Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання”

**І. А. Пушкін**

# ГРАМАДСКАЯ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У БЕЛАРУСКАЙ ССР (1919–1991)

МАНАГРАФІЯ

Магілёў
МДУХ
2018

УДК 94(476)„1919/1991“+323.15(476)
ББК 63.3 (4Беи)6
П 91

**Пушкін, І. А.** Грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991) : манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУХ, 2018. – 423 с. – ISBN 978-985-572-029-5.

У манаграфіі асвятляецца і аналізуецца грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Беларускай ССР (1919–1991): раскрыты арганізацыя і дзейнасць нацыянальных меншасцей у БССР у міжваенны перыяд (1919–1939), у гады Другой сусветнай вайны, удзел у грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці БССР у пасляваенны перыяд, спробаў рэформ, нарастання крызісу і заканчэння існавання савецкай сістэмы (1945–1991); прааналізаваны асноўныя кірункі нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў Беларускай ССР і стан нацыянальных меншасцей.

Адрасуецца навукоўцам, выкладчыкам і студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй.

Друкуецца па рашэнні
Савета ўніверсітэта ўстановы адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання"

Рэцэнзенты:
першы прарэктар УА "МДУ імя А. А. Куляшова"
доктар гістарычных навук, прафесар *Д. С. Лаўрыновіч,*
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі
Інстытута гісторыі НАН Беларусі
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. Г. Мазец,*
прарэктар па вучэбнай працы УА "МДУ імя А. А.Куляшова"
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт *А. В. Дзячэнка*

**УДК 94(476)„1919/1991“+323.15(476)**
**ББК 63.3 (4Беи)6**

**ISBN 978-985-572-029-5**

© Пушкін І. А., 2018
© Установа адукацыі
"Магілёўскі дзяржаўны
ўніверсітэт харчавання", 2018

**Змест**

Пералік умоўных абазначэнняў і скарачэнняў…………………… 5

Уводзіны……………………………………………………….. 7

**Глава 1 Гістарыяграфія, крыніцы, метадалогія даследавання**……… 14

1.1 Гістарыяграфія……………………………………………….. 14
1.2 Крыніцы…………………………………………………….. 35
1.3 Метады і метадалогія даследавання…………………………... 40

**Глава 2 Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў Беларускай ССР і стан нацыянальных меншасцей**……………………………….. 43

2.1 Этнічная структура і нацыянальна-культурная ідэнтыфікацыя насельніцтва Беларусі……………………... 43
2.2 Асноўныя кірункі і асаблівасці партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей БССР….. 60
2.3 Этнасацыяльныя праблемы насельніцтва і міжнацыянальныя адносіны ў Савецкай Беларусі……………………………… 128

**Глава 3 Дзейнасць нацыянальных меншасцей у БССР у міжваенны перыяд (1919–1939)**…………………………………………... 149

3.1 Арганізацыя і праца нацыянальна-грамадскіх аб'яднанняў…. 150
3.2 Удзел у арганізацыях, якія складалі палітычную сістэму БССР …………………………………………………………. 164
3.3 Культурна-асветніцкая дзейнасць сярод нацыянальных меншасцей……………………………………………………. 199

**Глава 4 Нацыянальныя меншасці Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны**…………………………………………………… 238

4.1 Грамадскае і культурна-асветніцкае жыццё нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1939–1941 гг. ……………………….. 238
4.2 Асаблівасці палітыкі гітлераўскіх акупантаў у адносінах да нацыянальных меншасцей і іх удзел у калабарацыяніісцкім руху ў Беларусі……………………………………………. 254
4.3 Уклад у перамогу над фашысцкай Германіяй………………... 268

**Глава 5 Удзел нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці БССР у пасляваенны перыяд, спробаў рэформ, нарастання крызісу і заканчэння існавання савецкай сістэмы (1945–1991)**……………………………… 288

5.1 Дынаміка, асноўныя тэндэнцыі і кірункі ў дзейнасці……….. 288
5.2 Удзел у партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве Савецкай Беларусі……………………………………………………. 320

5.3 Дасягненні і страты ў забеспячэнні грамадскіх і культурна-асветніцкіх запатрабаванняў нацыянальных меншасцей БССР…………………………………………………………….. 353
5.4 Дзейнасць ва ўмовах дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця і абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту……………… 365
Заключэнне…………………………………………………………... 376
Бібліяграфія………………………………………………………….. 387
Дадаткі……………………………………………………………….. 409
Summary……………………………………………………………… 421

## Пералік умоўных абазначэнняў і скарачэнняў

**Абкам, гаркам, райкам, АК, ГК, РК** – абласны (гарадскі, раённы) камітэт
**Аблвыканкам** – абласны выканаўчы камітэт
**АВК** – акруговы выканаўчы камітэт
**Акружком** – акруговы камітэт КП(б)
**Арк.** – аркуш
**АЯАРК "Джойнт"** – Амерыканскі яўрэйскі аб'яднаны размеркавальны камітэт "Джойнт"
**БАН** – Беларуская акадэмія навук
**БДАМЛМ** – Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва
**Белкамзет (ОЗЕТ)** – Таварыства па землеўладкаванню яўрэяў працоўных
**БУНД** – Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі
**ВС** – Вярхоўны Савет
**ВСНГ** – Вышэйшы савет народнай гаспадаркі
**Выканкам** – выканаўчы камітэт
**Гарвыканкам, ГВК** – гарадскі выканаўчы камітэт
**г.** – год
**гг.** – гады
**гл.** – глядзі
**ДАБр –** Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці.
**ДАВц** – Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
**ДАГАГом** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці
**ДАГАГр** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці
**ДАГАМаг** – Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці
**ДАГом** – Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці
**ДАГр** – Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці
**ДАМаг** – Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці
**ДАРФ** – Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі
**ДПУ** – Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне
**Еўбюро** – яўрэйскае нацыянальнае бюро пры ЦК (ЦБ) КП(б)Б
**Інбелкульт** – Інстытут беларускай культуры
**КП(б)Б** – камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі
**КПСС** – камуністычная партыя Савецкага Саюза
**Латбюро** – латышскае нацыянальнае бюро пры ЦК КП(б)Б
**Літбюро** – літоўскае нацыянальнае бюро пры ЦК КП(б)Б
**ЛКСМ, камсамол** – Ленінскі камуністычны саюз моладзі
**НАРБ** – Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь
**Наркамасветбел** – Народны камісарыят асветы Беларусі
**Наркамасветы, НКА** – Народны камісарыят асветы
**Наркамнац** – Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей
**Наркамюст** – Народны камісарыят юстыцыі
**Нацсавет** – нацыянальны савет
**НК** – Народны камісарыят

**НЭП** – новая эканамічная палітыка
**Польбюро** – польскае нацыянальнае бюро пры ЦК (ЦБ) КП(б)Б
**РВК** – раённы выканаўчы камітэт
**РДАНГ** – Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі
**РДАСПГ** – Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі
**РКСМ** – Расійскі камуністычны саюз моладзі
**Саўнаркам, СНК** – Савет народных камісараў
**Сельсавет, с/с** – сельскі савет
**СМ** – Савет Міністраў
**Спр.** – справа
**УсеКП(б)** – Усесаюзная камуністычная партыя (бальшавікоў)
**Ф.** – фонд
**ЦБ** – Цэнтральнае бюро
**ЦВК** – Цэнтральны выканаўчы камітэт
**ЦК** – Цэнтральны камітэт
**ЦСПСБ** – Цэнтральны савет прафесійных саюзаў Беларусі
**LCVA** – Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (Lietuvos centrinis valstybės archyvas)
**LMAVB RS** – Цэнтральная бібліятэка Акадэміі навук Літвы Аддзел рукапісаў (Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skurius)
**LVNA** – Літоўскі дзяржаўны новы архіў (Lietuvos valstybės naujasis archyvas)

## УВОДЗІНЫ

Рэспубліка Беларусь – дзяржава, у якой акрамя тытульнага насельніцтва беларусаў, шмат гадоў жывуць прадстаўнікі іншых нацый: латышы, літоўцы, палякі, рускія, татары, украінцы, яўрэі і інш., якія разам прайшлі адзіны, шмат у чым цярністы шлях, маюць нямала агульных нацыянальных герояў, пісьменнікаў, кампазітараў, грамадска-палітычных і дзяржаўных дзеячаў і г. д. Немагчыма вывучыць гісторыю і культуру Беларусі без даследавання гісторыі і культуры народаў, якія з'яўляліся нацыянальнымі меншасцямі на яе тэрыторыі і складалі істотную частку беларускага народа. Нацыянальныя меншасці зведалі працэсы асіміляцыі і інтэрнацыяналізацыі, але захавалі сваю самабытнасць. Яны адыгралі значную ролю ў фарміраванні і развіцці беларускага народа.

Гарманізацыя міжнацыянальных адносін і магчымасць рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы рэзка ўзмацнілі цікавасць да вывучэння пытанняў удзелу нацыянальных меншасцей Беларусі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці ў савецкі час, які папярэднічаў сучаснаму перыяду гісторыі нашай краіны.

Важнае значэнне мае аб'ектыўная ацэнка месца і ролі нацыянальных меншасцей у жыцці народа, іх дзейнасці ў розных грамадска-палітычных і культурна-асветных аб'яднаннях, рэлігійных, палітычных партыях і арганізацыях, іх сацыяльна-прававога статусу і ўдзелу ў праватворчым працэсе дзяржавы. Без гэтага немагчыма выпрацаваць сёння глыбока прадуманую, адпаведную інтарэсам краіны, дзяржаўную палітыку.

Праведзенае намі даследаванне нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі Савецкай Беларусі выявіла гістарычную заканамернасць пра пераемнасць этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да “нацыянальнай палітыкі” БССР (СССР). У прыватнасці, тэрміналогія, канцэптуальная арганізацыя кіравання раснастайнасцю і аперацыйныя падыходы да яе, якія сфарміраваліся ў савецкі перыяд і выразна сфармуляваныя ў канцы 1980-х гадоў, засталіся ў цэлым без змен, што дазваляе зрабіць выснову пра вызначальную ролю савецкай ідэалагічнай і істытуцыянальнай спадчыны ў кіраванні этнакультурнай разнастайнасцю ў перыяд навейшай гісторыі Беларусі.

Савецкі перыяд цікавы тым, што пры ім адначасова адзначаецца разбурэнне самабытных нацыянальных (традыцыйных) культур, іх захаванне праз кансалідацыю на этнічна-рэлігійнай аснове і нацыянальнае адраджэнне. Ва ўмовах існавання тагачаснага палітычнага рэжыму ў асяродку нацыянальных меншасцей найбольш выразна прасочваецца менавіта грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць. Больш за 70 гадоў складае ў гісторыі Беларусі XX стагоддзя савецкі перыяд. Гэта і абумовіла храналагічныя межы даследавання: 1919 год – год абяўяшчэння аб стварэнні БССР і 1991 год – год знікнення БССР і пачатак гісторыі суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь. Тэрытарыяльныя межы даследавання ахопліваюць межы БССР у межах

сучаснай Рэспублікі Беларусь, у перыяд 1921–1939 гг. – у межах тагачаснай БССР. Перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы не даследуецца.

01.01.1919 г. пачынаецца перыяд існавання БССР. Беларуская рэспубліка з 1922 г. уваходзіла ў склад СССР, сузаснавальніцай якога яна з'яўлялася. З першых дзён свайго існавання партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР дэкларавалі роўнасць магчымасцей усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, для самарэалізацыі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці. Нацыянальныя меншасці БССР праяўлялі актыўнасць ва ўсіх сферах палітычнай сістэмы грамадства, якая ўключала партыі, дзяржаўныя інстытуты, прафсаюзы, аб'яднанні і рухі, камсамол, кааператыўныя аб'яднанні, творчыя саюзы і г. д. Яны імкнуліся дасягнуць сваіх мэтаў, нягледзячы на тое, што большасць з іх мела абмежаваны ўплыў і ўлады імкнуліся выштурхнуць іх з палітычнага жыцця. Гэта было выклікана класавымі (палякі – шляхта, латышы – кулакі і г. д.) і знешнепалітычнымі фактарамі, што абумовіла трансфармацыю нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ад спрыяння нацыянальнаму развіццю ў параўнанні з перыядам царскай Расіі да недаверу і варожых адносін да нацыянальных меншасцей, якія прадстаўлялі краіны, дзе будаваўся капіталістычны лад.

*Аб'ект нашага даследавання* – нацыянальныя меншасці Беларусі. Вядомы два разуменні паняцця "нацыянальныя меншасці". Першае шырока сустракаецца ва ўсім свеце. *Нацыянальныя меншасці* – гэта групы насельніцтва пэўнай нацыянальнасці, якія расселены ў іншанацыянальным асяроддзі па-за межамі ўласных дзяржаўных утварэнняў або не маюць такіх. Ствараюць этнакультурную супольнасць, якая пэўным чынам інтэгруецца з тытульнай большасцю. Іншае дадзена ў Законе Рэспублікі Беларусь "Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь"[1]. Пад асобамі, якія належаць да нацыянальных меншасцей, разумеюцца тыя, хто пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларусі, маюць яе грамадзянства, і якія па свайму паходжанню, мове, культуры або традыцыям адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі. У Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацавана паняцце "нацыянальная супольнасць" (артыкулы 14, 15)[2]. Пад гэтым паняццем можна разумець усе нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыі краіны, у тым ліку і беларусаў.

*Прадмет даследавання* – грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Савецкай Беларусі, выяўленне спецыфікі іх гістарычных лёсаў і асаблівасцей, эвалюцыі асноўных форм існавання іх матэрыяльнай і духоўнай культуры, такіх элементаў як мова, літаратура, рэлігія і гістарычная памяць, у якіх найбольш праяўляецца самаідэнтыфікацыя этнаса.

[1] О национальных меньшинствах в Республике Беларусь: Закон Республики Беларусь 11 ноября 1992 г. № 1926–XII (изменения и дополнения от 5 января 2004 г. № 261–З, от 7 мая 2007 г. № 212–З) ; О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь "О национальных меньшинствах в Республике Беларусь": Закон Республики Беларусь от 5 января 2004 г. № 261–З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь (НРПА), 2004. № 4. 2/1010.

[2] Конституция Республики Беларусь 1994 года: с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г. Минск, 2008.

Удзел у грамадскім і культурным жыцці дазваляе вылучыць рэальную ролю грамадзяніна, асобных груп як на мясцовым узроўні, так і ў палітычнай сістэме грамадства. Калі грамадзяне прымаюць актыўны ўдзел у фарміраванні эліты, у вызначэнні асноўных мэтаў палітыкі, кантролі за яе ўвасабленнем, тады такую палітычную сістэму можна лічыць дэмакратычнай.

*Мэта:* ўпершыню на манаграфічным узроўні на канкрэтным гістарычным і фактычным матэрыяле паказаць і прааналізаваць грамадскую і культурна-асветніцкую дзейнасць асноўных, у колькасным вымярэнні, груп нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі, якія комплексна раней не даследаваліся на доктарскім узроўні, вывучаліся толькі некаторыя яе пытанні ў рэчышчы даследавання асобных праблем гісторыі Беларусі ў перыяд навейшай гісторыі ў 1919–1991 гг. У адпаведных главах ўзгадваюцца шэраг праблемных пытанняў удзела нацыянальных меншасцей (ці асобных этнічных супольнасцей) у грамадскім і культурным жыцці Савецкай Беларусі, якія засталіся па-за ўвагаю і патрабуюць асобных даследаванняў.

У даследаванні (наколькі дазволяць храналагічныя і тэматычныя рамкі працы і аб'ёмы тэксту) вырашаюцца наступныя *задачы*: прааналізаваць этнічную структуру і нацыянальна-культурную ідэнтыфікацыя насельніцтва Беларусі; вызначыць і ахарактарызаваць асноўныя этапы, кірункі і асаблівасці партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей БССР ў агульным кантэксце гісторыі Беларусі і развіцця беларускага грамадства; высветліць адносіны нацыянальных меншасцей да палітыкі дзяржавы, іх уплыў і значэнне пры рэалізацыі інтарэсаў насельніцтва Беларусі, узаемадзеянне дзяржавы і нацыянальных меншасцей у Беларусі, міжнацыянальныя адносіны; прааналізаваць грамадскую і культурна-асветніцкую дзейнасць нацыянальных меншасцей у міжваенны перыяд (1921–1939); паказаць іх становішча ў гады Другой сусветнай вайны; ахарактарызаваць удзел у грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці БССР у пасляваенны перыяд, спробаў рэформ, нарастання крызісу і заканчэння існавання савецкай сістэмы (1945–1991); прааналізаваць ролю нацыянальных меншасцей у працэсе кансалідацыі беларускага грамадства ў 1919–1991 гг.; раскрыць дзейнасць нацыянальных грамадскіх арганізацый і тэндэнцыі па самарэалізацыі і ўплыву нацыянальных меншасцей на асноўныя працэсы развіцця Беларусі праз іх удзел у грамадска-палітычных аб'яднаннях і ўладных структурах Беларусі; асвятліць здабыткі і страты нацыянальных меншасцей у справе захавання традыцыйнай культуры.

Станаўленне нацый і захаванне этнічных асаблівасцей і каштоўнасцей заўсёды з'яўляліся ініцыятывай сярэдніх класаў (пераважна гараджан, інтэлігенцыі, дробнай шляхты, заможнай часткі насельніцтва і г. д.), а не "простага народу" у інтарэсах якога разгортваліся ўсе нацыянальныя рухі. Таму ў даследаванні асаблівая ўвага звяртаецца на развіццё ў савецкі час ініцыятывы[3] і ўзроўню свядомасці нацыянальных меншасцей, што праявілася, найперш, у

[3] Ініцыятыва – гэта пачын, першы крок у якой-небудзь справе; унутраны намер (жаданне) да новых форм дзейнасці, прадпрыймальнасць, кіруючая роль у якіх-небудзь дзеяннях.

грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці. Грамадска-палітычная дзейнасць даследуецца, але ў назве працы тэрмін “палітычная” адсутнічае таму, што ў савецкі перыяд палітычная дзейнасць практычна не залежыла ад асноўнай масы насельніцтва і нацыянальныя меншасці не маглі істотна ўплываць на фарміраванне і развіццё палітычнай сферы. Працэс стварэння і дзейнасці розных нацыянальных грамадскіх арганізацый і палітычных рухаў дазваляе зразумець і прааналізаваць здольнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей да дзеянняў і самі гэтыя дзеянні ў справе задавальнення грамадскіх і культурна-асветніцкіх запатрабаванняў, як у справе ўмацавання існаваўшай сістэмы, так і захавання традыцыйнай культуры. Аналізуецца эвалюцыя намаганняў органаў партыйна-дзяржаўнай улады па вырашэнню нацыянальнага пытання, імкнення вырашыць этнічныя праблемы ў БССР. Паказваецца, як паўплываў дзяржаўны фактар на развіццё грамадскай актыўнасці і культуру нацыянальных меншасцей у параўнанні з царскім часам і сучаснасцю, які вопыт можна выкарыстаць. Праведзенае даследаванне дазволіць у будучым на яго базе правесці параўнальны аналіз нацыянальнай палітыкі, працэсу, метадаў, форм заканадаўчага афармлення і замацавання правоў нацыянальных меншасцей у Еўропе і СССР.

Распрацоўка метадаў і прыёмаў пазнання прадмета даследавання запатрабавала тлумачэння яго асноўных тэрмінаў і дэфініцый. Зыходзячы з існуючых тэрмінаў, нацыянальных і аўтарскіх асаблівасцей пры іх выкарыстоўванні, прапануем наступныя вызначэнні.

*Культура* – чалавечая дзейнасць у яе самых розных праявах, уключаючы ўсе формы і спосабы чалавечага самавыяўлення і самапазнання, назапашванне чалавекам і соцыумам ў цэлым навыкаў і ўменняў. Крыніцай паходжання культуры з’яўляецца чалавечая дзейнасць, пазнанне і творчасць. Мною культура разглядаецца як інфармацыйна-семіятычная, то ёсць сацыяльна значная інфармацыя, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і якая выяўляецца праз каштоўнасці, нормы, сэнсы і знакі (сімвалы). Культура як нормы паводзін складаецца з трох складнікаў: жыццёвыя каштоўнасці, нормы паводзін і артэфакты (матэрыяльныя творы). Жыццёвыя каштоўнасці вызначаюць самыя важныя ў жыцці паняцці. Яны з’яўляюцца асновай культуры. Нормы паводзін адлюстроўваюцца ў паняццях мараль і маральнасць. Артэфакты – творы матэрыяльнай культуры, якія звычайна з’яўляюцца вытворнымі ад першых двух складнікаў.

*Асветніцтва* – перадача, распаўсюджванне ведаў і культуры, а таксама сістэма выхаваўча-адукацыйных мерапрыемстваў і ўстаноў у дзяржаве. *Культурна-асветніцкая дзейнасць* – сацыяльна неабходная дзейнасць, мэтай ажыццяўлення якой з’яўляецца шырокае распаўсюджанне рознага тыпу інфармацыі, маючай прыярытэтнае значэнне пры ўстаноўленым узроўні развіцця грамадства. Культурна-асветніцкая дзейнасць ўцягнута практычна ва ўсе сферы жыцця людзей: палітыку, эканоміку, адукацыю, медыцыну, вольны час, кар’еру і г. д.

*Мультыкультуралізм* – палітыка, накіраваная на развіццё і захаванне ў асобна ўзятай краіне і ў свеце ў цэлым культурных адрозненняў, і тэорыя або ідэалогія, якая абгрунтоўвае такую палітыку.

*Нацыянальна-культурнае развіццё* – заканамернае якаснае змяненне этнічнага жыцця народаў на аснове агульнасці культурна-гістарычнага мінулага, нацыянальных каштоўнасцей, інтарэсаў і патрэбаў, якое ажыццяўляецца пры дапамозе забеспячэння эфектыўных механізмаў палітыка-прававога рэгулявання.

*Акультурацыя* – ўзаемнае прыпадабненне і прыстасаванне розных культур народаў і асобных з'яў гэтых культур, у большасці выпадкаў пры дамінаванні культуры народа больш высокаразвітога ў грамадскім дачыненні. Пры акультурацыі адзін народ засвойвае нормы іншага народа, але захоўвае сваю этнічную самасвядомасць.

*Асіміляцыя* – зліццё аднаго народа з іншым са стратай адным з іх сваёй мовы, культуры, нацыянальнай самасвядомасці. Адрозніваюць натуральную асіміляцыю, якая ўзнікае пры кантакце этнічна разнастайных груп насельніцтва, змешаных шлюбах і т.п., і гвалтоўную асіміляцыю, характэрную для краін, дзе нацыянальнасці не раўнапраўныя.

*Этнічная ідэнтычнасць* – складовая частка сацыяльнай ідэнтычнасці асобы, ўсведамленне сваёй прыналежнасці да пэўнай этнічнай (нацыянальнай) супольнасці. У яе структуры звычайна вылучаюць два асноўных кампанента – кагнітыўны (веды, прадстаўлення аб асаблівасцях уласнай групы і ўсведамленне сябе як яе члена на аснове пэўных характарыстык) і афектыўных (ацэнка якасцяў ўласнай групы, стаўленне да сяброўства ў ёй, значнасць гэтага сяброўства).

*Нацыя* – гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца: устойлівымі эканамічнымі і тэрытарыяльнымі сувязямі, агульнасцю мовы, культуры, характару, побыту, традыцый, звычаяў, самасвядомасці і гістарычнай памяці. *Этнас* – гістарычна склаўшаяся ўстойлівая сукупнасць людзей, аб'яднаных агульнымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі прыкметамі, у якія ўключаюць паходжанне, агульную мову, культуру, гаспадарку, тэрыторыю пражывання, самасвядомасць, знешні выгляд, менталітэт і іншае. Я разглядаю паняцце этнаса з пазіцыі эвалюцыйна-гістарычнага кірунку – як сацыяльныя супольнасці, якія ўзнікаюць у выніку гістарычнага працэсу. *Нацыянальнасць* – прыналежнасць чалавека да пэўнай этнічнай супольнасці.

*Нацыянальныя супольнасьці* – найбольш устойлівыя сацыяльныя ўтварэнні, сацыякультурныя супольнасці людзей, якія гістарычна склаліся і асноўнымі прыкметамі якіх з'яўляюцца агульнасць паходжання, тэрыторыі рассялення, адзінства мовы, агульнасць культуры, традыцый, звычаяў, густаў, нарматыўных паводзінаў, а таксама прыхільнасць да нацыянальных інстытутаў сям'і і рэлігіі.

*Самасвядомасць* – усведамленне суб'ектам самога сябе ў адрозненне ад іншага – іншых суб'ектаў і свету наогул; гэта ўсведамленне чалавекам свайго ўзаемадзеяння з аб'ектыўным светам і светам суб'ектыўным (псіхікай), ацэнка свайго светапогляду і жыццёва важных патрэбаў, думак, пачуццяў, матываў, інстынктаў, перажыванняў, дзеянняў. *Нацыянальная (этнічная) самасвядомасць* – адзін з складнікаў ідэнтычнасці чалавека, звязаны з адчуваемай ім

прыналежнасцю да пэўнага этнасу або нацыі. Гэта значыць ўсведамленне членамі групы наяўнасці дадзенай групы, яе асаблівасцей і мэтаў у сацыяльным свеце, вынікае з набытага ўсведамлення агульнасці культуры, гісторыі, мовы з пэўнай групай людзей. Прычым нацыянальная ідэнтычнасць не тоесная паняццю нацыянальнасці або грамадзянства, яны могуць быць фактарамі, якія аказваюць на яе моцны ўплыў.

*Міжнацыянальныя адносіны* – суб'ектыўна перажываемыя адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцей, этнічнымі супольнасцямі. Яны складваюцца ў палітыцы, эканоміцы, працоўнай дзейнасці, быце, сямейным жыцці, сферах сяброўскай, нефармальнай камунікацыі. Характар адносін (сяброўскі, нейтральны або канфліктны) залежыць ад гістарычнага мінулага, сацыяльна-палітычнай абстаноўкі ў краіне, эканамічных і культурна-бытавых умоў жыцця, ад канкрэтнай сітуацыі ці зацікаўленасці ў сувязях. На ўзроўні асобных людзей ён залежыць ад індывідуальна-псіхалагічных якасцей кожнага чалавека[4].

У самым шырокім сэнсе міжнацыянальны канфлікт вызначаецца як любая канкурэнцыя (суперніцтва) паміж групамі, ад проціборства за ўладанне абмежаванымі рэсурсамі да сацыяльнай канкурэнцыі, ва ўсіх тых выпадках, калі супрацьстоячы бок вызначаецца з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці. Я не згодны з гэтым. Мною *міжнацыянальны канфлікт* разглядаецца як сутыкненне несупадаючых або супрацьлеглых інтарэсаў ва ўсіх тых выпадках, калі супрацьстоячы бок вызначаецца з пункту гледжання этнічнай прыналежнасці.

*Грамадская дзейнасць* – дзейнасць па добраахвотнаму абслугоўванню палітычных, культурных, прафесійных патрэб грамадства.

*Грамадская-палітычная дзейнасць* – актыўная спецыфічная, прафесійная і непрафесійная дзейнасць у розных галінах палітычнага жыцця дзяржавы і грамадства, сацыяльную аснову якой складаюць карэнныя інтарэсы і патрэбы розных сацыяльных груп і слаёў, нацыянальных супольнасцей і іх адносіны наконт улады: яе ўтрыманне і захаванне, альбо яе рэфармаванне ці карэннае пераўтварэнне, якія могуць ажыццяўляцца рознымі спосабамі.

*Грамадства* – група людзей, якія валодаюць агульнымі інтарэсамі, каштоўнасцямі і мэтамі, а таксама любая сацыяльнае з'ява, установа або інстытут, якія разглядаюцца з пункту гледжання іх ўкладу ў развіццё грамадства.

*Дзейнасць* – матываваны працэс выкарыстання тых ці іншых сродкаў для змены і пераўтварэння чалавекам свету і свядомасці, які ўключае мэту, сродкі і вынік. *Удзел* – сумесная з кім-небудзь дзейнасць, ўцягнутасць ў якую-небудзь дзейнасць або спачувальнае стаўленне, падтрымка.

*Палітычная свядомасць* – усеагульнае, свабоднае, ініцыятыўнае і дзейнае ў вырашэнні пытанняў, якія закранаюць істотныя інтарэсы грамадзян. Удзел з'яўляецца для іх сродкам дасягнення мэтаў, рэалізацыі запатрабаванняў у самавыражэнні і самазацвярджэнні, у праяве пачуцця грамадзянскасці.

---

[4] *Мусіенка С.* Этнаканфесіянальнае асяроддзе Рэспублікі Беларусь: стан і тэндэнцыі развіцця // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 9. С. 34.

Дэмакратычная дзяржава забяспечвае такі свабодны ўдзел прававымі нормамі і працэдурамі, а таксама адносна раўнамерным размеркаваннем сярод розных частак грамадства такіх рэсурсаў удзелу як грошы, адукацыя, веданне механізмаў прыняцця рашэнняў, вольны час, доступ да СМІ. Дэмакратычнае грамадства дапускае і нязгоду.

*Палітычнае дзеянне* вызначаецца як свядомае і дабраахвотнае ўмяшальніцтва асобы, групы наконт улады існуючай сістэмы з мэтай прыстасавання яе да сваіх інтарэсаў, ідэалаў і каштоўнасцей. Дзейнасць злучана з імкненнем удасканаліць ці змяніць сацыяльна-эканамічны і палітычны лад.

*Грамадзянская супольнасць* – сістэма самастойных і незалежных ад дзяржавы грамадскіх інстытутаў і адносін, якія прызваны забяспечыць умовы для самарэалізацыі асоб і калектываў, рэалізацыі прыватных інтарэсаў і запатрабаванняў. Фарміраванне грамадзянскай супольнасці адбываецца па ініцыятыве і дзякуючы актыўнасці насельніцтва (“знізу”).

Пасля стварэння Рэспублікі Беларусь унутраны і знешны палітычны курс краіны ў навейшай гісторыі Беларусі арыентаваны на самабытнасць краіны ў гістарычным развіцці, фарміраванне прававога грамадства з сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікай і вызначаецца ўладамі як перыяд “палітыкі згоды”, аб’яднанне беларускага народа ў дзяржаву, дзе будуць захаваны этнічныя адметнасці супольнасцей і гарантаваны правы чалавека кожнай нацыянальнасці.

* * *

Аўтар лічыць сваім маральным абавязкам выказаць вялікую ўдзячнасць рэктарату УА “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання”, прарэктару па навуковай працы, доктару тэхнічных навук, прафесару А. В. Акулічу, загадчыку кафедры гуманітарных дысцыплін, доктару сацыялагічных навук, прафесару Ю. М. Бубнаву, старэйшым калегам і настаўнікам, якія шчодра дзяліліся ведамі і даследчыцкім вопытам: доктару гістарычных навук, прафесару, акадэміку НАН Беларусі М. П. Касцюку і доктару гістарычных навук, прафесару Л. М. Лычу. Асаблівая падзяка: доктару гістарычных навук, прафесару Д. С. Лаўрыновічу, кандыдату гістарычных навук, дацэнту В. Г. Мазецу, кандыдату філасофскіх навук, дацэнту А. В. Дзячэнку, а таксама ўсім, хто спрыяў выхаду гэтай працы ў свет.

# ГЛАВА 1
# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

## 1.1 Гістарыяграфія

Падзеі, якія адбываліся ў нашай краіне, не маглі не накласці адбітак на развіццё нацыянальных меншасцей Беларусі. Яны ў той ці іншай меры знайшлі адлюстраванне ў беларускай гістарыяграфіі. Розныя аспекты па разглядаемай праблематыцы знаходзілі адлюстраванне ў навуковай літаратуры, аднак гістарыяграфічная традыцыя даследавання праблемы не была ўстойлівай.

У савецкай гістарыяграфіі існаваў нярэдка тэндэнцыйны падыход да асвятлення грамадска-палітычных і культурных працэсаў, якія адбываліся на абшарах Беларусі, ролі ў гэтых працэсах нацыянальных меншасцей БССР. Не ўяўлялася магчымым і аб’ектыўнае даследаванне стану міжнацыянальыіых адносін, абмеркаванне прычын адмоўных праяваў і новых падыходаў да іх пераадолення.

Пэўную каштоўнасць уяўляюць выданні 1920–30-х гадоў, якія адначасова з’яўляюцца крыніцамі, таму яны прааналізаваны ў адпаведным раздзеле манаграфіі (гл. раздзел 1.2)[5]. Змешчаная ў іх інфармацыя дазваляе прасачыць асноўныя кірункі рэалізацыі асноў нацыянальнай палітыкі кіруючых колаў БССР у справе забеспячэння грамадскага і культурнага жыцця нацменшасцей, іх ролі ў агульнабеларускіх працэсах. У гэты перыяд быў апублікаваны фактычны матэрыял, які дазваляе шляхам аналізу статыстыкі засведчыць ролю нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным і культурным жыцці рэспублікі. Літаратура 1920-х гг. адрозніваецца шматварыянтнасцю ідэй, барацьбой думак, дыскусійным падыходам да праблем выбару шляхоў нацыянальна-культурнага будаўніцтва, формаў і метадаў кіраўніцтва гэтымі працэсамі. Працы, выдадзеныя ў 1930-я гады, мелі ў асноўным агітацыйна-прапагандысцкі характар. Вялікая ўвага надавалася паказу дасягненняў у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным будаўніцтве.

У навуковых працах 1950–80-х гг. утрымліваецца фактычны матэрыял, які характарызуе развіццё розных накірункаў культурнага, сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага жыцця Беларусі, удзелу ў ім насельніцтва, дзейнасці розных грамадскіх арганізацый. Але ў гэтых працэсах не разглядаўся або не ўзгадваўся зусім удзел нацменшасцей у грамадска-палітычным і культурным жыцці, іх дзейнасць разглядалася праз жыццё ўсяго беларускага народа. Вялікая ўвага надавалася паказу ўзаемаўплываў, узбагачэнню і збліжэнню культур народаў СССР і асобай місіянскай ролі рускай культуры[6]. У

---

[5] Тут і далей у дужках паказаны раздзелы манаграфіі ў якіх узгаданыя факты, падзеі, кірункі і г.д. асвятляюцца больш падрабязна.

[6] *Бараноўскі Я. І.* За дружбу народаў: Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў 1921–1925 гг. Мінск, 1972 ; *Вышынскі У. І., Петрыкаў П. Ц.* Змены сацыяльнай структуры насельніцтва БССР у міжваенны перыяд. Мінск, 1978 ; *Іваноў У. М.* Нарыс дэмаграфіі, сацыялогіі і быту рабочага

працах праводзілася думка, што на працягу навейшай гісторыі Беларусі (з 1917 года), уся беларуская культура ва ўзаемадзеянні з моцнымі культурамі іншых рэспублік толькі развівала і дапаўняла свае важнейшыя элементы, арганічна забяспечваючы культурныя і грамадскія запатрабаванні нацыянальных меншасцей. Нацыянальны склад прыводзіўся толькі для паказу вырашэння нацыянальнага пытання ў святле “Ленінскай нацыянальнай палітыкі”, каб замацаваць догму аб трыумфальным шэсці савецкай улады па шляху рэалізацыі памкненняў “савецкага народа”. Аналіз сутнасці, прыроды, ролі культур нацменшасцей, іх грамадска-палітычнай актыўнасці не быў зроблены. Замоўчваліся працэсы русіфікацыі, існаванне рэлігійнага фактару ў жыцці нацыянальных меншасцей, нярэдка асобна не ўлічвалі і не разглядалі літаратурную, мастацкую, навуковую спадчыну нацменшасцей і беларусаў. Грамадская дзейнасць нацменшасцей не падкантрольная КП(б)Б разглядалася як “буржуазна-нацыяналістычная”, “сіяністкая” і г.д.

Пэўны фактычны матэрыял з жыцця нацменшасцей у гады савецкай улады можна знайсці ў працах В. Вярэніча; у С. Марцалева – аб станаўленні і развіцці сродкаў масавай інфармацыі на нацыянальных мовах; у Л. Лыча – пра аналіз сацыяльна-культурнага развіцця БССР у параўнанні з іншымі рэспублікамі; шмат цікавых фактаў маецца ў работах Я. Новіка і У. Навіцкага, У. Сідарцова, І. Ігнаценкі, І. Марчанкі, П. Петрыкава, А. Люцко, Я. Мазуравай і іншых[7]. Аўтары адзначаных публікацый прыводзяць багаты фактычны матэрыял, на аснове якога можна правесці абагульняючы аналіз рэалізацыі нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў розных галінах вытворчасці і грамадскім жыцці рэспублікі.

Інтэрнацыяналізацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця грамадства як вынік правядзення нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі пераканаўча паказана ў працах В. Бармічава, І. Сяровай, А. Галаўнёва і А. Мельнікава, П. Сіліванчыка і А. Мельнікава, Я. Карнейчыка[8].

---

класа Савецкай Беларусі (1917–1941). Мінск, 1975; СССР и Польша: Интернациональные связи – история и современность: В 2 т. Т.1. М., 1977.

[7] *Веренич В.Л.* Состояние и перспективы исследования “Польщизны кресовой”// Польские говоры в СССР. Ч. 1. Минск,1973. С. 183–212 ; *Марцелев С.В.* На путях строительства социализма. Печать Белоруссии в 1926–1937 гг. Минск, 1972 ; *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941) / Под ред. В.А. Полуяна. Минск, 1987 ; *Новицкий В.И., Новик Е.К.* Участие Ленинского комсомола Белоруссии в борьбе за подъём народного образования (1920–июнь 1941). Минск, 1979 ; *Сидорцов В.Н.* Государственная деятельность рабочего класса БССР (1921–1937 гг.). Минск, 1978 ; *Игнатенко И.М.* Великий Октябрь в судьбах белорусского народа. Минск, 1987 ; *Марченко И.Е., Мельянков Г.С.* Белоруссия–Литва: содружество множит силы. Минск, 1985 ; *Петриков П.Т.* Организация и деятельность постоянных комиссий местных советов Белоруссии (1944–1970). Минск, 1971 ; *Люцко А.В.* Деятельность КПБ по подбору, воспитанию и расстановке кадров. 1943–1945 гг. Минск, 1973 ; *Яго ж.* Деятельность КПБ по подбору, воспитанию и расстановке кадров. 1946–1950 гг. Минск, 1975 ; *Марченко И.Е.* Рабочий класс БССР в послевоенные годы. 1945–1950. Минск, 1962 ; *Яго ж.* Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР. Минск, 1977 ; *Новик Е.К., Новицкий В.И.* Ленинский комсомол Белоруссии в общеобразовательной школе. Минск, 1982 ; *Мазурова Я.С.* Государственные трудовые резервы Белоруссии в годы четвертой пятилетки. М., 1962.

[8] *Бармичев В.* В единой семье братских культур. Минск, 1965 ; *Серова И.И.* О пролетарском интернационализме. Минск, 1970 ; *Яе ж.* Культура межнационального общения. Минск, 1986 ; *Головнёв А.М., Мельников А.П.* Сближение национальных культур в процессе коммунистического строительства. Минск, 1979;

У абагульняючых працах, якія былі прысвечаны гісторыі Беларусі, ўхвалялася дзяржаўная палітыка па нацыянальным пытанням, вялікая ўвага акцэнтавалася выключна на адлюстраванні станоўчых вынікаў нацыянальнага і культурнага развіцця саюзных рэспублік у савецкі перыяд. На фактычным матэрыяле ў зборніках дакументаў і матэрыялаў раскрываецца нацыянальна-дзяржаўная палітыка, работа па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці насельніцтва (у тым ліку розных нацыянальнасцей), стварэнні і дзейнасці савецкай сістэмы адукацыі, развіцці літаратуры і мастацтва, а таксама ў цэлым грамадска-палітычнае жыццё[9].

Але складаныя і супярэчлівыя працэсы тых гадоў разглядаліся без вылучэння асобных нацыянальных груп насельніцтва; не выходзілі за межы афіцыйна зацверджанай метадалогіі; суправаджаліся тымі жа штампамі-высновамі, што і раней, якія былі характэрны для савецкай гістарыяграфіі. Вялікай ідэалагізаванасцю характарызаваліся калектыўныя работы, якія былі прысвечаны грамадска-палітычнай дзейнасці і гісторыі КП(б)Б, прафсаюзаў, камсамола[10].

Якасна новае асэнсаванне праблем нацыянальна-культурнага і грамадска-палітычнага развіцця БССР пачалося ў канцы 80-х–90-я гады XX ст. Больш узважана і падрабязна сталі разглядацца развіццё і значэнне нацменшасцей у жыцці краіны. Выдаюцца тэматычныя зборнікі і часопісы, матэрыялы навуковых канферэнцый[11]. Вялікую ролю ў вывучэнні пытанняў існавання нацыянальных культур і іх узаемадзеяння адыгралі Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, якая прысвяціла гэтай праблематыцы шэраг выданняў[12],

---

*Силиванчик П.П., Мельников А.П.* Взаимообогащение и сближение национальных культур в период строительства коммунизма. Минск, 1974 ; *Карнейчык Я.* Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс. Мінск, 1969.

[9] Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы 1918–1941. Минск, 1978; Восстановление народного хозяйства БССР (1921–1925) : Сб.докум. и матер. Минск, 1981 ; Кооперативно-колхозное строительство в Белорусской ССР (1917–1927): Сб. докум. и матер. Минск, 1980 ; Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Мінск, 1976 ; Народное образование в БССР: Сб. докум. и матер. Мінск, 1979 ; Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929–1932): Сб. докум. и матер. / Под ред. А.И. Азарова. Минск, 1973; Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919–1941): Докум. и матер. Минск, 1980 ; Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Т. 3–5 / Гал. рэд. І.М. Ігнаценка. Мінск, 1973–1975 ; История государства и права Белорусской ССР. В 2 т. / Ред.коллегия: С.П. Маргунский и др. Минск, 1970 ; История рабочего класса Белорусской ССР: В 4 т. / Гл. ред. П.Т. Петриков и др. Минск, 1985 ; История советского крестьянства: В 5 т. М., 1986 ; Фарміраванне і развіццё беларускай сацыялістычнай нацыі. Мінск, 1958 ; Братское сотрудничество Белорусской ССР с союзными республиками. Минск, 1974.

[10] Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Минск, 1967 ; Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969). Минск, 1970 ; Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. Минск, 1975 ; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1983. Т.1. ; Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988. Минск, 1988 ; Ленинский комсомол Белоруссии в цифрах и фактах 1920–1980 / И.А. Сороковник, О.А. Здоровенин, А.Г. Гуринович, П.П. Макаров. Минск, 1980 ; *Шестак Ю.И.* Борьба большевистской партии против национализма и оппортунизма Бунда. М., 1980.

[11] Актуальныя пытанні гісторыі БССР (савецкі перыяд) / Склад. В.М. Фамін і інш.: Пад рэд. У.Н. Сідарцова. Мінск, 1991 ; Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён (Зб. артыкулаў). Мінск, 1992 ; Татары на зямлі Беларусі // Байрам: квартальнік татарскага грамадска-культурнага аб'яднання "Аль-кітаб", 1991. № 1 ; Весці Акадэміі нацыянальных меншасцей. 1997. № 4 ; Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб.навук.прац. У 3 кн. / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст–Мінск–Віцебск, 1996 ; Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. Мінск, 1997 ; Национально-государственные интересы Республики Беларусь. Минск, 1999 і інш.

[12] Беларусіка=ALBARUTHENICA. Кн. 3: Нацыянальная і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / Рэд. А. Мальдзіс і інш. Мінск, 1994 ; Беларусіка= ALBARUTHENICA. [Кн.] 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі / Рэд.: В. Рагойша і інш. Мінск, 1995.

Міжнародная акадэмія нацыянальных меншасцей. Дасягненнем гэтага перыяду з'явілася правядзенне Першай Нацыянальнай навукова-практычнай канферэнцыі "Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхам супрацоўніцтва і згоды" (Віцебск, 21–22.05.1996).

Пераасэнсаванне сутнасці і вынікаў нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў БССР адбываецца пасля атрымання незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Тут неабходна адзначыць манаграфіі і публікацыі І. Ігнаценкі, М. Касцюка, Л. Лыча, У. Навіцкага[13]. Значны ўклад у распрацоўку праблем фарміравання і развіцця культуры нацменшасцей Беларусі ўнесла сумесная работа Л. Лыча і У. Навіцкага[14]. Сярод калектыўных работ 1990-х гг. усебаковасцю асвятлення грамадска-палітычнага і культурнага жыцця БССР вызначаюцца "Нарысы гісторыі Беларусі"[15]. Дэмаграфічныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі, разглядаюцца ў артыкулах М. Старавойтава, А. Смалянчука[16]. Апошні, аналізуючы нацыянальную структуру насельніцтва Беларусі ў ХХ ст., зрабіў выснову, што "з пункту погляду этнанацыянальных працэсаў гісторыя Беларусі ХХ ст. – гэта гісторыя імкнення народаў краіны да нацыянальнага самавызначэння"[17]. Разглядаючы нацыянальныя адносіны і дзяржаўнасць, Н. Дзенісюк прапаноўвала ідэю пабудовы культурна-плюралістычнага грамадства з механізмам нацыянальна-культурнай (нацыянальна-асабовай) аўтаноміі ў Беларусі, што менавіта яна дазваляе задаволіць інтарэсы асобы, нацыі і дзяржавы адначасова, не парушаючы тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы[18]. У той жа час некаторыя даследчыкі адмаўлялі нават спробы фармулявання беларускіх нацыянальных інтарэсаў па-за межамі рускай нацыянальнай ідэі[19].

Ва ўсебаковых даследаваннях Л. Лыча пра міжнацыянальныя дачыненні ў Беларусі[20] паказваецца, як у выніку правядзення савецкай палітыкі зближэння

---

[13] *Игнатенко И.М.* Национальный вопрос и современность // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.). Мінск, 2001. С. 31–38 ; *Касцюк М.П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000; *Яго ж.* Узаемаадносіны этнічных супольнасцей на Беларусі ў ХХ ст. // Там жа. С. 24–31 ; *Навіцкі У.І.* Савецкая палітыка ў адносінах да этнічных супольнасцей Беларусі // Там жа. С. 15–24.

[14] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. 2-е выд., дап. Мінск, 1997.

[15] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. / А.П. Касцюк , І. М. Ігнаценка, У. І. Вышынскі і інш. Мінск, 1995.

[16] *Старовойтов М.И.* Национальный состав городского населения белорусско-российско-украинского пограничья (1920–1930-е годы) // Религия и общество – 4: сб. науч. трудов. Могилёв, 2009. С. 66–69 ; *Смалянчук А.* Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў ХХ стагоддзі. // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 1. Мінск, 2002. С. 157–167.

[17] *Смалянчук А.* Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў ХХ стагоддзі // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 1. Мінск, 2002. С. 165–166.

[18] *Денисюк Н.* Национальные отношения и государственность // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. М., 1995. С. 286.

[19] *Криштапович Л.* Русская идея и белорусская государственность // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. М., 1995. С. 301–305.

[20] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). Мінск, 2007 ; *Яго ж.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). Мінск, 2009 ; Беларуская нацыя і мова: Літ.-гістарычн. артыкулы. Мінск, 1994 ; Яўрэйская культура Беларусі – яе агульны духоўны набытак. Мінск, 2012; Варыяцыі на нацыянальную тэму. Мінск, 2011 ; Беларуская нацыянальная ідэя: тэарэтычны і практычны аспекты. Мінск, 2010. і інш.

і зліцця нацый, іх культур, моваў адбывалася дэнацыяналізацыя яе палітычнага, эканамічнага і духоўнага жыцця, дэфармавалася нацыянальная самасвядомасць народа.

Нацыянальную палітыку бальшавікоў у міжваенны час разглядалі ў сваіх публікацыях шэраг айчынных і замежных вучоных Н. Васілеўская, А. Глагоўская, В. Дэнінгхаус, С. Казіеў, А. Качаткова, А. Лейзераў, І. Раманава, М. Тэры[21]. Апошні адзначае, што арыгінальнасць палітыкі бальшавікоў у гэты перыяд ў тым, што яны падтрымлівалі знешнія формы існавання нацыянальных меншасцей больш, чым рускіх і ўвёў новы тэрмін – "імперыя станоўчай дзейнасці". Фарміраванне нацыянальнай культуры, развіццё адукацыі і асветы ў 1920–1930-я гг. даследавалі Е. Андрэева, Н. Пурышава[22].

Ролі Інбелкульта ў правядзенні беларусізацыі і даследаванні жыцця насельніцтва Беларусі, у тым ліку палякаў і яўрэяў, прысвечана калектыўная манаграфія[23]. Вывучэннем пытанняў культуры і гісторыі нацменшасцей у БАН займаўся М. Токараў[24].

Механізм уздзеяння на незалежна думаючую інтэлігенцыю, дэпартацыі і рэпрэсіі супраць нацменшасцей БССР разглядаюць даследчыкі У. Адамушка, Б. Блада, А. Вялікі, І. Раманава, В. Жук, А. Дзядзінкін і інш.[25]

---

[21] *Васілеўская Н.У.* Захады савецкай улады па забяспячэнні культурных патрэбаў этнічных меншасцяў БССР у першай палове 1920-х гадоў // Беларусь-Украіна : гістарычны вопыт узаемаадносін: матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003г.) / Рэдкал. У.І. Навіцкі (гал. рэд.), і інш. Мінск, 2004. С. 231–234 ; *Głogowska Helena.* Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki. Białystok, 1996 ; *Деннингхаус В.* В тени «Большого брата». Западные национальные меньшинства в СССР. 1917–1938 гг. М., 2011; *Казиев С.Ш.* Основные направления национальной политики Советского государства в Казахстане (1920–1929 гг.) // Вестник Томского государственного университета. История. 2014. № 5 (31). С. 51–56 ; *Кочеткова Е.А.* Национальная политика в Советском государстве в 1920-х – 1930-х гг.: случай финнов-иммигрантов в Карелии // Вестник ЛГУ им. А.С. Пушкина. 2011. № 1. Т. 4. С. 48–62 ; *Лейзеров А.* Национальная политика в Беларуси в первые годы советской власти (1920–1939) // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 1. Мінск: Водолей, 2002. С. 104–109 ; *Романова И.* Политика большевиков в отношении национальных меньшинств в Беларуси в межвоенный период // Ethnic Culture: Traditions and Innovations. Kaunas, 2004. С. 340–347 ; *Терри Мартин.* Империя «положительной деятельности». Нации и национализм в СССР, 1923–1939. М., 2011.

[22] *Андрэева* Е. Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917–1941 гг.) : вуч. дапаможнік. Мінск, 2001; *Пурышева Н.* Изменения модели национально-культурного развития в БССР на рубеже 20–30-х гг.: региональный аспект // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" у 2 ч. Ч. II / уклад І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. Магілеў, 2003. С.25–29; *Ее ж.* "Украинский фактор" в национально-культурной политике Беларуси (1920-е – начало 1930-х гг.) // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар.навук. канф. Мінск, 2004. С. 250–253..

[23] Інстытут беларускай культуры / М.П. Касцюк, П.Ц. Петрыкаў, М.У. Токараў і інш. Мінск, 1993.

[24] *Токараў М.* Вывучэнне культуры і гісторыі нацыянальных меншасцей у Беларускай Акадэміі навук (1920–30-я гг. ) // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2 / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. С. 62–64 ; *Яго ж.* Деятельность научных подразделений Белорусской академии наук по изучению национальных меншинств Республики (1929–1936 гг.) // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. ( Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001. С. 236–239.

[25] *Адамушка У.І.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск, 1994; Возвращённые имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репресий. Минск, 1992 ; *Блада Б.* Дэпартацыі польскага насельніцтва ў глыб СССР у 1939–1941 гг. // Дэпартацыя як сацыяльная праблема: Тэматычны зборнік навуковых прац. Брэст, 1997. С. 28–31 ; *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: "дваістыя стандарты" нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.) // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001. С. 292–297 ; *Яго ж.* Савецка–германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі // Весці БДПУ. Серыя 2. 2006. № 3. С. 15–18 ; *Сільвановіч С.* Палітыка савецкіх улад у адносінах да польскага насельніцтва паміж вераснем 1939 і чэрвенем 1941 г. // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. Гродно, 2003. С.

Дзейнасць нацыянальна-адміністратыўных адзінак, грамадска-палітычных арганізацый, партый і іншых аб'яднанняў, праз якія рэалізоўвалі свой патэнцыял нацменшасці, у той ці іншай ступені, разглядаецца ў работах М. Біча, Э. Іофе, І. Чамярыскага, Н. Вашчылы, А. Валахановіча, С. Пасталоўскага, зборніку дакументаў і матэрыялаў пра БУНД у Беларусі[26]. Дзейнасць нацыянальных маладзёжных арганізацый падрабязна прааналізаваў В. Даніловіч[27]. Нацыянальная палітыка, розныя бакі з грамадскага і культурнага жыцця латышоў, літоўцаў, палякаў, яўрэяў, іх склад у партыйна-савецкай наменклатуры даследаваліся аўтарам манаграфіі[28].

---

192–204 ; Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. Вып. 3 / сост. И. Кузнецов, Я. Басин. Минск, 2007 ; *Раманава І.М.* Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны перыяд // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001. С. 227–232 ; *Яе ж.* Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей Беларусі ў міжваенны перыяд // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 1. Мінск, 2002. С. 151–156 ; *Жук В.Н.* Польский фактор в политических репресиях в БССР (1937–1938 гг.) // Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы ХХ столетия). Минск, 2008. С. 34–51 ; *Дзядзінкін А.Л.* Рэпрэсіі другой паловы 1920–1930-х гадоў як адзін са сродкаў ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі савецкай улады на Беларусі // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. № 4. С. 34–35 ; *Белозорович В.А.* К проблеме депортаций населения из западных областей Беларуси в 1940 г. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук.канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001г.). Мінск, 2001. С. 268–275.

[26] *Біч М.В.* і інш. БУНД // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мінск, 1994. Т.2. С. 126–132 ; *Чемерисский И.А.* Партия Поалей-Цион в годы революции и в первые годы Советской власти // Непролетарские партии и организации национальных районов России в Октябрьской революции и гражданской войне. М., 1980. С. 156–165 ; *Ващило Н.Н.* Бундовские организации Могилева и Могилевского уезда в 1920–1921гг. // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья. Международная научно-практическая конференция: Тезисы докладов. Могилев, 2001. С. 28–30 ; *Великий А.* БУНД в коммунистической Беларуси: хроника политического уничтожения // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 2. Мінск, 2003. С. 52–59 ; *Валахановіч А.* Нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5. Мінск, 1999. С. 310–311 ; *Посталовский С.А.* Русские национальные советы в БССР в 1920–1930-е годы: к вопросу о количественной динамике // Весці Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2006. № 5. С. 91–93 ; Бунд в Беларуси. 1897–1921. Документы и материалы / Сост. Э.М. Савицкий. Минск, 1997.

[59] Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах / Авт.-сост.: Р.П. Платонов и др. Минск, 2001 ; "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". Верасень 1939 г. – 1956 г.: дакументы і матэрыялы. У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2009.

[60] Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб. матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.). Брэст, 2005 ; Религия и общество: актуальные проблемы современного религиоведения : сб. науч. трудов / Под общ. ред. В.В. Старостенко. Могилёв, 2006 ; Религия и общество – 4: сб. науч. трудов / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. Могилёв, 2009 ; Проблемы и перспективы становления гражданского общества : материалы Междунар. науч.-практич. конф., 20–21 мая 2010 г., Могилев. В 2 ч. Могилев, 2010 ; Религия и общество – 6: актуальные проблемы свободы совести: сб. науч. статей. Могилёв, 2011.

[61] Беларусіка = ALBARUTHENICA. [Кн.] 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі. Мінск, 1995 ; Беларусіка = ALBARUTHENICA. Кн. 3: Нацыянальная і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне. Мінск, 1994 ; Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы

працавалі асобныя секцыі, якія былі прысвечаны этнакультурнай гісторыі і рэлігіі Беларусі[63].

Інстытутам гісторыі НАНБ былі праведзены навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя пытанням этнічных супольнасцей ў Беларусі і беларуска-украінскаму ўзаемадзеянню, матэрыялы якіх унеслі значны ўклад у даследаванне гісторыі і сучаснасці нацыянальных меншасцей Беларусі[64]. Шэраг міжнародных навуковых канферэнцый, якія былі прысвечаны захаванню этнічнай свядомасці і развіццю польскай супольнасці, праводзіліся грамадскімі аб'яднаннямі "Саюз палякаў на Беларусі"[65] і "Міжнародная Акадэмія па вывучэнню нацыянальных меншасцей", якая выдавала штоквартальнік "Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей" і тэматычныя зборнікі навуковых прац па нацыянальнай адукацыі[66].

Сутнасць і кірункі дзяржаўнай палітыкі ў сферы нацыянальна-культурнага і рэлігійнага развіцця былі прадметам аналізу на вельмі прадстаўнічых навуковых форумах.

09–10.02.1995 г. у г. Мінску адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя "Грамадзянская і нацыянальная згода – першаснова кансалідацыі беларускага грамадства". У рэкамендацыях канферэнцыі адзначалася: "Важнейшай

міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). Мінск, 2004 ; Грамадзянская супольнасць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі. Матэрыялы навукова-практычнага семінара (Мінск, 30–31 мая 1996 года). Брэст, 1996 ; Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001 ; Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006 ; Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. Гродно, 2010 ; Polsko–Białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe: Materiały XI Międzynarodowej Konferencji Naukowej "Droga ku wzajemności" (Białystok 18–20.VII.2003). Białystok, 2004 ; Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г. Гродна, 2004 ; Этнічная, моўная і культурная разнастайнасць у сучасным грамадстве : зборнік навуковых прац удзельнікаў Міжнар. навук. - практ. канф., 29–30 мая 2014 г., г. Магілёў. Магілёў, 2014 і інш.

[62] Адукацыя і нацыянальна-культурнае адраджэнне: Тэз. навук. дакл. на Міжнар. канф. (25–26 кастр. 1994 г., г. Мінск): У 2 ч. Мінск, 1994 ; Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. М., 1995 ; Матэрыялы Першага з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск ; Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно–гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно–практической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. Витебск, 2007. Ч. I ; Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" у 2 ч. Магілеў, 2003. Ч. II ; Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў. Гродна, 2006 ; Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.-теорет. конф. (Минск, 29 сент. 2006 г.). Минск, 2006 ; Палітычныя рэпрэсіі на Беларусі ў XX стагоддзі: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 27–28 марта 1998 г.). Мінск, 1998 ; Шляхі Магілёўскай гісторыі: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2005 і інш.

[63] Напрыклад: Романовские чтения–3 : сб. трудов Международной науч. конференции / Под ред. И.А. Марзалюка. Могилёв, 2007 ; Романовские чтения – 5: сб. трудов Межд. науч. конференции. Могилёв, 2009.

[64] Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). Мінск, 2004 ; Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). Мінск, 2001 ; і інш.

[65] Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. Гродно, 2003 ; Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч. конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи , 2004 і інш.

[66] Нацыянальная адукацыя: тэмат. зб. навук. прац. Кніга IX. Адукацыя дыяспар / навук. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст, 1998.

перадумовай кансалідацыі беларускага грамадства з'яўляецца фарміраванне цэласнай гістарычнай свядомасці народа, сцвярджэнне нацыянальнай самабытнасці, усведамлення ўласнай гісторыі і дзяржаўнасці; адной з умоў кансалідацыі беларускага грамадства таксама з'яўляецца забеспячэнне свецкага характару беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай культуры". Удзельнікі канферэнцыі прапанавалі: "арыентаваць грамадства краіны на разуменне беларускай нацыі як сукупнасці ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь незалежна ад іх этнічнага паходжання. У сваіх падыходах да "польскага", "рускага" ці "літоўскага" пытанняў у цяперашнім і бліжэйшым будучым нацыянальная палітыка ўрада Беларусі павінна зыходзіць з неабходнасці захавання суверэнітэта над тэрыторыямі з насельніцтвам, якое не атаясамлівае сябе з беларусамі, інтэграванне этнічных меншасцей у грамадскае жыццё беларускай нацыі і дзейнасць беларускай дзяржавы"[67].

21–22.05.1996 г. у Віцебску адбылася Першая Нацыянальная навукова-практычная канферэнцыя "Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхі супрацоўніцтва і згоды". На ёй была ўхвалена навуковай грамадскасцю "Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі" [68]. Матэрыялы канферэнцыі былі выдадзены ў выглядзе тэматычнага зборніка навуковых прац "Нацыянальныя меншасці Беларусі" ў трох кнігах [69].

У 2006 г. (Мінск) НАН Беларусі правяла Міжнародную навуковую канферэнцыю па навейшай гісторыі "Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность". Пад час яе прагучалі даклады і былі абмеркаваны актуальныя пытанні навейшай гісторыі, дзяржаўнай ідэалогіі, сацыялогіі, прававой, нацыянальнай і рэлігійнай палітыцы, развіцця культуры і мастацтва, іншых аспектаў грамадска-палітычнага жыцця[70].

Праблемы навейшага перыяду гісторыі Беларусі, агульнадзяржаўнага, нацыянальнага маштабу ўзнімаліся на Першым з'ездзе вучоных Рэспублікі Беларусь (Мінск, 01–02.11.2007). У выступах М. Мясніковіча, П. Нікіценкі, А. Лукашанца, А. Кавалені адзначаліся задачы і праблемы стабільнага, дынамічнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі[71]. Ролю гуманітарных навук у фарміраванні беларускай мадэлі развіцця краіны прааналізаваў П. Нікіценка, які падкрэсліў, што асабліва важным для вучоных гуманітарыяў у галіне гісторыі з'яўляецца даследаванне айчыннай гісторыі,

---

[67] Рэкамендацыі канферэнцыі // Технология политики. Гражданское и национальное согласие – первооснова консолидации белорусского общества. Материалы междунар. науч. конф. Минск, 9–10 февраля 1995 г. М., 1995. С. 335–336.

[68] Канцэпцыя нацыянальна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі / Навук. рэд. С.А. Яцкевіч Мінск, 1996.

[69] Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. У 3 кн. / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст–Мінск–Віцебск, 1996.

[70] Новейшая история (1991–2006 гг.): государство, общество, личность: материалы науч.-теорет. конф. (Минск, 29 сент. 2006 г.). Минск, 2006.

[71] Матэрыялы Першага з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск.

сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускага грамадства[72]. У рэзалюцыі з'езда падкрэслена, што для дасягнення высокіх паказчыкаў устойлівага развіцця краіны ў кірунку "нацыянальная культура" неабходна навуковае абгрунтаванне шляхоў і механізмаў устойлівага развіцця мовы, літаратуры, гісторыка-культурнай спадчыны і мастацтва ва ўмовах глабалізацыі[73].

Аналізуючы гістарычныя шляхі дзяржаўнасці Беларусі прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі А. Каваленя падкрэсліў, што "дасягненні Рэспублікі Беларусь абумоўлены, і не ў апошнюю чаргу, навуковымі напрацоўкамі гісторыкаў, якія былі накіраваны на кансалідацыю грамадства, умацаванне міжканфесійнага і міжнацыянальнага ладу". Даследчык наступным чынам характарызуе нацыянальную палітыку дзяржавы: "Найноўшая гісторыя Беларусі пацвердзіла: палітычны курс, абраны ўладай, які накіраваны на стварэнне сацыяльна-арыентаванай рынкавай эканомікі, адпавядае нацыянальным інтарэсам, сутнасці нацыянальнай ідэі, векавым спадзяванням беларусаў, менталітэту народа і прынцыпу гістарычнай пераемнасці"[74].

Навукоўцы з Беларусі, Германіі, Грузіі, Казахстана, Расіі, Сербіі і Украіны змястоўна і грунтоўна прааналізавалі тэарэтычныя і практычныя аспекты рэалізацыі этнічнай, моўнай і культурнай разнастайнасці, а таксама гістарычныя перадумовы яе фарміравання пад час Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Роля этнічнай, моўнай і культурнай разнастайнасці ў сучасным грамадстве", якая адбылася ў г. Магілёве 29–30 мая 2014 г.[75] Удзел у падрыхтоўцы і правядзенні канферэнцыі прымалі – Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Еўрапейскі цэнтр па пытаннях меншасцей (European Centre for Minority Issues) з Германіі.

Высокім навуковым узроўнем і ўсебаковым асвятленнем нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў Савецкай Беларусі адзначаюцца калектыўныя выданні навуковых супрацоўнікаў Інстытута гісторыі і Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАНБ, якія пабачылі свет у апошнія некалькі год[76]. Адметнае месца сваёй грунтоўнасцю і падсумаваннем высноў сучасных даследаванняў займае калектыўная манаграфія "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст."[77].

У калектыўным даследаванні "Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе" сцвярджаецца, што нацыянальна-дзяржаўная палітыка, якая

---

72 *Никитенко П.Г.* Роль гуманитарных наук в формировании белорусской модели социально ориентированного устойчивого инновационного развития страны // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2007. Спецыяльны выпуск. С. 48.

73 Рэзалюцыя Першага з'езда вучоных Рэспублікі Беларусь // Там жа. С. 90.

74 *Каваленя А.А.* Дзяржаўнасць Беларусі: гісторыя і сучаснасць // Там жа. С. 72, 75.

75 Этнічная, моўная і культурная разнастайнасць у сучасным грамадстве : зборнік навуковых прац удзельнікаў Міжнар. навук.-практ. канф., 29–30 мая 2014 г., г. Магілёў / уклад. І.А. Пушкін; рэдкал.: Ю.М. Бубнаў (адк. рэд.). Магілёў, 2014.

76 Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В.К. Бандарчык, В.М. Белявіна, Г.І. Каспяровіч і інш. Мінск, 2001 ; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. Мінск, 2006 ; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2008 ; Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т.6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). Мінск, 2011.

77 Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М.У. Смяховіч і інш.; рэдкал.: А.А. Каваленя і інш. Мінск, 2012.

праводзілася ў БССР, мела на мэце ўмацаванне дзяржаўнасці ў савецкай форме, характарызавалася змаганнем партыйна-дзяржаўных органаў супраць любых праяў нацыянальнага руху і нацыянальнай выключнасці. Аўтары адзначылі, што літоўцы, латышы, немцы, палякі, яўрэі, эстонцы Беларусі праяўлялі высокую актыўнасць у самаарганізацыі і рэалізацыі сябе ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Адначасова падкрэсліўшы, што высокі ўзровень палітычнага ўдзелу, напрыклад у выбарах, меў у асноўным мабілізацыйны, а не добраахвотны характар[78].

Асобныя пытанні рэалізацыі нацыянальнай палітыкі, культурнага і асветнага жыцця нацменшасцей у БССР разглядаліся ў работах гісторыкаў у замежжы: А. Багровіча, Е. Глагоўскай, І. Касцюшкі, А. Кіпель, Я. Мірановіча, Н. Недасека, С. Станкевіча, А. Саковіча, В. Сянкевіча, А. Шчэсьняка і інш.[79] Цікавасць выклікаюць працы М. Іванова, П. Эберхардта, пра стан рэлігійнасці грамадства БССР – работы Р. Дзванкоўскага, Томаса Э. Бірда, А. Мартаса[80].

Гістарыяграфічны аналіз апублікаваных прац паказвае, што аўтары ў асноўным засяроджваюцца на дэмаграфічных аспектах, побыту, асобных баках сацыяльна-эканамічнага, культурна-асветніцкага жыцця нацыянальных меншасцей Рэспублікі Беларусь. Калі весці аналіз даследаванняў па асобных нацменшасцях, дык больш за ўсіх пашанцавала палякам, цыганам і яўрэям. Дзейнасць і роля палякаў даследаваліся С. Данскіх, М. Калацеем, Н. Улейчыкам, Т. Гавіным, Т. Кручкоўскім, І. Паповым, М. Гуменюком, І. Кабзінскай, У. Розенфельдам і М. Беспамятных, А. Садоўскім і інш. Яўрэйская тэматыка ў апошняе дзесяцігоддзе распрацоўвалася шырокім колам даследчыкаў, сярод якіх вылучаюцца В. Бацяева, Н. Бурая, Э. Іофе, Л. Лыч, У. Рубінчык, Л. Шкуцько і іншыя. Адносна малыя па колькасці этнічныя групы Беларусі – украінцы, латышы, літоўцы, немцы, татары, цыганы і іншыя народы – прадстаўлены ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі публікацыямі: Ю. Зяньковіча, Т. Кабржыцкай, Г. Калюжнай, Г. Курыловіч, В. Рагойшы, І. Канапацкага, А.-Б. Шабановіча, А. Орды, У. Тугая, Ю. Унуковіча, М. Беспамятных, Т. Горбач, Ю. Болатавай, Л. Дучыц, В. Жук, А. Зубарава, М. Калініна, М. Каралёва, Л. і Я. Піскун.

---

[78] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М.П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2008. С. 405, 224, 424.

[79] *Багровіч А.* Латгальцы – спрадвечныя суседзі // Запісы БІНІМ. Нью-Ёрк, 1976. № 14. С. 67–75; *Яго ж.* Жыхарства Беларускае ССР у святле перапісу 1959 г. Нью-Ёрк, Мюнхен, 1962 ; *Głogowska Helena.* Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki. Białystok, 1996 ; *Костюшко И.И.* Польское национальное меньшинство в СССР (1920-е годы). М., 2001 ; *Kipel A.* The American relief administration (ARA) in Byelorussia // Запісы БІНІМ. New York, 1978. № 16. С. 61–83 ; *Мірановіч Я.* Навейшая гісторыя Беларусі. Беласток, 1999 ; *Яго ж.* Wojna wszystkich ze wszystkimi Białoruś 1941–1944. Kraków, 2015 ; *Недасек Н.* Нацыянальнае самавызначэнне й Саветы // Беларускі зборнік. Кн. 11. Мюнхэн, 1959. С. 5–19 ; *Станкевіч Ст.* Нацыянальная палітыка Крэмля ў Беларусі // Беларускі зборнік. Кн. 1. Мюнхэн, 1955. С. 34–47 ; *Саковіч А.* Да гісторыі Беларускага Дзяржаўнага Унiверсiтэту // Запісы БІНІМ. Нью-Ёрк, 1954. № 1. С. 1–9 ; *Сяньkевіч В.* Да пытаньня польскае мяншыні на Беларусі // Запісы БІНІМ. New York, 1976. № 14. С. 76–84 ; *Szcześniak Andrzej Leszek.* Historia Polska i światnaszego wieki lata 1914–1990. Bydgoszcz, 1992.

[80] *Iwanow M.* Polacy w Związku Radzieckim w latach 1921–1939. Wrocław, 1990 ; *Эберхардт П.* Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1898–1989 / Пер. з польск. Ул.Люкевіча. Берасьце, 1997 ; *Dzwonkowski Roman.* Kościół Katolicki w ZSSR 1917–1939. Zarys historii. Lublin, 1997 ; *Thomas E. Bird.* Orthodoxy in Byelorussia: 1917–1980 // Zapisy BINIM. New-York, 1983. № 17. S. 144–208 ; *Мартос А.* Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Минск, 2000.

Неабходна падкрэсліць, што ў Беларусі выдадзены кнігі манаграфічнага зместу па асобных этнасах: латышах[81], паляках[82], татарах[83], яўрэях[84], азербайджанцах[85] у якіх, у ліку іншага, асвятляецца савецкі перыяд развіцця ўзгаданых супольнасцей, але ў цэлым па нацыянальных меншасцях маюцца абагульняючыя працы толькі аўтара дадзенага даследавання[86].

Трэба адзначыць, што ў распрацоўцы дадзенай тэмы існуюць пэўныя цяжкасці і складанасці. У першую чаргу, адсутнасць адназначных крытэрыяў для "этнанацыянальнай ідэнтыфікацыі пэўных групаў насельніцтва (беларускамоўных каталікоў, праваслаўных жыхароў беларуска-ўкраінскага і беларуска-рускага памежжаў)"[87], якія ў савецкі час па-ранейшаму разглядаліся палякамі, рускімі і г.д. Улічваючы значнасць і ролю яўрэйскага ў даваеннай і рускага этнасаў у пасляваеннай гісторыі Савецкай Беларусі, узнікае пытанне, а ці з'яўляюцца яны нацыянальнымі меншасцямі ў Беларусі.

Гістарыяграфічны аналіз апублікаваных прац засведчыў, што ў даследаваннях грамадскага і культурнага жыцця нацыянальных меншасцей Беларусі ў савецкі час адсутнічае сістэмнасць і не хапае параўнальнага аналізу. Асноўная ўвага скіравана на лічбавыя, колькасныя паказчыкі (статыстычныя дадзеныя) і жыццёвы шлях асоб пэўнай нацыянальнасці. Не ў поўным аб'ёме раскрыты такія важныя пытанні, як стварэнне і дзейнасць не савецкіх грамадскіх арганізацый, грамадскае і культурнае развіццё ў 1945–1991 гг., прычыны і шляхі захаванасці нацыянальнай ідэнтычнасці і перадумоў нацыянальнага адраджэння, роля і значэнне нацыянальных меншасцей у кансалідацыі грамадства, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі.

Такім чынам, існуючыя навуковыя працы закранаюць толькі пэўныя аспекты даследуемага пытання, яны не вычэрпваюць усёй глыбіні тэмы. Толькі выкарыстанне новага дакументальнага матэрыялу, а таксама комплексны, крытычны аналіз усіх груп крыніц (архіўных і апублікаваных) дазваляе

---

[81] *Тугай У.В.* Латышскі этнас у сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці Беларусі. Мінск, 2003 ; *Яго ж.* Латышы на Беларусі. Мінск, 1999 ; Латвия–Беларусь: 1918–2018 : [коллективная монография] / редкол. М. Королёв (гл. ред.) и др. Минск, 2018.

[82] *Gawin T.* Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności. Białystok, 2007.

[83] *Думін С.У., Канапацкі І.Б.* Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993 ; *Канапацкі І.Б., Смолік А.І.* Гісторыя і культура беларускіх татар. Мінск, 2000; *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). Мінск, 2007.

[84] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси: Краткий науч.-попул. очерк. Минск, 1996 ; История могилевского еврейства : Документы и люди : науч.-попул. очерки и жизнеописания. В 2 кн. Кн. 2, ч. 3. Могилев, 2011 ; *Лыч Л.* Яўрэйская культура Беларусі – яе агульны духоўны набытак. Мінск, 2012 ; *Смиловицкий Л.Л.* Евреи в Турове: история местечка Мозырского Полесья. Иерусалим, 2008 ; *Smilovitsky L. L.* Jewish Life in Belarus. The final decade of the Stalin regime, 1944–1953. Budapest–New York, 2014.

[85] *Ганбаров Б.А.* Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь: организационная структура, социально-экономическое положение и основные направления деятельности (1989–2013 г.). Минск, 2014.

[86] *Пушкін І.А.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.): манаграфія. Магілёў, 2004 ; *Яго ж.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія. Магілёў, 2007 ; Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.) : манаграфія. Мінск, 2010.

[87] *Рудовіч С.* Этнапалітычная гісторыя Беларусі пачатку 20 ст.: праблемы даследавання // Гістарычны альманах. Т 4. Гародня, 2001. С. 107.

стварыць агульную карціну ўдзелу і ролі нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурным жыцці ў навейшай гісторыі Беларусі.

Адсутнасць у беларускай гістарыяграфіі спецыяльнай працы, прысвечанай удзелу нацыянальных меншасцей у грамадскім культурна-асветніцкім жыцці Савецкай Беларусі, абумовіла ў свой час імкненне распачаць дадзенае даследаванне, якое выконвалася ў межах рэалізацыі Дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў: “Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі” на 2011–2015 гг. падпраграмы “Гісторыя, матэрыяльная і духоўная культура беларускага народа”, тэмы навукова-даследчых прац ”Роля нацыянальных меншасцей у забеспячэнні ўстойлівага паступальнага развіцця беларускага грамадства ў навейшай гісторыі Беларусі”[88] і “Рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей ў перыяд станаўлення і развіцця БССР (1920–1930-я гг.)”[89]; “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” на 2016–2020 гг. (навуковы кіраўнік – член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя) падпраграмы № 1 “Гісторыя і культура” (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. В. Даніловіч), задання 01.03.03 “Беларусь у гістарычным працэсе: сацыяльна-эканамічныя трансфармацыі і грамадская-культурныя змены (канец XVIII – пачатак XXI ст.)” (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. У. Смяховіч), тэма НДП “Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР ва ўмовах адзінага народнагаспадарчага комплексу (1944–1991 гг.)”[90].

### 1.2 Крыніцы

Крыніцавая база даследавання фарміравалася аўтарам зыходзячы з мэты найбольш поўнага раскрыцця даследуемай тэмы. Выкарыстоўваліся як апублікаваныя, так і архіўныя крыніцы.

У дачыненні да тэмы пэўную каштоўнасць уяўляюць выданні 1920–30-х гадоў, якія адначасова з’яўляюцца крыніцамі. Палітыка партыйна-дзяржаўных органаў Савецкай Беларусі гэтага часу ў галіне дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва знайшла адлюстраванне ў зборніках матэрыялаў і дакументаў[91]. Сярод іх вылучаюцца дзве часткі матэрыялаў па тэме “Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР”, у якіх утрымліваецца шмат фактаў і высноў аб дзейнасці нацменшасцей БССР[92].

У 1920-я гады асобныя бакі жыцця літоўцаў і латышоў даследаваны ў працах В. Скардзіса, К. Шкільтэра, аналіз рэвалюцыйнай дзейнасці яўрэяў

---

[88] Нумар дзяржрэгістрацыі 20112416, навуковы кіраўнік – к. г. н., дацэнт І.А. Пушкін.

[89] Нумар дзяржрэгістрацыі 20141458, навуковы кіраўнік – к. г. н., дацэнт І.А. Пушкін.

[90] Нумар дзяржрэгістрацыі 20161498, навуковы кіраўнік – к. г. н., дацэнт І.А. Пушкін.

[91] Два гады нацыянальнай работы ў БССР: Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні. Менск, 1929 ; Решения и резолюции ВКП(б) и КП(б)Б по национальному вопросу. Минск, 1926 і інш.

[92] Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. Да X гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менск, 1928. Ч. 1 ; Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч 2: Работа среди нац. меншинств в БССР. Минск, 1928.

зроблены ў работах С. Агурскага і іншых[93]. Дасягненні ў сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і нацыянальна-культурным будаўніцтве адлюстраваны як у абагульняючых працах 1930-х гадоў, так і ў работах С. Вальфсона, Х. Дунца, Л. Майзеля, Ю. Майзеля, С. Малініна, Я. Ракава і інш.[94]

Асобнае месца займаюць справаздачы, рэзалюцыі і пастановы з'ездаў камуністычнай партыі і Саветаў рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўню, якія дазваляюць прасачыць асноўныя кірункі рэалізацыі асноў нацыянальнай палітыкі кіруючых колаў БССР у справе забеспячэння грамадскага і культурнага жыцця нацменшасцей, іх ролі ў агульнабеларускіх працэсах[95]. Выкарыстоўваліся апублікаваныя: фактычны матэрыял, які дазваляе шляхам аналізу статыстыкі засведчыць ролю нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным і культурным жыцці[96]; зборнікі дакументаў[97]; перыядычны друк, які разглядаецца

---

[93] *Скардзіс В.* Літоўцы на Беларусі // Наш край. 1929. № 6–7. С. 10–25 ; *Шкільтэр К.* Латышскія калоніі на Беларусі: гістарычнае развіццё латышскіх сялянскіх гаспадарак. Менск, 1931 ; *Агурский С.Х.* Еврейский рабочий в коммунистическом движении (1917–1921). Минск, 1926.

[94] Ітогі і бліжэйшыя задачы правядзення Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР / Пастанова аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. Менск, 1934 ; *Вольфсон С.Я.* Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні: Нацыянальна- культурнае будаўніцтва БССР да XV стагоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Менск, 1932 ; *Дунец Х.* Супроць сац. – фашысцкага "Бунду" і супроць ідэалізацыі бундызму! Менск, 1932 ; *Майзель Л., Майзель Ю.* Десять лет борьбы и строительства: 1920–11 июля 1930г. (к разрешению национального вопроса в БССР). Москва–Харьков–Минск,1930 ; *Малінін С.Н., Ракаў Я.Г.* Што дала савецкая ўлада працоўным БССР. Мінск, 1939.

[95] Дзейнасць ураду БССР за 1926–1927 год. Менск, 1928 ; III Всебелорусский Съезд Советов Рабочих, Крестьянских и Красноармейских депутатов: Резолюции и постановления. Минск, 1921 ; Мястэчкі БССР у рэканструкцыйны перыяд. Мінск, 1932 ; Постановления пятого Всебелорусского съезда Советов. Минск, 1924 ; Рэзалюцыі і пастановы 3-га Акруговага З'езда Саветаў Віцебскай Акругі 21–27.04.29 г. Віцебск, 1929 ; Рэзалюцыі і пастановы 3-га Акруговага З'езда Саветаў Менскай Акругі 17–23 красавіка 1929 г. Менск, 1929 ; Рэзалюцыі IV Пленуму Аршанскага АК КП(б)Б (18–20 верасня 1929). Ворша, 1929 ; Рэзалюцыі IV-га Пленуму Аршанскага Акруговага Выканаўчага Камітэту 2-га скліканьня 2–4 красавіка 1928 г. Ворша, 1928 ; Декреты Советской власти. Т. 1. М., 1957.; Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства. Систематический сборник важнейших декретов. 1917–1920. М., 1920 ; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. Минск, 1983 ; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 12. 1971–1975. М., 1986 ; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 13. 1976–1980. М., 1986 ; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Т. 14. 1981–1984. М., 1987 ; БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне (11). Сесія (8). Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1988 ; БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне, 11-е. Сесія, 1-я. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1985 ; Сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Стэнаграфічныя справаздачы. Мінск, 1972–1989 ; Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання 22–23 чэрвеня 1972 года. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1972 і інш.

[96] Всесоюзная перепись населения 1926 года: Предварительные итоги. М., 1927. Т.X ; Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР 1919–1929. Минск, 1929 ; Всесоюзная перепись населения 1926 года: Предварительные итоги. Москва, 1928. Т. XXVII ; Натуральны рух насельніцтва БССР за 1927. Менск, 1930 ; Всесоюзная перепись населения 1937 года: Общие итоги. Сборник документов и материалов. М., 2007 ; Итоги Всесоюзной переписи населения 1970 года в 7 т. Т. IV. М., 1972 ; Численность и состав населения СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1979 г. М., 1984 ; Население СССР: По данным Всесоюз. переписи населения 1979 г. М., 1980 ; Население СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. М., 1990 ; Служачыя дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату БССР (Па матэрыялах перапісу служачых кіраў. апарату на 01.10.1929 г.). Менск, 1930 ; Статыстыка друку БССР за 1932 год. Б. М., 1932 ; Яўрэі на Беларусі. Статыстычныя матэрыялы. Менск, 1930 ; Ленинский комсомол Белоруссии в цифрах и фактах 1920–1980. Минск, 1980 ; Административно-территориальное устройство БССР: Справочник. В 2-х т. Т. 1 (1917–1941 гг.). Минск: Беларусь, 1985 ; Биографический справочник Белорусская ССР: Крат. энциклопедия Т. 5. Минск, 1982 ; Народное хозяйство СССР за 70 лет: Юбилейный стат. ежегодник. М., 1987 ; Народное хозяйство СССР в 1970 году: Стат. ежегодник. М., 1971 ; Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975 г.: стат. ежегод. Минск, 1975 ; Народное хозяйство Белорусской ССР. Минск, 1965 ; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1980 г. Стат. ежегод. Минск, 1981 ; Народное хозяйство Белорусской ССР : статистический сборник. – М., 1957 і інш.

асобна як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц. Упрыватнасці для асвятлення штодзённага жыцця выкарыстоўваліся фактычныя матэрыялы з перыядычных выданняў са збору Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі[98].

Абапіраючыся на класіфікацыі, якія існуюць у гістарычнай навуцы, увесь комплекс выкарыстаных у даследаванні архіўных крыніц можна сістэматызаваць, улічваючы тыпавыя і відавыя характарыстыкі, наступным чынам: статыстычныя пісьмовыя дакументальныя крыніцы (даныя перапісу насельніцтва), справаводчыя дакументальныя планава-справаздачныя (дакладныя запіскі і справаздачы) і распарадча-арганізацыйныя (распараджэнні, загады і пастановы) крыніцы, даведачна-інфармацыйная дакументацыя (перапіска), справаводчыя пісьмовыя дакументальныя крыніцы кадравага характару (спісы асабовага складу).

Для вывучэння прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі, вызначэння заканадаўча замацаваных формаў і метадаў іх грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці аўтарам выкарыстоўваліся нарматыўна-прававыя дакументы (дакументы ўсесаюзных і рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, загады, пастановы і іншыя дакументы ўнутрыведамаснага значэння), крыніцы, што належаць да галіны дэмаграфічнай статыстыкі (матэрыялы перапісаў насельніцтва БССР, статыстычныя даведнікі і справаздачы). Крыніцай для даследавання грамадскага і культурнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі з’яўляюцца матэрыялы справаводства дзяржаўных органаў (планы, справаздачы, даведкі, інфармацыі, пратаколы пасяджэнняў, палажэнні аб правядзенні, планы, праграмы, звесткі аб удзельніках, перапіска з арганізацыямі і грамадзянамі), якія змяшчаюць інфармацыю аб тых мерапрыемствах этнакультурнай накіраванасці, якія праводзіліся пры падтрымцы дзяржаўных органаў. Афіцыйная перапіска падзяляецца на перапіску з вышэйстаячымі арганізацыямі (Урадам, міністэрствамі і г. д.) і перапіску з грамадзянамі і арганізацыямі. Першыя інфармавалі вышэйстаячыя органы аб этнакультурнай сітуацыі ў рэгіёнах і ў рэспубліцы ў цэлым, праведзеных грамадскіх і культурна-масавых мерапрыемствах. Аналіз дакументаў другой групы дазваляе вызначыць этнакультурныя патрэбы нацыянальных меншасцей.

---

[97] “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…”. Верасень 1939 г. – 1956 г.: дакументы і матэрыялы. У 2 кн. Кн. 1. Верасень 1939 г. – 1941 г. / склад.: У.І. Адамушка і інш. Мінск, 2009 ; Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы 1918–1941. Минск, 1978 ; Бунд в Беларуси. 1897–1921. Документы и материалы / Сост. Э.М. Савицкий. Минск, 1997 ; Книга погромов. Погромы на Украине, в Белоруссии и европейской части России в период Гражданской войны. 1918–1922 гг. : Сборник документов. М., 2007 ; Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т. 1. Мінск, 1976 ; Народное образование в БССР: Сб. докум. и матер. Мінск, 1979 ; Образование и развитие Союза Советских Социалистических Республик (в документах). М., 1973 ; Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах / Авт.-сост.: Р.П. Платонов и др. Минск, 2001 ; По воле народа: Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии: Док. и материалы / Сост. М.Ф. Шумейко и др. Минск, 1988 ; Съезды Советов Союза ССР, союзных и автономных советских социалистических республик: Сборник документов. 1917–1936. В 3-х т. Т. III. М., 1960 і інш.

[98] Саха і молат (1919–1922), Штэрн (1928–1930), Gwiazda Młodzieży (1926–1928), Orka (1926–1928), Новый путь. Бобруйск (1942–1943), Новый путь. Могилёв (1943), Байрам. Татары на зямлі Беларусі (1991), Głos znad Niemna (1991–1994).

У працы былі выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва (Lietuvos centrinis valstybės archyvas), Літоўскага дзяржаўнага новага архіва (Lietuvos valstybės naujasis archyvas), аддзела рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы (Lietuvos moksli akademijos Vrublevskių biblioteka Rankraščių skurius), Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, Расійскага дзяржаўнага архіва навейшай гісторыі, Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі.

Аснову дадзенага даследавання склалі пісьмовыя дакументальныя крыніцы, якія захоўваюцца ў НАРБ: дакументы Цэнтральнага камітэта КП(б)Б (фонд 4 п), Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР (фонд 6), Савета Міністраў БССР (фонд 7), Народнага камісарыята асветы БССР (фонд 42), Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ (фонд 63), Народнага камісарыята РСІ БССР (фонд 101), Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў БССР (фонд 265), Рады народных міністраў Народнага сакратарыята Беларускай Народнай Рэспублікі (фонд 325), Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР (фонд 701), Мазырскага і Гомельскага камітэта усеагульнага яўрэйскага рабочага саюзу "БУНД" (фонды 2651 і 4604), Гомельскай арганізацыі "Югенд-Бунд" (фонд 4311).

Выкарыстаныя матэрыялы ДАБр складаюцца з дакументаў: Брэсцкага абкама КП(б)Б (фонд 1), Брэсцкага павятовага староства Палескага ваяводства (фонд 2), камандавання акругі корпуса № 9 Міністэрства ваенных спраў (фонд 67), Брэсцкай павятовай камендатуры дзяржаўнай паліцыі МУС Польшчы (фонд 93), Брэсцкага аддзела рускага дабрачыннага таварыства ў Польшчы (фонд 114), Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій пры Савеце міністраў СССР па Брэсцкай вобласці (фонд 210), статыстычнага ўпраўлення Брэсцкай вобласці цэнтральнага статыстычнага упраўлення (ЦСУ) пры Савеце Міністраў БССР (фонд 254), Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта (фонд 815), Упаўнаважанага Савета па справах рускай праваслаўнай царквы пры СМ СССР па Брэсцкай вобласці (фонд 1482), Пінскага павятовага староства Палескага ваяводства (фонд 2001), Баранавіцкага і Пінскага абкамаў КПБ (фонды 7580 і 7581).

Пры напісанні манаграфіі выкарыстоўваліся крыніцы з фондаў ДАВц: Віцебскага губернскага савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчага камітэта (фонд 56), Віцебскага абласнога камітэта КПБ (фонд 1-п), выканаўчага камітэта Віцебскага акруговага савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (фонд 118), Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта савета народных дэпутатаў (фонд 1966), аддзела народнай адукацыі выканаўчага камітэта Віцебскага абласнога савета дэпутатаў працоўных (фонд 2797), Віцебскага вытворчага ўпраўлення мясцовай

прамысловасці Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта (фонд 2856), Віцебскага губернскага камітэта РКП(б) (фонд 10050), Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б (фонд 10051).

У матэрыялах ДАГом вылучаецца дакументацыя: Гомельскага губернскага выканаўчага камітэта Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў (фонд 24), Гомельскага губернскага аддзела народнай адукацыі (фонд 60), Гомельскага абласнога савета дэпутатаў працоўных і яго выканаўчага камітэта (фонд 1174). Выкарыстаны фонды ДАГАГом: Гомельскага губернскага камітэта УсеКП(б) (фонд 1), Гомельскага губернскага камітэта ВЛКСМ (фонд 7), Гомельскага абласнога камітэта КП(б)Б (фонд 144), Гомельскага гаркама КПБ (фонд 265), Юравіцкага і Нараўлянскага райкамаў КП(б)Б (фонд 72 і 4286).

Важнай крыніцай для даследавання з'яўляюцца фонды Гродзенскіх архіваў: ДАГАГр – Гродзенскага абласнога камітэта КП(б)Б (фонд 1) і Беластоцкага абкама КП(б)Беларусі (фонд 6195); ДАГр – аддзела народнай адукацыі Гродзенскага аблвыканкама (фонд 730) і Гродзенскага абласнога савета дэпутатаў працоўных і яго выканкама (фонд 1171).

У працы былі выкарыстаны матэрыялы ДАГАМаг: Магілёўскага абкама кампартыі Беларусі (фонд 9), Бабруйскага абласнога камітэта КПБ (фонд 4317), Бабруйскага павятовага камітэта КП(б)Б (фонд 6573), Бабруйскага акруговага камітэта КП(б)Б (фонд 6575), Магілёўскай АКК-РСІ (фонд 6576), Магілёўскага акруговага камітэта КП(б)Б (фонд 6577), Магілёўскага ГК/РК КП(б)Б (фонд 6580), Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б) (фонд 6592), Калінінскага акруговага камітэта КП(б)Б (фонд 6601), Магілёўскага павятовага камітэта РКП(б) (фонд 6622).

У манаграфіі шырока ўжываліся дакументы ДАМаг: Магілёўскага павятовага прамысловага аддзела (фонд 2), Магілёўскага абласнога савета народных дэпутатаў і яго выканаўчага камітэта (фонд 7), выканаўчага камітэта Магілёўскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных (фонд 11), Магілёўскага акруговага аддзела народнай адукацыі (фонд 121), Магілёўскага раённага СВБ (фонд 131), Магілёўскага міжраённага яўрэйскага суда (фонд 153), Магілёўскага акруговага савета прафесійных саюзаў (фонд 244), Магілёўскай абласной камісіі садзейнічання працы надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па ўстанаўленню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых і ўліку страт, якія былі імі нанесены Магілёўскай вобласці (фонд 306), Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага і настаўніцкага інстытутаў Міністэрства асветы БССР (фонд 927), Магілёўскага абласнога савета прафсаюзаў (фонд 1027), Калінінскага акруговага аддзела народнай адукацыі (фонд 1258), Магілёўскага абласнога камітэта прафсаюза работнікаў дзяржустаноў (фонд 2315), Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР па Магілёўскай вобласці (фонд 2340); дакументаў акупацыйных устаноў Магілёўскага гарадскога ўпраўлення: агульна-адміністратыўнага, народнай адукацыі, медыка-санітарнага, прамысловага,

мастацтваў, епархіяльнага аддзелаў (фонды 259, 260, 263, 264, 271, 272, 274, 282, 289).

У працы былі выкарыстаны некаторыя дакументы з калекцыі аддзела рукапісаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні БДАМЛМ (фонд 3), фонда А. Луцкевіча аддзела рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы (фонд 21) і дзяржаўных архіваў Літоўскай Рэспублікі: LCVA – Упаўнаважанага савета па справах рэлігій пры СМ СССР па Літоўскай ССР (фонд R-181), Беларускага Нацыянальнага Камітэта ў г. Вільнюсе (фонд 306), Беларускай сялянска-работніцкай партыі (грамада) і Беларускага пасольскага клуба ў парламенце Польшчы (фонд 365), Міністэрства беларускіх спраў у Літве (фонд 395), Рады Народных Міністраў БНР (фонд 582), Міністэрства адукацыі Літоўскай ССР (фонд R-762); LVNA – Дзяржаўнага камітэта рэгіянальных праблем (фонд 77), дэпартамента па нацыянальных меншасцях і літоўцам замежжа пры Урадзе Літоўскай Рэспублікі (фонд 78).

Важнай крыніцай для даследавання былі матэрыялы шэрагу Расійскіх дзяржаўных архіваў. У прыватнасці ДАРФ: Савета па справах рэлігій пры СМ СССР (фонд Р-6991), яўрэйскага антыфашысцкага камітэта (фонд Р-8114), парламенцкай групы СССР (фонд Р-9497), усеагульнага таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэяў (АЗЕТа) (фонд Р-9498), яўрэйскага таварыства аказання дапамогі пацярпелым ад вайны і пагромаў (фонд Р-9538); з'езда народных дэпутатаў СССР, Вярхоўнага Савета СССР і іх органаў: камітэтаў і камісій ВС СССР, пастаянных камісій палат ВС СССР, Сакратарыята і Прэзыдыума ВС СССР, яго камітэтаў і камісій (фонд Р-9654).

Выкарыстоўваліся матэрыялы: РДАНГ – пленумаў ЦК УсеКП(б)–ЦК КПСС (фонд 2), аддзелаў партыйных органаў, прапаганды і агітацыі ЦК КПСС па саюзных рэспубліках, ідэалагічнага і іншых апарата ЦК КПСС (фонд 5), калекцыі рассакрэчаных дакументаў (фонд 89); РДАСПГ – Цэнтральнага Камітэта КПСС (фонд 17), польскага бюро агітацыі і прапаганды пры ЦК УсеКП(б) (фонд 63), арганізацыі Паалей – Цыон у СССР (фонд 272).

Такім чынам, шырокае выкарыстанне разнастайных крыніц, іх аналіз дазваляе верыфікаваць гістарычныя факты і зрабіць адпаведныя высновы, якія прадстаўлены ў наступных главах манаграфіі.

### 1.3 Метады і метадалогія даследавання

Дадзеная манаграфія была напісана з улікам сучасных метадалагічных падыходаў (прынцыпаў). У ёй выкарыстаны як агульна-навуковыя метады, так і спецыяльна-гістарычныя, якія адлюстроўваюць спецыфіку гістарычнага пошуку.

Метадалагічную базу даследавання склалі такія прынцыпы гістарычнай навукі, як *гістарызм і аб'ектыўнасць.* Згодна з *прынцыпам гістарызма* грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей разглядаліся ў развіцці ў кантэксце сацыякультурнай і палітычнай сітуацыі, якая склалася ў Савецкай Беларусі ў 1919–1991 гг. *Прынцып аб'ектыўнасці* абумовіў выкарыстанне шырокага спектра апублікаваных і архіўных крыніц, навуковай літаратуры, аналіз якіх дазволіў выявіць найбольш аб'ектыўныя і

даказаныя факты аб працэсах грамадска-палітычнага і культурна-асветніцкага жыцця нацыянальных меншасцей у Беларусі ў савецкі перыяд з улікам *каштоўнаснага* падыходу ў гісторыі. Паколькі аб'ектам гістарычнага даследавання выступае мінулае нашага грамадства, то навуковае яго вывучэнне будзе абавязкова ўключаць адпаведнае стаўленне навукоўца да прадмета даследавання. Трэба адзначыць, што з каштоўнасным падыходам звязана рэалізацыя некаторых сацыяльных функцый гістарычнай навукі: сацыяльнай памяці, пазнаваўчай і выхаваўчай функцый. Вывучэнне праблематыкі, акрэсленай у тэме манаграфіі, мае на мэце спрыяць нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву, захаванню адзінства і талерантнасці беларускага грамадства і міжнацыянальнай згоды ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь.

Даследаванне было выканана с выкарыстаннем агульнанавуковых (аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, тыпалагізацыя, параўнанне, аналогія, класіфікацыя) і спецыяльна-гістарычных (гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-параўнальны і гісторыка-сістэмны) метадаў.

У працы шырока ўжываўся метад *класіфікацыі* пры выдзяленні па адпаведных прыкметах асобных груп нацыянальных меншасцей, якія ўдзельнічалі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці БССР. Асабліва карысным дадзены метад быў пры класіфікацыі нацыянальных меншасцей па сацыяльнай прыкмеце, пры рэканструкцыі стварэння і дзейнасці іх грамадскіх аб'яднанняў, розных формаў па-за культавай дзейнасці, а таксама пры класіфікацыі на падставе займаемых пасад і выконваемых функцый у БССР.

На ўсіх этапах даследвання аўтарам выкарыстоўваўся *гісторыка-генетычны метад*. На аснове гістарыяграфіі і крыніцавай базы збіраліся факты аб грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей. Аналіз і абагульненне дадзеных фактаў дазволілі разглядзець грамадскую і культурна-асветніцкую дзейнасць нацыянальных супольнасцей у працэсе станаўлення і развіцця, прасачыць паступовую эвалюцыю яе інстытутаў, метадаў і формаў ажыццяўлення, вылучыць знешнія фактары, што ўплывалі на грамадскае і культурнае развіццё нацыянальных меншасцей у 1919–1991 гг.

*Гісторыка-тыпалагічны метад* у працы меў месца пры выпрацоўцы яе структуры, унутранай пабудовы, пры групоўцы і тыпалагізацыі гістарычных крыніц. Яго выкарыстанне дазволіла вызначыць асноўныя кірункі ў грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей. З дапамогай *гісторыка-параўнальнага метада* ўдалося параўнаць ступень актыўнасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей заходніх і ўсходніх абласцей Беларусі, пры рэалізацыі розных накірункаў грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці, іх удзелу ў савецкім будаўніцтве, у розных формах і метадах барацьбы супраць гітлераўскіх акупантаў і г.д., развіццё нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі. Ён быў карысным і пры супастаўленні нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі СССР і БССР у дачыненні да розных нацыянальнасцей Беларусі.

Прымяненне *гісторыка-сістэмнага метада* для вывучэння градаскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей патрабавала разгляду яе як адкрытай сістэмы, часткі сацыякультурнай і грамадска-палітычнай прасторы

Савецкай Беларусі, якая мела пэўную структуру, будову і функцыі. Развіццё гэтай сістэмы ажыццяўлялася як за кошт унутраных крыніц (імкненне этнафораў да захавання ўласнай самабытнасці як комплекса культурных кампанентаў і перадачы іх наступным пакаленням), так і пад уплывам знешніх фактараў (дэмаграфічных працэсаў, палітыкі дзяржавы, міжнароднага становішча). Гісторыка-сістэмны метад даў магчымасць правесці элементарна-структурны і функцыянальны аналіз грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей, што дапамагло вызначыць іх інстытутыцыйную будову, знешнія і ўнутраныя функцыі (этнакансалідуючая, культуратворчая, выхаваўчая і асветніцкая, адукацыйная), канкрэтныя формы іх ажыццяўлення.

Пры выяўленні прычын адпаведнага стаўлення нацыянальных меншасцей да тагачаснай партыйна-дзяржаўнай палітыкі, савецкага будаўніцтва, розных форм і метадаў грамадскай дзейнасці прымяняўся *рэтраспектыўны метад* даследавання.

Падчас даследавання разам з традыцыйнымі спецыяльна-гістарычнымі метадамі прымяняліся і нетрадыцыйныя метады, якія, у адрозненне ад вышэйпазначаных, рэдка выкарыстоўваюцца ў гістарычным аналізе, – гэта колькасныя метады, а менавіта метад *колькаснага аналізу.* Ён дазволіў упарадкаваць колькасныя даныя, атрыманыя пры дапамозе кантэнт-аналізу, якія датычацца займаемых нацыянальнымі меншасцямі пасад у партыйным, савецкім і гаспадарчым кіраўніцтве.

Такім чынам, выкарыстаны метадалагічны інструментарый у даследаванні дазволіў выканаць пастаўленыя ў ім задачы для дасягнення пастаўленай мэты.

# ГЛАВА 2
# НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСКАЙ ССР І СТАН НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

Савецкая нацыянальная палітыка характарызавалася тым, што, з аднаго боку, яна прызнавала факт існавання нацый і народаў у СССР і ў пэўнай ступені садзейнічала іх развіццю ў межах савецкіх рэспублік, а з другога – і гэта было асноўнай праграмнай і перспектыўнай задачай – праводзілася палітыка на зліццё нацый і народнасцей, нівеліроўку іх нацыянальных асаблівасцей. Больш за тое, вялікая ўвага надавалася з боку кампартыі і дзяржавы фарміраванню савецкага народа як новай супольнасці людзей, а затым мелася на ўвазе стварэнне адзінага сусветнага грамадства з сацыялістычнай і камуністычнай арыентацыяй[99].

## 2.1 Этнічная структура і нацыянальна-культурная ідэнтыфікацыя насельніцтва Беларусі

Бытавое ўспрыманне тэрміна "нацыянальная меншасць" бярэ пачатак яшчэ з дарэвалюцыйнай Расіі: "нацыянальныя меншасці" – гэта ўсе "нярускія", прычым тэрмін меў ярка выяўленую негатыўную афарбоўку. З прыходам да ўлады бальшавікоў нацыянальныя меншасці спачатку атрымалі надзвычай шырокія правы: так, яшчэ ў Дэкларацыі правоў народаў Расіі ад 02.11.1917 г. было прапісана "свабоднае развіццё нацыянальных меншасцяў і этнаграфічных груп, якія насяляюць тэрыторыю Расіі", што дало многія паўнамоцтвы ўкраінцам, палякам, яўрэям, немцам, балгарам і г.д. Аднак у 1930-я гг. улада ўзяла курс на зліццё нацый на аснове працоўнага класа, і праблемы нацыянальных меншасцей прыкметна адышлі на другі план. У 1970-я гг. перад прыняццем у 1977 г. новай Канстытуцыі СССР паняцце "нацыянальныя меншасці" зноў набыло актуальнасць. Пад нацыянальнымі меншасцямі сталі мець на ўвазе "некарэннае насельніцтва СССР" (карэйцы, немцы, балгары і г.д.) – усяго каля 0,5 % насельніцтва.

У СССР нацыянальнасці супрацьпастаўляліся народнасці. Да нацыянальнасцей адносілі: тытульныя народы саюзных рэспублік (украінцы, беларусы, малдаване і інш.), тытульныя народы аўтаномных рэспублік СССР, аўтаномных абласцей і нацыянальных акругаў (яўрэі, алтайцы, адыгейцы і інш.), этнічныя групы, якія валодалі агульнай самасвядомасцю, мовай і паходжаннем (цыганы, іжорцы, тафалары і інш.), грамадзян замежных дзяржаў (югаславы, французы, румыны і інш.), у рэдкіх выпадках да адной нацыянальнасці адносілі грамадзян розных дзяржаў, якія мелі агульнае паходжанне, саманазву і мову (арабы, карэйцы, немцы і інш.). У той жа час шэраг этнічных груп не вылучаліся асабна і аб'ядноўваліся з іншымі роднаснымі нацыянальнасцямі: паморы і казакі з рускімі, русіны з украінцамі, сваны з грузінамі, латгальцы з латышамі (аднак у 1926 г. латгальцы лічыліся асобнай нацыянальнасцю), сэту з эстонцамі, людзікі з

[99] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе. Мінск, 2008. С. 543.

карэламі, крашэны з татарамі, водзь з іжорцамі. Да народнасцей адносіліся малалікія народы Поўначы (ітэльмены, алеўты, эвены і інш.), Дагестана (аварцы, агулы, цахуры і інш.) і да т.п.

Пад нацыяй у савецкай краіне разумеўся любы этнас у складзе дзяржавы. Гэта было звязана з паліттэхналагічнай неабходнасцю выкарыстоўваць права нацый на самавызначэнне для барацьбы з поліэтнічнымі краінамі капіталістычнага свету.

Паводле перапісаў, на тэрыторыі Савецкай Беларусі пражывала больш за 130 нацыянальнасцей і народнасцей. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей разам з беларусамі з першых дзён удзельнічалі ў будаўніцтве сацыялістычнага грамадства.

Табліца 1 – Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі па матэрыялах перапісаў (у працэнтах)[100]

| Этнас / год | 1926 г. | 1939 г. | 1959 г. | 1970 г. | 1979 г. | 1989 г. | 1999 г. | 2009 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 80,6 | 82,9 | 81,1 | 81,0 | 79,4 | 77,9 | 81,2 | 83,7 |
| Рускія | 7,7 | 6,6 | 8,2 | 10,4 | 11,9 | 13,2 | 11,4 | 8,3 |
| Палякі | 2,0 | 1,0 | 6,7 | 4,3 | 4,2 | 4,1 | 3,9 | 3,1 |
| Украінцы | 0,6 | 1,9 | 1,7 | 2,1 | 2,4 | 2,9 | 2,4 | 1,7 |
| Яўрэі | 8,2 | 6,7 | 1,9 | 1,6 | 1,1 | 1,1 | 0,3 | 0,1 |
| Іншыя | 0,9 | 0,9 | 0,4 | 0,6 | 0,8 | 0,8 | 0,8 | 3,1 |

Групавая катэгарызацыі насельніцтва па эксклюзіўнай этнічнай прыкмеце пачалася з перапісу насельніцтва СССР 1926 г. і этнанацыянальнасць была затверджена як усеагульны атрыбут асобы. Нацыянальнасць грамадзян у Савецкім Саюзе (не іншаземцаў) вызначалася не дзяржаўнай, культурнай, рэлігійнай ці моўнай прыналежнасцю, а кроўным паходжаннем – “нацыянальнасцю” бацькоў – і была абавязковым пунктам грамадзянскага пашпарта, пасведчання аб нараджэнні, а таксама масы іншых савецкіх уліковых дакументаў. У “Асабовым лістку па ўліку кадраў” пашпартных органаў МУС СССР, на падставе якога запаўняўся і выдаваўся пашпарт, “нацыянальнасць” з’яўлялася пятай графой. Пры атрыманні першага грамадзянскага пашпарта ў шаснаццацігадовым узросце грамадзянін павінен быў паказаць сваю нацыянальнасць. Калі ён нарадзіўся ў аднанацыянальнай сям’і, то ў пятую графу запісвалася нацыянальнасць бацькоў, калі ў змяшанай, то па 1975 г. запісвалася нацыянальнасць бацькі. Пачынаючы з новага Палажэння аб пашпартах СССР (1974)[101] з 1975 г. стаў магчымы выбар паміж нацыянальнасцю маці і бацькі. Грамадзянін аднак меў права рабіць гэты выбар толькі адзін раз у жыцці – пры атрыманні свайго першага пашпарта. У выпадку цяжкасці ў выбары паміж нацыянальнасцю бацькі або маці пашпартныя органы

[100] 1926, 1939 гг. без заходніх абласцей Беларусі.

[101] Пастанова СМ СССР № 677 ад 28.08.1974 г. аб зацвярджэнні Палажэння “Аб пашпартнай сістэме ў СССР” // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 10. Спр. 112. Арк. 59.

ўнутраных спраў рэкамендавалі запісваць як і да 1975 г. – нацыянальнасць бацькі. Пры гэтым моўны фактар ніякага ўплыву не меў, так як з'явіўся феномен грамадзян СССР, якія не валодалі сваёй нацыянальнай мовай.

**Нацыянальнасці БССР і спецыфіка іх сацыяльнай структуры ў 1920–1930-я гг.** Нацыянальны склад БССР у міжваенныя дзесяцігоддзі быў наступны:

а) паводле перапісу 1926 года ў рэспубліцы жыло 4982240 чал., з іх : беларусаў – 80,6 %, яўрэяў – 8,2 %, рускіх – 7,7 %, палякаў – 1,92 %, украінцаў – 0,69 %, латышоў – 0,3 %, немцаў – 0,15 %, літоўцаў – 0,14 %, татараў – 0,1 %, цыганоў – 0,05 %, эстонцаў – 0,02 % , іншых – 0,13 %[102].

б) на 01.01.1930 года (першая лічба згодна дадзеных ЦВК БССР, у дужках ЦВК СССР): беларусаў – 81,7 % (80,2 %), рускіх – 11,8 % (7,8 %), яўрэяў – 2,8 % (8,5 %), палякаў – 2,0 % (2 %), украінцаў – 0,8 % (0,7 %), татараў – 0,1 % (0,1 %), латышоў – 0,3 % (0,3 %), немцаў – 0,2 % (0,1 %), літоўцаў – 0,1 % (0,1 %), цыганоў – 0,04 % (0 %), іншых – 0,2 % (0,2 %). Сярод гарадскога насельніцтва яўрэі складалі 9,3 % (40,1 %)[103].

в) паводле перапісу 1937 года ў БССР жыло 5198880 чал., з іх : беларусаў – 83,89 %, яўрэяў – 6,98 %, рускіх – 4,77 %, палякаў – 2,31 %, украінцаў – 1,26 %, латышоў – 0,19 %, немцаў – 0,19 %, літоўцаў – 0,11 %, татараў – 0,07 %, іншых – 0,23 %[104].

Нацыянальныя меншасці ў БССР найбольш кампактна пражывалі: яўрэі ў мястэчках Ляды Аршанскай акругі, Стрэшын, Парычы, Шчэдрын, Старыя Дарогі Бабруйскай акругі, Янавічы, Бешанковічы, Чашнікі, Колышкі Віцебскай акругі, Падобранка, Хойнікі Гомельскай акругі, Карма Магілёўскай акругі, Смілавічы, Узда Мінскай акругі, Капаткевічы, Нароўля, Тураў Мазырскай акругі, Дрыса, Ушачы, Асьвея, Вула Полацкай акругі, у вёсках Сялец Магілёўскай, Давыдаўка, Азарычы Мазырскай, Грозава Мінскай акруг; палякі ў вёсках Філатава Аршанскай акругі, Наталова, Янаўка Бабруйскай акругі, Рудня-Нісімкавічы, Падосава, Нова-Малынічы, Шлягіна, Рудня Сталбужская, Балашоўка, Паташня, Любавіна Гомельскай акругі, Аляксандраўка, Хрыпелева Магілёўскай акругі, Александраўка, Кустаўніцы, Тварычэўск Мазырскай акругі, імя Ланцуцкага, Замасточча, Амнішава, Лозінкі Мінскай акругі, Пушча Полацкай акругі; рускія ў вёсках Капусьціна, Багушэўка Бабруйскай акругі, Наўховічы (пасёлак Вольскі), Леніна, Церахаўка, Кузьмінічы, Гардуны, Харошаўка, Агародня-Гомельская, Мар'іна, Свяцілавічы, Хізы, Цярэнічы, Жгун-Буда, Камарынка Гомельскай акругі; латышы ў вёсках (калоніях) Перакальск Бабруйскай акругі, Грудзінаўка, Галіцкая Мыза Магілёўскай акругі, Вацлавава Полацкай акругі; украінцы ў вёсках Лукаеды, Гузень Гомельскай акругі, Акопы Мазырскай акругі; немцы ў вёсках (калоніях) Бярозаўка,

[102]Всесоюзная перепись населения 1926 года: Предварительные итоги. М., 1927. Т. X. С. 9–10.
[103]Нацыянальны склад насельніцтва БССР // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 2837. Арк. 43.
[104]Падлічана па: Всесоюзная перепись населения 1937 года: Общие итоги. Сборник документов и материалов. М, 2007. С. 106–107.

Анзельмаў Мазырскай акругі; літоўцы ў вёсцы Малькаўка Аршанскай акругі[105]. Існавалі і іншыя месцы, дзе прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі даволі значны працэнт сярод мясцовага насельніцтва, але ў вышэйзгаданых месцах яны пераважалі.

БССР з'яўлялася даволі монаэтнічнай рэспублікай, каля 80 % тут складалі прадстаўнікі тытульнай нацыі, беларускае насельніцтва ў асноўнай сваёй масе з'яўлялася вясковым (у 1920-я гады беларусы складалі 89 % вясковага насельніцтва[106]). Значную колькасць насельніцтва складалі яўрэі: калі ў 1927 г. тут пражывала 407,1 тыс. яўрэяў, то ў 1931 г. – 440,2 тыс., у 1937 г. – 363,2 тыс., у 1939 г. – 375,1 тыс. чалавек. Увогуле Савецкая Беларусь стала займаць 3 месца сярод рэспублік СССР па колькасці яўрэяў, хаця іх доля і зменшылася з 15,2 % (1926) да 12,4 % (1939)[107]. Абсалютная большасць з іх, па прычыне палітыкі царскага ўрада, жыла ў гарадах і мястэчках (1939 г. – каля 88 % ад усёй колькасці яўрэйскага насельніцтва).

Табліца 2 – Нацыянальны склад мястэчак БССР, згодна перапісу 1926 г. і абследавання 1931 г. (выбарачна 12 мястэчак)[108]

| **Нацыянальнасць** | **1926 год** | | **1931 год** | |
|---|---|---|---|---|
| | **колькасць** | **%** | **колькасць** | **%** |
| Беларусы | 12360 | 37,8 | 10731 | 45,3 |
| Яўрэі | 17476 | 53,5 | 11722 | 49,5 |
| Рускія | 1331 | 4,1 | 215 | 0,9 |
| Палякі | 555 | 1,7 | 352 | 1,5 |
| Украінцы | 144 | 0,4 | 71 | 0,3 |
| Татары | 740 | 2,5 | 470 | 2,4 |
| Іншыя | 168 | 0,1 | 107 | 0,2 |
| Усяго | 32674 | 100 | 23668 | 100 |
| Нацменшасці | 20314 | 62,17 | 12937 | 54,66 |

На 1926 г. колькасць яўрэяў-саматужнікаў была крыху больш за 8 % ад агульнай колькасці яўрэйскага насельніцтва, але яны складалі 79 % ад агульнай колькасці гаспадароў горада і вёскі, якія мелі наёмных рабочых, 76 % гаспадароў, якія працавалі толькі з членам сям'і і 62 % саматужнікаў-адзіночак. Толькі 3,1 % яўрэяў з'яўляліся гандлярамі, аднак яны складалі каля 90 % усіх гандляроў па БССР. З 28 заводчыкаў і фабрыкантаў 26 былі яўрэямі. Разам з тым у параўнанні з іншымі нацыянальнасцямі ў яўрэяў была самая высокая ўдзельная вага беспрацоўных (каля 7 % самадзейнага насельніцтва, у той час як сярод беларусаў адпаведны працэнт складаў толькі 0,4 %), а таксама асоб, якія

[105] Матэрыялы Нацкамісіі ЦВК БССР // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 175–177 адв.
[106] *Гринберг Р.* Население СССР. Народность. Возраст. Грамотность. М.–Л., 1929. Диаграмма II.
[107] *Даніловіч В. В.* Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі (1921–1929 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2015. № 2. С. 54.
[108] Мястэчкі БССР у рэканструкцыйны перыяд (Справаздача аб абследаванні мястэчак БССР, якое праведзена Нацкамісіяй пры ЦВК БССР і яўсектарам БАН у сак. – крас. 1931 г.). Мінск, 1932. С. 20.

не мелі пастаяннага даходу. Рабочыя і служачыя ў структуры яўрэйскага насельніцтва складалі прыкладна па 6 %[109].

Больш за 65 % самадзейнага насельніцтва рускіх (агульная колькасць каля 384 тыс. чалавек) было занята ў сельскай гаспадарцы, каля 15 % складалі ваеннаслужачыя, рабочыя і служачыя – па 6,8 %. Земляробства з'яўлялася асноўным заняткам польскага насельніцтва БССР, з 97,5 тыс. агульнага ліку палякаў прыкладна 82 % жылі з сельскай гаспадаркі. Рабочыя складалі 6,8 %, служачыя – 4,4 %. Да рускага і польскага этнасаў належала большая частка былых дваран (шляхты). Астатнія нацыянальныя меншасці краіны складалі каля 77,6 тыс. чалавек[110]. Іх заняткі ў пераважнай большасці заставаліся традыцыйнымі. Так немцы і латышы займаліся племянной жывёлагадоўляй, татары – агародніцтвам і апрацоўкай скуры і г. д.

Індустрыялізацыя выклікала ўрбанізацыю рэспублікі, у працэсе якой павялічылася колькасць гарадскога насельніцтва, узмацняўся прыток беларусаў у гарады. Адбыліся зрухі ў характары рассялення гараджан: знікла дзяленне горада на кварталы па этнічнай прыкмеце (Татарскія вуліцы і інш.). Індустрыяльнае развіццё прывяло да павелічэння колькасці рабочых у рэспубліцы. Так, за гады даваенных пяцігодак, рабочы клас павялічыўся ў 6 разоў, у той час як у цэлым па СССР – у 3 разы[111].

Папаўненне рабочага класа за кошт сялянства, у большасці сваёй беларусаў, прывяло да змен у нацыянальным складзе рабочага класа. Раней у гарадах ён складаўся пераважна з прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Цяпер жа, пры павелічэнні колькасці рабочых у буйной прамысловасці Беларусі з 1930 па 1940 гг. у 5 разоў, колькасць рабочых–беларусаў узрасла ў 8 разоў. Доля прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей памяншалася. У перыяд з 1929 да 1932 гг. з 49,1 % да 37,8 % (гл. табліцу 3).

Табліца 3 – Нацыянальны склад рабочых буйнай прамысловасці БССР[112]

| **Нацыянальнасць** | **Колькасць (тыс.)** | **Удзельная вага (%)** |
|---|---|---|
| Усяго | 93,0 | 100 |
| Нацыянальныя меншасці | 35,2 | 37,8 |
| Беларусы | 57,8 | 62,2 |
| Яўрэі | 23,5 | 25,3 |
| Рускія | 4,6 | 4,9 |
| Палякі | 3,1 | 3,3 |
| Іншыя | 4,0 | 4,3 |

[109] Всесоюзная перепись населения 1926 г. Т. XXVII. БССР. Отдел II. Занятия. С. 1–3.
[110] Падлічана па: Всесоюзная перепись населения 1926 г. Т. XXVII. БССР. Отдел II. Занятия. С. 1–3.
[111] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 296.
[112] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 211–212.

На пачатак 1940 г. у складзе рабочага класа прамысловасці рэспублікі беларусы складалі 76 %, яўрэі – 12,5 %, рускія – 5 %, палякі – 2,2 %, украінцы, літоўцы і іншыя – 3,7 %. З ліку ўсіх рабочых, якія былі заняты ў прамысловасці, на транспарце і сельскай гаспадарцы, на долю небеларусаў прыходзілася толькі каля 20 %[113]. Нацыянальных меншасцей было 15 % ад агульнай колькасці рабочых БССР[114]. Асабліва вялікая ўдзельная вага прадстаўнікоў тытульнай нацыі была на новых прадпрыемствах.

У 1930-я гг. адбываўся інтэнсіўны працэс фарміравання савецкай інтэлігенцыі. На 01.09.1934 г. вага прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у асяродку інжынерна-тэхнічных прадстаўнікоў па БССР складала ў буйной прамысловасці – 60,6 %, у будаўніцтве – 42,2 %. Сярод аграномаў і ІТР саўгасаў і МТС – 26,8 %[115]. Гэтаму спрыяла існаванне сярэдняй, сярэднеспецыяльнай і вышэйшай адукацыі на нацыянальных мовах.

У 1939 г. сацыяльная структура насельніцтва БССР была прадстаўлена рабочымі (21,9 %), калгаснікамі (57,2 %), служачымі (14,5 %). Назіраўся прыкметны рост нацыянальных кадраў ва ўсіх галінах вытворчасці. Сярод кіраўнікоў партыйных, дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх арганізацый і прадпрыемстваў удзельная вага небеларусаў складала – 36,4 %, сярод тэхнічнага персаналу – 34,2 %, медыцынскага персаналу – 36,3 %, культурна-палітыка-асветных работнікаў – 26,3 %, работнікаў мастацтва – 67,2 %, сувязі – 20,1 %. Нацменшасці пераважалі сярод такіх прафесій, як урачы, навуковыя работнікі, журналісты, адвакаты, суддзі.

За дзесяцігоддзе адбылося павышэнне ўдзельнай вагі беларусаў у агульным складзе насельніцтва БССР з 80,6 да 82,9 %. Яўрэі і рускія, колькасць якіх была прыблізна аднолькаваю і складала ў 1926 г. каля 8 %, за гэты час панізілі сваю ўдзельную вагу: рускія да 6,6 %, яўрэі да 6,7 %[116]. Адмена мяжы аседласці і розных працэнтных нормаў зрабілі магчымым для найбольш мабільнай часткі яўрэйскага насельніцтва атрыманне працы ў савецкім апараце буйных гарадоў Расіі, што выклікала іх адток з Беларусі. Перапісы зафіксавалі значнае зніжэнне колькасці палякаў – з 97,5 тыс. (1,9 %) у 1926 г. да 58,4 тыс. (1 %) у 1939 г.[117] Беларускі даследчык В. Жук аспрэчвае дадзеныя, што прыводзіць у сваіх даследаваннях М. Іваноў, які піша, што ў 1920-я гады ў Савецкай Беларусі жыло больш за 300 тыс. палякаў; не згодны ён з дадзенымі і афіцыйнай статыстыкі, якая называе лічбу 97,5 тыс. палякаў. В. Жук, на падставе дадзеных, атрыманых работнікамі акруговых польскіх бюро, якія ўлетку 1924 г. правялі апытанне і падлік польскага насельніцтва, падкрэслівае, што колькасць палякаў складала амаль 170 тыс.[118]

---

[113] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 296.

[114] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941) . С. 213.

[115] Там жа . С. 219–220.

[116] Всесоюзная перепись населения 1939 года: Основные итоги. М., 1992. С. 70.

[117] Там жа.

[118] *Жук В.Н.* Польское национальное меньшинство в БССР (1921–1939 гг.). Автореф. дис. на соискание уч. степ. канд. ист. наук. Минск, 2009. С. 9.

Аналіз гарадскога насельніцтва дазваляе нам сцвярджаць, што ў выніку сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1930-я гг. паступова памяншалася ўдзельная вага нацыянальных меншасцей сярод жыхароў гарадоў.

У 1920 г. нацыянальны склад гарадскога насельніцтва быў наступны: у Віцебскай губерніі – 207717 (15,2 % ад усяго насельніцтва), у тым ліку рускіх – 29,1 %, украінцаў – 0,2 %, беларусаў – 17,8 %, палякаў – 2,6 %, яўрэяў – 47,8 %, іншых – 2,5 %; Гомельскай – 410491 (17,3 %), у тым ліку адпаведна 45,0 %, 2,5 %, 12,1 %, 1,3 %, 38,3 %, 0,8 %; БССР (1923) – 193227 (12,3 %), у тым ліку адпаведна 7,7 %, 1,8 %, 37,7 %, 3,3 %, 47,4 %, 2,1 %. У Віцебску (1920): беларусаў – 12,1 %, рускіх – 33,8 %, украінцы – 0,3 %, палякі – 4 %, яўрэі – 45,2 %, іншыя – 4,6 %; Гомель адпаведна 41,7 %, 0,2 %, 1,6 %, 2,5 %, 48,2 %, 5,8 %; Мінск (1923) – 7,3 %, 1,5 %, 40,8 %, 4,2 %, 43,6 %, 2,6 %[119]. Напрыканцы 1930-х гг. сітуацыя істотна змянілася (гл. табліцу 4).

Табліца 4 – Нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, 1939 г.[120]

| **Вобласць, цэнтр вобласці** | **Нацыянальнасці (у працэнтах)** | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Рус.** | **Укр.** | **Бел.** | **Пал.** | **Нем.** | **Яўр.** | **Інш.** | **Нац-меншасці** |
| Віцебская | 15,31 | 1,98 | 59,9 | 1,19 | 0,15 | 20,05 | 1,42 | 40,1 |
| г. Віцебск | 17,22 | 1,86 | 55,34 | 1,56 | іншыя | 22,17 | 2,03 | 44,66 |
| Гомельская | 15,04 | 5,7 | 52,84 | 0,84 | 0,11 | 24,53 | 0,94 | 47,16 |
| г. Гомель | 18,03 | 6,8 | 43,87 | іншыя | іншыя | 29,38 | 1,92 | 56,13 |
| Магілёўская | 12,72 | 3,38 | 59,33 | 1,52 | 0,12 | 21,95 | 0,98 | 40,67 |
| г. Магілёў | 12,57 | 3,46 | 61,33 | 1,27 | іншыя | 19,83 | 1,54 | 38,67 |
| Палеская | 6,5 | 2,87 | 56,17 | 1,6 | 0,18 | 32,07 | 0,61 | 43,83 |
| г. Мазыр | 9,56 | 3,44 | 47,77 | 2,2 | іншыя | 36,09 | 0,94 | 52,23 |

У заходніх абласцях БССР, уз'яднаных з рэспублікай у 1939 г., у гарадах пераважала яўрэйскае і польскае насельніцтва. Згодна статыстычных дадзеных, на нашу думку не зусім дакладных, Беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў МУС Польшчы нацыянальны склад ваяводства быў наступны (23.06.1939): палякі складалі – 66,85 % насельніцтва, беларусы – 18 %, яўрэі – 12,5 %, рускія – 1,6 %, немцы – 0,4 %, літоўцы – 1,15 %; у г. Гродна палякаў – 49,5 %, беларусаў – 40,5 %, яўрэяў – 6,5 %, іншых – 3,5 %[121]. У той жа час на падставе польскай статыстыкі на 1939 год, пасля ўсталявання савецкай улады ў Заходняй Беларусі, быў зафіксаваны наступны нацыянальны склад у асобных гарадах, якія адлюстраваны ў табліцы 5[122].

[119] *Старовойтов М.И.* Национальный состав городского населения белорусско-российско-украинского пограничья (1920–1930-е годы) // Религия и общество – 4: сб. науч. трудов. Могилёв, 2009. С. 66–67.
[120] Там жа. С. 67.
[121] Справаздача Беластоцкага ваяводы // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 28. Арк. 9.
[122] Звесткі аб нацыянальным складзе раёнаў // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 17.

Табліца 5 – Нацыянальны склад гарадоў Гродна і Ваўкавыска

| | Агульная колькасць жыхароў | Беларусы | | Палякі | | Яўрэі | | Іншыя | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| г.Гродна | 58167 | 1354 | 2,3 | 27338 | 47 | 25595 | 44 | 3880 | 6,7 |
| Гродзенскі раён | 41341 | 30038 | 72,7 | 11181 | 27 | 114 | 0,27 | 8 | 0,03 |
| г.Ваўкавыск | 17254 | 1208 | 7 | 8627 | 50 | 6901 | 40 | 518 | 3 |

Аналізуючы нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, даследчык М. Старавойтаў робіць выснову, што "… у 1920–1930-я гады найбольш поліэтнічнымі былі гарады, асабліва цэнтры адміністратыўных адзінак. У грамадска-палітычным і культурным жыцці горада беларусы не адыгрывалі істотнай ролі. Беларускі горад заставаўся рускамоўным, з пераважным развіццём рускай культуры. Беларусізацыя не пайшла. Беларускі этнас напрыканцы 1930-х гг. заставаўся ў абсалютнай большасці аграрным (жыў у сельскай мясцовасці і быў заняты сельскай гаспадаркай), з самым нізкім адукацыйным узроўнем і нізкай ступенню урбанізаванасці ў параўнанні з іншымі нацыянальнасцямі. Гэта не дазваляла яму аказваць належны ўплыў на этнакультурныя працэсы ў БССР"[123].

У міжваенны час у Савецкай Беларусі адбывалася трансфармацыя святочна-абрадавай культуры народа. Асабліва ўрачыста адзначаліся дзяржаўныя святы і памятныя дні (Першамай, гадавіна Кастрычніка, 8 Сакавіка, Дзень Савецкай Арміі і інш.) [124]. Побач з імі да 1930 г. былі ўстаноўлены ў якасці "асобных дзён адпачынку" даты найбольш шанаваных у асяроддзі вернікаў-працоўных рэлігійных святаў. Асобнымі днямі адпачынку, акрамя дзяржаўных, былі: 6 студзеня (Водахрышча), 25 сакавіка (Благавешчанне), 27–28 красавіка (Вялікдзень), 29 мая (Ушэсце), 9 чэрвеня (Сёмуха), 6 жніўня (Спас), 15 жніўня (Успенне), 25–26 снежня (Каляды)[125].

1930 год знамянальны тым, што ў яго календары рэлігійныя святы ўжо не лічыліся асобнымі днямі адпачынку. У канцы 1929 – напачатку 1930 гг. была зачынена большая частка цэркваў, касцёлаў, сінагог і малітоўных дамоў. Наогул, па афіцыйных дакументах тых часоў яскрава бачна, як мяняліся адносіны ўлады да вернікаў і метады антырэлігійнай барацьбы. Ад перакананняў да прымусу, гвалтоўнай забароны. Першы ўдар быў нанесены па маёмасці вернікаў, наступныя

[123] *Старовойтов М.И.* Национальный состав городского населения белорусско-российско-украинского пограничья (1920–1930-е годы). С. 68–69.

[124] У канву пралетарскіх святаў увайшлі інсцэніроўкі на рэвалюцыйную тэматыку, дэманстрацыі, мітынгі, маёўкі, спевы рэвалюцыйных гімнаў, затым да іх далучыліся ўрачыстыя сходы, уручэнне Чырвонага Сцяга перадавому калектыву, ганаровы каравул вакол яго, урачысты вынас сцяга, прапаганда лепшых работнікаў, ушанаванне герояў працы і інш. Супрацоўнікам хат–чытален, народных дамоў рэкамендавалася праводзіць бяседы сярод насельніцтва з тым, каб да кастрычніцкіх урачыстасцей яны ўбіралі памяшканні, кватэры, рыхтавалі святочныя сталы. Беларусы. Т. 4 : Вытокі і этнічнае развіццё. С. 352.

[125] *Іваноў У.М.* Нарыс дэмаграфіі, сацыялогіі і быту рабочага класа Савецкай Беларусі (1917–1941). Мінск, 1975. С. 138–139.

па культавых будынках і святарах[126]. Па ўсёй Савецкай Беларусі распачынаецца працэс закрыцця сінагог, цэркваў, касцёлаў. Напярэдадні Ражства Хрыстова, Вялікадня і іншых рэлігійных святаў партыйна-савецкай уладай праводзілася тлумачальная работа сярод рабочых і сялян, іх запрашалі ў клубы на мастацкія вечары, забавы, лекцыі і даклады, антырэлігійныя вечары “бязбожніка і ўдарніка”. Асаблівая ўвага надавалася барацьбе са святочнымі рэлігійнымі традыцыямі. Аднак традыцыйныя святы і звычаі яшчэ моцна ўтрымліваліся ў быце нацменшасцей, асабліва старэйшага пакалення[127].

Безумоўна, дзеянні ўлад дазволілі дасягнуць даволі высокай ступені атэізму, у першую чаргу ў асяроддзі рабочых[128]. Але ўладам не ўдалося ў гэты перыяд цалкам вырашыць рэлігійнае пытанне, бо яны сутыкнуліся з актыўным супрацьдзеяннем веруючага насельніцтва, у тым ліку нацыянальных меншасцей.

Вядома, што менавіта сям’я, асабліва сялянская, з’яўлялася той сацыяльнай базай, дзе захоўваліся этнічная культура і традыцыі. Яна далучала дзяцей і моладзь да абраднасці, маральных нормаў і этыкету роднага народа. Сацыяльна-эканамічныя працэсы, укараненне новай сямейнай абраднасці ў 1920–30-я гг. адлюстравалі тэндэнцыі на разбурэнне народнай культуры, да страты пераемнасці духоўных каштоўнасцей, што ў выніку абярнулася згубай духоўнасці, раз’яднаннем маладога і старэйшага пакаленняў.

На гэты перыяд прыпадае актыўны працэс стварэння сямей з прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Звычайна ў шлюбы ўступалі мужчыны і жанчыны адной веры–рэлігіі, блізкія па культуры і побыту, сацыяльнаму становішчу. Адзінкавымі да рэвалюцыі былі міжнацыянальныя і міжканфесіянальныя шлюбы, якія асуджаліся грамадскасцю і афіцыйнымі ўладамі.

Становішча ў гэтай сферы змянілася пасля 1917 г., калі заканадаўча былі абвешчаны новыя прынцыпы сямейна–шлюбных адносін. Пашырыўся лік міжнацыянальных шлюбаў, што актывізавала ўзаемаадносіны паміж этнасамі, узаемаўплыў нацыянальных культур, наогул паскорыла ход этнічных працэсаў. У 1926 г. удзельная вага міжнацыянальных шлюбаў у БССР склала 6,4 % (у тым ліку

---

[126] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). Мінск, 1998. С. 155–157 ; *Литин А.* “Еврейский вопрос” в Могилеве в свете архивных изысканий // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі “Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць” у 2 ч. Ч. II. Магілеў, 2003. С. 53 ; *Пушкін І.* Стан праваслаўнай царквы ў Магілеве, дзейнасць архіепіскапа Паўліна (Крашэчкіна) 20–30-я гады XXст. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2001. С. 215–217 ; *Thomas E. Bird.* Orthodoxy in Byelorussia: 1917–1980 // Zapisy BINIM. New-York, 1983. № 17. S. 144–208 ; *Dzwonkowski Roman.* Kościoi Katolicki w ZSSR 1917–1939. Zarys historii. Lublin: Towarzystwo Naukowe katolickiego Uniwiersytetu Lubelskiego, 1997. S. 75.

[127] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.). С. 105–124 ; *Яго ж.* Религиозные организации польского населения Восточной Беларуси (беларуско–русское пограничье) // Kultura pogranicza- pogranicze kultur / Redakcja naukowa Adam Bobryk. Siedlce–Pułtusk, 2005. S. 169–172 ; Рэлігійнае жыццё нацыянальных меншасцей БССР у перыяд НЭПа // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб. Матэрыялаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.). Брэст, 2005. С.70–74 ; Рэлігійнае жыццё нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны час (1919–1939 гг.) // Первая мировая война: история, геополитика, уроки истории и современность: материалы международной научной конференции, Витебск, 11–12 ноября 2008 г. Витебск, 2008. С. 255–257 ; Рэлігійнае пытанне ў жыцці нацыянальных меншасцей (20-я гг. XX ст. ) // Старонкі гісторыі Магілёва: зборнік навуковых прац. Магілёў, 1998. С. 123–134.

[128] *Іваноў У.М.* Нарыс дэмаграфіі, сацыялогіі і быту рабочага класа Савецкай Беларусі (1917–1941). С. 147.

17,7 % у гарадах, 2,9 % у сёлах). Характэрна пры гэтым, што доля змешаных шлюбаў у беларусаў была меншай, чым у сярэднім па рэспубліцы, – 2,0 % (у гарадах – 7,0 % і у сёлах – 1,0 %). За перыяд 1927–1936 гг. працэнт змешаных шлюбаў у беларусаў значна павялічыўся: у мужчын – з 2,7 да 12,0 % (у 4,4 разы), а ў жанчын – з 4,9 да 10,0 %. Неабходна адзначыць, што большасць такіх шлюбаў прыходзілася на шлюбы паміж беларусамі і блізкімі да іх па культуры і мове (рускімі, украінцамі і палякамі). Працэс павелічэння колькасці змешаных шлюбаў уяўляў сабой адзін са шляхоў акультурацыі да зменлівых умоў жыцця. Сярэдні ўзровень міжнацыянальнай шлюбнасці ў БССР самы высокі з саюзных рэспублік (у 1936 г. па БССР – 19,4 %, па СССР – 12,5 %)[129].

Індустрыялізацыя, уцягванне жанчын у прамысловую вытворчасць на фабрыках і заводах вялі да зніжэння нараджальнасці. Аднак у гэты час урадам прымаліся пэўныя захады на ўмацаванне сям'і, павышэнне нараджальнасці (бясплатная медыцынская дапамога, пашырэнне сеткі радзільных устаноў, дзіцячых садкоў і ясляў, матэрыяльная дапамога цяжарным жанчынам, забарона абортаў). Таму, нягледзячы на адзначаныя раней негатыўныя фактары, з 1926 па 1939 гг. колькасць насельніцтва павялічвалася. На пачатак 1941 г. на Беларусі жыло 9092,0 тыс. чалавек.

Аналіз гарадскога насельніцтва дазваляе нам сцвярджаць, што ў выніку сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР нацыянальныя меншасці сталі паступова складаць меншую частку жыхароў гарадоў, але яны аказвалі асноўны ўплыў на этнакультурныя працэсы ў гарадах БССР. Нацыянальныя меншасці адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, асабліва ў цэнтрах адміністратыўных адзінак рэспублікі. Беларускі горад заставаўся рускамоўным, з пераважным развіццём рускай культуры.

**Змены этнічнай структуры і нацыянальная ідэнтыфікацыя насельніцтва ў 1940–1980-я гг.** На грамадскае і эканамічнае развіццё пасляваеннай Беларусі ўплывалі як аб'ектыўныя фактары – вынікі вайны і адпаведныя страты, неабходнасць аднаўлення гаспадаркі і мінімальны бюджэт, кадравае пытанне, так і суб'ектыўныя ў выглядзе такіх кірункаў дзейнняў улад, як інтэрнацыяналізацыя, эміграцыя, дэпартацыі, павышэнне ўзроўню адукацыі, правядзенне рознага роду кампаній і г. д.

Для пасляваенных дзесяцігоддзяў было характэрна, па-першае, змяншэнне колькасці беларусаў. Гэта адбылося ў выніку таго, што: шмат беларусаў загінула на вайне, пэўная частка была дэпартавана ў Германію, з-за ўрэгулявання мяжы паміж СССР і Польшчай да 1947 г. з беларускіх земляў выехала на захад ад "лініі Керзана" 120 тыс. палякаў, 85 тыс. яўрэяў, 469 тыс. беларусаў, а з Польшчы ў СССР пераехала ўсяго толькі 30 тыс. беларусаў. Да таго ж толькі з 1950 па 1960 г. з Беларусі ў Паўночныя і ўсходнія раёны СССР (Сібір, Казахстан, Карэлію і інш.)[130] па арганізаванаму набору рабочай сілы

---

[129] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 363–364.

[130] *Илюха О.П., Литвин Ю.В., Пушкин И.А.* Белорусы в Карелии: итоги изучения этнической группы // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя D. Эканоміка. Сацыялогія. Правы. 2016. № 1.

выехала прыкладна 900 тыс. чалавек. Тысячы высокакваліфікаваных маладых спецыялістаў з Беларусі пасля заканчэння вучобы ў ВНУ па размеркаванні былі накіраваны на прадпрыемствы, будоўлі, у арганізацыі і ўстановы за межы рэспублікі. Сярод іх большасць складалі беларусы. Па-другое, у БССР павялічылася колькасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, перш за ўсё рускіх, палякаў, украінцаў (рускіх прыкладна ў два разы і дасягнула амаль 1 млн чал., ці 10,4 %)[131]. Па-трэцяе, назіраўся вялікі энтузіязм насельніцтва, актывізацыя іх дзейнасці ў грамадскім і гаспадарчым жыцці. Праўда, энтузіязм працоўных падмацоўваўся адміністратыўнымі мерамі.

У пасляваенны перыяд актыўнасць насельніцтва стрымлівалася наступствамі палітыкі правячай камуністычнай партыі: змена дэмаграфічнай сітуацыі, тэрытарыяльнае пераразмяшчэнне людзей, размяшчэнне ў Беларусі вайсковых частак, недавер да мясцовага насельніцтва, якое заставалася на акупаванай тэрыторыі, да тых, хто вярнуўся дахаты з заходнееўрапейскіх краін, рэпрэсіі ў адносінах да мясцовай інтэлігенцыі, а затым недавер да тых, хто быў рэпрэсаваны і вярнуўся пасля рэабілітацыі, частка кадраў была дэпартавана ў Польшчу, засталася ў Беласточчыне і інш.

Масавыя тэрытарыяльныя перамяшчэнні людзей наклалі пэўны адбітак не толькі на дэмаграфічныя працэсы, але і на грамадска-палітычнае і нацыянальна-культурнае жыццё насельніцтва рэспублікі. На гэта таксама паўплывала працаўладкаванне ў Беларусі былых партызан. Сярод іх было 32 тыс. прадстаўнікоў не беларускай нацыянальнасці. Шмат хто з іх застаўся працаваць у БССР, прычым далёка не на шэраговых пасадах. У першыя пасляваенныя гады змяніўся нацыянальны склад КП(б)Б – на 01.01.1945 г. прадстаўнікі нацменшасцей складалі 54 % ад агульнай колькасці камуністаў Беларусі (01.01.1941 г. – 45 %). Прычым, як адзначае прафесар Л. Лыч, амаль усе камуністы-небеларусы маглі весці агітацыйна-прапагандысцкую работу ў масах, службовае справаводства толькі на рускай мове[132]. Асабліва вялікі працэнт асобаў не тытульнай нацыянальнасці ў Беларусі прыпадаў на кіруючыя кадры ўпраўленняў і аддзяленняў, гаспадарчых адзінак чыгунак Беларусі, Наркаматаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі БССР.

Мясцовыя прадстаўнікі нацменшасцей Беларусі ад'язжалі за межы рэспублікі па размеркаванню пасля заканчэння навучальных устаноў, у сувязі з асваеннем цалінных і абложных земляў Казахстана і Алтая, на заробкі ў Данбас, прычым сярод мігрантаў пераважала моладзь, найбольш актыўная частка насельніцтва.

---

С. 40–50 ; *Пушкин, И.А.* Сельскохозяйственное и промышленное переселение белорусов в Карелию (опыт Могилевской области) // Белорусы в Карелии (середина XX – начало XXI в.): сб. науч. ст. / И.И. Калачёва и др. Минск, 2016. С. 42–63 ; *Яго ж.* Письма белорусских переселенцев-колхозников из Карелии на родину (1950-е гг.) // Белорусы в Карелии. Исследования и материалы / Науч. ред. Л. И. Вавулинская, О. П. Илюха. Петрозаводск, 2016. С. 102–114 ; Миграции белорусского населения из Могилевской области в Республику Карелия: влияние на восстановление и развитие кадрового потенциала БССР (1950-е гг.) // Молодежная Галактика. СПб. 2017. № 13. С. 171–178.

[131] Багровіч А. Жыхарства Беларускае ССР у сьвятле перапісу 1959 г. С. 31–32 ; *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 351–352.

[132] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 45–46.

Колькасць яўрэяў у рэспубліцы паменшылася з-за вынікаў гітлераўскай акупацыі і іх асіміляцыі. Меней стала палякаў з-за масавых дэпартацый і перасяленняў у Польшчу, а таксама таму, што шмат католікаў раней запісваліся палякамі, а цяпер вырашылі прызнаваць сябе беларусамі. Вядома, што на Беларусі большая частка палякаў з'яўлялася акаталічанымі беларусамі. Гэтае меркаванне пацвярджалася дадзенымі перапісаў 1970, 1979 і 1989 гг., згодна з якімі адпаведна 76,4; 74 і 63,9 % палякаў назвалі роднай менавіта беларускую мову. Частка мясцовых латышоў, літоўцаў, украінцаў, немцаў, украінцаў добра засвоілі культуру, мову і звычаі беларусаў і рускіх таму сталі лічыць сябе беларусамі ці рускімі.

Доля нацыянальных меншасцей у складзе ўсяго насельніцтва ў разглядаемы перыяд была практычна стабільнай – 18,9 % у 1959 г. і 22,1 % у 1989 г. (гл. дадатак А). Найбольш вялікай і меўшай тэндэнцыю да павелічэння была руская супольнасць – з 8,2 да 13,2 % ад агульнай колькасці насельніцтва БССР. Колькасць рускага насельніцтва хутка расла за кошт перасяленцаў, якімі часцей з'яўляліся былыя ваеннаслужачыя, рабочыя, спецыялісты народнай гаспадаркі і партыйныя функцыянеры. Паводле перапісу 1959 г. у рэспубліцы пражывала ужо каля 659 тыс. (8,2 %) рускіх. У пасляваенны час колькасць рускага насельніцтва ў БССР хутка расла: 1970 г. – 938 тыс. (10,4 %), 1979 – 1134 тыс. (11,9 %), 1989 г. – 1342,1 тыс. (13,2 %)[133]. Прырост колькасці рускага насельніцтва забяспечваўся таксама развіццём асіміляцыйных працэсаў сярод беларусаў і некаторых нацыянальных меншасцей.

Акрамя рускіх, сярод асноўных нацыянальных меншасцей, у разглядаемы перыяд павялічвалася колькасць ўкраінскай супольнасці – з 1,7 да 2,9 %.

Памяншалася колькасць польскага насельніцтва ў БССР: 1959 г. – 538,9 тыс., 1989 г. – 417,7 тыс.[134] Згодна перапісу насельніцтва, у 1970 г. у БССР пражывала 382 600 палякаў і 8 092 літоўца, у 1979 г. – 403 169 асоб польскай нацыянальнасці (4,2 % ад агульнай колькасці насельніцтва) і 6 992 літоўскай (0,07 %). Да 1989 г. палякаў у рэспубліцы крыху пабольшала (417 720 чал.), пры гэтым іх удзельная вага паменшылася – 4,1 %, літоўцаў – 7 606 чалавек (0,07 %)[135].

У рэспубліцы, у параўнанні з даваенным часам, даволі значна скарацілася колькасць латышоў. Як адзначае прафесар У. Тугай, гэта было абумоўлена выездам латышоў з сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці ў Даўгаўпілс і Рыгу. З канца 1950-х гадоў колькасць латышоў у рэспубліцы заставалася практычна нязменнай: 2631 чалавек паводле перапісу 1959 г. і 2658 чал. – 1989 г. Яны пражывалі ў асноўным ў гарадах, дзе хуткімі тэмпамі адбываўся працэс рускамоўнай асіміляцыі латышоў Беларусі[136].

[133] Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования и источники средств существования населения Белорусской ССР. По данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. Минск, 1990. С. 196–197.
[134] *Maszkiewicz Mariusz.* Repatriacja czy repatriotyzacja? Wybrane problemy polskich strategii politycznych wobec rodaków wschodnią granicą (1986–1990). Wojnowice, 2017. S. 79.
[135] Итоги Всесоюзной переписи населения 1970 года в 7 т. Т. IV. М., 1972 ; Население СССР: По данным Всесоюз. переписи населения 1979 г. М., 1980 ; Население СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. М., 1990 ; Численность и состав населения СССР: По данным Всесоюзной переписи населения 1979 г. М., 1984.
[136] *Тугай В.В.* Латыши на Беларуси. С. 130.

Халакост прывёў да змены этнічнай структуры беларускіх гарадоў. У 1959 г. нацыянальныя меншасці складалі 38,4 % гарадскога насельніцтва БССР, у 1989 г. – 26,8 %. Працэсы урбанізацыі закранулі ўсе без выключэння нацыянальнасці, якія жылі ў рэспубліцы. Этнічная структура міграцыйнага патоку ў гарады Беларусі даволі стракатая, прадстаўлена больш як 20 нацыянальнасцямі. На першым месцы – беларусы, на другім – рускія, трэцім – украінцы, чацвёртым – палякі. За 1975–1988 гг. прапарцыянальныя суадносіны нацыянальнасцей некалькі змяніліся, паменшылася ўдзельная вага беларусаў, павялічылася доля рускіх, украінцаў і іншых. Так, сярод прыехаўшых у гарады беларусы склалі ў 1975 г. – 71,6 %, у 1980 г. – 68,8 %, 1988 г. – 66 %; рускія – адпаведна 18,5 %, 19,4 %, 20,0 %; украінцы – 4,4 %, 4,7 %, 5,2 %. Калі ў 1975 г. сярод прыбыўшых у гарады з сельскай мясцовасці беларусы склалі 81 %, то ў 1988 г. – 77 %; у складзе прыбыўшых з гарадскіх мясцовасцей – адпаведна 77 і 57 %. Міграцыйны прырост гарадоў Беларусі ў 1988 г. ішоў у асноўным за кошт беларусаў (68,4 %), рускіх (18,5 %), украінцаў (6,1 %)[137].

У 1989 г. у гарадах жыло 61,6 % беларусаў з агульнай іх колькасці, рускіх – адпаведна 86,8 %, украінцаў – 80,4 %, яўрэяў – 99 %. Істотныя змены адбыліся ў нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва. Колькасць і ўдзельная вага беларусаў у гарадах узрасла, а прадстаўнікоў нацменшасцей памяншалася: у 1959 г. – 33,0 %, 1970 г. – 30,7 %, 1979 г. – 28,5 %; 1989 г. – 26,8 %; 1999 г. – 21,0 % (гл. дадатак Б). У адрозненне ад нацыянальных меншасцей асаблівасцю беларусаў – гараджан з'яўляюцца моцныя сувязі з сельскай мясцовасцю[138].

*Рускія* з'яўляліся самай вялікай нацыянальнай меншасцю Беларусі. Іх роля ў сацыяльным і грамадскім жыцці была вышэй за іх колькасны склад, т.я. большасць з іх працавала ў сферы кіравання, навукі, культуры. Пераважная большасць рускіх у значнай ступені захоўвала сваю нацыянальную самасвядомасць, мову, а вернікі – рэлігію. Сучаснае рускае насельніцтва на Беларусі прадстаўлялі тры асноўныя групы: стараверы і іх нашчадкі, рускае несельніцтва, продкі якіх жылі тут на працягу некалькіх пакаленняў і рускія мігранты, якія перасяліліся ў рэспубліку не так даўно і мелі шчыльныя сваяцкія і сяброўскія сувязі з насельніцтвам Расіі. Акрамя гэтых груп можна адзначыць нашчадкаў ад міжнацыянальных шлюбаў рускіх з беларусамі і прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Да рускага насельніцтва адносіць сябе і даволі прадстаўнічая частка ўкраінцаў, татар, яўрэяў, беларусаў і асоб іншых нацыянальнасцей, якія былі выхаваны на рускай культуры і пераянялі некаторыя рысы рускага насельніцтва. Далучэнню беларусаў да культуры рускіх садзейнічала гістарычная памяць аб мінулым, агульнасць лёсу, роднасць культур, моў, а таксама ўзровень сацыяльна–прафесійнай і культурнай падрыхтаванасці.

*Палякі* ў асноўнай сваёй частцы жылі ў Воранаўскім, Шчучынскім, Лідскім, Гродзенскім, Ваўкавыскім раёнах Гродзенскай вобласці, шмат іх у Гродна і

[137] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 288.
[138] *Донских С.В.* В тени большого города. Народ и город в Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф. С. 31.

Лідзе[139]. Большая частка беларускіх палякаў – вясковыя жыхары. У пасляваенны час захоўвалася адносіны з боку савецкай улады да іх, як да не зусім савецкіх людзей. Палякі, католікі падвяргаліся полуафіцыяльнай дыскрымінацыі, асіміляцыі. Тым не менш значная частка з іх захоўвала польскую самасвядомасць, кансалідуючую ролю пры гэтым адыгрывалі мова і рэлігія. Сацыялагічныя апытванні польскага насельніцтва ў Беларусі (выбарка па ўсіх рэгіёнах рэспублікі, праводзіліся польскімі даследчыкамі ў 43 каталіцкіх парафіях, 859 рэспандэнтаў) паказалі прыкметы “сапраўднага паляка”. Найбольшая колькасць рэспандэнтаў адказала: веданне польскай мовы – 34 % (можна было выбіраць некалькі адказаў, таму агульная лічба больш за 100 %), католік – 30 %, бацькі палякі – 18 %, ведае (захоўвае) традыцыі – 14 %, самавызначэнне – 12 %, жыве ў Польшчы – 11 %, асаблівасці характару – 7 %, нарадзіўся ў Польшчы – 6 %, патрыятызм – 5,5 %, моліцца па-польску – 5 %, шляхціц – 5 %, ведае польскую гісторыю – 3,5 %, іншае – каля 3 %, запіс у дакуменце – каля 3,5 %, родзічы ў Польшчы – 2,5 %, хрышчоны ў каталіцкай веры каля 1 %[140]. Шматлікія польскія грамадскія дзеячы і каля 60 % насельніцтва Беларусі прытрымліваліся думкі, што ўсе католікі – палякі. Гэта было выклікана тым, што праблема польскай этнічнай індэнтыфікацыі шчыльна злучана з каталіцкай рэлігіяй. Каталіцкій клір у БССР да 1990-х гг. меў яскрава бачную прапольскую арыентацыю.

*Украінская* супольнасць БССР складалася часткова з жыхароў Брэсцкай і Гомельскай абласцей, а таксама тых, хто ў пераважнай большасці прыехалі сюды ў 1950–80-я гг. Гэта ў асноўным спецыялісты з розных галін эканомікі, чыноўнікі, інтэлігенцыя. Яны аселі, з большага, у Мінску і буйных гарадах Беларусі.

Напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гадоў адзначалася рэзкае павялічэнне эміграцыі *яўрэяў*, што прывяло да яшчэ больш значнага памяншэння іх колькасці. Неабходна адразу адзначыць, што за гады савецкай улады, асабліва падчас вайны і пасляваенныя гады, уласна яўрэйскае жыццё ў Беларусі практычна знікла. Бытавы антысемітызм, палітыка ўсеагульнай русіфікацыі прывялі да амаль поўнай асіміляцыі яўрэйскага насельніцтва. Толькі крах савецкай сістэмы ў СССР спрыяў уздыму нацыянальнай самасвядомасці ўсіх нацый, якя жылі на яго тэрыторыі, у тым ліку і яўрэйскай. Хутчэй за ўсё, асноўнай прычынай эміграцыі яўрэяў у Ізраіль, ЗША, Германію з’яўляўся пошук лепшых умоў жыцця, а не іншыя інтарэсы. Найбольшая хваля ад’езду яўрэяў з гарадоў Беларусі прыпадае на гады, якія супадаюць з заняпадам эканомікі.

Па сваім паходжанні *літоўская* этнічная група Беларусі ўмоўна падзяляецца на дзве асноўныя катэгорыі. Першая – карэнныя жыхары, ці аўтахтоны. Значная колькасць такіх літоўцаў пражывала на беларуска-літоўскім памежжы, найбольш кампактна – у Астравецкім і Воранаўскім раёнах Гродзенскай вобласці, крыху менш – у Пастаўскім і Браслаўскім раёнах

[139] *Gawin T.* Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności. Białystok, 2007. S. 11–36.
[140] *Gorbaniuk J., Gorbaniuk O.* Co znaczy być Polakiem dla katolików na Białorusi? // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Международной науч.конф., Гродно, 7–9 нояб. 2003 г. Барановичи, 2004. С. 50.

Віцебскай вобласці. У гэтых раёнах сканцэнтравана амаль што трэцяя частка ўсіх літоўцаў Беларусі. Другая катэгорыя складалася з літоўцаў-мігрантаў і іх нашчадкаў. Яны дысперсна пражывалі ў розных месцах Беларусі і складалі пераважную большасць сярод беларускіх літоўцаў. Даследчык Ю. Унуковіч адзначае, што практычна да сярэдзіны XX ст. літоўцы Беларусі захоўвалі свае асноўныя этнакультурныя асаблівасці, у першую чаргу рэлігійную і моўную адметнасці. У другой палове XX ст. назіралася агульнае скарачэнне колькасці літоўцаў і паслабленне іх этнічнай устойлівасці, што прывяло да іх частковай асіміляцыі. Тым не менш літоўскую мову сёння можна пачуць нават на ўсходзе Беларусі ў вёсцы Малькаўка Магілёўскай вобласці, дзе ў 1920–1930-х гг. існаваў літоўскі нацыянальны сельскі савет[141].

Нягледзячы на тое, што колькасць *латышоў* у Беларусі была невялікая, яны пакінулі пасля сябе глыбокі след працавітасцю, кемлівасцю, згуртаванасцю. Што датычыцца этнічных традыцый то можна адзначыць, што і ў савецкі час захоўваліся рысы, якія характэрны толькі для латышоў. Даследчык У. Тугай адзначае: “На Беларусі засталося няшмат дзяцей і ўнукаў латышскіх перасяленцаў. Аднак з поўнай упэўненасцю можна казаць, што яны ў цэлым захавалі нацыянальныя рысы, уласцівыя латышскай нацыі”[142].

Размяшчэнне *татарскага* этнасу па рэгіёнах Беларусі ў працэнтных суадносінах да колькасці ўсяго насельніцтва Беларусі згодна з перапісамі насельніцтва ў другой палове XX ст. адлюстравана ў табл. 6[143].

Табліца 6 – Размяшчэнне татарскага этнасу па рэгіёнах Беларусі.

| **Рэгіён** | **1959 г.** | **1970 г.** | **1979 г.** | **1989 г.** | **1999 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **%** | **%** | **%** | **%** | **%** | **чал.** |
| Магілёўская вобласць | 0,0 | 0,04 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 775 |
| Брэская вобласць | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 933 |
| Віцебская вобласць | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 1258 |
| Гомельская вобласць | 0,0 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 1127 |
| Гродзенская вобласць | 0,2 | 0,2 | 0,2 | 0,2 | 0,2 | 2155 |
| Мінская вобласць | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 3841 |
| БССР (Рэспубліка Беларусь) | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 10089 |

*Цыганы* з’яўляюцца самай шматколькаснай нацыянальнай меншасцю ў Еўропе[144]. Значная частка сучаснага цыганскага насельніцтва Беларусі – нашчадкі паваенных перасяленцаў з іншых рэгіёнаў СССР (галоўным чынам з Малдавіі). Канец качавога жыцця цыган у СССР наступіў у 1956 г. у сувязі з

[141] *Унуковіч Ю.* Літоўцы ва Усходняй Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 9. С. 37–43.
[142] *Тугай У.В.* Латышы на Беларусі. Мінск, 1999. С. 133.
[143] *Гембіцкая М.* Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 11. С. 38.
[144] *Фрэйзэр А.* Цыганы. Мінск, 2003.

з'яўленнем Указу Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР "Пра далучэнне да працы цыган, якія займаюцца бадзяжніцтвам". Цыган, што парушылі ўказ чакаў пяцігадовы тэрмін турэмнага зняволення. Месцамі кампактнага пражывання беларускіх цыган з'яўляліся Мінск, Гродна, Гомель, Віцебск, Магілёў, Брэст, Бабруйск, Заслаўль, Ашмяны, а таксама іншыя гарады і мястэчкі. Рэлігійны культ адыгрываў вялікую ролю ў жыцці беларускіх цыган[145].

Беларускія цыганы ўваходзяць у склад супольнасці, якую акрэсліваюць як беларуска-літоўскую этналінгвістычную групу цыганоў Еўропы. На тэрыторыі Беларусі цыганская супольнасць, у сваю чаргу, падзяляецца на некалькі меншых груп. Першую складаюць "беларуска рома", якія з'яўляюцца нашчадкамі выхадцаў з беларуска-літоўскага і венгерска-польскага арэалаў. Так называлі сябе толькі тыя цыганы, якія жылі ў Мінску і Мінскай вобласці. Да другой групы адносяцца беларуска-літоўскія цыганы польскага паходжання – "рома бежанцы", якія жылі па ўсёй заходняй і цэнтральнай частках рэспублікі. Трэцяя група – "ліпенцы" (ад змененага слова лепельцы). Яны жылі на паўночным захадзе Беларусі. На тэрыторыі Віцебскай і Магілёўскай абласцей жылі цыганы змешанага беларуска-рускага паходжання ("сякі", "вэшытка", "габалі" і інш.). На поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі цыганы называлі сябе "гомельцы", "палесякі", "сінякі". На Палессі жылі "пінчукі". У цэнтральнай, паўднёва-ўсходняй і паўднёвай частках Беларусі жылі групамі і асобнымі сем'ямі цыганы – "бернікі". Гэта нашчадкі былых членаў табараў, што качавалі па памежжы Беларусі, Бранскай вобласці і Украіны. На тэрыторыі Віцебскай вобласці пасля Другой сусветнай вайны ў вёсках пасялілася група цыганоў з Літвы. У Брэсцкай і Гродзенскай абласцях жылі польскія цыганы "фэлдытка". У цэнтральнай і паўднёвай частках Беларусі жылі невялікія групы цыганоў змешанага беларуска-украінскага паходжання – "муканы"[146]. Пачынаючы з канца 1980-х гг. значная частка цыган пераехала жыць у буйныя гарады, у горад Мінск.

Замкнутасць цыганскай культуры, выяўленае імкненне да самазахавання, свядомае абмежаванне доступу звонку, кланавасць, дуалізм маральнасці, аўтаномія асобы не раз выклікалі неразуменне ва ўлады і мясцовага насельніцтва. Цыганы ганарацца тым, што не асіміляваліся ў іншаэтнічным асяроддзі, захавалі сваё асаблівае аблічча, самасвядомасць, менталітэт і традыцыі. Выпрацавалі свой маральны кодэкс, якога прытрымліваюцца. Захоўвалі сямейныя традыцыі. Абагульняючы звесткі пра цыган, варта адзначыць два моманты. Па-першае, недастатковая ўвага органаў дзяржаўнай улады да патрэб і запатрабаванняў цыганскай нацыянальнай супольнасці і забеспячэння належнага статуса

[145] *Болотова Ю.Г.* Субкультура белорусских цыган // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 324–329.

[146] *Калінін В.* Цыганы на Беларусі // З гісторыяй на "ВЫ": Публіцыстычныя арт. Мінск, 1994. С. 330–349 ; *Дучыц Л.* З гісторыі цыганоў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. № 3. С. 48–49 ; *Жук О.Э.* Социальная организация цыган Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. –Гродно, 2006. С. 78–81 ; *Бартош О.Э.* Проблемы этничной идентификации цыган Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 152–154 ; *Болотова Ю.Г.* Субкультура белорусских цыган // Та жа. С. 324–329 ; *Піскун Л., Піскун Я.* Да пытання аб культуры і адукацыі цыганоў Беларусі // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. Брэст. 1997. № 4. С. 16–20.

грамадзянам ромскай нацыянальнасці. Па-другое, нежаданне саміх цыган прыкладаць шмат намаганняў для змянення свайго статуса, атрымання належнай адукацыі, актыўнага ўдзелу ў грамадскім і культурным жыцці.

Актыўныя знешнія міграцыі ў пасляваенную Беларусь пэўным чынам змянілі этна–канфесійную культуру грамадства, дапоўнілі яе шэрагам гістарычна новых для рэспублікі, адносна нешматлікіх іншаэтнічных груп. З'явіліся розныя па колькасці і характару рассялення этнічныя групы *народаў Каўказа*, агульная дэмаграфічная маса якіх за перыяд 1989–1999 гг. значна ўзрасла і склала прыкладна 25 тысяч асоб афіцыйна зарэгістраванага насельніцтва[147]. У Беларусі пражывалі прадстаўнікі каля 45 народаў Каўказскага рэгіёна. Як адзначае даследчык А. Рагімаў, яны не мелі асабліва значнай ролі ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных адносін у Беларусі, але на яе характар уплывалі. Найбольш шматлікія этнічныя групы народаў Каўказа, якія жылі ў Беларусі, згодна перапіса насельніцтва 1989, былі прадстаўлены: армянамі – 4933 чал., азербайджанцамі – 5009 чал., грузінамі – 2840 чал. Назіраўся пастаянны рост колькасці прадстаўнікоў і іншых народаў Каўказа: абхазаў, даргінцаў, інгушаў, кабардзінцаў, кумыкаў, лезгінаў, асецінцаў, чачэнцаў і інш. Прадстаўнікі народаў Паўночнага Каўказа і Закаўказзя пражывалі на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Найвялікшая этнічная група каўказцаў Беларусі – армяне. Большая колькасць з іх пражывала ў Мінскай, Гомельскай, Віцебскай абласцях, меншая ў Гродзенскай і Брэсцкай. Як этнаканфесійная група армяне прадстаўлялі адзін з найбольш ранніх кірункаў хрысціянства – манафізіцкую канфесію. Грузіны пераважна жылі ў Мінскай, Віцебскай і Гомельскай абласцях. Большасць вернікаў грузін – праваслаўныя. Азербайджанцы найбольш былі прадстаўлены ў Мінскай, Магілёўскай, Гомельскай і Віцебскай абласцях. Значная частка з іх вызнавала іслам шыіцкага толку. Прадстаўнікі іншых народаў Каўказа малаколькасныя і жылі дысперсна. Асяціны, лезгіны і кумыкі па колькасці, найбольш усяго, былі прадстаўлены ў Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Чачэнцаў па колькасці больш за ўсё ў Мінскай, Магілёўскай, Брэсцкай абласцях, і, найперш за ўсё, у буйных гарадах. Найбольшы рост насельніцтва за кошт прадстаўнікоў каўказскіх народаў адбыўся ў Мінскай вобласці і асабліва ў г. Мінску. Большасць прадстаўнікоў народаў Паўночнага Каўказа – па канфесійнай прыкмеце – мусульмане. Актывісты этнакультурных аб'яднанняў у пераважнай большасці належылі да гуманітарнай, радзей – тэхнічнай інтэлігенцыі[148]. Адчувалася некаторае негатыўнае ўспрыняцце іх з боку славянскай часткі насельніцтва Савецкай Беларусі.

Савецкія ўлады пасляваеннай БССР прыкладалі велізарныя намаганні дзеля саветызацыі і русіфікацыі насельніцтва рэспублікі. Пасляваенныя перапісы

[147] *Рагимов А.Н.* Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. ХХ ст. // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб.матэрыялаў міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.). Брэст, 2005. С. 215 ; *Яго ж.* Міграцыя народаў Каўказа ў Рэспубліку Беларусь у 1980–1990-я гг. // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 11. С. 33–40.
[148] *Рагимов А.Н.* Конфессионально–демографическая характеристика миграции представителей народов Кавказа в Беларусь в 80–90 гг. ХХ ст. // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: зб.матэрыялаў міжнароднай навукова–практычнай канферэнцыі. С. 215–218.

адлюстравалі гэты працэс. Яны засведчылі даволі значны прырост насельнітва Беларусі – ад 8 млн. у 1959 г. да 10,1 млн. у 1989 г. Але прырост асобных нацыянальнасцей быў розным. Калі колькасць рускіх узрасла прыблізна на 104 %, то беларусаў – толькі на 21 %. Колькасць яўрэяў зменшылася на 25 %, а палякаў – на 22,5 %. У колькасным вымярэнні перапіс 1989 г. даў наступныя вынікі: беларусаў – 7905 тыс., рускіх – 1342 тыс., палякаў – 418 тыс., украінцаў – 291 тыс., яўрэяў – 112 тыс., татараў – 12,5 тыс., цыганоў – 10,8 тыс., літоўцаў – 7,6 тыс., іншых – 53,5 тыс. Усё насельніцтва БССР складала прыблізна 10152 тыс. чал. Вынікі перапісаў 1959, 1970, 1979 і 1989 г. выразна паказалі рэальную пагрозу паступовага знікнення беларускай культуры, а разам з ёй і ўсёй беларускай нацыі[149]. Колькасць беларусаў сярод усяго насельніцтва рэспублікі змяншалася.

Сацыякультурная прастора Беларусі напрыканцы 1980-х гг. мела шэраг асаблівасцей: па-першае, паліэтнічны склад насельніцтва (пры тым, што каля 80 % насельніцтва называлі сябе беларусамі); па-другое, паліканфесіяналізм (у рэспубліцы захоўваўся даволі шырокі спектр рэлігійных рухаў), па-трэцяе, дзвюхмоўе (наяўнасць рускай і беларускай моў з яўнай перавагай рускай, якая з’яўлялася найбольш ужываемай і папулярнай). Імкненне ўладаў СССР да поўнай саветызацыі і русіфікацыі рабілі вельмі сумніўнымі перспектывы захавання і развіцця польскай, татарскай, яўрэйскай, літоўскай, украінскай і іншых культур на беларускай зямлі. У той жа час, як адзначае Н. Кутузава: “Шматгадовае пражыванне на адной тэрыторыі розных нацыянальных рэлігійных і моўных груп не прывяло да фарміравання галагеннага этнічнага і культурнага кангламерата”[150]. Кожная этнічная група з асаблівасцямі ўласных культурна-нацыянальных традыцый, з большага, засталася верная сваёй мове, звычаям, каштоўнасцям, светапоглядным комплексам, геапалітычным перавагам.

## 2.2 Асноўныя кірункі і асаблівасці партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да нацыянальных меншасцей БССР

Пэўная частка жыхароў, пераважна інтэлігенцыі, прымала ўдзел у стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, але значна больш насельніцтва выступала за Савецкую Сацыялістычную рэспубліку Беларусь (БССР). У праграмных дакументах абедзвюх рэспублік гарантавалася роўнасць усіх народаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі[151].

01.01.1919 г. пачынаецца перыяд існавання ССРБ (БССР). 16.01.1921 г. ССРБ і РСФСР заключылі паміж сабой ваенны і гаспадарчы саюз. Былі створаны сумесныя: вышэйшы савет народнай гаспадаркі; камісарыяты: ваенны і марскіх спраў, знешняга гандлю, фінансаў, працы, шляхоў зносін, пошты і тэлеграфу.

---

[149] *Смалянчук А.* Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў ХХ стагоддзі // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 1. Мінск, 2002. С. 157–167.

[150] *Кутузова Н.* Государство, нация, религия: опыт взаимодействия в Беларуси в контексте истории. С. 182.

[151] Даклад міністра па справах нацыянальных меншасцей БНР Жыблоўскага на імя Прэзыдэнта XII сіяніцкага кангрэса ў Карлсбадзе аб адносінах да яўрэяў // LCVA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 1 ; Хроніка для газет // Там жа. Спр. 1. Арк. 34 ; Вишневский А.Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995). Минск, 1995. С. 70–71 ; Часовы наказ мясцовым Беларускім Радам ад НС БНР // НАРБ. Ф. 325. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 26–26адв.

Аб'яднаныя наркаматы ўваходзілі ў склад СНК РСФСР. Агульнае кіраўніцтва ажыццяўлялася праз Усерасійскія з'езды саветаў і Усерасійскі ЦВК, у якія ССРБ дэлегавала сваіх прадстаўнікоў на аснове пастаноў Усерасійскага з'езда[152]. Беларуская рэспубліка з 1922 г. уваходзіла ў склад СССР, сузаснавальніцай якога яна з'яўлялася.

Савецкі перыяд у беларускай гісторыі – перыяд як стваральнай працы, так і значных разбуральных працэсаў у матэрыяльнай і духоўнай культуры ўсіх народаў, якія жылі ў БССР. Падзеі, якія адбываліся ў нашай краіне, не маглі не накласці адбітак на развіццё нацыянальных меншасцей Беларусі. Значная частка прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей разам з тытульным насельніцтвам з першых дзён удзельнічалі ў будаўніцтве сацыялістычнага грамадства.

Камуністычная партыя бальшавікоў безагаворачна ўспрымала і абараняла як фундаментальны тэзіс марксізму аб падначаленні нацыянальнага пытання справе класавай барацьбы пралетарыяту. Адначасова лідары кампартыі неаднаразова дэманстравалі гнуткасць і гатоўнасць да кампрамісаў у выбары пэўных форм вырашэння надзённых нацыянальных пытанняў у справе захавання і ўмацавання сваёй улады ці дасягнення праграмных мэтаў.

Пасля атрымання ўлады перад бальшавікамі паўстала, як першачарговая, задача зняць супярэчнасці, негатыўныя моманты, якія мелі месца ў нацыянальнай палітыцы Расіі. Толькі павярнуўшы на свой бок усе народы, якія жылі на яе тэрыторыі, можна было разлічваць на поспех у будаўніцтве новага грамадства. У Беларусі недавер і варожасць сярод насельніцтва розных нацыянальнасцей ускладняліся шэрагам абставін. Гэта ў першую чаргу рэлігійны фактар. Затым складанасць выклікала адрозненне нацыянальнага складу гарадскіх і сельскіх жыхароў. Вядома, што ў гарадах і мястэчках пераважала яўрэйскае насельніцтва, у вёсках – беларускае. Глыбокі псіхалагічны след, падазронасць паміж людзьмі, якія апынуліся не па сваёй волі на супрацьлеглых ваюючых баках, пакінула польска-савецкая вайна. Таму пасля заканчэння ваеннай кампаніі пытанні вырашэння нацыянальных праблем выйшлі на пярэдні план.

Важным актам на шляху абвяшчэння роўнасці, зняцця напружанасці паміж народнасцямі з'явілася "Дэкларацыя правоў народаў Расіі", прынятая 02(15).11.1917 г. Яна ўключала наступныя пункты: а) роўнасць і суверэннасць народаў Расіі; б) права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне, нават да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў; в) адмена ўсіх і ўсялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў; г) свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнаграфічных груп, якія насяляюць тэрыторыю Расіі. Для рэалізацыі на практыцы дэклараваных правоў народаў быў утвораны Наркамат па справах нацыянальнасцей, які ўзначаліў І. Сталін. Гэта была новая кіруючая структура ў сферы ўлады, якая адсутнічала раней у царскім і Часовым урадах. На гэта былі накіраваны адпаведныя пастановы з'ездаў Саветаў,

[152] Дагавор паміж РСФСР і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікай 1921 г. (копія) // LVCA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 1–2.

РКП(б), пленумаў ЦК. Пры камітэтах РКП(б) ствараліся аддзелы прапаганды і агітацыі для працы сярод нацменшасцей[153].

Кіруючая ў Савецкай Беларусі КП(б)Б з'яўлялася спачатку састаўной часткай РКП(б), а затым УсеКП(б) і функцыяніравала на правах яе абласной арганізацыі. Усе пастановы, рашэнні, якія прымаліся ЦК УсеКП(б), Палітбюро, аргбюро і г.д., з'яўляліся абавязковымі і для ЦК КП(б)Б. У БССР яны павінны былі рэалізоўвацца ў жыццё праз партыйныя арганізацыі, праз камуністаў, якія працавалі ў дзяржаўных, гаспадарчых, грамадскіх установах. Гэта тычылася любых дырэктыўных указанняў, нават вусных, тэлефонных, якія зыходзілі з агульнасаюзнага партыйнага цэнтра і яго аддзелаў.

Магчыма вылучыць наступныя перыяды ў палітыцы савецкага кіраўніцтва па дачыненні да нацыянальных меншасцей:

1) 1920–1928 гг. – перыяд рашучага пашырэння правоў усіх без выключэння нацыянальных меншасцей. Галоўнай асаблівасцю ў гэты час лічыўся вялікарускі шавінізм і з ім камуністычная партыя вяла рашучую барацьбу;

2) 1929–1935 гг. – перыяд значнага абмежавання правоў меншасцей, калі кіраўніцтва УсеКП(б) цалкам адмовілася ад супрацоўніцтва з прадстаўнікамі меншасцей, якія не з'яўляліся прыхільнікамі ідэй класавай барацьбы і пралетарскай ідэалогіі. Наступіў час барацьбы з "мясцовым нацыяналізмам";

3) 1936–1939 гг. – перыяд панавання цэнтрысцкіх тэндэнцый у нацыянальнай палітыцы. Час узмацнення рэпрэсій у дачыненні да ўсіх сацыяльных пластоў і груп нацменшасцей[154];

4) 1939–1945 гг. – перыяд дзейнасці ва ўмовах Другой сусветнай вайны. Адбылося ўз'яднанне беларускіх земляў у адзінай савецкай дзяржаве, што з'явілася найважнейшым палітычным актам у жыцці беларускага народа. Нацыянальныя меншасці адыгралі вялікую ролю ў змаганні з гітлераўскімі акупантамі, пры існаванні розных форм супрацоўніцтва з акупантамі пэўнай часткі насельніцтва;

5) 1945–1953 гг. – перыяд барацьбы супраць любых праяваў нацыянальнай самасвядомасці, якая нязменна характарызавалася як нацыяналізм, а таксама супраць нацыянальных традыцый і звычаяў, пры дэклараванні клопату пра далейшы росквіт нацыянальных культур;

6) 1954–1964 гг. – перыяд пэўнай дэмакратызацыі і лібералізацыі грамадскага жыцця пры нястомным змаганні з рэлігійнымі пачуццямі. Узмацненне тэндэнцыі, скіраванай на стварэнне наднацыянальнай сацыялістычнай супольнасці – савецкага народа, пры якой захаванне, не кажучы пра росквіт, культур нацменшасцей было не толькі абмежавана, а, нават, немагчыма;

7) 1965–1984 гг. – перыяд нарастання цэнтралізацыі і бюракратызацыі, узмацнення манапольнага становішча камуністычнай партыі і яе ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму, сяброўства і братэрства народаў пры найбольшай ролі вялікага рускага народа. Асаблівасцю перыяда было тое, што з

[153] Перапіска аб арганізацыі пры камітэтах РКП(б) аддзелаў прапаганды і агітацыі для працы сярод нацменшасцей. Жнівень 1919 – кастрычнік 1921 гг. // РДАСПГ. Ф. 17. Воп. 63. Спр. 8. Арк. 10–83.
[154] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. Мінск, 2008. С. 217.

Канстытуцыі зніклі палажэнні аб дзяржаўнай мове;

8) 1985–1991 год – перыяд адноснай дэмакратызацыі ў краіне, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыі грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей Беларусі.

**Рашучае пашырэнне правоў нацыянальных меншасцей БССР (1919–1929).** На палітыку дзяржаўнага кіраўніцтва ў адносінах да нацменшасцей паўплывалі тэрытарыяльныя змяненні межаў БССР. Трагічным вынікам кастрычніцкіх падзей стала грамадзянская вайна, якая прывяла да ганебнага адміністратыўнага падзелу ў 1921 г. тэрыторыі Беларусі паміж Польшчай і РСФСР. Заходняя Беларусь стала часткай Другой Рэчы Паспалітай (Польшчы). У 1919 г. па ваенна-палітычных меркаваннях усходняя Беларусь увайшла ў склад Савецкай Расіі, дзе да і пасля ўз’яднанняў (1924 і 1926) беларускіх зямель, на іх змяняўся статус беларусаў і рускіх як тытульнай супольнасці і меншасці.

У 1920-я гг. канцэпцыю шматнацыянальнай і цэнтралізаванай дзяржавы партыя бальшавікоў рэалізоўвала не з дапамогаю прымусовага захавання цэласнасці былой імперыі, а праз усталяванне фармальна незалежнай улады мясцовых камуністаў у нацыянальных раёнах на прынцыпах захавання ўсёй паўнаты кантролю над сітуацыяй у руках савецкай улады. Таксама, у сувязі з тым, што заходняя мяжа Савецкага Саюза праходзіла праз этнічныя тэрыторыі фінаў, беларусаў, украінцаў і румын, разлічвалі, што падкрэслена карэктнае абыходжанне з той часткай народаў, якія апынуліся ў СССР, прыцягне другую іх частку ў Польшчы, Фінляндыі і Румыніі, і вынікам гэтага стане барацьба гэтых народаў за ўз’яднанне пад савецкім сцягам. Увага надавалася развіццю культур не толькі прадстаўнікоў тытульных нацый рэспубік СССР, але і нацыянальных меншасцей, для іх таксама прадугледжвалася прадстаўленне шырокай нацыянальнай і, наперш, культурнай аўтаноміі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Нацыянальная палітыка бальшавікоў была сфармулявана на X (1921) і XII (1923) з’ездах КП(б). Прадугледжваліся наступныя важнейшыя мерапрыемствы ў галіне нацыянальных адносін: ліквідацыя эканамічнай адсталасці раней прыгнечаных народаў, паскоранае развіццё іх культуры, мовы, стварэнне на нацыянальнай мове кніжных выдавецтваў, сродкаў масавай інфармацыі, школ, хат-чытален, вылучэнне на адказную работу прадстаўнікоў мясцовага карэннага насельніцтва, перавод на нацыянальную мову справаводства і інш. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што з першых гадоў савецкай улады пэўная частка нацыянальных меншасцей была выключана з грамадска-палітычнага жыцця, бо была пазбаўлена выбарчых ці іншых праў з-за свайго сацыяльнага паходжання (былыя шляхта, гандляры, святары і г.д.). Але яна аказвала значны ўплыў на насельніцтва праз асабісты аўтарытэт. Напрыклад, у мястэчку Карма Магілёўскай акругі жыло каля 1500 чалавек. Яўрэйскае насельніцтва складала прыкладна 80 %, права голасу мелі 520 асоб і больш 400 былі пазбаўлены выбарчых правоў[155].

[155] Справаздача інструктара Галоўбюро яўсекцыі пры ЦК КП(б)Б Брукера // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 107. Арк. 54.

Кіруючыя колы БССР, якія дзейнічалі ў напрамку выканання пастаноў і рэзалюцый цэнтральных органаў улады, з першых дзён у адпаведных пастановах з'ездаў КП(Б)Б і саветаў, рашэннях выканаўчых органаў улады рэспублікі дэкларавалі роўнасць беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай моў і магчымасцей для прадстаўнікоў усіх нацыянальных супольнасцей.

На лютаўскай сесіі ЦВК саветаў Беларусі (1920) наконт мясцовых моў сказана было наступнае: "...Падцвярждаючы дэкрэт Саўнаркома Літбел ад 1919 г. аб поўным раўнапраўі ўсіх мясцовых моў, якімі ў межах ССРБ прызнаюцца мовы: беларуская, руская, яўрэйская і польская... ухваляючы палітыку Наркамасветбел, накіраваную да сапраўднага прадастаўлення ўсіх нацыянальнасцям Рэспублікі магчымасці атрымоўваць адукацыю і выхаванне, і развіваць сваю культуру на роднай мове, без якога бы там ні было прымусу да абучэння на мовах ім чужых..."[156].

Адпаведна ў "Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь", прынятай 31.07.1920 г., падкрэслівалася, што дзяржава "будзе будаваць сваё жыццё на аснове прыцягнення ў савецкае будаўніцтва самых шырокіх працоўных мас незалежна ад таго, да якой нацыянальнасці і вызначэння яны належаць. Абвяшчаецца поўнае раўнапраўе моў (беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай)"[157]. Зыходзячы з гэтага ў рэзалюцыі 2-га Усебеларускага з'езда Саветаў (1920) па дакладзе аб народнай асвеце падкрэслівалася неабходнасць "стварэння сеткі ўстаноў, усебакова абслугоўваючай культурныя патрэбы мас – на ўсіх мясцовых мовах, падрыхтоўкі да іх работнікаў асветы, выдання для іх літаратуры на мясцовых мовах і далучэння максімум камуністычных сіл да гэтай працы..."[158]. На пленуме ЦК КП(б)Б па нацыянальнай палітыцы ў кастрычніку 1926 г. настойліва прапаноўвалася, каб "…кіраўнікі ўсіх устаноў цэнтральных і мясцовых павінны забяспечыць свае апараты неабходнай колькасцю супрацоўнікаў, якія валодаюць мовамі нацыянальных меншасцей..." [159]. Забеспячэнне свабоднага эканамічнага і культурнага развіцця, раўнапраўе і павышэнне дабрабыту працоўных усіх нацыянальнасцей, стварэнне нацыянальных саветаў, роўнасць беларускай, рускай, яўрэйскай (ідыш) і польскай моў былі замацаваны ў Канстытуцыі БССР, якая была прынята 11.04.1927 г. VIII Усебеларускім з'ездам саветаў. 19.02.1937 г. XII надзвычайны з'езд саветаў БССР прыняў чарговую новую Канстытуцыю [160]. У яе змест быў перанесены з Канстытуцыі 1927 г. пункт аб чатырох дзяржаўных мовах. Аднак у канцы ліпеня 1938 г. гэты пункт быў выдалены, пры чым, у пастанове Вярхоўнага Савета БССР адзначалася, што выдаленне ідыша і польскай мовы з

---

[156] Матэрыялы сесіі ЦВК. 1920 г. // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 16.

[157] У 1918 г. Народны сакратарыят БНР аб'явіў беларускую мову – дзяржаўнай. Нацыянальным меншасцям прадстаўлялася права карыстацца сваёй мовай у афіцыйных зносінах з дзяржаўнымі ўстановамі. Планавалася выпускаць боны ў якіх галоўны тэкст на беларускай мове, другасны на яўрэйскай, польскай і рускай мовах. Хроніка для газет // LCVA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 34.

[158] Матэрыялы II Усебеларускага з'езда саветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 14–15.

[159] Матэрыялы Пленума ЦК КП(б)Б // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2479. Арк. 58.

[160] *Вишневский А.Ф.* Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995). Минск, 1995. С. 70–71.

Канстытуцыі не азначае ўшчамлення правоў іх носьбітаў[161]. Трэба падкрэсліць, што ў міжваенны час арганізацыйная праца савецкага (АВК, РВК) і партыйнага (АК, РК КП(б)Б) апаратаў, у асноўным вялася па-беларуску і на мовах нацыянальных меншасцей у месцах іх кампактнага пражывання, дзе існавалі нацыянальныя саветы.

22–25.11.1920 г. адбыўся ІІІ з'езд КП(б)Б. На ім было вырашана, каб у дзяржаўныя ўстановы і органы ўлады рэспублікі ўваходзілі прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць на яе тэрыторыі. Пачалася праца па арганізацыі органаў кіравання справамі нацыянальных меншасцей. З'езд выказаўся за стварэнне нацыянальных бюро пры ЦБ, а пазней ЦК КП(б)Б. У сакавіку 1921 г. у БССР, па прыкладу РСФСР, быў утвораны Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей, які ўзначаліў М. Кіпер[162]. Наркамнац БССР праіснаваў нядоўга і рашэннем ЦБ КП(б)Б ад 13.01.1922 г. быў канчаткова ліквідаваны[163]. Далей у Савецкай Беларусі арганізоўвалі і кіравалі працай сярод нацыянальных меншасцей нацыянальныя бюро пры КП(б)Б, Нацыянальная камісія пры Прэзідыуме ЦВК БССР, а з 1934 года Аддзел нацыянальнасцей.

КП(б) трымала пад жорсткім кантролем кіруючыя пасады па рабоце з нацыянальнымі меншасцямі. Зацвярджала ўсё больш-менш значныя пасады, загадчыкаў аддзелаў і г. д. 06.01.1922 г. на пасяджэнні ЦК КП(б)Б быў зацверджаны склад польбюро, 20.03.1922 г. – Галоўбюро яўрэйскай секцыі пры ЦК КП(б)Б, 14.07.1924 г. – латышскае[164], 1925 г. – літоўскае бюро. Ва ўсходняй частцы Беларусі, якая на той час уваходзіла ў склад РСФСР, існавалі падобныя структуры як на рэспубліканскім (на прэзідыуме Белбюро ЦК РКП(б) 19.03.1920 г. быў зацверджаны склад польскага і яўрэйскага бюро), так і рэгіянальных узроўнях РКП(б)[165]. На бюро ЦК КП(б)Б 15.12.1925 г. былі зацверджаны: сакратарыят нацыянальных бюро (яўрэйскага, латышскага, польскага) і адзіныя назвы для мясцовых секцый: "еўбюро", "латбюро", "польбюро", якія ўтвараліся ў акругах пры акруговых камітэтах КП(б)Б. Яны праіснавалі да пачатку 1930 г. У рэгіянальных дакументах таго часу ў адносінах да дадзеных структурам паралельна сустракаюцца дзве назвы – "бюро" і "секцыя", якія мелі адно значэнне.

Яўрэйскае бюро ЦК КП(б)Б існавала са снежня 1920 г. З 1922 г. называлася Галоўнае бюро яўрэйскай секцыі. Кіравала дзейнасцю яўрэйскіх секцый пры мясцовых арганізацыях КП(б)Б. Узначальваў бюро А. Бейлін. Польскае бюро пры

---

[161] Пастанова ВС БССР // Звязда. 1938. 28 ліп. ; *Зельцер А.* Евреи советской провинции: Витебск и местечки. 1917–1941. М., 2006. С. 198, 384.

[162] Пастанова СНК і прэзыдыума ЦВК ССРБ "Аб заснаванні Народнага камісарыята па справах нацыянальнасцей", 1921 г. // ДАГАМаг. Ф. 6573. Воп. 1. Спр. 79. Арк. 1 ; Пратакол пасяджэння ЦБ КП(б)Б № 2 ад 3.03.1921 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 425. Арк. 32.

[163] Пратакол пасяджэння ЦБ КП(б)Б № 15 ад 13.01.1922 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 693. Арк. 4 адв.

[164] Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 102.

[165] Пратакол Цэнтральнага літоўскага камітэта // LMAVB RS. Ф. 21. Спр. 985. Арк. 3–3адв ; Пратаколы агульных сходаў грамадзян літоўскай нацыянальнасці ў в. Сафійск Чавускага і в. Малькаўка Чэрыкаўскага паветаў Гомельскай губерніі наконт арганізацыі літоўскай секцыі пры губкоме РКП(б). 1921 г. // РДАСПГ. Ф. 17. Воп. 63. Спр. 29. Арк. 1–2 адв., 5–5 адв. ; Пратакол пасяджэння літоўскай секцыі пры Гомельскім губкоме РКП(б). 16.08.1921 г. // Там жа. Спр. 30. Арк. 38–41 ; Справаздача польбюро пры ЦК КП(б)Б па паветах за 1921 г. // Там жа. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 253. Арк. 3–3адв., 4–5, 10–14 ; Пратаколы пасяджэнняў польбюро пры ЦК КП(б)Б за 1928 г. // Там жа. Спр. 380. Арк. 1–37

ЦК КП(б)Б дзейнічала з пачатку 1920-х гг. да 1929 г. у Мінску. Сакратарамі польбюро ў розны час былі Цесьляк, В. Шаля, В. Внароўскі і інш. Латышскае бюро ЦК КП(б)Б працавала ў 2-й палове 1920-х гг. У розны час ў кіраўніцтва ўваходзілі А. Думс, Клявін, Кулен. З 1927 г. латышскае бюро ЦК КП(б)Б складалася з 11 членаў і 5 кандыдатаў. Існаваў прэзідыум латышскага бюро – 5 чалавек, з іх 2 штатных. Штатныя работнікі (сакратары) былі ў Полацкай, Віцебскай, Магілёўскай акругах. Літоўскае бюро ЦК КП(б)Б узнікла ў 2-й палове 1920-х гг. З 1926 г. сакратар А. Недварас (псеўданім Ёнас Бучукас). У 1929 г. у Літоўскае бюро ЦК КП(б)Б ўваходзіў С. Матулайціс[166].

Нацыянальныя бюро пры ЦК КП(б)Б выконвалі наступныя асноўныя задачы: вядзенне агітацыі і прапаганды сярод рабочых і беднаты адпаведнай нацыянальнасці, палітычнае выхаванне членаў партыі з ліку нацыянальнай супольнасці, барацьба супраць уплыву буржуазіі і дробнабуржуазных груп на працоўныя масы і інш. А таксама кіравалі дзейнасцю латышскіх, літоўскіх, польскіх, яўрэйскіх секцый пры мясцовых арганізацыях КП(б)Б. Польбюро намагалася ўзаконіць палітазаванае атаясамляванне часткі беларускага этнасу каталіцкага веравызнання з польскай нацыянальнай прыналежнасцю. Нацыянальныя бюро пры ЦК КП(б)Б, сярод іншага, кантралявалі і дзейнасць Наркамасветы ў справе працы нацыянальных школ, падрыхтоўкі настаўнікаў для гэтых школ і г.д. Выдавалі свае перыядычныя выданні: на польскай мове – газеты “Młot” (“Молат”) і “Orka” (“Ворыва”), на літоўскай “Raudonasis Artojas” (“Чырвоны араты”). У верасні – кастрычніку 1927 г. латышскае бюро выдала газету-аднадзёнку, прысвечаную 10-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Іншыя спробы бюро арганізаваць выданне латышскай перыёдыкі ў БССР поспеху не мелі.

У 1920-я гг. польскія секцыі (бюро) існавалі пры Бабруйскім, Барысаўскім, Віцебскім, Калінінскім і Мінскім, латышскія пры Полацкім, Віцебскім, Барысаўскім, Магілёўскім, Калінінскім і Бабруйскім, літоўскія пры Віцебскім і Аршанскім акруговых камітэтах КП(б)Б[167]. Сярод гарадской і вясковай моладзі працавалі латышскае і польскае бюро пры ЦК ЛКСМБ, а таксама мясцовыя польбюро ЛКСМБ у некаторых акругах. У Віцебскай акрузе меўся штатны работнік па працы сярод латышоў у АК ЛКСМБ[168]. Паступова дзейнасць нацыянальных секцый пры партыйных структурах была абмежавана толькі агітацыйна-прапагандысцкай працай. У 1924 г. ЦК КП(б)Б даслала сакрэтны ліст у польбюро, еўбюро, латбюро, дзе паведамлялася, што “ніводная кампанія і

[166] *Пушкін І.А.* Дзейнасць нацыянальных бюро ў складзе партыйных органаў БССР на працягу 1920–1930-х гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., 18–19 апреля 2013 г. Могилев, 2013. С. 131–133 ; Справаздача // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3637. Арк. 38

[167] Анкеты аб працы польскіх секцый пры мясцовых партыйных арганізацыях БССР // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 255. Арк. 1–6 ; Пратакол пасяджэння літоўскай секцыі пры Мінскім губкоме КП(б)Б // Там жа. Ф. 17. Воп. 63. Спр. 30. Арк. 42–44 ; Пратакол пасяджэння польбюро пры Магілёўскім павятовым камітэце РКП(б) // Там жа. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 260. Арк. 4–6 ; Справаздачы польбюро Чэрвеньскага павятова-гарадскога камітэта // Там жа. Спр. 612. Арк. 5–21 ; Справаздачы Польскіх секцый ў паветах БССР аб працы польскіх школ, хат-чытален і г.д. // Там жа. Спр. 253. Арк. 50–72.

[168] Інфармацыя аб працы сярод латышскага насельніцтва // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 12. Спр. 36. Арк. 38

палітычная праца не можа праводзіцца з боку загадчыкаў аддзелаў без санкцыі Сакратарыята ЦК і з боку пададдзелаў без санкцыі Аддзелаў ЦК"[169].

Нацыянальныя бюро (секцыі) правялі беспартыйныя канферэнцыі польскіх працоўных і губернскі з'езд польскіх работнікаў асветы ў Віцебску (1920, 1921), Полацку (1921), агульны сход настаўнікаў польскіх школ у Магілёве (1921)[170], сумесна з Нацкамісіяй ЦВК БССР: 1-ы Усебеларускі з'езд палякаў-сялян БССР (1926)[171], 2-гі Усебеларускі з'езд працоўных палякаў (1929), выбары дэлегатаў на Сусветны з'езд палякаў (1929), 1-ы Усебеларускі з'езд сялян-латышоў (1926), 1-ы Усебеларускі з'езд сялян-літоўцаў (1928). У канцы 1929 г. пад кіраўніцтвам латышскага бюро адбыліся 3-я Усебеларуская нарада латышоў-партработнікаў і 2-гі Усебеларускі з'езд (кангрэс) сялян і рабочых латышоў[172].

Стварaўся вялікі штат вызваленых работнікаў. Так, напрыклад, у 1925–26 гг. нацыянальнай працай сярод польскага насельніцтва ў БССР займаліся штатныя работнікі наступных устаноў: польбюро ЦК КП(б)Б у складзе трох чалавек: сакратара, інструктара і тэхнічнага работніка; польбюро Наркамасветы – 4 чалавека, з іх тры адказныя работнікі (у 1927 г. польбюро пры ЦК КП(б)Б ліквідавала польбюро пры НКА, пакінуўшы толькі шэсць інспектараў асветы сярод польскага насельніцтва: у Мінскай, Віцебскай, Полацкай, Магілёўскай і Аршанскай (аднаго на дзве акругі), Гомельскай, Бабруйскай акругах) [173]; польбюро ЦК ЛКСМБ – 1 штатны сакратар; сакратароў акруговых польбюро КП(б)Б – 10 (па адным у акрузе); інструктараў полькультуры ў акругах – 9; штатных райпольупаўнаважаных – 5; штатных акруговых сакратароў калегій польбюро – 3; штатных упаўнаважаных – 61. Да іх трэба далучыць і мясцовы актыў, які праводзіў працу спалучаючы яе з іншымі абавязкамі. Актыў КП(б)Б па рабоце сярод палякаў складаў 229 чалавек, у камсамоле 136 чалавек[174].

На бюро ЦК КП(б)Б 04.03.1926 г. была зацверджана, узгодненая прапанова НКА і нацкамісіі, аб увядзенні ў штат НКА інспектара па літоўскай культуры; 27.03.1926 г. быў прызначаны загадчык яўрэйскага аддзела Інбелкульта; 17.04.1930 г. было прызнана было неабходным увядзенне ў ЦС ПСБ інструктара па рабоце сярод нацменшасцей[175] і г.д. У 1926 г. у Магілёўскай акрузе былі штатныя ўпаўнаважаныя па працы сярод латышоў у пяці раёнах[176], упаўнаважаныя па працы сярод латышоў і яўрэяў меліся ў Калінінскай акрузе, дзе пры акруговым прафбюро быў упаўнаважаны па працы сярод яўрэяў членаў прафсаюза[177]. Нягледзячы на

---

[169] Ліст ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1917. Арк. 101.

[170] Пратаколы І беспартыйнай канферэнцыі польскіх працоўных, з'езда польскіх работнікаў асветы // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 258. Арк. 11–91 ; Інфармацыя аб І беспартыйнай канферэнцыі польскіх працоўных у г. Полацку // Там жа. Спр. 261. Арк. 2–4 ; Пратакол агульнага сходу настаўнікаў польскіх школ у Магілёве // Там жа. Спр. 260. Арк. 17–18 адв.

[171] Пратаколы І-га Усебеларускага з'езда сялян палякаў у Мінску 28.02.–3.03.1926 г. // Там жа. Спр. 381. Арк. 1–55.

[172] Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 90.

[173] Інфармацыя АВК // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 306. Арк. 128

[174] Справаздача польбюро // Там жа. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 938. Арк. 51

[175] Матэрыялы пасяджэнняў бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1274, 2006, 2005, 2532, 4761 ; *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХ ст.). Магілёў, 2004. С. 24–25

[176] Справаздача Магілёўскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 964. Арк. 46

[177] Справаздача Калінінскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 401. Арк. 19 адв.

значную колькасць штатных работнікаў, нацыянальная работа на месцах насіла несістэмны характар.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны маладая савецкая рэспубліка знаходзілася ў надзвычай цяжкім эканамічным становішчы. Страшную карціну спусташэння ўяўлялі сабой большасць раёнаў Беларусі. Прамысловасць, сельская гаспадарка і транспарт былі амаль спустошанымі[178]. Гаспадарчая разруха, спад прамысловай вытворчасці стварылі велізарныя цяжкасці ў забеспячэнні насельніцтва прамысловымі таварамі і харчаваннем. Працоўны клас, які вынес на сваіх плячах цяжар грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, знаходзіўся ў стане дэкласіравання і распылення. Шматлікія працоўныя, ратуючыся ад голаду, сышлі ў вёску або заняліся саматужнай працай. Сярэднегадовая колькасць працоўных у прамысловасці скарацілася, у прыватнасці на Магілёўшчыне амаль на 25 %[179]. Сур'ёзныя змены адбыліся і ў структурным складзе працоўнага класа.

Савецкі ўрад, бачачы незадаволенасць і масавыя ўзброеныя выступы народных масаў [180], адмовіўся ад палітыкі "ваеннага камунізму", што дазволіла не дапусціць сацыяльнага выбуху і спрыяла ажыўленню ў эканоміцы. Быў праведзены шэраг эканамічных мерапрыемстваў, якія атрымалі назву "новая эканамічная палітыка" (НЭП). На час іх рэалізацыі прыпадае перыяд правядзення беларусізацыі – найбольш удалай палітыкай у сферы нацыянальнага будаўніцтва ў БССР, якая паспрыяла культурнаму росквіту нацменшасцей на іх прыродным грунце. Ад палітыкі беларусізацыі найбольшую карысць атрымалі яўрэі, латышы, літоўцы, палякі і нават рускія.

Значны ўплыў на нацыянальна-дзяржаўныя працэсы аказваў і знешнепалітычны фактар. БССР знаходзілася на мяжы паміж дзвюма "варожымі сістэмамі" – сацыялістычнай і капіталістычнай, што накладвала адбітак на ўсе бакі жыцця грамадства. Паралельна з агульнымі, так званымі сацыялістычнымі пераўтварэннямі тут рэалізоўваўся комплекс мерапрыемстваў па забеспячэнні надзейнасці заходніх рубяжоў СССР. У 1923 г. была афіцыйна зацверджана спецыяльная адміністрацыйная тэрыторыя – пагранічны рэгіён. Гэты рэгіён павінен быў стаць вітрынай сацыялізма і выкарыстоўвацца для пашырэння ўплываў на Захад. У адпаведнасці з пастановай Палітбюро ЦК ад 16.07.1925 г. для

---

[178] Каля 65 % прамысловых прадпрыемстваў было разбурана, а іх абсталяванне вывезена. Большая частка ацалелых фабрык і заводаў праз адсутнасць сыравіны і паліва працавала з перабоямі або зусім бяздзейнічала. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў 1920 годзе складаў усяго толькі 23,3 % да ўзроўня 1913 г.

[179] *Агеев А.Г., Пушкин И.А.* История профсоюзного движения Могилёвщины. Могилёв, 2005.

[180] *Пушкін І.А.* Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады ХХ ст.): дакументы і матэрыялы. Мінск, 2009 ; Стужынская Н.І. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву: 20-я гг. ХХ ст. Вільня, 2000 ; Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах / Ул. Ляхоўскі, Ул. Міхнік, А. Гесь. Мінск, 2001 ; Борьба за Советскую власть в Белоруссии 1918–1920 гг. / Сб. дакум. и матер. В 2-х т. Минск, 1968. Т. 1 ; 1971. Т. 2 ; *Віцьбіч Ю.* Антыбальшавіцкія паўстанні і партызанская барацьба на Беларусі. Нью-Ёрк, 1996 ; *Грыцкевіч А.П.* Булак–Балаховіча паход 1920 // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2. Мінск, 1994. С. 122 ; *Маль К.* Антыбальшавіцкі рух у Беларусі ў 1919–1921 гг. // Беларускі гістарычны агляд. 1999. Т. 6. Сш. 1–2. С. 49–71 ; *Кузьміч В.* Барацьба з нелегальнымі ўзброенымі фарміраваннямі на беларускім участку савецка-польскага памежжа (1921–1926 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2008. № 5. С. 18–26 ; Доклад литовскому правительству о политическом состоянии Белоруссии. 29.03.1921 г. // LCVA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 1–9 ; Ліст Цэнтральнай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны аб арганізацыі Беларускага нацыянальнага войска // Там жа. Ф. 306. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 1–1адв.

пагранічнага рэгіёна ўстанаўліваўся шэраг льгот, найперш, большыя інвестыцыі, лепшае забеспячэнне таварамі, вышэйшая зарплата для спецыялістаў, стварэнне шырокай сеткі культурна-асветных устаноў і інш. Таксама ўстанаўлівалася спецыяльная палітыка ў адносінах да нацыянальных меншасцей у пагранічным рэгіёне. Тут павінна было быць больш нацыянальных школ, тэрытарыяльных утварэнняў, прэсы на мовах, рашучае падаўленне расійскага шавінізма[181].

У 1929 г. паняцце "пагранічны рэгіён" было пашырана. Яно ўключала не толькі ўсе раёны, якія прылягалі да мяжы, але і тыя, што прылягалі да гэтых раёнаў. Памежжа, што праходзіла па тэрыторыі БССР, у канцы 1920-х гг. уключала 40 раёнаў: 7 апорных і 33 раёны першай і другой зон[182]. Урадам краіны быў распрацаваны комплекс прыярытэтных напрамкаў развіцця пагранічных раёнаў, які ўключаў у сябе шырокі спектр ваенных, палітычных, эканамічных і культурных мерапрыемстваў[183].

Вялікую ролю ў правядзенні нацыянальна-дзяржаўная палітыкі адыгралі рашэнні VII з'езда КП(б)Б (20–26.03.1923). У дакладзе А. Чарвякова "Нацыянальныя моманты ў савецкім і партыйным будаўніцтве" былі пастаўлены задачы пашырэння тэрыторыі БССР, канцэнтрацыі кіраўніцтва ўсёй нацыянальна-культурнай працай у руках КП(б)Б, правядзення саветызацыі беларускіх мас пры дапамозе іх роднай мовы[184]. 15.07.1924 г. ЦВК БССР прыняў пастанову "Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі". Мясцовыя ўлады БССР сталі актыўна праводзіць наступныя практычныя мерапрыемствы па правядзенню нацыянальнай палітыкі: выяўленне нацыяльнага складу дзяцей і арганізацыя нацыянальных школ з пераводам выкладання навуковых прадметаў на родную мову, абслугоўванне жыхарства ў палітасветных установах на роднай мове, забяспячэнне літаратурай на роднай мове і іншае. Адбываўся перавод справаводства дзяржаўных, грамадскіх і партыйных інстытутаў на нацыянальныя мовы і наданне асаблівай увагі ўсебаковаму развіццю адукацыі і навукі на мове меншасці ў патрэбным ідэалагічным кірунку.

Вялікая ўвага надавалася кадравай палітыцы, што было неабходна для безумоўнага падпарадкавання і дакладнага выканання ўказанняў зверху. Гэта было асабліва важным пры правядзенні нацыянальнай палітыкі і для работы з найбольш актыўнай часткай прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Праводзілася так званая "карэнізацыя". Пад ёй разумелася вылучэнне на адказныя пасады ў дзяржаўным і партыйным апараце нацыянальных тэрыторый прадстаўнікоў дадзенай меншасці (гл. раздзел 3.2).

---

[181] *Terry Martin*. The Affairmative Action Empire: Nations and Nationalism in the Soviet Union, 1923–1939. Ithaca, NY and London: Cornell University Press, 2001. P. 315–316 ; *Терри Мартин*. Империя «положительной деятельности». Нации и национализм в СССР, 1923–1939. М., 2011.

[182] *Раманава I.* Жыццё ва ўмовах савецкага пагранічча. Беларускае пагранічча па савецкі бок дзяржаўнай мяжы ў 1930-я гг. // Памежжы Беларусі ў міждысцыплінарнай перспектыве. Warszawa, 2007. С.73.

[183] Матэрыялы аб мерапрыемствах па ўмацаванню памежных раёнаў БССР // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6309. Арк. 115.

[184] Нацыянальнае пытанне і Камуністычная партыя: Зб. артыкулаў, прамоў і пастаноў. Менск, 1924. С. 204–205, 208 ; *Пурышева Н.М.* «Фактор БНР» в культурной политике БССР (начало 1920-х гг.) // Романовские чтения – 5: сб. трудов Международной науч. конференции. Могилёв, 2009. С. 159

Варта адзначыць, што ў даваенны час амаль паўсюль удзельная вага нацыянальных меншасцей у кіруючых органах партыінай, прадстаўнічай і выканаўчай улады на цэтральным і мясцовым узроўнях была вышэйшая за іх працэнт у агульным складзе насельніцтва БССР. Але паступова ў шэрагах кампартыі павялічвалася колькасць тытульнага насельніцтва і памяншалася прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Гэта тлумачыцца як правядзеннем беларусізацыі, так і павышэннем адукацыйнага ўзроўню, далучанасці да грамадска-палітычных працэсаў беларускага насельніцтва.

Важным напрамкам нацыянальнай работы з'яўляліся выбарчыя кампаніі. Сярод іх варта вылучыць удзел нацыянальных меншасцей у выбарах і працы Усебеларускіх з'ездаў, рэспубліканскіх і мясцовых органах кіравання – саветах і выканкамах (гл. раздзел 3.2).

Райкамам КП(б)Б, нацыянальным бюро ў лістах вышэйшых партыйных органаў, пад грыфам "зусім сакрэтна", наконт правядзення розных "кампаній", якія праходзілі быццам бы па ініцыятыве працоўных, вельмі падрабязна распісвалася: дзе павінны з'явіцца ініцыятывы, як агітаваць, што казаць, як рыхтаваць актывістаў і г.д. Асабліва шмат стала такіх інструкцый пасля 1927 г.

У лісце ЦК КП(б)Б да ўсіх акружкомаў КП(б)Б у снежні 1927 г. наконт пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб скліканні 20.01.1928 г. Усебеларускага з'езда яўрэяў-сялян пісалася, што "... на з'ездзе будуць падведзены вынікі ўсіх мерапрыемстваў партыі і савецкай улады, а таксама дасягненні ў справе землеўладкавання яўрэяў, пагэтаму ён мае вялікую палітычную значнасць" [185]. Прадпісвалася напярэдадні правесці раённыя з'езды сялян-яўрэяў. Мясцовым уладам загадвалася выбіраць дэлегатамі актыўных сялян ад калгасаў і аднаасобнікаў з беднаты і серадмякоў. Падсумоўваючы вынікі Усебеларускага з'езда, улады адзначалі яго значнае грамадскае значэнне[186].

У выступленнях дэлегатаў адчуваўся пэўны недавер да мясцовых улад. А менавіта яны і з'яўляліся канкрэтнымі выканаўцамі пастаноў і дзеянняў вышэйстаячых уладаў. У іх не было магчымасцей ў сваіх дзеяннях для манеўру паміж заявамі і канкрэтнымі справамі. З аднаго боку, на словах, заклік да актыўнасці мас, з другога боку, фарміраванне аўтарытарызму і таталітарызму, якія прадугледжвалі: прадвызначанасць рашэнняў вузкім колам асоб, усеагульную падтрымку і адсутнасць іншадумства і ініцыятывы. Імкнучыся застацца пры ўладзе ў такіх варунках, сваімі дзеяннямі мясцовыя ўлады выклікалі шматлікія заўвагі з боку мас, іх недавер да нацыянальнай працы.

Улады вымушаны былі прыслухоўвацца да прапаноў, якія гучалі на з'ездах і пераўтвараць у жыццё пэўныя пастановы, безумоўна, толькі ў рэчышчы камуністычнага будаўніцтва (адкрываліся нацыянальныя школы, але толькі савецкага тыпу; кааперацыя з 1928 г. разумелася толькі як калектывізацыя – стварэнне калгасаў, а не варыянт розных тыпаў кааперацыі: арцелей, таварыстваў, кааператываў і г. д.).

[185] Ліст ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3618. Арк. 13.
[186] Справаздача // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3618. Арк. 65.

Адным з важных напрамкаў нацыянальнай палітыцы было стварэнне ў месцах кампактнага пражывання прадстаўнікоў пэўных нацыянальнасцей нацыянальных саветаў – сельскіх і местачковых (гл. раздзел 3.2). Гэтыя дзеянні знаходзілі падтрымку з боку прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Мала таго, яны жадалі быць аб’яднаны толькі ў свае нацыянальныя адміністратыўныя адзінкі. Напрыклад, латышы Быхаўскага раёну падкрэслівалі: “Мы не жадаем быць у іншых сельсаветах” і спецыяльна прыязджалі за 20 км у цэнтр латышскага сельсавета[187]. Утварэнне нацыянальных раёнаў і сельскіх (местачковых) саветаў было выклікана пастановай III Усесаюзнага з’езда саветаў (май 1925) “Аб савецкім будаўніцтве”. З’яўляючыся органам савецкай улады ў вёсцы, нацыянальныя сельскія саветы выконвалі неабходныя функцыі ў адміністрацыйнай, гаспадарчай і культурнай сферах. У лістападаўскай пастанове Прэзідыўма ЦВК БССР аб рабоце нацсаветаў (1927) адзначалася, што “арганізацыя нацсаветаў з боку палітычнага і практычнага ў поўнай меры сябе апраўдала”[188].

Даследчык М. Каралёў сцвярджае, што сучасныя гісторыкі ў большасці сваёй разглядаюць стварэнне нацыянальных сельскіх саветаў як з’яву негатыўную, падкрэсліваючы бесперспектыўнасць і навязанасць дадзенай формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага складу. Так як меркавалася ў ходзе пабудовы камунізму збліжэнне і зліццё ўсіх груп у адзіны савецкі народ, то драбненне тэрыторыі па нацыянальнай прыкмеце ў сярэдзіне 1920-х гг. ўяўлялася як своеасаблівы “нацыянальны нэп”, часовая і невялікая саступка нацыяналістам, неабходная ў прапагандысцкіх мэтах. Пры гэтым М. Каралёў спасылаецца толькі на адно расійскае дысертацыйные даследаванне. Адначасова робіць выснову, што стварэнне нацыянальных сельскіх саветаў у БССР было заканамерным вынікам завяршыўшыхся на агульнасаюзнай узроўні дэбатаў пра склад савецкай дзяржавы і адзінай форме самавызначэння народаў, на якую быў гатовы пайсці бальшавіцкі ўрад. Стварэнне нацсельсаветов цалкам было рашэннем “зверху”, у якім уласна жаданьне народу ўлічвалася толькі фармальна. Аднак гэтая ініцыятыва была пазітыўна ўспрынята нацыянальнымі меншасцямі, якія максімальна імкнуліся выкарыстаць прадставіўшыяся магчымасці для свайго эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця. Большага не дазваляла дасягнуць ўзрастаючая бюракратызацыя краіны. Станоўчыя вынікі для насельніцтва, на жаль, не сталі такімі для ўладаў. І дзяржава, якая ў сярэдзіне 1920-х гг. актыўна заахвочвала і развівала нацыянальную разнастайнасць, ужо з мяжы 1920–1930-х гг. стала бачыць у ёй пагрозу і пачынае караць за нацыянальныя асаблівасці (апагеем гэтага стануць нацыянальныя аперацыі ў гады вялікага тэрору). Згуртаванне народа ў дзяржаву-крэпасць перад пагрозай вайны патрабавала ліквідацыі ўсіх патэнцыйных ачагоў сепаратызму, якімі і сталі нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Існаванне нацыянальных сельскіх саветаў у БССР было з’явай з многім “часткова” – часткова натуральным, часткова ахапіўшым, часткова паспяховым. Гэта была даволі нядрэнная задумка вырашэння нацыянальнага

[187] Матэрыялы абследавання // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 112. Арк. 61.
[188] Два гады нацыянальнай работы ў БССР: Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні. Менск, 1929. С. 148 ; Пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 7–8.

пытання ў шматнацыянальнай краіне, рэалізаваць якую ў поўнай меры не дазволіла бачанне іншага будучага цэнтральнымі органамі ўлады[189].

На тэрыторыі БССР савецкай уладаю ствараліся і дзейнічалі на мовах нацыянальных меншасцей школы, аддзяленні пры сярэднеспецыяльных і вышэйшых навучальных установах, культурна-асветныя ўстановы, друкаваліся перыядычныя выданні і літаратура (гл. раздзел 3.3.). Пры гэтым у сферы адукацыі прасочваюцца дзве тэндэнцыі. З аднаго боку дэкларуецца імкненне да павелічэння колькасці нацыянальных школ. З другога боку, нягледзячы на тое, што існаваў план пашырэння колькасці нацыянальных школ, пачынаецца працэс паступовага скарачэння вышэйзгаданых школ. Так, у 1926 г. паводле пастановы СНК БССР НКА БССР разаслаў сакрэтны абежнік (цыркуляр) аб парадку пераводу школ, абслугоўваючых дзяцей беларусаў-католікаў, з польскай мовы выкладання на беларускую, а вясной 1929 г. бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла канчаткова ліквідаваць выкладанне польскай мовы як прадмета ў беларускіх школах[190]. Адукацыя і асвета на нацыянальных мовах з’яўлялася сродкам саветызацыі нацыянальных меншасцей.

У практыцы работы ўладных структур адзначаўся пільны нагляд за творчай і навуковай інтэлігенцыяй, бо многія яе прадстаўнікі займалі актыўную пазіцыю ў шмат якіх пытаннях грамадска-палітычнага і культурнага жыцця. КП(б) імкнулася дыферэнцыраваць і раскалоць нацыянальную інтэлігенцыю, каб знішчыць антысавецкія настроі. З 1920-х гг. распачынаецца супрацьстаянне кіраўніцтва і творчай інтэлігенцыі. Прадстаўнікам інтэлігенцыі нацыянальных меншасцей прыходзілася дзейнічаць ва ўмовах татальнага сачэння, калі іх дзейнасць не толькі кантраліравалася, але вывучаліся нават намеры. У сувязі з гэтым можна вызначыць дынаміку адносін кіраўніцтва БССР да інтэлігенцыі нацменшасцей.

Напачатку, у сярэдзіне 1920-х гадоў, ЦК КП(б)Б лічыў, што значная частка інтэлігенцыі зрусіфіцыравана, яна і большасць вялікарускай інтэлігенцыі менш актыўныя ў грамадска-палітычных пытаннях, быццам бы яны адрозніваліся моцнымі антыбеларускімі настроямі і неразуменнем нацыянальнай палітыкі ўладаў Савецкай Беларусі, моцна стоячы на пазіцыях вялікадзяржаўнага шавінізму. У другой палове 1920-х гадоў прадстаўнікі інтэлігенцыі нацменшасцей актыўна ўключыліся ў культурныя і грамадскія працэсы, але іх творчая дзейнасць хутка стала разглядацца як праявы варожага нацыяналізму. Асабліва тое, што не адпавядала афіцыйнаму курсу КП(б)Б, яе дактрыне. Ад актыўных прадстаўнікоў нацменшасцей запатрабавалі праводзіць выхаванне ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму[191].

---

[189] *Королёв М.* Латышские национальные сельсоветы как явление в национальной политике БССР // Латыши и белорусы: вместе сквозь века: ежегодный научный журнал. Вып. 6. 2017. С. 30–37 ; Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 110–111.

[190] Цыркуляр НКА БССР // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 266. Арк. 55.

[191] Ліст ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2481. арк. 156 ; Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. Минск, 2001. С. 63 ; Ітогі і бліжэйшыя задачы правядзення Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР / Пастанова аб’яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. Менск, 1934. С. 14 ; Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч. 2: Работа среди нац. меньшинств в БССР. Минск, 1928 ; *Сянкевіч А.* За ленінскую лінію ў нацыянальнай палітыцы. Менск, 1931.

Важным напрамкам нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі былі адносіны да партый і грамадскіх аб'днанняў нацыянальных меншасцей. Тагачасныя грамадска-палітычныя аб'яднанні, якія былі ў асяродку нацыянальных меншасцей, можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Да першай адносіліся тыя, якія падтрымлівалі савецкую ўладу і існуючы дзяржаўны лад, ці былі лаяльнымі да іх, альбо былі заснаваны і працавалі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Да другой адносіліся тыя, чыя дзейнасць знаходзілася ў "апазіцыі" да існуючай улады (гл. раздзел 3.1).

Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР спрыяла актывізацыі прадстаўнікоў нацменшасцей у грамадска-палітычным і культурным жыцці толькі ў рэчышчы падтрымкі дзеянняў камуністычнай партыі. Усе іншыя партыі і грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей пастутова забараняліся і былі ліквідаваны. Так, на падставе пастановы ЦК па яўрэйскіх нацыянальных справах, зацверджанай НК па Справах нацыянальнасцей РСФСР, аб закрыцці па ўсёй тэрыторыі РСФСР усіх буржуазных таварыств і ўстаноў (абшчын вернікаў, арганізацый "Гехалуц", "Маккабі", равінатаў і інш.), 12.07.1919 г. Віцебская губернская секцыя па яўрэйскіх нацыянальных справах пастанавіла ліквідаваць усе буржуазныя і клерыкальныя арганізацыі (за выключэннем "Паалей-Цыёна") у межах Віцебскай губерні[192]. У 1928 г. ЦК УсеКП(б) прыняў рашэнне аб роспуску "Паалей Цыёна", Мінская арганізацыя партыі перастала існаваць на год раней. У СССР была ліквідавана не проста яўрэйская партыя, а, наогул, апошняя легальная партыя ў краіне[193]. Напрыканцы 1920-х гг. усе нацыянальныя грамадскія арганізацыі былі ліквідаваны, большасць членаў аб'яднанняў нацыянальных меншасцей абвінавачаны ў контррэвалюцыйный дзейнасці, арганізацыйна разгромлены і высланы за межы БССР. Асобныя глыбока законспіраваныя групы праіснавалі да сярэдзіны 1930-х гг.

Рэалізацыя нацыянальнай палітыкі закранула і эканамічнае жыццё нацыянальных меншасцей. Гэта найперш тычылася вырашэння эканамічных праблем яўрэйскага насельніцтва і павялічэння таварнасці сельскай гаспадаркі шляхам стварэння калгасаў.

Эканамічныя праблемы яўрэйскага насельніцтва БССР неаднаразова станавіліся прадметам абмеркавання на пасяджэннях бюро ЦК КП(б)Б. Так, 04.06.1925 г. бюро пастанавіла: выдзяліць значную колькасць ворыўнай зямлі (10000 дз.) для працаўладкавання яўрэяў, распаўсюдзіць ільготы для сельскіх саматужнікаў, якія былі той жа катэгорыі працаўнікоў горада, склікаць Усебеларускі з'езд яўрэяў-саматужнікаў, ствараць сярод іх вытворчую кааперацыю і арцелі, паменьшыць падатак на дробных гандляроў, прыстасаваць савецкі апарат да яўрэйскай работы, абавязаць акружкомы забяспечыць на месцах работніка па еўпрацы, змагацца з сіяністамі, паляпшаць стан яўрэйскіх школ,

---

[192] Пастанова аб закрыцці яўрэйскіх буржуазных арганізацый у Віцебску // ДАВц. Ф. 56. Воп. 5. Спр. 1. Арк. 423, 434.

[193] Дакументы кіраўніка Мінскай арганізацыі ЯКРП Н.І. Фішара. Сакавік 1926 – лістапад 1927 гг. // РДАСПГ. Ф. 272. Воп. 1. Спр. 303. Арк. 3–4, 8–12 ; *Басин Я.* Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки. Минск, 2008. С. 95.

яўрэйскаму аддзелу Інбелкульта далучаць да савецкай працы беспартыйную яўрэйскую інтэлігенцыю, вылучаць у кампартыю рабочых яўрэяў і г. д. [194] Нягледзячы на ўсе намаганні КП(б)Б і ўлад, гэтыя пытанні не здымаліся са штодзённага жыцця на працягу ўсіх 1920-х гадоў. Аб гэтых жа кірунках працы гаварылася ў справаздачы еўбюро пры ЦК КП(б)Б 1926 г. і ў наступныя гады.

Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР надавала вялікую ўвагу землеўладкаванню працоўных яўрэяў. Гэта павінна было паспрыяць працаўладкаванню часткі непрацоўных яўрэяў у мястэчках, гарадах і адлучыць іх ад "дробнабуржуазнай стыхіі" – заняткаў дробным гандлем і г.д., у выніку павінна была ўзрасці іх актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі ў неабходным для ўладаў кірунку. Садзейнічала вырашэнню ўзгаданых праблем дзейнасць таварыства распаўсюджвання саматужніцкай і земляробчай працы сярод яўрэяў, таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэў – "ОЗЕТ" (у БССР яно называлася – Белкамзет), беларускай камісіі яўрэйскага грамадскага камітэта па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, пагромаў і стыхійных бедстваў (Яўградкам), праз які здзяйсняў сваю дзейнасць "Джойнт" (Амерыканскі аб'яднаны яўрэйскі камітэт па размеркаванню фондаў)[195].

У пачатку 1920-х гг. каб палепшыць матэрыяльны стан яўрэйскага насельніцтва ўрад БССР у пэўнай ступені спрыяў дзейнасці прадстаўнікоў амерыканскай арганізацыі "ARA" (па-беларуску ААД – Амерыканская адміністрацыя дапамогі), якая была створана для матэрыяльнай дапамогі яўрэям. Размеркаванне вялося з удзелам прадстаўнікоў улады. Былі, безумоўна, і перашкоды: не выконваліся абавязацельствы аб выдзяленні добраўладкаваных памяшканняў, мэблі і г.д.[196]. Дзякуючы дзейнасці гэтай арганізацыі і "Джойнта", яўрэйскае насельніцтва Савецкай Беларусі атрымала фінансавыя сродкі на набыццё прамысловага абсталявання, стварэнне працоўных месц, а таксама матэрыяльную дапамогу (харчаванне, вопратку і г.д.) на значныя сумы. Але не толькі яно. Дапамогу атрымала вялікая колькасць савецкай беларускай інтэлігенцыі і партыйна-савецкага кіруючага апарату[197].

Варта асобна падкрэсліць, што праводзячы ў 1920-я гг. перасяленне яўрэяў у Крым і Далёкі Усход, адначасова партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва катэгарычна выступала супраць перасяленняў яўрэяў у Палестыну і іншыя буржуазныя краіны і патрабавала: "разгарнуць шырокую масавую і індывідуальную працу супраць рээвакуацыі... разаблачаць контррэвалюцыйнасць тых цячэнняў і груповак, якія прывіваюць масам эмігранцкую псіхалогію (сіяністы і паалей-цыяністы розных кірункаў)"[198]. Такім чынам улады імкнуліся давесці сусветнай супольнасці аб вырашанасці "яўрэйскага пытання" менавіта ў савецкай краіне, пры чым як у

[194] Матэрыялы бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1279. Арк. 296–297.
[195] Цыркуляры яўрэйскага аддзела // Там жа. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 196. Арк. 62–77.
[196] *Kipel A.* The Amerikan relief administration (ARA) in Byelorussia // Запісы БІНІМ. New York, 1978. № 16. С. 61–83 ; Справаздача паўнамоцнага прадстаўніка губернскага камітэта АРА // ДАВц. Ф. 56. Воп. 6. Спр. 63. Арк. 7–47.
[197] *Іофе Э.* Роля "Джойнта " у развіцці яўрэйскай адукацыі на Беларусі ў 1920-я гг. // Весці Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей. Брэст, 1997. № 4. С. 30–33.
[198] Цыркуляр № 9 загадчыка яўрэйскага аддзела Наркамнаца РСФСР ад 1923 г. // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 196. Арк. 30

эканамічнай так і грамадскай сферах.

17.07.1938 г. выйшла пастанова Прэзідыума ЦВК БССР "Аб ліквідацыі Белкамзета пры Прэзідыуме ЦВК БССР". Яго функцыі і справы былі перададзены перасяленчаму аддзелу НКУС БССР. Спынілася ўсялякая прапаганда Яўрэйская аўтаномнай вобласці сярод працоўных яўрэяў [199].

Для найлепшай абароны эканамічных інтарэсаў саматужнікаў і для вядзення сярод іх культурнай працы, далучэння да грамадскай дзейнасці ствараліся таварыствы саматужнікаў. Праз іх улады імкнуліся далучыць саматужнікаў да камуністычнага будаўніцтва. Таварыствы саматужнікаў працавалі пад пільным кантролем КП(б)Б. Усялякія іншыя формы дзейнасці забараняліся. Напрыклад, прапанова Еўбюро ад 14.10.1928 г. аб "пабудове новых промыслаў, асабліва па вытворчасці экспартных прадметаў і прыналежнасцяў сялянскага будаўніцтва для большага далучэння ў іх элементаў з былых гандляроў і іншых груп..." была рашэннем бюро ЦК КП(б)Б ад 12.07.1929 г. названа "праваапартуністычнай установкай", якая супярэчыць пастановам пленума ЦК КП(б)Б (верасень 1928)[200].

Напрыканцы 1920-х гг. у СССР распачалася палітыка фарсіраванага абагульнення сялянскіх гаспадарак. Яна прадугледжвала стварэнне калектыўных гаспадарак (калгасаў) і закранула інтарэсы і лёс усяго сялянства. Палітыка калектывізацыі не пакінула ў баку і нацыянальныя меншасці Беларусі (гл. раздзел 3.2). На адпаведных нарадах партыйных работнікаў прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей палітыцы калектывізацыі надавалася важнае палітычнае значэнне, прычым часта прымалася рашэнне аб тым, што тэмп калектывізацыі павінен быць большым, чым у беларускай вёсцы[201]. Першымі на тэрыторыі БССР стварылі калгасы яўрэі. У дакладзе цэнтральнага праўлення АЗЕТу адзначалася, што "яўрэйскі земляроб у большасці ішоў шляхам калектывізацыі... ён ішоў не пад прымусам... ён паказаў шлях"[202].

Сяляне з ліку нацменшасцей неадназначна, па-рознаму, ўспрымалі пераход да калектыўных форм гаспадарання. Гвалтоўныя метады раскулачвання выклікалі акцыі пратэсту з боку сялян. У памежных раёнах БССР з 01.01.1930 да 15.08.1931 г.

---

[199] Альховік М.К. Нацыянальна я палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф. Могилев, 2013. С. 107.

[200] Пратакол пасяджэння еўбюро // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4325. Арк. 854.

[201] Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 10.06.31 г. Пр. № 53 // Там жа. Спр. 5114. Арк. 69 ; Аб становішчы яўрэйскіх нацыянальных і інтэрнацыянальных калгасаў. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 07.07.32 г. Пр. № 13 // Там жа. Спр. 5628. Арк. 29 ; Прапановы камісіі аб становішчы яўрэйскіх нацыянальных калгасаў. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 13.08.32 г. Пр. № 16 // Там жа. Спр. 5631. Арк. 27 ; Аб стане нацыянальных калгасаў. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 26.08.32 г. Пр. № 17 і 13.09.32 г. Пр. № 18 // Там жа. Спр. 5632. Арк. 28. Спр. 5633. Арк. 10 ; Праект рэзалюцыі пленума па нацыянальнаму пытанню. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 23.12.33 г. Пр. № 82 і 1.01.34 г. Пр. № 83 // Там жа. Спр. 6405. Арк. 2 ; Спр. 7131. Арк. 2 ; Аб працы літоўскіх і латышскіх с/с, школ, калгасаў. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 26.02.34 г. Пр. № 5 // Там жа. Спр. 7138. Арк. 21 ; Пастанова Чавускага РВК аб літоўскім калгасе "Гэдрыс" . Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 22.05.34 г. Пр. № 21 // Там жа. Спр. 7154. Арк. 13 ; Аб паляпшэнні палітасветпрацы ў літоўскіх калгасах. Пратакол пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 31.08.34 г. Пр. № 42 // Там жа. Спр. 7175. Арк. 10.

[202] Даклад // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4759. Арк. 79.

адбыліся 8 масавых выступаў сялян супраць раскулачвання і калектывізацыі. Сярод кіраўнікоў былі і асобы польскай нацыянальнасці[203].

Звярталі сваю ўвагу органы ўлады і на забяспячэнне грамадскіх і культурна-асветных нацыянальных запатрабаванняў і праз такія закрытыя дзяржаўныя інстытуты, як войска і органы правапарадку.

Так, напрыклад, 25.06.1926 г. на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б слухалася пытанне аб стане партыйнай працы ў памежных частках і войсках ДПУ. У пастанове Бюро, сярод іншага, адзначана: "…11) Партарганізацыям пагранчастак узмацніць увагу да практычнага ўвасаблення рашэнняў ЦК КПБ па нацпытанню. Звярнуць асаблівую ўвагу на засваенне партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі сутнасці нацпалітыкі і рашэнняў ЦК КПБ па гэтаму пытанню. Увесці вывучэнне беларускай мовы і беларусазнаўства пастаянным складам памежных і ўнутраных частак ДПУ. Узняць у ЦК КПУ пытанне аб паляпшэнні абслугоўвання літаратурай і газетамі чырвонаармейцаў – украінцаў на роднай мове."[204]

У 1920-я гг. рабіліся спробы пабудаваць войска па нацыянальна-тэрытарыяльнаму прынцыпу. На тэрыторыі нашай рэспублікі дыслацыравалася 2-ая Беларуская дывізія БССР. У 1926 г. малодшы камандны, адміністратыўны і шэраговы склад 2-ой Беларускай дывізіі складаўся на 29 % з небеларусаў. На 31.08.1926 г. у ёй сярод каманднага складу мелася 65,6 % прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Па групах сярод: вайсковых камандзіраў – 64 %, адміністратыўна-гаспадарчага складу – 60,9 %, палітычных работнікаў – 34,6 %, медыцынскага персаналу – 88 %, ветэрынарнага – 71 %. На 01.05.1926 г. сярод пяхотнага складу камандзіраў небеларусы складалі 59,5 % (108 асоб). Адпаведна – у 1926 г. сярод каманднага складу артылерысцкіх падраздзяленняў дывізіі прадстаўнікоў нетытульнай нацыі было 79,3 % (53 чал.), 1927 год – 63,9 %; сярод палітработнікаў у 1926 г. – 28,4 %, 1927 год – 14,9 %. На пачатак 1927 г. нацменшасцей сярод каманднага складу было 39,3 %[205].

Пры правядзенні беларусізацыі ў вайсковых частках неабходна было кіравацца наступным: "Укамплектаванне дывізіі да неабходнай патрэбнасці (75 % – беларусаў) павінна праводзіцца не шляхам шырокай замены небеларусаў беларусамі, а шляхам пакрыцця беларусамі, па-першае, некамплекту, і па–другое, наяўнай штогадовай нармалёвай уцечкі начскладу і шляхам навучання ўсяго кампалітскладу беларускай мове ў абавязковым парадку"[206].

У 1927–1928 гг. камплектаванне дывізіі планавалася праводзіць з абавязковай умовай папаўнення беларусамі і прадстаўнікамі тых нацыянальнасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі (яўрэі, палякі, рускія). Як адзначалася ў плане беларусізацыі: "Найбольш пажаданымі акругамі, адкуль павінна ісці папаўненне частак дывізіі, з'яўляюцца: Менская, Барысаўская, Бабруйская, Слуцкая і

[203] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы XX столетия). Минск, 2008. С. 25–26.
[204] Выпіска з пратакола № 36 пасяджэння Бюро ЦК КП(б)Б ад 25.06.26 г. // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 405. Арк. 28.
[205] Асноўны план беларусізацыі 2-ой Беларускай дывізіі з 1926 па 1928 г. уключна // Наша слова. 2006. 28 чэрв. С. 6.
[206] Там жа.

Віцебская. Само сабой зразумела, што дывізія як нацыянальная, павінна ўвабраць у сябе лепшы прызыўны кантынгент і першым чынам людзей пісьменных”[207].

У асноўным плане беларусізацыі 2-ой Беларускай дывізіі з 1926 па 1928 год уключна, які быў абмеркаваны на пасяджэнні Нацкамісіі ЦВК БССР 31-га жніўня 1926 г., наконт працы сярод нацменшасцей ва ўмовах Беларускай дывізіі адзначалася: “Пры камплектаванні дывізіі з тэрыторыі БССР, у склад яе будуць уваходзіць і іншыя асноўныя нацыянальнасці, якія насяляюць БССР, такія як: велікарусы, габрэі і палякі. Збор іх у асобныя падраздзяленні не праводзіць. Для абслугоўвання іх у палітасветрабоце дапушчаць іх збор у асобныя групы для палітзаняткаў і іншых форм школьнай працы. Працу пазашкольную сярод іх праводзіць у парадку ўліку нацмоманту”[208].

У БССР дзейнічалі нацыянальныя ўчасткі народных судоў. Яны былі ў акругах, дзе кампактна пражывалі групы асоб пэўнай нацыянальнасці. Напрыклад, у Віцебскай акрузе былі яўрэйскі і латышскі ўчасткі, у Магілёўскай акрузе – яўрэйскі і польскі[209]. Участкі нацыянальных судоў карысталіся павагай і аўтарытэтам у насельніцтва. Нацыянальныя суды ў Магілёўскай акрузе толькі за 1925–1926 гг. разгледзелі 181 справу. У 1926 г. праходзілі выбары народных засядацелей для нацыянальных і акруговых судоў. Сярод іх палякі складалі 9–13 %, а паміж тэхнічнага персаналу іх было 20 % [210]. У 1925 г. быў зацверджаны праект Наркамюста аб арганізацыі 5 яўрэйскіх, 3 польскіх і 1 латышскага ўчасткаў народных судоў. Планаваліся: яўрэйскія – у Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мазырскай акругах; польскія – у Мінскай, Магілёўскай, Барысаўскай акругах, латышскі – у Віцебску. Яны распачалі сваю дзейнасць напрыканцы 1925 – пачатку 1926 гг. У 1929 г. працавала 10 нацыянальных участкаў народных судоў: 6 яўрэйскіх, 3 польскіх і 1 латышскі[211]. У 1931 г. у БССР было 10 судоў, якія вялі справы на мове ідыш. У Магілёве яўрэйскі народны суд працаваў да 1937 г.[212]

У адносінах да рэлігіі, святароў і вернікаў – прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, палітыка дзяржаўнага кіраўніцтва БССР насіла характар падвойных стандартаў. На словах, у афіцыйных дакументах, забяспечвалася свабода сумлення, а на самой справе вялося непрыхаванае змаганне. Атэістычныя савецкія і камуністычныя органы лічылі, што для канчатковага адрыву людзей ад рэлігіі неабходны не толькі прапаганда, але і фізічная расправа з духавенствам ці пазбаўленне яго магчымасці служыць Богу, а таксама канфіскацыя і разбурэнне альбо прывядзенне ў непрыдатны для набажэнстваў стан усіх культавых пабудоў: хрысціянскіх, мусульманскіх, іўдзейскіх[213]. Супрацьстаянне афіцыйных улад і

---

[207] Асноўны план беларусізацыі 2-ой Беларускай дывізіі з 1926 па 1928 г. уключна // Наша слова. 2006. 28 чэрв. С. 6.
[208] Там жа. С. 7.
[209] Ліст аб дзейнасці нацыянальных судоў // ДАВц. Ф. 118. Воп. 1. Спр. 191. Арк. 152 ; Матэрыялы аб дзейнасці нацыянальных судоў // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 444. Арк. 11, 12
[210] Матэрыялы па правядзенню нацпалітыкі. Нацсклад работнікаў судоў // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 936. Арк. 47 ; Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 72. Арк. 33.
[211] Даклад нацкамісіі аб стане нацыянальнай працы // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 91. Арк. 61.
[212] Пратаколы яўрэйскага нарсуда // ДАМаг. Ф. 153. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 1–16.
[213] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 20 ; *Пушкін І.* Як зачыняліся цэрквы ў Магілёве (касцёлы, сінагогі) 1929–1930 гг. // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1996. С. 87–90 ;

царквы – частка гісторыі многіх дзяржаў і народаў. Аднак савецкая ўлада стала на шлях знішчэння як служыцеляў царквы, так і яе матэрыяльных асноў, увядзення татальнага атэізму.

Найбольшы ўдар улады наносілі па рэлігійных школах, дзе вучылі дзетак і падлеткаў Божаму слову, рыхтавалі спецыялістаў па веданню талмуда (яўрэйскія ешыботы). У маі 1922 г. НКА БССР выдаў спецыяльны загад, які забараняў дзейнасць хедэраў і іешыў. Адразу з’явіліся і адпаведныя пастановы мясцовых улад [214]. Яны выклікалі, пачынаючы з 1923 г., шматлікія суды над мелямідамі, равінамі (Гомельскі, Рагачоўскі і інш. раёны), над асобамі, якія нягледзячы на забароны, утваралі хедэры (Магілёў), ксяндзамі, пастарамі і г.д.[215]

Лістом Агітпропа і Польбюро ЦК УсеКП(б) у 1925 г. прадпісывалася неабходнасць асвятлення шпіёнскай дзейнасці каталіцкага кліра, яго ролі як агентаў польскага ўрада і польскага генеральнага штаба. У красавіку 1929 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б на падставе таго, што “...за апошні час органамі АДПУ раскрыты ў шэрагу месц Мінскага, Полацкага акругоў кантррэвалюцыйныя арганізацыі, звязаныя з Польшчай...”, запатрабаваў “...неабходнасць высялення ўсіх пасобнікаў з межаў БССР, …канфіскацыі іх маёмасці...”[216]. У выніку, толькі на Магілёўшчыне ў 1929 г. сярод палякаў былі ліквідаваны і выселены 5 вялікіх груп[217]. Наогул канфіскацыі дазвалялі палепшыць матэрыяльнае становішча дзяржавы, яны праводзіліся не толькі на вёсцы, але і ў гарадах, мястэчках, дзе ад іх пацярпела шмат яўрэяў[218].

Для актывізацыі антырэлігійнай працы сярод нацыянальных меншасцей увялі ў праграму польскага педагагічнага тэхнікума і Магілёўскай савецка-партыйнай школы выкладанне методыкі антырэлігійнай працы. Палічыўшы недастатковай працу нацыянальных секцый (яўрэйскай, латышскай, польскай) пры Цэнтральным савеце Саюза бязбожнікаў Беларусі, улады запатрабавалі хутчэйшай арганізацыі нацыянальных секцый Саюза пры акруговых саветах для паглыблення антырэлігійнай працы між нацыянальных меншасцей[219].

Трэба заўважыць, што ў 1926 г., на кароткі час праца ўлад дала плён, часова назіраўся распад рэлігійных арганізацый (у прыватнасці яўрэйскіх), але

---

Пратакол № 12 пасяджэння Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР ад 03.07.1947 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 4. Спр. 19. Арк. 404, 151–153.

[214] Анкеты па абследаванню барацьбы з хэдэрамі і ешыботамі // ДАГом. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 1560. Арк. 11, 23 ; *Пушкін І.А.* Рэлігійнае пытанне ў жыцці нацыянальных меншасцей (20-я гг. XX ст. ). С. 125.

[215] Справаздачы яўсекцыі Гомельскай акругі // ДАГАГом. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1229. Арк. 2–4 ; *Пушкін І.А.* Рэлігійнае пытанне ў жыцці нацыянальных меншасцей (20-я гг. XX ст. ). С. 123–134 ; Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). Мінск, 1998 ; *Пушкін І.* Магілёўшчына ў складзе Гомельскай губерні (20-я гг. XXст. ) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1998. С. 119–123 ; *Смиловицкий Л.* Евреи Беларуси: из нашей общей истории. 1905–1953. С. 47–48 ; *Dzwonkowski Roman.* Kościół Katolicki w ZSSR 1917–1939. S. 75, 134, 216.

[216] Ліст сакратарыята ЦК КП(б)Б № 42/сс, 1929 г. // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 862. Арк. 25–26

[217] Справаздачы АВК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2481. Арк. 7–9 ; Матэрыялы акруговых выканаўчых камітэтаў КП(б)Б // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 266. Арк. 3 ; Матэрыялы акруговых выканаўчых камітэтаў КП(б)Б // Там жа. Ф. 6580. Воп. 1. Спр. 626. Арк. 9.

[218] *Пушкін І.* Налёт на неплатнікаў дзяржаўных падаткаў у г. Магілёве (1929–1930) // Гістарычныя лёсы верхняга Падняпроўя: Зборнік мат. нав. канф. Ч. 2. Магілёў, 1995. С. 93–108.

[219] *Кулачков В.В.* Социокультурная деятельность в среде западных национальных меньшинств (на материалах Западного региона России 1920-х гг.) // Проблемы славяноведения. Сб. научных статей и материалов. Брянск, 2016. Вып. 18. С. 97.

праз год адбыўся новы ўздым і актывізацыя іх дзейнасці. Улады падкрэслівалі, што ўплыў праваслаўных святароў ужо нязначны, царкву наведвалі старыя і жанчыны, святары гублялі свой аўтарытэт. Аб меншым уплыве рэлігіі на жыццё яўрэйскага насельніцтва сведчылі шматлікія выпадкі, калі жанчыны-яўрэйкі выходзілі замуж за рускіх, памяншалася нецярпімасць да хрысціян і іншаверцаў "гояў"[220]. А вось уплыў каталіцкіх ксяндзоў захоўваўся і быў моцным. Касцёл наведвала да 90 % усяго каталіцкага насельніцтва. У 1927 г. была прынята сакрэтная рэзалюцыя ЦК КП(б)Б па пытанню адносін да каталіцкай царквы. У ёй прадугледжвалася: "узмацніць рэпрэсіі ў адносінах да ксяндзоў і ў адносінах кіраўнікоў клерыкальных гурткоў..., весці рашучую барацьбу з спробамі папы стварыць у БССР: 1) "Усходнюю царкву" уніяцкую; 2) нацыянальна-беларускую царкву"[221].

Адзначалася вясокая ступень рэлігійнасці латышскай і нямецкай супольнасцей, якія кампактна жылі ў вясковай мясцовасці. Камуністычная ўлада лічыла вынікам варожай рэлігійнай дзейнасці пратэстантаў выказванні вучняў Латрошчанскай латышскай нацыянальнай школы пры правядзенні размовы аб Леніне: "Ленін мне нічога не даў", "Калі б у мяне быў бы партрэт Леніна, я б яго спаліў", "Раней былі буржуі, цяпер ёсць новыя, якія нічога не робяць, але атрымоўваюць заробак" і г.д.[222]

З канца 1920-х гг. змены ў сацыяльна-эканамічным становішчы нацыянальных меншасцей прывялі да згортвання нацыянальнай палітыкі. Пераход ад экамічнага ціску (падаткі) і палітычнага (стыгматызацыя шляхам пазбаўлення выбарчых правоў[223]) да ліквідацыі прыватнай сферы вытворчасці і размеркавання адбіўся на жыцці ўсіх колаў насельніцтва. З-за пасілення ціску на прыватніка ў 1927–1928 гг. адбылося зніжэнне колькасці гандляроў. Так, закрыццё ў 1928 г. 5 тыс. гандлёвых прадпрыемстваў пазбавіла крыніцы існавання 20 тыс. чалавек, найперш яўрэяў. Моцным ударам стала скарачэнне саматужнай і рамеснай вытворчасці – асноўнай крыніцы існавання многіх яўрэйскіх сем'яў. Спроба вырашыць праблему працаўладкавання яўрэяў шляхам земленадзялення, альбо перасялення вялікага поспеху не мела[224], гэта было абумоўлена і тым фактам, што пераход да заняцця сельскай гаспадаркай разглядаўся яўрэямі як зніжэнне сацыяльнага статуса[225].

---

[220] Палітыка-эканамічнае апісанне Бабруйскай акругі (1927) // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 432. Арк. 208–209.

[221] Рэзалюцыя ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3679. Арк. 41.

[222] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХ ст.). Магілёў, 2004. С. 116–117.

[223] Інстытут "лішэнцаў". Калі для ўсяго насельніцтва СССР ва ўзросце ад 18 гадоў і болей лішэнцы складалі нязначны працэнт, то для яўрэяў гэта стала сапраўдным бедствам: у парыяў пераўтварыўся цэлы пласт яўрэйскага насельніцтва гарадоў і мястэчак. Доля яўрэяў-лішэнцаў была найвышэйшай у мястэчках і не акруговых гарадах, у канцы 1929 г. яны складалі каля трэцяй часткі ўсяго дарослага яўрэйскага насельніцтва, у акруговых гарадах адпаведны працэнт быў ніжэйшы і складаў 15,5 %, а ў пасяленнях вясковага тыпу – 20 %. *Зельцер А.* Евреи советской провинции: Витебск и местечки. 1917–1941. М., 2006. С. 116, 118.

[224] *Замойскі А.С.* Да пытання аб сацыяльна-эканамічным становішчы нацыянальных меншасцей савецкай Беларусі ў 1920-я гады // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы навук. канф. С. 217

[225] *Зельцер А.* Евреи советской провинции: Витебск и местечки. С. 96.

Годам "вялікага пералому" стаў 1929 г. Палітыка індустрыялізацыі і калектывізацыі разбурала традыцыйны ўклад насельніцтва Беларусі. Разам з тытульным народам БССР нацыянальныя меншасці зведалі жахі савецкіх масавых рэпрэсій.

**Перыяд значнага абмежавання правоў меншасцей (1929–1939).** Грамадскае жыццё ў Беларускай ССР у 1930-х гг. у вялікай ступені канцэнтравалася вакол выканання асноўных задач прамысловага і культурнага будаўніцтва, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, высялення ўсё новых прадстаўнікоў заможнай, а нярэдка і сярэдняй часткі вёскі ў аддаленыя рэгіёны краіны, пераважна на Поўнач і ў Сібір, выканання дзяржаўных падаткаў, якія пастаянна павялічваліся, і ўсяго таго, што з усім гэтым было звязана. Побач з ажыццяўленнем індустрыяльнага і культурнага будаўніцтва, правядзеннем масавай і пераважна прымусовай калектывізацыі значны націск рабіўся на барацьбу з так званым нацыянал-дэмакратызмам. Праўда, часам высокімі партыйнымі інстанцыямі аб'яўлялася, што асноўная небяспека заключаецца ў вялікадзяржаўным шавінізме, аднак гэта не мела асаблівага значэння, таму што ў рэшце рэшт усё зводзілася да барацьбы з мясцовымі праяўленнямі нацыянальных пачуццяў і памкненняў. У Савецкай Беларусі ў гэты час дадзенае пытанне стаяла надзвычай востра. Гэтую вастрыню яму мэтанакіравана прыдавалі як цэнтральныя, так і мясцовыя партыйна-савецкія ўлады[226].

У канцы 1920-х гг. партыйнае кіраўніцтва БССР было вымушана прызнаць пэўную безвыніковасць сваёй працы сярод асобных груп нацменшасцей. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў рэзалюцыях бюро ЦК КП(б)Б па дакладах польбюро, літбюро аб аб становішчы працы сярод польскага і літоўскага насельніцтва БССР. Так, у рэзалюцыі бюро ЦК КП(б)Б ад 01.03.1929 г. па дакладу польбюро аб становішчы сярод рабочых і сялян-палякаў адзначаліся наступныя негатыўныя моманты: праявы антысемітызму, клерыкалізм, наяўнасць вялікага ўплыву касцёла і духавенства, нязначны лік вясковага актыву з боку беднаты, недастатковасць масавай работы сярод моладзі[227]. Тыя ж недахопы былі выяўлены і ў працы сярод літоўцаў, што было зафіксавана ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б па дакладу літоўскага бюро аб становішчы працы сярод літоўскага насельніцтва БССР ад 19.07.1929 г.[228] Галоўным было тое, што ўлады БССР не дасягнулі сваёй асноўнай мэты – разбурыць адзіны нацыянальны "фронт" шляхам сацыяльнага (класавага) расслаення насельніцтва[229]. Гэтага было цяжка дасягнуць шляхам сапраўднага забеспячэння культурна-асветных і грамадскіх патрэб нацменшасцей, бо, з большага, праца сярод іх насіла фармальны характар, што было засведчана як у лістах ЦК КП(б)Б па асобных акругах[230], так і ў тэзісах да пленума ЦК аб

[226] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 247.
[227] Рэзалюцыя ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4323. Арк. 39–40.
[228] Матэрыялы бюро ЦК КП(б)Б // Там жа. Арк. 79.
[229] Матэрыялы Нацкамісіі ЦВК БССР // Там жа. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 1.
[230] Лісты ЦК КП(б)Б // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 177. Арк. 6.

нацыянальнай палітыцы, зацверджаных на бюро ЦК КП(б)Б ад 18.10.1930 г.[231] Ліквідаваць нацыянальнае адзінства нацменшасцей шляхам сацыяльнага (класавага) расслаення насельніцтва было магчымым толькі ў выніку масавых рэпрэсій.

1930-я гг. увайшлі ў гісторыю нашай краіны як адны з самых складаных і супярэчлівых. З аднаго боку, жыццё грамадства праходзіла ў асноўным у мірных умовах і было адзначана самаадданай працай народа, вонкава мажорным пафасам сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця ў кірунку пабудовы сацыялізму. Партыйна-савецкія ўлады БССР часткова працягвалі палітыку задавальнення культурна-адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцей на іх родных мовах. У гэты час сфарміраваліся асновы сацыялістычнай сацыяльна-класавай структуры насельніцтва.

З другога боку, у гэтыя гады вялося жорсткае, бязлітаснае, няўмольнае і ў той жа час паслядоўнае, спланаванае змаганне сталінскага кіраўніцтва з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, працоўнага класа, сялянства, нават з часткай партыйнага і савецкага апарата, грамадскімі арганізацыямі і г.д. Праводзіліся масавыя рэпрэсіі (гл. раздзел 2.3). У краіне ўсталявалася сталінская дыктатура. Апорай яе была адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыццём. На першым месцы знаходзілася саветызацыя і інтэрнацыяналізацыя насельніцтва, у тым ліку нацменшасцей, і выхаванне адданасці камуністычным ідэалам. Менавіта гэтым тлумачыцца пачатак пераводу навучання на рускую мову. Савецкая форма кіравання канчаткова стала дамінуючай і не падлягала абмеркаванню.

У рамках агульнай барацьбы з перажыткамі мінулага адбываўся наступ на самабытную культуру нацыянальных меншасцей, вялося змаганне з традыцыямі на штодзённым узроўні. Так, напрыклад, перавод на неперарыўны працоўны тыдзень[232] прымушаў іудзеяў працаваць у суботу, а хрысціян у нядзелю. У 1930 г. рэлігійныя святы зніклі з календара, прыкладна ў гэты ж час, напрыклад, быў забаронены продаж кашэрнага мяса, вытворчасць мацы і інш. важных для вернікаў рэчаў. Па ўсёй Савецкай Беларусі распачынаецца масавы працэс закрыцця сінагог, цэркваў, касцёлаў[233]. Асаблівая ўвага надавалася барацьбе са сяточнымі рэлігійнымі традыцыямі. Напярэдадні Ражства Хрыстова, Вялікадня і іншых рэлігійных святаў партыйна-савецкай уладай праводзілася тлумачальная работа сярод рабочых і сялян, іх запрашалі ў клубы на мастацкія вечары, забавы, лекцыі і даклады, антырэлігійныя вечары "бязбожніка і ўдарніка". Дзеянні ўлад дазволілі дасягнуць даволі высокай ступені атэізму, у першую чаргу ў асяроддзі

[231] Матэрыялы бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4764. Арк. 403, 434.

[232] Неперарыўны працоўны тыдзень – у 1929 г. замест сямідзённага тыдня ўводзўся пяцідзённы: чалавек чатыры дні працаваў, а пяты быў выхадны, але выхадныя былі па рухомаму графіку; у 1931 г. уводзіўся шасцідзённы рабочы тыдзень.

[233] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). Мінск, 1998. С. 155–157 ; *Литин А.* "Еврейский вопрос" в Могилеве в свете архивных изысканий // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац у 2 ч. Ч. II. Магілеў, 2003. С. 53 ; *Пушкін І.* Стан праваслаўнай царквы ў Магілеве, дзейнасць архіепіскапа Паўліна (Крашэчкіна) 20–30-я гады ХХст. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2001. С. 215–217 ; *Thomas E. Bird.* Orthodoxy in Byelorussia: 1917–1980 // Zapisy BINIM. New-York, 1983. № 17. S. 144–208 ; *Dzwonkowski Roman.* Kościoi Katolicki w ZSSR 1917–1939. Zarys historii. Lublin, 1997. S. 75.

рабочых[234]. Але ўладам не ўдалося ў гэты перыяд цалкам вырашыць рэлігійнае пытанне. Традыцыйныя святы і звычаі яшчэ моцна ўтрымліваліся ў быце нацменшасцей, асабліва старэйшага пакалення.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б 11.02.1930 г. унёс змяненні ў арганізацыю і правядзенне работы сярод нацменшасцей. Так, з 15.02.1930 г. ліквідоўваліся нацыянальныя бюро пры ЦК КП(б)Б і нацсекцыі пры акруговых камітэтах КП(б)Б[235]. Пры ЦК захоўваўся толькі адзін інструктар па рабоце сярод нацменшасцей, пры акружкомах асобныя работнікі не вылучаліся. Праўда, умацоўваўся колькасны і якасны склад нацкамісій пры ЦВК і АВК, інспектарскі склад па лініі народнай асветы. Пры ЦК захоўваўся толькі адзін інструктар па рабоце сярод нацменшасцей, пры акружкомах асобныя работнікі не вылучаліся. Праўда, умацоўваўся колькасны і якасны склад нацкамісій пры ЦВК і АВК, інспектарскі склад па лініі народнай асветы. Кіраўніцтва БССР у 1930 г. у тэзісах па становішчу і задачах культурна-масавага абслугоўвання нацменшасцей БССР засведчыла: "пры зробленых дасягненнях усё ж правадзімая культурна-масавая праца сярод нацменшасцей БССР з'яўляецца недастатковай і патрабуе больш шпаркага тэмпу і больш поўнага задавальнення ўзросшых культурных запатрабаванняў" [236]. Яўрэйскія інспектары павінны былі быць ва ўсіх акругах; польскія ва ўсіх, за выключэннем Оршы; латышскія і літоўскія ў Віцебску, Полацку і Магілёве. Было даручана Калгасцэнтру забяспечыць абслугоўванне нацменшасцей у калгасах. Уводзіўся адзін інструктар па рабоце сярод нацменшасцей пры культурным аддзеле ЦС ПСБ, яго ўвядзенне было прызнана неабходным на бюро ЦК КП(б)Б 17.04.1930 г.[237], адначасова, той жа ЦС ПСБ, у 1930 г., нягледзячы на пастановы прэзідыуму ЦК КП(б)Б, не жадаў даваць памяшканне пад клуб нацменшасцей (латышска-літоўскі клуб). Матывіравалася гэта тым, што "няхай працуюць праз клубы тых саюзаў, членамі якіх састаяць"[238]. У рэзалюцыі па дакладзе сакратара ЦК КП(б)Б "Аб стане работы Беларускай арганізацыі ЛКСМ" (1930) падкрэслівалася: "...Камсамол павінен усемагчыма развіваць інтэрнацыянальную працу, узмацняючы работу сярод нацыянальных меншасцей, асабліва сярод польскай і яўрэйскай моладзі, яшчэ болей умацоўваючы міжнацыянальнае адзінства ў шэрагах арганізацыі... змагацца з шавінізмам..."[239].

Усё гэта было якасна новым этапам у нацыянальнай працы. На практыцы гэта праяўлялася ў імкненні да "спрашчэння" этнанацыянальнай і моўнай структуры краіны, згортвання ўжывання нацыянальных моў. Стаўка рабілася на інтэрнацыяналізм шляхам адміністратыўных мер. Змены ў нацпрацы і гвалтоўнае правядзенне ўладамі калектывізацыі прывялі ў 1930 г. да шматлікіх фактаў дэманстратыўнага ўходу "на Радзіму" з усёй маёмасцю латышоў,

---

[234] *Іваноў У.М.* Нарыс дэмаграфіі, сацыялогіі і быту рабочага класа Савецкай Беларусі (1917–1941). С. 147.
[235] Пратакол № 50 сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 11.02.1930 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4769. арк. 608.
[236] Тэзісы па становішчу і задачах культурна-масавага абслугоўвання нацменшасцей // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5010. Арк. 150.
[237] Матэрыялы сакратарыяту ЦК КП(б)Б// НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4761. Арк. 2.
[238]Матэрыялы ЦС ПСБ // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 112. Арк. 3–4.
[239] Рэзалюцыя аб стане працы Беларускай арганізацыі ЛКСМ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5011. Арк. 16.

палякаў, асобных сямей немцаў[240]. У Магілёўскай акрузе толькі ў адзін дзень, 06.01.1930 г., падалі заяву на адыход за мяжу адразу 17 сем'яў[241]. Павялічылася колькасць нелегальных пераходаў. Так, да 01.07.1931 г. толькі з Лельчыцкага раёна ў Польшчу перайшло каля 200 чалавек[242]. Эміграцкія настроі органамі ДПУ былі зафіксаваныя амаль па ўсім беларускім памежжы, але найбольшы размах яны набылі ў Жыткавіцкім, Тураўскім і Дрысенскім раёнах[243].

З часам эфектыўнасць і мэтазгоднасць шэрагу форм работы з нацыянальнымі меншасцямі сталі падвяргацца сумневу. Прыгранічнае становішча БССР істотна паўплывала на шляхі рэалізацыі нацыянальнай палітыкі. Ва ўмовах згортвання нэпа неабходна было забяспечыць знаходжанне ў дзяржаўных межах толькі палітычна надзейнага насельніцтва, у разрад якога прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў маглі трапіць толькі з вялікімі агаворкамі. Таму значная частка сялянства, якая вельмі скептычна паставілася да калектывізацыі, фактычна апынулася па-за законам. На фоне нарастаючай маніі пра шпіёнаў і шкоднікаў масавыя высяленні сталі часткай штодзённасці. Уцягнутасць у агульнадзяржаўную эканамічную сістэму патрабавала правядзення ў нацыянальных сельсаветах калектывізацыі гвалтоўнымі метадамі, вынікам чаго сталі ломка традыцыйнага ўкладу жыцця і карэннае змяненне сацыяльнага аблічча беларускага селяніна з ліку нацыянальных меншасцей. Іх супраціў фарсіраванай калектывізацыі (асабліва тымі, якія мелі свае нацыянальныя капіталістычныя дзяржавы – латышамі, палякамі, немцамі, літоўцамі і інш.) прывёў да таго, што шматнацыянальнае насельніцтва стала ўспрымацца як патэнцыйная "пятая калона".

У 1933 г. цэнтральнае кіраўніцтва СССР канчаткова расчаравалася ў сваёй лініі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага драбнення па нацыянальнай прыкмеце і спыніла гэты працэс. З гэтага часу пачынаецца паступовая ліквідацыя нацыянальных саветаў. У БССР на пачатак 1934 г. было 102 нацсельсавета, але ў гэтым жа годзе іх колькасць пачынае скарачацца.

Аналіз пратаколаў пасяджэнняў ЦК КП(б)Б у 1930-я гг. дазваляе зразумець, як часта тагачасны вышэйшы орган улады рэспублікі разглядаў пытанні, якія закраналі інтарэсы нацыянальных меншасцей, і на падставе гэтага вызначыць асноўныя кірункі нацыянальнай палітыкі БССР ў той час.

У 1931–1933 гг. прымаліся рашэнні аб удасканаленні нацыянальнай працы і стане нацыянальных калгасаў, стварэнні польскіх нацыянальнага раёна і сельсаветаў, навучальнай установы для падрыхтоўкі настаўнікаў у школы нацменшасцей, кадравыя пытанні[244]. Для кіраўніцтва Савецкай Беларусі 1934 г. –

---

[240] Лісты акруговых выканаўчых камітэтаў КП(б)Б // ДАВц. Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 585. Арк. 248 ; Дакладныя запіскі аб наяўнасці класава чужых элементаў // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6295. Арк. 40, 103 ; Паведамленні войск АДПУ БССР // Там жа. Спр. 5575. Арк. 92

[241] Лісты АВК // ДАВц. Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 585. Арк. 248.

[242] Дакладныя запіскі аб наяўнасці класава чужых элементаў // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6295. Арк. 103.

[243] Дакладныя запіскі аб наяўнасці класава чужых элементаў // Там жа. Арк. 40.

[244] Пратаколы пасяджэнняў ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. 1931 г.: Спр. 5114. Арк. 69, 234, 1044 ; 1932 г.: Спр. 5617. Арк. 5 ; Спр. 5621. Арк. 540 ; Спр. 5628. Арк. 29 ; Спр. 5632. Арк. 28 ; Спр. 5633. Арк. 10 ; Спр. 5636. – Арк. 21 ; 1933 г. : Спр. 6366. Арк. 1 ; Спр. 6367. Арк. 34 ; Спр. 6370. Арк. 53 ; Спр. 6372. Арк. 7, 24 ; Спр. 6377. Арк. 26 ; Спр. 6380. Арк. 33 ; Спр. 6386. Арк. 53 ; Спр. 6403. Арк. 9 ; Спр. 6405. Арк. 2.

год пачатку масавага пераводу нацыянальных сельсаветаў у звычайныя (беларускія). Шмат увагі ўлады надавалі адукацыі, працы СМІ, дзейнасці калгасаў і культурна-асветных устаноў нацыянальных меншасцей Беларусі[245].

У 1934 г. адбыўся аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б. У яго пастанове адзначалася, што лютаўскі і сакавіцкі (1933) пленумы выпрацавалі дырэктывы па практычнаму правядзенню ў жыццё ленінскай нацыянальнай палітыцы "выхаванне працоўных усіх нацыянальнасцяў у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму". На пленуме канстатавалася "незадавальняючае бальшавіцкае кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый работай сярод працоўных нацменшасцяў, асабліва сярод польскага і яўрэйскага насельніцтва, што прывяло да засмечанасці многіх калгасаў, школ, клубаў, інстытутаў і інш. класава-варожымі нацыяналістычнымі элементамі", неабходнасць павышэння партыйнай класавай пільнасці супраць праяваў "вялікадзяржаўнага рускага шавінізму" і "беларускага нацыяналізму". Тут жа ўтрымліваліся ўказанні аб "найстрожайшем" пакаранні тых, хто зрывае і сабатуе канкрэтныя партыйныя мерапрыемствы па нацыянальным пытанні[246].

У пастанове ЦК КП(б)Б ад 26.02.1934 г. "Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў" паказвалася, што значная іх частка засмечаная кулацкімі, класава-варожымі і антысавецкімі элементамі. У 1936–1937 гг. працэс скарачэння колькасці і рэарганізацыі нацыянальных саветаў паскорыўся. Цяпер у дакументах звычайнымі сталі фармулёўкі пра іх "штучнае стварэнне" з "шкодніцкімі мэтамі".

У 1935–1938 гг. на пасяджэннях ЦК КП(б)Б разглядаліся пытанні аб перасяленні яўрэйскага насельніцтва БССР у Яўрэйскую аўтаномную вобласць, працэсе пераўтварэння школ нацменшасцей у беларускія, кіраўніцтве дзейнасцю грамадскіх арганізацый у асяродку нацменшасцей і перакладзе артыкула І. Сталіна на нацыянальныя мовы[247]. Яўрэйскія навучальныя ўстановы былі рэарганізаваны ў беларускія паводле пастановы Бюро ЦК КП(б)Б "Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы" (03.07.1938). 07.07.1938 г. рашэннем ЦК КП(б)Б былі рэарганізаваны ў беларускія яўрэйскія дзяцячыя сады і асобныя яўрэйскія групы у беларускіх дзіцячых садах. Цікава, што ў 1937 г. органы НКУС абвінавачвалі ў палітычнай нелаяльнасці "нацыянал-дэмакратычныя" і "трацкісцка-бухарынскія" элементы ў ажыццяўленні палітыкі ліквідацыі нацыянальных рускіх і яўрэйскіх школ. А ў 1938–1939 гг. органы НКУС абвінавачвалі ў тым жа тых, хто выступаў з крытыкай закрыцця яўрэйскіх

[245] Пратаколы пасяджэнняў ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7131. Арк. 2 ; Спр. 7138. Арк. 21 ; Спр. 7145. Арк. 15 ; Спр. 7146. Арк. 18 ; Спр. 7154. Арк. 13 ; Спр. 7155. Арк. 12 ; Спр. 7160. Арк. 16, 25 ; Спр. 7161. Арк. 37 ; Спр. 7167. Арк. 13 ; Спр. 7169. Арк. 4 ; Спр. 7171. Арк. 11 ; Спр. 7174. Арк. 47 ; Спр. 7175. Арк. 10 ; Спр. 7178. Арк. 9 ; Спр. 7179. Арк. 9 ; Спр. 7184. Арк. 15 ; Спр. 7186. Арк. 44 ; Спр. 7189. Арк. 38 ; Спр. 7190. Арк. 8, 30, 31 ; Спр. 7193. Арк. 11, 12 ; Спр. 7194. Арк. 33 ; Спр. 7197. Арк. 36.

[246] Ітогі і бліжэйшыя задачы правядзення Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР / Пастанова аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. Менск, 1934. С. 10, 14 ; Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 108–109.

[247] Пратаколы пасяджэнняў ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. 1935 г.: Спр. 7710. Арк. 33 ; Спр. 7721. Арк. 6, 9 ; Спр. 7723. Арк. 122 ; Спр. 7738. Арк. 8 ; Спр. 7744. Арк. 34 ; Спр. 7747. Арк. 29, 33 ; Спр. 7759. Арк. 50 ; Спр. 7791. Арк. 44 ; 1936 г.: Спр. 9139. Арк. 102 ; Спр. 9139. Арк. 102 ; Спр. 9144. Арк. 137 ; Спр. 9149. Арк. 20, 24 ; Спр. 9163. Арк. 8 ; Спр. 9172. Арк. 8 ; Спр. 9180. Арк. 21 ; Спр. 9192. Арк. 4.

школ як неадпаведнага “ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы”[248]. Дарэчы, пачынаючы ад другой паловы 1938 г. у афіцыйных дакумантах дзяржаўных органаў БССР больш не згадваюцца праявы антысемітызму.

У разглядаеіы акрыяд адбываліся змены ў сацыяльна-класавай структуры насельніцтва. Хуткімі тэмпамі павялічвалася колькасць неземляробчага і гарадскога насельніцтва, якое ў той час лічылася вядучай часткай грамадства і прымала актыўны ўдзел у грамадскім і культурным жыцці. Прычым колькасць рабочага класа як носьбіта новай ідэалогіі папаўнялася за кошт беларусаў. У стварэнні сацыяльна-эканамічнай базы сацыялістычнага грамадства непасрэдны ўдзел бралі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Так на 01.09.1934 г. у прамысловасці БССР яны складалі 36,5 % ад агульнай колькасці працаўнікоў[249].

Нацыянальныя меншасці ўдзельнічалі ў новых формах грамадскай актыўнасці, якія ўзніклі ў сувязі з пераменамі ў гаспадарчым жыцці: сацыялістычным спаборніцтве[250], ударніцтве, зотаўскім і стаханаўскім руху, развіцці рацыяналізатарства і вынаходніцтва. Найбольш пашыранымі былі новыя формы грамадскай актыўнасці ў асяроддзі гарадскога насельніцтва БССР, у складзе якога да 1930-х гг. пераважалі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Дзякуючы індустрыялізацыі пашэралася ўрбанізацыя рэспублікі, у працэсе якой павялічвалася колькасць гарадскога насельніцтва і ўзмацняўся прыток беларусаў у гарады. Адбыліся зрухі ў характары рассялення гараджан: знікла дзяленне горада на кварталы па этнічнай прыкмеце. Да чэрвеня 1941 г. у гарадах і гарадскіх пасёлках БССР каля 57 % усяго жыллёвага фонду складалі дамы, пабудаваныя пасля 1917 г. Выкарыстанне адзіных канструкцыйных і планіровачных стандартаў, архітэктурных прынцыпаў і будаўнічых норм вяло да ўніфікацыі жылля, пазбаўляла яго ад спецыфічных этнічных рыс.

У выніку сацыялістычных пераўтварэнняў у вёсцы ішло разбурэнне традыцыйнага жыццёвага ўкладу. Самая высокая грамадская актыўнасць на вёсцы была сярод настаўнікаў, яны пасля працоўнага дня ў школе вялі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, былі агітатарамі на выбарах, чыталі лекцыі і даклады ў сельскім клубе, распаўсюджвалі сялянскую пазыку сярод насельніцтва, заходзячы ў кожны сялянскі двор.

На грамадскую актыўнасць і свядомасць насельніцтва істотна паўплывала правядзенне палітыкі індустрыялізацыі, якая мела складанае, супярэчлівае значэнне для развіцця народа. Ствараліся ўмовы для ліквідацыі фактычнай эканамічнай няроўнасці рэспублікі, развіваліся прагрэсіўныя галіны: цяжкая

---

[248] *Альховік М.К.* Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., 18–19 апреля 2013 г., г. Могилев. Могилев, 2013. С. 106 ; НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12428. Арк. 287 ; Спр. 12429. Арк. 39.

[249] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). Минск, 1987. С. 168.

[250] Варта адзначыць, што сацыялістычнае спаборніцтва па-рознаму ўспрымалася насельніцтвам. З аднаго боку, гэта – энтузіязм працоўных, накіраваны на павышэнне вытворчасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, добраахвотнае зніжэнне расцэнак і павышэнне норм, а з другога – назіраўся скептыцызм і недавер, неразуменне сутнасці спаборніцтва: “Не жадаем уступаць у спаборніцтва, не навязвайце нам”, “Няма масла, няма сала, а вы нам тлумачыце аб спаборніцтве”. Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё . С. 350.

прамысловасць, электраэнергетыка. Шпаркімі тэмпамі Беларусь з аграрнай ператварылася ў аграрна–індустрыяльную рэспубліку[251]. З другога боку, індустрыялізацыя ажыццяўлялася галоўным чынам на сродкі, што забіраліся ў вёсцы пасля яе паскоранай калектывізацыі.

У развіцці прамысловасці БССР усебаковую дапамогу аказвалі іншыя сацыялістычныя рэспублікі. З індустрыяльна развітых цэнтраў Расійскай Федэрацыі і Украіны ў Беларусь паступалі розныя машыны, абсталяванне, паліва, метал і інш. З гэтых раёнаў прыязджалі кваліфікаваныя рабочыя і інжынеры. У БССР за гады даваенных пяцігодак прыбыло 3500 высокакваліфікаваных спецыялістаў з РСФСР і УССР[252]. Эканоміка Беларусі развівалася як састаўная частка эканомікі Савецкага Саюза.

19.02.1937 г. XII надзвычайны з’езд саветаў БССР прыняў чарговую новую Канстытуцыю[253]. У яе змест быў перанесены з Канстытуцыі 1927 г. пункт аб чатырох дзяржаўных мовах. Аднак у канцы ліпеня 1938 г. гэты пункт быў выдалены, пры чым, у пастанове Вярхоўнага Савета БССР адзначалася, што выдаленне ідыша і польскай мовы з Канстытуцыі не азначае ўшчамлення правоў іх носьбітаў[254].

З Канстытуцыі СССР 1936 г. і ўслед за ёй з Канстытуцыі БССР 1937 г. былі із’яты ўсе згадкі аб нацыянальных меншасцях. 24.01.1938 г. былі прынятыя дзве пастановы Аргбюро ЦК УсеКП(б) “Аб ліквідацыі нацыянальных раёнаў і сельсаветаў” і “Аб ліквідацыі нацыянальных школ і нацыянальных аддзяленняў у школах”, што афіцыйна замацавалі новую пазіцыю савецкай дзяржавы ў вырашэнні нацыянальнага пытання.

Восенню 1939 г. адбылося далучэнне Заходняй Беларусі да БССР. Ад імя ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі на 3-й пазачарговай сесіі ВС БССР, на якой вырашалася пытанне аб далучэнні да БССР Заходняй Беларусі, прысутнічала ўпаўнаважаная камісія народнага сходу Заходняй Беларусі. У склад яе ўваходзілі дэлегаты: беларусаў – 51, рускіх – 5, палякаў – 6, яўрэяў – 2, украінцаў – 2 (усяго 66 асоб)[255]. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 22,8 %. Было прынята рашэнне аб уз’яднанні з Савецкай Беларуссю. Беларусы заходніх абласцей пераўтварыліся з меншасці ў Польшчы ў тытульную нацыю, а палякі ў БССР далучыліся да польскай меншасці савецкай рэспублiцы. З гэтага часу на ўсёй тэрыторыі Беларусі будуецца сацыялістычны лад.

---

[251] Пад эканоміку ў гэты час закладвалася міна запаволенага дзеяння, фарміраваўся затратны механізм, які абапіраўся на прыцягненне ўсё новых рэсурсаў: матэрыяльных, працоўных (выкарыстанне таннай рабочай сілы, у большасці выхадцаў з вёскі). Звышцэнтралізацыя эканамічнага жыцця прывяла да канчатковага злому механізма самарэгуляцыі эканомікі. Яна ж дазволіла ўзняць прамысловасць на больш высокі ўзровень, правесці пераўзбраенне арміі, а ў гады вайны разграміць ворага. Цаной неймавернага напружання, працоўнага энтузіязму народа, рэспубліка зрабіла крок наперад у павышэнні тэмпаў прамысловага развіцця. Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 295.

[252] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 221.

[253] *Вишневский А.Ф.* Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995). Минск, 1995. С. 70–71.

[254] Пастанова ВС БССР // Звязда. 1938. 28 ліп. ; *Зельцер А.* Евреи советской провинции: Витебск и местечки. С. 198, 384.

[255] Склад дэлегатаў упаўнаважанай камісіі народнага сходу Заходняй Беларусі // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 230. Арк.16–19.

Аналіз асаблівасцей фарміравання нацыянальнай палітыкі БССР у 1920–1930-я гг. і асноўных напрамкаў дзейнасці органаў партыйна-дзяржаўнай улады дазваляе канстатаваць, што змест, формы і накіраванасць працы ў асяроддзі нацыянальных меншасцей з самага пачатку браліся пад строгі кантроль КП(б). У даследуемы перыяд у БССР прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі пераважную большасць у кіруючых органах розных узроўняў. У той жа час адзначаецца негатыўнае стаўленне партыйнага і савецкага кіраўніцтва да палякаў, літоўцаў, латышоў, немцаў, якое з'яўлялася вынікам: знешнепалітычных абставін, не даверам да іх у сувязі са статусам БССР як памежнай рэспублікі, высокага пачуцця нацыянальнай годнасці, што ўскладняла і рабіла менш выніковым уздзеянне на іх.

У 1920-я гг. былі створаны і дзейнічалі спецыяльныя органы (нацыянальных бюро) па кантролю і кіраванню працэсамі этна-культурнага развіцця нацыянальных меншасцей. У выніку быў назапашаны станоўчы вопыт дзяржаўнага кіравання і дзейнасці ў сферы міжнацыянальных адносін. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей БССР праявілі сваю актыўнасць ва ўсіх сферах тагачаснай палітычнай сістэмы. Значная частка з іх актыўна ўдзельнічала ў справе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР фарміравалася не ў Беларусі, за выключэннем асобных, самастойных дзеянняў у сярэдзіне 1920-х гг., калі прасочваюцца тэндэнцыі на прадастаўленне нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацыянальным меншасцям. Нацыянальна-дзяржаўная палітыка насіла ў большасці несістэмны характар, нягледзячы на пэўныя поспехі ў забеспячэнні насельніцтва ўстановамі, якія працавалі на роднай мове. Улады не ставілі мэтай адраджэнне ці замацаванне традыцыйных укладаў нацыянальных меншасцей. Асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з'яўлялася іх саветызацыя. Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР выкарыстоўвала патэнцыял нацыянальных меншасцей толькі для дасягнення канчатковай мэты – пабудовы камуністычнага грамадства. У канцы 1920-х гг. ЦК КП(б)Б быў вымушаны прызнаць пэўную безвыніковасць сваёй працы сярод асобных груп нацменшасцей. У той жа час правядзенне індустрыялізацыі, павышэнне адукацыйнага ўзроўню насельніцтва ў выніку нацыянальна-культурнай палітыкі істотна змянілі сацыяльна-эканамічнае становішча нацыянальных меншасцей БССР.

**Асноўныя кірункі нацыянальнай палітыкі ў пасляваенны перыяд (1945–1953).** Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў час Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945) была накіравана на кансалідацыю насельніцтва ўсіх нацыянальнасцей СССР для дасягнення перамогі над гітлераўскімі захопнікамі, на ўсенародную вайну супраць агрэсара.

Палітыка у галіне нацыянальных адносінаў, што праводзілася ў СССР у цэлым і ў БССР у прыватнасці, у пасляваенныя дзесяцігоддзі, у значнай ступені залежала ад цэлага комплексу фактараў, перш за ўсё палітычных і нацыянальна-культурных і ў агульных рысах супадала з нацыянальнай палітыкай передваеннага перыяду. Гэта праяўлялася і ў барацьбе з

"нацыяналізмамі", і ў пашырэнні сферы ўжывання рускай мовы. Так, у "Матэрыялах справаздачнага дакладу ЦК КП(б)Б XIX з'езду" (1949) падкрэслівалася, што партыя: "Лічыць сваёй першаснай задачай барацьбу супраць усялякага роду праяў нацыяналізму. Буржуазны нацыяналізм, пад чым бы ён не хаваўся, з'яўляецца агентурай міжнароднай рэакцыі… ЦК КП(б)Б вядзе пастаянную барацьбу супраць спроб нацыяналістычных элементаў адасобіць беларускую нацыянальную культуру ад культуры рускага народа, замкнуцца ў вузканацыянальных рамках, адмежавацца ад плённага ўплыву рускай культуры, ад яе вялікіх дасягненняў. Нацыяналістычныя элементы спрабавалі супрацьстаяць законнай цязе беларускага народа да рускай мовы, да авалодання культурнымі каштоўнасцямі вялікага рускага народа, у той час, як авалоданне рускай культурай і рускай мовай не толькі не абмяжоўвала, а наадварот, у вялікай ступені спрыяла абагачэнню і дальнейшаму развіццю беларускай мовы і беларускай культуры. Разам з тым, ЦК КП(б)Б неаднаразова папярэджваў аб неабходнасці барацьбы супраць якіх бы то ні было спроб ігнаравання беларускай нацыянальнай культуры, беларускай мовы, як магутнага сродка будаўніцтва беларускай сацыялістычнай культуры…"[256].

Датычылася гэта не толькі "беларускага нацыяналізму", але і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі: палякаў, яўрэяў, татараў, літоўцаў і інш. Паляванне на "нацыяналістаў", асабліва сярод творчай інтэлігенцыі, пачалося адразу пасля пераходу да мірнай працы.

Пачатак гэтаму быў пакладзены на прыёме ў гонар Перамогі, дзе Сталін узняў тост за "вялікі рускі народ". Не за савецкі, а менавіта рускі. За "нявернасць" Расіі ў гады Вялікай Айчыннай вайны былі пакараны цэлыя народы – калмыкі, чачэнцы, крымскія татары. На першае месца безумоўна і безальтэрнатыўна выходзіла руская нацыя і руская мова[257].

Для рэалізацыі патрэбных кірункаў нацыянальнай працы вялікую ўвагу надавалі вырашэнню "кадравага пытання" (нацыянальныя асаблівасці кадравага патэнцыялу гл. раздзел 5.2). Назіраўся палітычны недавер, павышаная падазронасць да асобаў, якія патэнцыяльна маглі займаць кіруючыя пасады, з ліку беларусаў і выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі. Палітыка цэнтральных уладаў была накіравана на ўмацаванне кадравага патэнцыялу рэспублікі асобамі залежнымі ад іх. Найбольш паслухмянымі былі тыя, хто не меў уласных каранёў на гэтай тэрыторыі і таму рабілі тое, што скажа начальства. Напрыклад, летам 1947 г. у Беларусь на працу былі накіраваны тры чалавекі на пасады першага і другога сакратароў, сакратара ЦК КП(б)Б: М. Гусараў, С. Ігнацьеў, М. Іўчук. Толькі апошні быў беларусам па нацыянальнасці. М. Гусараў ня ведаў Беларусі, а згадзіўся на пасаду ў інтарэсах уласнай кар'еры[258].

Трэба адзначыць, што ў пасляваенныя дзесяцігоддзі прадстаўнікі нацменшасцей, асабліва тыя, што былі прысланыя сюды цэнтральнымі органамі ўлады адчувалі сябе ў БССР даволі камфортна і самастойна. У тыя гады працэнт

[256] Стэнаграма XIX з'езда КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 213. Арк. 68.
[257] *Игнатенко И.М.* Национальный вопрос и современность. С. 36.
[258] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 76.

нацменшасцей (асабліва рускіх) сярод кіруючых кадраў рэспублікі быў заўсёды вышэй, чым іх удзельная вага ў агульным складзе насельніцтва. У першую чаргу за кошт накіраваных у рэспубліку кадраў, а не мясцовых ураджэнцаў. У той жа час трэба адзначыць, што шэраг прадстаўнікоў рускай нацыі шмат чаго зрабілі для развіцця беларускай культуры. Напрыклад, ураджэнец Варонежчыны оперны спявак М. Варвулёў, шэраг вучоных[259] і іншыя.

Асноўнай характарыстыкай міжэтнічных працэсаў у Беларусі з'яўляецца высокі ўзровень дэмакратызму з боку беларусаў, што адпавядаў нормам жыцця цывілізаванага грамадства. Калі ж і дапускаліся якія-небудзь памылкі ў практыцы міжэтнічных працэсаў, віна ў значнай ступені ляжыць на рэспубліканскіх дзяржаўных і партыйных структурах.

Вялікія складанасці і супярэчнасці міжэтнічных працэсаў у БССР з'явіліся вынікам увасаблення ў жыццё нацыянальнай палітыкі КПСС, асноўны напрамак якой яна бачыла ў паслядоўным зближэнні і зліцці савецкіх нацый і народнасцей. Ад гэтага тэарэтычна неабгрунтаванага, у аснове сваёй памылковага, крайне шкоднага напрамку ні на крок не адступалі партыйныя і савецкія органы Беларусі. Дасягнуўшы пэўнага поспеху ў развіцці эканомікі і культуры, зразумела, без уліку яе нацыянальнага аспекту, беларускі народ, як тытульная нацыя, так і мясцовыя нацменшасці, не толькі не ўмацаваў, а, наадварот, растраціў тыя якасці, якія складаюць яго этнакультурны патэнцыял[260].

Камуністычная партыя ўпэўнена кантралявала дзейнасць усіх дзяржаўных устаноў, міністэрстваў і ведамстваў, навуковай і творчай інтэлігенцыі, імкнучыся каб у галовах людзей панавала толькі марксісцка-ленінская ідэалогія. Партыя прыняла шэраг пастаноў, якімі вельмі абмяжоўваўся дыяпазон творчай думкі, практычнай дзейнасці мастацкай і навуковай інтэлігенцыі: "Аб часопісах "Звязда" і "Ленинград", "Аб рэпертуары драматычных тэатраў і мерах па яго паляпшэнні" (1946), "Аб кінафільме "Большая жизнь" (1948) і інш. Пад асабліва пільным наглядам знаходзіліся СМІ, выдавецтвы, творчыя аб'яднанні, навучальныя і навуковыя ўстановы.

Даследчык В. Мазец робіць выснову, што "на працягу 1945–1985 гг. нацыянальная палітыка КПСС і савецкай дзяржавы ў БССР характарызавалася барацьбой супраць любых праяваў нацыянальнай самасвядомасці, якая нязменна характарызавалася як нацыяналізм, а таксама супраць нацыянальных традыцый і звычаяў. У сферы культуры дэклараваўся клопат пра далейшы росквіт нацыянальных культураў усіх народаў СССР, але пры гэтым лічылася неабходным умацаванне іх інтэрнацыянальнай асновы, стварэнне агульнасавецкай

[259] Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава. Падзеі. Людзі. Лёсы / Пад рэд. А.У. Русецкага, А.М. Дарафеева. Віцебск, 1998 ; Возвращённые имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репресий. Минск, 1992 ; Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: Бібліяграфічны даведнік / Пад рэд. В.М. Чарапіцы. Гродна, 1999 ; Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921–2001) / Склад. А.А. Яноўскі. Мінск, 2001.

[260] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 263.

культуры камунізму праз пашырэнне грамадскіх функцый рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін шматнацыянальнай дзяржавы”[261].

Змена межаў пасля Другой Сусветнай вайны прывяла да пачатку міграцыйных працэсаў. Метадамі вырашэння “польскага пытання” былі дэпартацыі польскага насельніцтва[262] і передача Польшчы часткі тэрыторыі Заходняй Беларусі, населенай пераважна палякамі. 09.09.1944 г. паміж урадам БССР і Польскім Камітэтам нацыянальнага вызвалення (ПКНВ), створаным у Маскве, было падпісана Пагадненне пра ўзаемную “добраахвотную” эвакуацыю беларусаў з Польшчы і палякаў – з БССР у Польшчу. У БССР арганізацыя перасялення была ўскладзена на спецыяльна створаныя прадстаўніцтвы Савета народных камісараў. У другой палове 1944 г. пачалося перасяленне з Беларусі ў Польшчу палякаў, “паколькі лічылася, што яны з’яўляюцца небяспечнай сацыяльнай базай для ўзнікнення антысавецкіх выступленняў”[263]. Паводле міжнароднай дамоўленасці ад 16.08.1945 г. паміж Польшчай і СССР, Польскай рэспубліцы былі перададзены 17 раёнаў Беластоцкай вобласці разам з Беластокам і 3 раёны Брэсцкай вобласці. Праводзіўся абмен насельніцтвам паміж СССР і Польшчай. У 1944–1948 гг. з Заходняй Беларусі выехалі 274,2 тыс. палякаў ці тых, што назвалі сябе палякамі. Колькасць беларусаў, якія перасяліліся з Польшчы, была адносна невялікая (за 1945–1946 гг. у БССР пераехала 37 тыс. чалавек)[264]. Важную ролю ў прыняцці рашэння пра пераезд адыграў страх перад калектывізацыяй, а таксама агітацыя з боку каталіцкіх святароў і польскага падполля. Пры гэтым даследчыца Л. Козік, згадваючы праблемы, звязаныя як з рэгістрацыяй, так і выездам у Польшчу (неаднаразовыя адкладванні тэрмінаў высялення палякаў, парушэнні ўмоваў і г.д.), прыйшла да высновы, што выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу дазволіла выехаць у Польшчу толькі 32 % ад зарэгістраваных на выезд[265].

У пасляваенны час з БССР імкнуліся выехаць не толькі прадстаўнікі польскай, але і татарскай[266] і некаторых іншых меншасцей. Прычым пакінула рэспубліку ў значнай ступені элітарная частка гэтых супольнасцей. У ліку тых, хто выехаў у Польшчу, было 2180 настаўнікаў, 704 інжынерна-тэхнічных работнікі,

---

[261] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. Вып. 3. Минск, 2007. С. 234.

[262] *Kuzniacoŭ Ihar.* Deportacje Polaków z Zachodniej Białorusi w latach 1944–1952 przez aparat bezpieczeństwa BSRR // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 363–375.

[263] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1997. С. 237 ; *Вялікі А.Ф.* Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы // Праблемы ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.–тэарэт. канф. С. 262.

[264] Спісы рэпатрыіраваных палякаў // ДАГр. Ф. 1171. Воп. 3а. Спр. 17 ; Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 284 ; *Ruchniewicz Małgorzata.* Organizacja przesiedleń z BSRR do Polski w latach 1944–1946 // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. Warszawa, 2017. S. 325–345.

[265] *Kozik L.* Przesiedlenie Polaków do Polski z obwodu połockiego BSRR w latach 1944–1946 // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. Warszawa, 2017. S. 351–367.

[266] *Монзуль В.* Положение мусульманских общин в БССР в 1944–1960 годах (по документам Национального архива Республики Беларусь) // Архівы і справаводства. 2018. № 2. С. 83.

478 урачоў, 306 царкоўнаслужачых. У выніку масавага выезду спецыялістаў у Польшчу склалася даволі складанае становішча з педагагічнымі кадрамі ў Гродзенскай вобласці. Так, у 1944–1945 гг. з 1640 настаўнікаў, працаваўшых у школах Гродзеншчыны, 756 альбо 46,8 % з'яўляліся палякамі, ці палічылі сябе палякамі і выехалі ў Польшчу. Па асобных раёнах вобласці (Зэльвенскім, Сапоцкінскім, Жалудоцкім) гэты паказчык быў яшчэ вышэйшым і дасягаў 55–60 %. Гэта, у сваю чаргу, разам з палітыкай уладаў выклікала скарачэнне колькасці польскіх школ. Так, калі ў 1944–45 н. г. на польскай мове працавала 114 школ, то 1945–46 н.г. – 42, а ў 1946–1947 н.г. засталося толькі 22 польскія школы[267].

Прычыны такога без перабольшання масавага зыходу найбольш працаздольнага, руплівага, гаспадарлівага насельніцтва ў Польшчу: непрыняцце савецкай улады і ўсяго таго, што ад яе імя рабілася – правядзенне прымусовай калектывізацыі, масавых арыштаў і дэпартацый насельніцтва заходніх абласцей, прымусовых арганізацыйных набораў грамадзян на працу ў Сібір, на Сахалін, у Карэлію, на Урал ды іншыя раёны СССР, рэлігійны ўціск, непамерныя падаткі на аднаасобніка. Нельга не ўлічваць і роднасныя адносіны з палякамі па другі бок мяжы ды іншае[268]. Дэпартацыі і перасяленні палякаў на тэрыторыю Заходняй Сібіры адбываліся паводле рашэнняў Асобай нарады пры НКУС-МУС СССР ў 1944–1946 гг. і шэрагу пастаноў Савета Міністраў БССР у 1947–1951 гг.[269]

Асноўныя кірункі партыйна-дзяржаўных уладаў да застаўшагася польскага насельніцтва БССР былі сфармуляваны у пастанове ЦК УсеКП(б) "Аб палітычнай працы партыйных арганізацый сярод насельніцтва заходніх абласцей БССР" ад 20.01.1945 г., якая, паводле меркавання даследчыка А. Вялікага, "вызначыла стратэгію паводзін КП(б)Б адносна палякаў амаль да канца 1940-х гг." і ставіла задачу "выцяснення ўсяго польскага з духоўнага, культурнага, рэлігійнага жыцця палякаў"[270]. 12.12.1945 г. быў праведзены спецыяльны Пленум ЦК КП(б)Б. У яго пастанове адзначалася, што "агітацыйна-масавая работа партыйных арганізацый павінна насіць наступальны характар, выхоўваць пільнасць у насельніцтва і выкрываць усе вылазкі класава варожых элементаў, польска-нямецкіх і беларуска-нямецкіх нацыяналістаў, якія спрабуюць перашкодзіць паспяховаму правядзенню выбараў" [271].

У чарговы раз "польскае пытанне" ўздымалася на Пленуме ЦК КП(б)Б 03–06.06.1947 г., які разгледзеў пытанне "Пра стан і меры паляпшэння партыйна-

---

[267] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. С. 333 ; Вялікі А.Ф. Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. С. 266–267.

[268] *Вялікі А.Ф.* Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. С. 265 ; *Ruchniewicz Małgorzata*. Organizacja przesiedleń z BSRR do Polski w latach 1944–1946 // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 325–345.

[269] *Kuzniacoŭ Ihar.* Deportacje Polaków z Zachodniej Białorusi w latach 1944–1952 przez aparat bezpieczeństwa BSRR // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 363–375.

[270] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: "дваістыя стандарты" нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.) // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 293.

[271] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1985. Т. 3. С. 54.

арганізацыйнай і палітычнай працы ў арганізацыях КП(б) Беларусі”. Пленум ЦК КП(б)Б палічыў памылковым, што “некаторыя партыйныя і савецкія органы, асабліва Гродзенскай вобласці, не вядуць палітычнай работы сярод насельніцтва, якое размаўляе на польскай мове, і, у асаблівасці, сярод насельніцтва польскай нацыянальнасці”, а таксама абавязаў “партыйныя арганізацыі заходніх абласцей павысіць бальшавіцкую пільнасць і нястомна весці работу па выкрыцці і ліквідацыі нацыяналістаў усіх масцей як злейшых ворагаў народа...”[272].

Пастанова чэрвеньскага пленума ЦК КП(б)Б (1947) была першым і апошнім прызнаннем таго, што партыйныя і савецкія работнікі заходніх абласцей не вялі палітычную працу “сярод насельніцтва польскай нацыянальнасці”. Пазней, напрыклад, пры абмеркаванні ЦК КПБ пытання “Аб працы выканкама Гродзенскага абласнога савета дэпутатаў працоўных” (26.04.1967) нават не ўзгадвалася аб працы сярод палякаў і насельніцтва, размаўляючага па-польску[273].

У ліпені 1947 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б М. Гусараў накіроўвае адну за другой аналітычныя запіскі “Аб стане і мерах па паляпшэнні палітычнай працы сярод апалячанага беларускага насельніцтва і насельніцтва польскай нацыянальнасці ў заходніх абласцях БССР” на імя сакратара ЦК УсеКП(б) А. Жданава. Як трывожную прыкмету М. Гусараў адзначыў, што “за апошнія тры гады значна ўзрасла колькасць людзей, якія называюць сябе палякамі, нягледзячы на той факт, што колькасць польскага насельніцтва значна зменшылася ў выніку рэпатрыяцыі ў Польшчу”. Улічваючы гэтыя і іншыя фактары, ЦК КП(б)Б палічыў неабходным “Весці лінію на беларусізацыю апалячанага беларускага насельніцтва і на шырокае развіццё беларускай і рускай савецкай культуры ў заходніх абласцях БССР з тым, каб у бліжэйшыя гады далучыць да беларускай і рускай савецкай культуры і апалячаных беларусаў, і польскае насельніцтва, якое засталося ў рэспубліцы”. Не давалі спакою партыйнаму кіраўніцтву рэспублікі 22 польскія школы, якія працягвалі сваю дзейнасць. М. Гусараў падкрэсліваў, што ў рэспубліцы няма ні дастатковай колькасці падручнікаў на польскай мове, ні настаўнікаў, якія б маглі выкладаць па-польску. Да таго ж польскія настаўнікі, “атрымаўшы адукацыю і выхаванне ва ўстановах панскай Польшчы, як правіла, звязаныя з каталіцкім духавенствам, у асобных выпадках з нацыяналістычным падполлем, не жадаюць і не здольныя весці выхаванне вучняў у савецкім духу”. Першы сакратар ЦК КП(б)Б выказваў меркаванне, што “неабходнасць далейшага існавання польскіх школ у гэтых умовах падаецца нам надта сумніўнай” і прасіў ЦК УсеКП(б) санкцыянаваць правядзенне наступных мерапрыемстваў: “З-за таго, што існаванне польскіх школ магло б быць шкодным Савецкай дзяржаве, паступова пераўтварыць польскія школы ў беларускія і рускія

[272] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1985. Т. 3. С. 182 ; *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “двaістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 295.
[273] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 295.

шляхам замены ненадзейных некваліфікаваных выкладчыкаў палякаў, падрыхтаванымі і надзейнымі выкладчыкамі рускімі і беларусамі”[274].

Уладамі рэспублікі прадугледжвалася значнае пашырэнне вячэрніх школ з выкладаннем на беларускай і рускай мовах; адкрыццё ў Гародні ў 1947–1948 гг. палітвучэльні для падрыхтоўкі “надзейных работнікаў” з мясцовага насельніцтва; стварэнне ў ЦК КП(б)Б звыш устаноўленых лімітаў штату прапагандыстаў у складзе 10 чалавек, маючых належную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку і валодаючых польскай мовай і г.д. Як прыклад “правільнай працы” сярод насельніцтва заходніх абласцей, прыводзіўся факт, што за тры гады колькасць польскіх школ скарацілася з 144 (1944) да 22 (1947). Пасля 1947 г. у БССР былі закрыты апошнія польскія і ўкраінскія школы[275].

Партыйнае кіраўніцтва рэспублікі палічыла “неабходным давесці да ведама ЦК УсеКП(б) пра факты рэакцыйнай антысавецкай дзейнасці польскага каталіцкага духавенства ў заходніх абласцях БССР”[276].

Змаганне з каталіцкай царквой было выклікана сярод іншага і тым, што яна ніколі афіцыйна не прызнавала савецкую ўладу. Гэта будзе падцверджана на Усесаюзнай нарадзе упаўнаважаных Савета па справах рэлігій (1980), дзе з дакладам выступіў старшыня Савета па справах рэлігій пры СМ СССР У. Кураедаў. У прыватнасці ён адзначыў: “Калі з боку праваслаўнага і мусульманскага духавенства праяўляецца ў цэлым лаяльнае стаўленне да Савецкай дзяржавы, то ў каталіцызме сярод ксяндзоў ўсё больш прыкметны рост рэлігійнага экстрэмізму”[277]. Вырашаючы польскае пытанне, партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР прымае рашэнне аб дэпартацыі (перасяленні) ксяндзоў у Польшчу. Выказвалася занепакоенасць, што з 552 ксяндзоў, якія выказалі жаданне у першыя гады пасля вайны выехаць у Польшчу, выехала толькі 306. Святароў абвінавачвалі ў тым, што яны імкнуліся ўзяць пад свой уплыў дзяцей і моладзь “як непасрэдна, так і праз бацькоў і тых настаўнікаў, якія выхаваныя ў духу польскага нацыяналізму і рэлігійнай ідэалогіі”. Улады выкарыстоўвалі рэпатрыяцыі (дэпартацыі) польскага насельніцтва для канфіскацыі культавых будынкаў і перадачы касцёлаў пад культурныя патрэбы. Так, напрыклад, у 1947 г. будынак касцёла ў в. Валеўка Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці БССР перадалі пад жыллё рабочых[278].

---

[274] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 294.

[275] *Kruczkowski T.* Niektóre zagadnienia historii etnicznej Polaków na Białorusi // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар.науч.конф. С. 70–71 ; *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 294.

[276] Ліст першага сакратара ЦК КП(б)Б М.Гусарава // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 29. Спр. 543. Арк. 28 ; *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 209 ; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе. С. 342.

[277] Даклад старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР У. Кураедава. 1980 г. // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 106. Арк. 11–12 ; *Пушкін І. А.* Актывізацыя этнічнай самасвядомасці польскага і літоўскага насельніцтва Беларусі пад уплывам візітаў Папы Рымскага Яна Паўла ІІ у ПНР // Studia internationalia: Материалы VI междунар. науч. конф. “Западный регион России в международных отношениях X–XX вв.” (9–11 ноября 2017). Брянск, 2017. С. 203–204.

[278] Пратакол № 12 пасяджэння Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР ад 3.07.1947 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 4. Спр. 19. Арк. 404, 151–153.

На думку В. Мазеца, 1948–1953 гг. сталі самым змрочным перыядам для развіцця нацыянальнай культуры ў пасляваеннай гісторыі савецкіх яўрэяў. Гэта быў час правядзення ідэалагічных кампаній барацьбы з “бязроднымі касмапалітамі” і “яўрэйскімі буржуазнымі нацыяналістамі”. Сама прафесійная прыналежнасць чалавека да ліку яўрэйскіх літаратараў, яўрэйскіх акцёраў, даследчыкаў гісторыі, этнаграфіі, фальклору яўрэяў з’яўлялася падставаю для павышанай увагі з боку Міністэрства дзяржаўнай бяспекі. Вынікам гэтай барацьбы стала ліквідацыя літаральна ўсіх яўрэйскіх арганізацый і ўстаноў, у тым ліку і адзінага на Беларусі яўрэйскага тэатра. Яўрэйскія пісьменнікі, тэатральныя і мастацкія дзеячы былі звольнены з працы, а некаторыя нават і арыштаваны. Магчымасць выкарыстання ў культурным жыцці мовы ідыш або іўрыт была зведзена да мінімуму[279].

12.01.1948 г. у Мінску быў забіты кіраўнік Яўрэйскага антыфашысцкага камітэта (створаны 24.08.1941[280]), яўрэйскі артыст С. Міхаэлс. Пасля яго забойства, 26.03.1948 г. міністрам дзяржбяспекі Абакумавым у Савет Міністраў СССР і ЦК УсеКП(б) была накіравана дакладная, у якой адзначалася, што “у Беларусі органамі МДБ выяўлена і распрацоўваецца група, якую узначальвае член Саюза савецкіх пісьменнікаў Беларусі Платнер. І. Платнер да 1930 г. жыў у Амерыцы, дзе ўваходзіў у склад нацыяналістычнай арганізацыі “Паалей-Цыён” і з’яўляўся ўдзельнікам міжнароднага кангрэсу сіяністаў. Агентурным назіраннем высветлена, што ўдзельнікі нацыяналістычных яўрэйскіх груп на Украіне і Беларусі праз Яўрэйскі антыфашысцкі камітэт наладжвалі сувязь з яўрэйскімі нацыяналістычнымі дзеячамі, што прыязджалі ў Савецкі Саюз з-за мяжы”[281].

Неабходна памятаць, што савецкая краіна шмат зрабіла для ўзнікнення яўрэйскай дзяржавы (Дэкларацыя аб незалежнасци была прынята 14.05.1948) і спадзявалася на падтрымку курсу СССР з боку Ізраіля. Але кіраўніцтва новай дзяржавы зрабіла стаўку на палітыку ЗША. Гэта і прывяло да недаверу асобам яўрэйскай нацыянальнасці. 20.11.1948 г. на паседжанні Палітбюро ЦК УсеКП(б) было прынята рашэнне тэрмінова распусціць Яўрэйскі антыфашысцкі камітэт[282]. 25.11.1948 г. пастановаю палітбюро было закрыта выдавецтва “Дэр Эмес”, якое выпускала літаратуру на яўрэйскай мове.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР дзейнічаў у беларускай сталіцы з 1946 па 1949 гг. У яго рэпертуары былі спектаклі як яўрэйскіх, так і аўтараў іншых нацыянальнасцей, аднак адсутнічалі п’есы беларускіх аўтараў. Якраз тэатральнае мастацтва і выклікала хвалю нападаў партыйна-савецкага кіраўніцтва на нацыянальныя адметнасці. “Буйныя памылкі ў сваёй дзейнасці дапускалі і нашы тэатры. У тэатры оперы і балета доўгі час выкарыстоўвалі амаль выключна творы заходне-еўрапейскіх кампазітараў, а руская класіка і беларуская нацыянальная

[279] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 221.
[280] Яўрэйскі антыфашысцкі камітэт // ДАРФ. Ф. Р-8114. Воп. 1. Спр. 1.
[281] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 176; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 398–399.
[282] Яўрэйскі антыфашысцкі камітэт // ДАРФ. Ф. Р-8114. Воп. 1. Спр. 1–1281.

оперная і балетная музыка ігнараваліся… яўрэйскі тэатр – да апошняга часу прытрымліваўся нявернай рэпертуарнай палітыцы, ставіў антыпатрыятычныя п'есы, у якіх ідэалізаваўся патрыярхальна-мяшчанскі быт яўрэйскай мелкай буржуазіі, ухвалялася жыццё ў буржуазнай Амерыцы і г. д."[283]

У студзені 1949 г. быў надрукаваны ў "Правде" артыкул "Аб адной антыпартыйнай групе тэатральных крытыкаў", які паклаў пачатак разгортванню ідэалагічнай кампаніі па барацьбе з бязроднымі касмапалітамі. Сакратару ЦК КП(б)Б М. Гусараву ў пачатку 1949 г. была накіраваная дакладная запіска пра стан літаратурнай і тэатральнай крытыкі ў БССР, у якой выкрываліся касмапаліты. Так, у літаратурнай крытыцы і літаратуразнаўстве былі абвешчаны антыпатрыётамі-касмапалітамі Л. Бэндэ, Л. Бараг, В. Гальперын, М. Смолкін, А. Кучар і Я. Герцовіч. Л. Бэндэ і М. Смолкін абвінавачваліся ў паклёпе на Я. Коласа і Я. Купалу, В. Гальперын – у паклёпе на М. Багдановіча і М. Лынькова. А. Кучар быў абвешчаны "своеасаблівым арганізатарам касмапалітычнага падполля ў беларускай літаратуры." У галіне тэатральнай работы акрамя В. Галаўчынера ў касмапалітызме былі абвінавачаны мастацкі кіраўнік тэатра імя Янкі Купалы Л. Літвінаў і тэатральны крытык М. Модэль. Касмапаліты былі знойдзены нават у галіне кінамастацтва і музыкі. "Самым горшым відам касмапаліта ў тэорыі і практыцы" быў абвешчаны В. Вольскі, які "адзін час быў немцам, затым палякам, потым яўрэям, а цяпер пішацца беларусам". За тое, што ўхваляў і абараняў Л. Барага, быў падвергнуты крытыцы вядомы этнограф М. Грынблат[284].

08.02.1949 г. было прынята чарговае рашэнне Палітбюро ЦК УсеКП(б) "Пра роспуск аб'яднанняў пісьменнікаў і пра закрыццё альманахаў на яўрэйскай мове". На падставе гэтага рашэння былі распушчаны аб'яднанні яўрэйскіх пісьменнікаў у Маскве, Кіеве і Мінску. У той жа дзень сакратар ЦК КП(б)Б М. Гусараў накіраваў Старшыні СМ СССР Г. Малянкову пісьмо, у якім, праяўляючы "палітычную пільнасць", абгрунтоўваў неабходнасць закрыцця Беларускага дзяржаўнага яўрэйскага драматычнага тэатра: "Яўрэйскі драматычны тэатр БССР да апошняга часу вёў ідэалагічна неправільную рэпертуарную палітыку, у сваіх пастаноўках ідэалізаваў патрыярхальны быт дробнабуржуазных пластоў дарэвалюцыйнага яўрэйскага насельніцтва і ўхваляў жыццё ў капіталістычных краінах. Сярод работнікаў тэатра доўгі час распаўсюджваліся нацыяналістычныя настроі, нібыта рускія і беларусы вінаватыя ў смерці тысяч яўрэяў, бо не абаранілі іх ад немцаў і дапамагалі немцам у вынішчэнні яўрэяў"[285]. У пачатку 1949 г. быў праведзены партыйны сход, на якім было прапанавана "выкарчаваць карэнні буржуазнага касмапалітызму, эстэцтва і фармалізму ў яўрэйскім тэатры"[286].

[283] Стэнаграма XIX з'езда КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 213. Арк. 68–69.
[284] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 220.
[285] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 402.
[286] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 219.

Барацьба з нізкапаклонствам перад краінамі Захаду ў БССР набыла вялікі размах пасля публікацыі перад XIX з'ездам КП(б)Б (16–18.02.1949) артыкула "Носьбіты бязроднага касмапалітызму". На з'ездзе адзначалася: "…У тэатральнай і літаратурнай крытыцы ў Беларусі мелі месца антыпатрыятычныя праявы бязроднага касмапалітызма і буржуазнага эстэцтва. Група тэатральных крытыкаў (Літвінаў–Гурэвіч, Модель і іншыя), якая стаяла на пазіцыях фармалізму і касмапалітызму, сустракала ў штыкі лепшыя савецкія патрыятычныя п'есы… прыніжала дасягненні рускага рэалістычнага мастацтва. Рэжысёры Літвінаў-Гурэвіч, Галаўчынер і Марголін працягвалі на сцэны нашых тэатраў ідэйна-варожыя нам творы буржуазных драматургаў… Бязродны касмапалітызм, разам з прамым нізкапаклонствам перад замежжам, знайшоў сваё прамое выражэнне ў пастаноўках Штэйна і Марголіна ў яўрэйскім тэатры: "Музыкант" – Галкіна і "Блукаючыя зоркі" Дабрушына… У вобласці літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі бязродны касамапалітызм знайшоў сваё выражэнне ў творах Барагі і Мееровіча, якія заяўлялі, што беларускі фальклёр – гэта вынік самых розных, перакрыжаваных заходнееўрапейскіх уплываў… У літаратурнай крытыцы бязродныя касмапаліты ўсяляк імкнуліся прынізіць і зганьбіць дасягненне культуры беларускага народа. Так, напрыклад, Бэнда ў сваіх артыкулах зганьбіў выбітнага беларускага пісьменніка-дэмакрата Багушэвіча, аб'явіўшы яго ідэологам шавінізму і прапаведнікам каталіцызму, а Гальперын паказаў аднаго з буйнейшых беларускіх паэтаў-дэмакратаў Максіма Багдановіча містыкам і дэкадэнтам"[287].

Асноўныя кірункі нацыянальнай працы знайшлі сваё адлюстраванне ў рэзалюцыі XIX з'езда КП(б)Б, прынятай 18.02.1949 г. : "Надаючы штодзённую ўвагу ідэалагічнай працы, КП(б)Б узмацніла барацьбу супраць усіх праяў буржуазнай ідэалогіі, нізкапаклонства перад замежжам, супраць спробаў нацыяналістычных элементаў адасобіць беларускую нацыянальную культуру ад культуры вялікага рускага народа. Партыйныя арганізацыі палепшылі выхаванне інтэлігенцыі ў духу савецкага патрыятызму.

XIX з'езд КП(б)Б адзначае, што ЦК КП(б)Б, на аснове рашэнняў ЦК УсеКП(б) па ідэалагічных пытаннях і па справаздачы ЦК КП(б)Б, выявіў шэраг сур'ёзных памылак нацыяналістычнага кшталту ў працах па гісторыі БССР, па гісторыі беларускай літаратуры, у школьных хрэстаматыях. Выкрыта антыленінская тэорыя "адзінага патоку" ў развіцці беларускага народу і яго культуры, а таксама нацыяналістычная тэорыя "залатога веку", які быццам бы перажывала Беларусь у перыяд уладарства літоўскіх і польскіх феадалаў, нацыяналістычныя выдумкі, быццам бы святло культуры прыйшло ў Беларусь з захаду. Партыйныя арганізацыі ачолілі выкрыццё бязроднага касмапалітызму і іншых праяў нізкапаклонства перад капіталізмам і яго разбэшчанай культурай…

XIX з'езд КП(б)Б лічыць першачарговай задачай ЦК КП(б)Б і ўсіх партыйных органаў КП(б)Б далейшы ўздым ідэалагічнай працы КП(б)Б, усялякага развіцця беларускай савецкай культуры, нацыянальнай па форме,

[287] Стэнаграма XIX з'езда КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 213. Арк. 69–70.

сацыялістычнай па зместу, выхаванне ўсіх працоўных у духу сацыялістычнай свядомасці, савецкага патрыятызму, самаахвярнай адданасці Савецкай Радзіме, бальшавіцкай партыі, тав. Сталіну.

З'езд КП(б)Б патрабуе ад партыйных арганізацый далейшай рашучай барацьбы супраць буржуазнай ідэалогіі, супраць рэцыдываў нацыяналізму, бязроднага касмапалітызму і іншых праяў нізкапаклонства перад замежжам. … Выхоўваць інтэлігенцыю ў духу савецкага патрыятызму і сяброўства народаў СССР"[288].

Ідэалагічныя службы абвясцілі бязлітасную барацьбу з касмапалітызмам і нізкапаклонствам перад Захадам, аднак не збіраліся даваць належную прастору нацыянальным інтарэсам савецкіх народаў, баючыся, каб гэта не перарасло ў другую, на яго погляд, небяспечную крайнасць – мясцовы нацыяналізм[289].

30.03.1949 г. Беларускі дзяржаўны яўрэйскі драматычны тэатр быў зачынены, а яго дырэктар В. Галаўчынер, абвінавачаны ў бязродным касмапалітызме, пераехаў на працу ў Вільнюс.

Характарызуючы сітуацыю, відавочца тых падзеяў А. Рубін, які сам быў зняволены на 6 гадоў за распаўсюджванне яўрэйскай літаратуры, у сваёй кнізе успамінаў адзначаў: "Атмасфера ў Мінску была цяжкай, яўрэі былі запалоханыя, загнаныя і баяліся ўласнага ценю. Пачуццё нацыянальнай вартасці было прыгнечана, загнана ў далёкі куток і прыціснута рускім ботам"[290]. Яўрэяў маглі арыштаваць толькі за тое, што яны вывучалі іўрыт і ідыш, чыталі кнігі Шалом-Алейхема. Атрыманне грашовай дапамогі або наяўнасць сваякоў за мяжой былі важкай падставай для звальнення з працы.

Пастановы вышэйшага органа ўлады – XIX з'езда КП(б)Б – шырока абмяркоўваліся, браліся на ўзбраенне вялікай колькасцю прапагандыстаў. Барацьбой з касмапалітызмам і нізкапаклонствам перад захадам партыі ўдалося размежаваць паміж сабой не толькі мастацкую інтэлігенцыю, але і гісторыкаў, філосафаў, прадстаўнікоў іншых грамадазнаўчых навук,ператварыўшы многіх з іх у заўзятых змагароў за ўяўную камуністычную ідэю. Вынікам стала праца, накіраваная на дэнацыяналізацыю, русіфікацыю насельніцтва Беларусі. Гэта адбывалася праз вывучэнне кнігі "Короткий курс истории ВКП(б)", нізкія веды па нацыянальнай гісторыі, вышэйшыя і сярэднеспецыяльныя навучальныя ўстановы, дзе рыхтавалі педагогаў на рускай мове.

Як слушна падкрэслівае прафесар Л. Лыч, дэфармацыі моўнага развіцця закранулі не толькі беларускую нацыю. Яны насілі агульнасаюзны характар, бо недаацэнка нацыянальнага мела месца ва ўсіх рэгіёнах краіны. Паасобныя дзяржаўныя і партыйныя дзеячы, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі не ставіліся з належнай увагай да пытанняў нацыянальна-культурнага развіцця, разлічвалі, чым хутчэй падрыхтуюць культуры і мовы сваіх народаў да зліцця, тым у большую ласку ўвойдуць да І. Сталіна і яго паплечнікаў. Адначасова трэба адзначыць, што

---

[288] Рэзалюцыя XIX з'езда КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 215. Арк. 15, 15 адв., 16, 16 адв.

[289] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 125.

[290] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 220.

гаротнае становішча з гістарычнай памяццю, нацыянальнай самасвядомасцю вельмі хвалявала прагрэсіўных прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі. Шмат чаго прадпрымалася для захавання нацыянальных адметнасцей і захадаў каб падтрымаць іх. Аднак і рупліўцы на гэтай ніве пераацэньвалі ролю інтэрнацыянальнага і падпарадкоўвалі яму нацыянальны інтарэс[291].

Афіцыйныя крытыка тых часоў кнігі гісторыка Н. Каменскай "Утварэнне БССР" засведчыла, што гісторыя Беларусі набыла скажоны змест. Грамадска-палітычнай актыўнасці і нармальнаму нацыянальнаму развіццю народаў Беларусі, падтрыманню на належным узроўні іх этнічнай самасвядомасці ўвесь савецкі час перашкаджала амаль поўная адсутнасць у людзей аб'ектыўных ведаў па сваёй уласнай гісторыі.

Усё сказанае сведчыць, як цяжка і складана было працаваць у той час дзеля нацыянальнай ідэі, захавання нацыянальных адметнасцей. Асаблівы недавер існаваў у дачыненні да інтэлігенцыі, якая лепш за усіх разумела гэта і была гатовая самааддана працаваць на іх карысць.

У верасні 1951 г. Савет Міністраў СССР прыняў пастанову "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР". У тым жа годзе былі падвергнуты дэпартацыі ў Іркуцкую вобласць 4520 былых салдат Польскай арміі генерала У. Андэрса разам з членамі іх сямей. У ліку дэпартаваных – пераважна ўраджэнцы Заходняй Беларусі, якія былі мабілізаваны ў верасні 1939 г. у Войска Польскае, а потым трапілі ў савецкі палон. Толькі пасля 1956 г. былым салдатам арміі Андэрса было дазволена вярнуцца разам з сем'ямі ў Польшчу[292].

20–23.09.1952 г. праходзіў чарговы XX з'езд КП(б)Б. На ім з 709 дэлегатаў, 255 былі па нацыянальнасці рускімі, 33 – украінцамі, 4 – яўрэямі, 6 – іншай нацыянальнасці. Прадстаўнікі нетытульнай нацыі складалі – 42,3 % (на XIX – 46,2 %).

Агульным для абодвух пасляваенных з'ездаў КПБ было тое, што яны не мелі ніякай самастойнасці ў вызначэнні ўласнай палітыкі, а з'яўляліся выканаўцамі палітычных дактрын Сталіна. Вядома, што на міжэтнічныя працэсы ў краіне моцна ўплывалі асабістыя сімпатыі і антыпатыі правадыра. У матэрыялах XIX і XX з'ездаў нічога канкрэтнага не гаварылася пра развіццё і ўдзел асоб розных нацыянальнасцей у грамадскім і гаспадарчым жыцці рэспублікі. Вялася размова толькі пра агульны беларускі народ. Па інэрцыі і аўтаматызму надавалася некаторая ўвага развіццю беларускай культуры.

З рэзалюцыі XX з'езда КП(б)Б: "З'езд абавязвае ЦК КП(б)Б і ўсе партыйныя арганізацыі… выхоўваць кадры інтэлігенцыі ў духу баявога савецкага патрыятызму, бязлітаснай барацьбы супраць усіх праяў буржуазнай ідэалогіі, знішчаць на самым пачатку рэцыдывы буржуазнага нацыяналізму і бязроднага касмапалітызму… Важнейшай з'яўляецца праца па далейшаму развіццю культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зместу… Неабходна палепшыць працу па падбору, растаноўцы і выхаванню кадраў,

[291] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 137, 152, 157.
[292] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 347.

строга кіруючыся указаннямі Сталіна аб тым, што правільна падбіраць кадры – "гэта значыцца падбіраць работнікаў, па-першае, па палітычных прыкметах, ці заслугоўваюць яны палітычнага даверу і, па-другое, па дзелавых якасцях, ці прыдатныя яны для канкрэтнай працы". Весці нястомную барацьбу з парушальнікамі гэтых указанняў, з фактамі падбору кадраў па прыкметах сяброўскіх адносін, асабістай адданасці, зямляцтва і сваяцтва…"[293].

Пад час спрэчак на з'ездзе абмяркоўваўся праект новага статута партыі, які быў затым прыняты. У ім гаварылася: "Галоўныя задачы КПСС… выхаванне членаў грамадства ў духу інтэрнацыяналізму…"[294].

13.01.1953 г. была распачата чарговая кампанія па выяўленню ворагаў з ліку яўрэяў, якая ў гістарычнай літаратуры атрымала назву "справа ўрачоў". У адрозненне ад кампаніі 1948–1949 гг., калі яўрэяў называлі касмапалітамі, то ў 1953 г. слова "яўрэй" стала сінонімам словаў "сіяніст" і "нацыяналіст". Яны былі абвешчаны непрымірымымі ворагамі савецкай улады. З розных месцаў БССР у ЦК КП(б)Б ішлі паведамленні пра рост антыяўрэйскіх настрояў сярод насельніцтва пасля паведамлення ТАСС пра ўрачоў-шкоднікаў. Крымінальная справа ў дачыненні да іх была спынена ў сувязі са смерцю "вялікага правадыра".

Пэўныя змены ў нацыянальнай палітыцы адбыліся пасля смерці Сталіна. У БССР да 1953 г. было больш за ўсё істотных адхіленняў ад прынцыпаў гуманнасці і справядлівасці. Сітуацыю спрабавалі выкарыстаць некаторыя кіруючыя партыйныя работнікі, імкнучыся пры дапамозе новых падыходаў у нацыянальнай палітыцы, здабыць папулярнасць ва ўсёй шматнацыянальнай краіне. Гэта тычыцца найперш Л. Берыі. Ён пасля смерці Сталіна распачаў перабудову апарата кіруючых кадраў. У сваім лісце ён прапанаваў змясціць партыйнага лідара Беларусі – М. Патолічава, які быў па нацыянальнасці рускі. Прычым яго прапановы былі не супраць спецыялістаў народнай гаспадаркі, а менавіта супраць партыйнага апарату, які ў БССР складаўся з рускіх. Апарат павінен быў па яго прапанове складацца з мясцовых. Некаторыя вучоныя, напрыклад акадэмік М. Касцюк, лічаць той перыяд другой беларусізацыяй, якая была вельмі кароткачасовай і фактычна далей рашэнняў чэрвеньскага (1953) пленума ЦК КП(б)Б не пайшла[295].

Пры непасрэдным удзеле Л. Берыі 12.06.1953 г. была прынята пастанова ЦК КПСС "Пытанні Беларускай ССР", у якой вельмі сур'ёзна крытыкаваліся недахопы нацыянальнай палітыкі ў нашай рэспубліцы[296]. У выніку адбыўся чэрвеньскі пленум ЦК КПБ (1953). На ім з крытыкай нацыянальнай палітыкі ў рэспубліцы выступіў М. Зімянін. Яго прапановы прадугледжвалі павелічэння працэнтнага складу беларусаў у партыйна-савецкім апараце (напрыклад, у сямі райкамах КПБ усе сакратары былі прадстаўнікамі нацменшасцей), неабходнасць адраджэння беларускай мовы (выкліканае як унутранымі, так і знешнімі фактарамі). Адначасова пленум падкрэсліў, што рускім, украінцам, яўрэям і

[293] Рэзалюцыі XX з'езда КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 232. Арк. 37, 39, 44.
[294] Стэнаграма XX з'езда КП(б)Б // Там жа. Спр. 218. Арк. 173.
[295] *Касцюк М.* Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. 1995. № 2. С. 105.
[296] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 176.

прадстаўнікам іншых народаў даецца “поўнае права размаўляць на сваёй роднай мове”[297]. Гэтая праграма беларусізацыі напалохала многіх партыйных кіраўнікоў, у тым ліку беларусаў. Яны згуртаваліся вакол першага сакратара ЦК КПБ М. Патолічава. Зусім па-іншаму пайшла гаворка пра нацыянальную палітыку на ліпеньскім пленуме (1953), калі абмяркоўвалася злачынная дзейнасць Л. Берыі. Зразумела, што прапановы М. Зімяніна былі адхілены.

Ідэалагічная адзнака прапановам Берыі была дадзена на ХХІ з’ездзе КПБ пад час выступу сакратара ЦК КПБ Ц. Гарбузова: “Трэцяе і апошняе пытанне, на якім бы я хацеў прыпыніцца – гэта справа Берыі. Справа Берыі не была асобнай з’яваю ў нашым жыцці, яна мела прамую сувязь з лагерам імперыялізму. Сваімі вераломнымі прыёмамі Берыя імкнуўся падарваць сяброўства народаў Савецкага Саюза, пасеяць варожасць паміж імі, актывізаваць буржуазна-нацыяналістычныя элементы ў саюзных рэспубліках. Яго запіска па БССР аб так званых скажэннях нацыянальнай палітыкі ў БССР з’яўляецца актам дыверсіі. У замаскіраванай форме нам прапаноўвалі самае страшэннае, што толькі можна дапусціць, – гэта раз’яднаць нас, беларусаў, з вялікім рускім народам.

Тое, што КПБ і ўвесь беларускі народ разглядалі як вялікую дапамогу рэспубліцы – накіраванне ў Беларусь для дапамогі нам з братэрскіх рэспублік партыйных работнікаў, савецкіх работнікаў, спецыялістаў – ганьбавалася і ў завуаляванай форме, прапаноўвалася пачаць выгнанне работнікаў рускай нацыянальнасці з БССР.

Але КПБ здолела разабрацца ў гэтых пытаннях. Чэрвеньскі і ліпеньскі (1953) пленумы ЦК КПБ, сходы партыйнага актыву Мінска, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Брэста і іншых гарадоў далі адпор гэтай варожай вылазцы і адначасова далі адпор дэмагагічным правакацыйным выступам накшталт выступаў Чорнага і іншых. …Беларускі народ злучаны шчыльнымі сувязямі векавога і непарушнага сяброўства з вялікім рускім народам, у якім ён заўжды бачыў сваю апору, свой аплот. Аднаўленне прамысловасці, будаўніцтва новых фабрык і заводаў, аднаўленне і далейшае развіццё соцен гарадоў ідзе пры велізарнай дапамозе саюзных міністэрстваў. Гэта значыцца пры велізарнай дапамозе рускага народа”[298].

Смерць Сталіна не азначала канца сталіншчыны, хоць паступова абуджаліся спадзяванні на выхад з працяглага дыктатарскага праўлення. Яны ўзраслі ў сувязі з выкрыццём злачыннай дзейнасці Берыі, правядзеннем ХХ з’езда партыі, які адбыўся ў 1956 г. і распачаў перыяд часовай абмежаванай дэмакратызацыі грамадскага жыцця.

**Асаблівасці нацыянальнай палітыкі ва ўмовах пэўнай дэмакратызацыі і лібералізацыі грамадскага жыцця (1954–1964).** Дзесяцігоддзе пасля смерці І. Сталіна стала часам пэўнай дэмакратызацыі і лібералізацыі грамадскага жыцця ў СССР, ліквідацыі шматлікіх яго

[297] Даклад М. Зімяніна // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 296. Арк. 22.
[298] Стэнаграма ХХІ з’езда КПБ // Там жа. Спр. 223. Арк. 265, 266.

абмежаванняў, якія склаліся ў гады сталінскага кіраўніцтва. У Беларусі, як і ў іншых саюзных рэспубліках, дэмакратызацыя ў грамадска-палітычным жыцці праявілася перш за ўсё ў яго дэсталінізацыі. Быў падвергнуты крытыцы культ асобы Сталіна і асуджаны сталінскія злачынствы, пачалася масавая рэабілітацыя неабгрунтавана рэпрэсаваных, шмат у чым перагледжана ў бок змякчэння ранейшае заканадаўства і г. д. У выніку савецкія людзі сталі пазбаўляцца ад страху быць бязвінна пакаранымі, ад боязі выказваць свае погляды. Дасягненнямі гэтага перыяду гісторыі таксама сталі некаторая дэмакратызацыя ўнутранага жыцця кампартыі, актывізацыя дзейнасці і павышэнне ролі прафсаюзаў, камсамола і шэрагу іншых грамадскіх арганізацый. У выніку адбылося большае яднанне ўлады і народа, што спрыяла далейшаму ўмацаванню савецкай дзяржавы[299].

Палітычная "адліга" другой паловы 1950-х–першай паловы 1960-х гг. была пачатковым і значным этапам у адыходзе ад сталіншчыны. Але, разам з развянчаннем культу асобы Сталіна, было шмат супярэчлівага: правядзенне шматлікіх рэформ, іх нярэдка непрадуманы і непаслядоўны характар, стварэнне новага культу і г. д. Так, напрыклад, у 1954 г. праходзіў XXI з'езд КПБ на якім не выбіралі, як раней, кіраўнікоў дзяржавы ў якасці ганаровых дэлегатаў з'езда і ў прэзыдыум. А праз пяць год на пазачарговым XXIII з'ездзе КПБ зноў выбіралі ганаровы прэзыдыум з'езда ў складзе членаў прэзыдыума ЦК КПСС, прычым пад працяглыя апладысменты[300]. Падобнае было на XXIV з'ездзе, пад час яго правядзення яскрава праявіўся культ М. Хрушчова. Адпаведна, у БССР ствараліся культікі мясцовых кіраўнікоў, а рэформы прымалі характар незавершанасці. Іх выніковасць была нязначная.

У сярэдзіне 1950-х гг. узмацнілася палітыка канфрантацыі дзяржавы ў адносінах да рэлігіі і вернікаў, што звязана з ідэяй пабудовы на працягу аднаго пакалення ў краіне камунізму, дзе рэлігіі няма месца. Рэлігійная сфера зведала адчувальны ўціск з боку ўладаў. Пасля пастановы СМ СССР (1961) пачалася чарговая кампанія па масавым закрыцці і нават знішчэнні храмаў, рэпрэсіі ў адносінах да служыцеляў культаў і рэлігійнага актыву. З мэтаю змяншэння ўплыву каталіцкага духавенства ЦК КПБ намеціў шэраг мерапрыемстваў. У прыватнасці, іх дзейнасці чыніліся шматлікія перашкоды. Не рэгіструючы вярнуўшыхся са зняволення святароў і пагражаючы ім чарговай ізаляцыяй, улады тым самым прымушалі іх выязджаць з Беларусі. Аначасова з гвалтоўнымі сродкамі змагання з рэлігійнымі пачуццямі насельніцтва (закрыццё храмаў і ліквідацыя абшчын) шырока выкарыстоўвалася атэістычная прапаганда. У асноўным ёй павінны былі займацца агітатары-спецыялісты па працы з вернікамі. Напярэдадні перабудовы іх было ад 20 да 22,6 тыс. чалавек, што складала 10,4–11,6 % ад агульнай колькасці кадравага складу спецыялістаў па вуснай агітацыі ў БССР[301].

---

[299] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 492–493.

[300] Стэнаграма XXI з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 223 ; Стэнаграма XXIII з'езда КПБ // Там жа. Спр. 239.

[301] Ліст ЦК КПБ аб складзе кадраў вуснай палітычнай агітацыі на 01.01.1983 г. // Там жа. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 31.

У правядзенні нацыянальнай палітыкі ў пасляваенныя дзесяцігоддзі паступова ўсё большую моц набірала тэндэнцыя, скіраваная на стварэнне наднацыянальнай сацыялістычнай супольнасці – савецкага народа. Знаходзячыся ў 1959 г. у Мінску на святкаванні 40-годдзя з дня абвяшчэння БССР[302], М. Хрушчоў падкрэсліў: "Чым хутчэй усе мы будзем размаўляць на рускай мове, тым хутчэй пабудуем камунізм". А ў прынятай пастанове ЦК КПСС "Пра задачы партыйнай прапаганды ў сучасных умовах" (1960) падкрэслівалася, што "партыйныя арганізацыі і камітэты павінны строга ўлічваць у прапагандысцкай рабоце нацыянальныя асаблівасці разнастайных пластоў насельніцтва нашай краіны, зрабіўшы галоўны націск на інтэрнацыянальнае выхаванне працоўных, на далейшае ўмацаванне дружбы народаў, на няўхільнае збліжэнне і ўсебаковае ўзаемнае ўзбагачэнне сацыялістычных нацый"[303].

На XXI з'ездзе КПБ, які праходзіў 10–13.02.1954 г., прысутнічалі 745 дэлегатаў, з якіх 44,2 % складалі прадстаўнікі нацменшасцей (280 рускіх, 41 украінец, 8 іншай нацыянальнасці). На з'ездзе вялася гаворка аб арганізацыі і праверцы выканання дырэктыў партыі і ўрада, паляпшэнні працы з кадрамі і г.д.[304] Але практычна нічога не было аб развіцці ініцыятывы і самастойнасці. Такім чынам, у грамадстве замацоўвалася безыніцыятыўнасць, апатыя, не заўважалася роля шэраговых арганізацый і членаў партыі. У дакладах і выступах нацменшасці не вылучаліся з агульнай масы насельніцтва Беларусі. Рэзалюцыі XXI з'езда КПБ па ідэалагічнаму[305] і кадраваму пытаннях практычна паўтараюць змест рэзалюцыі XX з'езда. У нацыянальнай працы акцэнт зроблены на "…братэрскае сяброўства народаў СССР… адданасць савецкай Радзіме, справе КПБ… далейшае развіццё нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зместу культуры беларускага народу"[306].

24–27.01.1956 г. адбыўся XXII з'езд КПБ. У спрэчках на з'ездзе выступіў міністр адукацыі Ільюшын, які ўзняў пытанне аб тым, каб "…навесці парадак у беларускім правапісе, ачысціць яго ад элементаў штучнага адрыву ад рускага правапісу, бо шмат нашых дзяцей пакутуюць ад гэтага (апладысменты).

[302] Да святкавання гэтай даты ЦК КПБ зацвердзіў тэзісы "Сороколетие образования КПБ (1918–1958 гг.)" // РДАНГ. Ф. 5. Воп. 33. Спр. 64. Арк. 100–161.
[303] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. Мінск, 2012. С. 298.
[304] Стэнаграма XXI з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 223. Арк. 16–114.
[305] У ідэалагічнай працы таго часу было шмат фармалізму, але адпаведныя метады, формы і вынікі выхоўвання мас меліся. У БССР: "…14 вечаровых універсітэтаў марксізму-ленінізму, 241 вечаровая партыйная школа, 7952 гуртка па гісторыі КПСС, 345 гурткоў дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, 223 гуртка палітэканоміі, 1997 палітшкол і 991 тэарэтычны семінар. Штогод пры ЦК, абкамах, гаркамах КПБ праводзіліся курсы прапагандыстаў… за 1 год больш 40 тысяч лекцый …друк… 175 тысяч агітатараў… прачытана 144 тыс. дакладаў, на якіх прысутнічала каля 13 млн чалавек". Ідэалагічная праца вялася праз: "…3142 дзяржаўных клубных установы, 1202 калгасных клуба, 24 музеі, 1446 дзяржаўных бібліятэк, 2878 калгасных бібліятэк… Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў за справаздачны перыяд (2 гады) правяло 80 тыс. лекцый. …1818 кінаўстановак. …1217 сярэдніх школ (1954), 306 сярэдніх школ працоўнай моладзі і г. д." Стэнаграма XXI з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 223. Арк. 82–89.
[306] Рэзалюцыя XXI з'езда КПБ // Там жа. Спр. 225. Арк. 11, 25.

Незразумелую баязлівасць у гэтым пытанні праяўляюць людзі, якія звязаны з гэтай справаю…"[307].

У рэзалюцыі з'езда адзначалася, што ўсе сродкі ідэалагічнай працы накіроўваліся на "павышэнне сацыялістычнай свядомасці працоўных, на ўмацаванне ў народа камуністычных адносін да працы і грамадскай уласнасці, патрыятызму і сяброўства паміж народамі, выхаванне глыбока ідэйных, маральна трывалых людзей, упэўненых у сваёй моцы і падрыхтаваных пераадольваць любыя цяжкасці ў барацьбе за камунізм"[308]. Цікава, што на з'ездзе нічога не гаварылася пра фарміраванне нацыянальнай культуры сацыялістычнай па змесце.

У лютым 1956 г. адбыўся XX з'езд КПСС, які заняў досыць прагрэсіўную пазіцыю па многіх пытаннях, у тым ліку і нацыянальным. М. Хрушчоў у сваім дакладзе адзначыў: "Сацыялізм не толькі не знішчае нацыянальных адрозненняў і асаблівасцей, а, наадварот, забяспечвае ўсебаковае развіццё і росквіт эканомікі і культуры ўсіх нацый і народнасцей"[309]. У БССР жа ніхто з кіраўнікоў не збіраўся ўлічваць гэтыя асаблівасці. Інтэрнацыянальнае, у сэнсе рускае, цанілася куды вышэй, чым нацыянальнае.

Да канца 1950-х гг. працягваўся працэс перасялення палякаў з БССР у Польшчу. Красамоўным сведчаннем з'яўляецца дакладная запіска МУС БССР, накіраваная у ЦК КПБ, у якой адзначалася, што ў 1958 г. на сталае месца жыхарства ў Польшчу пераехала 30,4 тыс. грамадзян Беларусі. У перыяд з 1955 па 1958 гг. паток рэпатрыянтаў быў меншы па сваіх маштабах, чым у першыя пасляваенныя гады і зводзіўся ў асноўным да ўз'яднання сем'яў[310]. На думку даследчыка А. Вялікага, падсумоўваючы вынікі перасялення, абумоўленыя зменамі межаў, магчыма, што разам з этнічнымі палякамі з рэспублікі ад'ехала значная колькасць этнічных беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальных меншасцей, галоўным чынам яўрэяў. Перасяленне беларускага насельніцтва адмоўным чынам паўплывала на нацыянальна-дэмаграфічную сітуацыю ў заходнім рэгіёне. Тая, нашмат меншая колькасць беларусаў, што вярнулася на Радзіму, ні ў колькасных, ні ў прафесійных якасцях не змагла кампенсаваць людскія страты[311].

Пазачарговы XXIII з'езд КПБ адбыўся 14–15.01.1959 г. На ім з дакладам 14.01.1959 г. "Аб тэзісах дакладу т. М. Хрушчова "Кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959–1965 гг." і задачы кампартыі Беларусі" выступіў першы сакратар ЦК КПБ К. Мазураў. Ён нічога не казаў пра

---

[307] Стэнаграма XXII з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 237. Арк. 623.
[308] Рэзалюцыя XXII з'езда КПБ // Там жа. Арк. 7, 25.
[309] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 187.
[310] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 284.
[311] *Вялікі А.Ф.* Змяненні ў нацыянальна-дэмаграфічнай сітуацыі заходніх абласцей Беларусі пасля падпісання дагавора 16 жніўня 1945 г. аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. С. 266–267 ; Kruczkowski T. Nektóre zagadnienia historii etnicznej Polaków na Białorusi. C. 71–72.

нацыянальнае пытанне ці нацыянальныя культуры[312]. Акрамя гаспадарчых пытанняў закраналася праблема актывізацыі працы саветаў[313].

Праз дзейнасць у прадстаўнічых органах у прадстаўнікоў нацменшасцей з'яўлялася больш магчымасцей для рэалізацыі сябе ў грамадскім жыцці рэспублікі. Так, павялічвалася колькасць дэпутатаў. Дзякуючы гэтаму, утвараліся больш поўныя па складу і працаздольнасці пастаянныя камісіі саветаў. У дэпутатаў пашыраліся магчымасці для больш поўнага выкарыстання мясцовых рэсурсаў для пад'ёму вытворчасці, клопату аб павышэнні дабрабыту і культуры працоўных. На жаль, перыяд рэальнай актывізацыі працы саветаў быў не працяглы. Зноў запанаваў фармалізм, на першае месца выходзілі папяровыя справаздачы. Гэта вынік таго, што развіццё ініцыятывы і творчасці толькі дэкларавалася, застаючыся на словах.

На XXIV з'ездзе КПБ, які адбыўся 17–19.02.1960 г., ішла гаворка толькі аб "сацыялістычнай культуры": "Неабходна выхоўваць савецкіх людзей… у духу сацыялістычнага інтэрнацыялізму і патрыятызму, брацкага сяброўства народаў, высокіх прынцыпаў маралі новага грамадства. Весці непрымірымую барацьбу супраць нацыяналізму, касмапалітызму і іншых праяў буржуазнай ідэалогіі, супраць забабонаў мінулага ў свядомасці людзей"[314].

У выступах кіраўнікоў рэспублікі адчуваецца вяртанне да старога. Амаль, як пры Сталіне, вядзецца гаворка аб нацыяналізме, касмапалітызме, асобай ролі рускага народа. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў справаздачным дакладзе першага сакратара ЦК КПБ К. Мазурава: "…беларускі народ… дамогся новых поспехаў у пад'ёме эканомікі і культуры сваёй рэспублікі. Гэтыя поспехі… сталі магчымымі дзякуючы велізарнай дапамозе нашай рэспубліцы з боку ЦК КПСС і Ураду СССР, вялікага рускага і іншых народаў Савецкага Саюзу."[315]

XXV з'езд КПБ праходзіў 26–28.09.1961 г. На ім упершыню на пасляваенных з'ездах прагучаў каментар нацыянальнага складу дэлегатаў і

---

[312] На з'ездзе абмяркоўваўся сямігадовы план развіцця народнай гаспадаркі 1959–1965 гг. Шмат гаварылася ў дакладзе і выступах аб развіцці ініцыятывы, творчай актыўнасці асоб, брыгад, партарганізацый, абкамаў, гаркамаў, прафсаюзу, камсамолу і г. д. Але адзначалася, што шмат ініцыятыў і рашэнняў застаюцца на паперы. З рэзалюцыі XXIII з'езда КПБ: "…з'езд КПБ патрабуе ад усіх кіруючых работнікаў, партыйных камітэтаў і партыйнага актыву, ад кіраўнікоў савецкіх, прафсаюзных, камсамольскіх і гаспадарчых органаў прымаць асабісты ўдзел у палітычнай працы сярод насельніцтва, аказваць практычную дапамогу першасным партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям у мабілізацыі працоўных на паспяховае выкананне планаў сямігодкі…". Стэнаграма XXIII з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 239. Арк. 358 адв.

[313] У прэніях выступіў старшыня прэзыдыуму ВС БССР В.І.Казлоў: "Пасля XX з'езду КПСС… Павышэнню ўзроўня працы мясцовых саветаў садзейнічала ўзмацненне партыйнага кіраўніцтва іх працай і праведзеныя за апошні час такія важныя мерапрыемствы, як пашырэнне праў саюзных рэспублік і мясцовых саветаў, удасканаленне структуры дзяржаўнага апарату; укрупненне раёнаў і сельскіх саветаў; распрацоўка і прынясце новых палажэнняў аб раённым, гарадскім, раённым у горадзе, сельскім і пасялковым саветах; штогадовае правядзенне курсаў старшынь і сакратароў выканкамаў сельскіх і пасялковых саветаў; сістэматычнае правядзенне семінараў савецкіх работнікаў і іншае. Вялікае значэнне для далейшага развіцця савецкай дэмакратыі і яшчэ большага далучэння шырокіх мас працоўных да практычнай дзейнасці саветаў будзе мець прынясце па рашэнню ЦК КПБ павялічэнне норм прадстаўніцтва ў раённых, гарадскіх, сельскіх і пасялковых саветах." Стэнаграма XXIII з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 239. Арк. 89, 90.

[314] Стэнаграма XXIV з'езда КПБ. Рэзалюцыя // Там жа. Спр. 244. Арк. 564 ; *Пушкін І.А.* Рэлігія і царква ў матэрыялах з'ездаў КПБ часоў "палітычнай адлігі" (1954–1966 гг.) // Религия и общество – 3: актуальные проблемы современного религиоведения. Могилёв, 2008. С. 42–46.

[315] Стэнаграма XXIV з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 244. Арк. 428.

нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі. З дакладу мандатнай камісіі: “Нацыянальны склад дэлегатаў з’езда сведчыць аб тым, што ў Беларускай рэспубліцы жывуць і па-сяброўску працуюць людзі розных нацыянальнасцей, што дружба народаў нашай краіны з’яўляецца непарушнай асновай нацыянальнай палітыкі КПСС”[316].

На з’едзе прагучала інфармацыя аб шырокіх магчымасцях удзелу беларускага народа ў грамадскім жыцці рэспублікі. Напрыклад, у БССР у 1961 г. існавалі 16089 вулічных і дамавых камітэтаў, 3317 тэрытарыяльных жаночых саветаў, 212 саветаў пенсіянераў, 5817 таварысцкіх судоў, 5547 дабраахвотных народных дружын, 5599 грамадскіх саветаў пры культурна-асветных установах, 9472 бацькоўскіх камітэтаў школ і дзіцячых устаноў і г. д. [317]. Такім чынам, нацменшасці маглі ўдзельнічаць у мясцовым самакіраванні. Аднак усе гэтыя камісіі, саветы і камітэты не мелі рэальных праў, дзейнічалі вельмі часта фармальна. Улады не лічыліся з імі таму, што яны прымалі рашэнні, якія загадзя прымаліся выканаўчымі органамі. Вялікая колькасць грамадскіх камісій ствaралася для масавасці і яны аказвалі нязначны ўплыў на жыццё рэспублікі[318]. Таму, нягледзячы на актыўны ўдзел у іх працы асобных грамадзян, яны не сталі сапраўднымі шляхамі рэалізацыі грамадскіх памкненняў нацменшасцей.

Захаванне, не кажучы пра росквіт, культур нацменшасцей было не толькі абмежавана, а, нават, немагчыма. Гэта яскрава бачна з даклада другога сакратара ЦК КПБ Ф. Сурганава “Аб праекце новай праграмы КПСС”: “Кампартыя Беларусі бачыць сваю задачу ў тым, каб паслядоўна праводзіць і надалей прынцыпы інтэрнацыяналізму ў вобласці нацыянальных адносін, узмацняць сяброўства з усімі савецкімі народамі, як адну з найважнейшых заваёў сацыялізму, не паслабляючы барацьбы супраць праяў нацыяналізму, ідэалізацыі мінулага, супраць аджыўшых звычаяў і нораваў… Беларускі народ лічыць рускую мову сваёй другой роднай мовай. Працэс дабраахвотнага вывучэння, побач з роднай, рускай мовы мае станоўчае значэнне”[319].

Рэзалюцыя XXV з’езда КПБ нацэльвала партыйныя арганізацыі на неабходнасць “павесці яшчэ больш рашучую барацьбу з перажыткамі капіталізму ў свядомасці людзей, з праявамі буржуазнай ідэалогіі, прыватнаўласніцкай псіхалогіі, п’янствам, хуліганствам, дармаедствам, рэлігійнымі забабонамі. Увесь час выхоўваць савецкіх людзей у духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, настойліва змагацца супраць усялякіх праяў

[316] Стэнаграма XXV з’езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 248. Арк. 65.
[317] Там жа. Арк. 60.
[318] Такая сітуацыя не задавальняла частку моладзі і інтэлігенцыі. З выступу ў прэніях XXV з’езда КПБ 1 сакратара ЦК ЛКСМБ Л. Максімава: “Ёсць факты, калі групы моладзі, па-за межамі камсамола, аб’ядноўваюцца ў розныя, калі так можна выказацца, нелегальныя аб’яднанні, збіраючыся на кватэрах на “вечарыны”. Напрыклад, у лістападзе 1960 г. у Мінску група студэнтаў БДУ, палітэхнічнага інстытута, медыцынскага інстытута, музычнага вучылішча стварылі так званы гурток “Энтузіяст”, у якім… вяліся дыскусіі аб развіцці няжывой прыроды і ўтварэнні першых бялковых элементаў, аб накірунках і школах ў сучаснай літаратуры, мастацтве, аб дасягненнях кібернэтыкі і г.д. Нешта падобнае мела месца ў Гродна і Магілёве.” Стэнаграма XXV з’езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 248. Арк. 277.
[319] Стэнаграма XXV з’езда КПБ // Там жа. Спр. 248. Арк. 500.

нацыяналізму”[320]. Падобнае зафіксавана і ў рэзалюцыі XXVI з’езда КПБ, які праходзіў 03–05.03.1966 г. : “Выхаванне грамадства… у духу сяброўства народаў СССР, савецкага патрыятызму і пралетарскага інтэрнацыяналізму”[321].

У кастрычніку 1961 г. была прынята новая праграма КПСС, праект якой абмяркоўваўся ў партыйных арганізацыях, у тым ліку ў БССР[322]. У праграме адлюстраваны супярэчлівы змест палітыкі партыйных і дзяржаўных органоў па нацыянальным пытанні. З аднаго боку, у праграме адзначалася, што працэс станаўлення камуністычнай нацыі адбываецца ў выніку фармавання новых, агульных для ўсіх народаў нацыянальных элементаў і асаблівасцей. Праграмай прадуглежвалася зліццё паасобных народаў у адзіную камуністычную сусветную нацыю і іх моваў – у сусветную мову. Развіццё сацыялістычнага інтэрнацыяналізма абвяшчалася як вышэйшай якасці ўсіх савецкіх людзей. Неабходна было весці барацьбу супраць праяваў шавінізму і нацыяналізму, супраць тэндэнцый да нацыянальнай абмежаванасці і выключнасці, супраць нацыянальных звычаяў і традыцый. Падкрэслівалася, што ліквідацыя праяваў нацыяналізму адпавядае інтарэсам усіх нацый і народнасцей СССР, а кожная савецкая рэспубліка зможа далей квітнець і ўмацоўвацца толькі ў вялікай сям’і братніх сацыялістычных нацый СССР. Адным з галоўных напрамкаў дзяржаўнай нацыянальна-культурнай палітыкі з’яўлялася стварэнне агульнасавецкай культуры камунізму праз пашырэнне грамадскіх функцый рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін шматнацыянальнай дзяржавы. З другога боку, у ліку прыярытэтных задач, у праграме адзначаліся клопат пра далейшы росквіт нацыянальных культур і удасканальванне нацыянальнай дзяржаўнасці народаў СССР, умацаванне Савецкага Саюза як шматнацыянальнай дзяржавы. Дэкларавалася, што пашырэнне сферы ўжывання рускай мовы можа адбывацца без выцяснення іншых нацыянальных моваў і нават садзейнічаць іх росквіту. У дакуменце падкрэслівалася, што ў СССР адсутнічае штучная асіміляцыя нацый, а збліжэнне і частковае зліццё этнічных групаў ажыццяўляецца на строга добраахвотных пачатках, яно несумяшчальна з прывілеяваным становішчам той ці іншай этнічнай або нацыянальнай групы[323].

**Накіраванасць дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў перыяд нарастання цэнтралізацыі і бюракратызацыі грамадскага жыцця (1965–1984).** У 1965 г. у Беларусі кампартыю ўзначаліў П. Машэраў. З яго прыходам стала памяншацца ўдзельная вага нацыянальных меншасцей сярод кіруючых кадраў партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату і пазней заставалася стабільнай. Але ў групу ўлады дапускаліся толькі выбраныя. У рэспубліканскіх ЦК партыі другі сакратар, у функцыі якога ўваходзіла праца з

[320] Стэнаграма XXV з’езда КПБ // Там жа. Арк. 658 адв. ; *Пушкін І.А.* Рэлігія і царква ў матэрыялах з’ездаў КПБ часоў “палітычнай адлігі” (1954–1966 гг.). С. 42–46.
[321] Рэзалюцыя XXVI з’езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 251. Арк. 500.
[322] Абмеркаванне ў партыйных арганізацыях БССР праектаў праграмы і Статута КПСС. Ліст ЦК КПБ. 1961 г. // РДАНГ. Ф. 5. Воп. 31. Спр. 159. Арк. 2–51]
[323] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 299.

кадрамі, па ўстаноўленаму ЦК КПСС парадку, заўжды быў рускі[324]. Прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей у партыйным, савецкім і гаспадарчым кіраўніцтве забяспечвалася не толькі ў залежнасці ад поглядаў і кампетэнтнасці асобы, але і адміністратыўным шляхам, што негатыўна ўплывала на гаспадарчае развіццё БССР.

Істотных адрозненняў у накіраванасці дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў наступныя дзесяцігоддзі як у СССР у цэлым, так і ў БССР, не было, аб чым сведчаць матэрыялы з’ездаў КПСС і КПБ. Увасабленнем ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму, сяброўства і братэрства народаў была названа КПСС, у шэрагах якой былі прадстаўнікі 131 нацыі і народнасці СССР, падкрэслівалася, што пры стварэнні і ўмацаванні СССР усе нацыі і народнасці адыгралі сваю ролю і падкрэслівалася найбольшая роля вялікага рускага народа. У 1971 г. на чарговым з’едзе КПСС прагучала, што за гады сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне паўстала новая гістарычная супольнасць людзей – савецкі народ. Сугучнымі паводле свайго зместу былі заявы і дэкларацыі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Беларусі.

З другой паловы 1960-х гг. у краіне да ўлады прыйшлі неасталінскія сілы і пачаўся, так званы, застойны перыяд. У большасці сваёй хрушчоўскія пераўтварэнні былі перагледжаны, і дзяржаўны механізм вярнуўся ў асноўным да таго, што было дзесяцігоддзе назад. Пры гэтым асноўныя пераўтварэнні адбыліся пераважна ў пачатку перыяду, а ў 1971–1984 гг. у дзяржаўным будаўніцтве ўсталявалася адноснае зацішша. Дзяржаўная сістэма ўлады характарызавалася нарастаннем цэнтралізацыі і бюракратызацыі, узмацненнем манапольнага становішча ў ёй камуністычнай партыі. З аднаго боку, у гэты час адбыўся пэўны крок наперад у эканамічным і сацыяльным развіцці. Асабліва гэта характэрна для 8-й пяцігодкі. Гаспадарка дасягнула за гэты час новых рубяжоў. Затым тэмпы развіцця сталі паступова зніжацца. З другога, у той час расквітнелі фармалізм, бюракратызм, русіфікацыя, ідэалагічны ўціск. Вярталася сталінская адміністратыўна-камандная сістэма кіравання, але не такая рэпрэсіўная.

Праявы неасталінізму і іншых негатыўных тэндэнцый грамадскага развіцця прасочваюцца ў справаздачным дакладзе ЦК КПБ XXVI з’езду КПБ першага сакратара ЦК КПБ П. Машэрава: “Стала значна менш выпадкаў, калі пад выглядам крытыкі культу асобы скажалася гісторыя КПСС, ганьбавалася цэлая гістарычная эпоха ў жыцці нашай краіны, вялікія поспехі партыі і народа ў будаўніцтве сацыялізму … неабходна выхоўваць у нашага народу палымяны савецкі патрыятызм і сацыялістычны інтэрнацыяналізм. …Задача партыйных арганізацый… выхоўванне савецкіх людзей у духе брацкага сяброўства народаў, разумення агульнадзяржаўных інтарэсаў, непрымірыма адносіцца да нават нязначных праяў местніцтва і нацыянальнай абмежаванасці”[325].

XXVII з’езд КПБ праходзіў 22–24.02.1971 г. пасля ўрачыстых святкаванняў у СССР і БССР 50-годдзя савецкай улады, 100-годдзя з дня

[324] Сын белорусского народа Пётр Машеров. К 95-летию со дня рождения. Воспоминания и статьи. М., 2013. С. 231.
[325] Стэнаграма XXVI з’езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 251. Арк. 408, 412, 423.

народзінаў У. Леніна, 50-годдзя ўтварэння БССР. Гэтыя святкаванні значна паўплывалі на савецкае грамадства. Партыйна-савецкае кіраўніцтва патрабавала выканання і перавыканання планавых паказчыкаў да юбілеяў па асноўных накірунках гаспадарчага развіцця. Закранула гэта і грамадскае жыццё. Выступы і рэзалюцыі з'ездаў набываюць больш наступальны характар.

Справаздачны даклад першага сакратара П. Машэрава: "…КПБ напраўляла сваю дзейнасць на выхаванне ў нашых людзей высокай палітычнай свядомасці, камуністычных адносін да працы, савецкага патрыятызма і пралетарскага інтэрнацыяналізма, класавай непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі. …Уся дзейнасць КПБ у вобласці фарміравання ідэйна-мастацкага жыцця будавалася на марксісцка-ленінскіх палажэннях, складаючых аснову нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі СССР. Росквіт беларускай культуры быў бы немагчымы без працэсу ўзаемапранікнення і ўзаемаабагачэння культур брацкіх савецкіх народаў. Гэты прагрэсіўны працэс будзе працягвацца, памнажаючы нашы магчымасці ў развіцці беларускай савецкай сацыялістычнай культуры"[326]. Выступ М. Танка (Скурко) – першага сакратара Саюзу пісьменнікаў БССР: "Прапаганду супраць нас вядуць орды сіяністаў, рознай масці нацыяналістаў, розных псіхапатаў, як Тарсіс, здраднікаў, як Кузняцоў, і іншых маральных банкрутаў. …Літаратура павінна быць прасякнута пачуццём савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізма"[327].

У рэзалюцыі XXVII з'езда КПБ патрабавалася: "Увесь час выхоўваць у працоўных, калгаснікаў, інтэлігенцыі любоў да сацыялістычнай Радзімы, развіваць у іх высокароднае пачуццё сацыялістычнага патрыятызма і пралетарскага інтэрнацыяналізма. Надаць ідэалагічнай працы ваяўнічы, наступальны характар, усямерна павышаць палітычную пільнасць працоўных, выкрываць варожую буржуазную ідэалогію"[328]. Нацыянальная палітыка, накіраваная на інтэрнацыяналізацыю грамадскага жыцця, выклікала тэндэнцыю павелічэння ўдзельнай вагі сем'яў з мужам ці жонкай рознай нацыянальнасці з 11 % у 1959 г. да 25 % у 1989 г.[329]

Нягледзячы на ўсе намаганні ўладаў, у часткі насельніцтва Беларусі не была цалкам вынішчана нацыянальная самасвядомасць. Назіралася імкненне захавання нацыянальных адметнасцей праз стварэнне рознага роду аб'яднанняў[330] і ў рэлігійнай сферы. Усе гэтыя спробы пільна адсочваліся КДБ і выкараняліся. Аб гэтым неаднаразова казалася ў выступах старшыні КДБ БССР на XXV[331], XXVI[332], XXVII[333] з'ездах кампартыі Беларусі.

---

[326] Стэнаграма XXVII з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 258. Арк. 74, 89.

[327] Стэнаграма XXVII з'езда КПБ // Там жа. Спр. 257. Арк. 160, 163.

[328] Рэзалюцыя XXVII з'езда КПБ // Там жа. Спр. 256. Арк. 62, 64, 65.

[329] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 371.

[330] *Пушкін І.А.* Нацыянальна-патрыятычныя аб'яднанні Беларусі 1980–1990-х гг. // Романовские чтения – 3 : сб. трудов Международной науч. конференции. Могилёв, 2007. С. 26–27.

[331] З выступу ў спрэчках XXV з'езда КПБ старшыні КДБ пры СМ БССР У. Пятрова: "… На працягу 1960 г. і 8-мі месяцаў 1961 г. КДБ і яго мясцовымі органамі было прафілакціравана каля 1000 чал. У ліку прафілакціраваных у бягучым годзе 32 % складала моладзь да 25 год. Дазвольце прывесці адзін са шматлікіх прыкладаў па гэтаму пытанню. У красавіку гэтага году ў органы КДБ паступілі дадзеныя аб існаванні ў Гродна нелегальнай маладзёвай групы пад назвай "Клуб вольнай моладзі", у якую ўваходзілі трое юнакоў 1940–45 гг. нараджэння, двое з іх

Трэба адзначыць, што ў справаздачных дакладах і ў большасці выступаў на XXVII – XXIX з'ездах КПБ асноўны акцэнт рабіўся на паказчыкі развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі. З'езды сталі падобныя на гаспадарчыя нарады. У выступах вельмі шмат агульных слоў, штампаў, заклікаў. Прамовы ўсё больш "сумныя" і "нецікавыя" з пункту гледжання грамадскага развіцця. Практычна няма фактаў крытыкі. Назіралася толькі ўхваленне існуючага ладу жыцця. Адзначалася, што ўсё выдатна, адчуваецца рост паказчыкаў, паляпшэнне і павелічэнне, адным словам – "застой". На з'ездах не выступалі міністры культуры, адукацыі, замежных спраў БССР у сферы дзейнасці якіх знаходзіліся пытанні развіцця нацыянальных культур. Нічога не гаварылася пра

з'яўляліся членамі УЛКСМ. Як было ўстаноўлена праверкай, удзельнікі гэтай групы, пад уплывам антысавецкіх радыёперадач з замежжа, сталі выказваць паклёпніцкія меркаванні на нашу рэчаіснасць і г. д…. На кватэры аднаго з удзельнікаў групы Станішэўскага быў знойдзены Статут "Клуба" і нататкі антысавецкага зместу. Займаючыся гэтай групай моладзі, органы КДБ атрымалі новыя дадзеныя аб існаванні ў Гродна яшчэ двух маладзёвых груп, якія называлі сябе "Саюз вольнай моладзі" і "Вольная думка", у складзе якіх было 9 чалавек вучняў старшых класаў СШ і студэнтаў ВНУ, асобныя з іх з'яўляліся камсамольцамі. … Удзельнікі гэтых маладзёвых груп на сваіх сходах абмяркоўвалі праекты "праграмы" і "статута" выдуманых імі арганізацый, у шэрагу выпадкаў бралі пад сумненне правільнасць нашай палітыкі і мерапрыемстваў, якія праводзіліся партыяй і ўрадам… Іх дзейнасць (учынкі) былі абмеркаваны на сходах калектываў па месцу іх вучобы і працы." Стэнаграма XXV з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 248. Арк. 352, 353.

[332] З выступу на XXVI з'ездзе КПБ старшыні КДБ пры СМ БССР У. Пятрова: "…Папярэджана антыграмадская дзейнасць нелегальных маладзёвых груп, якія патрапілі пад уплыў буржуазнай прапаганды ў Мінску, Гомелі, Гродна, Маладзечна, Полацку і некаторых іншых гарадах рэспублікі. …Толькі за апошнія 2 гады органамі КДБ за розныя палітычна шкодныя і антыграмадскія праявы прафілакціравана 55 членаў КПСС і каля 200 камсамольцаў… напрыклад, студэнт (былы) медінстытута Баранаў… даказываў перавагі буржуазнага ладу жыцця… абязшкоджаны ўдзельнікі двух антысавецкіх груп, якія складаліся галоўным чынам з моладзі…" Стэнаграма XXVI з'езда КПБ // Там жа. Спр. 251. Арк. 174, 175, 179.

[333] З выступу старшыні КДБ пры СМ БССР Я. Мікулкіна: "…На сучасным этапе замежныя нацыяналістычныя арганізацыі шмат у чым змянілі тактычныя прыёмы і метады падрыўной працы, перайшлі да больш прыхаваных і вытанчаных формаў насаджэння нацыяналістычнай ідэалогіі. Калі яны раней заклікалі да яўных варожых дзеянняў, дык у сучасны момант лічаць галоўным ідэалагічную апрацоўку і паступовае ўцягванне ў нацыяналістычную дзейнасць адзінкавых асоб, перад усім з інтэлігенцыі і моладзі.

Не апошняе месца ў падрыўной дзейнасці імперыялізму займаюць замежныя рэлігійныя цэнтры, якія імкнуцца падтрымаць і актывізаваць дзейнасць царкоўна-сектанцкіх колаў у нашай краіне. Асаблівую актыўнасць праяўляе Ватыкан, які ў адпаведнасці з рашэннямі другога Ватыканскага сабора лічыць сваёй першачарговай задачай узмацненне пазіцый каталіцкай царквы ў СССР і ўцягванне рускай праваслаўнай царквы ў актыўную барацьбу з камуністычнай ідэалогіяй. У гэтым плане ён настойліва дамагаецца стварэння каталіцкай адміністрацыі ў Беларусі, прыкладае намаганні да ўзмацнення рэлігійнага фанатызму вернікаў і адпаведнай ідэалагічнай апрацоўкі інтэлігенцыі і моладзі.

…Назіраюцца выпадкі нелегальнага вырабу і распаўсюджвання "самвыдата"… Адмоўныя праявы сярод моладзі ў спробах стварэння розных клубаў і груп, накшталт "Саюза вольнай моладзі", "Клуба халасцякоў" і г. п. У канцы 1970 г. у г. Мазыры спынена антыграмадская дзейнасць маладзёвай групы, якая называла сябе "Сэксуальна-дэмакратычная партыя". У яе складзе было 23 чалавекі (22–27 год), з іх 4 камуністы і 7 камсамольцаў. Культывіравалі ідэі апалітычнасці, няўдзелу ў грамадскім жыцці, крытыканства… Не застаюцца безвыніковымі і намаганні замежных рэлігійных цэнтраў. У шэрагу месцаў рэспублікі былі заўважаны выпадкі масавых незаконных зборышчаў сектантаў, дзе побач з адпраўленнем абрадаў, абмяркоўваліся пытанні пашырэння рэлігійнага ўплыву. Асабліва нас павінны хваляваць імкненні і дзеянні царкоўнікаў і сектантаў па далучэнню да рэлігіі дзяцей і моладзі. Неабходна вастрэй рэагаваць на падобныя з'явы. У барацьбе з антыграмадскай дзейнасцю царкоўнікаў і сектантаў не варта абмяжоўвацца толькі адміністратыўнымі мерамі, якія нярэдка выклікаюць адваротную рэакцыю, а спалучаць іх з актыўнай атэістычнай прапагандай". Стэнаграма XXVII з'езда КПБ // Там жа. Спр. 257. Арк. 92, 94, 95.

У матэрыялах да стэнаграмы XXVII з'езда КПБ маецца даклад Я.Мікулкіна, у якім наконт дзейнасці маладзёвай групы ў г. Мазыры было адзначана, што "гэтыя асобы згрупіраваліся на глебе сумеснага ўдзелу ў мастацкай самадзейнасці". Але гэтая фраза закрэслена алоўкам і яе няма ў стэнаграме з'езду. Матэрыялы да стэнаграмы XXVII з'езда КПБ // Там жа. Спр. 259. Арк. 151.

міжнацыянальныя адносіны і нацыянальныя праблемы. Патрыятызм разумеўся як дзеянні ў абарону сацыялізму і сацыялістычнай рэчаіснасці.

На XXVIII–XXX з'ездах не выступалі старшыні КДБ пры СМ БССР (адпаведна Я. Мікулкін і В. Балуеў). У час "росквіту" і практычнай пабудовы развітога сацыялізму не магло быць антысавецкай дзейнасці. Інфармацыю аб ёй хавалі ад грамадскасці.

У справаздачным дакладзе П. Машэрава на XXVIII з'ездзе КПБ (04–06.02.1976) адзначалася : "Узбагачаючы назапашаны ў рэспубліцы вопыт патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання, у нашай прапагандзе варта больш сістэмна і яскрава раскрываць вечныя каштоўнасці і велізарныя перавагі сацыялізму, у поўнай меры ўлічваць палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і ідэалагічныя фактары, якія вядуць да далейшай інтэрнацыяналізацыі ўсіх сфераў жыцця савецкага грамадства, развіваць у нашага чалавека высакароднае пачуццё агульнасавецкай годнасці, сацыялістычнага патрыятызму. … Неабходна ўзмацненне працэсаў інтэрнацыяналізацыі ва ўсіх сферах жыцця нашага грамадства. … Стварэнне твораў, якія маюць высокія ідэі сацыялістычнага патрыятызму, інтэрнацыяналізму, гуманізму"[334].

Важнае значэнне для высвятлення сутнасці дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі маюць дакументы, звязаныя з падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР (1977) і БССР (1978). У запісцы "Да пытання аб дзяржаўнай мове ў канстытуцыях некаторых саюзных рэспублік", прадстаўленай 27.12.1977 г. на пасяджэнне Сакратарыята ЦК КПСС, адзначалася, што як у ранейшай, так і ў прынятай 07.10.1977 г. Канстытуцыі СССР адсутнічаюць запісы аб дзяржаўнай мове. Канстатавалася, што зыходзячы з поспехаў "савецкай нацыянальнай палітыкі за шасцідзесяцігадовы перыяд..., уяўляецца мэтазгодным у новых канстытуцыях усіх савецкіх рэспублік аб дзяржаўнай мове не згадваць". Выключэнне было зроблена толькі для Азербайджанскай, Армянскай і Грузінскай ССР, па прычыне таго, што "выключэнне з канстытуцый Закаўказскіх рэспублік... артыкулаў аб дзяржаўнай мове... можа выклікаць негатыўнае рэагаванне з боку пэўнай часткі насельніцтва, а таксама і на міжнароднай арэне...". Паводле артыкула 72 Канстытуцыі СССР, прынятай у 1977 г., за кожнай саюзнай рэспублікай захоўвалася права свабоднага выхаду са складу СССР[335]. Падобнае знайшло сваё адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР, якая была прынята 14.04.1978 г.

На XXIX з'ездзе КПБ (27–29.01.1981) задужа шмат гаварылася аб тым, што марксісцка-ленінская ідэалогія – аснова навуковага светапогляду савецкага чалавека, самая моцная і надзейная зброя ў барацьбе за камунізм. Палітыка партыі была накіравана на ўсямернае развіццё класавай самасвядомасці працоўных, павышэнне іх палітычнай пільнасці, выхаванне нецярпімасці да "варожай" ідэалогіі і маралі[336]. У матэрыялах з'ездаў усё больш назіралася заштампаванасць і падабенства. Практычна нічым, у сферы ідэалагічнай працы, рэзалюцыя XXIX з'езда не адрознівалася ад папярэдадняй. З рэзалюцыі XXIX з'езда КПБ па

---

[334] Пратакол XXVIII з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 269. Арк. 61–62, 63, 67.
[335] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 323.
[336] Пратакол XXIX з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 140. Спр. 1. Арк. 43, 45, 50.

справаздачнаму дакладу ЦК КПБ: "… За гады дзесятай пяцігодкі … працягваўся актыўны працэс выхавання новага чалавека, яшчэ больш шчыльнай стала непарушная дружба беларускага народа з вялікім рускім народам, іншымі братэрскімі народамі Савецкага Саюза. КПБ … правяла значную працу па фарміраванню ў працоўных камуністычнага светапогляду, па працоўнаму, маральнаму, патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню людзей. З'езд абавязвае настойліва і мэтанакіравана фарміраваць у працоўных навуковы светапогляд, самаахвярную адданасць ідэалам камунізма, глыбокае пачуццё савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму"[337].

Далейшая тэарэтычная распрацоўка асноўных канцэптуальных палажэнняў палітыкі КПСС у нацыянальным пытанні знайшла адлюстраванне ў пастанове, прысвечанай 60-й гадавіне з дня ўтварэння СССР (1982). У пастанове падкрэслівалася, што "сацыялістычная паводле зместу, шматгранная паводле сваіх нацыянальных формаў, інтэрнацыянальная па характары савецкая культура стала вялікай сілай ідэйна-маральнага яднання нацый і народнасцей Савецкага Саюза". Таксама звярталася ўвага на такі істотны момант, як узаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей у саюзных рэспубліках: "Так як у шэрагу рэспублік за апошнія гады значна павялічылася колькасць грамадзян некарэнных нацыянальнасцей, якія маюць свае спецыфічныя запатрабаванні ў галіне мовы, культуры і побыту, партыйныя камітэты абавязаны глыбей разумець гэтыя праблемы, своечасова прапаноўваць шляхі іх вырашэння"[338].

У дакладах і выступах на з'ездах 1970-х – першай паловы 1980-х гг. паказваюцца дасягненні, прыгожа гаворыцца аб неабходнасці развіваць ініцыятыву і актыўнасць, самастойнасць у прыняцці рашэнняў, але нічога канкрэтнага. Пануюць штампы, кшталту "усё для народа". Сакратары абкамаў КПБ казалі аб інтэрнацыянальным абавязку (вайна ў Афганістане), крытыкавалі змест часопіса "Новый мир". Хвалілі недахопы, а іх не магло не быць у рэспубліцы! У справаздачных дакладах за гучнымі фразамі хавалі праблемы і небяспеку распаду. Праяўлялася гэта, найперш, у ідэалагічнай сферы. На XXVII – XXX з'ездах адзначалі рост злачыннасці ў Мінскай, Гродзенскай, Віцебскай абласцях, казалі аб узросшым п'янстве і алкагалізме сярод насельніцтва. Гэта і ёсць прыкметы распаду грамаства, яго маральнага аблічча.

Нягледзячы на "застой", чытаючы стэнаграмы выступаў з паказчыкамі эканамічнага росту, клопатам аб людзях, адчуваецца нейкая нявыказанасць, заклапочанасць, трывога і нешта яшчэ. Амаль у кожным выступе гаворыцца аб неабходнасці патрыятычнага выхавання моладзі, узмацнення ідэалагічнай працы. Нешта адбывалася ў грамадстве, гэта разумелі на месцах. Людзі бачылі разыходжанне паміж ідэалагічнымі штампамі, заклікамі і рэчаіснасцю, калі грамадства падзялілася на наменклатуру (партыйна-дзяржаўны апарат, які жыве па сваіх законах і ідэалах) і астатнюю частку народа. Старыя метады ідэалагічнай працы не спрацоўвалі, новае пакаленне паціху стала выходзіць з-пад кантролю.

[337] Рэзалюцыя XXIX з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 140. Спр. 2. Арк. 15, 20, 21.
[338] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 323.

У гэты перыяд яўрэі пачнуць масава падаваць заявы на выезд з СССР у Ізраіль. Каб их стрымаць прымяняліся як забараняючыя меры, так і прапагандысцкія. 29.03.1983 г. быў створаны Антысіяніcцкі камітэт савецкай грамадскасці, які ўзначаліў двойчы Герой Савецкага Саюза Д. Драгунскі[339]. Яўрэям спачатку перашкаджалі пакідаць СССР, а затым не дазвалялі, па надуманых прычынах, вяртацца. Так, калі сям'я Хайт (грамадзяне Ізраіля) падала заяву аб пераездзе на пастаяннае месца жыхартва ў г. Віцебск і прыняцці савецкага грамадзянства, Віцебскі аблвыканкам прыняў рашэнне: "пагадзіцца з рашэннем Віцебскага гарсавета аб адмове ва ўездзе ў СССР на пастаяннае месца жыхарства і прыняцце савецкага грамадзянства ў сувязі з вострай жыллёвай праблемай у г. Віцебску"[340].

У грамадска-палітычным, культурным і эканамічным жыцці ў 1970–80-я гг. панавалі: шчыльнае злучэнне партыйнага і дзяржаўнага апарату, распаўсюджванне карупцыі, безыніцыятыўнасць, сацыяльная апатыя, вядомы не адзінкавыя факты злоўжыванняў службовым становішчам, якія дапускаліся кіраўнікамі, праявы прыватнаўласніцкіх тэндэнцый, парушэнне нормаў маралі і іншых, не сумяшчальных з маральнасцю, учынкаў[341]. У Беларусі былі выяўлены факты дзейнасці арганізаванай злачыннасці, якія атрымалі шырокі грамадскі рэзанас. Гэта так званыя "мінская" і "аршанская" справы, у якія былі ўцягнуты як гаспадарнікі, так і партыйныя, савецкія работнікі, а таксама супрацоўнікі праваахоўнай сістэмы[342]. Гэтаму таксама садзейнічалі праграмныя ўстаноўкі, якія арыентавалі на інтэрнацыяналізацыю і нерэальныя тэрміны пабудовы камунізму ў Савецкім Саюзе, сцвярджэнне, што ў СССР пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства і створана новая супольнасць "савецкі народ".

Такія памылковыя навуковыя прагнозы і тэорыі садзейнічалі далейшаму назапашванню дэфармацый у нацыянальнай сферы. Набыў моц працэс вымірання нацыянальных моў. Калі па перапісе 1926 г. у СССР былі зафіксаваны 194 мовы, то па перапісе 1979 г. – 130–140. Глабальная дэнацыяналізацыя культурнага і

---

[339] Запіска Ю. Андропава і А. Грамыкі ад 10.06.1968 г. у ЦК КПСС // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 18. Спр. 45. Арк. 1–4 ; Праект (з зацверджанымі папраўкамі) пастановы № 55/4с ад 07.09.1972 г. Сакратарыята ЦК КПСС "О плане основных пропагандистских и контрпропагандистских мероприятий в связи с очередной антисоветской компанией международного сионизма" // Там жа. Воп. 17. Спр. 41. Арк. 1–4 ; Выпіска з пратакола № 101/62с ад 29.03.1983 г. пасяджэння Сакратарыята ЦК КПСС – пастанова ЦК КПСС "О создании Антисионистского комитета советской общественности" // Там жа. Воп. 11. Спр. 175. Арк. 1–10.

[340] Рашэнне Віцебскага аблвыканкама ад 25.04.1989 г. // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 159. Арк. 24.

[341] Напрыклад: Запіска ад 16.03.1982 г. КПК пры ЦК КПСС аб шматлікіх фактах хабарніцтва сярод кіруючых работнікаў Краснадарскага краю // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 11. Спр. 134. Арк. 1 ; Выпіска з пратакола № 131/10с ад 23.11.1983 г. пасяджэння Сакратарыята ЦК КПСС аб публікацыі ў савецкай друку па ўзгадненні з КДБ СССР паведамлення аб выніках разгляду Вярхоўным судом РСФСР справы аб буйных хабарніках з гандлю "Гастраном" Галоўнага ўпраўлення гандлю Масгарвыканкама // Там жа. Спр. 135. Арк. 1 ; Запіска ад 02.01.1986 г. міністра ўнутраных спраў СССР "Аб злоўжываннях і парушэннях законнасці ў органах унутраных спраў Іркуцкай вобласці" // Там жа. Воп. 11. Спр. 136. – Арк. 1 ; Запіска старшыні КДБ СССР у ЦК КПСС "Аб мерах па ўпарадкаваньні кантактаў савецкіх службовых асоб з замежнымі грамадзянамі" (1986), у сувязі з масавымі фактамі хабарніцтва ў Дзяржкамітэце СССР па эканамічных сувязях, Міністэрстве знешняга гандлю СССР і іншых арганізацыях пры заключэнні здзелак з замежнымі фірмамі // Там жа. Воп. 18. Спр. 85. Арк. 1–4.

[342] *Барвінок К. І., Саракавік І. А.* Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2005. № 4. С. 71 ; *Пушкін І.А.* Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф. Магілёў, 2018. С. 65–73.

грамадска-палітычнага жыцця тытульнага народа БССР паўплывала на стан яе этнічных груп. Як адзначыў прафесар Л. Лыч, у выйгрышы аказалася толькі руская дыяспара[343]. Усе астатнія вымушаныя былі моцна паплаціцца сваёй этнакультурнай самабытнасцю[344]. Менавіта ў гарадах, паводле меркавання даследчыкаў, найбольш хуткімі тэмпамі ішоў працэс рускамоўнай асіміляцыі прадстаўнікоў нацменшасцей Беларусі. Так, напрыклад, паводле перапісу 1970 г. рускую мову назвалі роднай ў гарадах 56 % латышоў[345].

Сітуацыя пагоршылася пасля рэалізацыі шэрагу мерапрыемстваў па выкананні пастановы сакратарыята ЦК КПСС "Аб удасканаленні вывучэння і выкладання рускай мовы ў саюзных рэспубліках" (29.08.1978), пастановы ЦК КПСС і СМ СССР (26.05.1983) аб дадатковых мерах па паляпшэнні вывучэння рускай мовы ў навучальных установах саюзных рэспублік і прапаноў міжнароднай навуковай канферэнцыі "Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў сацыялістычных культурах" (1984)[346].

Саветызацыя і русіфікацыя насельніцтва рэспублікі прывялі да зменаў нацыянальнага складу насельніцтва. Напрыклад, у г. Гродна ў 1939 г. пражывалі 47 % палякаў, 42,6 % яўрэяў, 4,7 % беларусаў, а ў 1989 г. – 53 % беларусаў, 21,4 % палякаў, 20,5 % рускіх; у г. Ліда ў 1939 г. – 64,9 % палякаў, 33 % яўрэяў, 2,1 % беларусаў, у 1989 г. – 37,3 % палякаў, 41 % беларусаў, 17 % рускіх. На думку доктара гістарычных навук А. Смалянчука, на беларускай зямлі быццам праводзіўся эксперымент па поўнай дэнацыяналізацыі насельніцтва[347]. Даследчык

---

343 *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 5

344 На працягу 1959–1979 гг. адбываецца змяншэнне ўдзельнай вагі палякаў у агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі з 6,7 % да 4,1 %. Адбылося значнае скарачэнне ўдзельнай вагі палякаў, што прызналі роднай мову сваёй нацыянальнасці. У 1959 г. было 538900 палякаў у Беларусі (6,7 %), з іх 48,5 % назвалі польскую мову ў якасці роднай, 47,2 % беларускую, 4 % рускую. У 1970 г. 403100 асоб (4,2 %), польскую мову роднай назвалі 7,7 %, беларускую 74 %, рускую 18 % палякаў. Прычыны даволі значнага скарачэння колькасці палякаў у рэспубліцы можна патлумачыць працэсам іх моўнай, а потым і этнічнай асіміляцыі. Скарачэнне колькасці палякаў у міжперапісны перыяд 1959–1970 гг. было абумоўлена таксама пазбаўленнем рэгістрацыі каталіцкіх аб'яднанняў і закрыццём касцёлаў. Так, за 1960–1964 гг. былі зняты з рэгістрацыі 17 абшчын ў Віцебскай вобласці і 26 – ў Гродзенскай. З 1965 да 1970 г. колькасць касцёлаў у рэспубліцы паменшылася са 130 да 107. Паводле перапісу 1959 г. з 8,7 тыс. татараў 19,9 % назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці, 34,8 % – рускую. У 1970 г. роднай мову сваёй нацыянальнасці назвалі 24,5 % татараў, 41,1 % – рускую. Як засведчылі вынікі перапісу 1989 г., тэндэнцыя ўзмацнення русіфікацыі заставалася нязменнай. Так, толькі 25,9 % татараў назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці, для 52,4 % татараў роднай была руская. Разам з тым, свабодна валодалі роднай мовай ў 1970 г. – 8,9 % татараў, у 1979 г. – 10 %, у 1989 г. – 10,7 %. Падобная тэндэнцыя назіралася і сярод літоўцаў, латышоў. *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 214, 231–232 ; *Kruczkowski T.* Niektóre zagadnienia historii etnicznej Polaków na Białorusi. С. 73, 76.

345 *Тугай В.В.* Латыши на Беларуси. Минск, 2001. С. 130.

346 Пастанова № 122/1с ад 29.08.1978 г. Сакратарыята ЦК КПСС "Аб далейшым удасканаленні вывучэння і выкладання рускай мовы ў саюзных рэспубліках" (з прынятымі папраўкамі). Зацверджана Палітбюро ЦК КПСС 31.08.1978 г. Пратакол № 119/V // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 23. Спр. 13. Арк. 1–6 ; Спр. 31. Арк. 1–7 ; Копія запіскі аддзела навукі і навучальных установаў ЦК КПСС, інфармацыя ЦК КП саюзных рэспублік, абкамаў партыі, міністэрстваў аб выкананні пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 26.05.1983 г. аб дадатковых мерах па паляпшэнню вывучэння рускай мовы ў навучальных установах саюзных рэспублік (1984) // Там жа. Ф. 5. Воп. 90. Спр.185. Арк. 1–97 ; Даведкі аддзела арганізацыйна-партыйнай работы ЦК КПСС аб выніках міжнароднай канферэнцыі "Нацыянальны і інтэрнацыянальнае ў сацыялістычных культурах" (1984) // Там жа. Спр. 147. Арк. 40–45.

347 *Смалянчук А.* Нацыянальная структура насельніцтва Беларусі ў XX стагоддзі . С. 161.

Т. Кручкоўскі называе гэта вынікам рускай і беларускай каланізацыі[348]. Польскія даследчыкі гавораць пра працэс беларусізацыі палякаў. З гэтым можна пагадзіцца, але трэба ўлічваць тое, што суверэннай беларускай дзяржавы не існавала, і беларусізацыя мясцовых палякаў з'яўлялася толькі этапам да іх русіфікацыі.

Такая палітыка, на думку прафесара У. Навіцкага, садзейнічала зніжэнню ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці, скарачэнню элементаў нацыянальнай культуры нацыянальных меншасцей. Даследчык робіць выснову: "Савецкая палітыка адносна этнічных супольнасцей мела не толькі станоўчыя моманты, але і сур'ёзныя памылкі і пралікі. Гэта прывяло да глыбокага крызісу ў міжнацыянальных адносінах, які да сённяшняга дня адчуваецца на постсавецкай прасторы"[349].

Беларусь з'яўлялася адной з рэспублік СССР. Нягледзячы на прадстаўніцтва ў ААН, яна не мела рэальнага суверэнітэту і была пазбаўлена магчымасці праводзіць уласную нацыянальную і культурную палітыку. Акадэмік М. Касцюк падкрэслівае, што пэўныя змены ва ўзаемаадносінах этнічных супольнасцей на Беларусі, як і ў іншых месцах, адбыліся ў выніку перабудовачных працэсаў другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гг., што звязана ў першую чаргу з развіццём дэмакратыі, атрыманнем Беларуссю статуса суверэннай дзяржавы.

**Дзейнасць партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у сферы міжнацыянальных адносін у 1985–1991 гг.** У 1985 г. у развіцці сістэмы дзяржаўнай улады і кіравання Беларусі адбыўся істотны паварот, які паклаў пачатак новаму перыяду. На працягу некалькіх гадоў у адпаведнасці з палітыкай перабудовы, якая прадугледжвала правядзенне пэўнай дэмакратызацыі кіравання дзяржавай, адбывалася частковая дэцэнтралізацыя, якая пашырыла суверэнітэт Беларусі. Аднак у выніку таго, што ў 1990 г. працэс рэфармавання дзяржаўнага кіравання не завяршыўся, а затым выйшаў з-пад кантролю партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР, Беларусь стала на шлях набыцця рэальнага суверэнітэту і незалежнасці, які пасля распаду СССР у снежні 1991 г. набыў незваротны характар[350].

На час прыходу да ўлады М. Гарбачова прыпадае правядзенне ХХХ з'езда КПБ (30–31.01.1986). Упершыню за доўгія часы ў дакладзе мандатнай камісіі асобы польскай нацыянальнасці названы асобна, а не ў складзе агульнай групы – іншыя нацыянальнасці. У справаздачным дакладзе першага сакратара ЦК КПБ М. Слюнькова, побач з заклікамі выхавання моладзі ў духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, фарміравання падрыхтаванасці да абароны сваёй Айчыны, звернута ўвага і на міжэтнічныя працэсы: "З поля зроку партыйных камітэтаў і арганізацый не павінны знікаць такія актуальныя пытанні, як выхаванне высокай культуры міжнацыянальных адносін, пачуцця непарушнага яднання беларускага народа з вялікім рускім і іншымі брацкімі народамі нашай

[348] *Kruczkowski T.* Nektóre zagadnienia historii etnicznej Polaków na Białorusi. С. 75.
[349] *Навіцкі У.І.* Савецкая палітыка ў адносінах да этнічных супольнасцей Беларусі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 23.
[350] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 249.

шматнацыянальнай Радзімы. Належыць забяспечваць актыўны ўдзел прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць у рэспубліцы, у кіраванні вытворчасцю, у працы органаў улады"[351]. Прагучала гэта і ў рэзалюцыі з'езда: "Палепшыць камуністычнае і інтэрнацыянальнае выхаванне насельніцтва. …Дамагацца актыўнага ўдзелу грамадзян розных нацый, якія жывуць і працуюць у рэспубліцы, у кіраванні вытворчасцю, у працы органаў улады, у культурным жыцці гарадоў, раёнаў, працоўных калектываў"[352].

У гады "перабудовы" падкрэслівае В. Мазец: "было відавочным імкненне дзяржаўна-партыйнага кіраўніцтва да далейшай інтэрнацыяналізацыі міжнацыянальных зносін. Але тэорыя інтэрнацыяналізацыі, адлюстраваная ў праграмных дэкларацыях КПСС, вызначалася схаластыкай і была адарвана ад жыццёвай рэчаіснасці. Крызіс СССР як дзяржавы быў абумоўлены у тым ліку крызісам міжнацыянальных адносін. Пры гэтым назіралася відавочная непаслядоўнасць і хаатычнасць дзеянняў партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва Савецкага Саюза пры вырашэнні нацыянальнага пытання"[353].

Безумоўна, у першую чаргу, ўплыў на нацыянальную палітыку кіраўніцтва БССР аказвалі агульнасаюзныя падзеі. Ва умовах хуткага пагаршэння сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэспубліках СССР стала ўзмацняцца палітычная напружанасць, нарастаць цэнтрабежныя настроі. Праяўленнем нарастаючага ў краіне абвастрэння нацыянальнага пытання сталі хваляванні ў Алма-Аце ў снежні 1986 г., для падаўлення якіх былі прыменены войскі; пісьмовыя звароты прадстаўнікоў інтэлігенцыі Беларусі, накіраваныя ў снежні 1986 г. новаму кіраўніку СССР М. Гарбачову, у якіх яны пратэставалі супраць скарачэння сферы ўжывання беларускай мовы і настойвалі на правядзенні новага этапа "беларусізацыі", якія былі разгледжаны на пасяджэнні сакратарыята ЦК КПСС 10.03.1987 г.[354]; дэманстрацыі крымскіх татар 25–27.07.1987 г. каля Крамлёўскай сцяны ў Маскве з патрабаваннямі вяртання татар на іх гістарычную радзіму – Крым і аднаўлення крымска-татарскай аўтаноміі ў Крыме; дэманстрацыі ў жніўні 1987 г. у Прыбалтыцы з патрабаваннямі ліквідацыі белых плямаў у гісторыі і апублікавання сакрэтных пратаколаў 1939 г., якія вызначылі лёс прыбалтыйскіх рэспублік; востры міжнацыянальны канфлікт у Нагорным Карабаху, які пачаўся ў 1987 г., а ў 1988 г. перарос у крывавыя сутыкненні паміж армянамі і азербайджанцамі, у выніку чаго ў Баку, Нахічэвані і Кіравабадзе было ўведзена асобае становішча, на разгон дэманстрацый кінуты войскі[355]. Сілавы шлях вырашэння нацыянальных праблем[356] не даваў пазітыўных вынікаў і яшчэ больш

[351] Пратакол XXX з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 374. Арк. 4, 5, 43, 45.
[352] Рэзалюцыя XXX з'езда КПБ // Там жа. Арк. 211.
[353] *Мазец В.Г.* КПСС і КПБ у пошуку шляхоў вырашэння нацыянальнага пытання (1986–1990 гг.) // Романовские чтения – 10: сб. статей Международной науч. конференции. –Могилёв, 2015. С. 101–102.
[354] Матэрыялы да пастановы ЦК КПСС: лісты пісьменнікаў, артыстаў і вучоных БССР па пытаннях развіцця нацыянальнай мовы і культуры // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 23. Спр. 37. Арк. 1–23 ; Выпіска з пратакола № 42/4с ад 10.03.1987 г. пасяджэння Сакратарыяту ЦК КПСС "Аб лістах пісьменнікаў, артыстаў і навукоўцаў БССР па пытаннях развіцця нацыянальнай мовы і культуры" // Там жа. Спр. 17. Арк. 1–10.
[355] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 240
[356] Выступленне міністра МУС СССР В. Бакаціна на Пленуме ЦК КПСС "Аб нацыянальнай палітыцы партыі ў сучасных умовах" (1989) // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 298. Арк. 52–53

ускладняў становішча. У гэтых умовах кіраўніцтва СССР спрабуе рэфармаваць існуючую ў краіне сістэму, у тым ліку і ў сферы федэратыўных і міжнацыянальных адносін. У 1987 г. у апараце ЦК КПСС ствараецца спачатку пададдзел, а затым – аддзел па нацыянальных адносінах, у які былі запрошаны прадстаўнікі саюзных рэспублік. Прымаюцца законы СССР “Аб парадку вырашэння пытанняў, звязаных з выхадам саюзнай рэспублікі з СССР” (03.04.1990), “Аб размежаванні паўнамоцтваў паміж Саюзам ССР і суб’ектамі федэрацыі” (26.04.1990) і іншыя агульнасаюзныя прававыя акты, якія пашыралі правы саюзных рэспублік[357].

28.06.–01.07.1988 г. адбылася XIX Усесаюзная канферэнцыя КПСС, якая адобрыла прапанову М. Гарбачова ажыццявіць рэформу палітычнай сістэмы. Вышэйшым органам дзяржаўнай улады ў краіне станавіўся З’езд народных дэпутатаў СССР, які надзяляўся правам прымаць да свайго разгляду і вырашаць любое пытанне, аднесенае да ведання Саюза ССР. Іх правядзенне ў 1989–1991 гг. мела вялікі розгалас у грамадстве і яны значна паўплывалі на грамадска-палітычнае і культурнае жыццё краіны і актывізацыю грамадзян[358]. Актывізаваў і замацаваў працу ў адраджэнні культуры, традыцый нацыянальных меншасцей вераснёўскі (1989) пленум ЦК КПСС, які разгледзеў пытанні нацыянальнай палітыкі. На ім прагучала вельмі шмат цікавых думак і паступіла прапаноў ад прадстаўнікоў розных рэспублік і абласцей, за выключэннем ЦК КПБ[359]. На правядзенне нацыянальнай палітыцы паўплывалі абмеркаванне і прыняцце ВС Законаў СССР: “Аб узмацненні адказнасці за замах на нацыянальнае раўнапраўе грамадзян і гвалтоўнае парушэнне адзінства тэрыторыі СССР” (1990), “Аб мовах народаў СССР” (1990), “Аб вольным нацыянальным развіцці грамадзян СССР, якія пражываюць за межамі сваіх нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў або не маюць іх на тэрыторыі СССР”(1990)[360].

Нягледзячы на тое, што Саюз ССР прадугледжваў поўнае адзінства дзяржаўнага ладу для яго членаў, змяненні ў рэспубліках праходзілі па рознаму. Пэўную ролю у рэфармаванні дзяржаўнага механізма БССР адыграў закон “Аб народным абмеркаванні важных пытанняў дзяржаўнага жыцця Беларускай ССР”, які быў прыняты 02.02.1988 г. на восьмай сесіі ВС БССР[361]. Ён прадугледжваў абмеркаванне насельніцтвам важных пытанняў грамадскага і дзяржаўнага жыцця. У падрыхтоўцы і правядзенні абмеркавання мелі права ўдзельнічаць, разам з КПБ,

---

[357] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 240 – 241.

[358] Дакументы З’езда народных дэпутатаў СССР // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 1. Спр. 119, 121, 137, 142, 144, 145, 169, 170, 171.

[359] Прапановы партыйных камітэтаў, цэнтральных ведамстваў і ўстаноў, спецыялістаў па нацыянальных праблемах да пленум ЦК КПСС па міжнацыянальных адносінах. 08.09.1989 г. // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 329. Арк. 5, 46, 52, 201, 216, 250 ; Пастанова Пленума ЦК КПСС ад 20.09.1989 г. “Аб нацыянальнай палітыцы партыі ў сучасных умовах” // Там жа. Спр. 294. Арк. 1.

[360] Праект Закона СССР “Аб узмацненні адказнасці за замах на нацыянальнае раўнапраўе грамадзян і гвалтоўнае парушэнне адзінства тэрыторыі СССР” і матэрыялы да яго // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 6. Спр. 13. Арк. 1–10 ; Закон СССР “Аб мовах народаў СССР” // Там жа. Воп. 5. Спр. 179. Арк. 120–130 ; Закон СССР “Аб свабодным нацыянальным развіцці грамадзян СССР, якія пражываюць за межамі сваіх нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў або не маюць іх на тэрыторыі СССР” // Там жа. Спр. 180. Арк. 49–56.

[361] БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне (11). Сесія (8). Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1988. С. 83–90.

прафсаюзамі, УЛКСМ, і іншыя грамадскія арганізацыі (артыкул 5), што садзейнічала актывізацыі працэсаў утварэння і грамадскай дзейнасці культурна-асветніцкіх аб'яднанняў нацыянальных меншасцей. У артыкуле 4 Закона забараняліся прамыя або ўскосныя абмежаванні на ўдзел у абмеркаванні ў залежнасці ад "расавай і нацыянальнай прыналежнасці, полу, адукацыі, мовы, адносін да рэлігіі"[362]. Але найбольшае значэнне мела прыняцце 27.10.1989 г. Вярхоўным Саветам БССР закона БССР "Аб змяненнях і дапаўненнях Канстытуцыі (Асноўнага Закона) Беларускай ССР", якім ўносіліся значныя змяненні ў сістэму вышэйшай дзяржаўнай улады рэспублікі.

Нягледзячы на нястомнае змаганне з рэлігійнымі пачуццямі, камуністычным уладам не ўдалося выкараніць іх са свядомасці людзей. У саюзныя кіруючыя органы і ЦК КПСС накіроўваліся дзесяткі лістоў і калектыўных заяў вернікаў з Ліды і Смаргоні Гродзенскай вобласці, Гомеля, Браслава Віцебскай вобласці і іншых месцаў аб рэгістрацыі каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў. Напрыклад, толькі ў 1980–1985 гг. вернікі неаднаразова пісалі калектыўныя лісты-звароты з просьбай зарэгістраваць каталіцкія рэлігійныя аб'яднанні г. Барысава Мінскай вобласці і г. п. Івенец Валожынскага раёна (1983 г. – 10 лістоў, 1984 г. – 29, 1985 г. – 3)[363]. На ўсе звароты атрымалі адмоўны адказ[364]. Да пачатку 1989 г. ва ўсіх лістах вернікаў БССР да мясцовых і цэнтральных уладаў гаворка ішла толькі аб вяртанні касцёлаў і рэгістрацыі рэлігійных аб'яднанняў, ніякіх згадак пра нацыянальнасць не было. Аднак гэтыя звароты рыхтавалі глебу і паспрыялі нацыянальнаму адраджэнню.

Кіраўніцтва БССР у сваёй палітыкі ў адносінах да палякаў павінна было выконваць рашэнні цэнтральнага кіраўніцтва КПСС, якое на чале з М. Гарбачовым у часы перабудовы пад уплывам знешне і ўнутрыпалітычных фактараў улічвала нацыянальныя аспекты, аб чым сведчыць афіцыйная згода на дзейнасць каталіцкай царвы ў Беларусі і негалосны дазвол на дапамогу палякам Беларусі з боку Хрысціянска-сацыяльнага саюзу і іншых арганізацый, што падтрымлівалі ПАРП[365].

Так, у студзені 1989 г. у ЦК КПСС на імя М. Гарбачова быў накіраваны ліст служыцеляў рыма-каталіцкай царквы наконт запрашэння ксяндзоў з Польшчы. У адказ прагучала, што асноўнай прычынай, якая робіць немагчымым запрашэнне ў Беларусь польскіх ксяндзоў, з'яўляецца адмова Ватыкана ўрэгуляваць межы каталіцкіх епархій у адпаведнасці з дзяржаўнымі межамі СССР, у прыватнасці ў

[362] БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне (11). Сесія (8). С. 85.

[363] Заявы грамадзян католікаў у Савет па справах рэлігій пры СМ СССР // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3081. Арк. 7–16.

[364] *Пушкін І. А.* Актывізацыя этнічнай самасвядомасці польскага і літоўскага насельніцтва Беларусі пад уплывам візітаў Папы Рымскага Яна Паўла ІІ у ПНР // Studia internationalia: Материалы VI междунар. науч. конф. "Западный регион России в международных отношениях X–XX вв." С. 203–210 ; *Puszkin Ihar.* Wpływ wizyt papieża Jana Pawła II w Polsce na aktywność ludności katolickiej i świadomość językowo-etniczną Polaków w Białorusi // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 383–395.

[365] *Машкевіч Маріуш.* Східна польська політика у ХХ – на початку ХХІ ст.: концепції та інтерпретації. Київ, 2015. С. 130–131.

Беларусі[366]. Каб знайсці выхад з складанага кадравага пытання было вырашана зрабіць стаўку не на тэрытарыяльны фактар, а на нацыянальны, што паспрыяла кансалідацыі палякаў у Беларусі. 25.12.1989 г. Савет па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР звяртаецца да намесніка старшыні СМ БССР Н. Мазай: "У адпаведнасці з даручэннем СМ СССР Саветам па справах рэлігій разглядаецца пытанне аб магчымасці прыцягнення абмежаванага ліку святароў з ПНР для абслугоўвання шэрагу каталіцкіх парафій Беларусі, размешчаных у месцах кампактнага пражывання асоб польскай нацыянальнасці"[367]. Па даручэнні савецкага ўрада (старшыня СМ СССР М. Рыжкоў) Савет па справах рэлігій пры СМ СССР 09.01.1990 г. прыняў пастанову аб запрашэнні з Польшы да 50 ксяндзоў для работы ў прыходах рыма-каталіцкай царквы Беларусі. Больш таго пад ціскам вернікаў мясцовыя ўлады пагадзіліся на запрашэнне 58 польскіх ксяндзоў[368].

У якасці прыкладу, можна прывесці тыповую сітуацыю. У г. п. Міёры да стрыечнага брата І. Жаўняровіча прыехаў грамадзянін Польшчы К. Пажарскі. Ён звярнуўся да упаўнаважанага савета па справах рэлігіі Віцебскага аблвыканкама аб працаўладкаванні ксяндзом у адзін з каталіцкіх прыходаў Міёрскага раёна. Упаўнаважаны савета па Віцебскай вобласці М. Марозаў ў сваім лісце (22.06.1990) да намесніка Віцебскага аблвыканкама падкрэсліў: "Мая думка, як Упаўнаважанага Савета такая, у сувязі з тым, што Пажарскі не ведае ні рускай, ні беларускай моў, ксёндз па спецыяльнасці, таму зыходзячы з гэтых абставін ён будзе весці службу на польскай мове, а значыцца будзе ісці працэс апалячвання насельніцтва вобласці і арыентацыя абшчын на Польскі епіскапат, што з'яўляецца непажаданым момантам"[369]. Нягледзячы на думку ўпаўнаважанага, Віцебскі аблвыканкам дазволіў ксяндзу застацца ў БССР[370].

З'яўленне каталіцкіх святароў актывізавала працэс па стварэнні польскіх нацыянальных арганізацый, на іх арганізацыйных сходах прысутнічалі ксяндзы. Адбылося супадзенне інтарэсаў польскага насельніцтва БССР, рэлігійнага і нацыянальнага фактараў, намераў і мэтаў уладаў Польшчы і СССР[371].

У 1987–1991 гг. у БССР пачалі масава ствараццa нацыянальна-культурныя аб'яднанні палякаў, татар, яўрэяў, мэтай якіх з'яўлялася арганізацыя работы па вывучэнні мовы, гісторыі, культуры сваіх народаў (гл. раздзел 5.4).

---

[366] *Пушкін І. А.* Дакументы па гісторыі нацыянальных супольнасцей Беларусі 1980–1990-х гг. у цэнтральных архівах Расійскай Федэрацыі // Архівы і справаводства. 2014. № 3. С. 129–130.

[367] Інфармацыйныя лісты аддзела Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР (1988) // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 4080. Арк. 95.

[368] "Аб святарах каталіцкага культу ў рэспубліцы". Ліст старшыні савета па справах рэлігіі пры СМ Беларусі А. Жыльскага ў Вярхоўны Савет і СМ ад 27.12.1991 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 10.

[369] Ліст упаўнаважанага савета па Віцебскай вобласці Савета па справах рэлігій пры СМ БССР ад 22.06.1990 г. // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 14. Спр. 267. Арк. 15–16.

[370] Рашэнне Віцебскага аблвыканкама ад 25.06.1990 г. // Там жа. Арк. 12.

[371] *Пушкін І. А.* Актывізацыя этнічнай самасвядомасці польскага і літоўскага насельніцтва Беларусі пад уплывам візітаў Папы Рымскага Яна Паўла ІІ у ПНР // Studia internationalia: Материалы VI междунар. науч. конф. "Западный регион России в международных отношениях X–XX вв." С. 208–210 ; *Puszkin Ihar.* Wpływ wizyt papieża Jana Pawła II w Polsce na aktywność ludności katolickiej i świadomość językowo-etniczną Polaków w Białorusi // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 393–395.

27.07.1988 г. адбылася сустрэча кіраўніцтва ЦК КПБ з прадстаўнікамі інтэлігенцыі БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, мовы. У выступе першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова прагучала думка аб арганізацыі і правядзенні ў БССР, акрамя конкурса польскай песні, конкурса украінскай песні[372]. Дарэчы, цікавы факт, у Віцебску 23.07.1988 г. падчас конкурса польскай песні адбыўся вечар беларускай песні, дзе з 20 песен было толькі 4 беларускіх[373].

17.11.1988 г. адбылася сустрэча вышэйшага партыйнага кіраўніцтва рэспублікі з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, працы творчых саюзаў, дзейнасці Беларускага Народнага Фронту, Мартыралогу Беларусі і інш. З выступу першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова можна зразумець пазіцыю афіцыйнай улады да адраджэння праяў нацыянальнай свядомасці: "У рэспубліцы у апошні час актывізаваліся некаторыя экстрэмісцкія элементы"[374]. З боку афіцыйных кіраўнікоў творчых саюзаў, якія прызначаліся на свае пасады толькі са згоды партыйнага кіраўніцтва, прагучалі прапановы аб кантролі за дзейнасцю новых нацыянальных арганізацый. Старшыня праўлення рэспубліканскага аддзялення Савецкага фонду культуры І. Чыгрынаў адзначыў: "У Гродзенскай вобласці пры фондзе культуры створана польскае аддзяленне. Яно ўжо пачало дзейнічаць. Пасыпаліся звароты стварыць падобныя аб'яднанні ў Віцебскай, Брэсцкай абласцях. У Мінску жыве 15 тысяч палякаў. Зразумейце. Мы не вельмі спяшаемся выканаць гэта, бо прапановы паступаюць таксама ад татараў, літоўцаў, якія пражываюць у БССР. Польскае таварыства ў г. Ліда даслала ліст, каб дапамагчы ў вывучэнні польскай мовы ў школах. Вось такі дэмакратычны рух ідзе з нечаканага боку. У Мінску пры фондзе культуры створана яўрэйскае таварыства. Справа не ў тым, што прыязжаюць эмісары з Літвы і ўгаворваюць пераехаць у Літву літоўца ці рабіць чорную справу ў Беларусі. Відавочна, што рух аб'яднанняў нам патрэбна ўзяць пад кантроль і падумаць, што гэта такое, пакуль яно здаровае і цікавае"[375].

У 1989 г. з'явілася запіска ЦК КПБ "Аб некаторых негатыўных праявах у развіцці самадзейнага руху ў рэспубліцы і аб працы партыйных арганізацый па іх пераадоленню"[376]. Наконт абвастрэння міжнацыянальных адносін і працы

---

[372] Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі інтэлігенцыі БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, мовы. 27.07.1988 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1167. Арк. 2.

[373] Там жа. Арк. 22.

[374] Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, працы творчых саюзаў, дзейнасці Народнага фронта, Мартыралога Беларусі і інш. 17.11.1988 г. // Там жа. Спр. 1168. Арк. 1.

[375] Там жа. Арк. 8–9.

[376] Падчас правядзення ў СССР палітыкі перабудовы ў розных рэгіёнах і рэспубліках члены камуністычнай партыі раскалоліся на два лагеры. У адным апынуліся тыя, хто імкнуўся захаваць існуючы лад, перашкаджаў зменам на шляху дэмакратызацыі грамадства. У другім тыя, хто жадаў правесці змяненні ў грамадска-палітычным ладзе з мэтай выхаду з крызісу. Апошнія ўтварылі "Дэмакратычную платформу ў КПСС". У іх былі прыхільнікі і сярод членаў камуністычнай партыі Беларусі. У кастрычніку 1989 г. у Мінску пачынае дзейнічаць палітычны клуб "Камуністы за перабудову". Сустаршынёю клуба і найбольш актыўным быў Жыватнюк А. – намеснік начальніка АТК ВА "Гарызонт", сакратар цэхавай партарганізацыі КПБ, украінец па нацыянальнасці. 1940 года нараджэння, ён уступіў ў КПСС у 1964 г., працаваў на прамысловых прадпрыемствах Магілёва, загадчыкам сектара Магілёўскага абкама КПБ, інструктарам ЦК КПБ. Ён актыўна выступаў за дэмакратызацыю КПБ, будучы добрым арганізатарам менавіта ён, разам з паплечнікамі, з'арганізаваў і правёў 23–25.03.1990 г. у Мінску вельмі прадстаўнічую рэспубліканскую канферэнцыю

сярод прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у Беларусі, сярод іншага было адзначана: "Рэальнае жыццё, далейшае развіццё працэсаў дэмакратызацыі нашага грамадства на павестку дня паставіла яшчэ адну няпростую праблему – кіраўніцтва працай культурна-асветных аб'яднанняў, якія створаны па прынцыпу нацыянальных"[377].

19.01.1990 г. на пасяджэнні бюро ЦК КПБ разглядалася пытанне "Аб партыйным кіраўніцтве працай па ўдасканаленню міжнацыянальных адносін". На жаль, ніякага аналізу міжнацыянальных адносін у Беларусі не было зроблена. У асноўным члены бюро доўга спрачаліся наконт таго, які аддзел будзе займацца ў абкамах праблемамі міжнацыянальных адносін і каму гэтыя асобы будуць непасрэдна падпарадкоўвацца. У выніку прынялі рашэнне – вылучыць гэтую працу ў самастойны кірунак[378].

25.04.1990 г. загадчык ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ А. Русецкі прапанаваў разгледзець на пасяджэнні ЦК пытанне аб стварэнні Дзяржкамітэта БССР па нацыянальных пытаннях. У сваім лісце ён прапаноўваў рэкамендаваць Прэзыдыуму ВС БССР[379] утварыць Дзяржаўны камітэт па нацыянальных пытаннях і стварыць адпаведныя яго структуры на месцах. Сярод іншага, адзначаў: "Запатрабаванні далейшага ўдасканалення кіраваннем у сферы нацыянальнага развіцця і міжнацыянальных адносін у Беларусі вылучаюць неабходнасць стварэння гэтага дзяржаўнага органа ў нашай рэспубліцы". Гэтую выснову ён грунтаваў на наступным: "Аналіз працэсаў у рэспубліцы сведчыць аб росце нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, якія жывуць у Беларусі. Развіваюцца нацыянальныя інтарэсы і запатрабаванні грамадзян, узмацняецца іх імкненне да захавання і адраджэння самастойнасці сваёй культуры, мовы традыцый і звычаяў. У месцах кампактнага пражывання асобных нацыянальных груп у рэспубліцы ўтвораны і дзейнічаюць 11 нацыянальных культурна-асветных таварыстваў і аб'яднанняў"[380].

Прыкладалі намаганні па вырашэнні нацыянальных праблем і выканаўчыя органы ўлады як на ўрадавым узроўні, так і асобных міністэрстваў. Пастановай Савета Міністраў БССР (20.09.1990) была зацверджана "Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у

---

прыхільнікаў "Дэмакратычнай платформы ў КПСС", на якой прысутнічаў 201 дэлегат з усёй Беларусі. НАРБ. Ф. 4 п. Воп.156. Спр.724. Арк. 113.

[377] Запіска ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 14.

[378] Пратакол № 83 бюро ЦК КПБ // Там жа. Воп. 160. Спр. 1054. Арк. 4 ; Спр. 1059. Арк. 28.

[379] З 1960 да 21.09.1990 г. пытанні міжнацыянальных адносін не знаходзілі адлюстравання ў працы якога-небудзь органа Вярхоўнага Савета (ВС) БССР. ВС БССР па палажэнню 1960 г. ствараў 9 пастаянных камісій: мандатную; заканадаўчых меркаванняў; бюджэтную; па замежных справах; па сельскай гаспадарцы; па жыллёвым будаўніцтве, камунальнай гаспадарцы і добраўладкаванні; па народнай адукацыі і культурна-асветніцкай рабоце; па ахове здароўя і сацыяльным забеспячэнні; па гандлі і грамадскім харчаванні. Раней функцыянавала 8 пастаянных камісій ВС рэспублікі, а да ліпеня 1956 г. – толькі 4. У сакавіку 1963 г. колькасць пастаянных камісій вышэйшага органа дзяржаўнай улады Беларусі была павялічана да 12. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе. С. 442.

[380] Ліст А. Русецкага // Там жа. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 14.

БССР”[381]. Міністэрства культуры БССР распрацавала мерапрыемствы з трох раздзелаў па паляпшэнню працы з польскімі этнічнымі групамі ў БССР: 1) садзейнічанне дзейнасці культурна-асветніцкіх таварыстваў; 2) супрацоўніцтва ў вобласці мастацкай культуры; 3) садзейнічанне ў вывучэнні польскай мовы[382]. Восенню 1990 г., на аснове артыкулаў Дамовы аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе ПНР і СССР ад 08.04.1985 г., быў падпісаны пратакол аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры і мастацтва Рэспублікі Польшча і Міністэрствам культуры БССР на 1991–1992 гг. У ім было адзначана, што сваёй галоўнай задачай абодва бакі лічаць забеспячэнне ўмоў для культурнага развіцця нацыянальных меншасцей, аказанне ў гэтых мэтах шырокага садзейнічання супрацоўніцтву саюзаў і грамадска-культурных таварыстваў[383].

04.12.1990 г. Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі выказала свае прапановы па стварэнню ўмоў для працы “Саюза палякаў Беларусі”: выдзяліць памяшканне, арганізаваць запрашэнне спецыялістаў з Польшчы ў сферы адукацыі, адкрыць польскія школы ў Гродна, зрабіць ТБ і радыё на польскай мове, газеты і г.д.[384]

Саюз палякаў у Беларусі адразу пасля свайго ўтварэння (1990) трапіў пад пільны кантроль камуністычных уладаў. Адна з першых спробаў ціску на гэтае нацыянальнае грамадскае аб’яднанне адносіцца да восені таго ж года.

Вельмі цікавай і змястоўнай з’яўлялася інфармацыйная запіска пракуратуры БССР (22.10.1990) на імя першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова “Аб грамадска-палітычнай накіраванасці і выканні законнасці ў дзейнасці саюза палякаў” за подпісам пракурора БССР. У ёй, у прыватнасці, адзначалася: “СПБ утвораны 16.06.1990 г. на ўстаноўчым з’ездзе ў Гродна. Згодна статута і праграмы, СПБ – грамадска-палітычнае аб’яднанне, якое ставіць мэтай сацыяльнае і культурнае развіццё польскага насельніцтва, абарону нацыянальных і грамадзянскіх правоў палякаў, выхаванне моладзі на прынцыпах польскага патрыятызму і нацыянальных традыцый, усталяванне больш шчыльных сувязяў з Польшчай і польскімі аб’яднаннямі, распаўсюджванне каталіцкага ўплыву на тэрыторыі Беларусі”. Пракуратура падкрэслівала, што СПБ аспрэчвае дадзеныя аб колькасці палякаў ў Беларусі згодна перапісу 1989 г. Прыводзіла факты зваротаў беларусаў у ЗАГСы з просьбамі аб змяненні нацыянальнасці з беларускай на польскую. Адзначала сувязі СПБ з каталіцкай царквою: “На пасяджэннях праўлення саюза часта прысутнічае біскуп Т. Кандрусевіч”. У даведцы было пазначана, што на тэрыторыі Гродзенскай вобласці 119 каталіцкіх абшчын (праваслаўных – 98); працуюць 40 ксяндзоў, якія жывуць у вобласці і 15, якія прыязджаюць з Польшчы; створана каталіцкая семінарыя (40 чал.). “Частка каталіцкіх святароў, – гаварылася ў запісцы пракуратуры, – у сваіх казаннях з мэтай пашырэння сфер уплыву

381 Ліст Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у Савет Міністраў “Аб выкананні Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Рэспубліцы Беларусь” // НАРБ. Ф. 974. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 1–5

382 Мерапрыемствы па паляпшэнню працы з польскімі этнічнымі групамі, 1990 г. // Там жа. Воп. 4. Спр. 41. Арк. 70–73

383 Пратакол аб супрацоўніцтве // Там жа. Арк. 74–77

384 Прапановы Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі // Там жа. Арк. 67–68.

заклікае прыхаджан ствараць польскія грамадскія фарміраванні, прапаведваюць нацыяналістычныя настроі”. Пракуратура прыводзіла факты дзейнасці СПБ: “Пры іх актыўным удзеле адкрыты помнік А. Міцкевічу ў Лідзе, усталяваны помнікі воінам польскай арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў г.п. Сапоцкін і вёсцы Навумавічы Гродзенскага раёну. 30.09.1990 г. у Гродна быў праведзены санкцыянаваны мітынг, прысвечаны адраджэнню польскай нацыянальнай культуры, мовы, школ, бібліятэк. Была прынята рэзалюцыя, у якой падвергліся крытыцы мясцовыя і рэспубліканскія ўлады за нездавальняючае вырашэнне запатрабаванняў палякаў”[385].

“Польскай грамадскасцю, – адзначаў пракурор БССР, – таксама вылучаюцца прапановы аб адмове вывучэння беларускай мовы і літаратуры, выказваецца ідэя ўтварэння ў вобласці польскай аўтаноміі… Сярод палякаў, якія жывуць у рэспубліцы, укараняецца думка, што няма Польшчы без Гродна, Львова, Вільнюса”[386].

Прыводзячы лічбы аб колькасці вывучаючых польскую мову ў навучальных установах[387], факты дзейнасці СПБ, пракуратура рабіла выснову, што “аналіз працы саюза палякаў паказвае, што дадзеная арганізацыя з культурна-асветнай хутка палітызуецца, пераўтвараецца ў палітычную партыю з неабходнымі арганізацыйнымі структурамі ў цэнтры і на месцах. Дакладна выражаны нацыянальныя інтарэсы, якія арыентаваны на Польшчу, прасочваюцца тэндэнцыі адрыву палякаў ад іншых нацый. У асноўным дзейнасць саюза палякаў акцэнтуецца на інтарэсах нацыі, практычна не ўвязваецца з рашэннем неабходных гаспадарча-эканамічных пытанняў Гродзенскай вобласці. Падобная палітыка можа прывесці да раз’яднання насельніцтва вобласці па нацыянальных прыкметах і ўзнікнення міжнацыянальных канфліктаў”[388].

Пракурор Беларусі адзначаў: “Складаныя грамадска-палітычныя абставіны, якія складваюцца ў вобласці, рост нацыяналістычных настрояў, садзейнічалі зганьбаванню помнікаў У. Леніну 21.09.1990 г. у г. п. Сапоцкін, 01.10.1990 г. у в. Парэчча Гродзенскага раёна. Узбуджаны крымінальныя справы і праводзіцца разбіральніцтва. …Аб’ектыўных дадзеных аб дачыненні саюза палякаў да канфлікту ў в. Вярэйкі і зганьбавання помнікаў У. Леніна не ўстаноўлена”. Калі на гэта звярнуў увагу пракурор, значыць абвінавачванні “СПБ” у гэтым з боку уладаў былі.

У завяршэнні інфармацыйнай запіскі пракурор Беларусі зрабіў выснову: “Вынікі праведзенай праверкі саюза палякаў Беларусі сведчаць аб тым, што за дзейнасцю польскага руху неабходны пастаянны канстроль і нагляд з боку савецкіх і праваахоўных органаў”[389].

---

[385] Інфармацыйная запіска пракуратуры // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 43–44.

[386] Інфармацыйная запіска пракуратуры // Там жа. Арк. 45–46.

[387] 7,5 тыс. дзяцей у школах 12 раёнаў і 5 гарадоў вобласці, на факультэце польскай філалогіі ГрДУ – 100 студэнтаў, у Ваўкавыскім і Гродзенскім педагагічных вучылішчах.

[388] Інфармацыйная запіска пракуратуры // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 46.

[389] Інфармацыйная запіска пракуратуры // Там жа. Арк. 47.

У выніку 20.11.1990 г. быў накіраваны ліст загадчыка сектара ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ у ЦК КПБ, у якім ён прапаноўваў: “На падставе высноў пракуратуры БССР і Мінюста БССР Гродзенскаму абкаму партыі прапанавана ўзмацніць увагу да дзейнасці “Саюза палякаў у Беларусі”, усяляк накіроўваць яго намаганні ў канструктыўнае русла праз камуністаў – актывістаў саюза[390]. Прапановы па ўдасканаленню арганізацыі працы з нацыянальна-культурнымі аб’яднаннямі былі ўключаны ў рэзалюцыі, якія былі прыняты XXXI з’ездам КПБ.

Прадстаўнічыя органы ўлады звярнулі ўвагу на міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі толькі напрыканцы 1980-х гг., пасля падзей ва Узбекістане, Нагорным Карабахе, Абхазіі і іншых месцах[391]. У Вярхоўным Савеце БССР іх разгляд з’яўляўся кампетэнцыяй аддзела па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця, потым камісіі па народнай асвеце і культуры[392]. Пачынаючы ад 1972 і да 02.02.1988 гг. нацыянальныя праблемы не разглядаліся і на сесіях ВС БССР[393].

Пасля правядзення ў 1990 г. выбараў у мясцовыя і Вярхоўны саветы сталі адбывацца змены ў падыходах да задавальнення інтарэсаў нацыянальных супольнасцей Беларусі ў грамадска-палітычным і культурна-асветным жыцці. Пастановаю Прэзідыума ВС БССР ад 21.09.1990 г. у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета ўнутры некаторых аддзелаў былі ўтвораны сектары. У складзе аддзела па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця з’явіўся сектар па пытаннях адукацыі, культуры і міжнацыянальных адносін. Пастановаю ВС БССР XII склікання ад 01.06.1990 г. былі ўтвораны пастаянныя камісіі, сярод якіх – камісія па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах (Камісія). На гэта паўплывала і тое, што ў той час у вышэйшым органе ўлады краіны – Вярхоўным Савеце СССР – дзейнічала камісія Савета нацыянальнасцей ВС СССР па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах[394].

Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў, на сваім чацвёртым пасяджэнні 24.09.1990 г. члены Камісіі – дэпутаты Вярхоўнага Савета – абмеркавалі зварот агульнага сходу аддзялення польскага культурна-асветнага таварыства імя А. Міцкевіча (Гродна), які адбыўся 14.08.1990 г. Члены таварыства звярталіся да ўладаў з патрабаваннямі “спыніць антыпольскую кампанію ў газетах”, атрымаць

[390] Ліст загадчыка сектара ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ у ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 41.

[391] Некаторыя аспекты міжнацыянальных працэсаў у дзейнасці ВС Беларусі раскрыты аўтарам у наступных публікацыях: Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.). Магілёў, 2007. С. 61–70 ; Дзейнасць інстытутаў дзяржаўнай улады па рэгуляванні міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. 2013. № 9. С. 153–159 ; Дзяржаўныя органы па рэгуляванню міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. 2013. № 2. С. 32–37 ; Парламенцкая дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь па рэгуляванні міжнацыянальных адносін // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1. 2013. № 1. С. 62–69.

[392] У ВС БССР не існавала асобнай камісіі, якая б займалася нацыянальнымі пытаннямі. Час ад часу іх разглядам займаўся Аддзел па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця. Гэта было выклікана тым, што, згодна афіцыйнай ідэалогіі, на абшарах СССР, у тым ліку і Беларусі, нацыянальныя пытанні былі вырашаны, таму неабходнасці ў падрабязным аналізе стану міжнацыянальных адносін не існавала.

[393] Сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Стэнаграфічныя справаздачы. Мінск, 1972–1989.

[394] Інфармацыя пра сустрэчу з прадстаўнікамі камісій па пытаннях нацыянальных адносін // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 10. Спр. 109. Арк. 168.

магчымасць сустрэчы з кіраўніцтвам Гродзенскай вобласці, прасілі выдзеліць памяшканне для таварыства, дапамагчы ў выданні газеты і стварэнні школ на польскай мове, даць дазвол на змяненне нацыянальнасці з беларускай на польскую і інш. Частка палякаў вобласці патрабавала "забараніць гвалтоўнае набажэнства ў касцёлах на беларускай мове", што, на нашу думку, ніяк не адпавядала добрым узаемаадносінам беларусаў і палякаў каталіцкага веравызнання і супярэчыла курсу Каталіцкай царквы на ўжыванне падчас набажэнстваў нацыянальных моў краін знаходжання касцёла[395].

04.12.1990 г. Камісія прыняла рашэнне па пытанню "Аб стане адраджэння нацыянальнай культуры і роднай мовы сярод грамадзян польскай нацыянальнасці ў Гродзенскай вобласці і іншых раёнах Беларусі": рэкамендаваць СМ БССР разгледзець пытанне аб рэгістрацыі Саюза палякаў на Беларусі; вырашыць пытанне аб частковым фінансаванні газеты–органа СПБ; даручыць Гродзенскаму аблвыканкаму і гарвыканкаму разгледзець пытанні аб выдзяленні памяшканняў для СПБ, рэдакцыі газеты, частковым фінансаванні культурна-асветных аддзелаў таварыства; спрыяць хутчэйшаму развіццю польскай мовы; забяспечыць бібліятэкі літаратурай на польскай мове; выдзеліць памяшканні для гуртковай і іншай культурна-масавай дзейнасці; прыняць меры па аднаўленню помнікаў, якія ўшаноўваюць вядомых дзеячаў сумеснай гісторыі і культуры Беларусі і Польшчы[396].

Дарэчы, 5 і 6 снежня 1990 г. Камісія Савета нацыянальнасцей ВС СССР па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах правяла сустрэчу са старшынямі камісій па нацыянальных адносінах, створаных ВС саюзных і аўтаномных рэспублік. На сустрэчы прысутнічалі прадстаўнікі 9 рэспублік (РСФСР, УССР, УзбССР, ТуркССР, КіргССР, АзерССР, МалдССР, ЛатССР, ЭстССР), 14 аўтаномных рэспублік, 4 аўтаномных абласцей, 4 акругаў, 4 краёў, усяго больш за 40 чал. Вялася дыскусія аб міжнацыянальных адносінах, абмяркоўваўся праект новай саюзнай дамовы. Прадстаўнік БССР адсутнічаў[397].

Вясною 1991 г. члены Камісіі звярнулі ўвагу на сферу міжнацыянальных адносін. 20.03.1991 г. была заслухана "Інфармацыя вучоных Інстытута сацыялогіі АН БССР аб стане міжнацыянальных адносін у БССР", а 22.05.1991 г. разглядаліся пытанні "Аб падрыхтоўцы праекта Закона «Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у БССР»" і "Аб ходзе выканання рашэння Камісіі па адраджэнню польскай культуры і мовы, узнятым Польскім культурна-асветным таварыствам імя А. Міцкевіча"[398].

Напрыканцы 1980-х гадоў у Беларусі паўстала праблема нацыянальнага вывучэння Палескага рэгіёну. З'явіўся рух за прызнанне існавання заходнепалескай этнічнай групы (Етвязі). На пасяджэнні Камісіі 20.05.1991 г.

[395] *Пушкін І.А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.). Магілёў, 2007. С. 62
[396] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4089. Арк. 7–9,48–49.
[397] Інфармацыя пра сустрэчу з прадстаўнікамі камісій па пытаннях нацыянальных адносін // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 10. Спр. 109. Арк. 168–172
[398] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4090. Арк. 310–312,125–127.

абмяркоўвалася пытанне “Аб статуце і праграме грамадска-культурнага аб’яднання «Полісье»”. Статут быў прыняты на сходзе 14.04.1990 г. У ім дэкларавалася, што асноўная мэта аб’яднання – садзейнічанне этнакультурнаму адраджэнню Заходняга Палесся (Етвязі). Гэта частка Беларусі разглядалася як асобны край. У Статуце прасочваліся сепаратысцкія настроі. На пасяджэнні Камісіі частка дэпутатаў выказала заклапочанасць тым, што дзейнасць таварыства ініцыіравалася зверху, з боку выканаўчай улады, і гэта стварае нацыянальную напружанасць у рэспубліцы, вядзе да дэстабілізацыі міжнацыянальных адносін. 12.06.1991 г. Камісіяй разглядаўся “Зварот А. Трушко (А. Наварыча) з прапановаю больш актыўна садзейнічаць развіццю культуры Палескага рэгіёну Беларусі”. Выступіў М. М. Шэляговіч і расказаў аб працы грамадска-культурнага таварыства “Полісьсе”. Ён прапанаваў: а) прыняць Закон аб заходне-палескай этнічнай групе народа, б) прыняць пастанову аб фінансаванні работы ГКТ “Палісьсе”, в) стварыць заходне-палескі культурна-асветны цэнтр. Дэпутаты прынялі рашэнне: “1) падтрымаць і адобрыць імкненне членаў ГКТ “Палісьсе” да вывучэння народнай культуры, фальклору, дыялекту Палескага рэгіёну... 3) лічыць немэтазгодным прыняцце заканадаўчых актаў па стварэнню якіх-небудзь аўтаномій, навуковых цэнтраў. Жыхары беларускага Палесся з’яўляюцца самабытнай часткай беларускага народа”[399]

02.10.1991 г. прадметам увагі Камісіі стала пытанне “Аб дзейнасці нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў горада Мінска”. На падставе таго, што ў маі 1991 г. пры Мінскім гарадскім аддзяленні Савецкага фонду міра былі зарэгістраваны і дзейнічалі 6 нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў (татарскае, яўрэйскае, украінскае, рускае, армянскае, азербайджанскае) з агульнай колькасцю сяброў больш за 6000 чалавек, а таксама рашэння 5-й нечарговай сесіі Мінскага гарадскога савета за № 165 ад 05.09.91 г. аб размяшчэнні ў будынку дома палітычнай асветы Мінскага абкама КПБ-КПСС Цэнтра нацыянальных культур, Камісія прыняла рашэнне: 1) прапанаваць Савету Міністраў разгледзець рашэнне Мінскага гарсавета аб утварэнні ў доме палітасветы Цэнтра нацыянальных культур; 2) прапанаваць Дзяржкамдруку і Міністэрству культуры забяспечыць бібліятэкі літаратурай на мовах нацменшасцей; 3) прапанаваць Вярхоўнаму Савету каапгаваць у склад Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах ВС РБ з правам дарадчага голаса прадстаўнікоў нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў рэспублікі[400].

XXXI з’езд КПБ (28–30.11.1990) праходзіў ва ўмовах дэмакратызацыі і развалу СССР, калі кампартыя згубіла свой аўтарытэт. У дакладзе першага сакратара ЦК КПБ Я. Сакалова прагучала: “Прызнаючы нацыянальныя рухі як натуральную форму волевыяўлення народаў, КПБ улічвае іх дэмакратычную накіраванасць. Па ініцыятыве ЦК КПБ прыняты “Закон аб мовах у БССР”. …Варта праяўляць клопат і аб стварэнні ўмоў для свабоднага развіцця

[399] Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4090. Арк. 107–136
[400] Там жа. Арк. 139–147

культурных традыцый пражываючых у Беларусі нацыянальных груп”. Кажучы пра асабліваю ролю ЦК КПБ у прыняцці закона аб мовах, партыйны лідар БССР нават не ўзгадаў пра ініцыятывы і лісты інтэлігенцыі ў абарону роднай мовы. Паралельна ў справаздачным дакладзе адзначалася: “Узрастае шавінізм, нацыяналізм, сепаратызм… КПБ выступае за інтэрнацыяналізацыю грамадскага жыцця”[401].

У выступах на з’ездзе неаднойчы ўзгадваліся падзеі ў Закаўказзі, Кіргізіі, Малдове, Заходняй Украіне, “экстрэмісты”, “беларускі нацыяналістычны фронт”, гучалі словы ў абарону кампартыі, напады на БНФ, ЦК КПСС, Якаўлева, З. Пазьняка, М. Гарбачова. Міжнацыянальныя праблемы ў Беларусі ўзгадваліся толькі ў адзінкавых выступах. Напрыклад, у выступе першага сакратара Магілёўскага абкама КПБ У. Папова: “Патрэбна надаць першачарговую ўвагу наступным пяці праблемам… Гэта адносіны да культуры з пункту гледжання задавальнення моўна-культурных запатрабаванняў людзей усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі рэспублікі…”[402].

Нацыянальнае пытанне і праблемы нацыянальных меншасцей узгадваліся ў прынятых рэзалюцыях: “З’езд … падтрымлівае палітыку, накіраваную на захаванне нацыянальнага самаатаясамлення беларускага народа, дзяржаўную абарону яго мовы, забеспячэнне свабоднага развіцця культурных традыцый нацыянальных груп, якія пражываюць у рэспубліцы[403]. …Мы прапаноўваем сумеснае супрацоўніцтва …па ўдасканаленні міжнацыянальных адносін. Мы за згоду ў такіх важных праблемах, як станаўленне прававой дзяржавы і грамадзянскай супольнасці, маральнае і духоўнае развіццё народаў, якія жывуць у Беларусі, на аснове нацыянальных традыцый і сусветнай гуманістычнай спадчыны[404]. …У вобласці адукацыі: распрацоўка і рэалізацыя канцэпцыі нацыянальнай школы, якая ўлічвала … спецыфіку нацыянальнага склада. У вобласці культуры: … павага самавызначэння і раўнапраўя культур усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць у БССР”[405]. З’езд даручаў ЦК КПБ “шчыльна супрацоўнічаць с творчымі саюзамі, выдавецтвамі, навуковай і педагагічнай грамадскасцю ў працы па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у БССР”[406]. Гэтага было недастаткова ва ўмовах набіраўшага моц нацыянальнага руху. А з другога боку, прынятыя рэзалюцыі з’езда ўжо нічога не вырашалі – надыйшла новая эпоха.

27.07.1990 г. была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Насельніцтва Беларусі ў сваёй пераважнай большасці яшчэ не ставіла

[401] Справаздача аб працы ЦК КПБ і задачы партыйных арганізацый рэспублікі ў новых умовах. Даклад першага сакратара ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1019. Арк. 85, 94, 117, 118; Спр. 1027. Арк. 102.

[402] Пратакол XXXI з’езда КПБ // Там жа. Спр. 1020. Арк. 25–26.

[403] Рэзалюцыя “Па справаздачы ЦК КПБ і задачам партыйных арганізацый рэспублікі ў новых умовах”. Пратакол XXXI з’езда КПБ // Там жа. Спр. 1021. Арк. 75–76.

[404] Рэзалюцыя XXXI з’езда КПБ “Аб пазіцыі кампартыі Беларусі ў адносінах з грамадска-палітычнымі арганізацыямі і рухамі”. Пратакол XXXI з’езда КПБ // Там жа. Арк. 174.

[405] Рэзалюцыя XXXI з’езда КПБ “Аб палітыцы КПБ у вобласці адукацыі, навукі і культуры”. Пратакол XXXI з’езда КПБ // Там жа. Спр. 1022. Арк. 69, 71.

[406] Матэрыялы да пратакола XXXI з’езда КПБ (1990). Рэзалюцыя XXXI з’езда КПБ “Аб палітыцы КПБ у вобласці адукацыі, навукі і культуры” // Там жа. Спр. 1032. Арк. 25, 28.

пад сумненне неабходнасць існавання СССР і падтрымлівала ідэю яго абнаўлення на аснове заключэння новага Саюзнага дагавора. У рэферэндуме, праведзеным у СССР па ініцыятыве саюзнага цэнтра 17.03.1991 г. па пытанні аб захаванні СССР, прыняло ўдзел 83,3 % жыхароў Беларускай ССР, якія мелі права ўдзельнічаць у галасаванні. За захаванне абноўленага Саюза ССР выказалася 82,7 % з іх[407]. Цікава, што напярэдадні рэферэндума (13.03.1991) партыйны лідар Беларусі А. Малафееў даслаў у пастаянную камісію ЦК КПСС па нацыянальнай палітыцы партыі інфармацыйный ліст “Аб рэалізацыі у Беларусі заканадаўчых актаў аб суверэнітэце рэспублікі і забеспячэнні праў чалавека”. У ім адзначалася: “У рэспубліцы ўзніклі новыя грамадска-палітычныя і культурна-асветныя фарміраванні, якія імкнуцца выказаць і абараніць нацыянальныя інтарэсы грамадзян. Сярод іх “Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны”, “Саюз палякаў Беларусі”, рускае, украінскае, татарскае, яўрэйскае нацыянальна–культурныя таварыствы”. Адначасова ў лісце шмат увагі надавалася запалохванню ЦК КПСС тым, што шэраг аб’яднанняў “імкнецца адарваць ў Расіі частку тэрыторыі”[408].

Падпісанне новага Саюзнага дагавора, намечанае на 20.08.1991 г., не адбылося: перашкодзілі падзеі, звязаныя са стварэннем путчысцкага Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы ў СССР і яго няўдалай спробай узяць уладу ў свае рукі. Паражэнне путчыстаў садзейнічала далейшаму ўздыму нацыянальных рухаў па ўсёй прасторы СССР, якія змагаліся за дзяржаўную незалежнасць. Большасць рэспублік, якія раней толькі аб’явілі аб сваім суверэнітэце, цяпер пайшлі далей, заявіўшы аб незалежнасці. У тым ліку і Беларуская ССР, парламент якой 25.08.1991 г. на нечарговай пятай сесіі 12-га склікання прыняў закон “Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі”. Лёс СССР быў вырашаны 21.12.1991 г. у Алма-Аце на сустрэчы кіраўнікоў 11 рэспублік СССР, за выключэннем Грузіі і краін Прыбалтыкі, дзе імі была падпісана Дэкларацыя, у якой канстатавалася, што з утварэннем Садружнасці Незалежных Дзяржаў (08.12.1991) СССР спыняе сваё існаванне.

Такім чынам, на працягу многіх дзесяцігоддзяў дзяржаўная палітыка савецкай улады ў дачыненні да міжнацыянальных адносін, побач са станоўчымі (дружба народаў, верацярпімасць і іншае), была прасякнута палітычным дагматызмам, не дазваляючым падысці да нацыянальных праблем з улікам патрэб асобных этнічных супольнасцей, канкрэтных людзей, татальным кантролем за дзейнасцю нацыянальных грамадскіх арганізацый. Усё непадпарадкаванае камуністычнай партыі забаранялася і знішчалася.

Аналіз стэнаграм і матэрыялаў вышэйшага органа ўлады – з’ездаў КПБ у перыяд 1945–1990 гг. дазваляе вылучыць агульнае. На з’ездах фармуляваліся агульныя кірункі сацыяльнай, эканамічнай, культурнай палітык, але канкрэтная

[407] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 245–246.
[408] Ліст А. Малафеева // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 840. Арк. 18.

праца па ўвасабленні іх у жыццё і спецыфіка аддаваліся на водкуп наменклатуры. Прычым рэальную ўладу ў краіне мела партыйна-савецкая наменклатура агульнасаюзнага ўзроўню. Адбываўся працэс фарміравання палітычнай культуры з таталітарнай свядомасцю. Дзяржава падпарадкавала сабе чалавека, у тым ліку і нацыянальныя групы. Гэта перашкаджала свабодным праявам грамадскіх сіл. Празмернае апякунства дзяржавы над грамадзянамі нанесла вялікую шкоду энэргіі, дзейнасці, маралі людзей. У выніку празмернага мэтанакіраванага кіраўніцтва – асобы адмаўляліся ад істотнай часткі самастойнасці і адказнасці, з'яўлялася сацыяльная апатыя і іншыя негатыўныя з'явы.

На працягу 1945–1984 гг. нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР, характарызавалася барацьбой супраць любых праяваў нацыянальнай самасвядомасці, якая нязменна характарызавалася як нацыяналізм, а таксама супраць нацыянальных традыцый і звычаяў, пры дэклараванні клопату пра далейшы росквіт нацыянальных культур. Пры ўзмацненні манапольнага становішча камуністычнай партыі і яе ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму было заяўлена аб стварэнні наднацыянальнай сацыялістычнай супольнасці – савецкага народа, падкрэслівалася сяброўства і братэрства народаў пры найбольшай ролі рускага народа. З Канстытуцыі былі выкрэслены палажэнні аб дзяржаўнай мове. У такіх умовах захаванне, не кажучы пра росквіт, культур нацыянальных меншасцей было не толькі абмежавана, а, нават, немагчыма. У выніку моцнага ідэалагічнага ўціску ў грамадскім жыцці і мэтанакіраванай нацыянальнай палітыкі ў БССР руская мова выціснула мовы нацыянальных меншасцей з грамадска-палітычнага жыцця і культурна-адукацыйнай сферы. Адбылася русіфікацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця беларускага народа. Значныя змены ў нацыянальнай палітыцы адбыліся пасля прыняцця 27.07.1990 г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, а таксама шэрагу заканадаўчых актаў аб мовах, культуры і адукацыі.

Нягледзячы на саветызацыю палякаў Беларусі, яны так і не сталі цалкам савецкімі, у сэнсе дэнацыяналізаванымі інтэрнацыялістамі. Аб гэтым сведчыць тое, што яны першымі ў Беларусі сярод нацменшасцей распачалі працэс нацыянальнага адраджэння. Варта падкрэсліць, што ўзровень этнічнай самасвядомасці ў прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей быў значна вышэй, чым у беларусаў. З пачаткам дэмакратызацыі грамадскага жыцця побач з адраджэннем культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнаса пачаўся і аналагічны працэс у большасці нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі нашай краіны.

### 2.3 Этнасацыяльныя праблемы насельніцтва і міжнацыянальныя адносіны ў Савецкай Беларусі

У БССР адносіны паміж беларусамі і нацыянальнымі меншасцямі ў цэлым былі нармальныя, антаганістычнай варожасці паміж народамі не існавала. Аднак існавалі пэўныя адчужанасць і непаразуменні на нацыянальна-канфесійнай глебе паміж тытульным насельніцтвам і групамі палякаў, рускіх, латышоў, немцаў, літоўцаў, яўрэяў. Беларусы нярэдка бачылі ў яўрэях – гандляроў, у палякаў –

“шляхту”, у латышах – кулакоў. Частка яўрэйскай і рускай інтэлігенцыі лічыла, што беларуская культура “ніжэйшая” за іх, што на беларускай мове нічога вартага “не зробіш”. Былі выпадкі калі палякі, немцы, латышы называлі беларусаў – сялян: “хлопы”, “шэрыя”, “лапатнікі”, “мужыкі”[409]. Літоўцы на Магілёўшчыне называлі беларусаў “чумокас” (лаянка – “пастух”)[410]. Праявы антысемітызму, нецярпімасць паміж беларусамі, палякамі і яўрэямі часцяком была абумоўлена палітыкай савецкай улады, калі на бытавым узроўні насельніцтва звяртала ўвагу на нацыянальнацсь партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва.

**Грамадскія настроі і міжнацыянальныя адносіны.** Сацыяльна-эканамічны і культурны стан грамадства, суцельная яго палітызаванасць, выклікалі складанасці ў рэалізацыі нацыянальнай палітыкі. Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР адзначала, што найбольш цяжка весці працу па савецкаму будаўніцтву сярод латышскага насельніцтва, бо яно найбольш раўнадушна ці нават нядобразычліва адносілася да савецкага будаўніцтва, вяло адасоблены вобраз жыцця (на хутарах – “калоніях”), у тым ліку беднякі і серадня́кі. Да таго ж большасць латышоў па тых часах жылі даволі заможна. Адсюль склалася думка “калі латыш – дык кулак”. Не змянілі такі падыход і намаганні Латбюро пры ЦК КП(б)Б[411]. Не давала плёну праца і сярод нямецкага насельніцтва. Улады, аналізуючы становішча ў месцах кампактнага пражывання немцаў у Нараўлянскім і Каралінскім раёнах, адзначалі “моцны нямецкі шавінізм” у форме пагардлівых адносін да беларусаў, замкнёнасць на нацыянальнай і рэлігійнай глебе. Як найбольш негатыўныя моманты адзначалі: шчыльную сувязь з Нямеччынай і Амерыкай, адсутнасць моладзі нямецкай нацыянальнасці ў камсамоле, калгасы не ствараюцца і наогул, маецца імкненне выехаць з СССР[412].

Забяспячэнне культурных і грамадскіх патрэб палякаў у БССР супрацьпастаўлялася становішчу беларусаў у Польшчы. У адносінах да палякаў кіраўніцтва Савецкай Беларусі, адзначаючы, што з 97498 палякаў (1926) каля 59 % былі серадня́кі, 25 % беднякі і толькі 10 % кулакоў, сцвярджала, што, у прынцыпе, у палякаў няма варожых адносін да савецкай улады, сяляне-палякі добра плоцяць падаткі, шмат хто з іх змешчаны на, так званай, “залатой дошцы” гонару. Праўда, падкрэслівалася, што яны адрозніваюцца моцнай (фанатычнай) рэлігійнасцю і на іх маюць вялікі ўплыў ксяндзы. З гэтага пункту гледжання і павінны былі быць да іх адпаведныя адносіны. Але на мясцовым (побытавым) узроўні пераважала думка, што ўсе палякі – гэта шляхта і ёй няма месца ў БССР. Да таго ж камуністычнае кіраўніцтва не задавальняла імкненне палякаў мець свае самастойныя ад уплыву КП(б)Б арганізацыі, прапаганда лозунга “усе палякі – роўныя”. Значная частка польскага насельніцтва разглядалася як “шпіёны” і патэнцыйная “пятая калона”.

[409] *Дубянецкі Э.С.* Міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў 20-я гады ХХ ст. Аўтарэферат дыс. С. 11–13 ; Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. С. 34 ; Справаздача Магілёўскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 168.
[410] Матэрыялы па абследванню нацсаветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 109. Арк. 76, 2 ; Аб працы сярод польскага насельніцтва // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5126. Арк. 140.
[411] Матэрыялы нарады // Там жа. Спр. 2987. Арк. 11–29.
[412] Справаздачы АВК КП(б)Б // Там жа. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 109. арк. 2–11

Штодзённае жыццё насельніцтва ўплывае на ўсе бакі жыцця грамадства. З другога боку, грамадскія настроі фарміруюць яго. Актуальным з'яўляецца вывучэнне пытання грамадскіх настрояў менавіта ў асяродку нацыянальных меншасцей, асабліва ў перыяд катаклізмаў і фарміравання новых сацыяльна-палітычных канструкцый. Публікацый на гэту тэму няшмат[413]. Доўгі час аналіз стану грамадскай думкі ў адносінах да рэчаіснасці быў аднабаковым. Станоўчае ўспрыняцце камуністычнай улады, энтузіязм і працоўныя поспехі – вось стрыжань асвятлення жыцця грамадства ў савецкі час. Камуністычныя ўлады практыкавалі падтрымку сваіх дзеянняў з боку масаў наступным чынам: яна выказвалася на агульных сходах, з'ездах спецыяльна падрыхтаванымі асобамі і ў выглядзе загадзя падрыхтаваных рэзалюцый, пастаноў. Усе дзеянні ўладаў рабіліся як бы па патрабаванню працоўных: закрыццё і выкарыстоўванне ў культурна-асветных мэтах цэркваў, знішчэнне абразоў, адмена ў якасці вольных дзён ад працы рэлігійных святаў, асуджэнне або падтрымка тых ці іншых падзеяў у замежжы і г. д.[414]

А што гаварылі людзі паміж сабой? На тых жа сходах ці ў быту, на прадпрыемствах. Асабліва рабочыя, якія, на думку пэўных асобаў, былі найбольш свядомымі і з'яўляліся грунтам камуністычнай сістэмы. Сярод іх у разглядаемы перыяд у БССР быў вельмі вялікі працэнт прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. У цэлым рабочыя і служачыя імкнуліся спакойна працаваць, будаваць сваю гаспадарку, выказваліся супраць вайны, чуткі аб якой перыядычна з'яўляліся і хвалявалі ўсё насельніцтва[415]. У той жа час органы ДПУ зафіксавалі сотні, тысячы фактаў незадаволенасці дзеяннямі ўладаў і створанай палітычнай сістэмай. Пры гэтым патрэбна ўлічваць палітычныя рэаліі. 1924–1928 гг. – перыяд часовай і частковай лібералізацыі ў эканоміцы і грамадскім жыцці БССР, што выклікала ў насельніцтва пачуццё адноснай дэмакратызацыі ў грамадскім жыцці. Яшчэ канчаткова не сфарміраваўся таталітарны рэжым, таму людзі не палохаліся выказваць свае думкі. У 1930-я гг. сітуацыя змянілася. Масавыя палітычныя рэпрэсіі выклікалі ў насельніцтва страх не толькі перад адпаведнымі органамі, але перад сабе падобнымі. Аднадушная падтрымка любых прапаноў кіраўніцтва на сходах і маўклівае пазбяганне размоў на грамадска-палітычныя і сацыяльна-

---

[413] *Платонаў Р.П.* Палітыка. Ідэі. Лёсы: Грамадскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэалагічнага дыктату ў Беларусі 20–30-х гадоў. Мінск, 1996 ; *Сідоранка В.М.* Штодзённае жыццё гарадскога насельніцтва БССР 20-х гг. XX ст. (на польскамоўных матэрыялах БССР) // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социорелигиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. Витебск, 2007. Ч. I. С. 118–120 ; *Пушкін І.А.* Грамадска-палітычныя погляды насельніцтва г. Магілёва напрыканцы 20-х гадоў // А.А.Смоліч і яго час: Матэрыялы навуковых прац першага Смолічаўскага семінара. Мінск–Магілёў, 2001. С. 105–11 ; *Яго ж.* Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20–30-я гады XX ст.): дакументы і матэрыялы. Мінск, 2009 ; История Могилёвского еврейства: Документы и люди: науч.–популяр. очерки и жизнеописания. В 2-х кн. Кн. 2, ч.1 / сост. А. Литин. Минск, 2006 і інш.

[414] *Пушкин И.А.* Религиозные организации польского населения Восточной Беларуси (беларуско-русское пограничье). S. 169–172 ; Яго ж. Налёт на неплатнікаў дзяржаўных падаткаў у г. Магілёве (1929–1930) // Гістарычныя лёсы верхняга Падняпроўя: Зборнік мат. нав. канф. Ч. 2. Магілёў, 1995. С. 93–108 ; Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.). Магілёў, 2004.

[415] Інфармацыйная справаздача Бабруйскага АК КП(б)Б за перыяд снежань–чэрвень 1927 г. // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 432. Арк. 213–214.

эканамічныя тэмы запанавала ў асяродку "звычайных" грамадзян. Паспрабуем разгледзіць грамадскія настроі, якія дазваляюць асвятліць маладаследаваныя бакі міжнацыянальных адносін.

У савецкі час быў шырока распаўсюджаны стэрэатып – "яўрэі ўсе камуністы і ва ўсім вінаваты яны", таму сістэматычна адзначаліся праявы антысемітызму. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва звязвала антысемітызм з выступамі супраць КП(б)Б, у кіраўніцтве якой пераважалі асобы яўрэйскай нацыянальнасці. Сярод начальнікаў акруговых аддзелаў ДПУ і асобых частак, напрыклад Магілёўскай акругі, за подпісамі якіх складаліся сакрэтныя запіскі аб настроях сярод грамадства, таксама былі яўрэі. У выніку ўсе эканамічныя пралікі кіраўніцтва і карныя дзеянні супраць тых, хто не ўсхваляў дзейнасць КП(б)Б і саветаў, атаясамляліся з дзейнасцю яўрэяў.

Рабочыя Бабруйска, Магілёва, Шклова, Жлобіна, Асіповіч, Свіслач, абвінавачвалі савецкую ўладу ў тым, што яна давала шмат прывілеяў яўрэям. Часта гучалі выказванні накшталт: "Яўрэям добра жывецца, яны займаюць лепшыя пасады, улада ім больш дапамагае". На курсах камсамольскага актыву на пытанне анкеты "Як ты лічыш, якая нацыянальнасць у нас на кіруючых пасадах?", было вельмі шмат адказаў, што паўсюль яўрэі, а беларусаў вельмі мала. Некаторыя тлумачылі гэта тым, што беларус не можа кіраваць, а яўрэі разумныя[416]. Загадчык сямігодкі пры Магілёўскім педтэхнікуме М. Азарэвіч (паляк) казаў: "зараз жыдоўскае царства, жыдоўскі ўціск", "белмова некультурна-мужыцкая, якую толька зараз выдумалі і на ёй брыдна работаць і служыць"[417]. У м. Ула ксёндз Стась Цыбульскі ў касцёле пад час казання прамовіў: "яўрэі хочуць забраць нашы касцёлы, а свае сінагогі не закрываюць"[418].

Яскравым прыкладам сувязі палітыкі ўладаў з дзейнасцю яўрэяў з'яўляецца барацьба рабочых фабрыкі "Спартак" (Шклоў) за святкаванне Пасхі. Да 1930 г. "асобнымі днямі адпачынку" лічыліся шэраг найбольш шанаваных у асяроддзі вернікаў–працоўных рэлігійных святаў. Змагаючыся з рэлігійнымі пачуццямі людзей, улады спрабавалі адмяніць гэтыя дні адпачынку. Першым крокам стала спроба пераносіць іх на іншыя дні. Такім чынам, прымушаючы рабочых працаваць у дзень рэлігійных святаў. У красавіку 1927 г. на фабрыцы "Спартак" быў скліканы сход. На парадку дня было адно пытанне – аб святкаванні Пасхі. Кіраўніцтва выказвалася за тое, каб святкавання не было і перанесці яго на 3 мая. Пад час сходу у выступах рабочых гучала: "Мы ведаем, што ўсе камуністы нас толькі эксплуатуюць і жывуць за наш кошт, для нас усё роўна, як пастановіць дэлегацкі сход, а святкаваць мы будзем і на працу на Пасху не пойдзем." Прысутныя крычалі: "Правільна". Далей: "Мы ведаем камуністычныя, жыдоўскія зацеі, яны хочуць нас адлучыць ад нашай веры, але мы сябе ў крыўду не дадзім". Праз некалькі дзён адбылася канферэнцыя. На ёй у знак пратэсту супраць змены

---

416 Сакрэтнае інфармацыйнае паведамленне загадчыка інфармацыйнага пададдзела Бабруйскага АК КП(б)Б у ЦК КП(б)Б ад 12.11.1929 г. // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 770. Арк. 71.

417 Ліст Магілёўскага акругавога аддзела ДПУ БССР ад 20.08.1929 г. // Там жа. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 588. Арк. 27.

418 Дакладная запіска "Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП(б)Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі (па дадзеных 40 раёнаў)" ад 07.06.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12109. Арк. 58.

парадку дня камуністамі большасць рабочых зыйшла і тым самым сарвала правядзенне канферэнцыі. На ёй паспеў выступіць рабочы-каталік, які казаў: “Мне асабіста не важна тое, што я адсвяткаваў сваю Пасху, але мне важна тое, калі Пасху будуць святкаваць усе вернікі – як каталікі, так і рускія, нам у гэтых адносінах трэба злучыцца і не слухаць розных жыдоў і камуністаў.” Сярод рабочых былі жадаючыя працаваць у дзень Пасхі, але ў сувязі з тым, што гэтыя рабочыя былі нізкай кваліфікацыі, фабрыка не працавала 24 і 25 красавіка[419].

Безумоўна, мелі месца факты праяў рэальнага антысемітызму. Так на шклозаводзе “Камінтэрн”: штодзённыя абразы “яўрэйская морда” нікога не здзіўлялі, здзекі з 62-гадовага рабочага яўрэя з боку рабочага не яўрэя – хапаў за валасы, нос, ліў на яго ваду, піхаў, казаў “жыдоўская спіна моцная, на ёй можна пакатацца, жыд па-жыдоўску працуе” успрымаліся як сяброўскія жарты і г. д.[420] Цікавая інфармацыя ўтрымліваецца ў лісце Бабруйскага гаркама КП(б)Б у ячэйку лесазавода № 7 (1926): “У гаркаме маюцца звесткі, што на вашым заводзе каля тэлефоннага апарата была вывешана аб’ява, што размаўляць па тэлефоне на яўрэйскай мове забараняецца. У сувязі з гэтым Гаркам прапаноўвае вам тэрмінова даць тлумачэнне, чыя гэта была ініцыятыва, кім вывешана аб’ява, як на гэта рэагавала ячэйка і чаму вамі аб гэтым выпадку не было паведамлена ў Гаркам. Ваш адказ павінен быць падрабязны і ясны па кожнаму пытанню паасобку”[421].

Антысемітызм у асяродку студэнцтва меў масавы і адзіночны характар, але часцей ён заўважаўся ў дачыненні да яўрэяў-членаў камсамола і КП(б)Б. Напрыклад, з боку студэнтаў і студэнтак Магілёўскага палітасветтэхнікума “назіралася беспадстаўная і сістэматычная траўля і нападкі” на студэнтак-яўрэяк М. Кроль (член ЛКСМ з 1919 г., КП(б)Б з 1928 г.) і Р. Тапаз (кандыдат у члены КП(б)Б). Антысемітызм праявіўся ў ігнараванні з боку аднакурснікаў, неабгрунтаваных дробязных абвінавачаннях у прыватных размовах і на сходах, звадлівых нататках ў сцянную і светлавую газеты, мянушках “мяшчанкі” і “інтэлігенткі” (лічыліся абразлівымі). Курсантка педагагічных курсаў В. Герасімава падчас перапынку напісала на класнай дошцы “бей жидов, спасай Россию”. Першакурснік зямельнага тэхнікума камсамолец Самохін здзекаваўся над сваім таварышам па кватэры (яўрэям) і катаваў яго на працягу года (пра гэта было вядома адміністрацыі тэхнікума, але з камсамола і тэхнікума Самохіна не выключылі)[422]. 14.10.1933 г. група вучняў з 7 асоб, сярод якіх была адна дзяўчына, Славенскай чыгуначнай фабрычна-завадскай сямігодкі Талачынскага раёну пабілі шыбы ў вокнах, узламалі шкафы, знішчылі прылады, напісалі антысеміцкія фразы на сценах яўрэйскай 2-х камплектнай школы[423].

---

[419] Інфармацыйныя зводкі аддзела ДПУ // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 350. Арк. 229–231.

[420] Сакрэтнае інфармацыйнае паведамленне загадчыка інфармацыйнага пададдзела Бабруйскага АК КП(б)Б у ЦК КП(б)Б ад 12.11.1929 г. // Там жа. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 770. Арк. 71.

[421] Сакрэтны ліст Бабруйскага гаркаму КП(б)Б ад 25.09.26 г. // Там жа. Спр. 405. Арк. 51.

[422] *Пушкін І.* Грамадска-палітычныя і міжнацыянальныя адносіны ў сферы падрыхтоўкі кадраў Магілёва // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., 25–26 мая 2017 г., г. Магілёў / уклад. А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. Магілёў, 2017. С. 373–374 ; Дакладная запіска па вучнёўскай моладзі Магілёўскага окротдела ДПУ Бел. // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 695. Арк. 149–153.

[423] Дакладная запіска аб выніках расследавання факта антысеміцкага выступлення групы вучняў Славенскай чыгуначнай ФЗС // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6816. Арк. 6–10.

На раённых канферэнцыях яўрэяк-сялянак Віцебскай акругі ў 1926 г. дэлегаткі адзначалі факты зласлівых адносін з боку сялян-беларусаў да яўрэяў-земляробаў. Яны былі выкліканы тым, што вельмі часта яўрэі, якія атрымалі зямлю, з большага, яе самі не апрацоўвалі – наймалі для правядзення пасяўных і ўборачных работ сялян-беларусаў. У цэлым адносіны паміж яўрэйскімі і беларускімі сем'ямі ў інтэрнацыянальных калгасах былі добрыя, вядомы прыклады ўзаемадапамогі і супрацоўніцтва. Аднак праявы антысемітызму і яўрэйскага шавінізму адзначаліся ў калгасах "Бліўнг", "Праца" Капыльскага раёна, імя Молатава Чэрвеньскага, "Бальшавік" і іншых, асабліва ва ўзаемаадносінах з палякамі[424].

Абследаванне шэрагу раёнаў Віцебскай, Гомельскай, Мазырскай і іншых акруг на прадмет абагульнення вынікаў правядзення нацыянальнай палітыкі ў БССР паказала, што ў асяродку нацыянальных меншасцей адзначаліся побач з антысемітызмам праявы вялікадзяржаўнага (рускага) і яўрэйскага шавінізму, асабліва падчас правядзення беларусізацыі[425].

Шавіністычныя настроі назіраліся сярод часткі служачых беларускай і рускай нацыянальнасцей. У беларусаў – у выглядзе непрыязных адносінаў да служачых, якія не ведалі беларускай мовы, а ў рускіх і яўрэяў – у нежаданні вывучаць беларускую мову. У 1924 г. група настаўнікаў Полацкай акругі, незадаволеная палітыкай беларусізацыі і карэнізацыі, выехала ў Пскоўскую губерню РСФСР. Яны адмовіліся працаваць у школах БССР з-за таго, што "іх дзецям не дазваляюць вучыцца на роднай мове, што тутака … душаць рускую нацыю…"[426]. На пленуме ЦК КП(б)Б 12–15.03.1926 г. былі адзначаны факты праяў беларускага шавінізму ў адносінах да нацменшасцей з боку беларускай інтэлігенцыі[427]. Высокакваліфікаваныя рабочыя польскай нацыянальнасці менавіта на нацыянальнай глебе адмаўляліся вучыць беларусаў і яўрэяў.

У ветэрынарным інстытуце Віцебска: "Яўрэйскае студэнцтва не дазволіла студэнтам палякам размаўляць на польскай мове і гаварыла, што па польску можна гутарыць у калідоры"[428], гучалі выказванні наконт беларускай мовы: "Я гэтай дубовай мовы ня вывучу і за 30 гадоў" (Гомельшчына), "Напрасно тратят время на изучение этого идиотского языка" (Гомель) і інш.[429]

У Бабруйску яўрэі-камсамольцы збілі парабка-беларуса[430]. У Свіслацкім раёне падчас вылучэння сакратаром камсамольскай ячэйкі беларуса, былы

[424] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 25–27.

[425] Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. С. 124,163.

[426] *Силиванчик П. П.* Деятельность коммунистической партии Белоруссии по осуществлению культурной революции в республике (1919–1937). Минск, 1961. С. 48.

[427] Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. С. 125 ; Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. С. 315.

[428] Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы матэрыялаў па нацыянальным пытанні да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091. Арк. 4.

[429] Там жа. Арк. 8.

[430] Справаздачы аб працы нацыянальных саветаў // Там жа. Спр. 109. Арк. 3 ; Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. С. 94.

сакратар (яўрэйскай нацыянальнасці) сімуліраваў падпал і напад на сябе, а абвінавацію у гэтым новага сакратара. Потым стала вядома, што гэтым ён хацеў дыскрэдытаваць хлопца – беларуса[431].

Антыбеларускія праявы выявіліся ў сістэматычных выказваннях сярод аднакурснікаў студэнта 2 курса Магілёўскага зямельнага тэхнікума Д. Мілісіна (беспартыйны, рускі): "Што гэта за Беларуская Рэспубліка, што за мова, якую прымушаюць вучыць, ці не лепш, каб зусім не было гэтай беларускай мовы". Першакурснік зямельнага тэхнікума Рагацкі (беспартыйны, яўрэй, з Віцебскага акругі) таксама ўпарта не жадаў размаўляць і здаваць залікі на беларускай мове, тлумачачы гэта цяжкасцю, а тым часам лекцыі, якія выкладаліся па-беларуску, ён выдатна перакладаў і запісваў на рускай мове. Ф. Казанцаў (рускі) не верыў у сацыялістычнае будаўніцтва, асабліва ў Беларусі, заяўляючы, што Беларуская Рэспубліка не зможа аўтаномна існаваць за адсутнасцю ў ёй фабрык, заводаў і недахопу свайго хлеба, таму лічыў мэтазгодным далучыць Беларусь да РСФСР. Як з'явіўся цыркуляр НКА БССР аб прыняцці ў тэхнікумы (нав. установы) пэўнай квоты (працэнтаў) беларусаў, адразу адбыліся выпадкі абурэння, што працэнт беларусаў не зніжаюць і гэта "пахне анцісемітызмам" (зямельны тэхнікум Магілёўскай акругі)[432]. У Глуску яўрэі камсамольцы скардзіліся, што цяпер яўрэяў менш вылучаюць на кіруючыя пасады, у асноўным гэта робяць з ліку беларусаў. Казалі: "Добра, калі б мы дастаткова валодалі рускай і беларускай мовамі, тады б нас вылучалі на кіруючую працу, у іншым выпадку ў нас гэта не атрымаецца"[433].

На працягу 1920 – першай паловы 1930-х гадоў пытанне аб міжнацыянальных непаразуменнях увогуле і антысемітызме ў прыватнасці, не аднойчы, разглядалася на самым выокім узроўне. Праявы антысемітызму лічыліся савецкай уладай як дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне нянавісці на нацыянальнай глебе і класіфікаваліся ў адпаведнасці з законам як дзяржаўныя злачынствы. Так, у зусім сакрэтных запісках дзяржаўнага кіраўніцтва БССР (1928) адзначалася: "Гэта з'яўляецца вельмі характэрным для дадзенага перыяду і не падлягае ніякаму сумненню, што адзначанае ўзмацненне антысеміцкіх праяў з'яўляецца вынікам агульнага пад'ёму актыўнасці антысавецкіх элементаў..."[434]. Там жа ўлады падкрэслівалі, што найбольш антысеміцкім настроям падвержаны рускія (у дакументах "москали"), пасля іх палякі, украінцы, толькі затым беларусы. Шматлікія праявы антысемітызму прывялі да з'яўлення 06.07.1929 г. сакрэтнага Цыркуляра ЦВК БССР "Аб барацьбе з антысемітызмам"[435].

Органамі ДПУ быў арганізаваны збор агентурнай інфармацыі аб праявах антысемітызма ва ўсіх пластах савецкага грамадства, з выхаваўчай мэтай

[431] Інфармацыйны ліст № 4 Бабруйскага акружкома ЛКСМБ ад 28.05.1926 г. // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 204. Арк.15.
[432] Ліст Адміністратыўнага аддзела Магілёўскага АВК ад 05.10.1929 г. // Там жа. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 588. Арк. 37.
[433] Інфармацыйны ліст № 4 Бабруйскага акружкома ЛКСМБ ад 28.05.1926 г. // Там жа. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 204. Арк.15.
[434] Дакладная запіска аб фактах антысемітызма за 1928 г. // ДАВц. Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 705. Арк. 15.
[435] Цыркуляр ЦВК БССР і матэрыялы да яго // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 62. Арк. 283–305.

праводзіліся паказальныя працэсы супраць антысемітаў, апошнія атрымлівалі розныя спагнанні[436].

Варта падкрэсліць, што нягледзячы на супрацьдзеянне антысемітызму, партыйна-савецкае кіраўніцтва не заўжды знаходзіла падтрымку з боку яўрэйскага насельніцтва. У канторы Лесбела (1927) служачы А. Гозбін выказаўся: "Партыйцы перарадзіліся. Большасць з іх не ідэйныя, а шкурнікі… Усе рускія камуністы страшэнныя антысеміты і гэта назіраецца ў Магілёве". Студэнт педтэхнікума яўрэй І. Шульман на курсавым камсамольскім сходзе заявіў, "што ў нас пасады і працу атрымоўваюць толькі партыйцы і камсамольцы. Усе партыйцы – шкурнікі. Яны глядзяць толькі на тое, каб атрымаць пабольш пенсіі, а на тое, што на біржах працы тысячы беспрацоўных, яны не звяртаюць увагу". Яўрэі-рабочыя не толькі словамі, але і дзеяннямі выказвалі свой пратэст. У 1927 г., пасля таго як Троцкага і Зіноўева выключылі з КП(б), у клубе будаўнікоў знялі іх партрэты. Аднак рабочыя прынеслі і павесілі іх назад. Пры гэтым папярэдзілі: "Калі хто пасмее зняць гэтыя партрэты, у таго здымем галаву – яны нашы абаронцы" [437]. Настроі магілёўцаў яўрэйскай нацыянальнасці адлюстраваны ў выказваннях рабочых друкарні ў Магілёве, якія, гаворачы наконт "дабраахвотных" складак, падкрэслівалі: "Нашы кіраўнікі душаць рабочы клас… толькі і ведаюць, што браць усемагчымыя адлічэнні, ахвяраванні… рабочыя іншых краін жывуць значна лепей, чым мы, нягледзячы на тое, што ў іншых краінах існуе імперыялізм, а мы жывем у савецкай краіне". Далей – болей: "Калі пачнецца вайна, дык я ўпэўнены, што больш дурняў не будзе і ніхто не пойдзе абараняць савецкую ўладу, бо рабочыя зразумелі, што савецкая ўлада – адзін падман", "…як можна мірыцца з існаваннем такой улады. Я чакаю і не магу дачакацца калі, урэшце, нас пазбавяць ад яе", "…кажуць, што мы ідзем да сацыялізму, а мне здаецца, што на дзесятым годзе рэвалюцыі, мы ідзем не да сацыялізму, а да прыгоннага права…"[438].

Дасягнуўшы свайго апагея ў 1929 – пачатку 1930 г., кампанія барацьбы з антысемітызмам стала слабець, пакуль не патухла зусім. Даволі цяжка ацаніць эфектыўнасць адміністрацыйных і крымінальных мераў уздзейнічання для аслаблення канфліктаў, але тое, што насельніцтва вымушана было ўстрымлівацца ад публічных выступаў, спрыяла зніжэнню адкрытай міжэтнічнай канфрантацыі[439].

Змены ў нацыянальнай палітыцы ў другой палове 1930-х гг. прывялі да абвастрэння міжнацыянальных адносін. Так, напрыклад, рэарганізацыя яўрэйскіх школ і пастаноўка пытання аб рэарганізацыі нацыянальнага савета ў м. Колышкі Лёзненскага раёна, паслужылі сігналам для антысеміцкіх праяваў з боку

---

[436] *Романова И.* Отношение белорусов к евреям в связи с социально-политическими изменениями в межвоенный период // Материалы Десятой Ежегодной Международной Междисциплинарной конференции по иудаике. Часть 1 / Академическая серия. Вып.12. М., 2003. С.11–12.

[437] История Могилёвского еврейства: Документы и люди: науч.-популяр. очерки и жизнеописания. В 2-х кн. Кн. 2. Ч. 1. С. 226–228.

[438] Інфармацыйныя зводкі аддзела ДПУ // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 350. Арк. 70, 124, 194 ; История Могилёвского еврейства: Документы и люди: науч.-популяр. очерки и жизнеописания. В 2-х кн. Кн. 2, ч. 1. С. 236–238.

[439] *Зельцер А.* Евреи советской провинции: Витебск и местечки. С. 227.

кіраўніцтва сельсавета. Апошняе адказнасць за адсутнась хлеба ў краме ўсклала на мясцовых яўрэяў, абвінаваціла іх у спекуляцыі і на падставе гэтага правяло арышты. У дакладной запісцы па выніках расследавання гэтых падзей, паведамлялася: "Гэтыя масавыя арышты, у значнай частцы сваёй зусім неабаснаваныя, выклікалі сярод яўрэйскага насельніцтва моцны перапалох. Некаторыя главы яўрэйскіх сямей пачалі хавацца па чужых кватэрах, боючыся арышту". На шмат якіх хатах і калгасным амбары былі зроблены надпісы "Усе жыды спекулянты". У мястэчку цыркулявалі чуткі, што "хутка выганяць усіх яўрэяў з мястэчка, яўрэйскую школу закрылі, а зараз закрыюць нацсавет, шмат яўрэяў арыштавалі, а астатніх разгонім, як разагналі іх у Германіі"[440]. Савецкая ўлада забяспечыла поўнае раўнапраўе яўрэяў у адукацыйнай, сацыяльнай, культурнай і іншых сферах жыццядзейнасці грамадства. Аднак абвяшчэнне ў сярэдзіне 1930-х гг. аб вырашэнні "яўрэйскага пытання" было заўчасным.

Такім чынам, у асяродку нацыянальных меншасцей грамадскія настроі можна падзяліць на тры групы. Першая – абсентысцкія (абыякавыя), характэрныя для насельніцтва, якое ставіла перад сабой мэту выжывання ў любых умовах. Другая – канфармісцкія, уласцівыя асобам, якія прыстасоўваюць сваё жыццё да рэальнасці і спадзяюцца атрымаць сваю частку ўлады, дабрабыту ў існуючых сістэмах. Трэцяя – настроі агітацыйнага супраціву, характэрныя асобам актывісцкага тыпу паводзін, якія былі незадаволены працэсам фарміравання "новай, бальшавіцкай" рэчаіснасці.

Грамадскія і міжнацыянальныя адносіны засведчылі праявы незадавальнення, агітацыйнага супраціву насельніцтва Савецкай Беларусі, якія праяўляліся: у эканамічнай сферы па прычыне беспрацоўя, нізкага заробку; у палітычнай сферы з-за фарміравання аднапартыйнасці і ліквідацыі іншадумства; у сацыяльнай сферы ў выніку парушэння правоў працоўных і фарміравання непадкантрольнай народу партыйнай наменклатуры; у ідэалагічнай сферы, калі дзеля захавання ўлады паплечнікі станавіліся ворагамі (адносіны да "старых" камуністаў, "царскіх" кадраў-спецыялістаў), а ворагі сябрамі (гітлераўскі нацызм); у духоўнай сферы, справакаваныя змаганнем з рэлігіяй і закрыццём храмаў.

**Дэпартацыі і палітычныя рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей.** Разам з тытульным народам БССР нацыянальныя меншасці зведалі жахі савецкіх рэпрэсій[441], асабліва ў перыяд 1926–1939 гг., на які прыпадаюць масавыя добраахвотна-прымусовыя міграцыі насельніцтва і палітычныя рэпрэсіі. Прычым найбольш яны абрынуліся на людзей этнічна і сацыяльна актыўных.

Рэпрэсіі ў Савецкай Беларусі па нацыянальнай прыкмеце пачынаюцца яшчэ ў 1920-х гг. і закранулі працаўнікоў чыгуначнага транспарту. ЦК КП(б)Б 03.06.1922 г. прызнала "неабходным правесці чыстку Жэлдора і Пачцеля (прафсаюзаў) ад польскага і іншага ненадзейнага элемента..."[442]. Першае высяленне (дэпартацыя) польскага насельніцтва з тэрыторыі Віцебшчыны, якая на той час была ў складзе

[440] Лісты і заявы грамадзян, дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 14781. Арк. 22–62.
[441] Аўтар выказвае шчырую падзяку даследчыцы І. Раманавай за прадастаўлены архіўны матэрыял.
[442] Ліст ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 693. Арк. 46.

РСФСР, адбылося яшчэ ў маі – чэрвені 1920 г.[443] У 1923 г. на аснове загада Наркамата шляхоў зносін была створана "Асобая камісія па чыстцы транспарту ад усялякага падазронага элемента і агентаў польскай, латвійскай, літоўскай, румынскай і фінскай нацыянальнасцей". У выніку яе дзейнасці звальненню толькі з Заходняй чыгункі, якая была прызнана прыфрантавой, падлягалі каля 1 тыс. чалавек[444]. У 1927 г. была праведзеная чыстка ад "нядобранадзейнага элемента" Заходняй і Маскоўска–Беларуска–Балтыйская чыгунак[445]. Хтосьці з нацыянальных меншасцей лічыліся носьбітамі варожай марксізму-ленінізму ідэалогіі – сіянізму, клерыкалізму, іншыя разглядаліся як прадстаўнікі народаў, якія ў сябе на радзіме "будуюць капіталістычныя дзяржавы"[446].

Шырокамаштабнымі былі ўнутраныя міграцыі, якія мелі як добраахвотны, так і вымушаны характар. Вялікія памеры набылі перасяленні яўрэяў з Савецкай Беларусі ў Крым і Бірабіджан[447]. Калектывізацыя і звязаныя з ёй высылкі заможных сялян на Урал, поўнач Расіі, у Сібір і іншыя рэгіёны СССР пацягнулі за сабой разбурэнне традыцыйных укладаў жыцця, сем'яў, дзіцячую безнагляднасць, голад 1933 г. У гэты час назіраліся масавыя выезды за межы Беларусі сялян–аднаасобнікаў, якія кідалі свае гаспадаркі і сем'і, ратаваліся ад раскулачвання і калгасаў. Узрасла інтэнсіўнасць добраахвотных міграцый насельніцтва ў раёны буйных прамысловых будоўляў, перш за ўсё на Ўрал і ў Сібір. Міграцыйныя страты ў перыяд паміж перапісамі 1926 і 1939 гг. склалі 617 тыс. чалавек[448].

Вясной 1930 г. адбылося масавае высяленне насельніцтва польскай нацыянальнасці (кулакоў, шляхты і г.д.) з памежных акруг БССР: Полацкай, Мінскай, Бабруйскай, Мазырскай[449]. Усяго каля 9 тыс. чал. На гэтым улады не спыніліся. У 1936 г. у мэтах умацавання дзяржаўных межаў выкарыстоўваліся перасяленні "неблаганадзейнага элемента" з 500–мятровай пагранпаласы ў тылавыя раёны БССР. У яго лік якраз і траплялі, у першую чаргу, палякі, часткова латышы і літоўцы.

У сваю чаргу, добраахвотнікі (камуністы, камсамольцы, стаханаўцы, актывісты, у пераважнай большасці беларусы, яўрэі і рускія), якія праходзілі пільную ідэалагічную праверку, накіроўваліся ў памежныя раёны.

Адметнай асаблівасцю масавых рэпрэсій 1930-х гг. стала правядзенне так званых "нацыянальных аперацый", скіраваных супраць нацыянальных меншасцей. Складовай часткай рэпрэсій па нацыянальнай прыкмеце стала пашпартызацыя насельніцтва і ўвядзенне рэжыму прапіскі. Падчас пашпартызацыі ўсе дадзеныя аб прадстаўніках нацыянальных меншасцей або

---

[443] *Анисяев М.А.* Организация борьбы с дезертирством на Западном фронте в 1919–1920 гг. // Віцебскі край: матэрыялы ІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 24.11.2016 г., г. Віцебск. Мінск, 2017. С. 11.
[444] Інфармацыйныя зводкі аб правакацыйных выступах сярод насельніцтва БССР // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1245. Арк. 116–117 ; *Раманава І.М.* Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны перыяд // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 228.
[445] Выпіскі з пратаколаў // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3034. Арк. 274.
[446] *Пушкін І.* Дэпартацыі і перасяленні ў БССР у 1920–1930-я гг. // Дэпартацыя як сацыяльная праблема: Тэматычны зборнік навуковых прац / Нав. рэд. С.А. Яцкевіч. Брэст, 1997. С. 22.
[447] Матэрыялы яўсекцыі // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 374. Арк. 60–94 ; Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 495. Арк. 28.
[448] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё . С. 283.
[449] *Пушкін І.* Дэпартацыі і перасяленні ў БССР у 1920–1930-я гг. С. 22.

прыбылых з-за мяжы (незалежна ад нацыянальнасці) перадаваліся ў аддзелы НКУС, дзе ў пэўных выпадках толькі на падставе нацыянальнасці выдаваліся даведкі на арышт. Калектывізацыя, раскулачванне (атаясамленне паляка і шляхціча з кулаком), рост эміграцыйнага руху (найперш нелегальных пераходаў у Польшчу), умацаванне пагранічнага рэгіёна (у тым ліку шляхам разрыву роднасных сувязей) прывялі да того, што першай ахвярай чыстак па нацыянальнай прыкмеце сталі палякі[450].

Так, у выніку "праведзенай органамі ДПУ працы па раскрыцці паўстанцкіх і шпіёнскіх арганізацый сярод польскага насельніцтва", у 1929 г. з БССР было выселена 1,5 тыс. польскіх сем'яў[451]. 05.03.1930 г. было прынята рашэнне Палітбюро аб высылцы 3–3,5 тыс. асоб "кулацка-бандыцка-польскага элементу"[452]. Адзначалася, што таксама дэпартацыі падлягаюць шляхецкія сем'і, незалежна ад іх матэрыяльнага становішча, чыё знаходжанне ля граніц лічыцца АДПУ і мясцовымі партыйнымі арганізацыямі небяспечным[453]. Адбылося масавае высяленне насельніцтва польскай нацыянальнасці (кулакоў, шляхты і г. д.) з памежных акруг БССР: Полацкай, Мінскай, Бабруйскай, Мазырскай[454]. Усяго каля 9 тыс. чал. Але, важна адзначыць, што палітыка ў цэлым у адносінах да палякаў не працярпела зменаў (у 1932 г. уздоўж беларуска-польскай мяжы ўзнік новы польскі нацыянальны Дзяржынскі раён у складзе 10 нацыянальных польскіх сельскіх саветаў).

Ускладненне міжнароднай сітуацыі 1933–1934 гг. самым непасрэдным чынам адбілася на адносінах савецкай улады да нацыянальных меншасцей: тыя з іх, гістарычныя радзімы якіх мелі агульную мяжу з СССР, аўтаматычна пераўтвараліся ў "пятую калону" імперыялізма і падлягалі прэвентыўна рэпрэсіям. У кастрычніку 1933 г. паўнамоцны прадстаўнік АДПУ у Беларусі і будучы наркам унутраных спраў рэспублікі Л. Закоўскі дакладваў І. Сталіну, што ў БССР ўскрыты шэраг філіялаў Польскай арганізацыі вайсковай (ПОВ), сярод ахопленых яе ўплывам быў названы шэраг чыгуначных вузлоў (Магілёўскі, Жлобінскі, Асіповіцкі)[455].

Зварот нямецкага насельніцтва ў гады голада за гуманітарнай дапамогай у Германскія консульствы Кіева і Масквы паслужыў падставай для правядзення шэрагу аперацый супраць "фашысцкіх шпіёнаў і агентаў". Толькі ў Нараўлянскім раёне ў 1934 г. арыштавана было 80 чалавек. Суд прыгаварыў да расстрэлу 5 чалавек "актыўных агентаў Германскага фашызму", 9 чалавек былі прыгавораны да пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР на тэрмін ад 10 да 5 гадоў і

---

[450] *Terry Martin.* The Affairmative Action Empire: Nations and Nationalism in the Soviet Union, 1923-1939. Ithaca, NY and London: Cornell University Press, 2001. P. 323.

[451] Інфармацыйная зводка ДПУ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп.1. Спр. 5568. Арк. 5–6.

[452] *Замойскі А.С.* Да пытання аб сацыяльна-эканамічным становішчы нацыянальных меншасцей савецкай Беларусі ў 1920-я гады. С. 219.

[453] *Terry Martin.* The Affirmative Action Empire: Nations and Nationalism in the Soviet Union, 1923–1939. P. 322

[454] *Пушкін І.* Дэпартацыі і перасяленні ў БССР у 1920–1930-я гг. С. 22.

[455] *Мозохин О.* ВЧК–ОГПУ. Карающий меч диктатуры пролетариата. М., 2004. С. 420.

адзін чалавек быў апраўданы[456]. У 1937 г. арышты "за консульскія сувязі" былі працягнуты.

Рэпрэсіі дасягнулі свайго апагея ў 1937–1938 гг. У ліпені 1937 г. палітбюро ЦК КП(б)Б пастанавіла "дать немедля приказ по органам НКВД об аресте всех немцев, работающих на заводах". 25.07.37 г. з'явіўся адпаведны загад, які тычыўся ўсіх германскіх падданых, 30.07.37 г. цыркуляр у адносінах да ўсіх савецкіх грамадзян нямецкай нацыянальнасці[457]. У жніўні 1937 г. былі прыняты аналагічныя рашэнні адносна палякаў, латышоў, эстонцаў і некаторых іншых нацыянальнасцей. Гэта было зроблена ў адпаведнасці з пастановай Палітбюро ЦК УсеКП(б) ад 09.08.1937 г. Найбольш буйной акцыяй стала аперацыя па загаду НКУС СССР № 00447 ад 30.07.1937 г. Згодна з ім рэпрэсіям падлягалі: былыя кулакі, царкоўнікі і сектанты, былыя актыўныя ўдзельнікі антысавецкіх узброеных выступленняў, кадры антысавецкіх палітычных партый і г. д. Гэта была найбольш масавая па колькасці арыштаваных і расстраляных акцыя. Фактычна аднačасова з ёю быў праведзены яшчэ шэраг спецыяльных аперацый НКУС супраць прадстаўнікоў пэўных нацыянальнасцей па ўсім СССР. Сярод іх: па ліквідацыі мясцовых арганізацый "Польскай арганізацыі вайсковай" (праводзілася на адставе загада НКУС ад 11.08.1937), аперацыя ў адносінах перабежчыкаў з Латвіі, актывістаў латышскіх клубаў і грамадстваў (дырэктыва НКУС ад 30.11.1937), аналагічная па эстонцах, літоўцах і інш. (дырэктыва НКУС ад 14.12.1937). Падчас правядзення гэтых аперацый у раёнах, якія непасрэдна прылягалі да мяжы, і ў важных стратэгічных пунктах (напрыклад, Мінск) высяленню падлягалі ўсе палякі, латышы і немцы, уключаючы актывістаў савецкай улады і партыйцаў. У раёнах, якія знаходзіліся далей ад мяжы, кампанія насіла выбарчы характар – высяляліся жыхары вёсак, размешчаных на стратэгічных тэрыторыях, напрыклад, на чыгуначных станцыях[458].

У загадзе на поўную ліквідацыю мясцовых арганізацый прыдуманай, сфальсіфікаванай "Польскай арганізацыі вайсковай" (ПАВ) прадпісвалася: "Арышту падлягаюць: а) выяўленыя ў працэсе следства і па сённяшні дзень не адшуканыя актыўныя члены ПАВ згодна прыкладзенага спісу; б) усе застаўшыяся ў СССР ваеннапалонныя польскага войска; в) уцекачы з Польшчы, незалежна ад часу іх перахода ў СССР; г) палітэмігранты і палітабмененыя з Польшчы; д) былыя члены ППС і іншых польскіх антысавецкіх палітычных партый; е) найбольш актыўная частка мясцовых антысавецкіх нацыяналістычных элементаў польскіх раёнаў"[459]. Усіх прадпісывалася адразу, неадкладна арыштоўваць.

У ліпені–жніўні 1937 г. на Беларускай чыгунцы было "выкрыта некалькі шпіёнска-дыверсійных гнёздаў і шырока разгалінаваная япона-нямецкая, трацкісцка-бухарынская шкодніцкая арганізацыя". Сярод асабліва значных

---

[456] *Раманава І.* Голад 1932–1934 гг. і Беларусь // Спадчына. 2003. № 1–2. С. 80–90.
[457] *Дзядзінкін А.Л.* Рэпрэсіі другой паловы 1920–1930-х гадоў як адзін са сродкаў ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі савецкай улады на Беларусі // Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. 2003. № 4. С. 34–35.
[458] *Iwanow M.* Pierwszy naród ukarany: Polacy w Związku Radzieckim, 1921–1939. Warszawa, 1991. S. 374 ; *Wialiki Anatol.* „Operacja polska" w BSRR. Lata 1937–1938. Początek, Przebieg, Rezultaty // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 195–220.
[459] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы ХХ столетия). С. 40–41.

гнёздаў ворагаў называліся буйныя чыгуначныя вузлы (Гомель, Магілёў, Жлобін, Асіповічы, Унеча, Крычаў, Слуцк). Сакратару ЦК КП(б)Б Волкаву дакладвалі, што сярод выкрытых шпіёнска-дыверсійных і шкодніцкіх арганізацый асаблівае месца займае "Польская арганізацыя вайсковая", якая мела сваёй мэтай шпіянаж, арганізацыю дыверсій і тэрору, нацыянальна-фашысцкую апрацоўку палякаў, якія жывуць на найважнейшых участках дарогі. Акрамя таго, дакладвалася, што ў Гомелі выяўлена контррэвалюцыйная "Паўстанцкая арганізацыя". У дакладной прыводзіліся наступныя факты, якія, на думку складальнікаў гэтага дакумента, з'яўляліся пераканаўчымі доказамі варожай дзейнасці: "Арыштаваны нейкі Навакоўскі, шпіён, які састаяў у дадзенай арганізацыі, прызнаваў: "Я ўсё жыццё не пераварваю рускіх". Былы старшыня дарожнага камітэту прафсаюзу рабочых чыгуначнага транспарту Іваноў, раскрыты як актыўны член "ПАВ", пры разборы яго справы на пасяджэнні парткома ўпраўлення дарогі заявіў: "Калі за што мяне трэба асуджаць, дык за тое, што я нарадзіўся ў Польшчы. Сённі аба мне разбіраецца пытанне як вынік паклёпу, ці за тое, што я нарадзіўся ў Польшчы… Былы конторшчык распарадчага аддзела ст. Гомель Мілановіч, зараз арыштаваны як антысавецкі элемент, выказваўся: «Яшчэ Польша не сгінэла, пакуль мы жывём»"[460].

Уяўленне аб тым, як вёўся пошук агентуры, можа даць вытрымка з наступнага дакумента: "…б. нач. райаддзела УДБ Валавік (зараз працуе ў Бабруйскім аддзеле УДБ) паўторна склікаў аператыўных працаўнікоў і ўказаў, што Рэчыцкаму раёну дадзена заданне выявіць і арыштаваць 300 чалавек вышэйадзначаных нацыянальнасцей [палякаў, латышоў, немцаў і інш.], для чаго даў заданне выявіць па прадпрыемствах і сельсаветах такіх асоб"[461].

У ходзе аперацый супрацоўнікі органаў "ускрывалі" "шырока разгалінаваныя сеткі дыверсійна-паўстанцкіх арганізацый", "шпіёнска-дыверсійныя гнёзды" і шырока разгалінаваныя шкодніцкія арганізацыі і г. д. Так, "выяўленая" ў Віцебску Польская арганізацыя вайсковая "мела сваіх прадстаўнікоў на транспарце, у паравозным дэпо, у водаканале, на буйных прадпрыемствах горада (фабрыка імя Кагановіча, лесазавод № 3, аддзел харчгандлю, інвалідная каапірацыя), у авіябрыгадзе, шпіёны і дыверсанты займалі адказныя пасады ў самім апараце гарадскога камітэта партыі, камсамола, стварылі ў 21 польскай школе польска-нямецкую шпіёнскую рэзідэнтуру" і г. д.[462] Кіраўніцтва апошняй прыпісвалася ксяндзу С. Райко.

Палітычны тэрор выклікаў разгубленасць і панічны страх перад органамі НКУС. Але не ўсё насельніцтва адназначна ўспрымала падобныя дзеянні ўладаў. Напрыклад, шмат хто з палякаў ухваляў барацьбу са "шпіёнамі, дыверсантамі, шкоднікамі". У гэты час павялічылася колькасць даносаў у органы НКУС БССР.

У разгар масавых рэпрэсій Наркам унутраных спраў БССР Б. Берман у сваёй запісцы ў ЦК КП(б)Б ад 20.10.1937 г. адзначаў: "Практычная дзейнасць

[460] Дакладныя запіскі палітаддзелаў Беларускай чыгункі // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12089. Арк. 36, 37, 38, 42.
[461] Дакладныя запіскі і спецданясенні аб працы суда і пракуратуры БССР // Там жа. Спр. 14647. Арк. 19.
[462] Дакладная запіска аб шкоднай дзейнасці контррэвалюцыйных арганізацый у БССР // Там жа. Спр.12058. Арк. 147–151.

контррэвалюцыйных фарміраванняў, якія актыўна дзейнічалі на Беларусі і яе пагранічных раёнаў рагортвалася, галоўным чынам, у напрамку: разведвацельнай працы на карысць палякаў і немцаў, падрыхтоўкі паўстанцкіх кадраў і стварэння апорных пунктаў для фашысцкіх інтэрвентаў"[463].

"Выбарчы агляд" 154 хутароў, размешчаных у 7,5-кіламетровым памежным пасе Заслаўскага, Мінскага і Уздзенскага раёнаў, які быў праведзены ў 1937 г. спецорганамі, "высветліў": 75 двароў мелі родных у Польшчы, а гаспадары 118 двароў "складаюць контррэвалюцыйны актыў, які праводзіць антыкалгасную працу". "Контррэвалюцыйны актыў" быў выяўлены сярод насельнікаў хутароў у памежнай зоне Капыльскага і Старобінскага раёнаў. Адзначалася таксама, што "асаблівае значэнне маюць хутарскія гаспадаркі ў справе падрыхтоўкі польскай разведкай паўстанцкіх груп і арганізацый да моманту вайны паміж Польшчай і СССР". Звыш 100 жыхароў хутароў Старобінскага раёна былі прыцягнутыя да адказнасці па справе паўстанцкай арганізацыі "Беларуская Рэвалюцыйная Партыя"; на тэрыторыі гэтага ж раёна "была раскрыта" паўстанцкая арганізацыя "створаная агентамі польскай разведкі", тое ж самае было "выяўлена" і на хутарах Ветрынскага, Чырвонаслабадскога, Ельскага, Бягомльскага і Лельчыцкага раёнаў. У справаздачы НКУС адзначалася: "Калі трэба, колькасць гэтых прыкладаў можна значна павялічыць… па справах польскіх шпіёнаў і паўстанцкіх арганізацый няма амаль ніводнай, дзе б не праходзілі, як актыўныя ўдзельнікі, жыхары хутароў, а самі хутары – як явачныя кватэры і пункты пераправаў". Такія справы складалі да 70 % ад агульнай лічбы[464].

Наркам унутраных спраў прыводзіў наступныя дадзеныя: у вёсцы Тонеж Тураўскага раёна, якая складалася з 80 двароў пасля праведзеных арыштаў усё мужчынскае насельніцтва складала 3 чалавекі; у калгасе "Красноармеец" Плешчанічскага раёна з 29 мужчын у канцы 1937 г. і пачатку 1938 г. было арыштавана 23[465].

Савецкая ўлада ўзмацніла рэпрэсіі супраць святароў і рэлігійнага актыва. Абсалютная большасць ксяндзоў да жніўня 1937 г. была арыштаваная па абвінавачванню ў шпіёнскай працы. Толькі за тры месяцы 1938 г. былі рэпрасаваны 6530 чалавек : палякаў – 2663 чал., беларусаў – 2717, украінцаў – 68, рускіх – 61, яўрэяў – 375, немцаў – 152, латышоў – 400, літоўцаў – 56, эстонцаў – 12, іншых – 26. Сярод іх было 7 служыцеляў культу, 778 асобаў каталіцкага касцёльнага актыву[466]. Касцёльны актыў складаў: у катэгорыі рэпрасаваных рабочых 50 з 196 чал., служачых 93 з 629, калгаснікаў 258 з 1124 чал.[467] За 1937 і 1938 гг. было "усяго арыштавана і асуджана 3247 царкоўнікаў і сектантаў, з іх звыш 400 чалавек папоў і манахаў, 1 мітрапаліт і 5 архіепіскапаў"[468]. Рэпрэсіі

---

[463] Дакладная запіска Б. Бермана // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12055. Арк. 96.
[464] Справаздача НКУС // Там жа. Арк. 87–91.
[465] Спецпаведамленні НКУС БССР // Там жа. Спр. 13230. Арк. 199.
[466] Статыстычныя звесткі рэпрэсаваных шпіёнаў, дыверсантаў і паўстанцаў польскай, літоўскай і нямецкай выведак за 01.06.1938 – 01.09.1938 г. // Там жа. Спр. 14609. Арк. 2, 4.
[467] Там жа. Арк. 5–7.
[468] Дакладная запіска НКУС "Аб антысавецкай дзейнасці царкоўнікаў і сектантаў ў БССР" на 21.06.1938 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 13219. Арк. 57.

закранулі старабрадцаў “У Гомелі і навакольных раёнах існуе арганізацыя стара-царкоўнікаў, ... якая налічвала да моманту ліквідацыі 58 удзельнікаў, з іх 18 папоў” (Левашоў, Шамко, Гінтаўт і інш.)[469].

Як адзначалася ў дакладной НКУС па выніках аперацый па ліквідацыі польскай, нямецкай і латышскай агентуры ў БССР, якія доўжыліся са жніўня 1937 г. па верасень 1938 г., па польскай аперацыі было ліквідавана 467 польскіх шпіёнскіх рэзідэнтур, арыштавана 13042 польскіх шпіёнаў; па нямецкай аперацыі 224 чалавек праходзілі па графе “консульскія сувязі і адзіночкі шпіёны”, 102 чалавекі як удзельнікі 18 шпіёнскіх груп; па латвійскай аперацыі было ліквідавана 43 шпіёнскія рэзідэнтуры з колькасцю ўдзельнікаў 247, 150 консульскіх сувязей, 275 – шпіёнаў-адзіночак.

Усяго былі арыштаваныя 21407 “польскіх шпіёнаў, дыверсантаў і ўдзельнікаў паўстанцкіх арганізацый”, 563 чалавекі “нямецкай агентуры”, 1459 – латышскай[470]. З агульнага ліку арыштаваных каля 19 тыс. чалавек да канца 1938 г. было асуджана да расстрэлу. Пагранічнае становішча былога польскага нацыянальнага раёна (Дзяржынскага) прадвызначыла лёс яго жыхароў – амаль усе яны былі рэпрэсаваныя. Антыпольскія рэпрэсіі ахапілі таксама частку каталікоў, якія раней уладамі кваліфікаваліся як “беларусы-каталікі”. Па нацыянальнасці “агентура” размяркоўвалася наступным чынам: беларусаў – больш за 10 тыс., палякаў – больш за 9 тыс., яўрэяў (у асноўным, палітэмігранты і перабежчыкі з Польшчы) – больш за 1 тыс., латышоў – больш за 1 тыс., немцаў – больш за 0,5 тыс., рускіх – каля 400, украінцаў і літоўцаў – прыкладна па 200 чалавек, больш за 100 іншых.

У рэпрэсіях 1937 г. галоўнай падставай для арышту, згодна загада НКУС СССР, было абвінавачванне ў польскім шпіянажы, а ў 1938 г. сама прыкмета прыналежнасці да польскай нацыянальнасці магла быць падставай для арышту асобаў, якіх падазравалі ў шпіянажы. У БССР “польскай” аперацыяй у 1938 г. непасрэдна кіраваў начальнік 3-га (контрвыведка) аддзела упраўлення дзяржаўнай бяспекі НКУС БССР яўрэй А. Гепштэйн, які, імкнучыся выканаць план па раскрыццю шпіёнаў, наладзіў строгі кантроль за агентурнымі данясеннямі. І як толькі ў іх было пазначана, што падазроны з’яўляецца па паходжанні палякам, немцам або латышом, адразу накладваў рэзалюцыю “арыштаваць”[471]. А. Гепштэйн на допыце 07.03.1939 г. паказаў: “Лінія на арышт у першую чаргу палякаў прывяла ў рэшце рэшт да таго, што на месцах пры складанні даведак на арышт, часта на падставе толькі таго, што ў чалавека польскае прозвішча ці імя ва ўстановачных дадзеных за вочы пісалі “паляк”, ведаючы, што пры гэтым Мінск абавязкова дасць санкцыю на арышт”[472].

---

[469] Там жа. Арк. 60–61.

[470] *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск, 1994. С. 55–56.

[471] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы ХХ столетия). С. 44–46 ; *Раманава І.М.* Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны перыяд // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 231.

[472] Абвінаваўчае заключэнне і прысуд Ваеннага трыбунала і войск НКУС БССР на А. Гепштэйна // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 14877. Арк. 10.

У 1938 г. НКУС сабраў даведкі на ўвесь камандны склад вайсковых кадраў БВА. Справы вайскоўцаў, якія нарадзіліся за мяжой ці мелі там родных, перадаваліся на разгляд "двоек" з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі[473].

У выніку гістарычнага мінулага Беларусі, а таксама падзелу краіны паводле ўмоваў Рыжскай мірнай дамовы паміж Польшчай і СССР (які меў вынікам разрыў не толькі суседскіх сувязей, але і сваяцкіх), відавочна, пошукі шпіёнаў сярод "чужых" (г. зн. прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей) тычыліся ў значнай ступені і "сваіх" (беларусаў). Так, наркам унутраных спраў Наседкін 13.12.1938 г. паведаміў сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка, што падчас арыштаў 1937 – першай паловы 1938 гг. "…з узятых асоб па польскай лініі – чыстых палякаў было вынята не больш 35–40 %, а астатнія былі беларусы, рускія, яўрэі, украінцы і г.д. На мае заўвагі начальнік 3-го аддзела Гепштэйн заявіў, што беларусы ва ўмовах Беларусі, якая мяжуе з Польшай, узяты хоць і ў большым працэнце, чым палякі, аднак гэтыя ўсе арыштаваныя ўзяты абсалютна правільна"[474].

У гэтай жа запісцы Наседкін адзначае, што асноўны ўдар НКУС БССР быў накіраваны па польскай лініі, і вельмі нязначны – па латышах, немцах, трацкістах, правых, нацдэмах, сіяністах, бундаўцах і г. д. Недастатковая колькасць арыштаваных "шпіёнаў" і "агентаў" сярод латышоў падкрэслівалася і ў іншых дакументах.

У сувязі з гэтым аператыўным работнікам сталіцы было загадана на працягу адных сутак "выклікаць у аддзяленне міліцыі па месцу жыхарства пад усялякімі маркамі ўсіх латышоў, якія пражывалі ў горадзе Мінску і апытаць іх". Пасля заканчэння апытанняў у той жа дзень былі складзены даведкі на арышт усіх ураджэнцаў Латвіі, "хоць іншых кампраметуючых матэрыялаў і не было"[475].

У адпаведнасці з такімі ўстаноўкамі за подпісам начальніка УНКУС Віцебскай вобласці П. Раднова ва ўсе раёны вобласці была спушчана дырэктыва, якая ўтрымлівала сцвярджэнне, што там, дзе ёсць "латышскае насельніцтва, там абавязкова павінна быць контррэвалюцыйная арганізацыя", якую загадвалася неадкладна ліквідаваць[476]. Так, Віцебскім гораддзеленнем НКУС быў праведзены перадопыт асуджанай як "польагента" да вышэйшай меры пакарання Чыжэўскай. У адпаведнасці з новымі патрабаваннямі былі атрыманы паказанні, што яна з'яўляецца ўдзельніцай контррэвалюцыйнай латышскай фашысцкай арганізацыі. Больш за тое, ёй быў прад'яўлены спіс латышоў, якія наведвалі латышскі клуб. Таго факту, што Чыжэўская пагадзілася з тым, што ведае іх усіх, было дастаткова, каб арыштаваць усіх 60 чалавек як удзельнікаў контррэвалюцыйнай латышскай арганізацыі[477].

За 1937–1938 гг. толькі па адной латышскай калоніі Быхаўскага раёна з 70 гаспадарак латышоў было арыштавана 75 чалавек, з іх пазасудовымі органамі

[473] Дакладная запіска НКУС БССР аб парушэнні рэвалюцыйнай законнасці // Там жа. Спр. 14642. Арк. 16.
[474] Дакладная запіска // Там жа. Спр. 13235. Арк. 183–202.
[475] Копія абвінаваўчага заключэння УДБ НКУС // Там жа. Спр. 14891. Арк. 9.
[476] Там жа.
[477] Даведка НКУС БССР // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 14694. Арк. 63.

да расстрэлу былі прыгавораны 46 чалавек, 16 чалавек былі асуджаны на 10 гадоў, 2 чалавекі – да 8 гадоў і 1 – да 5 гадоў, адзін чалавек памёр у турме, адзін быў там жа забіты. Што здарылася з астатнімі – органы не ведалі, 8 чалавек проста "згубілі"[478].

Згодна дадзеных НКУС БССР са жніўня 1937 г. па верасень 1938 г. у рэспубліцы былі арыштаваны каля 30 тыс. чалавек польскай, латышскай і нямецкай нацыянальнасці як "агентаў замежных краін"[479].

Былы пракурор БССР Наседкін на паседжанні Бюро ЦК КП(б)Б 26.07.1939 г. у сваіх паказаннях адзначыў, што масавыя арышты, галоўным чынам, праводзіліся па лініі ваеннай пракуратуры, таму што ў Беларусі арыштоўвалі, галоўным чынам, па 68 артыкулу – за шпіянаж[480]. Аднак гэты артыкул не быў выключнай прэрагатывай ваеннай пракуратуры[481].

З ліпеня 1937 па лістапад 1938 г. па СССР ахвярамі нацыянальных аперацый сталі 335 513 чалавек, паводле дэкрэта 00447 было рэпрэсавана 767 397. З усіх арыштаваных па дэкрэту 00447 было расстраляна 49,3 %, з арыштаваных паводле нацыянальных аперацый – 73,7 %. Яшчэ вышэйшы працэнт растраляных паводле польскай аперацыі – 79,4 %[482]. Зразумела, не кожны арыштаваны па польскай аперацыі быў паляк, не ўсе арыштаваныя палякі былі арыштаваны паводле польскай аперацыі. Так, на 01.09.1938 г. у Беларусі палякі складалі толькі 43 % арыштаваных па польскай аперацыі, немцы – 76 % па нямецкай аперацыі, латышы – 74,6 % па латышскай аперацыі[483]. Усе тры нацыянальнасці ўключаліся ва ўсе тры аперацыі.

Этнічныя чысткі суправаджаліся ліквідацыяй нацыянальных саветаў і нацыянальных школ. Сярод абвінавачванняў рэпрэсаваных беларускіх дзяржаўных і культурных дзеячоў абавязкова фігуравала абвінавачванне ў наўмысным штучным насаджэнні польскіх школ у пагранічных раёнах з большасцю беларускага насельніцтва, правядзенне паланізатарскай работы, шпіянаж на карысць фашыстскай Польшчы і г. д.[484] Ідэя выкарыстання працэсаў пашырэння правоў нацыянальных меншасцей з мэтай прапаганды рэвалюцыі была адкінута. Не патрэбнымі сталі і падрыхтаваныя нацыянальныя кадры, якія ў

---

[478] Паведамленне НКУС БССР // Там жа. Арк. 11.

[479] *Раманава І.М.* Рэпрэсіі супраць нацыянальных меншасцей БССР у міжваенны перыяд // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 229–230.

[480] Стэнаграма пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Оп. 1. Спр.14540. Арк. 31.

[481] "Рэйтынг" артыкулаў Крымінальнага кодэкса БССР 1928 г., складзены беларускім гісторыкам У. Адамушка на падставе аналіза 7 тыс. картак персанальнага ўліку жыхароў Мінска і Мінскай вобласці, рэабілітаваных у 1955–1993 гг., сведчыць: 38 % з іх было рэпрэсавана за шпіянаж (68 арт.). Некалькі большы працэнт асуджаных праходзіў толькі па 72 артыкулу – «прапаганда і агітацыя супраць савецкай улады» – 38,7 %. Значны працэнт рэпрэсаваных праходзіў па 76 артыкулу – «арганізацыйная дзейнасць супраць савецкай улады» – 28,9 %. Цікава адзначыць, наступным «найбольш папулярным» з'яўляецца 69 артыкул – «падрыў дзяржаўнай прамысловасці», аднак па ім праходзіла толькі 8,9 % рэпрэсаваных. Шмат каму з асуджаных абвінавачванні высоўваліся адразу па некалькіх артыкулах, але больш чым трэцяя частка з іх абвінавачваліся ў шпіянажы. *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-ых гадоў на Беларусі. Мінск, 1994. С. 11–13

[482] *Terry Martin.* The Affairmative Action Empire: Nations and Nationalism in the Soviet Union, 1923–1939. P. 338.

[483] *Платонаў Р., Сташкевіч М.* Дзве аперацыі супраць "ворагаў народа" // Беларускі гістарычны часопіс. 1993. № 1. С. 78–79.

[484]Дакладная запіска ў камітэт партыйнага кантролю пры ЦК УсеКП(б) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12107. Арк. 34–41.

выпадку рэвалюцыі маглі б правесці сацыялістычныя пераўтварэнні на сваіх гістарычных радзімах. Нацыянальная палітыка адносна яўрэйскай нацыянальнай меншасці была кваліфікавана як імкненне "пад сцягам здзяйснення нацыянальнай палітыкі адарваць яўрэйскае насельніцтва ад агульных задач савецкай улады і камуністычнай партыі, падаграваць шавіністычныя настроі, адарваць яўрэйскае насельніцтва ад культуры вялікага рускага народа "[485].

Польская нацыянальная аперацыя паслужыла ўзорам для серыі іншых аперацый, якія мелі мішэнню нацыянальныя дыяспары, "варожыя нацыі" ў новай тэрміналогіі, групы з рэальнымі ці ўяўнымі сувязямі з замежжам. Даследчык А. Вялікі адзначае, што галоўнымі вынікамі "польскай аперацыі" у Беларусі з'яўляліся наступныя. Па-першае, у час яе правядзення былі ліквідаваныя важнейшыя інстытуты польскасці – Рымска-каталіцкі касцёл, вучэбныя, навучальныя, навуковыя ўстановы, мастацкія і творчыя саюзы, Дзяржынскі нацыянальны польскі раён, польскія нацыянальныя сельскія саветы, школы, дзіцячыя садкі і г. д. Была спынена ўся польская дзейнасць, якая праводзілася ў рэспубліцы на працягу 20–30-х гг. XX ст. Па-другое, у выніку правядзення "польскай аперацыі" было рэпрэсавана больш за 9 тыс. палякаў, аднак магчыма меркаваць, што гэта лічба значна вышэйшая. Лічыцца, што на тэрыторыі Беларусі па абвінавачванні ў шпіёнскай дзейнасці на карысць Польшчы ў 1937–1938 г. было забіта каля 50 тыс. палякаў. Адначасова адбываліся вывазкі ў Сібір і Казахстан[486]. Па-трэцяе, у правядзенні аперацыі выразна праглядаецца "беларускі след". Падчас яе рэалізацыі было рэпрэсавана больш за 10 тыс. беларусаў, абвінавачаных у шпіянажы на карысць Польшчы, удзеле ў польскіх паўстанцкіх арганізацыях і дыверсіях. Штучна "прывязваючы" да "польскай аперацыі" беларускую нацыянальна арыентаваную партыйна-савецкую, дзяржаўную, ваенную, навуковую, творчую эліту палітычнае кіраўніцтва Савецкага Саюза нанесла ёй адчувальны ўдар, знішчыўшы яе найбольш таленавітую, адукаваную і вопытную частку[487].

Рэпрэсіі працягваліся і ў 1940-я гг. Пасля пачатку Другой сусветнай вайны было прапанавана расстраляць 25700 асоб польскай нацыянальнасці, якія знаходзіліся ў турмах заходніх абласцей Украіны і Беларусі[488]. На пасяджэнні палітбюро ЦК УсеКП(б) 05.03.1940 г. была прынята адпаведная згода[489]. 25.04.1941 г. наркам унутраных спраў СССР Л. Берыя і наркам дзяржбяспекі СССР У. Мяркулаў звярнуліся да І. Сталіна з прапановаю аб арышце "контррэвалюцыйных элементаў" (удзельнікаў нацыяналістычных арганізацый, членаў іх сем'яў, а таксама членаў сем'яў уцекачоў за мяжу) у заходніх абласцях

[485] Ліст у ЦК УсеКП(б) // Там жа. Спр. 14781. Арк. 59.

[486] *Śleszyński Wojciech.* Dzierżyńszczyzna – polski eksperyment w BSRS. Budowa komunistycznej wizii dziejów Polski // Biuletyn Historii Pogranicza. Białymstok. 2016. S. 37.

[487] *Wialiki Anatol.* „Operacja polska" w BSRR. Lata 1937-1938. Początek, Przebieg, Rezultaty // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 195–220.

[488] Запіска наркама ўнутраных спраў СССР Л.П. Берыі ў ЦК УсеКП(б), І.В. Сталіну // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 14. Спр. 5. Арк. 1–4.

[489] Выпіска ад 5.03.1940 г. з пратаколу № 13/144 пасяджэння Палітбюро ЦК УсеКП(б) // Там жа. Спр. 4. Арк. 1–2.

БССР[490]. 21.06.1941 г. У. Мяркулаў паведаміў Сталіну, Молатаву і Берыі аб паспяховым завяршэнні “аперацыі па арышту і высяленню антысавецкага і сацыяльна-чужога элемента з заходніх абласцей БССР”[491]. Сярод расстраляных і выселеных былі некалькі тысячаў жыхароў Заходняй Беларусі з ліку ваенапалонных, а таксама арыштаваных былых афіцэраў, асаднікаў, чыноўнікаў і г. д.

Дэпартацыі і рэпрэсіі ў дачыненні да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей (палякаў, яўрэяў) адбываліся і ў пасляваенны час (гл. раздзел 2.2).

У выніку можна канстатаваць, што разгорнутыя масавыя рэпрэсіі 1930-х гг. былі не толькі прадуктам знешняга фактару – пагаршэння міжнароднага становішча СССР і ўзрастання напругі на заходняй мяжы, але і ўнутранага фактару – падаўлення іншадумства ў вышэйшых эшалонах улады і савецкім грамадстве ў цэлым. Праводзячы рэпрэсіі і масавыя дэпартацыі і перасяленні насельніцтва, партыйна-савецкае кіраўніцтва імкнулася рэалізаваць некалькі мэтаў: ліквідаваць палітычную і нацыянальную апазіцыю; здабыць танную працоўную сілу; аслабіць пэўныя народы шляхам ліквідацыі (фізічнай і пераменай месц жыхарства) найбольш актыўных і патэнцыяльна актыўных іх прадстаўнікоў; сфарміраваць палітычнае, эканамічнае і культурнае кіраўніцтва ў рэспубліках, якое не абапіралася на мясцовыя інтарэсы, а паслухмяна выконвала распараджэнні цэнтральных органаў улады; паменшыць уплыў аўтахтоннага насельніцтва.

**Высновы.** Можна канстатаваць, што з першых дзён свайго існавання савецкая ўлада надавала важнае значэнне нацыянальнаму пытанню. Змест, формы і накіраванасць працы ў асяроддзі нацыянальных супольнасцей з самага пачатку браліся пад строгі кантроль камуністычнай партыі (бальшавікоў). Прычым улада не ставіла мэтай адраджэнне ці замацаванне традыцыйных укладаў нацыянальных меншасцей. Асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з’яўлялася іх саветызацыя. Дзяржаўнае кіраўніцтва БССР спрыяла актывізацыі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурным жыцці ў рэчышчы падтрымкі дзеянняў кампартыі. Партыйна-савецкая ўлада выкарыстоўвала патэнцыял нацыянальных меншасцей толькі для дасягнення канчатковай мэты – пабудовы камуністычнага грамадства. Усё непадпарадкаванае камуністычнай партыі забаранялася і знішчалася.

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей БССР праявілі сваю актыўнасць ва ўсіх сферах тагачаснай палітычнай сістэмы. Значная частка з іх супольна з беларусамі, а некаторыя нават больш актыўна, ўдзельнічала ў справе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. Аналіз нацыянальнага складу партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР дазваляе казаць аб тым, што прадстаўнікі нацыянальных меншасцей адыгрывалі нават больш значную ролю

[490] Запіска ад 24.05.1941 г. наркама ўнутраных спраў СССР Л.П. Берыі і наркама ДБ СССР У. Меркулова ў ЦК УсеКП(б), І. Сталіну. Праект пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб арышце польскіх грамадзян (удзельнікаў нацыяналістычных арганізацый, членаў іх сем’яў, а таксама членаў сем’яў уцекачоў за мяжу) у Беларусі // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 18. Спр. 4. Арк. 1, 2–3.
[491] Запіска ад 21.06.1941 г. наркама ДБ СССР у ЦК УсеКП(б) І. Сталіну, СНК СССР В. Молатаву, НКУС СССР Л.П. Берыі // Там жа. Спр. 7. Арк. 1–3.

ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, чым беларусы.

Адраджэнне культур нацыянальных меншасцей на тэрыторыі БССР з'яўлялася састаўной часткай палітыкі беларусізацыі, якая станоўча паўплывала на працэс этнічнай ідэнтыфікацыі ўсіх нацыянальных супольнасцей. Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР насіла ў большасці несістэмны характар, нягледзячы на пэўныя поспехі ў забеспячэнні насельніцтва ўстановамі, якія працавалі на роднай мове.

Нацыянальная палітыка ў БССР была накіравана на інтэрнацыяналізацыю, паступовую ліквідацыю нацыянальна-моўнай разнастайнасці, асіміляцыю і акультурацыю прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей. Тагачасная прапаганда сцвярджала аб добраахвотнай і ўсвядомленай асіміляцыі этнічных груп, аднак факты не дазваляюць пагадзіцца з гэтым.

За міжваеннае дваццацігоддзе нацыянальная палітыка савецкай улады працярпела істотную трансфармацыю: ад прадастаўлення нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацыянальным меншасцям да стыгматызацыі пэўных народаў і правядзення супраць іх шырокамаштабных рэпрэсій. У выніку правядзення калектывізацыі, барацьбы з "унутранымі ворагамі" і "агентамі замежных дзяржаў" найбольш працаздольная і актыўная частка насельніцтва была або рэпрасавана, або дэпартавана за межы БССР. У першую чаргу гэта тычыцца прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, у большай меры – латышоў, літоўцаў, немцаў, палякаў, у меншай – рускіх, яўрэяў і іншых. Але нават тыя, што засталіся, імкнуліся захаваць свае нацыянальныя асаблівасці праз рэлігію. Палітычны тэрор выклікаў разгубленасць і панічны страх перад органамі НКУС. Але не ўсё насельніцтва з ліку нацыянальных меншасцей адназначна ўспрымала падобныя дзеянні ўладаў. Шмат хто ўхваляў барацьбу са "шпіёнамі, дыверсантамі, шкоднікамі". У гэты час павялічылася колькасць даносаў у органы НКУС БССР.

На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР характарызавалася барацьбой супраць любых праяваў нацыянальнай самасвядомасці, а таксама супраць нацыянальных традыцый і звычаяў, пры дэклараванні клопату пра далейшы росквіт нацыянальных культур. Пры ўзмацненні манапольнага становішча камуністычнай партыі і яе ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму было заяўлена аб стварэнні наднацыянальнай сацыялістычнай супольнасці – савецкага народа, падкрэслівалася сяброўства і братэрства народаў пры найбольшай ролі вялікага рускага народа. З Канстытуцыі былі выкрэслены палажэнні аб дзяржаўнай мове. У выніку моцнага ідэалагічнага ўціску ў грамадскім жыцці і мэтанакіраванай нацыянальнай палітыкі ў БССР руская мова выціснула мовы нацыянальных меншасцей з грамадска-палітычнага жыцця і культурна-адукацыйнай сферы. Адбылася русіфікацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця беларускага народа. Значныя змены ў нацыянальнай палітыцы адбыліся пасля з пачаткам дэмакратызацыі грамадскага жыцця, калі побач з адраджэннем культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнаса пачаўся і аналагічны працэс у большасці нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі нашай краіны.

У БССР захоўвалася пэўнае напружанне ў сферы міжнацыянальных адносін. Для часткі насельніцтва быў характэрны пэўны антысемітызм, які савецкай уладаю ўвязваўся з выступленнямі супраць камуністычнай партыі і савецкай улады; пагардлівыя адносіны да праяў беларускай культуры з боку асобных груп нацыянальных меншасцей. У сувязі з нацыянальнай прыналежнасцю шэрагу актывістаў і кіраўнікоў шмат якія іх дзеянні і прапановы ўспрымаліся як не ўласцівыя беларусам і ў адказ негатыўныя праявы да нацыянальных меншацей.

Ва ўмовах фарсіравання аднапартыйнай, адміністрацыйна-каманднай сістэмы ў краіне, палітычных рэпрэсій нельга сказаць, што ўсе прадстаўнікі нацыянальных меншасцей – кіраўнікі і члены камуністычнай партыі, прафсаюзаў і іншых афіцыйных аб’яднанняў раўнадушна глядзелі, як парушаюцца прынцыпы дэмакратызацыі, галоснасці, забеспячэння рэалізацыі свабод і інтэрасаў працаўнікоў. Вядома вялікая колькасць фактаў праяў ініцыятывы і крытыкі дзеянняў партыйнага кіраўніцтва з боку насельніцтва.

## ГЛАВА 3
## ДЗЕЙНАСЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1919–1939)

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. выклікалі грандыёзны энтузіязм у самых шырокіх колах грамадства. Упершыню народы велізарнай імперыі паверылі, што яны ад гэтага часу будуць вольныя, і захацелі дзейнічаць у імя зразумелай ім высокай ідэі. Цяжкасці здаваліся неістотнымі, а шчаслівая будучыня ў выглядзе "сацыялізму", а ў перспектыве "камунізму", выглядала такой блізкай і рэальнай. У парыве барацьбы за справядлівасць, лепшае жыццё з "карабля гісторыі" выкідвалася ўсё "старое", у якое залічвалі і адвечныя духоўныя каштоўнасці народаў: іх традыцыйны побыт, святы і абрады, вераванні і рэлігію – тое, што складала гістарычную памяць і самасвядомасць народаў[492].

Дэкларуемая свабода аказалася ілюзорнай. Сродкам здзяйснення новых ідэалаў была дыктатура пралетарыяту. Таму з першых гадоў савецкай улады ўзмацняўся партыйна-дзяржаўны кантроль за сферай ідэалогіі і грамадскім жыццём.

Тагачасныя падзеі паўплывалі на лёс усяго насельніцтва Беларусі. Прычым не ўсе народы, якія насялялі Беларусь, падтрымалі ідэі Кастрычніцкай рэвалюцыі[493]. Шмат прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей апынуліся па розныя бакі грамадскага жыцця. Так, у склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ўваходзілі 9 яўрэяў, 4 палякі, 2 рускіх, па 1 украінцу і літоўцу [494]. Можна прывесці прыклады з асяродку яўрэйскага і татарскага насельніцтва Беларусі, калі іх прадстаўнікі выступілі супраць бальшавікоў і нават са зброяй у руках змагаліся супраць савецкай улады. Так, палкоўнікі расійскай арміі беларускія татары Г. Канапацкі і А. Смольскі былі на баку БНР і ўдзельнічалі ў працы Беларускай вайсковай камісіі (БВК). Па розныя бакі апынуліся татары падчас савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., ліквідацыі нацыянальна-вызваленчага войска С. Булак-Балаховіча і інш. Татары, выхадцы з Беларусі, прымалі ўдзел у дзейнасці мусульманскага ўрада Крыма (1918), пазней шмат хто з іх вярнуўся на Бацькаўшчыну, але не ў савецкую Беларусь, а ў Заходнюю, дзе прымалі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці. А. Ахматовіч стаў сенатарам Польшчы, А. Крычынскі ўзначаліў Цэнтральны Савет Культурна-асветніцкага Саюза татар Рэчы Паспалітай. Л. Крычынскі быў ініцыятарам стварэння татарскага нацыянальнага музея ў Вільні, галоўным рэдактарам часопіса "Рочнік татарскі"[495]. Актыўна супрацоўнічаў з кіраўніцтвам БНР вядомы яўрэйскі сіяніст і гісторык, ураджэнец Пінска, І. Лур'е, які сцвярджаў: "Литовцы, украинцы, белорусы дадут еврейству максимум национально-

[492] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 350.
[493] У апошнія дзесяцігоддзі падзеі кастрычніка 1917 г. ацэньваюцца ў частцы навуковых даследаванняў як бальшавіцкі пераварот, у Расійскай гістарыяграфіі ў апошні час падзеі лютага і кастрычніка аб'яднаны ў агульнае паняцце "Рэвалюцыя 1917 г. у Расіі", некаторыя даследчыкі яе называюць "Вялікая Расійская (руская) рэвалюцыя".
[494] Спіс рады БНР. Красавік 1918 г. // LCVA. Ф. 582. Воп. 2. Спр. 11. Арк. 33.
[495] Заява ў Беларускі Нацыянальны Камітэт 28.10.1921 г. // LCVA. Ф. 306. Воп. 1. Спр. 3. Арк. 24–24адв. ; *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пач. XXI ст.). Мінск, 2007. С. 13–14.

политических прав, из-за реальных интересов своих народов"[496] і "независимость Белоруссии единственный путь к возрождению белорусского края и белорусской и еврейской народностей"[497]. Прадметам нашага аналізу стала грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацыянальных меншасцей у Савецкай Беларусі.

## 3.1 Арганізацыя і праца нацыянальна-грамадскіх аб'яднанняў

У беларускай савецкай гістарыяграфіі нацыянальныя партыі, грамадска-палітычныя аб'яднанні, таварыства, брацтвы нацменшасцей БССР адназначна лічыліся буржуазнымі, клерыкальнымі і таму іх дзейнасць у 1920–30-я гг. была варожай і шкоднай для насельніцтва Беларусі. Улады ў той час трымалі курс на непрымірымае змаганне з іх існаваннем.

Палітычныя партыі згуртоўвалі людзей, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі, і найбольш актыўных прадстаўнікоў нацменшасцей для дасягнення пэўных ідэалаў. Нацыянальныя аб'яднанні, таварыствы, брацтвы ствараліся для сумеснай рэалізацыі праграмы альбо дасягнення пэўнай мэты, якія дзейнічалі на падставе пэўных правілаў і працэдур, развівалі актыўнасць і самадзейнасць асоб, задавальнялі іх запатрабаванні і інтарэсы. Яны аказвалі непасрэдны ўплыў на грамадскае жыццё рэспублікі.

Тагачасныя грамадскія аб'яднанні (далей: аб'яднанні), якія былі ў асяродку нацыянальных меншасцей, можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Да першай адносіліся тыя, якія падтрымлівалі савецкую ўладу і існуючы дзяржаўны лад, ці былі лаяльнымі да іх, альбо былі заснаваны і працавалі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Да другой адносіліся тыя, чыя дзейнасць знаходзілася ў "апазіцыі" да існуючай улады. Абедзве групы падзяляліся на падгрупы аб'яднанняў у залежнасці ад накірунку работы. Першая складалася з: а) палітычных аб'яднанняў : Яўрэйская камуністычная партыя (ЯКП), партыя "Паалей Цыён", БУНД, яўрэйскі камуністычны саюз моладзі (Яўкамол); б) грамадскіх: прафесійныя саюзы, піянерскія арганізацыі; в) гаспадарчых: таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэяў, таварыства саматужнікаў, сельскагаспадарчыя, кааперацыя і г. д.; г) культурна-асветніцкіх: літаратурныя, краязнаўчыя таварыствы, таварыства "Ваяўнічых бязбожнікаў" і г. д.; д) рознага роду дабраахвотных таварыстваў кшталту Міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), Авіяхім, Чырвоны Крыж і г. д. Другая група складалася з: а) палітычных: "Алгемейне-Сіяністы", "Яўрэйская працоўная партыя Цыарэй Цыён", ЦСП (Цыянісцка-Сацыялістычная партыя)[498] з яе маладзёжнымі філіяламі: ЦС ЮФ (Цыянісцкі сацыялістычны Югенд Фербанд) і ЯССМ (Яўрэйская Сіянісцка-сацыялістычная моладзь), арганізацый моладзі –

---

[496]Даклад І. Лур'е "Беларуская праблема і яўрэйства" // LCVA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 58. Арк. 12.

[497] Анкета І. Лур'е. 1921 г. // Там жа. Спр. 62. Арк. 5–6.

[498] У навуковай літаратуры і архіўных дакументах сустракаюцца розныя формы напісання назваў адных і тых жа яўрэйскіх партый і арганізацый. "Цыарэй Цыён" – "Цыарэй Сіон", "Цыянісцка-Сацыялістычная" – "Сіянісцка-Сацыялістычная" і г. п. Гэта адны і тыя ж арганізацыі або партыі з розным напісаннем слова "Сион". "Цыарэй Цыён" на рускай мове – "Молодёжь Сиона".

АСМ (арганізацыя сіяніцкай моладзі), “Гехалуц” і інш.; б) грамадскіх: “Камітэт абароны палякаў” у Бабруйскай акрузе; в) культурных і спартыўных: польскія “скауты”, латышскія спартыўныя гурткі, музычныя гурткі ў нямецкай калоніі Мазырскай акругі і інш.; г) дабрачынных эканамічнага напрамку: “Бікур Хейлым”, “Гімплас-Хасед”; д) рэлігійных таварыстваў, брацтваў: “тэрцыяраў” (амаль пры кожным касцёле), “ружанца”, “Св. Вікенція з Пауля”, “Св. Сэрца Ісуса і Марыі”, “Непарочнага зачацця Св. Дзевы Марыі”, сярод немцаў – гурткі “Божых дзяцей” і г. д.[499]

Грамадска-палітычнае жыццё з’ўлялася галоўнай сферай увагі кампартыі і савецкай кіраўніцтва, бо без авалодання ім нельга было разлічваць на ўсталяванне аднапартыйнай улады. Таму ў адрозненне ад сацыяльна-эканамічнай сферы, дзе ўздзеянне бальшавіцкай таталітарнай сістэмы ўсталёўвалася паступова, па меры таго як укараняліся сацыялістычныя формы гаспадарання, грамадска-палітычнае жыццё ў дзяржаве бальшавікі бралі пад свой кантроль з першых дзён усталявання сваёй улады[500]. Рашуча і бескампрамісна вялася барацьба з усялякімі праявамі іншадумства, з усім, што не адпавядала інтарэсам бальшавіцкай улады. Насілле станавілася звычайнай з’явай. У Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд нацыянальныя аб’яднанні, партыі, таварыствы паступова страчвалі свае дасягненні і ўплыў у грамадстве таму, што на іх, з аднаго боку, абрынуўся татальны кантроль і рэпрэсіі, а з другога, нацыянальна-дэмакратычныя партыі і рухі былі аслаблены выдзяленнем з іх розных плыняў. Нямала з іх прадстаўнікоў (БУНДа, “Паалей-Цыёна”) пераходзілі на платформу кампартыі і савецкай улады. Да гэтага іх схілялі ажыццяўленне НЭПа, правядзенне палітыкі беларусізацыі, дзяржаўнае і нацыянальна-культурнае будаўніцтва і г. д.

**Яўрэйскія грамадскія арганізацыі і аб’яднанні.** Яўрэі былі самай актыўнай нацыянальнай меншасцю. Яе прадстаўнікі дзейнічалі фактычна ва ўсіх адгалінаваннях палітычнага спектра краіны. Яўрэйскі асяродак заўжды быў насычаным вялікай колькасцю розных партыйнах груповак. У асаблівасці сацыял-дэмакратычнага і народніцкага накірунку. У 1920-я гг. дзейнічала шмат розных сіяніцкіх партый і арганізацый, якія ўплывалі не толькі на заможных, саматужнікаў, але і на частку моладзі, якую прываблівалі праграмамі са своеасаблівым сінтэзам рэлігійных і сацыялістычных ідэй.

Большая частка яўрэйскіх нацыянальных арганізацый імкнулася да аб’яднання яўрэяў усіх краін, да адраджэння нацыянальнага цэнтра ў Палестыне. Маючы ў аснове сваіх праграм гэты аб’яднальны пастулат, яны ўсё ж мелі свае адрозненні ў формах і метадах дасягнення мэты. Можна ўсе яўрэйскія аб’яднанні гэтага перыяду падзяліць на тры групы.

---

[499] Дакладныя запіскі, справаздачы, лісты // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1869, 1914, 1964, 2993 ; Справаздачы і даклады ЦК КСМБ // Там жа. Ф. 63. Воп. 2. Спр. 12, 144, 275 ; Матэрыялы латсекцыі // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 222 ; *Пушкін І.А., Агееў А.Р.* Грамадзянская супольнасць і дзяржава. Станаўленне беларускага самакіравання. Магілёў, 2017. С. 118.

[500] *Касцюк М.П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі . Мінск, 2000. С. 115.

Першая – гэта партыі і аб'яднанні, якія падтрымлівалі савецкую ўладу і пэўны час супрацоўнічалі з КП(б)Б : Яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (Паалей-Цыён), Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (БУНД), Яўрэйская камуністычная партыя (ЯКП); маладзёжныя: "Югенд-Бунд", яўкамол і іншыя.

У пачатку 1920-х гг. у шэрагу гарадоў і мястэчак БССР (Мазыр, Слуцк, Гомель, Бабруйск, Віцебск і інш.) актыўна дзейнічалі і мелі істотны ўплыў на рабочых мястэчак і прафсаюзы – ячэйкі БУНДа, якія распачалі ствараць свае самастойныя арганізацыйныя структуры на Беларусі яшчэ з сакавіка 1917 г.[501]

У лістападзе 1920 г. выканкам Камінтэрна прапанаваў ЦК РКП(б) і ЦК БУНДа стварыць камісію аб зліцці БУНДа з РКП(б). У адпаведнасці з гэтым была ўтворана камісія, якая распачала сваю працу ў другой палове снежня 1920 г. і завяршыла яе ў студзені 1921 г. Фактычна было вырашана прыпыніць дзейнасць БУНДа і прапанавана членам арганізацыі ўступіць у РКП(б). Не ўсе члены БУНДа былі з гэтым згодны. ЦК вырашыў правесці экстраную канферэнцыю БУНДа аб злучэнні з РКП(б). Асноўным патрабаваннем часткі бундаўцаў было – захаванне назвы БУНД, структуры і культурнай аўтаноміі ў РКП(б).

У 1921 г. быў разасланы ліст ЦК РКП(б) аб змаганні з БУНДам і шляхах яго ліквідацыі і злучэнні з РКП(б)[502]. На Віцебшчыне з мэтай недапушчэння выбрання членаў БУНДа ў гарсавет, іх арганізацыю "своечасова забылі папярэдзіць" аб вылучэнні сваіх прадстаўнікоў, а потым, наогул, забаранілі галасаваць на сходах за іх спісы[503].

Выкананнем пастановы камісіі і пленума ЦК БУНДа, які ў цэлым падтрымаў пастанову, на месцах у 1921 г. распачаўся працэс аб'яднання. Напрыклад, у Віцебску адбылося аб'яднанне яўрэйскай секцыі РКП(б) і Віцебскага губкома БУНДа. Такім чынам, пэўная частка членаў БУНДа ўвайшла ў склад РКП(б), значна павялічыўшы колькасць членаў кампартыі ў БССР[504]. У адносінах да тых, хто не жадаў аб'ядноўвацца, быў абраны шлях рэпрэсій.

Ліквідацыі падлягалі і першасныя арганізацыі РСДРП (меншавікоў), якія ў 1920–23 гг. дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі (Віцебская губернія РСФСР). Большасць іх членаў складалі яўрэі. 23.03.1922 г. ДПУ прапанавала выслаць з Віцебска 7 найбольш актыўных членаў Віцебскай арганізацыі РСДРП(м), якія па нацыянальнасці былі яўрэі[505]. Таму вельмі часта, у пэўных месцах, члены

---

[501] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1983. Т. 1. С. 264 ; Решения и резолюции ВКП(б) и КП(б)Б по национальному вопросу. Минск, 1926. С. 39 ; *Рудовіч С.* Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе. Мінск, 2001. С. 68 ; *Ващило Н.* Борьба РКП(б) с политической оппозицией в начале 20-х годов (на материалах Могилёва) // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2001. С. 223–229.

[502] Ліст ЦК РКП(б) // ДАВц. Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 219. Арк. 16

[503] Спісы кандыдатаў на выбары ў гарсавет Віцебска // ДАВц. Ф. 56. Воп. 6. Спр. 78. Арк. 2–3, 26

[504] Бунд в Беларуси. 1897–1921. Документы и материалы. Минск, 1997. С. 527–538 ; *Ващило Н.Н.* Бундовские организации Могилева и Могилевского уезда в 1920–1921гг. // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья. Международная научно-практическая конференция: Тезисы докладов. Могилев, 2001. С. 28–30 ; *Липецкий Э.А.* Некоторые аспекты деятельности БУНДа после Октябрьской революции 1917 г. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2001. С. 190.

[505] Інфармацыйныя зводкі ДПУ // ДАВц. Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 396. Арк .95.

партый РСДРП(м) і БУНДа кааперавaліся для сумесных дзеянняў. У Віцебску на выбарах у гарадскі савет выстаўлялі сваіх прадстаўнікоў адным спісам ва ўсіх выбарчых курыях[506]. 14.06.1924 г. у Гомелі прайшоў з'езд былых членаў РСДРП(м) і БУНДа – 67 меншавікоў, 47 бундаўцаў, 6 яўрэяў сацыял-сіяністаў і 2 спачуваючых. У прынятых рэзалюцыях былі патрабаванні аб вырашэнні эканамічных і палітычных пытанняў, у асноўным местачковага насельніцтва[507].

У лісце бюро ЦК КП(б)Б (1926) аб рабоце сярод яўрэяў[508] прадпісвалася знішчэнне "небальшавіцкіх традыцыяў" сярод тых, хто "паходзіў з дробнабуржуазных партыяў", у прыватнасці БУНДа. Сярод яўрэяў не павінна было застацца рэшткаў "бундаўскай ідэалогіі" і ідэалізацыі БУНДа. Справа ў тым, што былыя члены БУНДа, якія ўступілі ў кампартыю, высока ацэньвалі ролю і дзейнасць БУНДа. Гэта вельмі не падабалася камуністычным уладам. Яны бязлітасна змагаліся за выкараненне наступных поглядаў, якія часта выказваліся ад гэтых членаў КП(б)Б у першасных арганізацыях: "У свой час БУНД быў адзінай арганізацыяй, у шэрагах якой яўрэйскі рабочы мог далучыцца да рэвалюцыйнага руху; у Беларусі БУНД быў рэвалюцыйнай партыяй, і калі б не БУНД, дык наша партыя не здолела б зрабіць паміж яўрэйскіх рабочых таго, што яна зрабіла; ёсць думка, што з БУНДа ўтваралася беларуская кампартыя (КП(б)Б); бальшавікі прыйшлі на гатовую глебу, а падрыхтаваў яе БУНД; у партыі штосьці не так, бо сталі шукаць прычыну і знайшлі – БУНД, гэта даказвае адарванасць ЦК ад масаў, бо трэба зразумець, што калі б не БУНД, яўрэйскія рабочыя былі б больш адсталыя"[509]. Вельмі моцнай была вера ў вялікія дасягненні БУНДа сярод рабочых Бабруйска, Слуцка ў 1928–29 гг.

15.01.1919 г., на пасяджэнні ЦК КП(б)Б была выказана думка аб "пажаданасці" арганізацыі яўрэйскай кампартыі з часткі былых членаў БУНДа. Праз пяць дзён бюро пастанавіла: "яўрэйскую прызнаць і зацвердзіць"[510]. Палову года яна мела свой камітэт, які карыстаўся самастойнасцю пытанняў культурна-нацыянальнай аўтаноміі. Члены яе прымалі ўдзел у працы КП(б)Б побач з членамі партыі бальшавікоў і падпарадкоўваліся іх дысцыпліне. Затым ЦБ КП(б)Б пераканалася, што гэта не дала належнага эфекту – не прывяло да росту ЯКП, таму камітэт быў ліквідаваны, а была разгорнута праца яўрэйскай секцыі як часткі апарату кампартыі бальшавікоў[511]. У жніўні 1919 г. у выніку расколу Яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (ЯСДРП, з 1923 – ЯКРП)[512] вылучылася Яўрэйская камуністычная партыя (ЯКП – "Паалей

---

[506] Матэрыялы аб выбарах // ДАВц. Ф. 56. Воп. 6. Спр. 78. Арк. 2–4.

[507] Рэзалюцыя // ДАГАГом. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 878. Арк. 107.

[508] Перед крутым поворотом: Тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925–1928 гг.): Отражение времени в архивных документах. С. 223 ; Справаздача еўбюро пры ЦК КП(б)Б (1926 г.) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2479. Арк. 118.

[509] Лісты аб стане працы сярод яўрэяў // НАРБ. Ф 701. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 120 ; Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2005. Арк. 158–159; Бунд в Беларуси. С. 538–540.

[510] Пастанова ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф.4 п. Воп. 1. Спр. 8. Арк. 12 адв., 18 адв.

[511] Стэнаграма даклада // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3720. Арк. 52.

[512] Яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (Паалей–Цыон) дзейнічала ў Расіі (у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі) з 1906 па 1928 г. Па кірунках дзейнасці гэта была сіяніцкая нацыянальная партыя (Паалей Цыон – Рабочы Сіона). Члены партыі былі прадстаўлены ў УЦВК, у мясцовых саветах.

Цыён")[513]. Нягледзячы на агульныя мэты, бальшавіцкае кіраўніцтва не дазволіла 30.07.1920 г. паставіць подпіс пад Дэкларацыяй аб абвяшчэнні ССРБ прадстаўніку ЯКП "Паалей-Цыён", не звяртаючы ўвагі на яго настойлівыя патрабаванні. У 1928 г. ЦК УсеКП(б) прыняў рашэнне аб роспуску ЯКРП "Паалей-Цыёна", Мінская арганізацыя партыі перастала існаваць на год раней[514]. Частка былых членаў ЯКРП (Паалей-Цыон), што пісьмова заявілі аб адыходзе іх ад ідэалогіі і праграмы ЯКРП, былі прыняты ў шэрагі УсеКП(б)[515].

У пачатку 1920-х гг. актыўна і плённа дзейнічала сярод яўрэйскага насельніцтва Савецкай Беларусі партыя ЯСДРП "Паалей-Цыён". Асабліва вялікім уплывам карысталася яе арганізацыя ў г. Орша. Напрыклад, для параўнання, у Віцебску на беспартыйнай канферэнцыі было яўрэяў – членаў партыі "Паалей-Цыён" 7 з 250 дэлегатаў, а ў г. Орша – 18 з 98 дэлегатаў, там жа 13 членаў ЯКП[516].

ЯКП "Паалей-Цыён" у 1920 г. утварыла Яўкамол. Яго арганізацыі існавалі ў Бабруйску, Мазыры, Слуцку, Барысаве, іншых гарадах і мястэчках. Яшчэ раней, у 1918 г., у часе нямецкай акупацыі, ЯСДРП "Паалей-Цыён" заснавала арганізацыю "Юнгер-Арбэйтар"[517].

Яўкамол і "Югенд-Бунд" (узнік у Мінску ў верасні 1917 г. як маладзёжная арганізацыя) былі найбольш распаўсюджаны ў пачатку 1920-х гг. на тэрыторыі Савецкай Беларусі і мелі значны уплыў на яўрэйскую моладзь [518]. Нягледзячы на меркаванне В. Кнорына, што гэтыя арганізацыі "цалкам былі арганізацыямі, якія тармазілі рэвалюцыйнае самавызначэнне моладзі да

---

Выдавалі шэраг газет і часопісаў, найбольш у 1917–1919 гг. Самая вядомая "Яўрэйская пралетарская думка" (1918–1927 гг.). ЦК ЯСДРП і мясцовыя арганізацыі адмоўна адносіліся да мерапрыемстваў Яўрэйскага камісарыята пры Наркамнацы і ЦБ Яўрэйскай секцыі пры ЦК РКП(б). У жніўні 1919 г. у партыі адбыўся раскол, з яе складу вылучылася Яўрэйская камуністычная партыя (ЯКП – Паалей–Цыон), у снежні 1922 г. ЯКП самараспусцілася і яе члены ўступілі ў РКП(б). У 1923 г. ЯСДРП змяніла назву – Яўрэйская камуністычная рабочая партыя Паалей–Цыон (ЯКРП – Паалей–Цыон). Дзейнічала на тэрыторыі СССР да 1928 г. Цэнтральны кіруючы орган знаходзіўся ў Маскве. Актыўна дзейнічалі рэгіянальныя цэнтры ЯСДРП. У маі 1918 г. у Мінску быў створаны Галоўны камітэт ЯСДРП (Паалей–Цыон) Беларусі (1918). У структуры партыі, сярод іншых, былі: Беларуска-Літоўскі Камітэт ЯСДРП (Паалей–Цыон) (1919–1921), Беларускі абласны Камітэт ЯСДРП (Паалей–Цыон) (1921–1925, Мінск), Паўночна-Заходні Абласны Камітэт ЯСДРП (Паалей–Цыон) (Мінск–Віцебск, 1917–1921). Існавалі арганізацыі партыі ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Лукомлі, Магілёве, Мінске, Рэчыцы, Слуцку і інш. Лісты, пратаколы, даклады арганізацый ЯСДРП (Паалей–Цыон) на тэрыторыі Беларусі. 1917–1928 гг. // РДАСПГ. Ф. 272. Воп. 1. Спр. 14, 116, 129, 187, 188, 190, 192, 194, 302, 303, 304, 305, 306, 307, 310, 312, 313, 314, 315, 316, 317, 318, 319, 320, 321, 322, 323, 530 ; *Чемерисский И.А.* Партия Поалей-Цион в годы революции и в первые годы Советской власти // Непролетарские партии и организации национальных районов России в Октябрьской революции и гражданской войне. М., 1980. С. 156–165.

[513] Рэзалюцыі, прынятыя на канферэнцыі "камуністычных фракцый" ЯСДП "Паалей–Цыён", ухваліўшай утварэнне Яўрэйскай камуністычнай партыі "Паалей–Цыён". 10–14.08.1919 г., г. Гомель // РДАСПГ. Ф. 272. Воп. 1. Спр. 14. Арк. 1–8 ; Пратаколы пасяджэння Бюро Мінскага камітэта ЯКП (Паалей–Цыон), лісты ўпаўнаважанага ЦК ЯКП пры Мінскім камітэце аб стане працы мінскай арганізацыі. Красавік 1918 – снежань 1924 гг. // Там жа. Спр. 302. Арк. 1–216.

[514] Дакументы кіраўніка Мінскай арганізацыі ЯКРП Н.І.Фішара у ЦК ЯКРП аб яго арышце і высылцы з Мінска савецкай уладаю. Сакавік 1926 – лістапад 1927 гг. // Там жа. Спр. 303. Арк. 3–4, 8–12 ; Спр. 305. Арк. 1–103.

[515] Ліст ад групы былых членаў ЯКРП (Паалей–Цыон) у ЦК УсеКП(б) і ў Выканкам Камінтэрна с просьбай прыняць у шэрагі УсеКП(б). 14.05.1930 г. // Там жа. Спр. 129. Арк. 1.

[516] Звесткі аб Паалей Сіяніс цкіх арганізацыях у г. Віцебске // ДАВц. Ф. 10050. Воп. 1. Спр. 219. Арк. 122.

[517] Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. Минск, 1975. С. 89 ; *Олікер Б., Розенблюм Л.* Нарысы па гісторыі камсамолу Беларусі. Менск, 1927. С. 112.

[518] Лісты і тэлеграмы Магілёўскага камітэта ЯСДРП (Паалей–Цыон) і Магілёўскай арганізацыі Югенд аб працы сярод моладзі, аб правядзенні беспартыйнай яўрэйскай канферэнцыі (1918–1920) // РДАСПГ. Ф. 272. Воп. 1. Спр. 313. Арк. 1–24.

апошняга дня свайго існавання”[519], яны ў сваіх дзеяннях ішлі па агульным шляху з камсамолам. Дарэчы, па Б. Олікеру і Л. Розенблюму складваецца ўражанне, што камсамол на Беларусі ўзнік і сфарміраваўся на базе яўрэйскіх маладзёжных арганізацый. У сакавіку 1921 г. у трох паветах БССР (ССРБ) і Мінску сярод маладых яўрэяў мелася невялікая колькасць членаў “Югенд-Бунда”. Яго арганізацыі выступалі за зліццё з КСМБ, што і адбылося ў канцы сакавіка 1921 г. На думку В. Даніловіча: “Гэта сведчыць аб перавазе ў асяроддзі моладзі камуністычных ідэй над сацыял-дэмакратычнымі і перспектыўнасці дзейнасці камсамола ў тым ліку і ў плане адстойвання інтарэсаў яўрэйскіх працоўньгх юнакоў і дзяўчын”[520].

У Яўкамол прымалі маладых яўрэяў ва ўзросце 14–23 гадоў. Члены саюза былі абавязаны весці ўсюды прапаганду пераходу да прадукцыйнай працы на нацыянальных калектыўных пачатках, наведваць мітынгі, гутаркі і лекцыі камуністычных арганізацый. У сакавіку 1921 г. арганізацыя Яўкамола была толькі ў Мінску. Там жа 15.03.1921 г. была праведзена I Усебеларуская канферэнцыя арганізацыі. Старшынёй Галоўнага камітэта Яўкамола Беларусі быў абраны Зільберберг, а таксама канстатавалася, што, нягледзячы на перашкоды з боку яўсекцый КП(б)Б і КСМБ, яго шэрагі ў Беларусі павялічваюцца. Налічваючы ў 1921 г. 80–90 членаў, ён працаваў даволі актыўна. Пры клубе Яўкамола дзейнічалі курсы па ліквідацыі непісьменнасці і бібліятэка-чытальня. Праводзілася ваенна-спартыўная праца (заняткі з трыма групамі юнакоў і дзяўчын). Рэгулярна адбываліся заняткі ў фарбандшколе, часта праводзіліся абмеркаванні хвалюючых яўрэйскую моладзь пытанняў. Пры гэтым сцвярджалася, што Яўкамол – адзіная арганізацыя ў Мінску, якая робіць штосьці пазітыўнае для яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын. Акрамя таго, Яўкамол у Беларусі арганізоўваў дапамогу яўрэям, пацярпелым ад бандытызму[521]. Яўкамол меў значныя матэрыяльныя сродкі і да 1923 г. з’яўляўся рэальным канкурэнтам камсамола ў асяроддзі яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын. Аднак з-за супрацьдзеяння савецкіх улад наладзіць маштабную працу не ўдалося, таму было прынята рашэнне аб ліквідацыі саюза і ўступленні яго членаў у камсамол, што адбылося ў 1922 г. Нягледзячы на гэта, канчатковага зліцця не было. Да 1928 г. у БССР адзначалася дзейнасць асобных невялікіх груп яўкамола, але яны фактычна не мелі уплыву на яўрэйскую моладзь.

Нягледзячы на пэўнае падабенства мэтаў і праграм агульных дзеянняў, кампартыя бальшавікоў у 1920-я гг. вяла змаганне з яўрэйскімі партыямі і аб’яднаннямі як з дробнабуржуазнымі партыямі. Да таго ж, як адзначыў А.Чарвякоў на II Усебеларускім з’ездзе сялян-яўрэяў (студзень 1928): “…наша мэта – асіміляцыя яўрэйскага насельніцтва пры пабудове агульначалавечай культуры на камуністычных пачатках”[522].

---

[519] Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. Минск, 1975. С. 6.

[520] *Даніловіч В. В.* Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі (1921–1929 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2015. № 2. С. 54.

[521] Там жа.

[522] Два гады нацыянальнай работы ў БССР: Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні. Менск, 1929. С. 47.

У 1922 г. большасць арганізацый ЯКП “Паалей-Цыёна” аб’ядналіся з кампартыяй. Канчатковы распад партыі ЯКРП “Паалей-Цыён” зацягнуўся да канца 1920-х гг. Так толькі ў пачатку 1928 г. з яе шэрагаў выйшлі 5 найбольш актыўных членаў Віцебскай арганізацыі[523]. У тым жа годзе ЦК УсеКП(б) прыняў рашэнне аб роспуску “Паалей-Цыёна”, у чэрвені супрацоўнікі ДПУ занялі памяшканне партыі і апісалі яе маёмасць. У СССР была ліквідавана не проста яўрэйская партыя, а, наогул, апошняя легальная партыя ў краіне[524].

У шэрагах КП(б)Б у 1922 г. былых членаў “Паалей-Цыёна”, БУНДа, ЯКП было – 12,3 % ад агульнай колькасці, у актыве рэспубліканскіх органаў да 40 %, акруговых да 25 %[525]. Аднак вядомы выпадкі, калі прадстаўнікі вышэйзгаданых партый, якія ўступілі ў склад кампартыі і падтрымлівалі яе ідэалогію, тым не менш выказвалі патрабаванні вызвалення сацыялістаў з вязніц, свабоду слова і думкі, свабоду прафсаюзаў ад засілля камуністычнай партыі[526]. На падставе гэтага партыйныя органы і частка савецкіх даследчыкаў лічылі, што яны заставаліся членамі падпольных сіяніцкіх арганізацый. Нават сцвярджалася, што ў сярэдзіне 1920-х гг. у Беларусі і Украіне існавала разгалінаванае сіяніцкае падполле[527].

Другая група – партыі і аб’яднанні, якія імкнуліся да стварэння сваёй дзяржавы[528] і адстойвалі буржуазна-дэмакратычныя правы: “Алгеймене-Сіяністы”, “яўрэйская працоўная партыя Цыарэй – Цыён” і арганізацыя моладзі АСМ (арганізацыя сіяніцкай моладзі), “Гехалуц” (“Першапраходзец”), “Гашамер” (“Абаронца”)[529], “Маккабі” і іншыя[530]. Яны заклікалі да стварэння яўрэйскай буржуазнай Палестыны, выказваліся за адсутнасць у яўрэйскім асяроддзі класавых супярэчнасцей (адсюль не можа быць класавай барацьбы); за наяўнасць толькі нацыянальнага пытання, сцвярджаючы пастулат: яўрэй – гэта іудзей; заяўлялі аб сваёй апалітычнасці ў тагачасных бягучых падзеях.

З гэтай групай аб’ядноўвалася адной рысай – варожым стаўленнем да КП(б)Б (лічылі, што тая ўзурпавала ўладу і парушалі асновы дэмакратыі і волі) група арганізацый і партый “сацыялістычнай арыентацыі”: ЦСП (Цыяніцка-сацыялістычная партыя) з яе маладзёжнымі філіяламі : ЦС ЮФ (Цыяніцкі

---

[523] Ліст аб працы сярод яўрэйскага насельніцтва // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4256. Арк. 1–2.

[524] *Басин Я.* Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки. Минск, 2008. С. 95 ; “Поалей-Цион” // Гражданская война и военная интервенция в СССР: Энциклопедия. М., 1987. С. 467.

[525] Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён (Зб. арт.). Мінск, 1992. С. 82.

[526] Дакладная запіска аб сіянізме // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1964. Арк. 11 ; Ітогі і бліжэйшыя задачы правядзення Ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР / Пастанова аб’яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б. Менск, 1934. С. 7.

[527] Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. С. 152.

[528] Вытрымкі з газетных артыкулаў // LCVA. Ф. 582. Воп. 1. Спр. 37. Арк. 1–4адв.

[529] “Гехалуц” (“Хе-халуц”) – арганізацыя, якая ставіла перад сабой мэты: эміграцыя ў Палестыну і стварэнне яўрэйскай дзяржавы, пабудова грамадства ў адпаведнасці з палітыка-нацыянальнымі і грамадска-эканамічнымі інтарэсамі працоўных. История еврейского национального движения 1914 – 1949. Иерусалим, 1996. С. 37–38.
“Гашамер” (“Ха-шамер”) – гэта арганізацыя, якая ставіла перад сабой мэту забяспечваць бяспеку яўрэйскага насельніцтва. Асноўны прынцып арганізацыі: “Па першаму закліку накіроўвацца ў любую кропку краіны для выканання любога задання”. История еврейского национального движения 1870–1914. Иерусалим, 1996. С. 173–175.

[530] *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб’яднанняў БССР (20-я гг. ХХст.) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1998. С. 32–38 ; *Яго ж.* Удзел яўрэяў г. Магілёва ў грамадска-палітычным і культурным жыцці (1917 – канец 30-х гадоў ХХ ст.) // Этнаграфія беларускага Падняпроўя: Матэрыялы навуковай канферэнцыі 30 лістапада – 1 снежня 1999 г. Магілёў, 1999. С. 30–40.

сацыялістычны Югенд-Фербанд) і ЯССМ (Яўрэйская Сіяніцка-сацыялістычная моладзь) і інш. У іх праграме былі палажэнні, якія прадугледжвалі адстойванне інтарэсаў яўрэйскіх працоўных і беднаты, яны імкнуліся ў сваёй дзейнасці рэалізоўваць ідэі II Інтэрнацыянала[531].

У БССР актыўна ўтвараліся і дзейнічалі ў перыяд 1923–1925 гг.: ЦСП, правага кірунку АСМ, левыя ЦСЮФ, ЯССМ, меншым уплывам карысталася партыя Цыарэй-Цыён. "Гашамер-Гацаір" ("Юны абаронца"), "Гехалуц", "Маккабі" у першай палове 1920-х гг. мелі свае аддзяленні па 30–50 чалавек у Гомелі, Быхаве, Мінску, Рагачове, Бабруйску, Нова-Беліцы, Новазыбкаве, Рэчыцы, Мазыру, Калінкавічах[532]. "Маккабі" прыпыніла сваю дзейнасць у БССР у 1924 г. У сакрэтным лісце КП(б)Б прапаноўвалася змагацца з яўрэйскімі антыкамуністычнымі арганізацыямі ў БССР: "Гехалуцам", "КССМ", "Югенд", "Гэшеймер-Геццэр", "Юней Іудо", "Гехалуц Аццэ" і інш. На тэрыторыі Савецкай Беларусі дзейнічала маладзёжная яўрэйская сіяніцкая арганізацыя "Гехавер", якая ўспрымала савецкую рэчаіснасць з негатыўнага боку. У сваіх цыркулярах кіруючыя органы арганізацыі ў 1924 г. ацэньвалі тагачасную сітуацыю наступным чынам: "…руская рэчаіснасць: рэакцыя лютуе на яўрэйскай вуліцы…"[533].

Сіяніцкія маладзёжныя арганізацыі ў Савецкай Беларусі былі невялікімі, разгортвалі сваю дзейнасць пераважна ў мястэчках. Нягледзячы на ўсе захады савецкіх улад, іх колькасны склад павялічваўся і дасягнуў свайго піка ў 1925 г. У сярэдзіне 1920-х гг. юнацкія сіяніцкія арганізацыі пачалі радыкалізоўвацца і выкарыстоўваць адпаведныя метады барацьбы. Дзякуючы наяўнасці моцных крыніц фінансавання, яны павялічылі выпуск пракламацый, перыядычных і неперыядычных выданняў для маладых яўрэяў, якія перавышалі па колькасці камсамольскія і піянерскія. Разам з тым пачалося пранікненне сіяністаў у камсамол з мэтай ідэалагічна разваліць яго ячэйкі і перацягнуць яўрэяў-камсамольцаў да сябе. Але ў выніку ўзмацнення процідзеяння савецкіх улад і паляпшэння экнамічнага становішча яўрэйскіх юнакоў і дзяўчын ужо з канца 1926 г. назіралася паслабленне ўплыву маладзёжных сіяніцкіх арганізацый і распад іх мясцовых структур. Апошняя спроба актывізацыі дзейнасці сіяністаў сярод яўрэйскай моладзі назіралася ў 1928–1929 гг. Аднак яна была беспаспяховай. Напрыканцы 1929 г. арганізаваныя юнацкія сіяніцкія групы былі ліквідаваны[534].

З другой паловы 1926 г. да 1928 г. у дзейнасці яўрэйскіх нацыянальна-палітычных аб’яднанняў сталі назірацца новыя тэндэнцыі. Зусім не тыя, якіх чакала кіраўніцтва БССР, якое ў сярэдзіне 1920-х гг. разгарнула бязлітасную барацьбу супраць самастойных яўрэйскіх арганізацый. Пасля часовай разгубленасці, адбылася перагрупоўка сіл, нават кансалідацыя. Кансалідуючую

---

[531] Дакладныя запіскі аб сіяністах // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1964. Арк. 8–9.

[532] Матэрыялы аб дзейнасці яўрэйскіх арганізацый // ДАГАГом. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1229. Арк. 59–62 ; Ф. 7. Воп. 1. Спр. 355. Арк. 10.

[533] Матэрыялы нарады арганізацыі "Гехавер" // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1892. Арк. 23.

[534] *Даніловіч В. В.* Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі (1921–1929 гг.) // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. 2015. № 2. С. 61.

ролю ўзяла на сябе ЦСП. Яна актыўна стала выступаць супраць КП(б)Б. На першае месца вылучала агульнапалітычныя патрабаванні: свабоду друку, сходаў, легалізацыю палітычных партый, вызваленне палітычных зняволеных – сацыялістаў, тайнае галасаванне і г. д., а толькі затым нацыянальныя патрабаванні: працоўную нацыянальна-асабістую аўтаномію, яўрэйскія саветы з цэнтральным выканаўчым органам яўрэйскіх саветаў і з'ездамі гэтых саветаў, яўрэйскую нацыянальную кааперацыю з асобным яўрэйскім цэнтральным органам, яўрэйскія нацыянальныя вайсковыя фарміраванні, утварэнне асобнага яўрэйскага бюджэта з агульнага дзяржаўнага, арганізацыю яўрэйскіх прадпрыемстваў з агульнадзяржаўных сродкаў для ліквідацыі беспрацоўя паміж яўрэйскага насельніцтва і г. д. ЦСП адназначна разглядала сябе як "сіяніцка-сацыялістычную партыю – спадчынніцу вопыту былых яўрэйскіх сацыялістычных партый"[535].

Пасля карных дзеянняў улад "выжылі" найбольш правыя яўрэйскія арганізацыі. ЯССМ – з яго "левымі" лозунгамі, які ганарыўся ледзь не "ленінізмам", быў амаль ліквідаваны. Умацаваўся правы СССМ (сіяніцка-сацыялістычны саюз моладзі, па яўрэйску ЦСЮФ-Югендаўцы) – філіял ЦСП. Стаў назірацца хуткі рост дзіцячых – "шомерскіх" арганізацый (колькасць узрасла з 500 да 1546). У пэўных месцах Савецкай Беларусі яны былі больш шматлікія, чым піянерскія[536].

На думку яўбюро, ЦК КП(б)Б БССР з'яўлялася "адным з ачагоў распаўсюджвання сіянізму ў СССР …асабліва заўважана сіяніцкая дзейнасць і настроі ў Мазырскай, Слуцкай, Бабруйскай, Мінскай акругах, меней у Барысаўскай і Магілёўскай, і менш за ўсё ў Віцебскай, Полацкай, Калінінскай, Аршанскай…"[537].

ЦСП, ЦСЮФ актыўна дзейнічалі праз яўрэйскія школы, крэдытныя таварыствы, таварыствы саматужнікаў у мястэчках. "Гехалуц", нягледзячы на памяншэнне колькасці сваіх членаў (у арганізацыі засталося каля 30 % першапачатковай колькасці) паспяхова распачаў працу ў яўрэйскіх сельскагаспадарчых калектывах. Нават сярод яўрэйскай інтэлігенцыі, якая была найбольш блізкай да савецкай і пралетарскай грамадскасці, сталі ўмацоўвацца нацыяналістычныя настроі, настроі адчужанасці і адасобленасці. Паміж імі запанавалі выказванні наступнага зместу: "Нічога не зробіш, мы знаходзімся паміж чужых"; уяўленні, што яўрэяў–служачых выціскаюць з дзяржаўнага апарату; погляды, што яўрэйская культура параўнальна з беларускай знаходзіцца ў горшым стане, што ёй не надаецца належнай увагі і прэстыжнасці; праявы своеасаблівай "тугі па сваёй дзяржаве"[538].

На выбарах (Бабруйская, Мінская, Слуцкая акругі) яўрэйскія партыі і арганізацыі імкнуліся правесці ў саветы сваіх кандыдатаў. Пры немагчымасці выкарыстоўвалі наступны метад – спрабавалі даваць адвод членам кампартыі,

[535] Матэрыялы аб дзейнасці сіяніцкіх арганізацый // НАРБ. Ф. 63. Воп. 2. Спр. 275. Арк. 2–3.
[536] Матэрыялы сіяніцкіх арганізацый // Там жа. Арк. 1–3.
[537] Справаздачы па нацпалітыцы // Там жа. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 133.
[538] Пратаколы, выпіскі з пасяджэнняў еўбюро // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1899. Арк. 36–37 ; Решения и резолюции ВКП(б) и КП(б)Б по национальному вопросу. С. 95.

матывуючы тым, што члены КП(б)Б, у большасці, прыезджыя, а трэба выбіраць сваіх, местачковых[539].

Своеасаблівая лакалізацыя ўплыву яўрэйскіх арганізацый верагодна была выклікана, у першую чаргу, эканамічным станам мястэчак. Яўрэйская моладзь, якая працавала на прамысловых прадпрыемствах, прымала актыўны ўдзел у савецкім будаўніцтве. Але пэўная частка захоўвала замкнёнасць на нацыянальнай глебе, нават з'яўляючыся членамі камсамолу. Гэта магчыма было б патлумачыць праявамі антысемітызму, але часцей самі яўрэі "раздувалі пытанне аб антысемітызме, усё прымаючы як антысемітызм…"[540]. У выніку далучэння яўрэйскай моладзі да савецкага будаўніцтва ў 1920-я гг. стала знікаць яўрэйскае мястэчка са своеасаблівым нацыянальным каларытам і ўкладам.

Асобную групу складалі дабрачынныя нацыянальныя яўрэйскія арганізацыі, якія таксама сваёй дзейнасцю ўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё. Медыцынскую дапамогу яўрэям аказвала яўрэйская філантрапічная арганізацыя "Лінэс-Гацэдак", якая была ўтворана да 1917 г. У чэрвені 1927 г. у Бабруйску па ініцыятыве "Джойнта" на грамадскіх пачатках утварылася арганізацыя "БЕМСО". Еўбюро ЦК КП(б)Б праз яе спадзявалася далучыць яўрэйскую беспартыйную інтэлігенцыю да савецкай працы. БЕМСО разгарнула вялікую працу, праз год налічвалася каля 3000 чалавек, ахопленых абслугоўваннем. У 1927 г. сярод яе членаў было 807 яўрэяў, 168 беларусаў, праз год 713 яўрэяў і 148 беларусаў. На сродкі членаў арганізацыі была адкрыта амбулаторыя, рэнгенкабінет, лабараторыя і г. д. За некалькі месяцаў дзейнасці было выдадзена 15425 бясплатных рэцэптаў, аказана медыцынская дапамога "на даму" 5610 чалавекам[541]. Сацыяльную дапамогу яўрэям аказвалі таварыствы "Бікур Хейлым", "Гімплас-Хасед"[542] .

З першых месяцаў існавання савецкай улады шэраг клерыкальных сіяністкіх арганізацый дзейнічалі нелегальна – "у падполлі". Сярод іх "Мізрахі" ("Духоўны цэнтр") і "Ахдут Ізраэл" ("Яднанне Ізраіля"), якія настойвалі на захаванні рэлігійнай традыцыі як пры стварэнні будучай дзяржавы ў Ізраілі, так і ў жыцці яўрэйскай дыяспары, у тым ліку і ў Беларусі. Найбольш моцныя пазіцыі на тэрыторыі Беларусі меў "Ахдут Ізраэл", які ў 1918 г. аб'яднаўся з рухам "Адас Ізраэл" ("Абшчына Ізраіля") у адзіны рэлігійна-палітычны фронт "Ахдут" ("Адзінства"). Іх падпольная дзейнасць працягвалася да сярэдзіны 1920-х гг. і была спынена ў выніку рэпрэсій. Асобныя глыбока законспіраваныя групы сіяністаў праіснавалі да 1934 г.[543]

Трэба асобна адзначыць паспяховую і плённую дзейнасць шэрагу грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, якія вырашалі эканамічныя пытанні яўрэйскага насельніцтва. У пачатку 1920-х гг. актыўна дзейнічалі: Таварыства распаўсюджвання саматужніцкай і земляробчай працы сярод яўрэяў (ОРТ),

[539] Матэрыялы па рэалізацыі нацпалітыкі // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 128.
[540] Справаздача еўбюро ЦК ЛКСМБ // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3603. Арк. 8–9.
[541] Справаздачы // Там жа. Спр. 4662. Арк. 46, 64 адв.
[542] Справаздачы па нацпалітыцы // Там жа. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 125.
[543] *Басин Я.* Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки . С. 89, 96.

таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэў – “ОЗЕТ”, беларуская камісія яўрэйскага грамадскага камітэта па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны, пагромаў і стыхійных бедстваў (Яўградкам), праз які здзяйсняў сваю дзейнасць “Джойнт” (Амерыканскі аб’яднаны яўрэйскі камітэт па размеркаванню фондаў). Дзякуючы Яўградкамаму працавалі дзіцячыя: дамы ў Барысаве, Полацку і Мазыры, яслі ў Віцебску, кансультацыя ў Мінску і інш.[544] На пасяджэннях Мінскага бюро ОРТа (1923 год) абмяркоўваліся пытанні дзейнасці Мінскай сельскагаспадарчай вучэбнай фермы, навучальных устаноў прафесійнага тыпу, дзе большасць навучэнцаў складалі яўрэі (Мінск, Бабруйск) і інш.[545]

Ліквідаваць беспрацоўе, задаволіць жаданне яўрэяў заняцца земляробствам, накіраваць увагу і энергію яўрэйскай беднаты на земляробства – вось асноўныя задачы, якія спрабавалі вырашыць у 1920-я гады актывісты Таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэў – “ОЗЕТ[546]. У БССР яно называлася Белкамзет. Кіраваліся ў сваёй дзейнасці ўласным Статутам.

Усесаюзнаенае таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэяў у СССР было створана ў снежні 1924 г. У ліпені 1925 г. было выбрана Цэнтральнае ўпраўленне і Цэнтральны савет таварыства. 15.11.1926 г. адбыўся І-ы Усесаюзны з’езд[547]. З 1928 года і да сваёй ліквідацыі мела наступную структуру: прэзыдыум, арганізацыйны, перасяленчаскі, сельскагаспадарчы, вытворчы, агітацыйна-масавы, інфармацыйны сектары, бугалтэрыя, канцылярыя. На месцах дзейнічалі рэспубліканскія, краявыя, абласныя і раённыя саветы таварыства, яго ячэйкі на заводах, фабрыках, навучальных установах. Пастановаю палітбюро ЦК УсеКП(б) ад 11.05.1938 г. таварыства было ліквідавана[548].

У 1926 г. ячэйкі Белкамзета меліся ва ўсіх акруговых гарадах і ў большасці мястэчак[549]. Дзейнасць таварыства ахоплівала не толькі сацыяльна-эканамічнае, але і грамадскае і культурнае жыццё яўрэяў. Частка яўрэяў праз Белкамзет надзялялася зямлёй на тэрыторыі Савецкай Беларусі. Другая – перасялялася, добраахвотна-прымусова, на вольныя землі ў Крым і Далёкі Ўсход. Так, у лютым 1925 г., планава, толькі з двух паветаў (Гомельскага і Клінцоўскага) пераселена ў Крым 200 сямей яўрэяў. Гэта была своеасаблівая дэпартацыя, нягледзячы на пэўную добраахвотнасць. Ліст Белкамзета ад 09.08.1926 г. у Калінінскую акругу патрабаваў хутчэйшай адпраўцы яўрэйскіх сямей у Крым, каб не дапусціць зрыву гэтай важнай “перасяленчай кампаніі”. У пачатку чэрвеня 1926 г. сваёй пастановай прэзідыум Белкамзета аб’явіў кампанію па перасяленню яўрэяў з БССР у Крым “ударнай”[550].

[544] Дакументы (фотаздымкі) Яўрэйскага таварыства аказання дапамогі пацярпелым ад вайны і пагромаў (1919–1920) // ДАРФ. Ф. Р-9538. Воп. 1. Спр. 97. Арк. 1 ; Спр. 98. Арк. 1 ; Спр. 100. Арк. 1 ; Спр. 101. Арк. 1 ; Спр. 102. Арк. 1 ; Спр. 104. Арк. 1 ; Спр. 106. Арк. 1 ; Спр. 109. Арк. 1.

[545] Цыркуляры яўрэйскага аддзела // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 196. Арк. 62–77.

[546] *Басин Я.* Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки. С. 148–149.

[547] Парадак сходу і праект тэзісаў дакладаў на І-ым Усесаюзным з’ездзе Таварыства па землеўпарадкаванню яўрэйскіх працоўных // РДАСПГ. Ф. 272. Воп. 1. Спр. 116. Арк. 1–45.

[548] Пратаколы, справаздачы АЗЕТа // ДАРФ. Ф. Р-9498. Воп. 1. Спр. 11–15, 456–458, 578.

[549] Справаздачы аб працы рэспубліканскіх і абласных аддзелаў АЗЕТа // Там жа. Спр. 71, 315.

[550] Лісты Белкамзета // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 290. Арк. 60–94.

У мястэчках 90 % саматужнікаў складалі яўрэі. Для найлепшай абароны іх эканамічных інтарэсаў (яны мелі льготы на падаткі, на аплату камунальных паслуг), а таксама для вядзення культурнай працы і далучэння да грамадскай работы ствараліся таварыствы саматужнікаў. У 1924 г. па БССР іх было 68, ў 1926 г. таварыствы аб'ядналі больш 50 % саматужнікаў. Праз удзел у іх шэрагах, на працягу 1925–26 гг., чатыры яўрэі – саматужнікі былі абраны ў гарадскі савет, 36 народнымі засядацелямі ў судах, іншыя сталі заснавальнікамі гарадскіх таварыстваў узаемадапамогі. Пасля згортвання НЭПа яўрэі, якія займаліся гандлем, дробнай вытворчасцю, маглі знайсці прымяненне сваім ведам, навыкам, вопыту, нават сродкам толькі ў дзейнасці саматужніцка-прамысловай кааперацыі, якая была арыентавана на стварэнне прамысловай базы сацыялізму. Усялякія іншыя формы іх дзейнасці забараняліся.

Такім чынам, у міжваенны перыяд у савецкай Беларусі дзейнічалі розныя сіяніцкія партыі і арганізацыі, якія ўплывалі не толькі на заможных, саматужнікаў, але і на частку моладзі, якую прываблівалі праграмамі са своеасаблівым сінтэзам рэлігійных і сацыялістычных ідэй. Яны падзяляліся на некалькі груп: партыі і аб'яднанні, якія падтрымлівалі савецкую ўладу і пэўны час супрацоўнічалі з КП(б)Б; партыі і аб'яднанні, якія імкнуліся да стварэння сваёй дзяржавы і адстойвалі буржуазна-дэмакратычныя правы; варожым стаўленнем да КП(б)Б. Савецкая ўлада вяла нястомнае змаганне з усімі, пасля карных дзеянняў улад "выжылі" найбольш правыя яўрэйскія арганізацыі, якія на першае месца вылучалі агульнапалітычныя патрабаванні, а толькі затым нацыянальныя патрабаванні. Асобныя глыбока законспіраваныя групы сіяністаў праіснавалі да 1934 г. Найбольш паспяховую і плённую дзейнасць мелі шэраг грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, якія вырашалі эканамічныя пытанні яўрэйскага насельніцтва.

**Грамадскія арганізацыі польскага насельніцтва.** На рубяжы XIX–XX стст. на беларускіх землях існавалі польскія партыі і грамадскія аб'яднанні розных палітычных арыентацый[551]. Яны карысталіся падтрымкай значнай колькасці палякаў Беларусі. Найбольш уплывовымі былі арганізацыі рэлігійна-клерыкальнага кірунку. У некаторых з іх было сяброўства па канфесійных, а не нацыянальных прыкметах. Таму на тэрыторыі БССР у 1920-я гг. сярод вернікаў католікаў – палякаў і літоўцаў – узнікае і дзейнічае вялікая колькасць таварыстваў, брацтваў, гурткоў і г. д.[552] Іх дзейнасць мела не толькі рэлігійны, але і грамадскі характар.

Найбольш распаўсюджаным было таварыства "Тэрцыяраў". Яно аб'ядноўвала каталікоў – мужчын і жанчын. Для ўступлення ў яго патрэбна было 2 рэкамендацыі членаў – "тэрцыяраў". Згодна статута яны "… ўмацоўвалі

[551] *Литвинёнок Р.С.* Польское общественно-политическое движение в Беларуси и Литве (конец XIX–начало XX в.) // Вестник БГУ. Серия 3. 1998. № 2. С. 10–16.

[552] *Пушкин И.А.* Религиозные организации польского населения Восточной Беларуси (беларуско-русское пограничье) // Kultura pogranicza – pogranicze kultur / Redakcja naukowa Adam Bobryk. Siedlce–Pułtusk, 2005. S. 169–172.

сям'ю, маральны парадак у дзяржаве і стваралі арганізаваную армію служак у царкве". У Мінску ў студзені 1927 г., па дадзеных ДПУ, было не меней 80 "тэрцыяраў". Збіраліся яны на пасяджэнні кожную пятніцу пры кафедральным касцёле. Знаходзіла польская і літоўская моладзь выхад сваёй энергіі і ў працы таварystваў "Ружанца" – "Kołka Rużancowa". Як і "тэрцыяры", яны існавалі практычна пры кожным касцёле[553].

Невялікую частку асоб аб'ядноўвалі наступныя арганізацыі: "Таварыства Св. Вікенція з Пауля", "Таварыства Св. Сэрдца Ісуса і Марыі" (серцыянкі), "Таварыства Непарочнага зачацця Св. Дзевы" (непакаянкі), "Слугі Марыі" – таварыства аб'ядноўвала мужчын трыма групамі: сярод сялян, рабочых, інтэлігенцыі. Апошняе было вельмі законспіраванае. Наогул, большая частка з іх, адчуваючы на сабе варожасць камуністычных улад БССР, дзейнічалі ў строгай канспірацыі. Безумоўна, яны не імкнуліся да звяржэння савецкай улады, а змагаліся за маральнасць грамадства, актыўна ўдзельнічаючы ў штодзённым жыцці. Праз усе гэтыя таварыствы вялася актыўная работа ў развіцці як польскай, так і беларускай культуры.

Асобна сярод палякаў, як і літоўцаў, латышоў, немцаў, ствараліся культурна-асветныя і спартыўныя гурткі. Уладам не падабалася, што ва ўсіх без выключэння таварыствах і гуртках прапагандавалася ідэя "нацыянальнага адзінства".

У 1925 г. у Бабруйскай акрузе сяляне-палякі вылучылі патрабаванне стварыць "Камітэт абароны палякаў"[554]. Стварэнне падобных камітэтаў было выклікана, магчыма, і тым, што ўлады падчас выбараў складалі "чорныя спісы" выбаршчыкаў, якіх не дапускалі да выбараў[555]. У першую чаргу, у чорныя спісы траплялі члены розных арганізацый і брацтваў, сябры касцёльных рад.

У 1925–26 гг. у Дрыбінскім раёне паміж палякаў панавала думка аб неабходнасці ўлады Пілсудскага, згодна дадзеных аддзела ДПУ на тэррыторыі Магілёўскай акругі (1926–1927) – "палякі і каталікі-беларусы... выказвалі свае патрыятычныя погляды і сімпатыі Польшчы, выказвалі спадзяванні, што ў выпадку ўзнікнення вайны з Польшчай тэрыторыя Магілёўскай акругі абавязкова адыйдзе да яе...", у 1930 г. у Рудня–Нісімкавіцкім польскім сельсавеце адбылася дэманстрацыя з выкрыкамі "Далоў савецкую ўладу, да здраўствуе Пілсудзкі"[556].

Звесткі аб дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў палякаў на тэрыторыі заходняй часткі БССР у 1939–1941 гг. утрымліваюцца ў іншай главе манаграфіі (гл. раздзел 4.1).

---

553 Інфармацыйныя лісты ДПУ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2993. Арк. 12–13 ; *Пушкін І.* Удзел палякаў на Магілёўшчыне ў грамадска-палітычным жыцці БССР і адносіны да іх з боку дзяржаўнага кіраўніцтва 20-я гг. ХХ ст. // Проблемы славяноведения: Сборник научных статей и материалов. Вып.3. Брянск, 2001. С. 252–261 ; *Яго ж.* Грамадска-палітычная актыўнасць палякаў БССР у 20-я гады і адносіны да іх з боку дзяржаўнага кіраўніцтва // Край-Kraj: Дыялог на сумежжы культур / Рэд. А. Агееў, Я. Іваноў. Магілёў, 2000. С. 47–64.

554 Справаздачы польбюро // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1914. Арк. 90.

555 Палесская правда. 1925. 18 нояб. ; Матэрыялы польсекцыі // ДАГАГом. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1890. Арк. 18.

556 Лісты // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3723. Арк. 8 ; Інфармацыя ДПУ // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 841. Арк. 243–244.

Можна зрабіць выснову, што сярод польскага і літоўскага насельніцтва БССР дзейнічала значная колькасць таварыстваў, брацтваў, гурткоў. Найбольш уплывовымі былі арганізацыі рэлігійна-клерыкальнага кірунку. У некаторых з іх было сяброўства па канфесійных, а не нацыянальных прыкметах. Ва ўсіх без выключэння таварыствах і гуртках прапагандавалася ідэя "нацыянальнага адзінства", што не падабалася камуністычным уладам.

**Грамадскія аб'яднанні балтамоўнага насельніцтва БССР.** Літоўцы ўтваралі ў асноўным культурніцкія гурткі. Мэта – захаванне нацыянальных асаблівасцей. Але ў сваёй дзейнасці яны не цураліся і цікавасці да тагачасных грамадска-палітычных падзей. Члены гурткоў падтрымлівалі шчыльную сувязь з Літвой, былі выпадкі, калі літоўская моладзь з Савецкай Беларусі ішла служыць у літоўскае войска[557]. Дарэчы, падчас перавыбараў 1929–30 гг. у літоўскія нацыянальныя сельскія саветы камуністам прыйшлося вельмі цяжка. Па іх словах "прыйшлося змагацца за кожную кандыдатуру, прапанаваную партыяй". З пачаткам калектывізацыі стала яшчэ складаней. Літоўцы (асабліва жанчыны) выступалі вельмі арганізавана. Так, напрыклад, 24.07.1930 г., у дзень святкавання 10-годдзя БССР на сходзе ў Малькаўскім літоўскім нацыянальным сельскім савеце (Аршанская акруга) адбылося сапраўднае паўстанне. Жыхары запатрабавалі прымаць у калгас толькі літоўцаў і толькі на гэтым пагаджаліся з яго існаваннем, патрабавалі вярнуць раскулачаных. Калі пазней ДПУ пачало вывозіць чарговых "кулакоў", літоўцы ўзвялі барыкады, запрудзілі дарогу бярвеннямі[558].

У Віцебскай, Магілёўскай акругах у 1926–1927 гг. афарміліся нелегальныя латышскія групы. У сваёй дзейнасці яны імкнуліся да нацыянальна-культурнага развіцця, арыентаваліся на грамадска-палітычны лад Латвіі, арганізоўвалі пасяджэнні, на якіх абмяркоўвалі штодзённыя пытанні; падтрымлівалі сувязь з Латвіяй, адтрымоўвалі адтуль газеты. У 1925 г. камуністычныя ўлады БССР абвінавацілі ў арганізацыі ўсяго гэтага латышскага консула Г. Гіргенсона, які месціўся ў Віцебску[559].

Латышы імкнуліся арганізавацца і рэалізоўваць свае памкненні, якія шмат у чым не супадалі з камуністычнымі ўстаноўкамі. У Калінінскай акрузе ў 1928 г., падчас выбараў у латышскі нацыянальны сельскі савет, частка латышоў арганізавана спрабавала правесці сваіх прадстаўнікоў у савет. Напачатку яны мелі поспех. Але затым КП(б)Б спахапілася і ўзяла выбары пад жорсткі кантроль і не дапусціла абранне непажаданых асоб. Група латышоў не змірылася і паспрабавала на наступных выбарах правесці ў прэзідыум савета адну трэцюю частку складу са сваіх прадстаўнікоў[560]. Усе гэтыя латышы былі названы кулацкім элементам і высланы 2 групамі ў Сібір і за межы БССР за "антысавецкія выступы".

---

[557] Справаздачы аб працы сярод літоўскага насельніцтва // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 182.
[558] Матэрыялы па абследванню нацсаветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 109. Арк. 57, 60 адв.
[559] Справаздачы // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 1906. Арк. 35 ; Спр. 2987. Арк. 58 адв.
[560] Вынікі абследаванняў нацсаветаў // Там жа. Спр. 4267. Арк. 6.

Сярод латышоў – жыхароў гарадоў (18 % ад усяго латышскага насельніцтва) 80 % складалі рабочыя, якія даволі актыўна ўдзельнічалі ў савецкім будаўніцтве, сярод іх было шмат камуністаў і 20 % – інтэлігенцыя, былыя гандляры, служачыя і г. д. Менавіта частка апошніх у сярэдзіне 1920-х гг. імкнулася арганізавацца і ўтварыць свае арганізацыі і гурткі, якія ад пачатку стварэння былі падвергнутыя знішчэнню з боку ўладаў. У 1924–25 гг. праводзіліся "нелегальныя" сходы, было імкненне арганізавана дзейнічаць падчас выбараў у саветы, аб'яднацца праз кааперацыю і г.д.[561]

У выніку можна адзначыць, што ў сяродку літоўцаў і латышоў дзейнічалі розныя арганізацыі і гурткі, якія ставілі асноўнай мэтай захаванне нацыянальных асаблівасцей і нацыянальна-культурнае развіццё. Пад час выбараў у нацыянальныя сельскія саветы і правядзенне калектывізацыі выступалі вельмі арганізавана, для іх характэрна наяўнасць нацыянальна свядомага і дзейнага актыва.

Такім чынам, НЭП прадугледжваў розныя сацыяльна-эканамічныя ўклады ў гаспадарцы, якія, зразумела, прадвызначалі шматпартыйнасць і наяўнасць альтэрнатыў, чаго ніяк не хацелі дапусціць бальшавікі. Яны настойліва вялі справу да ліквідацыі нацыянальных палітычных партый і арганізацый, стварэнне якіх было не санкцыянавана камуністычнымі ўладамі.

У выніку розных прычын большасць новаўтвораных і тых, што дзейнічалі раней, нацыянальных грамадска-палітычных аб'яднанняў нацыянальных меншасцей знаходзілася ў апазіцыі да камуністычнай партыі і адпаведна, часткова, да савецкай улады.

Напрыканцы 1920-х гг. усе нацыянальныя грамадскія арганізацыі былі ліквідаваны, большасць членаў аб'яднанняў нацыянальных меншасцей абвінавачаны ў контррэвалюцыйный дзейнасці, арганізацыйна разгромлены і высланы за межы БССР. Асобныя глыбока заканспіраваныя групы праіснавалі да сярэдзіны 1930-х гг. У гісторыі БССР вядома існаванне нелегальных нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля 1939 г.

### 3.2 Удзел у арганізацыях, якія складалі палітычную сістэму БССР

Паказчыкам магчымасцей удзелу нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці стала іх дзейнасць у аб'яднаннях, якія складалі палітычную сістэму БССР: у камуністычнай партыі, прафсаюзах, дзяржаўных інстытутах (наркаматах, саветах), камсамоле, кааператыўных аб'яднаннях, творчых саюзах і іншых.

**Нацыянальныя асаблівасці КП(б)Б.** Рэальную ўладу мела толькі КП(б)Б, праз яе структуры вялікую актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці БССР праяўляла шмат прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей (гл. дадаткі В, Г). У 1920-я гг. у Савецкай Беларусі сярод членаў камуністычнай партыі (бальшавікоў) было шмат яўрэяў, рускіх і ўкраінцаў, асабліва першых.

[561] Справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2987. Арк. 58 адв.

Магчыма, таму ў савецкі час у афіцыйных выданнях нацыянальны склад КП(б)Б падаваўся толькі з канца 1930-х гг.[562]

Для прыкладу разгледзім склад адной з акруговых партыйных арганізацый. У арганізацыі КП(б)Б Бабруйскай акругі на 01.01.1926 г. было 1932 чал. З іх: рабочых – 1160 (60,5 %), сялян – 474 (24,5 %), служачых і іншых – 298 (1 %). Жанчыны складалі ўсяго – 9,9 % (193 асобы). Згодна нацыянальнасці: беларусаў – 48,1 %, яўрэяў – 32,1 %, палякаў – 3,6 %, рускіх – 10,5 %. За апошнія тры месяцы 1925 г. засведчана павышэнне працэнтнай вагі беларусаў, палякаў і памяншэнне рускіх і яўрэяў[563]. Да канца 1927 г. назіралася павелічэнне колькасці прадстаўнікоў тытульнай нацыі (гл. табліца 7). У 1928 г. у рэспубліцы налічвалася 31694 членаў партыі[564], з іх 46,8 % небеларусаў.

Табліца 7 – Нацыянальны склад Бабруйскай арганізацыі КП(б)Б, 01.01.1928 г.[565]

| | **Усяго** | **Працэнт нацменшасцей** | **Бел.** | **Рус.** | **Яўр.** | **Пал.** | **Лат.** | **Літ.** | **Інш.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Членаў | 3386 | 44,13 % | 1892 | 265 | 966 | 123 | 37 | 26 | 77 |
| Жанчын | 338 | 67,76 % | 109 | 33 | 170 | 15 | 7 | 1 | 3 |

У сярэдзіне 1920-х гг. у апараце ЦК і ЦКК КП(б)Б сярод адказных работнікаў (сакратары, загадчыкі аддзелаў і іншыя) было: беларусаў – 22,4 %, рускіх – 14,5 %, палякаў – 12,1 %, яўрэяў – 46,2 %, іншых – 4,8 %; з членаў акружкомаў КП(б)Б было беларусаў – 28,5 %, яўрэяў – 27 %, палякаў – 5,5 %, рускіх – 29 %, іншых нацыянальнасцей – 10 %[566].

На персанальным наменклатурным уліку ў ЦК КПБ на 01.01.1939 г. налічалася 156 адказных працаўнікоў, з іх нацменшасці складалі 25,6 %. Іх было сярод першых-трэціх сакратароў раённых і гарадскіх камітэтаў партыі – 31 %, першых сакратароў – 38,5 %, другіх сакратароў – 28,2 %, трэціх сакратароў – 26,1 %. У 1940 г. сярод усіх сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ прадстаўнікі нетытульнай нацыі ў БССР складалі – 31,8 %, першых сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ – 31,4 %, другіх сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ – 33,5 %, сакратароў гаркамаў і райкамаў – 30,4 %[567].

У Магілёўскай вобласці сярод усіх сакратароў прадстаўнікі нетытульнай нацыі складалі 33,3 %. З 20 першых сакратароў райкамаў і гаркамаў іх было 25 % (1 – рускі і 4 яўрэі), сярод другіх сакратароў (21 асоба) – 33,3 % (1 – рускі, 6 – яўрэяў), у складзе трэціх сакратароў (19) – 42,1 % (1 – рускі, 7 – яўрэяў).

---

[562] Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988.
[563] Інфармацыйная справаздача Бабруйскага акруговага камітэта КП(б) Б // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 412. Арк. 70–72.
[564] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё . С. 347.
[565] Інфармацыйная даведка // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 557. Арк. 38.
[566] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (1920-я гг.). С. 58.
[567] Нацыянальны склад партыйных кадраў // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 968. Арк. 129–131, 142–144, 154–156, 166–168.

Прыкладна такая жа прапорцыя нацыянальных кадраў захоўвалася і на ніжэйшым узроўні загадчыкаў аддзелаў, камсамольскіх сакратароў, старшыняў райвыканкамаў[568].

Аналізуючы нацыянальны склад КП(б)Б у працэнтах (разам кандыдаты і члены) за 1924–1939 гг., можна заўважыць, што праз яе структуры найбольш вялікую актыўнасць у пабудове сацыялістычнага грамадства БССР прымалі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. На працягу ўсяго перыяду яўрэі складалі не менш 25 % усяго складу кампартыі (бальшавікоў) Беларусі, рускія і ўкраінцы ад 13 да 29 %[569]. Назіралася агульная тэндэнцыя да скарачэння колькасці членаў партыі і кандыдатаў у асяродку нацыянальных меншасцей[570]. Паступова ў шэрагах арганізацыі павялічвалася колькасць тытульнага насельніцтва. Гэта тлумачыцца як правядзеннем беларусізацыі, так і саветызацыяй, павышэннем адукацыйнага ўзроўню, далучанасці да грамадска-палітычных працэсаў беларускага насельніцтва.

**Удзел у дзейнасці прадстаўнічых і выканаўчых органаў цэнтральнай улады.** Тэндэнцыі падпарадкавання лініі камуністычнай партыі ўсіх думак і поглядаў прывяла ў другой палове 1920-х гг. да ўзмацнення партыйнага ўціску ў розных сферах жыцця Савецкай Беларусі. Гэта датычылася органаў савецкай улады розных узроўняў і грамадскіх арганізацый. Тым не менш, адметнай рысай грамадска-палітычных кампаній гэтага перыяду было іх дэмакратычнае правядзенне.

Важным напрамкам работы нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці з'яўляліся выбарчыя кампаніі. Сярод іх варта вылучыць удзел у выбарах і працы Усебеларускіх з'ездаў (гл. табліца 8) і мясцовых органах кіравання – саветах.

З'езды выкарыстоўваліся для паказу падтрымкі палітыкі савецкай улады і КП(б)Б як у справе пабудовы сацыялізму, змагання з сусветным і ўнутраным капіталізмам, так і ў галіне нацыянальнай палітыкі. Аднак прадстаўнікі розных сацыяльных груп (сяляне, рабочыя, саматужнікі) нацыянальных меншасцей мелі магчымасць выкарыстоўваць гэтыя з'езды для вырашэння сваіх патрэб.

Да таго ж напярэдадні ўсеагульных з'ездаў праводзілася вялікая падрыхтоўчая праца – праводзіліся сходы і канферэнцыі. Напрыклад, перад скліканнем 02.07.1929 г. Усебеларускага з'езда палякаў прайшлі акруговыя канферэнцыі. Раней, у 1924 г., быў скліканы і праведзены Усебеларускі з'езд жанчын-полек, у 1925 г. – Усебеларускі з'езд сялян-палякаў, у 1926–27 гг. былі

---

[568] *Пушкин И.А.* Роль и значение национальных меньшинств в партийно-советском руководстве Могилёвщины // Романовские чтения: сб. трудов Международной науч.конференции. Могилёв, 2005. С. 389 ; *Яго ж.* Партия и советы: фамилии и статистика // История Могилевского еврейства: док. и люди: науч.-попул. очерки и жизнеописания. В 2 кн. Кн. 2, ч. 1. Минск, 2006. С. 75–77.

[569] *Пушкін I.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (1920-я гг.). С. 58.

[570] Даклады камісій // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2005. Арк. 527 ; Спр. 4713. Арк. 49 ; Спр. 4323. Арк. 46 ; *Пушкін I.A.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. XX ст.) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1998. С. 33.

праведзены 33 раённыя канферэнцыі палякаў (з іх 14 жаночых), у 1927–28 гг. 31 раённая канферэнцыя (з іх 4 жаночых) і г. д.[571]

Табліца 8 – Нацыянальны склад дэлегатаў Усебеларускіх з'ездаў саветаў[572]

| | **3 з'езд 1921 г.** | **4 з'езд 1922 г.** | **5 з'езд 1924 г.** | **6 з'езд надзвыч. 1924 г.** | **7 з'езд 1925 г.** | **8 з'езд 1927 г.** | **9 з'езд 1929 г.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго дэлегатаў | 216 | 250 | 326 | 405 | 716 | 676 | 584 |
| Беларусаў | 113 | 120 | 157 | 175 | 319 | 390 | 364 |
| Рускіх | 32 | 39 | 47 | 62 | 63 | 107 | 60 |
| Яўрэяў | 53 | 66 | 87 | 123 | 86 | 115 | 95 |
| Палякаў | 9 | 12 | 15 | 14 | 16 | 30 | 24 |
| Іншых | 9 | 13 | 20 | 31 | 41 | 34 | 41 |

Наогул, у сельскай мясцовасці часта склікаліся сельскія сходы. Значная частка якіх адбывалася летам, часам па некалькі разоў на працягу тыдня. Гэта выклікала нараканні сялян: "За сходам мы не маем часу нават паспаць" (Каменскі сельскі савет). Характэрна, што сярэдні ўдзел насельніцтва ў сходах быў у большасці нізкі. Па пэўных сельскіх саветах яўка на шэраг сходаў вагалася ад 24 да 44 %, у мястэчках ад 27 да 69 %. На сходах вырашаліся пытанні па самаабкладанню, аб размеркаванні сенажаці, адчыненні ясляў, школ і інш.[573]

Удзел польскага насельніцтва ў працы органаў дзяржаўнай улады і кіравання быў прааналізаваны даследчыкам А. Лейзеравым. Ён адзначыў яго на ўсіх узроўнях прадстаўнічай сістэмы – ад вышэйшых да мясцовых органаў улады. Так, сярод дэлегатаў VI Усебеларускага з'езда саветаў палякі складалі 3,4 %, VIII Усебеларускага з'езда саветаў – 4,5 % (параўнайце з працэнтам польскага насельніцтва ў агульнай масе жыхароў БССР, які складаў 1,96 %). На акруговых з'ездах саветаў у 1923–24 гг. палякі складалі 2,5 %, у 1926 – 2,6 %. У ЦВК БССР VI склікання палякамі з'яўляліся 8,0 % ад агульнага ліку, VIII-га склікання – 4,4 %. У складзе павятовых выканаўчых камітэтаў (1923–1924), якія ўвасаблялі дзяржаўную ўладу ў перыяд паміж павятовымі з'ездамі саветаў, палякаў было – 3,4 %, у складзе акруговых выканаўчых камітэтаў у (1927) – 3,5 %, РВК: 1925 г. – 1,5 %, 1926 – 2,5 %, 1927г. – 3,1 %. Належным чынам былі прадстаўлены палякі і ў гарадскіх саветах БССР: 1925г. – 3,2 %, 1926 г. – 2,2 %, 1927 г. – 2,5 %[574].

---

[571] Матэрыялы аб працы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3033. Арк. 123 ; Спр. 4323. Арк. 45.

[572] Падлічана па: *Бараноўскі Я.І.* За дружбу народаў: Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў 1921–1925 гг. Мінск, 1972. С. 90 ; История государства и права Белорусской ССР. В 2 т. Т. 1. Минск, 1970. С. 145, 306–307.

[573] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё . С. 348.

[574] *Лейзеров А.* Участие поляков в государственной, экономической, культурной жизни Беларуси (1920–30-е годы) // Нацыянальныя пытанні: Матерыялы III Міжнар.кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цівілізацый" (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000г.). Мінск, 2001. С. 194–195.

Аналізуючы матэрыялы з’ездаў (найбольш часта яны праводзіліся ў 1926–1928 гг.), можна зрабіць высновы, што акрамя пытанняў развіцця і ўдасканалення сельскай гаспадаркі, найбольш часта гучалі пытанні нацыянальнай культурна-асветнай работы (стварэнне, дзейнасць, матэрыяльныя ўмовы школ, хат-чытален, бібліятэк, дзейнасці гурткоў і г. д.), выдання падручнікаў, газет, літаратуры на нацыянальных мовах, падрыхтоўкі настаўнікаў, стварэння нацыянальных саветаў, развіцця кааперацыі. Іншыя прапановы і не маглі з’явіцца, бо на падобныя форумы траплялі толькі загадзя правераныя і падрыхтаваныя органамі КП(б)Б асобы.

Улады вымушаны былі прыслухоўвацца да прапаноў, якія гучалі на з’ездах і пераўтвараць у жыццё пэўныя пастановы, безумоўна, толькі ў рэчышчы камуністычнага будаўніцтва (адкрываліся нацыянальныя школы, але толькі савецкага тыпу; кааперацыя з 1928 г. разумелася толькі як калектывізацыя – стварэнне калгасаў, а не варыянт розных тыпаў кааперацыі: арцелей, таварыстваў, кааператываў і г. д.).

Палітыка ажыўлення працы мясцовых саветаў, у тым ліку і нацыянальных, садзейнічала прыцягненню да грамадска-палітычнага жыцця больш шырокага кола насельніцтва, за выключэннем тых, хто быў пазбаўлены выбарчых правоў. Аднак сапраўдная актывізацыя дзейнасці саветаў прывяла б іх да супрацьстаяння з партыйнымі органамі, якія імкнуліся да адзінаўладдзя. Таму ажыўленне работы саветаў адбывалася марудна і нават стрымлівалася палажэннем аб дзейнасці саветаў, прынятым у 1922 г. Яно не давала ім амаль ніякіх правоў. Толькі палажэнні 1924-га, а затым 1925 г. дазволілі абмяркоўваць і вырашаць пытанні мясцовага жыцця[575].

Неабходна заўважыць, што новыя формы і метады работы ў нямалай колькасці выпадкаў не даходзілі да працоўных (сялян). Утварыўся пэўны разрыў паміж саветамі і працоўнымі, яшчэ больш паміж імі і заможнай часткай вёскі.

У значнай ступені гэтым можна растлумачыць нізкую яўку насельніцтва на выбары саветаў, якія адбыліся ў 1924 г. Усяго па БССР у гэтых выбарах прынялі ўдзел 35,47 % выбаршчыкаў. Характэрнай іх рысай былі істотныя адхіленні ў розных мясцовасцях ад сярэдніх паказчыкаў. У 50 раёнах БССР у іх удзельнічалі менш як 35 % выбаршчыкаў, а ў 17 – не больш за 15 %.

Гэтая акалічнасць запатрабавала правядзення паўторных выбараў у тых саветах, пераважна сельскіх, дзе быў слабы ўдзел насельніцтва ў галасаванні. Выбары адбыліся ў лютым–сакавіку 1925 г. і ахапілі 737 саветаў з 1208. У час выбарчай кампаніі быў улічаны вопыт папярэдніх выбараў і ўзмоцнена агітацыйна-прапагандысцкая работа. У той час меліся поспехі ў аднаўленні народнай гаспадаркі. Усё гэта прывяло да павышэння актыўнасці насельніцтва. У сярэднім па БССР у паўторных выбарах удзельнічалі 42,6 % выбаршчыкаў. Павышэнню працэнта ўдзельнікаў садзейнічала і вяртанне выбарчых правоў частцы з тых, хто раней быў пазбаўлены іх.

---

[575] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. Мінск, 1995. С. 11.

Выбары ў саветы ў 1926–1927 гг. прайшлі пры сярэдняй актыўнасці выбаршчыкаў. У вёсках БССР яўка была 46,3 %. Рост невялікі. У час наступных выбараў у 1927–1928 гг. уплыў на актыўнасць аказаў хлебны крызіс. Але ў гэты час ужо стала назірацца масіраваная ідэалагічная дзейнасць партыйных і савецкіх органаў, узмацненне наступлення на заможную частку вёскі. Адбывалася карэнная змена ўнутрыпалітычнага курсу.

Шмат было прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у кіруючых выканаўчых органах, якія аказвалі адчувальны ўплыў на савецкае і гаспадарчае будаўніцтва БССР (гл. дадатак Д). Побач з беларусамі працавалі: рускія, яўрэі, латышы, татары, палякі, літоўцы, украінцы, немцы і іншыя асобы. Сярод адказных кіраўнікоў наркамата працы прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 75 %, у Вярхоўным судзе – 40 %, наркамаце РСІ – 60 %, наркамаце гандлю – 66 %, дзяржплане – 77 %, наркамаце земляробства – каля 45 %, НКУС – 55 %, наркамаце фінансаў – каля 55 %, наркамаце аховы здароўя – 90 %, наркамаце асветы – 58 %, наркамаце юстыцыі – 77 %, ЦСУ – 58 %[576].

Даволі высокі працэнт яўрэяў быў сярод адказных работнікаў рэспубліканскіх устаноў: у адміністратыўных, гаспадарчых, судовых, кааператыўных, зямельных, а таксама ў акруговых, дзе іх, напрыклад, было: у адміністратыўных – 19,1 %, зямельных – 82 %. Шмат прадстаўнікоў рускай нацыянальнасці было сярод той жа катэгорыі работнікаў у рэспубліканскіх і акруговых установах – там іх колькасць была ў 2–3 разы большая за сярэднестатыстычную па рэспубліцы і толькі ў кааператыўных іх колькасць у працэнтных адносінах амаль адпавядала сярэдняй па БССР – 8,8 % (7,7 %). Працэнт палякаў у акруговых зямельных установах (2,1 %) амаль адпавядаў колькаснаму складу польскага насельніцтва савецкай Беларусі. Больш было палякаў сярод адказных работнікаў акруговых адміністратыўных устаноў – 4,2 % і рэспубліканскіх кааператыўных – 5,0 %, але не было ніводнага паляка ў рэспубліканскіх судовых і зямельных установах[577].

Можна адзначыць, што амаль паўсюль удзельная вага нацыянальных меншасцей у органах цэнтральнай прадстаўнічай і выканаўчай улады была вышэйшая за іх працэнт у агульным складзе насельніцтва БССР.

**Стварэнне, грамадска-палітычны і культурна-асветніцкі стан нацыянальных саветаў.** Згодна тагачаснай палітыцы ў месцах кампактнага пражывання прадстаўнікоў пэўных нацыянальнасцей утвараліся нацыянальныя саветы – сельскія і местачковыя, якія, з’яўляючыся органам савецкай улады ў вёсцы, выконвалі неабходныя функцыі ў адміністрацыйнай, гаспадарчай і культурнай сферах. Яны каардынавалі гаспадарчую дзейнасць сялян, прапагандавалі новыя агратэхнічныя метады, уводзілі розныя формы кааперацыі.

Як правіла, у сялянскіх гаспадарках літоўцаў, латышоў, палякаў, немцаў і іншых выкарыстоўваліся больш перадавыя тэхналогіі і дасягненні агракультуры.

[576] Нацыянальны склад наркаматаў // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1118. Арк. 5–25.
[577] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХ ст.). С. 59.

У выніку гэтыя сяляне часта атрымоўвалі больш высокія ўраджаі і прыбыткі ў параўнанні з сялянамі-беларусамі. Гэта стала прычынай таго, што падчас калектывізацыі іх залічылі ў разрад кулакоў і затым разам з сем'ямі рэпрэсавалі.

Утварэнне нацыянальных раёнаў і сельскіх (местачковых) саветаў было выклікана пастановай III Усесаюзнага з'езда саветаў (май 1925) "Аб савецкім будаўніцтве" у якой сцвярджалася, што хутка будуць прыняты шэраг мераў "забяспечваючых і абараняючых інтарэсы нацыянальных меншасцей"[578].

Пастановай Прэзідыума ЦВК БССР ад 24.09.1925 г. было ўтворана 5 латышскіх, 2 нямецкіх, 9 польскіх, 2 рускіх, 5 яўрэйскіх нацыянальных сельскіх і местачковых Саветаў. У 1926 г. нацыянальныя саветы абслугоўвалі 69495 чалавек: яўрэяў – 25629, палякаў – 18491, рускіх – 3697, латышоў – 1971, немцаў – 2167, беларусаў – 9379, другіх нацыянальнасцей – 1221. На тэрыторыі нацыянальных саветаў жылі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей (гл. табліца 9).

Табліца 9 – Склад нацыянальных сельскіх саветаў БССР[579]

| | **1926 г.** | **1927 г.** |
|---|---|---|
| У польскіх сельскіх саветах – палякаў | 84,3% | 84,2 % |
| У латышскіх сельскіх саветах – латышоў | 78,5 % | 86,3 % |
| У нямецкіх сельскіх саветах – немцаў | 90 % | 75 % |
| У рускіх сельскіх саветах – рускіх | 78,8 % | 73 % |
| У яўрэйскіх сельскіх саветах – яўрэяў | 75,9 % | 91,2 % у сельскіх, 60,5 % у местачк. нацсаветах |

У працэнтных суадносінах нацменшасці былі ахоплены нацсаветамі: яўрэі – 42 %, рускія – 15 %, палякі – 20 %, латышы – 15 %, украінцы – 7 %, немцы – 52 %. Яўрэі і немцы былі больш ахоплены таму, што пражывалі кампактна. Усяго па рэспубліцы ў 1920-я гг. было даволі шмат нацыянальных саветаў (гл. табл. 10).

Табліца 10 – Колькасць нацыянальных саветаў у БССР[580]

| **Год** | **Яўр.** | **Пол.** | **Ням.** | **Лат.** | **Рус.** | **Укр.** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1924 | 7 | – | – | 2 | – | – | 9 |
| 1925 | 11 | 2 | 1 | 5 | 1 | – | 20 |
| 1926 | 18 (6 вяск.) | 13 | 2 | 4 | 1 | – | 38 |
| 1927 (без Гомельшчыны) | 22 | 23 | 2 | 5 | 2 | – | 54 |
| 1927 (з Гомельскай акруг.) | 24 | 29 | 2 | 5 | 16 | 2 | 78 |

Масава нацыянальныя сельскія саветы ў БССР сталі ствараццa з 1926 г. У той год з'явілася 19 нацыянальных сельскіх саветаў (30,65 % ад агульнай

[578] Административно-территориальное устройство БССР: Справочник. В 2-х т. Т. 1. Минск, 1985. С. 12.
[579] Падлічана па: Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч 2: Работа среди нац. меншинств в БССР. Минск, 1928. С. 96–97.
[580] Там жа. С. 96–98.

колькасці існаваўшых нацыянальных с/с у нашай рэспубліцы). У 1927 г. – 20 (32,26 %), 1928 г. – ніводнага, 1929 г. – 1 (1,61 %), 1930 г. – ніводнага, 1931 г. – 6 (9,67 %), 1932 г. – 11 (17,74 %, у сувязі са стварэннем шэрагу польскіх с/с у Койданаўскім польскім раёне), 1933 г. – 3 (4,84 %), 1934 г. – 2 (3,22 %). 1934 г. быў апошнім годам, калі ў БССР ствараліся нацыянальныя адміністратыўна-тэрытарыяльныя адзінкі: Фелікс-Конаўскі польскі сельскі савет у Бялыніцкім раёне, Замасцянскі польскі, які ўзнік у выніку ліквідацыі другога польскага нацыянальнага савета. У 1920–1930-я гг. у БССР пабывалі ў якасці нацыянальных больш за 70 сельскіх саветаў: 37 польскімі, 15 рускімі, 6 украінскімі, 8 яўрэйскімі, 5 латышскімі, 2 нямецкімі, 1 літоўскім. А таксама 17 у якасці яўрэйскіх нацыянальных местачковых саветаў[581].

У якасці прыкладу варта разгледзіць сацыяльна-эканамічны, культурна-асветніцкі і грамадска-палітычны стан некаторых саветаў.

*Мархлеўскі нацыянальны польскі сельскі савет* Талачынскага раёна Аршанскай акругі[582] быў арганізаваны ў лютым 1926 г. У кіруючы склад сельсавета уваходзілі 10 асоб (1927): 9 палякаў і 1 беларус, 9 сялян і 1 служачы, 2 жанчыны. Будынак сельсавета знаходзіўся ў прыстасаваным памяшканні і не адпавядаў свайму прызначэнню.

Пры сельсавеце былі арганізаваны пяць камісій па тры чалавекі ў кожнай: падатковая, культурная, гаспадарчая, кааперацыйная і санітарная. Старшынямі камісій былі члены сельсавета. Акрамя таго яшчэ каля 10 асоб былі ўцягнуты ў актыў сельсавета. Больш ці менш задавальняюча працавалі падатковая, культуры і кааперацыйная. Рэгулярна на пасяджэнні збіраўся толькі прэзыдыум сельсавета (утрох і ўсе палякі). На яго сходах разглядаліся пытанні аб памерах і своечасовай аплаце падаткаў, арганізацыі пажарнай аховы, паляпшэнні дабрабыту, развіцці культуры і інш. Справаздачы аб працы сельсавета звычайна рабіў старшыня на сходах у населенных пунктах на польскай і беларускай мовах. Сельсавет карыстаўся аўтарытэтам у мясцовага насельніцтва і аказваў на яго значны ўплыў. Справаводства вялося на польскай мове, за некаторымі выключэннямі. Адносіны да беларускай мовы былі здавальняючыя. Насельніцтва абслугоўвалася на нацыянальных мовах – па-польску і па-беларуску, якая лічылася мовай нацыянальнай меншасці ў складзе сельсавета.

На тэрыторыі сельсавета знаходзілася 23 населенных пункты. У іх было 376 двароў і пражывалі згодна перапісу (1926): 1393 палякі (71,29 %), 491 беларус (25,13 %), 62 рускіх (3,17 %), па 4 літоўца і украінца (па 0,2 %). Найбольшая адлегласць двароў ад цэнтра сельсавета складала 7 вёрст. Дарогі былі ў здавальняючым стане.

Бедняцкіх гаспадарак налічвалася – 191, серадлякоў – 121, кулакоў – 3 (0,95 %). Батракоў (1927) – 26 чал., у 19 гаспадарках не мелася коней. 82 % жыхароў

---

[581] Административно-территориальное устройство БССР. С. 5–20 ; *Басин Я.* Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки. С. 155.

[582] Вывады аб працы Мархлеўскага нацыянальнага польскага савета Талачынскага раёна Аршанскай акругі // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1007. Арк. 11–13.

сельсавета своечасова плацілі падаткі, 42 гаспадаркі (13,4 %) былі вызвалены ад падатку наогул.

Насельніцтва выкарыстоўвала шматпольную форму землякарыстання, імкнулася да племянной (коні, быкі) жывёлагадоўлі. Некаторыя займаліся пчалярствам. Вырошчвалі: жыта, пшаніцу яравую, ячмень, авёс, грачыху, гарох, боб, каноплю, лён, канюшыну, кармавыя травы, бульбу. Леса на тэрыторыі сельсавета – 117 дзесяцін, ім насельніцтва было забяспечана кепска, таму былі выпадкі самавольных парубак. Наогул, лес выкарыстоўваўся не гаспадарліва. Прамысловасці не было, саматужніцкая вытворчасць складалася з 5 кузняў і арцелі калеснікаў. Ад жыхароў неаднаразова гучалі думкі аб неабходнасці арганізацыі цагельні і рамеснай школы па падрыхтоўцы сталяроў, кавалёў, слесараў.

Сельсавет арганізаваў грамадскія арганізацыі: МОПР – 25 чал., “Прэч непісьменнасць” – 19 чал., але працавалі яны фармальна. Кааперытыўных аб’яднанняў практычна не было, крэдытаў бралі мала. Спрабавалі наладзіць працу камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. Матэрыяльная дапамога аказвалася: незаможным сялянам, чырвонаармейцам, удовам, батракам.

На тэрыторыі сельсавета было чатыры школы, з іх дзве польскія, па адной польска-беларуская і беларуская. Усяго дзяцей у школах – 232 вучня (1927/1928 нав. год). У канцы 1920-х гг. школы размяшчаліся ў наймаемых памяшканнях. Падручнікамі былі забяспечаны здавальняюча. У бібліятэцы не хапала кніг і газет на польскай мове. Каля 115 дарослых не рэгулярна наведвалі пункты па ліквідацыі непісьменнасці на польскай і беларускай мовах. Шэсць асоб напрыканцы 1920-х гг. вучыліся ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Бальніц і фельшарскіх пунктаў у пачатку 1930-х гг. на тэрыторыі сельсавета не было.

Акруговы выканаўчы камітэт КП(б)Б неаднаразова рабіў выснову, што сельсавет, як нацыянальны, цалкам сябе апраўдаў.

*Грудзінаўскі латышскі нацыянальны сельскі савет* Быхаўскага раёна Магілёўскай акругі быў арганізацыйна афармлены ў жніўні 1924 г.[583] Склад сельсавета – 10 чал., беднякоў – 2, серадднякоў – 6, заможных – 1, служачы – 1, жанчын – 2, членаў КП(б)Б – 2 (1928). Да пачатку 1930-х гг. сельсавет займаў пакой у памяшканні хаты-чытальні. У ім практычна штогод мяняліся старшыні і сакратары сельсавета (члены КП(б)Б). Яны прысылаліся партыйнымі органамі і іх не задавальняла цяжкае матэрыяльнае становішча ў якім яны знаходзіліся, асабліва ў параўнанні з дабрабытам мясцовага латышскага насельніцтва. Неаднаразова намеснікам старшыні сельсавета выбіралася мясцовая настаўніца.

[583] Акт абследавання Грудзінаўскага латышскага нацыянальнага сельскага савету Быхаўскага раёна // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4267. Арк. 15–18 адв.; *Пушкин И.А.* Грудиновский латышский национальный сельский совет // Латыши и белорусы: вместе сквозь века: сб. науч. ст. Вып. 3. Минск, 2014. С. 44–50 ; *Яго ж.* Социально-экономическое и культурное развитие латышского населения БССР (на примере Грудиновского латышского национального сельского совета) // Современные проблемы гуманитарных и общественных наук. Серия «Социально-политическое развитие российского общества». Вып. 2 (15). Воронеж, 2017. С. 82–91.

Пры сельсавеце былі арганізаваны пяць камісій: культурна-асветная, сельскагаспадарчая, фінансава-падатковая, гандлёва-кааперацыйная і мясцовай гаспадаркі, у кожнай з іх лічылася па пяць асоб. За выключэннем сельскагаспадарчай, камісіі практычна не працавалі. Рэгулярна на пасяджэнні збіраўся толькі прэзыдыум сельсавета (тры асобы), які абмяркоўваў наступныя пытанні: арганізацыйныя, правядзенне пасяўной кампаніі, памер і збор сельскагаспадарчага падатку, дзяржпазыкі, землеўпарадкаванне, разгляд заяў і г. д. Справаздачы аб працы сельсавета на агульным сходзе рабіў старшыня 1–2 разы ў год на латышскай мове. Сельсавет таксама выконваў усю тэхнічную працу выбарчай камісіі.

Абслугоўванне насельніцтва вялося на латышскай мове. Аднак справаводства было амаль цалкам на рускай мове, акрамя запісаў ЗАГСа, якія вяліся на латышскай і беларускай мовах. Заявы ў сельсавет насельніцтва пісала на рускай мове. Надпісы на афіцыйных штампах былі на беларускай і рускай мове, на пячатцы да 1929 г. толькі на беларускай мове.

Сельсавет арганізоўваў і праводзіў сходы беднаты (якой было каля 14–26 %), але тыя да пачатку калектывізацыі ніякага ўплыву на астатняе насельніцтва не мелі. Быў дэлегацкі сход жанчын. Спрабавалі стварыць ячэйкі Авіяхіма, МОПРа, якія хутка распадаліся. Больш трывалым аказаўся гурток аматараў радыё. У 1927 г. узнікла ячэйка ЛКСМБ, у 1928 г. кандыдацкая партгрупа (2 члена КП(б)Б і 1 кандыдат), пасля 1929 г. піянерская арганізацыя.

На тэрыторыі сельсавета пражывалі 650 асоб (1928) і была 141 гаспадарка: латышоў – 590 чал. (90,77 %), 127 гаспадарак (90,07 %); беларусаў – 51 (7,85 %), 13 гаспадарак (9,22 %); палякаў – 9 (1,38 %), 1 гаспадарка (0,71 %). 4 % жыхароў былі пазбаўлены выбарчых правоў. Насельніцтва абслугоўвалася поштай 3 разы на тыдзень.

Насельніцтва мела 1565 дзесяцін ворыўнай зямлі, 148 коней, 303 каровы, 409 авечак, 193 свінні. Форма землякарыстання – хутары, шматполле (шасціполле) з жывёлагадоўчым ухілам (малочная жывёла і свінаводства). Вырошчвалі збожжа, бульбу, канюшыну. Займаліся пчалярствам. У 1928 г. было праведзена землеўпарадкаванне, у 22 гаспадарак абрэзалі зямлю (406 дзесяцін). З іх утварылася 49 новых гаспадарак, якія раней былі беззямельнымі. Зямлю атрымалі 11 латышскіх сямей, якія жылі на тэрыторыі сельсавета і 38 беларускіх з-за яго межаў.

На тэрыторыі сельсавета жылі 5 кавалёў, 1 шавец, 5 краўцоў, якія адначасова займаліся сельскай гаспадаркай. Частка насельніцтва наймалася на лесанарыхтоўкі. На хутарах было пашырана самагонаварэнне, таму ня рэдка заводзіліся адміністратыўныя справы за самагонаварэнне, шынкарства, хуліганства. Сельскагаспадарчы падатак жыхарамі выконваўся на 90 %. У 39 бядняцкіх гаспадарак ён быў адменены цалкам.

Сярод латышскага насельніцтва было шырока развіты кааперацыя і самаабкладанне дадатковым падаткам на мясцовыя патрэбы. Яно актыўна брала крэдыты. За кошт самаабкладання адрамантавалі і пабудавалі 5 новых мастоў, зрабілі рамонт дарог.

Насельніцтва сельсавета было кааперавана на 96,7 %. Спажывецкае таварыства ахоплівала 57,7 % гаспадарак, малочная арцель – 33,5 %, крэдытная – 46,5 %, машыннае таварыства – 10 %. Малочная арцель аб'ядноўвала 90 сямей (з нацыянальнага савету толькі 47) з 183 каровамі. За 1928 г. яна перапрацавала 75395 літраў малака, было зроблена 6676 кг сыру, 375 кг масла. Збыт быў наладжаны ў Быхаве і Магілёве. Машыннае таварыства (14 гаспадарак) мела малацілку, 3 конных прывада. У камітэт сялянскай узаемадапамогі уваходзіла 62 чал.

На тэрыторыі сельсавета існавала 2-х камплектная школа (51 вучань) з выкладаннем на латышскай і беларускай мовах. Руская мова вывучалася як прадмет. Падручнікамі былі ў цэлым забяспечаны. Памяшканне школы было маленькае (абодва камплекты ў адным пакоі), не было інтэрната для хутарскіх вучняў. Кніг на латышскай мове ў бібліятэцы не хапала. Само насельніцтва (1928) выпісвала 48 асобнікаў газет: 35 на латышскай мове, 11 на рускай, 2 на беларускай. Працавала хата-чытальня, пры ёй быў створаны драматычны гурток. У хату-чытальню выпісвалі 10 газет і 6 часопісаў, але ў асноўным на рускай і беларускай мовах. Насельніцтва слаба цікавілася беларусізацыяй, бо лічыла, што цяжка вучыць беларускую мову. Латышы старэйшага ўзросту нават рускую мову слаба ведалі.

Вялікі ўплыў на жыццё жыхароў аказвалі рэлігія і традыцыі. Дзейнічалі дзве царквы: лютэранская і англа-апостальская. На агульных сходах жанчыны займалі абавязкова левы бок, паасобна ад мужчын, як у царкве. Няверуючых было ўсяго 14 % насельніцтва.

Лютэранская царква аб'ядноўвала 210 чалавек дарослых. Яны рэгулярна збіралі сродкі на патрэбы царквы (каля 400 руб. у год). Для прыкладу на рамонт маста, дарог і пабудову 5 новых мастоў пайшло агулам 900 руб. У 1930-х гг. уплыў царквы сярод беднаты і моладзі вонкава памяншаўся, даходы царквы знізіліся на 43 %, абраднасць (царкоўныя шлюбы, хрэсьбіны) на 25 %, канфірмацыя на 75 %. Група англа-апостальскай царквы налічвала 63 асобы. З'яўляліся, на думку мясцовых улад, рэлігійнымі фанатыкамі. Вернікі наведвалі царкву 3 разы на тыдзень, збіралі на патрэбы царквы да 900 руб. у год, у грамадскай працы ніякага ўдзелу не прымалі. Склад царкоўнага савету – заможнікі, пазней былі раскулачаны.

Узаемаадносіны паміж латышамі і беларусамі на тэрыторыі сельсавета былі добрыя. З навакольным беларускім насельніцтвам узніклі складанасці пад час земляўпарадкавання – адрэзаную зямлю атрымалі беларусы, якія жылі не на тэррыторыі латышскага нацыянальнага сельсавета, а навокал, што не спадабалася латышам. Калектывізацыя на тэрыторыі сельсавета праводзілася прымусова, гвалтам. Былі антысавецкія выказванні, зроблены замах на забойства бедняка і пагроза забіць членаў сельсавета.

*Бярозаўскі нацыянальны нямецкі сельскі савет* Нараўлянскага раёна Мазырскай акругі напрыканцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. складаўся з пяці месц (калоній) кампактнага пражывання асоб нямецкай нацыянальнасці агульнай колькасцю 1567 чал. З іх немцы складалі 91,3 %. Гаспадарак

налічвалася 306. Матэрыяльны стан быў вельмі добры. Ворыва мелася 925,9 дзесяцін. На тэрыторыі сельсавета было два паравых і тры ветраных млына, з іх адзін паравы належыў сельскагаспадарчаму таварыству[584].

Нямецкае насельніцтва жыло на хутарах. Пры сельсавеце існаваў Кантрольны саюз у якім налічвалася 38 членаў. Ён займаўся разглядам гаспадарчых пытанняў, павялічэннем ураджайнасці. Калектывізацыя насельніцтва не цікавіла. Дзейнічала сельскагаспадарчае (аб'ядноўвала ў 1928 г. – 548 асоб) і спажывецкае (102 чал.) таварыствы. Насельніцтва выкарыстоўвала крэдыты на набыццё машын і механізмаў, насення, мінеральных угнаенняў. Падаткі выплочвалі своечасова. На сродкі, атрыманыя шляхам самаабкладання, адрамантавалі дарогі, будынкі школы і амбулаторыі.

На тэрыторыі сельсавета існавалі дзве нацыянальныя школы (каля 25–30 вучняў) з нямецкай мовай навучання. Але была нізкая наведваемасць. У канцы 1920-х гг. у школах не хапала падручнікаў на нямецкай мове (забяспечанасць толькі на 20 %). Працавала хата-чытальня, але ў ёй не было працаўніка з нямецкага асяродка. Прыезжыя (рускія, беларусы) доўга не трымаліся, так як з-за ня ведання нямецкай мовы не маглі працаваць сярод мясцовага насельніцтва. Не хапала літаратуры на нямецкай мове. Насельніцтва абслугоўвалася на нямецкай мове. Пры сельсавеце былі створаны камісіі і ячэйка МОПРа, але яны фактычна не працавалі.

Істотныя змены ў сацыяльна-эканамічным, грамадскім і культурным жыцці насельніцтва нацыянальных сельсаветаў адбыліся пасля пачатку і правядзення калектывізацыі, у выніку рэпрэсій (раскулачвання) і дэпартацый у Сібір і Далёкі Ўсход, на гістарычную радзіму (нямецкае насельніцтва). Як правіла, у сялянскіх гаспадарках літоўцаў, латышоў, палякаў, немцаў і іншых выкарыстоўваліся больш перадавыя тэхналогіі і дасягненні агракультуры. У выніку гэтыя сяляне часта атрымоўвалі больш высокія ўраджаі і прыбыткі ў параўнанні з сялянамі-беларусамі. Гэта і стала прычынай таго, што падчас калектывізацыі іх залічылі ў разрад кулакоў, а затым разам з сем'ямі выслалі за межы БССР.

У сакавіку 1932 г. у БССР па палітычных меркаваннях Койданаўскі раён быў пераўтвораны ў польскі нацыянальны (29.06.1932 г. перайменаваны ў Дзяржынскі). У склад раёна ўваходзілі 17 сельскіх саветаў: 9 польскіх, 6 беларускіх, 1 польска-яўрэйскі, 1 літоўскі, з ліпеня 1933 г. яшчэ 2 украінскіх с/с. У маі 1936 г. ЦВК БССР рэарганізаваў 7 польскіх сельскіх саветаў раёна ў беларускія. Мэтай дзейнасці польскага аўтаномнага раёну было выхаванне мясцовага насельніцтва ў камуністычным духу і падрыхтоўка партыйных кадраў на выпадак агрэсіі супраць Польшчы[585]. Самым важным элементам гэтага эксперымента, які заключаўся ў стварэнні мініяцюры "Савецкай Польшчы", было

[584] Справаздача Бярозаўскага нацыянальнага нямецкага сельсавета Нараўлянскага раёна Мазырскай акругі "Аб гаспадарча-культурнай дзейнасці" // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 236–237.

[585] Административно-территориальное устройство БССР. С. 15 ; *Śleszyński, Wojciech.* Dzierżyńszczyzna – polski eksperyment w BSRS. Budowa komunistycznej wizii dziejów Polski // Biuletyn Historii Pogranicza. Białymstok. 2016. S. 29 ; *Iwanow Mikołaj.* Polska autonomia w Związku Sowieckim, 1925–1935. Aspekt prawno-polityczny // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 175.

ўвядзенне ва ўсе дзяржаўныя і партыйныя ўстановы Дзяржыншчыны (з міліцыяй і судом уключна) польскай мовы ў якасці афіцыйнай, таксама вялікае значэнне мела развіццё польскага савецкага выхавання, адукацыі і шматлікіх цэнтраў культуры[586]. Яшчэ адным элементам змагання супраць польскай спадчыны камуністычныя ўлады лічылі нейтралізацыю ўплываў каталіцкага касцёла. Стваралася таксама новае апісанне гісторыі польскіх земляў.

Утварэнне польскага нацыянальнага раёна "Дзяржыншчына" тлумачыцца трыма прычынамі. Па-першае, супрацівам кіруючых прыхільнікаў палітыкі "беларусізацыі", паколькі большасць палякаў яны лічылі акаталічанымі беларусамі і вельмі сімптаматычны той факт, што польскі нацыянальны раён стварыўся ўжо пасля згортвання адзначанай палітыкі. Па-другое, тут назіраецца непасрэдны ўплыў польска-савецкай дамовы аб ненападзе 1932 г. Па-трэцяе, відаць, арганізацыя такой польскай аўтаноміі мела сваёй мэтай падрыхтоўку своеасаблівага "польскага рэвалюцыйнага войска" на выпадак вайны з Польшчай. Галоўнай мэтай нацыянальнай палітыкі было не столькі жаданне савецкай улады развіваць нацыянальную самасвядомасць, мову і культуру меншасцей, колькі саветызацыя кампактна пражываючых нацыянальнасцей. Яшчэ адной важнай прычынай стварэння аўтаномных рэгіёнаў з'яўлялася іх міжнароднае прапагандысцкае і ідэалагічнае ўздзеянне. Палітыка савецкай дзяржавы па нацыянальным пытанні павінна была стаць эфектыўнай ідэалагічнай зброяй у барацьбе з капіталістычным асяроддзем і з'явіцца ідэальным рашэннем нацыянальнага пытання. Створаныя з мэтай саветызацыі меншасцей нацыянальныя бюро нярэдка супрацоўнічалі з нацыянальнымі камуністычнымі партыямі і адпаведнымі секцыямі Камінтэрна. Па меркаванні М. Іванова, частка камуністычных нацыянальных дзеячаў разглядалі меншасці як своеасаблівыя рэвалюцыйныя рэзервовыя войскі, якія ў адпаведны момант можна было выкарыстаць у барацьбе з буржуазіяй і для падштурхоўвання сацыялістычнай рэвалюцыі на гістарычнай радзіме[587].

Разыгрыванне польскай карты ў Савецкай Беларусі закончылася ў 1934 г., калі быў падпісаны пакт аб непадзенні паміж Польшчай і Германіяй. У новых палітычных рэаліях польскае насельніцтва, з якога планавалася стварыць фарпост новай ідэалогіі, станавілася пагрозай для камуністычнай дзяржавы. Ідэалагічнае змаганне, у тым ліку канструяванне сацыялістычнай версіі гісторыі „камуністычнага польскага народа", змянілася фізічнай ліквідацыяй. Пад канец 30-х гадоў XX ст. польская супольнасць у Беларусі выклікала больш апасенняў чым спадзяванняў[588].

28.07.1937 г. на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б па ініцыятыве правяраючага з Масквы Я. Якаўлева абмяркоўвалася пытанне "Аб ліквідацыі палітыкі

[586] *Iwanow Mikołaj.* Polska autonomia w Związku Sowieckim, 1925–1935. Aspekt prawno-polityczny // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 189.
[587] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 216 ; *Śleszyński Wojciech.* Dzierżyńszczyzna – polski eksperyment w BSRS. Budowa komunistycznej wizii dziejów Polski. S. 29 ; *Iwanow Mikołaj.* Polska autonomia w Związku Sowieckim, 1925–1935. Aspekt prawno-polityczny. S. 175.
[588] *Śleszyński Wojciech.* Dzierżyńszczyzna – polski eksperyment w BSRS. Budowa komunistycznej… S. 36–38.

паланізацыі Беларусі". Былое кіраўніцтва рэспублікі (М. Галадзед, А. Чарвякоў, Шаранговіч) было абвінавачана ў правядзенні шкодніцтва ў нацыянальнай палітыцы. Іх абвінавачвалі ў насаджэнні прымусовага навучання польскай мове беларускіх дзяцей, а таксама ў садзейнічанні арганізацыі польскага раёна, дзе жыло ў большасці беларускае насельніцтва. У выніку бюро ЦК КП(б)Б пастанавіла: "1) ліквідаваць Дзяржынскі нацыянальна-польскі раён; 2) польскія сельсаветы перавесці на беларускае справаводства"[589]. 31.07.1937 г. Дзяржынскі раён быў ліквідаваны як самастойная адміністратыўная адзінка.

Міжваенныя лёсы палякаў у СССР з'яўляюцца прыкладам беспрэцэдэнтнага ў гісторыі чалавецтва знішчэння нацыі ў імя ідэалогіі. Паражэнне ідэі аўтаноміі польскага камунізму на "далёкім памежжы" і "каварнага флірту камунізму з польскасцю" прывяло да адраджэння пачуцця глыбокага антаганізму палякаў у дачыненні расійскай улады і праяўленню так добра вядомых з царскіх часоў адносін да палякаў, як да ворагаў любой улады[590].

Спроба саветызацыі палякаў, літоўцаў, латышоў, немцаў і іншых з дапамогай створаных форм нацыянальнай аўтаноміі не прывяла да чакаемых вынікаў. Сведчаннем гэтага быў супраціў з боку некаторых меншасцей БССР сацыялістычным пераўтварэнням, а таксама шматлікія праявы сімпатыі да сваёй гістарычнай радзімы. У гэтай сітуацыі роспуск нацыянальных саветаў[591], згортванне нацыянальна-культурнай працы і наступныя рэпрэсіі былі непазбежныя. Гэта было толькі пытаннем часу. Размах рэпрэсіўных дзеянняў у дачыненні да розных нацыянальных меншасцей быў не аднолькавы, але закрануў усіх.

**Удзел у дзейнасці прадстаўнічых і выканаўчых органаў мясцовай улады.** Па БССР шмат прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей было абрана ў кіруючыя органы саветаў (гл. табліца 11, дадатак Е).

Калі параўноўваць працэнт абраных прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей з іх працэнтам у агульным ліку насельніцтва, можна заўважыць, што працэнт рускіх, абраных у гарсаветы ў 1925 г., быў большы за іх працэнт у агульнай колькасці насельніцтва (15,6 % і 20,5 %) і толькі ў выніку перавыбараў 1926 г. гэтая лічба прыведзена ў адпаведныя суадносіны. Калі ў 1925 г. у дачыненні да беларусаў гэтыя суадносіны супадалі, дык у 1926 г. адбылася дыспрапорцыя (39,26 % і 52,0 %).

У прынцыпе, падобныя суадносіны захоўваліся напрацягу 1930-х гг. Так, у 1939 г. у складзе Магілёўскага гарсавета з агульнага ліку дэпутатаў (273 чал.) нацменшасці складалі 55,3 %. Беларусаў было – 122, яўрэяў – 110, рускіх – 24,

---

[589] Матэрыялы бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 3. Спр. 470. Арк. 55–56.

[590] *Iwanow Mikołaj.* Polska autonomia w Związku Sowieckim, 1925–1935. Aspekt prawno-polityczny. S. 190.

[591] У 1934 г. пачынаецца працэс ліквідацыі нацыянальных саветаў, які працягваўся да 1939 г. Найбольшая колькасць нацыянальных саветаў знікла ў 1937 г. – 29 (46,77 %), 1935 г. – 13 (20,96 %), 1936 г. – 9 (14,52 %), 1934 г. – 5 (8,07 %), 1938 г. – 3 (4,84 %), 1939 г. – 3 (4,84 %). Административно-территориальное устройство БССР.

Частка яўрэйскіх і большасць рускіх былі пераўтвораны ў беларускія ў 1935–1936 гг., украінскія і большасць польскіх – у 1936–1937 гг. Метады ліквідацыі былі розныя: рэарганізацыя ў беларускія шляхам далучэння беларускіх вёсак; ліквідацыя с/с наогул, а крыху пазней утвараліся зноўку, але толькі беларускія; далучаліся да іншых – беларускіх і інш.

украінцаў – 9, грузін – 1, татар – 1, армян – 1, латышоў – 1, немцаў – 2, палякаў – 2[592].

Табліца 11 – Нацыянальны склад кіруючых органаў мясцовых саветаў, у працэнтах[593]

| Нацыянальнасць | Членаў РВК | | Членаў сельскіх саветаў | | Членаў гарадскіх саветаў | | Членаў месточковых саветаў | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1925 г. | 1926 г. | 1925 г. | 1926 г. | 1925 г. | 1926 г. | 1925 г. | 1926 г. |
| Беларусы | 80,2 | 78,3 | 91,4 | 92,3 | 39,4 | 52,0 | – | 52,9 |
| Яўрэі | 6,7 | 8,3 | 3,8 | 2,3 | 30,1 | 30,0 | – | 41,9 |
| Палякі | 1,6 | 2,6 | 1,7 | 2,4 | 3,3 | 2,0 | – | 2,1 |
| Рускія | 7,4 | 6,4 | 1,8 | 1,5 | 20,5 | 12,0 | – | 2,6 |
| Іншыя | 4,1 | 4,8 | 1,3 | 1,6 | 6,7 | 4,0 | – | 1,2 |

У сельсаветах жа значна менш былі прадстаўлены рускія, больш беларусы. Яўная дыспрапорцыя, асабліва падчас выбараў 1924 г. і перавыбараў 1925 г., назіралася ў прадстаўніцтве яўрэяў у выбарчых органах. Практычна тое ж было і ў 1927 г.[594]

У 1926 г. нацыянальныя саветы абслугоўвалі 69495 чалавек: яўрэяў – 25629, палякаў – 18491, рускіх – 3697, латышоў – 1971, немцаў – 2167, беларусаў – 9379, другіх нацыянальнасцей – 1221 (гл. табліца 12).

Табліца 12 – Склад нацыянальных сельскіх саветаў БССР[595]

| | 1926 г. | 1927 г. |
|---|---|---|
| У польскіх сельскіх саветах – палякаў | 84,3% | 84,2 % |
| У латышскіх сельскіх саветах – латышоў | 78,5 % | 86,3 % |
| У нямецкіх сельскіх саветах – немцаў | 90 % | 75 % |
| У рускіх сельскіх саветах – рускіх | 78,8 % | 73 % |
| У яўрэйскіх сельскіх саветах – яўрэяў | 75,9 % | 91,2 % у сельскіх, 60,5 % у местачк. нацсаветах |

Былі прыклады, калі да арганізацыі польскага сельсавета існавала пэўная напружанасць паміж палякамі і беларусамі, якая праявілася падчас перавыбараў 1926 г., дык у 1927 г. гэтых праяў не было. Наадварот, выбаршчыкі – палякі прасілі забяспечыць прадстаўніцтва беларусаў у польскім сельсавеце. Наогул, у адносінах да палякаў былі выпадкі неправамоцных дзеянняў з боку

[592] Нацсклад Магілёўскага гарсавета // ДАМаг. Ф. 11. Воп. 1. Спр. 135. Арк. 13.
[593] Падлічана па: Нацсклад кіруючых органаў мясцовых саветаў. Справаздачы // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 234–235.
[594] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХ ст.). С. 71.
[595] Падлічана па: Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч 2. С. 96–97.

ўпаўнаважаных па перавыбарах, што з’яўлялася грубым парушэннем грамадзянскіх правоў.

Разгледзім некалькі канкрэтных прыкладаў выбараў у нацыянальных саветах на абшарах Магілёўшчыны, якая складалася з дзвюх акруг: Магілёўскай і Бабруйскай (Калінінская існавала да 09.06.1927).

На тэрыторыі Магілёўскай акругі на 01.01.1928 г. налічвалася 265 сельсаветаў. З іх сем было местачковых і пяць нацыянальных: адзін польскі – Хрыпелеўскі, два латышскія – Галіцка-Мызскі, Грудзінаўскі, два яўрэйскія – Кармянскі і Сялецкі. На тэрыторыі Магілёўскай акругі ў 1924 г. былі ўтвораны 2 польскія сельсаветы: у Фашчаўцы і Княжыцах. Праіснавалі яны да 1926 г. і былі зліквідаваны таму, што большасць насельніцтва складалі не палякі, а беларусы рыма-каталікі[596]. Усяго на 1928 г. у акрузе жыло: беларусаў – 751430 чалавек (90,77 %), яўрэяў – 49900 (5,91 %), рускіх – 15747 (1,92 %), палякаў – 6218 (0,76 %), латышоў – 2450 (0,29 %), украінцаў – 1180 (0,14 %), літоўцаў – 666 (0,08 %), татар – 86 (0,01 %), немцаў – 299 (0,03 %), іншых нацыянальнасцей – 1119 (0,09 %). У выніку выбараў 1927 г. у мясцовыя саветы было ўсяго абрана 3594 чалавека (3348 мужчын і 246 жанчын). З іх ліку ў местачковыя саветы 121 мужчына і 18 жанчын. Сярод выбраных было 3395 беларусаў, 9 рускіх, 106 яўрэяў, 51 паляк, 30 латышоў, 3 прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей[597].

Перавыбары сельскіх саветаў праводзіліся з 7 па 20 студзеня 1927 г. На Магілёўшчыне яны праходзілі з большай актыўнасцю насельніцтва, у параўнанні з мінулымі яна павялічылася ў сярэднім на 7 %, але заставалася нізкай. Як і ў мінулых выбарах, удзельнічалі ўсе сацыяльныя групы вёскі за малым выключэннем. Розніца была ў тым, што калі раней на выбарах бедната іграла малую ролю, дык у 1927 г. галоўную ролю адыгрывалі яна і серадннякі. І толькі ў пэўных мясцінах заможнае сялянства спрабавала актыўна ўдзельнічаць. У якасці прыкладу можна прывесці, як у Грудзінаўскім нацыянальным сельсавеце яны спрабавалі прапанаваць свае спісы кандыдатаў.

Калі казаць пра латышскае насельніцтва Магілёўскай акругі, то патрэбна адзначыць наступнае. Найбольшую актыўнасць на выбарах (60 %) праявілі латышы, якія жылі ў калектыўнай савецкай гаспадарцы “Чырвоны двор”. Ад іх у мясцовы сельскі савет увайшоў 1 чалавек – беспартыйны, бядняк. У Валоках, дзе на 13 хутарах жыло 78 латышоў, прынялі ўдзел у выбарах 50 %. Ад латышоў у склад савета ўвайшлі 1 латыш бядняк, 1 серадняк, абраны кандыдатам, 1 серадняк, абраны членам рэвізійнай камісіі. У Латрошчы, дзе было 45 хутароў, на якіх жылі 270 латышоў у выбарах удзельнічалі 40 %, у мясцовы савет увайшлі 2 латышы: адзін серадняк-камсамолец, адзін серадняк-беспартыйны ў кандыдаты. У Хонава, 35 хутарскіх гаспадарак – 110 латышоў, на выбары прыйшло 38 %. У сельскі савет выбраны адзін бядняк і адзін серадняк – беспартыйныя. Дарэчы, у мінулых выбарах мясцовыя латышы адмаўляліся ўводзіць у савет сваіх прадстаўнікоў. У Грудзінаўскім сельскім савеце, дзе было 138 хутарскіх гаспадарак і 611 латышоў,

[596] Справаздача аб дзейнасці польскіх саветаў // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 928. Арк. 3 адв.
[597] Справаздача аб выніках выбараў // Там жа. Спр. 439. Арк. 301.

прыйшлі на выбары 37 %. У склад нацыянальнага сельсавета абрана 10 членаў. З іх было 3 беднякі, 5 сераднякоў, 1 настаўнік – член КП(б)Б і 1 заможны. Кандыдатамі – 1 бядняк і 2 серадніякі. Усяго было абрана ў саветы з латышскага сялянства 28 чалавек. З іх 1 сябра КП(б)Б і 1 камсамолец, чаго раней не было. Па сацыяльнаму становішчу: 8 беднякоў, 13 сераднякоў, 2 настаўнікі. Сярод выбраных былі 3 жанчыны[598].

Усяго было абрана палякаў у склад сельскіх саветаў Магілёўскай акругі ў 1926 г. – 64, у 1927 г. – 57. Памяншэнне па выніках выбараў 1927 г. дакументы тлумачаць больш дакладным улікам беларусаў-каталікоў і палякаў. Акрамя таго, палякі былі абраны і ў склад прэзідыўмаў сельскіх саветаў: Магілёўскі раён – 6, Шклоўскі – 6, Лупалаўскі (раён існаваў з 8 жніўня 1924 г. па 2 сакавіка 1931 г.) – 1, Быхаўскі – 1. Усяго 14 чалавек. З агульнай колькасці па выбарах 1926 і 1927 гг. чатыры палякі былі старшынямі сельскіх саветаў. Па два ў Магілёўскім і Шклоўскім раёнах.

Перавыбарам 1927 г. папярэднічала падрыхтоўчая праца, якая пачалася са справаздач старшынь сельскіх саветаў, далей прайшлі паседжанні беднаты і жанчын. І толькі потым адбыліся перавыбары.

Па Хрыпелеўскаму нацыянальнаму польскаму сельскаму савету ў 1927 г. быў большы працэнт (57 %) выбаршчыкаў, якія з'явіліся на выбарчыя ўчасткі (у 1926 г. – 38 %), і больш актыўнае абмеркаванне кандыдатур на паседжаннях. Паўсюль прайшлі кандыдатуры, прапанаваныя актывам з беднякоў. Была спроба ў аколіцы Журавец заможнымі сялянамі вылучыць найбольш заможнага і гаспадарлівага грамадзяніна Бурскага, але большасць удзельнікаў паседжання не падтрымала гэтую кандыдатуру. У склад Хрыпелеўскага с/с у 1927 г. было абрана 11 чалавек: 7 беднякоў і 4 серадняк і (у 1926 г. 1 бядняк, 6 сераднякоў, 4 заможныя). Склад сельсавета абнавіўся на 75 %, у асноўным за кошт беднякоў, што не заўжды ішло на карысць працы сельскага савета.

Большы працэнт удзелу ў выбарах палякаў быў і па іншых населеных пунктах акругі, дзе жыло польскае насельніцтва. Праўда, не паўсюль была аднолькавая актыўнасць. Акрамя таго, у Лупалаўскім і Бялыніцкім раёнах не арганізоўваліся асобныя выбарчыя ўчасткі ў польскіх вёсках, а далучалі польскія вёскі да беларускіх і наадварот. Гэта прывяло да непажаданых вынікаў. Напрыклад, у Бялыніцкім раёне быў утвораны выбарчы ўчастак, на тэрыторыі якога знаходзіліся: беларуская вёска Ігліца (600 чал.), польская вёска Студзенка (157 чал.) і змешаная беларуска-польская вёска Заграшоўе (150 чал.). У выніку ў сельскі савет былі абраны: з першай вёскі ніводнага, з другой і трэцяй па два чалавекі. Гэта тлумачыцца тым, што палякі праявілі большую актыўнасць і, нягледзечы на вялікую адлегласць да вёскі Ігліца, на выбары прыйшло 100 % палякаў-выбаршчыкаў, а выбаршчыкі з самой Ігліцы на выбары не прыйшлі. Наогул, агульны працэнт удзельнікаў у перавыбарах сельскіх саветаў па Магілёўскай акрузе быў 43,8 %, па мястэчках акругі – 48,4 %, а па польскіх населеных пунктах – 5 %.

---

598 Матэрыялы латышскай нацсекцыі // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 726. Арк. 46.

На тэрыторыі Бабруйскай акругі ў 1927 г. было 7 мястэчак гарадскога тыпу і 27 мястэчак вясковага тыпу, дзе было сканцэнтравана яўрэйскае насельніцтва. Агульная колькасць яўрэяў у акрузе была прыкладна 89490 чалавек, палякаў на Бабруйшчыне, разам са Случчынай, жыло каля 16400 чалавек. У акрузе былі 4 яўрэйскія нацыянальныя саветы, адзін савет польска-яўрэйскі (Шацілкі), тры польскія нацсаветы, Парыцкі местачковы яўрэйскі нацыянальны савет, Багушэўскі нацыянальны рускі сельсавет. У кожным сельскім савеце існавалі камісіі: сельскагаспадарчая, санкультасветная, фінансава-падатковая, дабрабыту, гандлёвай кааперацыі і іншыя[599]. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 63,1 % ад агульнай колькасці членаў гарадскіх саветаў і 8,9 % дэпутатаў сельскіх саветаў (гл. табліца 13).

Табліца 13 – Нацыянальны склад саветаў Бабруйскай акругі, 1927 г.[600]

| | **Гарадскія саветы (Бабруйск, Слуцк, Рагачоў, Жлобін)** | | **Сельскія і местачковыя саветы (216 саветаў)** | |
|---|---|---|---|---|
| | **Колькасць (чал.)** | **Працэнт** | **Колькасць (чал.)** | **Працэнт** |
| Беларусы | 226 | 36,9 | 2732 | 91,1 |
| Рускія | 147 | 24,0 | 69 | 2,3 |
| Яўрэі | 204 | 33,3 | 113 | 3,8 |
| Палякі | 15 | 2, 5 | 65 | 2,2 |
| Іншыя | 20 | 3,3 | 19 | 0,6 |
| Усяго | 612 | 100 | 2998 | 100 |

Сярод працоўных жанчын асноўнай формай савецкай работы з’яўляліся дэлегацкія сходы. У той час іх называлі “школай камунізму”. Характэрна, што жаночыя сходы не былі самастойнымі арганізацыямі, а толькі дапамагалі ў працы прафсаюзам, саветам і іншым грамадскім фарміраванням. Кожны год у дэлегацкі рух улівалася новае папаўненне. Былыя дэлегаткі, якія праявілі сябе на грамадскай працы, вылучаліся на прафсаюзную, савецкую і партыйную работу. Паступова дэлегацкія сходы замыкаліся самі на сабе, набывалі бюракратычныя рысы заарганізаванасці і фармалізму.

Актыўнасць жанчын, іх жаданне стаць упаравень з мужчынамі выяўляліся ў росце колькасці дэлегатак. Так, калі ў 1924 г. у Беларусі было 6500 дэлегатак, у 1925 г. – 15000, то ўжо ў 1926 г. іх налічвалася 27767 чалавек. У дэлегацкі рух на вёсцы ў першую чаргу прываблiваліся бядначкі, батрачкі, радзей сераднячкі, пры адначасовай ізаляцыі больш-менш заможных сялянак, якія выгадна вылучаліся пісьменнасцю і даволі шырокім кругаглядам. Іх выступленні на перавыбарах мелі

[599] Матэрыял аб становішчы масавай працы Саветаў Бабруйскай акругі // ДАГАМаг. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 601. Арк. 118, 121, 124.
[600] Там жа. Арк. 111, 116.

"больш шырокі грамадскі характар" і не замыкаліся, як у бяднячак, на сваіх нястачах[601].

Выбаршчыкі Магілёўшчыны, якія прадстаўлялі нацменшасці, у сваіх наказах звярталі ўвагу новага складу саветаў на: 1) больш чуллівыя адносіны саветаў да запытаў сялянства; 2) бліжэй прыстасаваць сваю работу да масаў; 3) выяўляць укрывацеляў зямлі і жывёлы; 4) правільнае абкладанне сялян сельгаспадаткам; 5) узмацняць у вёсцы сацыялістычныя элементы; 6) умацаваць і пашырыць на вёсцы культурна-асветныя ўстановы; 7) садзейнічаць насельніцтву ў водпуску лесаматэрыялаў. У гэтых "наказах", якія прайшлі папярэднюю апрацоўку ў кіруючых органах, добра бачны эканамічныя патрабаванні выбаршчыкаў і ідэалагічныя камуністычнага актыву.

Насельніцтва нацыянальных сельскіх і местачковых саветаў на агульных сходах вельмі часта выступала з рознымі ініцыятывамі, што не падабалася ўладам. Таму з 1927 г. кіраўніцтва БССР палічыла недапушчальным, каб ініцыятыва пры вырашэнні грамадскіх пытанняў належала сходам, а не актыву саветаў. Пры кожным нацыянальным савеце ўтвараўся актыў з 15–20 асоб, які арганізоўваў сваю працу праз дзейнасць розных камісій, секцый, дэпутацкіх груп. Але вельмі часта праца актыву вялася фармальна. Пры абследаванні ў 1928 г. рускіх нацыянальных саветаў улады канстатавалі, што "ніякага ажыўлення работы, толькі па ўказанню зверху, ды і тое не заўжды ўлічваюць рэкамендацыі". Актывізаваць работу актыву спрабавалі заможныя гаспадары, якія імкнуліся праз нацыянальныя саветы вырашаць штодзённыя культурныя і грамадскія пытанні, але ўлады адносілі іх да кулакоў і вялі працу па недапушчэнню іх да працы ў саветах.

Як адзначалася ў пастанове Прэзідыўма ЦВК БССР ад 10.11.1927 г. аб рабоце нацсаветаў, арганізацыя нацыянальных саветаў з боку палітычнага і практычнага ў поўнай меры сябе апраўдала[602]. Станоўчым было: памяншэнне нацыянальных непаразуменняў паміж асобнымі нацыянальнасцямі, перавод большай часткі працы нацсаветаў на родную мову, пашырэнне сеткі нацыянальных школ, клубаў, хат-чытальняў, чырвоных куткоў, узмацненне даверу з боку местачковага насельніцтва ў нацсаветах да савецкай улады. З адмоўных момантаў на той час у пастанове зафіксаваны наступныя: пры арганізацыі нацсаветаў АВК і РВК у некаторых выпадках у аснову бралі выключна нацыянальны прынцып, а не нацыянальна-тэрытарыяльны; склад працаўнікоў у некаторых нацыянальных саветах слаба азнаёмлены з савецкім будаўніцтвам, адсюль былі моманты скажэння лініі савецкай улады ў нацпытанні; слаба разгорнута арганізацыйна-масавая работа[603].

---

[601] Беларусы. Т. 4. С. 366.

[602] У 1960-я гг. некаторыя даследчыкі, наадварот, сцвярджалі, што ліквідацыі нацыянальнай адасобленасці, выхаванню ў духу інтэрнацыяналізму перашкаджала менавіта стварэнне нацыянальных саветаў, якія садзейнічалі павялічэнню нацыяналістычных настрояў. *Маргунский С.П.* Государственное строительство БССР в годы восстановления народного хозяйства (1921–1925). Минск, 1966. С. 143.

[603] Матэрыялы нацкамісіі // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 7–8.

У прынцыпе, выбары 1925–1927 гг. паказалі, што грамадскае жыццё ішло мерным крокам. Гэта натуральнае развіццё палітычных працэсаў было ўстойлівым, пакуль яго не парушылі суб’ектыўныя падыходы вярхоўнага партыйнага і савецкага кіраўніцтва краіны[604]. Дэмакратычныя асновы грамадска-палітычнай дзейнасці ў канцы 1920-х гадоў пачыналі ўсё больш падмяняцца адміністрацыйным націскам. Гэта абмяжоўвала ўдзел прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у розных сферах жыцця.

Выбарчая кампанія 1929 г. праходзіла ва ўмовах наступлення на дэмакратычныя заваёвы, звязаныя з НЭПам. Больш адчувальнымі сталі каманднa-адміністрацыйныя метады кіраўніцтва. Адмаўленне ад удзелу ў выбарах усё больш пачынала разглядацца як адмоўныя адносіны да партыі і савецкай улады. Насельніцтва не магло не ўлічваць гэтую акалічнасць і адпаведная яўка сялян склала 58,7 % (рабочых у гарадах 79,2 %). У вёсцы дасягненню гэтай лічбы паспрыялі жанчыны. Калі ў 1927 г. у выбарах прынялі ўдзел толькі 24,7 % жанчын, то ў 1929 г. – 42,4 %. Стваралася аснова для будучага фактычнага 100 %-га ўдзелу насельніцтва ў выбарчых кампаніях.

Стварэнне і дзейнасць нацыянальных саветаў дазваляюць адзначыць дзве акалічнасці. Першая, – ва ўмовах НЭПа, як адзначалася ў пастанове прэзыдыуму ЦВК БССР ад 10.03.1927 г. аб рабоце нацсаветаў, арганізацыя нацыянальных саветаў з боку палітычнага і практычнага ў поўнай меры сябе апраўдала[605]. Палітычнае, гаспадарчае і культурнае жыццё, у патрэбным для камуністычных уладаў кірунку, на тэрыторыі падпарадкаванай нацсаветам, развівалася хутчэй, чым у іншых месцах БССР. Паляпшаліся міжнацыянальныя адносіны. Былі прыклады, калі да арганізацыі польскага сельсавета існавала пэўная напружанасць паміж палякамі і беларусамі, але ў час перавыбараў 1927 г. гэтага не было. Выбаршчыкі – палякі самі прасілі забяспечыць прадстаўніцтва беларусаў у польскім сельсавеце.

Другая, – спроба ў 1930-я гг. саветызацыі палякаў, літоўцаў, латышоў, немцаў і іншых з дапамогай створаных форм нацыянальнай аўтаноміі не прывяла да чакаемых вынікаў. Сведчаннем гэтага быў супраціў з боку некаторых меншасцей БССР сацыялістычным пераўтварэнням: калектывізацыі, рэлігійнай палітыцы савецкай дзяржавы, а таксама шматлікія праявы сімпатыі да сваёй гістарычнай радзімы.

На пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б 26.02.1934 г. слухалася пытанне “Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў”, у выніку зацвердзілі пастанову ЦК КП(б)Б “Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў”[606]. У ёй адзначалася, што Вацлаўскі сельсавет Ушацкага раёна, Галіцка-Мызскі сельсавет Клімавіцкага раёна, Малькаўскі сельсавет Мсціслаўскага раёна, калгасы “Гайма” Быхаўскага раёна, “Цэлтнэ” Ушацкага раёна, “Бязбожнік”, “Сарканойс Арайс” Лёзненскага раёна і іншыя “засмечаны кулацкімі, класава-варожымі і антысавецкімі элементамі”.

---

[604] *Касцюк М.П.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі . С. 64–65.
[605] Пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 7–8.
[606] Пратакол № 5 пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 26.02.1934 г. // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 21.

ЦК КП(б)Б пастанавіла праверыць і ачысціць калгасы і нацыянальныя сельсаветы ад кулакоў і класава-варожых элементаў[607].

У гэтай сітуацыі роспуск нацыянальных саветаў, згортванне нацыянальна-культурнай працы і наступныя рэпрэсіі былі непазбежныя. Гэта было толькі пытаннем часу. Пастановамі Палітбюро ЦК УсеКП(б) ад 07.12.1937 г. і 20.02.1939 г. была праведзена ліквідацыя нацыянальных раёнаў і сельскіх саветаў, за выключэннем яўрэйскіх, якія афіцыйна былі ліквідаваны ў 1944 г.[608] Адзначалася, што многія нацыянальныя раёны і сельсаветы былі створаны ворагамі народа са шкодніцкімі мэтамі[609]. У БССР працэс ліквідацыі нацыянальных саветаў працягваўся з 1934 па 1939 гг. Найбольшая колькасць нацыянальных саветаў знікла ў 1937 г. – 29 (46,77 %), 1935 г. – 13 (20,96 %), 1936 г. – 9 (14,52 %), 1934 г. – 5 (8,07 %), 1938 г. – 3 (4,84 %), 1939 г. – 3 (4,84 %)[610]. Частка яўрэйскіх і большасць рускіх былі пераўтвораны ў беларускія ў 1935–1936 гг., украінскія і большасць польскіх – у 1936–1937 гг. Метады ліквідацыі былі розныя: рэарганізацыя ў беларускія шляхам далучэння беларускіх вёсак, спачатку ліквідацыя сельскіх саветаў наогул, а затым утварэнне, але ў якасці беларускіх, далучэнне савета той ці іншай нацыянальнасці да беларускага і іншыя.

**Дзейнасць у шэрагу камсамолу і прафсаюзаў.** Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей маглі актыўна ўдзельнічаць у грамадскім і гаспадарчым жыцці праз органы ЛКСМБ і прафесійныя саюзы.

Камсамольцы пад кіраўніцтвам кампартыі займаліся ідэалагічным выхаваннем, палітычнай асветай народа, у тым ліку атэістычнай прапагандай. У быт уваходзілі камсамольскія вяселлі, чырвоныя хрэсьбіны, чырвоны вялікдзень і інш. У агульным складзе КСМБ за 1922–1928 гг. працэнт беларусаў хутка ўзрастаў (у 1927 г. – 67 % ад агульнай колькасці)[611], рускіх і яўрэяў памяншаўся, палякаў і іншых нацыянальнасцей крыху павялічыўся. Немцаў, у месцах іх кампактнага пражывання, у КСМБ не было ніводнага[612].

Калі аналізаваць нацыянальны склад КСМБ па асобных акругах за 1925–1927 гг., можна заўважыць цікавую акалічнасць – нязначна, але працэнт яўрэяў у складзе сакратароў ячэек узрастаў. Калі працэнтная вага рускіх і іншых у складзе мясцовых арганізацый заставалася амаль той жа, дык у складзе бюро ячэек, сакратароў ячэек, складзе райкамаў істотна павялічвалася. Пабольшала палякаў у арганізацыях і складзе райкамаў, але адначасова значна скарацілася колькасць сакратароў палякаў. У кіруючых органах ЛКСМБ (ЦК, акружкомы, райкамы) колькасць тытульнага насельніцтва павялічвалася толькі на 5–10 %, палякаў і яўрэяў паменшыла, больш стала прадстаўнікоў іншых

---

[607] Пастанова ЦК КП(б)Б “Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў” // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 78–79.

[608] *Кострыченко Г.В.* Тайная политика Сталина. С. 132.

[609] *Вдовин А.И.* Российский федерализм и «Русский вопрос» // Вестник Московского университета. История. 2000. № 5. С. 18.

[610] Административно-территориальное устройство БССР.

[611] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё . С. 347.

[612] Матэрыялы абследавання // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 236–241.

нацыянальнасцей. З агульнай тэндэнцыі вылучаецца павелічэнне колькасці асоб рускай нацыянальнасці ў апараце ЦК з 8,1 да 14 %[613].

Вялікі працэнт яўрэяў (81,5 %) быў і ў складзе актыву піянерскай арганізацыі. Наогул, піянерскі рух быў найбольш распаўсюджаным сярод яўрэйскіх дзетак. У яўрэйскіх нацыянальных школах 70–80 % вучняў былі піянерамі (1925). Так, напрыклад, на тэрыторыі Магілёўскай акругі былі атрады ў Шклове, Быхаве, Чавусах, Прапойску, Карме[614]. Дрэнна ішла піянерызацыя ў польскіх нацыянальных школах, з вялікай цяжкасцю ўзнікалі піянерскія атрады ў літоўскіх і латышскіх школах[615].

Якім чынам спрычыніліся нацыянальныя меншасці да станаўлення савецкага прафсаюзнага руху ў БССР бачна з наступных прыкладаў, якія асвятляюць ролю палякаў і яўрэяў. На 01.05.1924 г. сярод членаў дзесяці найбуйнейшых прафсаюзаў Беларусі палякі складалі – 7,3 %. Адпаведна, яны былі належным чынам прадстаўлены ў выбарных органах прафесійных саюзаў. У 1925 г. у складзе ЦСПСБ палякаў было 2,9 %, у 1926 г. у складзе яго прэзыдыума – 5,9 %, у акруговых саветах прафсаюзаў – 6,0 %, у райпрофбюро – 44 %, у цэнтральных праўленнях прафсаюзаў – 5,2 %, у акруговых аддзяленнях – 3,7 %, у ФЗК – 3,1 %. Удзельнічалі палякі і ў працы з’ездаў прафсаюзаў. А. Лейзераў у якасці прыкладу прыводзіць наступную працэнтную вагу палякаў на рэспубліканскіх з’ездах (1925): сярод дэлегатаў саюза дрэваапрацоўшчыкаў – 5,3 %, саюза скурнікаў – 1,3 %, саюза папернікаў – 15,9 %, саюза медыка-санітарных работнікаў – 2,4 %[616].

У 1922 г. з 10 членаў павятовага прафбюро 9 былі яўрэямі. У тым жа годзе ў Магілёве яўрэі былі сакратарамі ячэек прафсаюзаў: работнікаў медыка-санітарнай працы, скурнікаў, будаўнікоў, харчавікоў, камунальнай гаспадаркі, дрэваапрацоўшчыкаў, швейнай прамысловасці, народнага харчавання, сувязі, работнікаў мастацтва, транспарту, работнікаў савецкіх органаў, воднага транспарту[617]. Згодна даклада бюро Яўсекцыі ўлетку 1923 г. з 7412 рабочых, заарганізаванных у прафсаюзы, 2035 былі яўрэйскай нацыянальнасці. Сакратаром Магілёўскага павятовага прафсаюзнага бюро да 1924 г. быў яўрэй Л. Эпштэйн[618].

Адразу пасля ўз’яднання Магілёўшчыны з БССР на VI канферэнцыі прафсаюзаў у красавіку 1924 г. было абрана Магілёўскае павятовае бюро прафесійных саюзаў у складзе 9 членаў і 3 кандыдатаў. На першым арганізацыйным пасяджэнні 15 красавіка было ўтворана бюро і размеркаваны абавязкі: старшыня, ён жа кіраваў арганізацыйнай і культурнай працай – Б. Эпштэйн, сакратар і адказны за тарыфна-эканамічную работу – Эйнгорн, інспектар працы – Каганаў, адказны за працу сярод моладзі – Мушкацін, сярод

[613] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады ХХ ст.). С. 60.
[614] Звесткі аб колькасці піянерскіх арганізацый // ДАГАМаг. Ф. 30. Воп. 1. Спр. 37. Арк. 9, 31.
[615] Пратаколы пасяджэнняў латышскай нацсекцыі // Там жа. Ф. 6575. Воп. 1. Спр. 177. Арк. 15–25.
[616] *Лейзеров А.* Участие поляков в государственной, экономической, культурной жизни Беларуси (1920–30-е годы) . С. 199.
[617]Справаздачы // ДАГАМаг. Ф. 6622. Воп. 1. Спр. 190. Арк. 37 ; Спр. 150. Арк. 99, 103.
[618] Справаздачы // Там жа. Спр. 227. Арк. 296 адв. ; Спр. 189. Арк. 9 ; Спр. 411. Арк. 3.

жанчын – Л. Пінская, скарбнік – Хвошч. У склад бюро ўвайшлі таксама яўрэі: Лапо, Гелер, Бунімаў.

На 01.12.1924 г. існавалі 95 мясцовых камітэтаў на абшарах Магілёўскай акругі (496 членаў мясцкамаў). Нацыянальны склад камітэтаў быў наступны: беларусаў – 255, яўрэяў – 178, рускіх – 45, палякаў – 12, іншых – 6[619]. У 1924 – 25 гг. яўрэі з’яўляліся старшынямі акруговых аддзяленняў прафсаюзаў: будаўнікоў, скурнікаў, друкароў, харчавікоў, швейнікаў, савработнікаў, камунальнай гаспадаркі, дрэваапрацоўшчыкаў, народнага харчавання[620].

На 01.01.1925 г. агульная колькасць членаў прафесійных саюзаў па Магілёўскай акрузе складала 12298 чалавек. Нацыянальны склад: беларусаў – 6379, яўрэяў – 3362, рускіх – 1828, палякаў – 406, іншых – 323. У акрузе налічвалася 19 прафсаюзаў. Сярод кіраўніцтва акруговых аддзяленняў саюзаў (141 чал.) было: беларусаў – 47, яўрэяў – 70, рускіх – 19, палякаў – 9. У праўленнях саюзаў металістаў, будаўнікоў, швейнікаў, дрэваапрацоўшчыкаў, друкароў, харчавікоў, скурнікаў яўрэі складалі – 88,8 %. І толькі 15, % з іх былі членамі КП(б)Б, ЛКСМБ. Дарэчы, у дакументах асабліва падкрэслівалася, што 100 % яўрэяў пералічаных саюзаў гаварылі на яўрэйскай мове (ідыш), а 50 % былі здольныя чытаць і пісаць па-яўрэйску[621].

У студзені 1926 г. магілёўскія прафсаюзы паведамілі ў яўсекцыю наступныя звесткі аб колькасным складзе яўрэяў у сваіх ячэйках (гл. табліцу 14).

Табліца 14 – Колькасць асоб яўрэйскай нацыянальнасці ў прафсаюзах Магілёўскай акругі[622]

| Назва прафсаюза | Усяго | Яўрэяў |
|---|---|---|
| Металістаў | 205 | 86 |
| Рабземлеса | 262 | 83 |
| Медсанпрацы | 542 | 193 |
| Кам.гаспадаркі | 353 | 130 |
| Швейпрама | 283 | 270 |
| Работнікаў мастацтва | 130 | 59 |
| Друкароў | 107 | 87 |
| Сувязі | 208 | 3 |
| Савецкіх работнікаў | 1048 | 334 |
| Работнікаў асветы | 735 | 119 |

У маі 1926 г. у Магілёўскай акрузе з 14355 членаў прафсаюза было 3488 яўрэяў (24,3 %)[623].

Патрэбна заўважыць, што з канца 1920-х гг. колькасць яўрэяў у кіраўніцтве сярэдняга і вышэйшага ўзроўню прафсаюзаў пачала паступова памяншацца. Калі

619 Нацсклад прафсаюзных камітэтаў // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 82. Арк. 1–4.
620 Матэрыялы яўсекцыі // Там жа. Спр. 110. Арк. 22, 26.
621 Прафсаюзная праца сярод яўрэяў // Там жа. Спр. 63. Арк. 147.
622 Падлічана па: Лісты прафсаюзных арганізацый // Там жа. Спр. 108. Арк. 91–116.
623 Матэрыялы яўсекцыі // Там жа. Спр. 150. Арк. 28.

ў 1923 г. у прафсаюзным апараце яўрэі складалі 67 %, сярод старшыняў прафсаюзаў іх было 84 %, сярод старшыняў акруговых (павятовых) прафбюро 100 %[624], дык сярод апошніх у 1926 г. яўрэяў стала толькі 44 %. Як выключэнне выглядае склад прэзыдыума Магілёўскага акрпрафсавета 1927 г., у які ўваходзілі 2 беларусы, 7 яўрэяў, 2 палякі, 1 невызначанай нацыянальнасці. Да канца года нацыянальны склад акруговых праўленняў саюзаў на Магілёўшчыне стаў наступным: беларусаў – 48,4 %, рускіх – 8 %, яўрэяў – 36,9 %, палякаў – 4,3 %, іншых 2,4 %[625], што больш адпавядала нацыянальнаму складу прафсаюзаў. Яўрэі пераважалі ў такіх прафесійных саюзах, як: швейнай прамысловасці – 93,3 %, скурнікаў – 74,9 %, друкароў – 66 %. Складалі меншасць сярод чыгуначнікаў – 14 %, работнікаў сувязі – 1,9 %, папернікаў – 15,7 %, хімікаў – 16 % (прычым гэта ў асноўным рабочыя запалкавых фабрык, на шклозаводах Магілёўшчыны яўрэяў – членаў прафсаюза было толькі 4 %)[626].

01.02.1928 г. нацыянальны склад сярод членаў прафсаюзаў у Магілёўскай акрузе з'яўляўся зусім іншым: беларусаў – 69,7 %; яўрэяў – 20,7 %; палякаў – 2,6 %; рускіх – 5,4 %; латышоў – 0,4 %; іншых – 1,2 %[627].

Калі правесці аналіз нацыянальнага складу членаў прафсаюзаў БССР: сельскагаспадарчых работнікаў, індустрыяльных, транспарту і сувязі і іншых, то можна заўважыць, што сярэдні працэнт членаў прафсаюза сярод яўрэяў, рускіх, палякаў і іншых нацыянальнасцей узрастаў. У той жа час назіраўся і колькасны рост членаў прафсаюза беларусаў, што сведчыць аб агульнай тэндэнцыі павелічэння колькаснага складу прафесійных саюзаў. Гэтыя лічбы цікава параўнаць з нацыянальным складам кіраўнічых прафсаюзных органоў (у %) за 1927 і 1928 гг. Так, у ЦС ПСБ колькасць яўрэяў на выбарных пасадах узрасла з 37,5 % да 42,4 %, на аплачваемых з 46,1 % да 63,6 %[628], што ніякім чынам не адпавядала працэнтнаму складу яўрэяў – членаў прафсаюзаў, у той жа час колькасць рускіх, палякаў на выбраных пасадах паменшылася. Тая ж дыспрапорцыя, у нязначных адхіленнях, захоўвалася і на ўзроўні акруговых аддзелаў прафсаюзаў.

Крыху іншым было становішча на ўроўні вызваленага апарату фабрычна-завадскіх прафсаюзных камітэтаў (ФЗМК) і цэхавых камітэтаў БССР, сярод якога нацыянальныя меншасці складалі адпаведна 45 % і 16,7 % (гл. табліцу 15)[629].

Прафсаюзы Беларусі аб'ядноўвалі значную колькасць рабочых і служачых. З дапамогай вытворчых нарад прафсаюзныя арганізацыі ўцягвалі ў кіраўніцтва вытворчасцю шырокія слаі рабочых. Свае намаганні яны сканцэнтроўвалі на пытаннях павышэння вытворчасці працы, зніжэння сабекошту, паляпшэння якасці вырабаў, умацавання працоўнай дысцыпліны. Прафсаюзы займаліся арганізацыяй сацыяльнага страхавання, паляпшэннем

---

[624] Запіска еўбюро аб працы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3723. Арк. 34.
[625] Матэрыялы аб прафсаюзных канферэнцыях // Там жа. Спр. 3514. Арк. 1–1адв.
[626] Запіска еўбюро аб працы // Там жа. Спр. 3723. Арк. 29.
[627] Нацыянальны склад членаў прафсаюза // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 567.
[628] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.). С. 63.
[629] Статыстычныя звесткі аб нацскладзе прафсаюзаў // НАРБ. Ф. 265. Воп. 1. Спр. 2920. Арк. 8–7.

матэрыяльнага становішча і бытавых умоў працоўных, арганізацыяй культурна-асветніцкай работы.

Табліца 15 – Нацыянальны склад вызваленага апарату ФЗМК БССР, 1930 г.

| Нацыянальнасць | Вызваленыя старшыні цэхавых камітэтаў | Члены цэхавых камітэтаў | Вызваленыя члены ФЗМК |
|---|---|---|---|
| Беларусы | 20 | 719 | 317 |
| Яўрэі | 1 | 339 | 204 |
| Палякі | – | 68 | 20 |
| Рускія | 2 | 83 | 24 |
| Іншыя | 1 | 79 | 11 |
| Усяго | 24 | 1288 | 576 |

У 1930-я гг. у атмасферы ўсеагульнай падазронасці, татальных пошукаў “ворагаў народа”, масавых рэпрэсій дзейнасць прафсаюзаў была строга рэгламентавана. Іх працу жорстка кантралявалі партыйныя, савецкія і іншыя органы падаўлення. Ініцыятыва працоўных і прафсаюзных органаў накіроўвалася толькі на дасягненне пастаўленых мэтаў сацыялістычнага будаўніцтва. Прафсаюзам адводзілася роля перадатачнага механізму па выкананню партыйна-савецкіх рашэнняў[630].

Такім чынам, нацыянальныя меншасці БССР, асабліва яўрэі і палякі прынялі самы актыўны ўдзел у станаўленні савецкага прафсаюзнага руху, з’яўляючыся членамі прафесійных саюзаў і іх кіруючых структур. Прычым вага яўрэяў сярод кіраўніцтва прафсаюзамі ніякім чынам не адпавядала працэнтнаму складу яўрэяў – членаў прафсаюзаў, у той жа час колькасць рускіх, палякаў на выбраных пасадах паступова паменшалася. Яўрэйская моладзь адыграла асноўную ролю ў станаўленні і дзейнасці камсамольскай і піянерскай арганізацый БССР. На працягу 1920–30-х гг. кампартыя, прафсаюзы, камсамол былі адзяржаўлены, дзейнасць іх была строга рэгламентавана. У іх шэрагах не павінна было быць іншадумства і ініцыятывы, у тым ліку сярод кіраўнікоў – прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей.

**Удзел у дзейнасці масавых грамадскіх арганізацый.** У міжваенны час на тэрыторыі Савецкай Беларусі існавалі таварыствы і аб’яднанні, дзейнасць якіх кантралявалася партыйнымі і савецкімі органамі: таварыства садзейнічання абароне і авіяцыйна-хімічнаму будаўніцтву (Авіяхім), Міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), Саюз ваяўнічых бязбожнікаў, таварыства землеўпарадкавання працоўных яўрэяў, Чырвоны Крыж, краязнаўчае таварыства, сялянскай узаемадапамогі (ККОВ), таварыства саматужнікаў, “Прэч непісьменнасць”, спартыўныя, сельскагаспадарчыя,

[630] *Пушкин И. А.* Профессиональные союзы БССР в предвоенный период на примере Могилёвщины (1930–1941 гг.) // Труд. Профсоюзы. Общество. 2007. № 2. С. 78–82.

прыхільнікаў дзяцей, меліярацыйныя, прыхільнікаў вёскі, паляўнічых, музыкальна-мастацкія, эсперантыстаў, навуковыя і навукова-тэхнічныя (навуковае таварыства зубных урачоў), таварыства ўзаемнага крэдыту, Беларускае таварыства дапамогі пралетарскаму студэнцтву, усебеларускае пажарнае таварыства, сяброў радыё, лесу і г. д.[631]

У месцах кампактнага пражывання латышоў, літоўцаў, немцаў, яўрэяў, рускіх, палякаў найбольш часта, па ўказанні зверху дабраахвотна-прымусова, утвараліся ячэйкі МОПРа, Авіяхіма, "Прэч непісьменнасць". У справаздачных дакументах сярэдзіны 1920-х гадоў адзначаны, напрыклад, ячэйкі МОПРа (26 чал.) і Авіяхіма (26 чал.) у Анземаўскім нямецкім нацыянальным сельскім савеце Мазырскай акругі; ячэйка МОПРа (46 чал.) у латкалоніі Бабруйскай акругі. А наогул на той час у месцах кампактнага пражывання латышоў было арганізавана 5 ячэек МОПРа, 2 ячэйкі Чырвонага Крыжа, 11 ячэек Авіяхіма. На тэрыторыі Янавіцкага яўрэйскага нацыянальнага мястэчковага савета Віцебскай акругі па справаздачных паперах лічылася: у МОПР – 249 чалавек, Авіяхіме – 100 чал., Чырвоным Крыжы – 34 чал., "Прэч непісменнасць" – 72 чал., і г. д., але гэта было толькі на паперы. Па пяці акругах у месцах кампактнага пражывання яўрэяў, ячэйкамі МОПРа было ахоплена 37 % насельніцтва, Авіяхіма – 41 %[632].

На пачатак 1927 г. у Беларусі налічвалася да 1200 гурткоў ваенных ведаў, працавалі ваенна-санітарныя курсы, пасты паветранага назірання, 100 абсталяваных ціраў, праводзіліся "Тыдні абароны". Таварыствам садзейнічання абароне сабрана ў фонд "Наш адказ Чэмберлену" 39938 рублёў[633].

У гэтыя гады пры большасці буйных прадпрыемстваў і ўстаноў узнікалі шэфскія грамадскія арганізацыі працоўных. Яны праводзілі арганізатарскую і палітычную работу ў горадзе і на вёсцы, спрыялі ўмацаванню сувязей паміж рабочымі і сялянамі. З іх дапамогай утвараліся кааператывы, машынныя і іншыя аб'яднанні.

Шырокі размах у разглядаемы перыяд атрымаў краязнаўчы рух. Аматары-краязнаўцы апісвалі грамадскае і эканамічнае жыццё ў рэспубліцы, яе прыродныя ўмовы: глебы, карысныя выкапні, жывёльны і раслінны свет; вывучалі гісторыю народа, яго мову, святы і абрады, фальклор, звычаі, народныя веды і вераванні. Гэта пазітыўна ўплывала на нацыянальныя пачуцці, развіццё нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. У 1926 г. у Беларусі існавала 167 краязнаўчых арганізацый, у якіх налічвалася больш за 4000 чалавек, у 1930 г. ужо было 333 арганізацыі з 8819 членамі[634]. Адзначаючы станоўчую дзейнасць краязнаўцаў у прывіцці любові да роднага краю, сваёй малой радзімы, можна ўсё ж заўважыць, што яны разглядалі народныя традыцыі, народную культуру як перажытак, які не трэба браць з сабой у новае жыццё. Галоўная накіраванасць іх даследаванняў была ў пошуках парасткаў новага:

---

[631] *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. XX ст.) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1998. С. 32–38.

[632] Там жа. С. 35.

[633] Беларусы. Т. 4. С. 347–348.

[634] Там жа. С. 348.

звычаяў, абрадаў, нават новага фальклору. Вялікую ролю ў развіцці краязнаўства адыгрываў часопіс "Наш край", які праіснаваў усяго 5 год.

Трэба адразу адзначыць, што пераважная частка масавых грамадскіх аб'яднанняў заставалася "на паперы", аб чым сведчылі праверкі 1928–1929 гг. Зафіксавана, што ячэйкі працу вядуць слаба, яе практычна няма, ды, наогул, нават дакладнага ўліку членства не вялося. Уся канкрэтная праца звялася толькі да збору членскіх складак. На тэрыторыі нямецкіх сельсаветаў вышэйназваныя таварыствы – "проста фікцыя" і г. д. У выніку, як адзначалася ў 1928 г. : "На тэрыторыі латышскіх сельскіх саветаў Авіяхім і МОПР працу не вядуць, спыняюць сваю дзейнасць, а дзе-нідзе распаліся"[635]. Праўда, як выключэнне, былі прыклады канкрэтнай працы: латышскія арганізацыі МОПРа Віцебскай і Полацкай акруг апекавалі вязняў Дзвінскай турмы, гурткі Авіяхіма збіралі сродкі на танк "Латвешу Стрельнекс"[636]. Адсутнасць працы кіраўніцтва БССР тлумачыла незабяспечанасцю насельніцтва адпаведнай літаратурай на нацыянальных мовах і неналежнаю ўвагаю да гэтага накірунку работы з боку нацыянальных саветаў.

Табліца 16 – Нацыянальны склад кіруючых органаў кааператыўных аб'яднаняў, у працэнтах на 01.09.1929 г.[637]

| Назва | Бел. | Яўр. | Пал. | Рус. | Інш. |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго працоўных у выбарных органах спажывецкай кааперацыі | 63,8 | 23,4 | 0,4 | 6,8 | 5,6 |
| Адказныя супрацоўнікі спажывецкай гаспадаркі | 38,3 | 51,6 | 1,7 | 5,8 | 2,6 |
| Адказныя працаўнікі Белкаапсаюза | 27,2 | 62,8 | – | 7,2 | 2,8 |
| Адказныя працаўнікі акруговых спажыўсаюзаў | 51,8 | 37,0 | 2,2 | 6,0 | 3,0 |
| Старшыні гарпо, старшыні с/т | 68,8 | 19,2 | 5,8 | 0,4 | 5,8 |

На тэрыторыі нацыянальных сельсаветаў частка сялян была аб'яднана ў камітэты ўзаемадапамогі. Але ўся іх праца, як адзначалася ў матэрыялах абследвання латышскага сельскага савету Калінінскай акругі, Уздзенскага, Янавіцкага саветаў за 1926–27 гг. абмяжоўвалася толькі збіраннем складак і выдачай дапамогі. Найбольш актыўна і плённа працавалі прадстаўнікі і іншых нацыянальных меншасцей БССР у таварыствах, звязаных з вытворчасцю, перапрацоўкай і рэалізацыяй сельскагаспадарчай прадукцыі. Разнастайныя формы добраахвотнай кааперацыі найбольш былі распаўсюджаны сярод немцаў, латышоў, палякаў, літоўцаў. У 1928 г. 75–90 % нацыянальных меншасцей БССР былі ахоплены кааперацыяй – спажывецкай і сельскагаспадарчай (латышы – амаль на 100 %). Трэба адзначыць, што гэта не было высілкам камуністычнай улады, бо да рэвалюцыі 1917 г. латышскае насельніцтва было ўжо

[635] Беларусы. Т. 4. С. 348.
[636] Справаздача // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3637. Арк. 4, 30.
[637] Падлічана па: Справаздачы // НАРБ. Ф. 4. Воп. 8. Спр. 17. Арк. 304–307.

каапераваным [638]. У 1920-я гг. вельмі часта навакольнае беларускае насельніцтва ўваходзіла ў латышскія таварыствы[639].

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей не толькі ўдзельнічалі ў працы кааператыўных аб'яднанняў, але і прымалі актыўны ўдзел у іх кіруючых органах (гл. табліцу 16).

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей уваходзілі практычна ва ўсе ўзгаданыя аб'яднанні на добраахвотна-прымусовай аснове. Гэтаму кірунку працы з нацменшасцямі партыйнае і савецкае кіраўніцтва надавала вялікую ўвагу, бо праз таварыствы праходзіла агітацыйная, прапагандысцкая дзейнасць, адбывалася "інтэрнацыянальнае выхаванне", ды і вырашаліся фінансавыя пытанні. Розныя дзяржаўныя "займы", пазыкі распаўсюджваліся сярод насельніцтва у тым ліку і праз рознага роду арганізацыі і таварыствы.

**Нацыянальныя калгасы як своеасаблівая форма грамадскага кіравання і самакіравання.** Пераход да масавай калектывізацыі запатрабаваў лістападаўскі 1929 г. пленум ЦК УсеКП(б). 05.01.1930 г. ЦК УсеКП(б) прыняў пастанову "Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву". Гэтая пастанова абмяркоўвалася на студзеньскім (1930) пленуме ЦК КП(б)Б, на якім была пастаўлена задача завяршыць калектывізацыю да канца 1931 г. У той жа час шэраг мясцовых партыйных камітэтаў і выканкамаў імкнуліся дасягнуць 100 % калектывізацыі сялянскіх гаспадарак да вясны 1930 г., замест 35 %, як прадугледжвалі рашэнні пленума. Да лютага 1930 г. з 100 раёнаў БССР у 24 працэнт калектывізацыі быў ад 42 да 86 %, а ў 7 раёнах – 100 %. У цэлым па БССР да гэтага часу калгасамі было ахоплена 38,3 % сялянскіх гаспадарак.

Стварэнне калектыўных гаспадарак (калгасаў)[640] закранула інтарэсы і лёс нацыянальных меншасцей Беларусі. Прадметам нашага даследавання сталі нацыянальныя калгасы як своеасаблівая форма грамадскага кіравання і самакіравання не толькі сродкамі вытворчасці, але і грамадскага жыцця.

Для правядзення суцэльнай калектывізацыі лістападаўскі (1929) пленум прыняў рашэнне аб пасылцы ў вёску 25000 рабочых, так званых "дваццаціпяцітысячнікаў". У 1930 г. у вёскі па Беларусі былі накіраваны 610 чалавек[641]. Сярод іх, згодна дадзеных Белкалгасцэнтра на 01.04.1930 г., прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 54,8 % (гл. табліцу 17).

---

[638] Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч. 2 ; *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. ХХст.) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 1998. С. 32–38 ; *Тугай У.В.* Латышы на Беларусі. Мінск, 1999.

[639] Справаздача // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3637. Арк. 3.

[640] Калгас – прадпрыемства створанае для калектыўнага вядзення сельскай гаспадаркі. Спачатку гэты тэрмін быў агульным для трох тыпаў гаспадарак: сельскагаспадарчых арцелей, таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі і камун. Да 1938 г. у СССР засталася толькі адна форма калектыўнай вытворчасці ў вёсцы – сельскагаспадарчыя арцелі, за якімі замацавалася адзіная назва – калгасы, якая выкарыстоўваецца аўтарам у дадзенай манаграфіі.

[641] *Сидорцов В. Н.* Государственная деятельность рабочего класса БССР (1921–1937 гг. ). Минск, 1978. С. 68.

Табліца 17 – Нацыянальны склад “дваццаціпяцітысячнікаў” па акругах (1930)[642]

| Назва акругі | Усяго | Бел. | Яўр. | Пал. | Рус. | Інш. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Мінская | 81 | 45 | 25 | 5 | 4 | 2 |
| Гомельская | 76 | 42 | 22 | 2 | 3 | 7 |
| Віцебская | 60 | 27 | 14 | 3 | 8 | 8 |
| Бабруйская | 68 | 34 | 19 | 5 | 7 | 3 |
| Аршанская | 85 | 58 | 13 | 7 | 5 | 2 |
| Мазырская | 47 | 23 | 21 | 2 | 1 | – |
| Полацкая | 49 | 13 | 2 | – | 34 | – |
| Магілёўская | 144 | 34 | 34 | 3 | 70 | 3 |
| Усяго | 610 | 276 | 150 | 27 | 132 | 25 |

Першымі на тэрыторыі БССР стваралі калгасы яўрэі[643]. У 1924 г. у рэспубліцы быў 31 яўрэйскі калгас, у 1929 г. – 226 (па іншых звестках 249), пазней значная частка калгасаў узбуйнілася, іншыя сталі інтэрнацыянальнымі[644]. Доўгі час у Савецкай Беларусі калгасы былі амаль выключна яўрэйскімі. Сярод іншых нацыянальнасцей, у тым ліку беларусаў, складвалася ўражанне, што такая камуністычная форма вядзення гаспадаркі выключна яўрэйская. Дарэчы, у яўрэйскіх калгасах (1929) была даволі нязначная колькасць членаў КП(б)Б – 93 і 414 членаў КСМБ[645]. У дакладзе цэнтральнага праўлення АЗЕТу адзначалася, што “яўрэйскі земляроб у большасці ішоў шляхам калектывізацыі... ён ішоў не пад прымусам... ён паказаў шлях”[646]. Варта адзначыць, што яўрэі-калгаснікі для правядзення сельскагаспадарчых прац (пры апрацоўцы глебы, дойцы кароў) наймалі да 20–50 % навакольнага насельніцтва. Напрыклад, у калгасах “Свабода” Мінскага раёна, “Совег” Парыцкага, “Акцябр” Капыльскага, “Бальшавік” Чэрвеньскага раёнаў і інш.[647]

У 1926 г. з’яўляецца першы польскі калгас, у наступным годзе іх было – 13. У 1927 г. на базе сядзібы “Міхалава” Віцебскага раёна быў створаны першы ў СССР цыганскі калгас “Новае жыццё”, другі падобны калгас існаваў у Жлобінскім раёне. У 1928 г. арганізаваны першы літоўскі калгас. У тым жа годзе быў створаны кітайскі калгас (старшыня А. Чжан Ван Фу) пад Віцебскам. У пачатку 1930-х гадоў калгас стаў інтэрнацыянальным: разам з кітайцамі тут працавалі беларусы, палякі, літоўцы, латышы. На 1929 г., да пачатку суцэльнай калектывізацыі, было 277 нацыянальных калгасаў, з іх яўрэйскіх – 249, польскіх – 22, латышскіх – 4, літоўскіх – 1, кітайскіх – 1[648]. У 1930 г. было 19 латышскіх калгасаў[649]. Згодна звестак Ю. Майзеля, у 1929 г. у БССР было 252 яўрэйскія

---

[642] Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929–1932): Сб. докум. и матер. Минск, 1973. С. 89.

[643] Спачатку гэта былі камуны і сельскагаспадарчыя арцелі.

[644] Даклад камісіі // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4713. Арк. 17.

[645] Склад яўрэйскіх калгасаў // Там жа. Спр. 4771. Арк. 124.

[646] Даклад // Там жа. Спр. 4759. Арк. 79.

[647] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // Там жа. Спр. 7138. Арк. 31.

[648] Справаздачы нацсаветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 9.

[649] Матэрыялы абследавання // Там жа. Спр. 112. Арк. 59.

калгасы, якія аб’ядноўвалі 2255 яўрэйскіх сямей, і 23 польскія калгасы, у якіх палякі складалі ад 30 да 50 %[650].

Надзейным сродкам агітацыі за стварэнне калгасаў з’яўлялася правядзенне з’ездаў калгаснікаў, на якіх дэманстраваліся поспехі ў калектывізацыі вёскі. Так, напрыклад, 25–28.02.1931 гг. у Лёзненскім раёне праходзіў з’езд калгаснікаў. У ім прынялі ўдзел 155 дэлегатаў, сярод іх было 113 беларусаў, 5 рускіх, 18 латышоў, 4 літоўца, 7 яўрэяў, 4 палякі, 3 эстонцы, 1 украінец[651]. Нацыяльныя меншасці складалі 27,1 % ад агульнай колькасці ўдзельнікаў.

Калгасы дзейнічалі на падставе Статутаў (Статуты сельскагаспадарчай арцелі былі прынятыя ў 1930, 1935 гг.), у якіх акрамя палажэнняў аб асноўнай гаспадарчай дзейнасці было замацавана наступнае: пад кіраўніцтвам кампартыі весці працу па камуністычным выхаванні калгаснікаў, уключэнню іх у грамадскае жыццё, развіццю сацыялістычнага спаборніцтва; больш поўна задавальняць матэрыяльныя і культурныя патрэбы калгаснікаў, паляпшаць бытавыя ўмовы іх жыцця. Вышэйшым органам калгаса з’яўляўся агульны сход. Кіраўнік гаспадаркі – старшыня – выбіраўся агульным галасаваннем. У дапамогу старшыні выбіралася кіраўніцтва калгаса (праўленне), для кантралю за яго дзейнасцю – рэвізійная камісія. Выбары павінны былі праводзіцца тайным або адкрытым галасаваннем. Акрамя таго на ўзроўні калгаса дзейнічалі грамадскія органы – пасты народнага кантролю, таварыскія суды, добраахвотныя народныя дружыны, саветы брыгад і інш. Дзейнічалі Саветы калгасаў у раёнах, рэспубліцы. Нягледзячы на дэкларуемыя прынцыпы дэмакратыі, якімі ў пэўный ступені скарысталіся члены нацыянальных калгасаў, уся дзейнасць калгасаў (выбары старшыні, праўлення і г. д.) была падкантрольная кампартыі. Тым не менш, наяўнасць выбараў, абмеркаванне на сходах хвалючых калгаснікаў пытанняў, дзейнасць у грамадскіх органах, задавальненне сацыяльна-бытавых і культурных патрэб (пабудова жылля, школ, калгасных клубаў і інш.) дазваляла жыхарам вёскі далучацца да грамадскага і культурнага жыцця рэгіёна і рэспублікі. З улікам вагі калектыўнай гаспадаркі і усебаковага ахопу жыцця ўзрастала роля кіраўніцтва калгасамі ў справе камуністычнага выхавання вясковага насельніцтва.

Сяляне з ліку нацменшасцей неадназначна, па-рознаму, ўспрымалі пераход да калектыўных форм гаспадарання. Для сераднякоў уцягванне ў калгасы азначала карэнную ломку звычнага, традыцыйнага ладу жыцця. Таму яны выказвалі нязгоду і сумненні адносна ўступлення ў калгасы. Бедната і батракі, спадзяючыся палепшыць сваё эканамічнае становішча, у асноўным падтрымлівалі радыкальныя пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы.

Галоўнай прычынай праяў незадавальнення сераднякамі з’яўляліся вялікія падаткі і раскулачванне. Адносіны маламаёмасных сялян да раскулачвання і высялення больш заможных аднавяскоўцаў былі розныя. У адных раёнах кампактнага пражывання нацменшасцей раскулачванне праходзіла пры актыўным

[650] *Майзель Л., Майзель Ю.* Десять лет борьбы и строительства: 1920 – 11 июля 1930г. (к разрешению национального вопроса в БССР). С. 30–31.

[651] Проведение сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1929–1932): Сб. докум. и матер. С. 195.

удзеле беднаты, у іншых усе сяляне выказвалі пратэст супраць дзеянняў уладаў. Так, напрыклад, выступленні сераднякоў і беднаты польскай нацыянальнасці супраць раскулачвання адбыліся ў в. Логвішча Жыткавіцкага раёну Мазырскай акругі, Лозінскім польскім нацсавеце Мінскай акругі, Мархлеўскім польскім нацсавеце Аршанскай акругі[652] і інш. 24.07.1930 г., у дзень святкавання 10-годдзя БССР на сходзе ў Малькаўскім літоўскім нацыянальным сельскім савеце (Аршанская акруга) адбылося сапраўднае паўстанне. Жыхары запатрабавалі прымаць у калгас толькі літоўцаў і тады пагаджаліся з існаваннем калгаса, патрабавалі вярнуць раскулачаных. Калі пазней ДПУ пачало вывозіць чарговых “кулакоў”, літоўцы ўзвялі барыкады, запрудзілі дарогу бярвеннямі[653]. У памежных раёнах БССР з 01.01.1930 г. да 15.08.1931 г. адбыліся 8 масавых выступаў сялян супраць раскулачвання і калектывізацыі. Сярод кіраўнікоў былі палякі[654].

Яшчэ адной з формаў супраціву масавай калектывізацыі ў памежных раёнах БССР з’яўлялася нелегальная эміграцыя. Сярод польскага насельніцтва Бабруйскай, Мінскай акруг у пачатку 1930 г. з’явіліся факты пагроз у бок савецкай улады з намерам зыйсці з усёй маёмасцю ў Польшчу. Органы ДПУ атрымалі загад арыштамі папярэджваць магчымыя падобныя дзеянні насельніцтва. Нягледзячы на гэта, некалькім сотням сялянаў удалося гэта зрабіць[655]. Нелегальная эміграцыя ў асноўным канцэнтравалася на Палессі. Найбольшая адзначалася летам 1931 г.

Тым не менш, у чэрвені 1931 г. у БССР функцыянаваў 151 польскі калгас. Затым пасля вядомага артыкула І. Сталіна адбылося іх памяншэнне, на жнівень 1931 г. засталося 134. Але да пачатку 1933г. у БССР функцыянавала не менш 149 польскіх калгасаў. На 01.01.1934 г. калектывізацыяй у БССР было ахоплена 51 % гаспадарак. На 01.01.1935 г. – 72,6 % усіх сялянскіх двароў, абагульнена 80 % усіх пасяўных плошчаў. Улады адзначалі: “Вялікія дасягненні мае БССР ў справе калектывізацыі па раёнах нацменшасцей. Літоўскія бядняцка-серадняцкія гаспадаркі калектывізаваны на 100 %, а польскія ў сярэднім на 80 %”[656].

Імкненне прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у вёсцы і пры калектывізацыі захоўваць свае нацыянальныя адметнасці і адзінства выклікала заклапочанасць з боку партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, таму каб паскорыць працу па саветызацыі і камуністычнаму выхаванню, улады, шляхам аб’яднoўвання і рэарганізацыі, пераўтваралі нацыянальныя калгасы ў інтэрнацыянальныя або беларускія.

У выніку рэарганізацыі на 15.11.1930 г. у БССР застаўся 91 яўрэйскі калгас, якія аб’ядноўвалі 1732 яўрэйскіх сям’і, а амаль утрая больш – 4862 яўрэйскіх сям’і апынуліся ў інтэрнацыянальных калгасах[657]. Існавалі

[652] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы XX столетия). Минск, 2008. С. 19.
[653] Матэрыялы па абследванню нацсаветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 109. Арк. 57, 60 адв.
[654] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы XX столетия). С. 25–26.
[655] Паведамленні АДПУ па БВА // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 21. Спр. 279. Арк. 92.
[656] *Жук В.И.* Из истории польского национального меньшинства в БССР (20–30-е годы XX столетия). С. 28–29, 32.
[657] Размеркаванне яўрэйскіх сямей у калгасах БССР на 15.11.1930 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5052. Арк. 6.

58 калгасаў дзе было больш за 25 сямей яўрэяў, яны аб'ядноўвалі 2544 яўрэйскія сям'і і 2361 беларускую[658].

Стварэнне інтэрнацыянальных калгасаў прыводзіла да таго, што большасць яўрэйскіх сямей перасялялася ў гарады, мястэчкі, разбураліся яўрэйскія калектыўныя гаспадаркі. Таму ў грамадства складвалася ўражанне, што савецкая ўлада працягвае ранейшую практыку адлучэння яўрэяў ад зямлі. Напрыклад, калгас імя Чарвякова спачатку быў буйным яўрэйскім калгасам, пасля рэарганізацыі ў ім не засталося ніводнай яўрэйскай сям'і; у калгасе "Ройтэр Функ" Крупскага раёна з 15 яўрэйскіх сямей – ніводнай, тое ж у калгасах "Ройтэр Акцябр", "Найвег" Чашніцкага, "Бліўнг" Клімавіцкага раёнаў, у "Індзер Бег" Рагачоўскага з 8 яўрэйскіх сямей засталася толькі адна[659]. Аб'яднанне яўрэйскіх і беларускіх калгасаў у пераважнай большасці адбывалася па ініцыятыве і загадах партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва, пры гэтым і яўрэйскае, і беларускае насельніцтва былі супраць[660].

У інтэрнацыянальных калгасах яўрэйскім сем'ям было значна цяжэй, бо яны раней, ствараючы свой нацыянальны калгас, абагульнілі ўсю сваю маёмасць, або па роду заняткаў яны яе не мелі, у прыватнасці хатняй жывёлы. Калі ж яны аб'ядноўваліся з беларускімі, польскімі ці іншымі ў якіх захоўвалася нейкая хатняя жывёла ў асабістай уласнасці, матэрыяльны стан яўрэйскай сям'і станавіўся горшы. Яўрэі не ўмелі добра займацца земляробствам, адсюль нізкія заробкі і дрэнны матэрыяльны дабрабыт. Як вынік – адбываліся ўцёкі яўрэяў з інтэрнацыянальных калгасаў.

У цэлым адносіны паміж яўрэйскімі і беларускімі калгасамі былі добрыя, былі прыклады ўзаемадапамогі, супрацоўніцтва паміж яўрэйскімі і беларускімі сем'ямі ў яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасах: "Рэйтар", "Сацвег", "10 годдзе БССР" Рэчыцкага раёна, імя Карла Маркса ў Клімавіцкім раёне[661]. Адначасова зафіксаваны праявы антысемітызму і яўрэйскага шавінізму ў калгасах "Бліўнг", "Праца" Капыльскага раёна, імя Молатава Чэрвеньскага, "Бальшавік" і іншых, асабліва ва ўзаемаадносінах з палякамі[662].

Што з сябе ўяўлялі нацыянальныя калгасы (1932). Літоўскі нацыянальны калгас "Чырвоная вішня" Дубровенскага раёна, арганізаваны ў 1931 г., 415 га ворыва, 24 гаспадаркі літоўцаў: 22 – серадняцкія, 2 – беднякоў, 21 конь (13 рабочых), 70 кароў і целят. Напрамак дзейнасці – жывёлагадоўля і вырошчванне ільну[663]. Калгаснікі літоўцы катэгарычна не хацелі аб'ядноўвацца з суседнімі калгасамі таму, што гаспадарчыя справы ў іх нацыянальным калгасе былі лепшыя, чым у суседніх[664]. Калгас "10 годдзе БССР" Рэчыцкага раёна (тут і далей яўрэйскія) , створаны ў 1928 г., плошча ворыва 3000 га, 90 гаспадарак

658 Спіс калгасаў БССР з колькасцю яўрэйскіх сямей звыш 25 на 15.11.1930 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Арк. 3–4.
659 Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // Там жа. Спр. 7138. Арк. 41.
660 Там жа. Арк. 28.
661 Там жа. Арк. 25.
662 Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 26–27.
663 Інфармацыйная зводка № 6 Нацкамісіі ЦВК БССР за 01.05–15.06.1932 г. // Там жа. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 2865. Арк. 121.
664 Там жа. Арк. 122.

(59 яўрэйскіх). Спецыялізацыя – жывёлагадоўля: 303 каровы і 800 целят, 100 свіней (малочная і свінаферма). Калгаснікі з дапамогаю крэдытаў пабудавалі 4 двары для жывёлы, свінарнік, 75 жылых дамоў, цагельны завод, кузьню, млын, будынак чатырохгадовай школы. Калгас "Акцябр" Мазырскага раёна – 27 гаспадарак (25 яўрэйскіх). Спецыялізаваліся на жывёлагадоўлі: 75 кароў, 16 свіней, 17 коняў. Калгас "Сацыялістычны шлях" Парыцкага раёна, арганізаваны ў 1929 г., 170 гаспадарак (145 яўрэйскіх). Мелася ворыва 2252 га і 400 га сенажаці. Спецыялізацыя – малочна-гародніны. Малочная ферма – 300 кароў, 39 свіней, 40 авечак, 100 коней, 32 вулля, 2 трактары. У 1932 г. калгас меў прыбытак 177592 руб. Пабудавалі млын з крупадзёркай, кузьню, сіласную вежу, квасільню, гараж для трактароў[665]. Калгас "Чырвоны луч" Крупскага раёна, у 1930 г. 21 гаспадарка (18 яўрэйскіх). Занятак – жывёлагадоўля. Калгас "Карпачы" Клімавіцкага раёна, арганізаваны ў 1918 г. (у калгасе было ўсё абагульнена, яўляў з сябе – камуну), 18 яўрэйскіх гаспадарак, спецыялізацыя – жывёлагадоўля, малочная ферма 54 каровы. Меўся млын[666]. Калгас "Рэцтэ Фелд" Бешанковіцкага раёна, арганізаваны ў 1928 г., 23 яўрэйскіх гаспадаркі. У 1930 г. 29 гаспадарак, мелася 50 кароў, 6 коней. У раёне калгас лічыўся ўзорным. Калгас "1 Мая" Слуцкага раёна, арганізаваны ў 1925 г., у 1931 г. 168 гаспадарак – 106 яўрэйскіх, 59 беларускіх, 2 польскіх. Мелася 318 кароў, 156 свіней, 104 коні. Сад – 4 000 дрэў, агарод – 100 га. Калгас "Акцябр" Старабінскага раёна, арганізаваны ў 1925 г. як яўрэйскі, з 1931 г. – інтэрнацыянальны калгас – 78 гаспадарак (8 яўрэйскіх). Спецыялізацыя – птушкаводства[667]. Калгас "Колас" Чырвонаслабодскага раёна, існаваў з 1925 г., у 1929 г. аб'яднаўся з яўрэйскім калгасам "Праца". У пачатку 1930 г. 44 гаспадаркі (37 яўрэйскіх). Ворыва – 170 га, сенажаці – 100 га, сад – 6 га, агарод – 2 га, 128 кароў. Калгас (камуна) "Іскра" Шклоўскага раёна, арганізаваны ў 1925 г., у 1927 г. распаўся і зноў стварыўся. У 1931 г. – 25 гаспадарак (20 яўрэйскіх гаспадарак, 4 польскіх, 1 беларуская) і 3 асобы. Спецыялізацыя – малочна-гародніны. Ворыва 131 га, сенажаці 132 га., сад і агарод 15 га[668].

У пачатку 1932 г. адбылося абследаванне яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасаў брыгадамі ЦК. Яно засведчыла, што большасць абследаваных калгасаў справілася з уборкай ураджаю і выканалі план нарыхтовак, некаторыя па пэўных пазіцыях нават перавыканалі: калгас "Карпачы" Клімавіцкага раёна выканаў план усіх нарыхтовак на 140 %, "Новае жыццё" Клімавіцкага раёна на 120 %, "Акцябр" Капыльскага раёна і "Акцябр" Мазырскага на 100 %[669]. Але трэба мець на ўвазе, што пры высокіх працэнтах здачы нарыхтовак практычна нічога не заставалася на працадні і выплаты калгаснікам. Гэта спараджала нездавальненне з боку калгаснікаў і не зацікаўленасць у выніках сваёй працы. Адбываліся выпадкі не правільнага размеркавання ўраджаю на працадні, нізкая ўраджайнасць збожжа і

[665] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 43.
[666] Там жа. Арк. 44.
[667] Там жа. Арк. 45.
[668] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 46.
[669] Там жа. Арк. 13–14.

бульбы, прыклады безгаспадарлівасці, напрыклад, у калгасах: "Звязда" Старабінскага, "1 Мая" Слуцкага, імя Сталіна Мазырскага, "Рэйтар Ванг" Крупскага, "Прагрэс" Чашніцкага раёнаў і інш. З другога боку для паляпшэння матэрыяльнага становішча прымаліся нешматлікія спробы ўмацавання гаспадарак калгасаў. У яўрэйскіх калгасах: "Заходы" – правялі меліярацыю зямель, пабудавалі 3 двары для жывёл (на 300 галоў), стайню, свінарнік, сіласную вежу (з дапамогаю Белкамзета); "Касілкавічы" – пабудавалі двары для жывёлы, лазню, жыллё для калгаснікаў; "Ройтэ Фэйз" Бешанковічкага раёна – пабудаваны двор для жывёлы на 100 галоў, зернесховішча і малочная ферма; "Карпачы" Клімавіцкага раёна – пабудаваны кароўнік, млын, жыллё для калгаснікаў[670].

Пры гэтым, варта адзначыць, што падобнае будаўніцтва прывяло да вялікай запазычанасці дзяржаве з боку яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасаў. Яны набралі крэдытаў на будаўніцтва, але ў выніку неправільнага, безгаспадарчага выкарыстоўвання атрыманых сродкаў не змаглі дасягнуць пастаўленых мэтаў. Утварыліся такія вялікія запазычанасці, што іх немагчыма было вярнуць не толькі з прыбыткаў, але нават прадаўшы ўсю маёмасць калгаса. Напрыклад, калгас "Колас" Чырвонаслабодскага раёна: дзяржаўны крэдыт на 01.01.1932 г. – 82 298 руб., а ўся яго маёмасць была ацэнена ў 95 000, з іх 60 тыс кошт будынкаў як гаспадарчых, так і жылых. Калгас "Акцябр" Капыльскага раёна (старшыня Гінзбург): у выніку безгаспадарчасці і крадзяжоў запазычанасць складала 46 000 руб. Калгас план нарыхтовак выканаў, але з 96 кароў засталося 12, з 30 коней – 4, з 30 авечак засталіся адзінкі. Запазычанасць калгасаў: "Бальшавік" Чэрвеньскага раёна – 21 152 руб., "Іскра" Шклоўскага раёна – 43000 руб., "Камф" Парыцкага – 41 000 руб. (гэта пры 35 гаспадарках), "10 годдзе БССР" Рэчыцкага – 300 000 руб. (пачалі будаваць крухмальны завод, патрацілі грошы, але працу не давялі да канца)[671].

Правядзенне калектывізацыі парушыла традыцыйны ўклад жыцця нацыянальных меншасцей БССР. Савецкая ўлада бачыла ў калектывізацыі асноўны сродак пераходу да камуністычнага грамадства вясковага насельніцтва, у якім не павінна было быць месца рэлігіі. Аднак у 1930-я гг., нягледзячы на антырэлігійную прапаганду, рэпрэсіі ў адносінах да актыву абшчын і святароў, рэлігійныя перакананні (вераванні) былі часткай жыцця насельніцтва ў нацыянальных калгасах БССР. У яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасах значная частка калгаснікаў не працавала ў суботу і святочныя дні, у час асенніх і іншых рэлігійных свят ствараліся малельні, рабілі мацу, карысталіся паслугамі рэзніка[672].

Калгасны лад быў не сумяшчальны з глыбокай рэлігійнасцю латышскага, нямецкага і польскага насельніцтва Беларусі. Сярод іх было шырока распаўсюджана меркаванне, што ў калгасах будуць гвалтоўна прымушаць адмаўляцца ад рэлігіі. Менавіта ўплывам "контррэвалюцыйных клерыкальных і сектанцкіх элементаў, рэлігійным фанатызмам" савецка-партыйнае кіраўніцтва

---

[670] НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7138. Арк. 18, 19.

[671] Там жа. Арк. 22–24.

[672] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // Там жа. Арк. 26, 34–35 ; Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б // Там жа. Спр. 6301. Арк. 35.

тлумачыла нізкія паказчыкі калектывізацыі сярод нямецкага насельніцтва. Так, у Нараўлянскім раёне працэнт калектывізацыі мясцовых немцаў складаў у канцы 1931 г. – 3,5 %, у 1934 г. – 9,1 %. Гэта было значна ніжэй адпаведных паказчыкаў у асяроддзі іншых мясцовых нацыянальных меншасцей – палякаў і ўкраінцаў[673]. Гвалтоўнае правядзенне калектывізацыі ў БССР актывізавала прыхаваную і адрытую па-за культавую дзейнасць вернікаў у асяродку нацыянальных меншасцей[674].

Зніжэнне тэмпаў калектывізацыі выклікала негатыўную рэакцыю ўладаў, якія ўзмацнілі рэпрэсіўныя метады ўздзеяння на вясковае насельніцтва, у тым ліку і на нацыянальныя меншасці. Так, у вясною 1934 г. "ачысцілі ад кулацка-шкодных элементаў" нацыянальны літоўскі калгас "Гэдрыс" Сухараўскага сельсавета Чавускага раёна[675]. 26.02.1934 г. на бюро ЦК КП(б)Б зацвердзілі пастанову ЦК КП(б)Б "Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў". У ёй адзначылі, што калгасы "Гайма" Быхаўскага раёна, "Цэлтнэ" Ушацкага раёна, "Бязбожнік", "Сарканойс Арайс" Лёзненскага раёна і іншыя "засмечаны кулацкімі, класава-варожымі і антысавецкімі элементамі". ЦК КП(б)Б пастанавіла ачысціць калгасы ад кулакоў і класава-варожых элементаў[676].

Незадаволенасць і супраціў выклікала практыка калектывізацыі сельскай гаспадаркі і на тэрыторыі Заходняй Беларусі пасля яе далучэння да БССР. Неабходна адзначыць, што гэты працэс у заходніх абласцях у 1940–1941 гг. праходзіў у мякчэйшай форме, чым гэта было ў СССР у 1930-я гг. Мясцовых кулакоў цалкам не раскулачвалі і ў большасці не высялялі. Ім у залежнасці ад мясцовых умоў пакідалі 10–15 гектараў зямлі, якую яны павінны былі апрацаваць без найму працоўнай сілы[677].

У выніку можна сцвярджаць, што палітыка калектывізацыі закранула ўсе нацыянальныя меншасці Беларусі. Калгасы з'яўляліся своеасаблівай формай грамадскага кіравання і самакіравання не толькі сродкамі вытворчасці, але і грамадскага жыцця. Аб чым, у прыватнасці сведчыць тое, што роля старшыні калгаса ў жыцці грамадства ў савецкі час пастунова ўзрастала ў параўнанні з роллю старшыні мясцовага савета, які страчваў рэальны ўплыў.

Калектыўныя гаспадаркі былі пастаўлены ў становішча, якое выключала ініцыятыву, а тым самым асуджала сельскую гаспадарку на адставанне ад патрэбаў грамадства. Адбывалася разбурэнне абшчыннага самакіравання ў сельскім побыце, аднак яго асобныя элементы працягвалі жыць і ў новых умовах (звычай узаемадапамогі – талака і інш.). Правядзенне калектывізацыі ў БССР

---

[673] ДАГАГом. Ф. 4286. Воп. 1а. Спр. 127. Арк.36 ; Воп. 2а. Спр. 32. Арк. 55 ; Спр. 33. Арк. 60 ; *Пичуков В.П.* Религиозный актив немецкой диаспоры белорусского восточного Полесья (20–30-е годы XX в.) // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 2. Гродна , 2009. С. 43–48.

[674] *Пушкін І.А., Агееў А.Р.* Грамадзянская супольнасць і дзяржава. Станаўленне беларускага самакіравання. Магілёў, 2017. С. 123.

[675] Пастанова бюро Чавускага РК КП(б)Б ад 28.04.1934 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7154. Арк. 76 ; Пратакол № 21 пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 16.05.1934 г. // Там жа. Спр. 7138. Арк. 13.

[676] Пастанова ЦК КП(б)Б "Аб рабоце нацыянальных літоўскіх і латышскіх сельсаветаў, школ і калгасаў" (1934) // Там жа. Арк. 21, 78–79.

[677] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 39.

актывізавала прыхаваную і адрытую па-за культавую дзейнасць вернікаў у асяродку нацыянальных меншасцей.

### 3.3 Культурна-асветніцкая дзейнасць сярод нацыянальных меншасцей

Да рэвалюцыі 1917 г. на тэрыторыі Беларусі не было ніводнай вышэйшай школы, не хапала сярэдніх і пачатковых школ, якія б абслугоўвалі насельніцтва на родных мовах. Пасля рэвалюцыі савецкая ўлада з мэтай далучэння працоўных мас да сацыялістычнага будаўніцтва звярнула ўвагу на развіццё культуры не толькі карэннага насельніцтва, але і нацыянальных меншасцей.

1920-я гады характарызаваліся правядзеннем на дзяржаўным узроўні палітыкі беларусізацыі, якая характарызавалася: стварэннем сістэмы нацыянальнай адукацыі, у тым ліку на мовах асноўных нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі, пераводам на нацыянальныя мовы справаводства ў месцах кампактнага пражывання нацменшасцей, развіццём, побач з беларускай, літаратуры, мастацтва, тэатра, сродкаў масавай інфармацыі на нацыянальных мовах. Ствараліся спрыяльныя ўмовы для развіцця культур нацыянальных меншасцей. Даследчык У. Навіцкі падкрэслівае, што “за некалькі гадоў было створана столькі, колькі многія нацыі выпрацоўвалі дзесяцігоддзямі”[678]. Але трэба ўлічваць з якімі мэтамі гэта праводзілася. Так, на пленуме ЦК КП(б)Б 25–29.01.1925 г., у рэзалюцыі наконт працы сярод нацменшасцей адзначалася наступнае: “неабходна працу па беларусізацыі сярод яўрэяў, палякаў, латышоў пераважна праводзіць праз прадстаўнікоў дадзенай нацыянальнасці, вывучыўшых беларускую мову, ведаючых асаблівасці края. Асабліва важна ўсё працу і мерапрыемствы ў галіне барацьбы з нацыяналістычнымі і рэлігійнымі забабонамі праводзіць ад імя партыі рукамі прадстаўнікоў дадзенай нацыянальнасці, ці ў крайнім выпадку, гаворачых на мове дадзенай нацыянальнасці”[679].

Кіравалі працай асветных устаноў нацменшасцей інспектары нацыянальных культур акруговых інспектарыятаў НКА. У пэўных акругах былі інспектары народнай асветы па асобных групах нацыянальнасцей, у некаторых абслугоўвалі некалькі акруг. Так, яўрэйскія асветныя ўстановы па Магілёўскай і Аршанскай акругах падлягалі інспектару яўрэйскай культуры пры Магілёўскім акргінспектарыяце[680]. Ствараліся сеткі нацыянальных школ, культурных устаноў, рыхтаваліся кадры. Асаблівая ўвага ўладамі надавалася знешнім прыкметам роўнасці моў: шыльды і абвесткі павінны былі змяшчацца на чатырох дзяржаўных мовах.

**Развіццё пісьменнасці на нацыянальных мовах.** У другой палове 1920-х гадоў у БССР пісьменнасць складала сярод украінцаў – 43 %, рускіх – 49 %, палякаў – 50 %, літоўцаў – 61 %, яўрэяў – 70 %, латышоў – 74 %. Гэта было добрай базай для таго, каб нацыянальныя меншасці ўнеслі сваю ролю ў

[678] *Навіцкі У.* Гістарыяграфія гісторыі культуры Беларусі 20 ст.: вынікі і перспектывы даследаванняў // Гістарычны альманах. Т 4. Гародня, 2001. С. 75.
[679] Матэрыялы пленума ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2479. Арк. 31 адв.
[680] Справаздачы АВК // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр.964. Арк. 46.

ліквідацыю непісьменнасці ў БССР праз утвораныя нацыянальныя школы і пункты па ліквідацыі непісьменнасці (лікбезы), якія адначасова з'яўляліся цэнтрамі палітычнай асветы.

Утвараліся асобныя лікбезы для груп нацыянальных меншасцей па ўсёй тэрыторыі Савецкай Беларусі. Толькі ў Мазырскай акрузе ў 1926/27 навучальным годзе такімі пунктамі было ахоплена каля 60000 непісьменных. З агульнай колькасці лікбезаў было 308 беларускіх, 14 яўрэйскіх, 6 польскіх, 2 нямецкія[681]. Падчас заняткаў у лікбезах слухачы далучаліся да грамадскай працы ў гуртках, бібліятэках, хатах-чытальнях. Гэта садзейнічала актыўнасці прадстаўнікоў нацменшасцей у грамадскім і культурным жыцці. Адначасова ліквідацыя непісьменнасці праводзілася рознымі грамадскімі аб'яднаннямі. Напрыклад, сялянскімі таварыствамі грамадскай узаемадапамогі[682].

У арганізацыі ліквідацыі непісьменнасці былі задзейнічаны па ўласнай грамадзянскай ініцыятыве дзесяткі тысячаў пісьменных грамадзян[683]. Вялікі ўздым грамадзянскай ініцыятывы па ліквідацыі непісьменнасці быў падкрэслены ў пастанове "Аб выніках нацыянальна-культурнага будаўніцтва і палітыкавыхаваўчай рабоце" XI з'езда КП(б)Б, які адбыўся ў 1927 г. Аднак у пачатку 1930 г. заставалася яшчэ даволі шмат непісьменных. Не было нават дакладнага ўліку іх колькасці. Не належным чынам была арганізавана іх праца, шмат было фармалізму ў дзейнасці. Не дастатковым было іх матэрыяльна-тэхнічнае і вучэбна-метадычнае забеспячанне. Толькі ў 1926 г. быў выдадзены Галоўпалітасветам яўрэйскі буквар для пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці[684].

Найбольшую працу па пераадоленню непісьменнасці сярод нацыянальных меншасцей выканала іх нацыянальнае школьніцтва. У 1921 г. НКА БССР рэкамендаваў у школах кіравацца вучэбнымі планамі, дзе прадугледжвалася вывучэнне, побач з роднай мовай, любой іншай, распаўсюджанай у Беларусі. У школах нацменшасцей такімі абавязковымі мовамі пазней сталі беларуская, а затым руская (асабліва пасля гвалтоўнага згортвання беларусізацыі)[685].

07.04.1924 г. ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб увядзенні ў рэспубліцы ўсеагульнага пачатковага навучання ў аб'ёме пачатковай школы (планавалася ўвесці не пазней 1934/35 нав. г.). Асноўным тыпам школы сталі лічыць чатырохгадовую двухкамплектную школу і першы канцэнтр сямігодкі. Побач з увядзеннем агульнай сеткі школ была складзена асобная сетка нацыянальных школ на аднолькавых умовах. На пачатку па-ранейшаму пераважалі, асабліва сярод пачатковых школ, аднакамплектныя школы, гэта значыць з адным настаўнікам (норма 40 вучняў на 1 настаўніка). У 1924/25 навучальным годзе такіх школ на БССР было 72 % . Такія ж школы пераважалі і сярод нацыянальных. Дазвалялася ствараць нацыянальныя школы з камплектам

[681] Справаздача Мазырскага АВК // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2345. Арк. 355.
[682] *Григорьев Г.А.* Крестьянские общества взаимопомощи БССР: 1921–1930 гг. Минск, 1993.
[683] Из истории социалистического и коммунистического строительства / Сб. статей. Минск, 1973. С. 44–45.
[684] Справаздача яўсекцыі Магілёўскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 40а.
[685] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мінск, 1968. С. 305–306.

30 навучэнцаў, калі школьны радыус абслугоўвання быў большы за 3 км, павінен быў быць інтэрнат[686].

У БССР назіралася вялікая актыўнасць і жаданне насельніцтва вучыць сваіх дзяцей на роднай мове, дзеля гэтага яно пагаджалася будаваць школы нават за свае ўласныя сродкі. Толькі ў маі 1926 г. у Рэчыцкім раёне адбылося 4 сходы грамадзян, на якіх было прынята рашэнне аб адкрыцці школ на роднай украінскай мове з наступнага вучэбнага года[687]. Аднак сярод рускіх і яўрэяў была даволі высокая ўдзельная вага (каля 40–60 %) жадаючых вучыць дзяцей у рускіх і беларускіх школах і беларусаў рыма-каталікоў (50–60 %), якія вучыліся ў польскіх школах. Напрыклад, на самым усходзе Беларусі дзеці з вёскі Макаўе Крычаўскага раёна Калінінскай акругі, нягледзячы, што побач была беларуская школа, хадзілі за 5–6 км у суседнюю вёску, у Дарліўскую польска-беларускую школу[688]. На рускай мове ў асноўным абслугоўваліся вайскоўцы, іх дзяцей была большасць у рускіх школах, рускіх дзіцячых садках[689]. У Савецкай Беларусі толькі татары не мелі магчымасці рэалізаваць свае запатрабаванні. У жніўні 1927 г. татары, якія жылі ў мястэчку Узда, правялі сход, дзе звярнуліся да ўлад са зваротам аб адкрыцці нацыянальнай татарскай школы. Але, як праз год адзначыў інструктар ЦВК СССР, ім нават не далі адказу[690].

Калі выбарачна прааналізаваць нацыянальны склад школ у 1925 г., дык можна заўважыць, што ў 6 мястэчках (Шклоў, Бялынічы, Быхаў, Новы Быхаў, Чавусы, Прапойск) дзе меліся яўрэйскія школы, іх наведвала 567 вучняў. Адначасова 1333 вучня яўрэйскай нацыянальнасці вучыліся ў рускіх школах. У г. Магілёве 61 % усяго яўрэйскага дзіцячага кантынгента наведвала 9 рускіх школ і толькі 23,5 % тры яўрэйскія школы. У рускіх школах ад 55 да 59 % вучняў яўрэяў былі дзецьмі заможных бацькоў.

Яўрэі імкнуліся вучыць дзяцей у школах з рускай альбо беларускай мовай таму, што вышэйшую адукацыю магчыма было атрымаць толькі на гэтых мовах, тым самым заняць адпаведнае сацыяльнае становішча ў грамадстве. Да таго ж у гэтых школах антырэлігійная прапаганда вялася ў асноўным супраць хрысціянскай царквы і не закранала асноў іудаізму, што цалкам задавальняла значную частку яўрэяў старэйшага ўзросту.

Па стану матэрыяльнай і вучэбнай базы, забяспечанасці памяшканнямі нацыянальныя школы, за выключэннем рускіх, знаходзіліся ў няроўным становішчы ў параўнанні з беларускімі.

Большая частка школ была на дзяржаўным бюджэце, але існавалі школы на ўтрыманні насельніцтва. Матэрыяльнае становішча нацыянальных школ было цяжкім. Больш за палову не мелі сваіх памяшканняў і былі вымушаны іх арэндаваць. Каля 50 % памяшканняў мелі трухлявы стан і патрабавалі капітальнага рамонту. Для прыкладу, варта ўзгадаць пра актыўнасць, якую

---

[686] Пастанова ЦВК і СНК БССР // НАРБ. Ф. 101. Воп.1. Спр. 2190. Арк. 204.
[687] Справаздача Гомельскага АВК // ДАГом. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 278. Арк. 3–7
[688] Справаздача Калінінскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6601. Воп. 1. Спр. 380. Арк. 6
[689] Справаздача Магілёўскага АВК // Там жа. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269. Арк. 168
[690] Матэрыялы праверкі нацпрацы ў БССР // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 91. Арк. 251.

праяўляла насельніцтва Бярозаўскага і Анземаўскага нямецкіх нацыянальных саветаў пры правядзенні самаабкладання дадатковым падаткам для рамонту школ[691].

Падручнікамі школы былі забяспечаны дрэнна. У 1926 г. у польскіх школах быў адзін падручнік на трох вучняў. Праз тры гады латышскія школы былі забяспечаны падручнікамі на 60–70 %, польскія для першага канцэнтра на 65–80 %, у другім – на 15 %. Вучні карысталіся падручнікамі УССР і РСФСР, змест якіх быў мала прыстасаваны для Беларусі[692]. Не хапала парт і абсталявання. У асобных школах (латышскіх у Магілёўскай акрузе) не было нават геаграфічных карт, за выключэннем Еўрапейскай часткі СССР і Беларусі.

Навучанне ў школах вялося праз спалучэнне комплекснай і прадметнай сістэм. У школах праводзілася пазакласная праца: утвараліся харавыя, драматычныя гурткі, палітычныя, вялося мастацкае і грамадскае выхаванне.

Побач з дзяржаўнымі нелегальна існавалі прыватныя школы: польскія і яўрэйскія (хедэры), якія карысталіся пэўным аўтарытэтам сярод насельніцтва.

У 1925/26 навучальным годзе ўсяго было школ па БССР – 4279, з іх – 4042 чатырохгадовых, 237 сямігодак. З агульнай колькасці – беларускіх: чатырохгадовых – 3751, сямігодак – 176; польскіх: чатырохгодак – 103, сямігодак – 5; латышскіх: чатырохгодак – 15, сямігодка – 1; літоўскіх – 8; яўрэйскіх – 178 школ. Прычымназіралася тэндэнцыя да павелічэння колькасці нацыянальных школ, за выключэннем рускіх, колькасць якіх напрыканцы 20-х гадоў памяншалася. У 1926/27 навучальным годзе ў рэспубліцы было 200 яўрэйскіх школ, з іх 53 сямігодкі, 136 польскіх – 11 сямігодак, 439 рускіх – 32 сямігодкі, 32 іншых нацыянальнасцей – 1 сямігодка; 1927/28 навучальным годзе: 209 яўрэйскіх, з іх 61 сямігодка, 145 польскіх – 12 сямігодак, 136 рускіх – 18 сямігодак, 43 іншых нацыянальнасцей – 1 сямігодка[693]. У розных раёнах колькасць нацыянальных школ залежыла ад нацыянальнага складу і кампактнасці пражывання. Так, у 1927/1928 навучальным годзе ў Лёзненскім раёне Віцебшчыны было 51 школа: з іх 4 латышскіх, 1 яўрэйская, 1 польская, 1 літоўская, 1 эстонская. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей навучаліся не толькі ў сваіх нацыянальных школах і наадварот іх школы наведвалі дзеці беларусаў[694].

Не шмат існавала нацыянальных школ сялянскай і рабочай моладзі. Пастановаю Літоўскага бюро ЦК КП(б)Б ад 28.12.1928 г. было вырашана адкрыць у Дымаве Высачанскага раёна Віцебскай акругі першую літоўскую школу сялянскай моладзі[695].

[691] Справаздачы аб працы нацсаветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 67. Арк. 236–241.
[692] Інфармацыя аб становішчы нацыянальных школ // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4713. Арк. 27 ; Ф. 701. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 186–187.
[693] *Głogowska Helena.* Białorus 1914-1929. Kultura pod presja polityki. S. 140 ; *Вольфсон С.Я.* Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні: Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР да XV годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. С.16 ; *Тугай У.В.* Латышы на Беларусі. С. 102.
[694] *Карпекін К.* Латышскія школы Лёзненскага раёна ў 1924–1930 гг. // Латыши и белорусы: вместе сквозь века: ежегодный научный журнал. Вып. 6. 2017. С. 42.
[695] Матэрыялы Літоўскага бюро // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4269. Арк. 17.

У пачатку 1930 г. ў рэспубліцы існавалі для нацыянальных меншасцей: 70 яўрэйскіх школ-сямігодак, 154 чатырохгодак, 4 прафесійных школы, 2 сельскагаспадарчых тэхнікума, 11 хат-чытален, 63 вечаровыя школы, 55 дзіцячых садкоў; 12 польскіх сямігодак, 161 чатырохгодка, 3 школы сялянскай моладзі, 640 пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці, 7 дзіцячых дамоў, 2 дзіцячых сада, 38 хат-чытален; 21 латышская школа чатырохгодка, 8 хат-чытален; 10 літоўскіх школ чатырохгодак; 32 рускіх сямігодкі, 407 чатырохгодак[696]. Нягледзячы на тое, што ўзрос ахоп дзяцей школай на роднай мове – яўрэйскіх 60 %, польскіх 53 %, латышскіх 80–85 %, катастрафічна не хапала настаўнікаў для немцаў і эстонцаў, цалкам адсутнічалі школы на роднай мове для малых груп нацменшасцей, мала было сямігодак для украінцаў, літоўцаў, немцаў. Першая і адзіная ў Беларусі школа для цыганаў на іх роднай мове стала працаваць толькі на пачатку 1930-х гг. у г. Віцебску[697].

Нягледзячы, што існаваў план пашырэння колькасці нацыянальных школ, з канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. назіраецца працэс паступовага прыпынення і скарачэння вышэйзгаданых школ. Пры асаблівым жаданні дзяцей, вывучэнне роднай мовы ў школах пакідалася як неабавязковага прадмета.

У 1933 г. у рэспубліцы было 337 польскіх, 327 яўрэйскіх і 134 рускіх агульнаадукацыйных школ. З 1934 г. адбываецца пераход, асабліва ў гарадах і ўсходняй частцы БССР, да пераводу школ на рускую мову навучання[698]. Напрыклад, 05.08.1937 г. на пасяджэнні бюро Магілёўскага ГК КП(б)Б было прынята рашэнне аб рэарганізацыі 5-й польскай школы у рускую школу (дакладаў яўрэй Гольдзін). З пастановы (на мове арыгіналу): “У сувязі з тым, што пятая польская нацыянальная школа была ўкамплектавана ў сваёй большасці з дзяцей беларусаў-католікаў, якія не ведаюць польскай мовы, навучэнцы як у быту так і ў школе карыстаюцца рускай і беларускай мовай …Такая палітыка нічога агульнага не маючая з ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкай праводзілась нацыянал фашыстамі з Наркомасветы, якія пад прыкрыццём фальшывым нацыянальным сцягам штучна насаджалі польскія школы і насільственна полонізіравалі насельніцтва”[699].

У снежні 1937 г. была прынята пастанова ЦК УсеКП(б) аб нацыянальных школах, згодна з якой існаванне асобных нацыянальных школ (фінскіх, эстонскіх, нямецкіх, англійскіх, грэчаскіх і інш.) прызнавалася шкодным. Школы нацыянальных меншасцей БССР сталі масава пераўтварацца ў беларускія. Так, 28.08.1938 г. аргкамітэт ЦВК БССР па Магілёўскай вобласці зацвярдзіў пастанову

---

[696] *Майзель Л., Майзель Ю.* Десять лет борьбы и строительства: 1920 – 11 июля 1930г. (к разрешению национального вопроса в БССР). Москва–Харьков–Минск, 1930. С. 34.

[697] *Карнялюк К.* Цыганскі клуб “Рома” // Літаратура і мастацтва. 1993. 5 ліст. ; *Эстенко Л.* Приветствую тебя, цыган! С. 126 ; *Болотова Ю.Г.* Субкультура белорусских цыган // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 324–329.

[698] *Пушкін І.* Школы нацыянальных меншасцей БССР у 20–30-я гады ХХ ст. // Веснік Беларускага інстытута праблем культуры. Матэрыялы навуковай канферэнцыі ЧАЛАВЕК. КУЛЬТУРА. ЭКАНОМІКА. Мінск, 1997. С. 69–71 ; *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 248.

[699] Пратакол № 17 пасяджэння бюро Могілёўскага ГК КП(б)Б ад 05.08.1937 г. // ДАГАМаг. Ф. 6580. Воп. 2. Спр. 3. Арк. 247.

Клімавіцкага РВК аб рэарганізацыі латышскай школы ў Клімавіцкім раёне ў беларускую[700] і інш. Увага на просьбы і патрабаванні нацыянальных дыяспар не звярталася (нарыклад, яўрэі безвынікова спрабавалі дабіцца навучання на рускай мове)[701]. Яўрэйскія навучальныя ўстановы былі рэарганізаваны ў беларускія паводле пастановы Бюро ЦК КП(б)Б "Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы" ад 03.07.1938 г. Рашэнне ЦК КП(б)Б аб рэарганізацыі яўрэйскіх дзяцячых садоў і асобных яўрэйскіх груп у беларускіх дзіцячых садах у беларускія прынята 07.07.1938 г.[702] У 1938 г. ва ўсіх нацыянальных школах у якасці абавязковага прадмета для навучання была ўведзена руская мова. Змены ў нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі канца 1930-х гадоў вялі да пасілення рускай нацыянальнай складовай[703].

Нацыянальныя школы, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, недахоп падручнікаў і настаўнікаў, даволі якасна абучылі значную колькасць людзей на роднай мове і забяспечылі культурнае развіццё нацыянальных меншасцей БССР.

**Роля нацменшасцей у станаўленні навуковых, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў БССР.** Пасля заканчэння нацыянальных школ выпуснікі мелі магчымасць працягваць адукацыю ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах для нацменшасцей альбо на спецыялізаваных (нацыянальных) аддзяленнях, якія ўтвараліся ў тэхнікумах і ВНУ як на тэрыторыі БССР, так і ў іншых рэспубліках СССР. У пэўных установах для прадстаўнікоў нацменшасцей Савецкай Беларусі была ўстаноўлена квота, для іх спецыяльна браніраваліся вучэбныя месцы. Так, напрыклад, асобы польскай нацыянальнасці маглі працягваць абучэнне: у Камуністычным універсітэце Нацмензахада, Польскім аддзяленні Маскоўскага рабфака, польаддзяленні Магілёўскай савецка-партыйнай школы, Менскім польскім педтэхнікуме, польскім аддзяленні Ленінградскай саўпартшколы, у Вайсковай школе "Чырвоных камунараў" і інш. Латышы ў Цэнтральным латышскім педагагічным тэхнікуме і на латышскім аддзяленні рабфака Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта[704].

З большага нацыянальныя школы былі забяспечаны настаўніцкімі кадрамі. Але не ўсе яны на той час адпавядалі сваім пасадам. З мэтай падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў для нацыянальных школ адкрываліся спецыяльныя педагагічныя тэхнікумы, так у 1926/27 навучальным годзе ў БССР працавалі тры яўрэйскіх педагагічных тэхнікумы (у Мінску, Віцебску, Гомелі), дзе налічвалася 493 навучэнцы, двухгадовыя яўрэйскія педкурсы. Для

---

[700] Пратакол № 17 аргкамітэту ЦВК БССР па Магілёўскай вобласці // ДАМаг. Ф. 7. Воп. 2. Спр. 1. Арк. 337.

[701] Пастановы і цыркуляры бюро і ЦК КП(б)Б, матэрыялы расследавання фактаў аб закрыцці яўрэйскіх школ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 13133. Арк. 49 ; Спр. 13134. Арк. 9, 10; Спр. 13323. Арк. 23–26.

[702] *Альховік М.К.* Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф. Могилев, 2013. С. 106 ; Матэрыялы ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12428. Арк. 287 ; Спр. 12429. Арк. 39.

[703] Рускі народ абвяшчаўся першым сярод роўных // Правда. 1936. 1 февр.

[704] *Кулачков В.В.* Культурная политика государства и крестьянство Западного региона России в 1920-е гг. : монография. Брянск , 2013. С. 57–58.

падрыхтоўкі настаўнікаў польскіх школ у 1923 г. у Мінску быў адкрыты польскі педагагічны тэхнікум, пры ім з 1926 г. працавалі двухгадовыя курсы[705]. Для падрыхтоўкі настаўнікаў для латышскіх школ наркамасветы штогод пасылаў у Ленінградскі педтэхнікум па 10 стыпендыятаў. Аднак адкрыццё нацыянальных школ у БССР патрабавала нашмат большай колькасці педагагічных кадраў, чым рыхтавалася. Так у 1929/1930 нав.годзе толькі ў польскіх школах (у двухкамплектных, школах сялянскай моладзі і інш.) не хапала 15 настаўнікаў, работнікаў у 10 польскіх хатах-чытальнях. Прычым 30 настаўнікаў заставаліся працаваць у школах нягледзячы на тое, што на думку ўладаў "яны па сваёй ідэалогіі і педагагічнай падрыхтоўцы не адпавядалі займаемым пасадам"[706]. У 1930 г. катастрафічна не хапала настаўнікаў для нямецкіх і эстонскіх нацыянальных школ[707].

У 1922 г. быў утвораны Інстытут беларускай культуры, які разгарнуў сваю працу толькі ў 1924 г. У яго статуце было прадугледжана ўтварэнне яўрэйскага аддзелу для вывучэння мовы, літаратуры, гісторыі і археалогіі. Для вывучэння падобных пытанняў іншых нацменшасцей прадугледжвалася ўтварэнне адпаведных секцый і камісій[708]. У 1925 г. утвараюцца яўрэйскі і польскі сектары, у 1926 г. – кафедра гісторыі Літвы, у 1927 г. – камісія па вывучэнню латышоў[709]. Яўрэйскі сектар Інбелкульта ў 1925–26 гг. меў тры секцыі: гістарычную, лінгвістычную і літаратурна-мастацтвазнаўчую. Секцыі ўтварылі камісіі: слоўнікавую, моваэнаўчую, фальклорную, літаратурную, эканамічную, па вывучэнню гісторыі рэвалюцыйнага руху, гістарычную, па тэатральнаму мастацтву[710]. Гістарычная камісія сабрала матэрыялы па гісторыі яўрэяў БССР і апублікавала ў першай кнізе часопіса "Цайтшрыфт" ("Хроніка") у 1926 г. Літаратурная секцыя даследавала творчую спадчыну яўрэйскіх літаратараў: Пераца, Шалом-Алейхема, вывучала гісторыю яўрэйскай драмы і камедыі, збірала яўрэйскі фальклор і г.д. Сацыяльна-эканамічная секцыя даследавала некалькі мястэчак – Нароўлю Мазырскага і Лапічы Асіповіцкага раёнаў. Вынікі былі апублікаваны ў навуковых часопісах Інбелкульта і БДУ[711].

Сярод супрацоўнікаў Інстытута беларускай культуры былі асобы розных нацыянальнасцей (гл. табліцу 18)[712].

---

[705] Даведкі, дасланыя Польбюро пры ЦК КП(б)Б і Польбюро ЦК РКП(б) 27.07.1925–23.04.1928 гг. // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 382. Арк. 1–30

[706] Пратакол пасяджэння польбюро ЦК КП(б)Б ад 15.11.1929 г. // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 710. Арк. 52.

[707] Становішча і задачы культурна-масавага абслугоўвання нацменшасцей БССР, 1930 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5010. Арк. 153.

[708] *Токараў М.* Вывучэнне культуры і гісторыі нацыянальных меншасцей у Беларускай Акадэміі навук (1920–30-я гг. ) // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 62.

[709] Інстытут беларускай культуры. С. 21 ; *Токараў М.* Вывучэнне культуры і гісторыі нацыянальных меншасцей у Беларускай Акадэміі навук (1920–30-я гг. ) // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 62.

[710] *Герасімава І.* Навуковае жыццё яўрэяў Беларусі ў 1920–30-я гады // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 65 ; *Навіцкі У.* Развіццё культур нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1920-я гг. // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 50.

[711] *Герасімава І.* Навуковае жыццё яўрэяў Беларусі ў 1920–30-я гады // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 65.

[712] Падлічана па: Справаздача. Нацыянальны склад // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 98.

Табліца 18 – Нацыянальны склад членаў ІБК на 01.05.1926 г.

| | Агульны лік | Белар. | Яўр. | Паляк. | Інш. |
|---|---|---|---|---|---|
| Сапраўдных членаў | 77 | 48 | 16 | 6 | 7 |
| Членаў-супрацоўнікаў | 69 | 35 | 14 | 4 | 6 |
| Членаў- карэспандэнтаў | 60 | 38 | 5 | 13 | 4 |
| Усяго | 206 | 121 | 45 | 23 | 17 |

У 1927 г. у Інбелкульце з 76 правадзейных членаў было 18 % яўрэяў, 10 % палякаў, 5 % рускіх[713].

У першым статуце БАН, зацверджаным у 1928 г., прадугледжвалася ўтварэнне яўрэйскага і польскага нацыянальных сектараў. Для вывучэння іншых нацыянальных меншасцей утвараліся ў складзе аддзелаў адпаведныя даследчыя кафедры, камісіі, іншыя навуковыя падраздзяленні. Самым буйным быў яўрэйскі сектар. Як адзначае даследчык М. Токараў, у 1929 г. сектар меў 5 камісій: лінгвістычную, тэрміналагічную, па вывучэнню гісторыі яўрэйскай літаратуры, па вывучэнню яўрэйскага фальклору, па вывучэнню яўрэйскага насельніцтва. Па звестках І. Герасімавай, камісій было 7[714]. Асаблівасцю тэматыкі даследаванняў польскага, літоўскага і латышскага нацыянальных сектараў было тое, што яны займаліся вывучэннем не толькі асаблівасцей нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод гэтых нацыянальнасцей, якія жылі ў БССР, але шмат увагі надавалі гісторыі і палітыцы Польшчы, Літвы, Латвіі. Нягледзячы, што работы даследчыкаў, якія працавалі ў нацыянальных сектарах мелі ярка акрэслены ідэалагічны кірунак, яны адыгралі пэўную ролю ў забеспячэнні культурных патрэб нацыянальных меншасцей БССР. У 1920-я гг. у ІБК, затым БАН плённа працавалі (пазней рэпрэсаваныя ў 1937–1938 гг.) яўрэі: В. Гесен, Е. Рыўлін, С. Агурскі, Я. Бранштэйн, М. Кульбак, М. Агульнік, І. Ашэровіч; літоўцы: С. Матулайціс, В. Скардзіс; латыш К. Шкільтэр; украінец П. Бузук; палякі: І. Віткоўскі, С. Гельтман; рускія: Я. Афанасьеў, А. Дубах, М. Дурнава і інш.[715]

На пачатку 1930-х на базе існаваўшых навуковых цэнтраў былі ўтвораны Інстытуты: польскай пралетарскай культуры і яўрэйскай пралетарскай культуры (1932); літоўскай і латышскай нацыянальных культур (1933). У 1935 г. гэтыя інстытуты былі аб'яднаны ў Інстытут нацыянальных меншасцей АН БССР, які быў ліквідаваны ў 1937 г. Аднак акадэмічныя работнікі працягвалі ажыццяўляць даследаванні ў галіне яўрэйскай гісторыі, культуры, фальклору і мовы ідыш.

[713] Інстытут беларускай культуры. С. 17.

[714] *Герасімава І.* Навуковае жыццё яўрэяў Беларусі ў 1920–30-я гады // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 66 ; *Токараў М.* Вывучэнне культуры і гісторыі нацыянальных меншасцей у Беларускай Акадэміі навук (1920–30-я гг. ) // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 62–63.

[715] Возвращённые имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репресий. Минск, 1992 ; *Адамушка У.І.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск, 1994.

Працягвалася работа над выданнем руска-яўрэйскага слоўніка, адной з мэтаў якога было спрыянне яўрэям у авалоданні рускай мовай[716].

Актыўнасцю вылучаліся прадстаўнікі нацыянальных меншасцей у секцыях навуковых працаўнікоў. Так у складзе Цэнтральнага савету секцыі навуковых працаўнікоў БССР і цэнтральнага бюро, акрамя беларусаў былі прадстаўлены рускія, яўрэі, немцы. На III Усебеларускім з’ездзе навуковых працаўнікоў (1927) яўрэі складалі 24,1 %, рускія 17,2 %, латышы 4 %[717].

У гэты перыяд у БССР ішоў працэс стварэння вышэйшай школы. Вышэйшая і сярэдне-спецыяльная школы павінны былі забяспечыць неабходнасць Савецкай Беларусі ў кадрах і сфарміраваць новую інтэлігенцыю, якая б стаяла на баку савецкай улады.

Пры педагагічным факультэце БДУ працавалі яўрэйская (з 1922) і польская секцыі (аддзяленні). Там выкладалі вядомыя прафесары М. Нікольскі, С. Лазінскі, І. Раврэбе, І. Сасіс, І. Маркон[718]. Кіраўніцтва БССР у 1924 г. запатрабавала, каб студэнты 1 курса педагагічнага факультэта, акрамя абавязковай для ўсіх беларускай мовы, выбіралі адну з моў края (яўрэйскую альбо польскую) і адпаведную нацыянальную секцыю.

У 1926/1927 гг. навучальным годзе ў БДУ, Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію, Беларускі дзяржаўны ветэрынарны інстытут было залічана 217 яўрэяў, 89 рускіх, 17 палякаў і 40 асоб іншых нацыянальнасцей. Прычым пастановай НКА Беларусі ад 09.08.1926 г. было дазволена ў БДУ праводзіць экзамены на яўрэйскай мове для тых абітурыентаў, якія жадалі вучыцца на яўрэйскім аддзяленні. У выпускнікоў яўрэйскіх сямігодак або чатырохгодак пры паступленні ў прафесійныя школы, пры іх жаданні, прымалі экзамены на яўрэйскай мове[719].

Сярод студэнтаў прадстаўнікі нацыянальных меншасцей у 1932 г. складалі ад агульнай колькасці 39 %, у 1940 г. – 23,4 %. У 1937 г. сярод выпускнікоў тэхнікумаў іх было 20 %. Пасля беларусаў другое месца па колькасці навучэнцаў у ВНУ і тэхнікумах займалі яўрэі. У 1933 г. у вышэйшых навучальных установах на іх прыходзілася 31,5 % кантынгенту, у сярэдніх спецыяльных установах – 20,3 %, адпаведна рускіх – 4,0 і 2,7 %, палякаў – 2,5 і 3,3 %[720].

У цэлым аналізуючы нацыянальны склад настаўнікаў установаў народнай адукацыі і рабфакаў, варта адзначыць вялікую колькасць сярод іх прадстаўнікоў рускіх і яўрэяў. У меншых прапорцыях былі прадстаўлены ў палітасветустановах палякі, украінцы, латышы; ва ўстановах сацыяльнага выхавання – палякі, украінцы, немцы[721].

---

[716] *Альховік М.К.* Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., 18–19 апреля 2013 г., г. Могилев. Могилев, 2013. С. 107

[717] Матэрыялы з’езда // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3120. Арк. 653–670.

[718] *Смиловицкий Л.* Евреи Беларуси: из нашей общей истории. 1905–1953. С. 257–258.

[719] Справаздачы НКА БССР // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2303. Арк. 139,184.

[720] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 251–252.

[721] Статыстычны штогоднік 1925–1926. Мінск, 1926. С. 38–61.

Разглядаючы прафесарска-выкладчыцкі склад педагагічнага персаналу ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах на працягу 1925–1929 гг., можна канстатаваць рост колькасці прафесараў-беларусаў з 7 да 8 асоб, яўрэяў з 9 да 12, рускіх з 57 да 59, палякаў – з нуля да 1 асобы, іншых нацыянальнасцей з 9 да 10 асоб. У той жа час паменшылася колькасць дацэнтаў – беларусаў з 26 да 23, іншых нацыянальнасцей з 11 да 3; павялічыўся лік дацэнтаў – яўрэяў з 18 да 19, рускіх з 27 да 41, палякаў – (не было) да 3 асоб. Павялічвалася колькасць асістэнтаў – беларусаў з 57 да 68, рускіх з 35 да 37, паменшылася колькасць яўрэяў з 43 да 28, іншых з 8 да 5 асоб. Узрасла колькасць аспірантаў-беларусаў з 23 да 37 і яўрэяў з 3 да 12 асоб, паменшыўся лік рускіх з 12 да 6, не было ніводнага аспіранта паляка[722].

У 1935 г. у рэспубліцы пачаў дзейнічаць Настаўніцкі інстытут нацыянальных меншасцей. Акрамя трох яўрэйскіх і аднаго польскага тэхнікумаў, функцыянавалі чатыры яўрэйскія і пяць польскіх аддзяленняў пры рабфаках. Такім чынам, прадстаўнікі нацыянальных меншасцей адыгралі значную ролю у станаўленні навуковых і вышэйшых навучальных устаноў БССР.

**Аб'яднанні пісьменнікаў, якія пісалі на нацыянальных мовах.** Сярод творчай інтэлігенцыі палякаў, рускіх, яўрэяў найбольшай актыўнасцю якраз вызначаліся члены літаратурных груп, якія прытрымліваліся накіраванасці Аб'яднання пралетарскіх пісьменнікаў (АППа) і пісалі на нацыянальных мовах.

Найбольш ідэалагічна вытрыманай, на думку камуністычнай улады савецкай Беларусі, была дзейнасць польсекцыі Бел АППа, якую ўзначальваў У. Кавальскі. Распачала яна працу з 01.01.1928 г., аб'ядноўвала 63 аўтараў (1929). За першы год выдала два зборнікі, у якіх пытанням класавай барацьбы было прысвечана 6 твораў, літаратурнага жыцця – 18, прыгодніцкіх – 1, на антырэлігійную тэматыку – 11, прысвечаных гадавіне рэвалюцыі – больш за 20. У секцыі аб'ядноўваліся пераважна пачынаючыя паэты і пісьменнікі польскай нацыянальнасці. Яны стварылі 12 літаратурных гуркоў (280 сяброў) пры польскіх школах і педтэхнікуме, дзейнічалі літгурткі для рабочай моладзі пры клубе Р. Люксембург (Мінск) і ў Барысаве, для сялянскай моладзі ў Татаршчызне (Койданаўскі раён). Члены секцыі за год пабывалі з выступамі ў Бабруйску, Магілёве, Шклове, Віцебску, Барысаве, Слуцку[723].

Рускія пісьменнікі ў канцы 1920-х гг. утварылі групу "Звенья" з 14 чалавек. Яны мелі філіялы ў Віцебску і Бабруйску, друкавалі свае творы на літаратурнай старонцы газеты "Звязда" і іншых газет, якія выдаваліся на рускай мове. Выдалі некалькі невялічкіх зборнікаў. З іх выдзелілася 7 чалавек, у большасці сялянскіх пісьменнікаў, якія ўтварылі аддзяленне Маскоўскага Перавалу[724].

---

[722] *Пушкін, І.А.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці. 20-я гады XX ст. С. 90–91.

[723] *Пушкін І.* Удзел палякаў на Магілёўшчыне ў грамадска-палітычным жыцці БССР і адносіны да іх з боку дзяржаўнага кіраўніцтва 20-я гг. XX ст.// Проблемы славяноведения. С. 252–261 ; *Яго ж.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. XXст. ) // Магілёўская даўніна. С. 35.

[724] *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. XX ст. ) // Магілёўская даўніна. С. 36.

З 1924 г. існавала яўрэйская секцыя УАППа ў Беларусі, з 1928 г. яўсекцыя Бел АППа. У 1928 г. яна налічвала 15 чалавек, у наступным – 50, з іх 20 у Мінску, астатнія – у літгуртках Віцебска, Бабруйска, Барысава, Магілева, Полацка, Гомеля, Оршы, Мазыра. Свае творы яны друкавалі на старонках газет "Юнгер Арбайтер", "Кастрычнік", часопіса "Штэрн", выпусцілі зборнікі: "КЭП" і піянерскіх спеваў. Арганізавалі некалькі дзесяткаў выстуленняў пісьменнікаў у Мінску, Гомелі, Баруйску, Мазыры, Рэчыцы, Чэрвені, Койданаве, Калінкавічах, Тураве, Горках, Нароўлі. Вельмі часта выступалі разам з беларускімі пісьменнікамі. У 1929 г. друкаваліся зборнікі Харыка, Даўгапольскага, Аршанскага, Майзэля, Гардона[725]. Ідэалагічныя органы Савецкай Беларусі адзначалі, што частка яўрэйскіх пісьменікаў праяўляла літаратурнае чванства, маўляў, яўрэйская літаратура даўно абагнала беларускую, сярод беларусаў няма здольных аўтараў і г. д. Пісалі ў асноўным яны на тэмы жыцця дробнабуржуазных пластоў горада і мястэчак. Былі выпадкі падтрымкі шавінізму яўрэйскіх рабочых на заводзе "Кастрычнік". Часам праводзіліся рэлігійныя абрады абразання і інш. Іх паводзіны і творчасць абмяркоўвалі на сходках секцыі. Наогул, у паэзіі пераважала лірыка. Толькі маладыя члены секцыі з канца 20-х гадоў сталі знаёміць чытачоў з жыццём рабочых і сялян (Гарэлік, Ізраэліт, Даўгапольскі, Э. Каган).

**Мастацтва паасобных нацыянальнасцей.** У другой палове 1920-х гадоў перыядычна наладжваліся вечары збліжэння працаўнікоў мастацтва паасобных нацыянальнасцей. Дзяржаўная акадэмія мастацкіх навук супольна з Наркамасветы БССР праводзілі нацыянальныя вечары, на якіх выступалі з дакладамі аб стане беларускай літаратуры і мастацтва пісьменнікі літаратурных груп: "Маладняка", "Узвышша", "Юнгер Арбайтэр", "Камуна", "Пробліск". Падобнае было і падчас беларускай выстаўкі ў Маскве[726].

Значны ўплыў на грамадства аказвалі пастаноўкі яўрэйскага дзяржаўнага тэатра, польскага вандроўнага тэатра (займеў свой сталы будынак у Мінску толькі ў 1932 г.), рускага тэатра ў Бабруйску. На сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра ставіліся спектаклі на яўрэйскай, беларускай, рускай мовах.

У 1929 г. з удзельнікаў тэатральнага гуртка польскай моладзі пры клубе імя Р. Люксембург быў створаны Польскі дзяржаўны вандроўны тэатр, які гастраляваў па рэгіёнах рассялення палякаў. Яго асноўная сцэна знаходзілася ў Мінску ў будынку касцѐла св. Сымона і Алены. У ліпені 1932 г. тэатр стаў Дзяржаўным польскім тэатрам БССР, аднак ужо ў 1935 г. быў расфарміраваны[727].

На сцэне Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра раскрыўся талент у будучым заслужаных артыстаў БССР М. Моіна, М. Сокала, А. Трэпеля[728]. Згодна з пастановай Бюро ЦК КП(б)Б ад 08.05.1938 г. "Аб сетцы і базах размяшчэння

---

[725] *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у дзейнасці грамадска-палітычных аб'яднанняў БССР (20-я гг. ХХст. ) // Магілёўская даўніна. С. 36.
[726] Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т. 1. С. 40.
[727] *Захаркевіч С. А.* Этнічныя меншасці Беларусі: вопыт сацыяльнай трансфармацыі ў XIX–пачатку XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 4. Мінск, 2009. С. 247.
[728] *Навіцкі У.* Развіццё культур нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1920-я гг. // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2. С. 50.

тэатраў БССР" яўрэйскі драматычны тэатр пераводзіўся з г. Мінска ў г. Віцебск і павінен быў абслугоўваць галоўным чынам "перыферыю і раённыя цэнтры БССР"[729].

Значную працу сярод насельніцтва праводзіў яўрэйскі аддзел Беларускага дзяржаўнага музея, у якім былі шырока прадстаўлены яўрэйскі быт і мастацтва[730]. У ім з 8 па 28.11.1927 г. працавала сельскагаспадарчая выстава дасягненняў нацыянальных меншасцей. У ёй прынялі ўдзел яўрэі, палякі, латышы, літоўцы. Былі арганізаваны 3 аддзелы: культурны, сельскагаспадарчы і саматужніцкі, на якіх дэманстравалі дасягненні выдавецтва, навучальныя ўстановы, нацыянальныя суды, саветы, шырока быў прадстаўлены друк на нацыянальных мовах, узоры нацыянальнага мастацтва. Выставу за кароткі тэрмін наведалі 19698 чалавек, правялі 82 экскурсіі. Быў адзначаны высокі ўзровень прадстаўленых матэрыялаў, асабліва вылучаліся якасцю яўрэйскі і польскі аддзелы[731].

Міжваенны час быў перыядам станаўлення савецкага музычнага мастацтва. Асаблівае значэнне меў зварот да скарбніц народнай музыкі. Гэтаму была падпарадкавана збіральніцкая, кампазітарская і выканаўчая дзейнасць Інбелкульта, а пазней і БАН. Вялікае значэнне мела дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у тэатральным, выяўленчым і самадзейным мастацтве Савецкай Беларусі, у працы народных кансерваторый (першая была адкрыта ў 1918 г. у Віцебску, яны існавалі таксама ў Гомелі, Бабруйску). Сярод іх варта ўзгадаць мастакоў М. Шагала, Ю. Пэна, К. Малевіча, І. Суэціна, С. Юдовіна, І.Когана, скульптараў А. Бразера, З. Азгура, актораў: Г. Грыгоніса, Л. Ржэцкую (БДТ), Ю. Гальперыну, С. Болітара (БДТЮГ), С. Глікман, У. Стэльмаха, С. Фрыда (БДЦТРАМ) і інш. Значны ўклад у стварэнне асноў беларускай прафесійнай музыкі зрабілі рускія кампазітары: М. Чуркін, Я. Цікоцкі, А. Туранкоў, М. Аладаў [732]. Існавала практыка запрашэння на працу ў БССР з іншых рэспублік больш кваліфікаваных мастацкіх кадраў на адказныя мастацкія пасады[733].

Польскі вандроўны тэатр і яўрэйскі тэатр з поспехам выступілі падчас Усебеларускага тыдня ў Маскве. Яўрэйскі тэатр і графікі Юдовін, Бразер былі адзначаны ганаровымі дыпломамі выставы "вобразнага і тэатральнага" мастацтваў нацыянальнасцей СССР у Маскве[734].

---

729 *Альховік М.К.* Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф. Могилев, 2013. С. 107 ; Матэрыялы бюро ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Стр. 12400. Арк. 244.

730 Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т.1. С. 286–287.

731 Інфармацыя аб выставе. Кніга водгукаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 57.

732 *Ершова Э.Б.* Исторические судьбы художественной интеллигенции Белоруссии (1917–1941). С.43,114; Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т. 1. С. 360–365 ; *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 94.

733 Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т. 1. С. 118.

734 Там жа. С. 44–45,290.

**Друк і СМІ на нацыянальных мовах.** Прадстаўнікі нацменшасцей актыўна прымалі ўдзел у дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі (Белдзяржкіно, радыё, газеты і часопісы)[735].

У 1924 г. пастановаю СНК БССР было створана Белдзяржкіно, пакуль напачатку не было сваіх спецыялістаў, запрашалі з іншых рэгіёнаў СССР. У 1925 г. яно было аб'яднана з кінаарганізацыяй – Беларускае пралеткіно[736]. Нацыянальны склад прадстаўлен ў табл. 19.

Напачатку ў дзейнасці Белдзяржкіно пераважалі два кірункі: культурна-асветны і здымкі ўласных кінафільмаў. У лістападзе 1925 г. Белдзяржкіно набыло 25 кінаперасовак. За 4 месяцы 1926 г. былі паказаны 1048 кінасеансаў, якія наведалі 272 тысячы гледачоў[737]. Практыкаваліся наступныя формы працы: чытанне лекцый у кінатэатрах, складанне спецыяльных праграм навукова-агітацыйнага характару, стварэнне рабочых кінатэатраў, правядзенне дыспутаў. У 1928 г. адбылося адкрыццё кінафабрыкі Белдзяржкіно ў Ленінградзе. У 1920-я гады ў беларускім кіно вядучае становішча займала гісторыка-рэвалюцыйная тэматыка, толькі пачыналі адлюстроўваць праблемы сучаснасці. Значны ўклад у развіццё беларускага кіно ў 1920–30-я гады ўнеслі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей: Ю. Тарыч, В. Гардзін, Д. Шлюгпейт, Н. Аптэкман, М. Авербах, Г. Рошаль, А. Файнцыммер і іншыя.

Табліца 19 – Нацыянальны склад работнікаў Белдзяржкіно ў 1926–1929 гг.[738]

| **Нацыянальнасць** | **1926 г.** | **1927 г.** | **1928 г.** | **1929 г.** |
|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 1 | 7 | 8 | 14 |
| Яўрэі | 8 | 18 | 20 | 38 |
| Рускія | 1 | 1 | – | 1 |
| Іншыя | – | 1 | 2 | 2 |

На пасяджэнні савета пры ўпаўнаважаным "Радыёперадач" па БССР ад 21.10.26 г. было вырашана перавесці агучванне радыёгазеты на беларускую мову і ўвесці 1 раз на 2 тыдні ў эфіры яўрэйскі, польскі і латышскі аддзелы. Зводка перадач на радыё за кастрычнік 1926 г. утрымлівала 18 радыёгазет эфірам на 13 гадзін, перадачы на польскай мове – 2 (1 гадзіна), на яўрэйскай мове – 1 (30 хвілін), на латышскай – 1 (30 хвілін), рускія літаратурныя перадачы – 4 (3 гадзіны 45 хвілін). У справаздачы аб працы радыё (1926) адзначалася: "нашы

[735] *Пушкін І.* Нацыянальныя меншасці БССР у грамадска-палітычным і культурным жыцці (20-я гады XX ст.). С. 96–101.
[736] Мастацтва Савецкай Беларусі. Зб. дакум. і матэр.: У 2 т. Т. 1. С. 360 ; *Głogowska Helena.* Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki. S. 183–184.
[737] *Смаль В.И.* Сквозь призму десятилетий: О политике КП(б)Б в области киноискусства в 20–30-е годы. Минск, 1980. С. 15.
[738] Згодна: *Głogowska Helena.* Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki. Białystok, 1996. S. 186.

перадачы ідуць на нацыянальных мовах усіх нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі БССР"[739].

Кіраўніцтва Савецкай Беларусі надавала вялікую ўвагу выданню літаратуры на нацыянальных мовах. На яўрэйскай мове з 1924 па 1929 гг. Белдзяржвыдатам выдадзена 460 000 экзэмпляраў кніг, на польскай мове за гэты перыяд 185 000, на латышскай і літоўскай мовах – 9000, на рускай мове – 198 000 экз.

У рэзалюцыі 2-га Усебеларускага з'езда Саветаў па дакладзе аб народнай асвеце (1920) вялікая ўвага надавалася выданню і павелічэнню накладаў газет, часопісаў, у тым ліку і на нацыянальных мовах.

У 1919 г. у Гомелі выдавалася яўрэйская газета "Рабочий голос", якая была зачынена органамі савецкай улады[740]. Выдаваўся ў 1919–1921 гг. у Мінску часопіс "Школа и культура Советской Белоруссии" па-руску, па-беларуску і па-яўрэйску[741]. 01.06.1920 г. ЦК КП(б)ЛіБ прыняў пастанову аб выданні на польскай мове газеты "Молат" ("Młot") і на літоўскай "Камуністас". Газета "Молат" выдавалася на польскай мове штотыднёва з снежня 1918 г. у Мінску напачатку як орган выканаўчага ЦК КПРП і ЦК Кампартыі ЛіБ. Першым рэдактарам быў польскі камуніст Ю. Ляшчынскі[742]. З 12.12.1919 г. газета друкавалася ў Смаленску, у наступныя гады і да свайго закрыцця выходзіла ў Мінску як орган польбюро ЦК КП(б)Б[743]. На 1-ым Усебеларускім з'ездзе сялян-палякаў (1926), было прапанавана замест штодзённага "Молата", выдаваць штотыднёвік[744]. Ім стала газета "ORKA" (Ворыва) – орган ЦК КП(б)Б, якая прызначалася для сялян і выдавалася ў Мінску. Там жа выдавалася газета "Gwiazda Młodzieży" (Зорка Моладзі), якая павінна была адлюстроўваць інтарэсы польскай працоўна-сялянскай моладзі БССР і РСФСР. Наклад газеты "Ворыва" ў адрозненні ад "Зоркі" павялічваўся, магчыма таму, што органы КП(б)Б у першую чаргу клапаціліся аб сваёй газеце і таму, што шэрагі ЛКСМБ у той перыяд не значна павялічваліся за кошт польскай моладзі.

У 1920 г. у БССР выдавалася 14 перыядычных выданняў на рускай мове, 3 па-беларуску, 1 на рускай і беларускай мовах, 3 па-яўрэйску, 1 па-польску [745]. Матэрыялы, якія друкаваліся ў газетах на нацыянальных мовах аналізаваліся, што знайшло сваё адлюстраванне ў пастановах IV з'езда КП(б)Б, пасяджэння ЦБ КП(б)Б ад 17.02.1922 г.[746] Выдаваліся на яўрэйскай мове: піянерская газета "Дэр юнгер ленінец" (Малады ленінец), двухтыднёвы часопіс "Дэр юнгер арбайтэр" (Малады рабочы). Абодва выданні былі закрыты ў 1937 г.

---

[739] Справаздача аб працы радыё за 1926 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2345. Арк. 380–381 ; Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч 2. С. 92

[740] *Каменская Н.* Первые социалистические преобразования в Белоруссиии (25 окт.1917–июль 1919). Минск, 1957. С. 214.

[741] Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945). Мінск, 1993. С. 26–27.

[742] *Хацкевич А.Ф.* Польские интернационалисты в борьбе за власть Советов в Белоруссии. Минск, 1967. С. 90.

[743] Справаздачы рэдакцыі газеты "Młot", дакладная запіска рэдактара газеты ў ЦК КП(б)Б аб неабходнасці павелічэння накладу газеты, перапіска аб працы газеты. 16.04.1920 – 10.01.1922 гг. // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 328. Арк. 1–72.

[744] Пастановы з'езда // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 43. Арк. 33–35.

[745] Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР. Да X гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ч. 1. С. 72.

[746] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 1. С. 83, 113.

Згодна дадзеных прэзідыўма ЦВК БССР ад 1926 г., на тэрыторыі рэспублікі выдаваліся наступныя газеты і часопісы на нацыянальных мовах: штодзённая рэспубліканская газета “Кастрычнік” на яўрэйскай мове, накладам 6000 асобнікаў; штотыднёвая рэспубліканская газета “ORKA” на польскай мове, накладам 1400 асобнікаў; орган ЛКСМБ штодзённая газета “Юнгер Арбайтар” на яўрэйскай мове, накладам 2000 асобнікаў; орган ЛКСМБ газета “Gwiazda Młodzieży” на польскай мове выдавалася два разы на месяц накладам 1370 асобнікаў; часопіс “Штэрн” (Зорка) на яўрэйскай мове, накладам 3000 асобнікаў[747].

Са старонак “Штэрна” гучалі галасы паэтаў М. Кульбака, І. Харыка, Ц. Доўгапольскага, Г. Камянецкага, М. Тэйфа, М. Ліўшыца, празаікаў Ф. Гардона (П. Кабзарэўскага), Э. Кагака і інш., са старонак газеты “Ворыва” У. Кавальскага, Э. Раманоўскай. Уладам не падабалася, што ў “Штэрне” публікаваліся ў асноўным творы агульнага характару, якія мала асвятлялі тагачаснае грамадскае, культурнае і эканамічнае жыццё яўрэяў [748]. Гэты часопіс быў утвораны рашэннем бюро ЦК КП(б)Б ад 20.12.1924 г. як грамадска-літаратурны часопіс на яўрэйскай мове. Напачатку яго аб'ём быў 8 друкаваных аркушаў (64 стар.). У “Штэрне” друкаваліся: белетрыстыка, паэзія, асвятляліся агульныя пытанні грамадска-палітычнага і навуковага жыцця, эканоміка, культура, гісторыя кампартыі. Ён выдаваўся ў Мінску беларускім аддзяленнем выдавецтва “Школа і кніга”. У 1926 г. вакол часопіса гуртаваліся аб’яднанні пісьменнікаў.

У 1927 г. з 11 рэспубліканскіх газет было 4 на рускай мове, 3 на беларускай, 2 на польскай, 2 на яўрэйскай; з 11 часопісаў – 4 на беларускай, 3 на рускай, 2 на беларускай і рускай мове, 2 на яўрэйскай. Праз два гады ў савецкай Беларусі выдавалася 16 газет: 7 штодзённых, 2 штотыднёвых, 3 два разы на тыдзень, 4 тры разы на тыдзень. З іх на беларускай мове было – 8, на яўрэйскай – 2, па-руску – 1, па-польску – 1, па-літоўску – 1, на руска-беларускай мовах – 3. Выдавалася 20 часопісаў: 13 на беларускай мове, 1 на яўрэйскай, 6 на рускай і беларускай адначасова. Вакол газет утварылася сетка грамадскіх карэспандэнтаў[749].

Газета “Кастрычнік” да 1925 г. выходзіла пад назвай “Дэр Векер”, перайменаванне адбылося па рашэнню бюро ЦК КП(б)Б. Газета змяшчала матэрыялы як агульнадзяржаўнага зместу, так і з грамадскага, культурнага, эканамічнага жыцця яўрэяў. На Усебеларускім з’ездзе яўрэяў-сялян (1928) была прынята рэзалюцыя па дакладу аб газеце “Кастрычнік”. У ёй былі адзначаны як дасягненні, так і недахопы. Да станоўчага аднеслі: наяўнасць аддзела партыйнага жыцця, шырокага кола грамадскіх карэспандэнтаў, матэрыялаў па барацьбе з ідэалагічнымі традыцыямі БУНДа і іншых дробнабуржуазных партый, наяўнасць антысеміцкай прапаганды, старонак культуры, з жыцця працоўных. З адмоўных момантаў было адзначана: мала асвятляліся пытанні калгаснага будаўніцтва, слаба вялася выхаваўчая праца, мала ўвагі надавалася пытанням земляуладкавання

[747] Матэрыялы ЦВК БССР // НАРБ. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 1013. Арк. 69 ; Практическое разрешение национального вопроса в БССР. Ч 2: Работа среди нац. меншинств в БССР. С. 82.
[748] Матэрыялы нацкамісіі // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 141.
[749] Інфармацыя ЦК КП(б)Б // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4715. Арк. 41.

яўрэяў. У рэзалюцыі па дакладзе аб масавай працы ўказвалася адсутнасць яўрэйскай антырэлігійнай перыёдыкі, менавіта на яўрэйскай мове[750].

У газетах на польскай мове ўтрымлівалася шмат палітычна-грамадскага матэрыялу з жыцця палякаў, літаратурна-мастацкія старонкі, інфармацыя са школ, вёсак і г.д. Напрыканцы 1920-х гг. газета "Зорка моладзі" была зліквідавана, а забеспячэнне працы сярод польскай моладзі было ўскладзена на "Ворыва", якая стала выходзіць 2 разы на тыдзень. У 1926 г. абедзве газеты мелі па 160–200 грамадскіх карэспандэнтаў.

У 1926 г. вакол газеты "Юнгер Арбайтар" ўтварылася літаратурная група з 15 чалавек. Яна працавала ў двух накірунках: па лініі вучобы і грамадскай працы сярод рабочых і моладзі. Ладзілі вечары ў рабочых клубах, выязджалі ў мястэчкі, друкавалі літаратурныя старонкі, выпусцілі зборнік аб ахвярах "белага" тэрору.

З 1927 г. стала выходзіць на літоўскай мове газета "Раудонайс Артояс" (Чырвоны Араты). У кастрычніку 1930 г., падсумоўваючы працу газеты, было адзначана, што яна адыграла вялікую ролю ў справе павышэння культурнага ўзроўню і палітычнай свядомасці працоўных літоўцаў, да галоўнага дасягнення аднесена наяўнасць вялікай колькасці грамадскіх карэспандэнтаў – 164, з якіх 25 рабочыя ЗША[751].

Латышы дасылалі інфармацыю аб мясцовым жыцці ў газеты на латышскай мове: "Латвешу Земнекс", "Крэвіяс Цыня", "Сібірыяс Цыня", палякі ў газету "Трыбуна Радзецка", яўрэі ў газету "Ройтэ Нодл" і іншыя.

На Гомельшчыне багата друкавалася матэрыялаў на польскай мове ў газеце "Палеская праўда" аб культурна-асветніцкім і грамадска-палітычным жыцці ў вёсках, дзе кампактна пражывалі асобы польскай нацыянальнасці. Інфармацыя аб жыцці палякаў у Савецкай Беларусі ўтрымлівалася ў штомесячным часопісе "Głos sluchacza", які выдаваўся па-польску ў Маскве слухачамі польскага сектара Камуністычнага універсітэта малых народаў Захаду[752]. У 1922 г. Віцебскім губернскім аддзелам па справах нацыянальнасцей разам з Яўрэйскім грамадскім камітэтам выдаваўся бюлетэнь "Эдыес" (Весткі) на яўрэйскай мове[753]. З 1927 г. ЦП Таварыства па землеўпарадкаванню працоўных яўрэяў выдавала штомесячны часопіс на рускай мове "Трыбуна Яўрэйскай Савецкай грамадскасці" аб жыцці яўрэяў у СССР, у якіх меліся матэрыялы з БССР[754].

Дасылалі яўрэі матэрыялы і ў газеты, непадкантрольныя афіцыйным органам улады, у выданні розных сіяніскіх партый, якія дзейнічалі на тэрыторыі СССР, у тым ліку і БССР. Напрыклад, у газету "Сіяніскская сацыялістычная думка" – орган ЦСП. У сіяніскіх газетах, улётках утрымлівалася інфармацыя аб жыцці яўрэяў, дзейнасці партый, аб арэштах на абшарах Савецкай Беларусі[755].

---

750 Рэзалюцыі з'езда // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4251. Арк. 8, 21.
751 Справаздача рэдакцыі // Там жа. Спр. 4775. Арк. 18–19.
752 Асобнікі газеты // ДАГАГом. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1890. Арк. 18–19 ; Спр. 2068. Арк. 1–6.
753 Справаздача Віцебскага АВК // ДАВц. Ф. 56. Воп. 1. Спр. 185. Арк. 5.
754 Інфармацыйны ліст // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 2967. Арк. 57.
755 *Кіржніц А.* Яўрэйскі пэрыодычны друк у СССР (1917–1927). Менск, 1928 ; Вытрымкі з газет // НАРБ. Ф. 4. Воп. 10. Спр. 29. Арк. 312.

Праз сродкі масавай інфармацыі ўлады не толькі ўплывалі на свядомасць і выхаванне, далучалі да савецкага і камуністычнага будаўніцтва, ліквідоўвалі недахопы, але і арганізоўваліся розныя "кампаніі" і ініцыятывы. Нацкамісія ЦВК БССР у 1927 г. да святкавання 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі зацвердзіла спецыяльныя выпускі газет на нацыянальных мовах. З 22.07.1929 г. распачалася праца праз газету "Раудонайс Артояс" па збору сродкаў на пабудову самалёта імя "працоўных літоўцаў СССР". У 1930 г. сакратарыят ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне выдаць аднадзённую газету "За калектывізацыю" на латышскай і нямецкай мовах. У пратаколах "закрытых" пасяджэнняў камісіі ЦК КП(б)Б па польскаму пытанню ад 1929 г. адзначалася, што рэзалюцыі-наказы на вясковых сходах павінны будавацца на падставе артыкулаў, змешчаных у газетах "Трыбуна Радзецка", "Ворыва"[756].

У выніку абследавання работы местачковых і сельскіх нацыянальных саветаў за 1927–29 гг. было адзначана, што з агульнага ліку выпісаных насельніцтвам газет – 80 % на роднай мове[757].

У другой палове 1930-х гг. з 10 рэспубліканскіх газет 5 выходзілі на беларускай, 2 на яўрэйскай і па 1 на рускай, польскай і літоўскай мовах. У агульным накладзе літаратура на мовах нацыянальных супольнасцяў складала каля 25 %[758]. У другой палове 1937 г. спынілася выданне яўрэйскай піянерскай газеты "Дэр юнгер ленінец", бюлетэня яўрэйскага сектара Акадэміі навук БССР "На фронце навукі" і "Лінгвістычнага зборніка" на ідыш. У 1938 г. у рэспубліцы выдавалася 199 рэспубліканскіх, акруговых, гарадскіх, раённых і шматтыражных газет, з іх 149 на беларускай мове. Безумоўна, большая частка газет, якая выдавалася на мове нетытульнай нацыі, друкавалі свае матэрыялы па-руску. Па стане на 01.09.1939 г. у Мінску на мове ідыш выдаваліся толькі штодзённая газета "Акцябер" і штомесячны часопіс "Штэрн".

Пасля 1939 г. у рэспубліцы выдаваліся газеты на польскай мове: у Мінску штодзённая грамадска-палітычная газета "Штандар Вольнасці" ("Сцяг Свабоды"), у Граева "Новае жыццё". На польскай і беларускай мовах выходзіла газета "Новая Ломжа". У Заходняй Беларусі частка наклада газеты "Свабодная праца" (5 тыс. асобнікаў – 20 %) выдаваўся на польскай мове (1940). Газета "Беластокер Штэрн" ("Беластоцкая зорка") на яўрэйскай мове (1940, 6 тыс. асобнікаў)[759]. У абласных цэнтрах, дзе былі створаны абласныя радыёстанцыі, працавалі рэдакцыі польскага вяшчання[760].

Такім чынам, адчувальную ролю ў грамадскім і культурным жыцці нацыянальных меншасцей БССР ігралі сродкі масавай інфармацыі на

[756] Матэрыялы ЦК КП(б)Б // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 3033. Арк. 125.
[757] Справаздачы аб працы нацыянальных саветаў // Там жа. Ф. 701. Воп. 92. Арк. 180.
[758] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 261.
[759] Пастановы ЦК КП(б)Б аб выданні газет // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". У 2 кн. Кн. 1. Мінск, 2009. С. 152–153.
[760] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.) // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. Мінск, 1998. С. 40.

нацыянальных мовах, асабліва калі ўлічваць прагу насельніцтва ў той час да друкаванага слова і да радыё.

Праз сродкі масавай інфармацыі аказваўся значны ўплыў на свядомасць насельніцтва рэспублікі, праводзіліся розныя "кампаніі", праз стварэнне і пашырэнне кола грамадскіх карэспандэнтаў газет, часопісаў, радыё да грамадскага жыцця далучалася найбольш актыўная частка прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей.

**Стварэнне і дзейнасць культурна-асветных устаноў.** Асаблівую ўвагу кіраўніцтва БССР надавала стварэнню і дзейнасці культурна-асветных устаноў, якія б абслугоўвалі насельніцтва на роднай мове. Цэнтрамі культурна-асветнай работы ў гарадах былі клубы і бібліятэкі, а ў вёсках хаты-чытальні.

Да пачатку беларусізацыі ў БССР дзейнічалі на нацыянальных мовах наступныя культурна-асветныя ўстановы: клубы (45 у горадзе, 12 у вёсцы) – на рускай мове 50 (89 %), на беларускай 1 (1,5 %), на польскай 2 (3 %), на яўрэйскай 3 (5 %), латышскай 1 (1,5 %); дамоў культуры (усяго 86 – 1 у горадзе, 85 у вёсцы) з іх на беларускай мове – 12 (14 %), на рускай – 74 (86 %); хат-чытален (усяго 209, усе ў вёсцы) – на беларускай мове 38 (17 %), на яўрэйскай мове 6 (3 %), на рускай 162 (78,5 %), польскай 3 (1,5 %)[761].

Акрамя іх у 1926 г. у БССР існавалі 119 культурна-асветных устаноў народнай адукацыі (дзіцячых садоў, дамоў, камун), у якіх знаходзілася 5984 дзіцяці, з якімі працавалі 414 чалавек[762]. У тым годзе з 62 дзіцячых садкоў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні акруговых аддзелаў, 34 працавалі на беларускай мове, 19 на яўрэйскай, 5 на рускай, 2 на польскай, 2 на змешаных. У 1926/27 навучальным годзе з 78 дзіцячых дамоў 45 з'яўляліся беларускамоўнымі, 16 яўрэйскамоўнымі, 4 польскамоўнымі. Для прыкладу, у 1926 г. толькі ў Магілёўскай акрузе дзейнічалі наступныя культурна-асветныя ўстановы для абслугоўвання нацменшасцей: яўрэйскіх – 2 дзіцячых дома, 2 дзіцячых садка, 2 вечаровыя школы, 2 школы для малапісьменных, 2 пункта па ліквідацыі непісьменнасці, 2 хаты-чытальні, 1 бібліятэка; польскіх – 1 школа для малапісьменных, 2 пункты па ліквідацыі непісьменнасці, 2 хаты-чытальні; латышскіх – 1 чырвоны куток[763].

З правядзеннем беларусізацыі колькасць нацыянальных культурна-асветных устаноў павялічвалася. У 1927–1929 гг. узрос лік польскіх нацыянальных хат-чытален з 24 да 40, колькасць латышскіх заставалася нязменнай – 4, узніклі па адной літоўскай і нямецкай. Стала больш чырвоных куткоў, якія працавалі на родных мовах: польскіх з 15 да 53, латышскіх з 15 да 23, літоўскіх з 1 да 17[764]. Нацыянальныя хаты-чытальні, нягледзячы на тое, што знаходзіліся ў цяжкім матэрыяльным стане і дрэнна забяспечваліся літаратурай, праводзілі ў вёсках

[761] *Głogowska Helena.* Białorus 1914–1929. Kultura pod presja polityki. S. 112.
[762] Статыстычны штогоднік 1925–1926. С. 22–23.
[763] Справаздача Магілёўскага АВК // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 269.
[764] Справаздачы аб працы нацыянальных саветаў // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 92. Арк. 187 адв.

асноўную культурна-асветніцкую працу[765]. У Магілёўскай і іншых акругах ў 1925 г. засноўваліся яўрэйскія хаты-чытальні на грошы насельніцтва. Калі параўноўваць колькасць насельніцтва, якое абслугоўвалася хатамі-чытальнямі, варта адзначыць, што нацменшасці былі ахоплены дадзенымі культурна-асветнымі ўстановамі лепей, чым беларускае насельніцтва.

Асноўнымі формамі гэтай работы бібліятэк былі: правядзенне выстаў, размоў, чытанняў. У кожнай бібліятэцы БССР мелася літаратура нацыянальных меншасцей на рускай, польскай, яўрэйскай, беларускай мовах. Ствараліся і пэўны час плённа працавалі нацыянальныя бібліятэкі ці аддзелы пры агульных бібліятэках. Так, дзейнічалі Мінская гарадская яўрэйская бібліятэка імя І. Перэца (закрыта ў 1938), яўрэйская бібліятэка ў Бабруйску (пазней была пераўтворана ў раённую і пазбаўлена нацыянальнага статусу)[766]. У гарадской цэнтральнай бібліятэцы ў Мінску былі яўрэйскі і старажытнаяўрэйскі аддзелы[767]. У Магілёве дзейнічала гарадская яўрэйская бібліятэка імя Переца (2785 кніг на яўрэйскай мове). Яна мела чытальную залу, яе супрацоўнікі арганізавалі 11 выездаў з кніжным фондам у месцы кампактнага пражывання яўрэйскага насельніцтва. Пры бібліятэцы працаваў літаратурны гурток. Аднак, нягледзячы што жыхары добра наведвалі бібліятэку, яе хутка ліквідавалі. Наогул колькасць чытачоў бібліятэк год ад году павялічвалася, у тым ліку і тых, хто карыстаўся кнігамі на нацыянальных мовах. Але трэба падкрэсліць, што нацменшасці не былі ў поўнай меры ахоплены нацыянальнымі бібліятэкамі. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў рэзалюцыі І Усебеларускага з’езда ізбачоў[768].

Клубныя ўстановы аб’ядноўвалі актыўную частку насельніцтва. Вялікую працу праводзіў польскі рабочы клуб імя Р. Люксембург у Мінску[769]. Гомельскі клуб чыгуначнікаў ў 1927 г. меў больш як 2500 актывістаў, сярод якіх былі прадстаўнікі нацменшасцей. Тут працавала 5 драматычных гурткоў: тры беларускія, рускі і ўкраінскі. У рабоце клуба актыўна ўдзельнічалі жонкі рабочых розных нацыянальнасцей.

Асабліва вялікія магчымасці для рэалізацыі сваіх культурных патрэб нацменшасцям давалі культурна-асветныя гурткі, якія існавалі пры клубах і карысталіся вялікай папулярнасцю ў актыўнай форме сярод моладзі і ў пасіўнай форме людзьмі сталага ўзросту. З удзельнікаў тэатральнага гуртка польскай моладзі пры клубе Р. Люксембург у 1929 г. быў створаны Польскі дзяржаўны вандроўны тэатр БССР. Высокі ўзровень майстэрства дэманстравалі рускія, польскія, яўрэйскія аматарскія трупы, якія дзейнічалі пры клубах у акругах. Ствараліся нацыянальныя аркестры. У 1926 г. узнік яўрэйскі аркестр.

---

[765] Справаздача Гомельскага АВК // ДАГом. Ф. 60. Воп. 1. Спр. 1412. Арк. 2–4 ; Справаздачы Польскіх секцый ў паветах БССР, аб працы польскіх школ, хат-чытален // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 253. Арк. 50–72.

[766] *Альховік М.К.* Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., 18 – 19 апреля 2013 г., г. Могилев. Могилев, 2013. С. 107

[767] Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы 1918–1941. С. 66.

[768] Там жа. С. 109–110 ; Рэзалюцыі першага Ўсебеларускага з’езду ізбачоў (14–18 сакавіка 1927). Менск, 1927.

[769] Справаздача аб працы польскага рабочага клуба імя Р. Люксембург у Мінске. 1921 г. // РДАСПГ. Ф. 63. Воп. 1. Спр. 253. Арк. 15–16.

Актыўнасцю вылучаліся яўрэі, рускія, палякі, якія былі членамі прафсаюзных клубаў, як шэрагоўцы, так і члены праўлення. За 1926–1927 гг. актыў з ліку яўрэяў павялічыўся з 33 % да 40,9 %, за кошт палякаў, якіх стала меней з 3,8 % да 2,5 %; лік асоб рускай нацыянальнасці заставаўся стабільным – каля 12 %[770].

Рэгулярна праводзілася культурна-асветная дзейнасць сярод нацменшасцей прафесійнымі саюзамі: камунальнікаў, папернікаў, будаўнікоў. На яўрэйскай, польскай, рускай мовах праводзіліся сходы, вечары самадзейнасці, сямейныя вечары, ставіліся спектаклі, чыталіся лекцыі[771].

Выпускаліся на нацыянальных мовах сцянныя газеты. Яны павінны былі дапамагчы выкрываць недахопы на месцах і далучаць да іх выпраўлення рабочых і сялян. Сцянныя газеты выпускаліся на прадпрыемствах, культурна-асветных установах, навучальных установах і г.д. У маі 1926 г. была арганізавана Усебеларуская выстава сцянных газет на яўрэйскай мове[772]. У клубных установах яны выпускаліся: на беларускай мове – 8,4 % (1927) і 1,5 % (1928) ад агульнай колькасці; на яўрэйскай мове адпаведна 2,5 % і 0,3 %; на рускай мове – 52 % і 22 %; на некалькіх мовах адразу – 37,1 % і 63,5 %; на польскай мове – 0,2 % (1928) [773].

Значны ўнёсак пакінулі ў беларускай культуры рускія – заолаг П. Маўрадыядзі, літаратуразнавец А. Яўлахаў, астраном А. Міхайлаў, статыстык А. Арцымовіч. Вялікую карысць Беларусі прынесла дзейнасць яўрэяў: гісторыкаў і грамадска-палітычных дзеячаў С. Дзіманштэйна, М. Калмановіч, літаратуразнаўцы Я. Бранштэйна, пісьменніка, аўтара шэрагу кніг А. Юдэльсона, яўрэйскага паэта, з 1928 г. рэдактара часопіса “Штэрн” І. Харыка, літаратурнага крытыка, работніка асветы БССР, рэдактара газеты на яўрэйскай мове “Кастрычнік” Х. Дунеца[774].

Шмат чаго карыснага зрабілі на гаспадарчай, савецкай, культурна-асветнай працы палякі: А. Славінскі, Р. Піляр, Я. Далецкі, С. Мертэнс, І. Валешка, В. Ашмарын, Я. Машынская-Гельтман, С. Пшэдэцкая, В. Беляцкі, К. Бенэк, Т. Домбаль, плённа і добрасумленна працавалі польскія асветнікі і настаўнікі: Я. Клыс, С. Асташэўскі, М. Кавальская, дырэктар Мінскага польскага педтэхнікума Ф. Зарэмбскі і інш. [775]

**Становішча і эвалюцыя асноўных форм і метадаў па-за культавай дзейнасці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей БССР у 1930-я гг.**

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў асноўным асвятляецца рэпрэсіўная палітыка дзяржаўных і карных органаў у адносінах да царквы ў 1930-я гг. і недастаткова раскрыты формы і метады па-за культавай дзейнасці рэлігійных абшчын. Даследуючы іх, неабходна мець на ўвазе, што ў выніку правядзення

---

[770] Матэрыялы нацкамісіі // НАРБ. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 39. Арк. 9.
[771] Матэрыялы яўбюро // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4326. Арк. 794–795.
[772] Матэрыялы нацкамісіі // Там жа. Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 142.
[773] Справаздачы аб працы клубных устаноў // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 4713. Арк. 47; Спр. 196. Арк. 49.
[774] Бунд в Беларуси. 1897–1921 ; *Платонаў Р.П.* Лёсы: Гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20–30-х гадоў. С. 165, 180, 181.
[775] Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945). Мінск, 1993. С. 94.

калектывізацыі і барацьбы з “унутранымі ворагамі” і “агентамі замежных дзяржаў” найбольш працаздольная і актыўная частка насельніцтва была або рэпрасавана, або дэпартавана за межы БССР. У першую чаргу гэта тычыцца прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, у большай меры – латышоў, літоўцаў, немцаў, палякаў, у меншай – рускіх, яўрэяў і іншых. Але нават тыя, што засталіся, імкнуліся захаваць свае нацыянальныя асаблівасці праз рэлігію і не з’яўляліся пакорным і паслухмяным “статкам”. Яны ва ўмовах рэпрэсій выкарыстоўвалі ўсе магчымасці па захаванню і забеспячэнню рэлігійных патрэб насельніцтва.

Намі даследаваны наступныя формы па-за культавай дзейнасці рэлігійных абшчын нацыянальным меншасцей БССР: дзейнасць па тлумачэнню і сістэматызацыі рэлігійных ідэй, місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям’і, па захаванню прынцыпаў і правілаў жыцця, кіраўніцтва і дзейнасць рэлігійных арганізацый, асветная, адукацыйная. У выніку аналіза вызначаны прычыны актывізацыі рэлігійнай дзейнасці абшчын і асобных вернікаў.

Прафесар У. Навіцкі, характарызуючы становішча рэлігійных абшчын 1930-я гг., робіць выснову: “У БССР былі ліквідаваны ўсе знешнія праявы рэлігійнага жыцця. Тысячы праваслаўных цэркваў, касцёлаў, сінагог былі закрыты, пераабсталяваны ў дамы культуры, аддадзены пад склады, або ўвогуле знесены. Большая настка свяшчэннаслужыцеляў знаходзілася ў зняволенні ці была расстраляна па абвінавачванню ў антысавецкай дзейнасці. Пад забаронай знаходзіліся дабрачынныя і іншыя рэлігійныя арганізацыі, выданне рэлігійнай літаратуры. Аднак вызваліць народ ад “рэлігійнага дурману” бальшавікам не ўдалося. Вера па-ранейшаму працягвала жыць у людскіх сэрцах. Аб гэтым сведчылі вынікі ўсесаюзнага перапісу 1937 г., калі 57 % дарослага насельніцтва СССР абвясцілі сябе веруючымі. Але спавядаць рэлігію вернікі маглі толькі ў нелегальных умовах. Гэта адбывалася ў той час, калі савецкая Канстытуцыя 1936 г., прыкрываючы вакханалію, што адбывалася ў краіне, абвясціла свабоду выканання рэлігійных культаў і антырэлігійнай прапаганды. Аднак тагачасная рэчаіснасць сведчыла аб адваротным”[776].

Трэба падкрэсліць, што вернікі не выступалі ў якасці пасіўных сведкаў падзей, якія адбываліся па ініцыятыве Савецкай улады. Узмоцненая абмежавальна-рэпрэсіўная палітыка, якую праводзіла савецкая улада ў дачыненні да рэлігіі і царквы, выклікала адкрыты і латэнтны супраціў абшчын нацыянальных меншасцей. Рэлігійны актыў з’яўляўся ініцыятарам і арганізатарам супрацьстаяння значнай часткі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей афіцыйнаму гвалту ўлады. Менавіта ён ініцыяваў кампанію па эміграцыі часткі насельніцтва БССР з ліку нацыянальных меншасцей і праводзіў у 1929–1932 гг. адпаведную падрыхтоўчую працу. Найбольш моцныя настроі эміграваць за мяжу СССР былі сярод польскага і нямецкага насельніцтва[777]. У прыватнасці, немцы-

[776] *Навіцкі У.* Разгром рэлігійных арганізацый // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Мінск, 2007. С. 335.
[777] Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы матэрыялаў па нацыянальным пытанні да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930 г.) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091. Арк. 23–24.

лютэране праводзілі сходы, выбіралі дэлегатаў для звароту ў германскае пасольства ў Маскве і консульства ў Кіеве, збіралі грошы на паездкі[778].

На працягу ўсяго перадваеннага дзесяцігоддзя можна вылучыць праявы такой формы па-за культавай дзейнасці як захаванне прынцыпаў і правілаў жыцця. Пачатак 1930-х гг. адзначыўся зняццем званоў з цэркваў і касцёлаў, знікненнем з афіцыйных календароў дзён рэлігійных свят, масавым закрыццём культавых пабудоў. Гэта выклікала абурэнне з боку вернікаў, якое часта пераўтваралася ў масавыя стыхійныя выступленні, напрыклад у Чавусах, Касцюковіцкім раёне і інш.[779]

Як вынік такой формы па-за культавай дзейнасці можна лічыць, што яшчэ ў сярэдзіне 1930-х гг. захоўваліся культавыя пабудовы, якія выкарыстоўваліся па свайму прызначэнню. Становішча рэлігійных абшчын нацменшасцей у гэты час яскрава характарызуюць звесткі аб рэлігійных пабудовах на 1935 г. (гл. табл. 20).

На 20.12.1936 г. у Савецкай Беларусі дзейнічала 74 праваслаўныя царквы (была закрыта 1371 царква), 71 сінагога (закрыта 633), 18 касцёлаў (закрыты 95). Усяго дзейнічала 163 храма, што складала 7,2 % ад дзейнічаўшых да 1917 г. (закрыты 2099). З агульнай колькасці закрытых культавых пабудоў (2099) былі пераабсталяваныя пад культустановы – 855, пад зернесховішчы і разабраныя – 1006, не закрытыя і не дзейнічаючыя – 238. “Да студзеня 1937 г. у БССР засталося дзеючых цэркваў – 74, з іх старацаркоўнай арыентацыі – 42, беларускай аўтакефальнай – 26 і абнаўленчых – 6. Мелася дзеючых служыцеляў рэлігійнага культу да 100 чалавек і папоў, якія не маюць парафій, а таксама склаўшых сан да 300 чалавек. У цяперашні час маецца дзеючых цэркваў – 2, адна ў г. Орша і адна ў г. Мазыру і ўлічана 15 папоў, з іх 13 склалі сан”[780]. Інфармацыю па найбольш буйным гарадам БССР глядзі ў табліцы 21.

---

[778] *Пичуков В.П.* Миграции немецкого населения белорусского Восточного Полесья в 20–30-е годы XX в. // История и культура Европы в контексте становления и развития региональных цивилизаций и культур: Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности. Мат. междунар. научно-теорет. конф. Витебск, 2003. С. 167 ; НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091. Арк. 23–24

[779] Зводка аб здарэннях і дзейнасці міліцыі і крымінальнага вышуку Магілёўскага акругі з 8 да 14 студзеня 1930 г. // ДАГАМаг. Ф. 6577. Воп. 1. Спр. 892. Арк. 10 ; Зводка аб здарэннях і дзейнасці міліцыі і крымінальнага вышуку Магілёўскага акругі з 22 да 28 студзеня 1930 г. // Там жа. Арк. 30.

[780] Дакладная запіска НКУС “Аб антысавецкай дзейнасці царкоўнікаў і сектантаў ў БССР” на 21.06.1938 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 13219. Арк. 56.

Табліца 20 – Звесткі аб рэлігійных пабудовах па БССР у 1935 г.[781]

| Раён, мястэчка | Рэлігійны культ | Колькасць культавых пабудоў, якія існавалі | Колькасць культавых будынкаў, якія былі забраны ў вернікаў | Колькасць культавых будынкаў, якія выкарыстоўваліся савецкай уладай: пад установы культуры | Колькасць культавых будынкаў, якія выкарыстоўваліся савецкай уладай: для гаспадарчых патрэб | Колькасць культавых пабудоў ва ўласнасці абшчын вернікаў | Колькасць культавых пабудоў, якія знаходзіліся ў вельмі дрэнным стане і не маглі выкарыстоўвацца | Колькасць культавых пабудоў дзе перасталі існаваць пяцёркі вернікаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Абагульняючыя лічбы, якія напісаны ад рукі ў дакуменце | | | | | | | | |
| Усяго | царква | 305 | 168 | 43 | 27 | 162 | 23 | 2 |
| | сінагога | 129 | 78 | 40 | 22 | 47 | 2 | – |
| | касцёл | 43 | 18 | 5 | 5 | 20 | 1 | – |
| | кірха | 3 | 2 | – | 1 | 1 | – | – |
| Абагульняючыя лічбы на падставе падліку па табліцы | | | | | | | | |
| Усяго | царква | 291 | 130 | 42 | 27 | 162 | 23 | 36 |
| | сінагога | 126 | 78 | 39 | 22 | 47 | 2 | – |
| | касцёл | 40 | 21 | 5 | 5 | 20 | 1 | – |
| | кірха | 3 | 2 | 1 | 1 | 1 | – | – |
| | мячэць | 2 | – | – | – | 1 | – | – |
| | стараабр. царква | 1 | – | – | – | 1 | – | – |

Табліца 21 – Колькасць культавых пабудоў на пачатак 1937 г.[782]

| | | Было | Закрыта | Дзейнічалі | % закрытых |
|---|---|---|---|---|---|
| Мінск | цэркваў | 17 | 15 | 2 | 90 |
| | сінагог | 63 | 53 | 10 | 88,8 |
| | касцёлаў | 4 | 1 | 3 | 25 |
| Віцебск | цэркваў | 17 | 16 | 1 | 94 |
| | сінагог | 51 | 42 | 9 | 82 |
| | касцёлаў | 2 | 0 | 2 | 0 |
| Магілёў | цэркваў | 18 | 15 | 3 | 83 |
| | сінагог | 17 | 13 | 4 | 76 |
| | касцёлаў | 3 | 1 | 2 | 33 |

[781] Падлічана па: Звесткі аб рэлігійных пабудовах па БССР (1935) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11853. Арк. 81–82.
[782] Дакладная запіска "Па пытанні аб касцёлах" ад 07.08.1937 г. // Там жа. Спр. 11035. Арк. 78–82.

У 1930-я гг. дзейнічалі наступныя храмы вакол якіх гуртаваліся рэлігійныя абшчыны рускага насельніцтва**:** белакрыніцкі храм у вёсцы Новая Мільча (зачынены ў 1934, пасля закрыцця ён быў пераабсталяваны пад клуб)[783]; малітоўныя дамы беспапоўскага паморскага кшталту ў Ветцы і ў вёсках Веткаўскага раёна: Дубовы Лог (цяпер Добрушскі раён), Касіцкія, Папсуеўка, Тарасаўка, Лявонцьева, Барацьба, а таксама Парыцкага (цяпер Светлагорскага) раёна: Зарэчча і Нова-Аляксандраўка (зачыненыя ў 1934 і былі перададзеныя пад школы і калгасныя сховішчы збожжа)[784]; белакрыніцкая малельня ў Гомелі (зачынена ў 1934, разбурана)[785]; белакрыніцкая царква св. Іллі Прарока па вул. Камісарава (зачынена ў 1937, а затым пераабсталяваная пад трыкатажную фабрыку)[786]; Праабражэнская царква безпапоўскага кірунку па вуліцы Пралетарскай у Гомелі (зачынена ў 1937 і была зачыненая і пераабсталяваная пад майстэрню лесатэхнічнага інстытута)[787]; стараверская царква белакрыніцкай згоды ў вёсцы Агародня-Гомельская Добрушскага раёна (зачынена ў 1939, а затым перароблена пад клуб)[788]. Да 1935 г. у Сівенскім сельсавеце Старадарожскага раёна адбываліся нелегальныя маленні стараабрадцаў у прыватных хатах, у прыватнасці выконваліся рэлігійныя абрады ў хаце кіраўніка стараабрадцаў Ф. Абрамава. Іх сходы актыўна наведвала моладзь[789].

У Шклоўскім раёне было 25 цэркваў, 3 касцёлы і 8 сінагог. З іх 22 цэрквы былі закрыты, тры не працавалі з-за адсутнасці святароў. З трох касцёлаў былі закрыты два: у в. Стараселле і г. Шклове, якія выкарыстоўваліся пад сховішча “Заготзерно”. Працаваў адзін касцёл у в. Фашчаўка. З 8 сінагог былі закрыты 5 самых вялікіх, 3 дзейнічалі. Сінагогі выкарыстоўваліся пад збожжасховішчы, а адна была перабсталявана пад школу[790]. У Заслаўлі ў сярэдзіне 1937 г. будынак касцёла выкарыстоўваўся пад сховішча “Заготзерно” і праводзілася пераабсталяванне яго пад электрастанцыю, у будынку былой сінагогі размяшчалася шавецкая арцель “Перамога”[791]. У Жыткавіцкім раёне ў 1937 г. у 2 закрытых сінагогах – хлебапякарня і сталярная майстэрня. На тэрыторыі раёна дзейнічалі 2 сінагогі ў прыватных дамах[792]. У Бабруйску было закрыта 30 сінагог, дзейнічалі толькі 7, у якіх працавалі 2 равіна і 5 рэзнікаў У горадзе

---

[783] *Рогинский Р.М.* Закрытие старообрядческих храмов и молелен на Гомельщине, как фактор конфессиональной политики И.В. Сталина в предвоенный и послевоенный период // Религия и общество – 9 : сборник научных статей. Могилев, 2015. С. 27–29.

[784] Пратакол пазачарговага пасяджэння бюро Веткаўскага райвыканкама КП(б)Б ад 17.10.1928 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 119. Арк. 74 ; Аб рэлігійнай дзейнасці стараверскіх абшчын і груп // Там жа. Воп. 61. Спр. 73. Арк. 69, 73, 140.

[785] *Рогинский Р.М.* Закрытие старообрядческих храмов и молелен на Гомельщине, как фактор конфессиональной политики И.В. Сталина в предвоенный и послевоенный период. С. 27–29.

[786] Аб антысавецкай дзейнасці старавераў Іллінскай царквы // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 50. Спр. 96. Арк. 36–40.

[787] *Рогинский Р.М.* Закрытие старообрядческих храмов и молелен на Гомельщине, как фактор конфессиональной политики И.В. Сталина в предвоенный и послевоенный период. С. 27–29.

[788] Аб рэлігійнай дзейнасці стараверскіх абшчын і груп // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 306. Арк. 68–70, 144.

[789] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 94, 95, 97.

[790] Дакладная запіска Шклоўскага РК КП(б)Б ад 06.05.1937 г. // Там жа. Арк. 75.

[791] Звесткі аб наяўнасці малітоўных дамоў, якія дзейнічаюць і не дзейнічаюць. 03.08.1937 г. // Там жа. Спр. 11853. Арк. 83.

[792] Дакладная запіска Жыткавіцкага РК КП(б)Б. 1937 г. // Там жа. Спр. 12082. Арк. 275, 276.

таксама жыў адзін былы равін і 2 былых яўрэйскіх прапаведніка (узросту 65–70 год)[793].

Па даных НКУС у межах БССР да ўсталявання савецкай улады было 90 касцёлаў і 58 капліц, якія абслугоўваліся 48 ксяндзамі. З іх па розных прычынах да жніўня 1937 г. былі закрыты, разбураны і знесены – 83. Заставаліся дзеючымі 11 касцёлаў, а пра астатнія звестак не мелася. З агульнай колькасці бяздзейсных пастановай ЦВК БССР было афармлена закрыццё толькі 46 касцёлаў і капліц, а астатнія перасталі дзейнічаць з прычыны арышту ксяндзоў.

На 20.08.1937 г. у горадзе Мінску існавалі 3 касцёла: кафедральны на плошчы Свабоды, зачынены пасля арышту ксяндза Баравіка; Кальварыйскі – зачынены па тых жа прычынах; Златагорскі, які дзейнічаў. Яго перыядычна наведваў для здзяйснення набажэнстваў Барысаўскі ксёндз Ярашэвіч[794]. Касцёл наведвалі ў рэлігійныя святы да 1000 чал., галоўным чынам жанчыны, якія прыводзілі з сабой дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. У касцёл таксама прыязджала шмат вернікаў палякаў з іншых раёнаў БССР – Мінскага, Заслаўскага, Смалявіцкага, Смілавіцкага, Пухавіцкага, Лагойскага, Капыльскага і нават з такіх далёкіх раёнаў як Слуцкі, Бабруйскі, Стара-Дарожскі і іншыя. У горадзе Барысаве меўся адзін дзеючы касцёл. Наведвалі яго пад час набажэнстваў да 250 чал. вернікаў каталікоў з горада Барысава, Барысаўскага раёна, а таксама з раёнаў: Крупскага, Смалявіцкага, Халапеніцкага. У г. Магілёве дзейнічаў адзін касцёл. Нягледзячы на арышт ксяндза Аўгло, вернікі збіраліся на набажэнствы амаль штодня, прыходзіла каля 300–400 чал., галоўным чынам жыхары горада Магілёва, а ў святочныя дні – з суседніх раёнаў. У Шклоўскім раёне ў вёсцы Фашчаўка дзейнічаў касцёл, у якім вернікі збіраліся, нягледзячы на арышт ксяндза. Агульная колькасць наведвальнікаў была 150–200 чал. са Шклоўскага і суседніх раёнаў. У горадзе Гомелі меўся адзін дзеючы касцёл. Тут таксама, нягледзячы на тое, што ксёндз быў арыштаваны, вернікі самі адкрывалі касцёл і збіраліся ў ім па святочных днях. У мястэчку Свіслач Асіповіцкага раёна дзейнічаў адзін касцёл (ксяндза не было), у ім збіраліся вернікі з мястэчка Свіслач і Асіповіцкага раёна агульнай колькасцю да 50–60 чалавек. У вёсцы Шацілкі Парыцкага раёна дзейнічаў адзін касцёл (ксяндза не было), збіралася некалькі дзясяткаў вернікаў. У горадзе Віцебску дзейнічаў адзін касцёл, абслугоўваў яго ксёндз Філіп. Касцёл наведвалі да 250 чал. з горада Віцебска і суседніх раёнаў. У Мсціслаўскім раёне дзейнічаў адзін касцёл, абслугоўваўся ксяндзом Варнесам. Касцёл наведвалі 30–40 чалавек, пераважна сталага ўзросту. У раёне польскага насельніцтва было зусім мала. У горадзе Орша дзейнічаў адзін касцёл, абслугоўваўся ксяндзом Кашыцай. Вернікаў збіралася да 100 чал. з горада Оршы і суседніх раёнаў. У горадзе Чавусах дзейнічаў адзін касцёл, які абслугоўваўся ксяндзом Казюнасам. Касцёл наведвала каля 200 чал. з Чавускага і суседніх раёнаў[795].

05.10.1937 г. адбылося пасяджэнне бюро ЦК КП(б)Б на якім разглядалася пытанне “Аб польскіх касцёлах”. На ім прагучала інфармацыя, што за 1936 г.

---

[793] Дакладная запіска Бабруйскага РК КП(б)Б. 1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Спр. 12082. Арк. 199.
[794] Інфармацыя ў Бюро ЦК КП(б)Б ад 24.08.1937 г. // Там жа. Спр. 11035. Арк. 68.
[795] Там жа. Арк. 69–70.

паступіла 112 заяў на закрыццё касцёлаў, а 20 заяў на адкрыццё. Аднак у дакуменце праглядаецца зацёртая першая лічба – ці то 3, ці 8. Такім чынам заяў магло быць 320 або 820. Нездарма ў дакуменце пазначана “Вы разумееце, якая вялізная праца праароблена імі”[796].

Гвалтоўнае правядзенне калектывізацыі ў БССР актывізавала прыхаваную і адрытую па-за культавую дзейнасць вернікаў у асяродку нацыянальных меншасцей. У яўрэйскіх і інтэрнацыянальных калгасах значная частка калгаснікаў працавала ў суботу і святочныя дні, у час асенніх і іншых рэлігійных свят ствараліся малельні, рабілі мацу, карысталіся паслугамі рэзніка, жанчыны адмаўляліся ў суботу даіць кароў, наймалі сялянак, адмаўляліся варыць некашэрнае мяса. Так, прымалі “рэзнікаў”, якія рэзалі жывёлу па рэлігійных рытуалах (калгасы: “Колас” Мінскай акругі, “Акцябр” Мазырскага, “Ройтэр Штрал” Крупскага, “Інтэрнацыянал” Капыльскага, “Бальшавік” Чэрвеньскага раёнаў). Адчынялі ў калгасах малельні (калгас “Серп” Лупалаўскага р-на Магілёўскай акругі, яўрэйскі калгас “Бліўнг”), запрашалі за грошы на святочныя дні да сябе “кантара” (калгас “Лебен” Смалявічскага р-на Аршанскай акругі). У калгасе “Дарагонава” Старадарожскага р-на Бабруйскай акругі прынялі ў лік пая ад аднаго з уступаўшых “Тору”. Былі выпадкі дапамогі ад калгасаў матэрыяльна альбо прадуктамі равіну (калгас “Абрамовіча” Копыльскага раёна). Равін Клімавіцкі падаў заяву ў калгас “Энэргія” аб прыёме яго ў члены калгаса ў якасці рахункавода і г.д.[797] Перад яўрэйскай пасхай у нацыянальным яўрэйскім калгасе Касцюковіцкага раёну ў 29 гаспадарках выпякалі мацу[798].

Калгасны лад быў не сумяшчальны з глыбокай рэлігійнасцю латышскага, нямецкага і польскага насельніцтва Беларусі. Даследчык В. Пічукоў прыводзіць шмат дакументальных фактаў, якія красамоўна сведчаць аб адносінах нямецкага насельніцтва да рэлігіі ў кантэксце калектывізацыі: “Жонка баптыста Лапса (калонія Хаткі) у пачатку 1930-х гг. перасцерагала жанчын ад ўступлення ў калгас: “Лепш памерці з голаду, таму што там могуць прымусіць ісці супраць рэлігіі”. Немцы не маглі зразумець непрыкрытага гвалту ўлады над рэлігіяй, не прымалі яны і некаторых яе новаўвядзенняў, ставячыся да іх з асцярогай. “Прыязджае які-небудзь работнік у калонію і тлумачыць, напрыклад, што ў калектывах [калгасах] будуць яслі, куды маці будуць здаваць сваіх дзяцей на дзень... Немцы, зразумеўшы, што ў іх зусім адбяруць дзяцей, прыйшлі ў жах” (сведчанне афіцыйнага дакумента за 1930 г.). Дзіцячых ясель нямецкая жанчына не хацела, яны супярэчылі яе традыцыйнаму ўяўленню аб характары сямейнага выхавання… У 1935 г. на агульным сходзе жыхароў калоніі Майдан баптыстка Гартвіг заявіла Разаліі Шот, якая ўступіла ў калгас: “Ты – дурніца, ты ж прадала сваю душу ... і мы, сёстры, цябе ў сваё асяроддзе прыняць ужо не можам. Але калі ты адмовішся і выйдзеш з калгасу, то мы яшчэ больш Богу ўпадабаемся”. Як адзначае крыніца,

796 Пратакол № 20 пасяджэння бюро ЦК КП(б)Б ад 05.10.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 73.

797 Справаздачы еўбюро // Там жа. Спр. 4771. Арк. 130 ; Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // Там жа. Спр. 7138. Арк. 26 ; Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б. Пач. 1932 г. // Там жа. Арк. 34–35 ; Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б // Там жа. Спр. 6301. Арк. 35.

798 Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // Там жа. Спр. 11852. Арк. 100.

“пасля гэтага Шот Разалія пачала плакаць, не ведаючы, што ёй рабіць”. Арыштаваны 23.06.1941 г. за “рэлігійную антысавецкую дзейнасць” жыхар в. Роза-Люксембург Аўгуст Грас паказаў на допыце 16.01.1942 г. у Новасібірску, што яго неўступленне ў свой час у калгас тлумачыцца нежаданнем маці – Грас Атыліі. “Маці была рэлігійна перакананая ...”. А да яе смерці ў студзені 1941 г. яна з’яўлялася кіраўніком гаспадаркі”[799].

Наогул у 1930-я гг. выказванні накшталт: “Лепш застацца сядзець пад заборам голым і галодным, але не застацца без рэлігіі” (Валасавіцкі сельсавет Дамонавіцкага раёна) былі нярэдкасцю ў БССР[800].

Сем’і, у якіх муж і жонка прытрымліваліся рознай веры, былі вельмі распаўсюджанай з’явай. Дзеці, народжаныя ад змешанага шлюба, прымалі рэлігію кіраўніка сям’і. Нягледзячы на дзейнасць савецкіх актывістаў – камсамола, ізбачоў, настаўнікаў, асноўная частка нацыянальных меншасцей БССР захоўвала веру і падтрымлівала духавенства. У латышскіх, літоўскіх, нямецкіх, польскіх і яўрэйскіх сем’ях працягвалі маліцца на роднай мове, чытаць рэлігійныя кнігі. Так, на думку саміх палякаў, рэлігійнасць “прышчаплялась ім з дзяцінства”[801], з’яўляючыся асновай выхавання. Дзеці навучаліся рэлігіі ў касцёле і сям’і. Бацькі штодня маліліся на польскай мове, і дзеці, якія ледзь навучыліся размаўляць, паўтаралі за імі малітвы. Веданне рэлігійных абрадаў было абавязковым для ўсіх членаў польскай сям’і, таму дзеці траплялі ў касцёл значна раней, чым у школу. Нягледзячы на забарону рэлігійнага (духоўнага) шлюбу ў савецкім грамадстве і замену яго свецкім, большасць палякаў працягвала браць шлюб у касцёлах або таемна выклікаць ксяндза на дом.

Уплыў рэлігіі выразна прасочваецца ва ўсіх сферах жыцця насельніцтва. Нават палякі члены камуністычнай партыі (бальшавікоў) не цураліся рэлігійнай абраднасці. Вядомы выпадкі, калі нават сакратар ячэйкі КП(б)Б у польскім калгасе хрысціў сваё дзіцяці. Член кампартыі памёр і на пахаванне не дазволілі прывезці ксяндза, але яго таварыш па партыі сам узяў псалтыр і, спяваючы, ўзначаліў пахавальнае шэсце[802]. Падобныя факты можна прывесці і з жыцця яўрэйскага насельніцтва. У Касцюковіцкім раёне перад яўрэйскай пасхай мацу выпякалі члены гарсавета – Н. Ошараў, І. Боршч, Захарэвіч, камсамольцы Ліўшыц (настаўніца яўрэйскай школы), Самацыевіч і інш.[803]

Не апраўдалася надзея камуністычнай улады на тое, што новыя савецкія святы паступова заменяць традыцыйныя рэлігійныя. Традыцыйнымі для польскага і літоўскага насельніцтва заставаліся, перш за ўсё, калядныя і велікодныя святы. Рэлігійныя святы адзначаліся значнай часткай латышскага,

---

[799] *Пичуков В.* От крестьянки-колонистки до спецпереселенки: трагический путь немецкой женщины Советской Беларуси в межвоенный период // Репрессивная политика советской власти в Беларуси : Сборник науч. работ. Вып. 2. Минск, 2007. С. 224–226.

[800] Дакладныя запіскі РК КП(б)Б. 1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Спр. 12082. Арк. 6.

[801] *Трубчик Е.Г.* «Этничность» и «костёльность» населения белорусско-польских деревень БССР в межвоенный период // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 2. Гродна, 2009. С. 27–30.

[802] Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы матэрыялаў па нацыянальным пытанні да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091. Арк. 19.

[803] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 100.

нямецкага, рускага і яўрэйскага насельніцтва БССР. Улады канстатавалі, што антырэлігійная дзейнасць Саюза ваяўнічых бязбожнікаў, польскіх настаўнікаў, ізбачоў і камсамольцаў у большасці выпадкаў не спрыяла паслабленню рэлігійных настрояў у каталікоў, наадварот, выклікала рэзкае абурэнне веруючага насельніцтва[804].

У 1930-я гг., нягледзячы на забароны ўладаў, каталіцкі актыў і ксяндзы ў цэлым шэрагу месц узмацнялі працу па стварэнню і кіраўніцтву дзейнасці грамадскіх арганізацый у асяродку веруючага польскага насельніцтва. Шырока выкарыстоўваліся розныя метады і спосабы місіянерскай і дабрачыннай дзейнасці.

У Полацкай акрузе ксёндз Капуста раз’язджаў па вёсках, дзе жыло польскае насельніцтва. Аднойчы адбыўся цікавы выпадак. Сакратар райкама КП(б)Б накіроўваўся ў вёску і сустрэў ксяндза, які запытаўся куды гэта сакратар едзе. “А у тую вёску” – кажа сакратар. Ксёндз у адказ: “Няма чаго ехаць, бо я ўжо там быў і ўсё, што трэба зрабіў”[805]. Ксёндз Мустэйкіс у Бабруйскай акрузе арганізаваў сярод рабочых шкляной гуты “Кастрычнік” грамадскую арганізацыю са спецыяльнымі сяброўскімі білетамі (іх было зроблена каля 3000) і складкамі, якія рэгулярна плаціліся і адзнакі аб гэтым рабіліся ў білетах. Мясцовыя ўлады ўбачылі ў гэтым падабенства з кампартыяй. Акрамя рабочых і іх жонак у склад арганізацыі ўвайшло вясковае насельніцтва. Арганізацыя была разгромлена[806]. У г. Клімавічы (1937) ўтарылася дабрачынная яўрэйская абшчына, якую ўзначаліў былы гандляр і лішэнец Белінаў. Яе дзейнасць была накіравана на збор сродкаў для дапамогі веруючым бедным яўрэям[807]. На тэрыторыі нацыянальнага польскага Рудня-Насімкаўскага сельсавета Чачэрскага раёна дзейнічалі таварыства “Тэрцыяраў” і таварыства “Ружанца” – “Kołka Różancowa”, праводзіўся збор сродкаў для Гомельскага ксяндза. У дні рэлігійных свят дзеці не наведвалі школу, была шырока распаўсюджана думка: “Усе палякі каталікі, усе каталікі – роўныя”[808].

Фашчаўскі касцёл у Шклоўскім раёне адыгрываў значную ролю ў рэлігійным жыцці мясцовага і навакольнага насельніцтва. На рэлігійныя святы збіралася вялікая колькасць людзей з Шклоўскага, Магілёўскага, Дрыбінскага, Горацкага і Аршанскага раёнаў. Мясцовыя ўлады некалькі разоў спрабавалі сабраць подпісы каб закрыць касцёл, але безвынікова. Касцёльную раду ачольваў інвалід па зроку, у яе склад уваходзілі нават некалькі калгаснікаў. У Фашчаўцы па ініцыятыве ўладаў былі пабудаваны: МТС, двухпавярховая сярэдняя школа, вялікая крама, праведзена электрычнасць, але гэта не дапамагло паўплываць на рэлігійнасць насельніцтва[809]. У 1936 г. старшыня Фашчаўскага сельсавета і

[804] *Трубчик Е.Г.* «Этничность» и «костёльность» населения белорусско-польских деревень БССР в межвоенный период // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. С. 27–30.
[805] Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы матэрыялаў па нацыянальным пытанні да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 5091. Арк. 22.
[806] Там жа. Арк. 20.
[807] Дакладная запіска “Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП(б)Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі (па дадзеных 40 раёнаў)” ад 07.06.1937 г. // Там жа. Спр. 12109. Арк. 55.
[808] Дакладная запіска аб скрыўленні нацыянальнай палітыкі ў Чачэрскім раёне (1931) // Там жа. Спр. 5546. Арк. 4.
[809] Дакладная запіска Шклоўскага РК КП(б)Б ад 06.05.1937 г. // Там жа. Спр. 11852. Арк. 80.

дырэктар МТС запатрабавалі ад мясцовага ксяндза зрабіць капітальны рамонт касцёла: "Мы прапанавалі ксяндзу зрабіць капітальны рамонт, маючы на ўвазе, што ён гэтага не выканае і тады мы зробім канфіскацыю касцёла"[810]. Але вернікі (касцёльная рада) на працягу 2 дзён сабралі 60 000 рублёў і за 10 дзён адрамантавалі будынак касцёла. Падобная дзейнасць уладамі была ўспрынята як быццам сельсавет ды партыйная арганізацыя аказалі садзейнічанне ксяндзу ў рамонце касцёла.

Прыкладам місіянерскай дзейнасці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей можа быць інфармацыя АДПУ па Рэчыцкім раёне, дзе на 02.03.1931 г. мелася 6 рэлігійных "сект". Адна з іх, на нямецкім хутары Заходы, складалася з 60 чал. Даследчык В. Пічукоў прыводзіць шмат фактаў дзейнасці і прозвішчы актыву рэлігійных абшчын нямецкага насельніцтва БССР[811].

У Ушацкім раёне да сакавіка 1935 г. у касцёле здзяйсняліся рэлігійныя абрады і для праваслаўных (хрышчэнне, вянчанне і г.д.), прычым па больш нізкіх коштах чым праводзілі праваслаўныя святары. Падобнае было ў Бярэзінскім раёне, дзе гэта рабіў ксёндз Тамашэўскі ў двух касцёлах – Багушэвічы і Беразіно. На думку камуністычных уладаў гэта рабілася з мэтай павелічэння ўплыву каталіцкага духавенства, якое "ажыццяўляе ў Беларусі шырокую шпіёнскую працу"[812].

Вельмі часта аснову рэлігійных абшчын немцаў і латышоў складалі найбольш пісьменныя і аўтарытэтныя людзі. "Ідэйным натхняльнікам" абшчыны баптыстаў Бярозаўскага сельсавета, паводле афіцыйнай фармулёўцы, быў Р. Мітэльштадт. Ён жа з'яўляўся сакратаром абшчыны і кіраўніком яе хору (арыштаваны АДПУ ў 1932). У Лельчыцкім раёне групай баптыстаў-немцаў кіраваў Ф. Рыхтэр, яго намеснікам быў А. Шварц[813]. У месцах кампактнага пражывання латышоў (Асвейскі раён) у 1937–1938 гг. "была ліквідавана антысавецкая група баптыстаў, кіраўнікі якой – латышы Ф. Клявін і І. Калнін [якія ўзначальваў абшчыну пасля арышту П. Бернгарда] – мелі сувязь з латвійскай выведкай"[814].

У чэрвені 1938 г. нарком унутраных спраў БССР А. Наседкін дакладваў у Маскву: у рэспубліцы ў ліку працуючых засталіся толькі дзве царквы – у Оршы і Мазыры[815], але гэта не спыніла вернікаў.

---

[810] Дакладная запіска "Па пытанні аб касцёлах" ад 07.08.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 78–79.
[811] *Пичуков В.П.* Религиозный актив немецкой диаспоры белорусского восточного Полесья (20 – 30-е годы ХХ в.) // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. С. 43–48 ; *Яго ж.* "…О которых узнаем случайно…": Немецкое население Речицкого региона в 20–30-е гг. ХХ в. // Пятыя Міжнародныя Доўнараўскія чытанні (Рэчыца, 22–23 верасня 2005 г.). Гомель, 2005. С. 348–360 ; От крестьянки-колонистки до спецпереселенки: трагический путь немецкой женщины Советской Беларуси в межвоенный период // Репрессивная политика советской власти в Беларуси : Сборник науч. работ. Вып. 2. Минск, 2007. С. 236.
[812] Дакладная запіска "Па пытанні аб касцёлах" ад 07.08.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 80.
[813] *Пичуков, В.П.* Религиозный актив немецкой диаспоры белорусского восточного Полесья (20–30-е годы ХХ в.) // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. С. 43–48.
[814] Дакладная запіска НКУС "Аб антысавецкай дзейнасці царкоўнікаў і сектантаў ў БССР" на 21.06.1938 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 13219. Арк. 71 ; *Королев М.Г., Мартинкевич И.А., Голубев В.Н.* «Белорусские» латыши на приграничьи (в межвоенный период). Минск, 2012. С. 63.
[815] *Навіцкі У.* Разгром рэлігійных арганізацый // Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Мінск, 2007. С. 329.

Шэраг цікавых і красамоўных фактаў аб рэлігійнасці старавераў і рускіх праваслаўных утрымліваецца ў запісцы выконваючага абавязкі адказнага сакратара Магілёўскага абласнога савета СВБ Воранава (1939). Згодна ёй, у Магілеве вернікі збіраліся на Успенскіх могілках, дзе маліліся побач з "кладбищенской церковью". Актывіст групы вернікаў І. Механікаў двойчы пабываў у Маскве ў мітрапаліта Сергія наконт адкрыцця прыхода і прысылцы святара ў Магілёў. Адзначаў, што мітрапаліт аднёсся да прапановы станоўча. Вернікі збіралі сродкі на пераезд і ўтрыманне святара. У Бабруйску на Мінскіх могілках дзейнічала царква ў якой, па няпоўных звестках, за 1939 г. ахрысцілі больш 1600 дзяцей з Бабруйска, Бабруйскага, Кіраўскага і іншых раёнаў. У Багушэўскім сельсавеце дзяк Бахановіч "абслугоўваў шэраг сельсаветаў з паходнай царквой", на маленні збіралася шмат людзей. Вядомы прыклады моцнай рэлігійнасці старавераў у Міхалёўскім сельсавеце. У Душэўскім сельсавеце Чавускага раёна С. Хлапкоў адмовіўся атрымоўваць дзяржаўную дапамогу (2000 рублёў) як шматдзетны: "Я не буду прадаваць сваіх дзяцей ідалам"[816].

28.10.1940 г. інсруктар аддзела прапаганды і агітацыі Магілёўскага абкама КП(б)Б нехта Гозман (яўрэй), аналізуючы стан антырэлігійнай працы ў Крычаўскім раёне, адзначаў, што ў Крычаве дзейнічалі "сектанскія" групы, аб'яднанне вернікаў "Крестоносцев". На вуліцы Піянерскай і Рачной, дзе жылі "Крыжаносцы" на варотах і дзвярах іх дамоў былі намаляваны крыжы і літары "Х.В." – Хрыстос Уваскрос. Старавер Фралоў (рускі) называў савецкую ўладу "антыхрыстам" і не пускаў у школу сваіх 3-х дзяцей школьнага ўзросту, кажучы, што ён сам здольны выхаваць сваіх дзяцей. Запаўняліся веруючымі і два яўрэйскіх малітоўных дамы ў Крычаве[817].

Па-за культавая дзейнасць прадугледжвала асветную працу сярод моладдзі і дзяцей. Так, у Клімавіцкім раёне ў малітоўных сходах прымалі ўдзел і дэкламавалі евангелле 7–10-гадовыя дзеці. З Касцюковіч ў Клімавічы для дэкламавання евангелля спецыяльна прывозілі 12-гадовую дзяўчынку. У Бягомльскім раёне дзеці баптыстаў чыталі евангелле, пры гэтым адмаўляліся вывучаць і дэкламаваць вершы савецкіх пісьменнікаў. У шэрагу раёнаў дзеці і моладзь прымалі ўдзел у царкоўных хорах. У Мінску пры касцёле, што на могілках, існаваў балетны гурток для дзяцей з адмысловай настаўніцай. У Шклоўскім раёне школьнікі з сем'яў вернікаў распаўсюджвалі "Святы ліст" сярод аднакласнікаў[818]. У Клімавіцкім раёне равін Брыскер арганізаваў 2 хедэры, адзін на прыватнай кватэры, другі пры сінагоге пад кіраўніцтвам равіна Локшына. У красавіку 1935 г. хедэр наведвалі, у тым ліку, і 10 дзяцей яўрэйскай савецкай школы[819]. Вялікі ўплыў на моладзь мела даволі шматлікая абшчына стараабрадцаў у Пліскім сельсавеце Бешанковіцкага

---

[816] Дакладная запіска ад 25.06.1939 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 4а. Спр. 42. Арк.10–14.
[817] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б і ЦС СВБ БССР ад 11.10.1940 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 15512. Арк. 13 ; Даведка аб стане антырэлігійнай працы ў Крычаўскім раёне на 25.10.1940 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 4а. Спр. 103. Арк. 20–21.
[818] Дакладная запіска аб стане антырэлігійнай прапаганды ў Беларусі на пачатак 1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 94.
[819] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // Там жа. Спр. 11852. Арк. 99.

раёну. Пад час перапісу 1937 г. іх дзеці заяўлялі, што яны вернікі. У Кіраўскім раёне ў в. Капусціна нават піянеры, дзеці старабрадцаў, насілі крыжыкі і не хавалі сваю рэлігійнасць[820]. Вучні, дзеці стараабрадцаў, пад уплывам бацькоў, хрысціліся перад і пасля абеду ў школьнай сталоўцы, адмаўляліся слухаць антырэлігійную інфармацыю (Мінкаўская і Пархінская рускія школы Рагачоўскага раёна)[821].

Гуртаванне вакол касцёла жабракоў, раздача грошаў дзецям, сувязь з польскім консулам, удзел дзяцей у шэсцях на польскіх могілках, падтрымка сувязі з польскай школай, размешчанай каля дома спецыялістаў – уся гэта дзейнасць Мінскага ксяндза савецкай уладаю ў 1937 г. расцэнівалася як "выключна нахабныя паводзіны"[822].

Новая хваля актывізацыі па-за культавай дзейнаці рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей была выклікана падрыхтоўкай і прыняццем Канстытуцый СССР (1936) і БССР (1937), а таксама правядзеннем Усесаюзнага перапісу насельніцтва, які праводзіўся з 15.10.1936 па 12.01.1937 г.

Свабода веравызнання была зафіксавана ў адпаведных артыкулах Канстытуцыі СССР (Арт.124)[823] і Канстытуцыі БССР (Арт. 99)[824]. Дэкларуючы ў асноўным законе краіны рэлігійную цярпімасць і свободу, улады імкнуліся забяспечыць гэты пастулат не ўвасабленнем яго ў грамадстве, а шляхам гвалтоўнай ліквідацыі рэлігійнасці па прынцыпу: "мы за свабоду веравызнання, але вернікаў у нас няма".

Вернікі розных канфесій выкарысталі змест артыкулаў Канстытуцыі і актывізавалі сваю дзейнасць, што з аднаго боку засведчыла высокі ўзровень рэлігійнасці насельніцтва (гэта ж паказалі вынікі перапісу насельніцтва 1937), а з другога справакавала новую хвалю рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва.

За 1936 г. было закрыта па хадайніцтве працоўных: цэркваў – 81, сінагог – 22, касцёлаў – 9, усяго – 112. За гэты ж перыяд (1936 г.) паступілі заявы ад вернікаў аб адкрыцці цэркваў – 158 заяў з 51 раёну, сінагог – 61 заява з 26 раёнаў, касцёлаў – 16 заяў з 11 раёнаў, усяго – 235 заяваў. У Бешанковіцкім раёне для адкрыцця Ульскага касцёла было пададзена 4 заявы і па Крычаўскаму касцёлу 3 заявы[825]. Акрамя таго, за адкрыццё касцёлаў былі пададзены заявы са Шклова, Лельчыц, Плешчаніц, Дрыбіна, Хойнікаў, Чавус, Бялыніч, Лёзна, Лепеля[826]. На мяжы Бешанковіцкага і Сіроцінскага раёнаў у м. Вуллі меўся будынак касцёла, часова заняты пад склад "Заготзерно". На працягу 1936 г. у Бешанковіцкім раёне сабралі 600 подпісаў за закрыццё касцёла, а ў Сіроцінскім – 1000 подпісаў за

---

[820] Дакладная запіска "Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП(б)Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі (па дадзеных 40 раёнаў)" ад 07.06.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12109. Арк. 45.
[821] Дакладная запіска ў ЦК КП(б)Б ад 13.05.1935 г. // Там жа. Спр. 11852. Арк. 94, 95, 97.
[822] Дакладная запіска "Па пытанні аб касцёлах" ад 07.08.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 81.
[823] Конституция СССР 1936 г. // Кукушкин Ю.С., Чистяков О.И. Очерк истории Советской Конституции. М., 1987. С. 309.
[824] Конституция (Основной Закон) Белорусской Советской Социалистической Республики. Минск, 1937. С. 27–28.
[825] Дакладная запіска аб стане антырэлігійнай прапаганды ў Беларусі на пачатак 1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 90.
[826] Дакладная запіска "Па пытанні аб касцёлах" 07.08.1937 г. // Там жа. Арк. 80.

адкрыццё. Напярэдадні каталіцкай пасхі сакратар ЦВК Беларусі Ляўкоў (пазней зняты з пасады і безпадстаўна арыштаваны як вораг народа) прапанаваў сакратару Сіроцінскага райкама адкрыць на вялікдзень касцёл[827].

Супастаўленне падачы заяў на закрыццё (112) і адкрыццё (235) храмаў за 1936 г. відавочна сведчыць аб значнай актывізацыі рэлігійнай дзейнасці нацыянальных меншасцей у БССР. Пры гэтым выкарыстоўваліся розныя формы і метады па-за культавай дзейнасці рэлігійных абшчын, у тым ліку, нават, супрацоўніцтва з мясцовымі органамі ўлады. Так, напрыклад, у Бабруйскім раёне – прыгарад Цітаўка, праваслаўны святар прапанаваў камсамольскай першаснай арганізацыі свае паслугі ў кіраванні харавым гуртком пры доме культуры і аднойчы казаў камсоргу: “нічога, браток, падчас выбараў у Вярхоўны савет папрацуем разам”[828]. Адзін з настаўнікаў сямігодкі выкладаў, што “езуіты – гэта такія культтрэгеры, якія насілі на сваіх плячах культуру і таму мы павінны падтрымліваць іх ідэі”[829].

22.03.1937 г. на пасяджэнні бюро Магілёўскага РК КП(б)Б пры абмеркаванні пытання “Аб рашэннях лютаўскага пленума ЦК УсеКП(б) і сакавіцкага пленума ЦК КП(б)Б” член бюро РК КП(б)Б Цюраеў адзначыў, што (на беларускай мове ў арыгінале): “У Княжыцкім сельсавете папы і царковныя служкі сабралі больш подпісаў за адкрыццё царквей, чым нашы арганізацыі за закрыццё, папы дабраліся за подпісамі і ў Бялыніцкі раён … На швейнай фабрыцы ёсць католікі, якія працуюць на фабрыцы і прымаюць удзел у адпраўленні рэлігійных абрадаў у касцёле (удзельнічаюць у хоры)” [830].

У Чашніках Лепельскага раёна былы равін, які раней адмовіўся ад сваёй рэлігійнай дзейнасці, а ў 1937 г. падаў заяву ў райвыканкам з просьбай дазволіць яму ўзнавіць сваю ранейшую дзейнасць[831]. У чэрвені 1937 г. у Быхаве З. Фейгін абяцаў даць 8000 руб. на рамонт будынка сінагогі пры ўмовах, што яго падтрымаюць у справе вяртання раней закрытай сінагогі. У Лепелі група іўдзееў падала заяву на пабудову новай сінагогі, а таксама патрабавала вяртанне былой сінагогі, дзе шмат год знаходзіўся масласырзавод[832]. Польскім насельніцтвам збіраліся подпісы за адкрыццё касцёла ў Сенненскім раёне. Для працы сярод польскага насельніцтва прыязжалі ксяндзы Баравік з Мінска і Аўгло са Смаленска[833]. У Расіцкім сельсавеце Дрысенскага раёна група касцёльнага актыву сабрала 260 подпісаў, каб да іх з Віцебска прыязжаў ксёндз Райко (былы Расіцкі ксёндз быў арыштаваны)[834].

---

[827] Дакладная запіска “Па пытанні аб касцёлах” 07.08.1937 г. // // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11035. Арк. 79.
[828] Дакладная запіска аб стане антырэлігійнай прапаганды ў Беларусі на пачатак 1937 г. // Там жа. Арк. 91.
[829] Даклад Вансоўскага на пасяджэнні камісіі бюро ЦК КП(б)Б па падрыхтоўцы матэрыялаў па нацыянальным пытанні да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б (1930 г.) // Там жа. Спр. 5091. Арк. 22.
[830] Пратакол № 17 пасяджэння бюро Магілёўскага РК КП(б)Б ад 22.03.1937 г. // ДАГАМаг. Ф. 6580. Воп. 2. Спр. 1.Арк. 381.
[831] Дакладная запіска Лепельскага РК КП(б)Б. 1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 145.
[832] Дакладная запіска “Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП(б)Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі” ад 07.06.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 26–27 ; Спр. 12109. Арк. 39–40.
[833] Дакладная запіска Сененскага РК КП(б)Б ад 10.05.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 125.
[834] Дакладная запіска “Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП(б)Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі” ад 07.06.1937 г. // Там жа. Арк. 26–27.

За тры-чатыры месяцы 1937 г. вернікамі БССР было подана заяў у ЦВК БССР з подпісамі аб адкрыцці цэркваў 25 калектыўных заяў, сінагог – 7, касцёлаў – 2, малітоўных дамоў – 1, абвяртанні канфіскаваных прадметаў культа – 1, аб рэгістрацыі папоў і ксяндзоў – 5. У той жа час улады змаглі арганізаваць падачу толькі 13 матэрыялаў аб закрыцці цэркваў[835]. Усе гэтыя дзеянні вернікаў былі вынікам прыняцця Канстытуцыі 1936 г., у прыватнасці палажэннямі аб свабодзе сумлення і веравызнання, якія былі і ў Канстытуцыі БССР 1937 г. Шмат фактаў актывізацыі вернікаў па збору сродкаў і подпісаў на адкрыццё цэркваў, сінагог і касцёлаў у Шклоўскім, Бягомльскім, Жлобінскім і іншых раёнах зафіксавана падчас Усесаюзнага перапісу насельніцтва[836].

Вядомы шматлікія факты адмаўлення ад удзелу ў перапісу, так і агітацыі, каб людзі запісваліся веруючымі – тады адчыняць цэрквы і касцёлы. Падобнае было ў Рагачоўскім, Дамонаўскім, Расонскім, Жыткавіцкім, Сененскім раёнах[837]. У пэўных рэгіёнах гэта ўспрымалася насельніцтвам станоўча і з надзеяю, таму быў высокі працэнт запісаўшыхся вернікамі. У асобных калгасах колькасць запісаўшыхся вернікамі даходзіла да 90–95 % пры папярэднім запаўненні бланкаў. У Заслаўскім раёне адказныя работнікі райкама вымушаны былі правесці агітацыю на месцах, пасля чаго шматлікія калгаснікі перапісалі сябе ў “няверуючыя”[838]. У Вітуніцкім сельсавеце Бягомальскага раёну агітавалі насельніцтва, каб пры правядзенні перапісу запісвацца “у вернікі і тады адкрыюць царквы”. У Расонскім раёне падчас перапісу запісваліся вернікамі таму “што савецкая ўлада тады дазволіць аднавіць працу раней закрытых цэркваў”, “савецкай уладзе з замежжа загадалі перапісаць усіх вернікаў для таго, каб адкрыць цэрквы і касцёлы”[839]. Афіцыйнай уладаю гэта трактавалася як вынік варожай контррэвалюцыйнай агітацыі.

Ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбылося згуртаванне вернікаў на этнічнай аснове. Немцы, палякі, латышы, літоўцы не толькі не адракліся ад рэлігіі, але яна яшчэ больш кансалідавала іх. Мацнела пазіцыя “прыняць любыя пакуты за веру”. Сходы вернікаў праходзілі нелегальна, у лесе, з надыходам халадоў – па хатах. Месцы сустрэч змяняліся. Абвесткі ажыццяўлялі жанчыны. Збіраліся вернікі, як правіла, у дамах, дзе гаспадыні-жанчыны, бо, мужы былі рэпрэсаваныя.

У выніку рэпрэсіўных дзеянняў партыйна-савецкага кіраўніцтва БССР у сярэдзіне і другой палове 1930-х гг. рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей засталіся без святароў і рэлігійнага актыву, што дазволіла цалкам забраць культавую маёмасць (пабудовы) у дзяржаўную ўласнасць. Застаўшыяся вернікі былі не ў стане, нават тэарэтычна, абапіраючыся на Кастытуцыю БССР 1937 г., абараніць маёмасць абшчын ад супрацьпраўных дзеянняў улад.

---

[835] НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 11852. Арк. 54.

[836] Дакладная запіска аб стане антырэлігійнай прапаганды ў Беларусі на пачатак 1937 г. // Там жа. Спр. 11035. Арк. 93.

[837] Дакладныя запіскі РК КП(б)Б (1937 ) // Там жа. Спр. 12082. Арк. 3, 16, 218, 275, 289.

[838] *Жиромская В. Б., Киселев И. Н., Поляков Ю. А.* Полвека под грифом «секретно»: Всесоюзная перепись населения 1937 года. М., 1996. С. 97.

[839] Дакладная запіска “Аб стане антырэлігійнай прапаганды ў КП (б) Б і актывізацыі царкоўнікаў і сектантаў ў шэрагу раёнаў Беларусі (па дадзеных 40 раёнаў)” ад 07.06.1937 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 12109. Арк. 28, 49

Такім чынам, можам зрабіць выснову, што, нягледзячы на палітычны і сацыяльны ціск з боку органаў савецкай улады, рэлігійныя абшчыны іўдзейскага, каталіцкага і пратэстанцкага веравызнання, якія існавалі ў месцах кампактнага пражывання асоб польскай, латышскай, літоўскай, нямецкай, яўрэйскай і рускай нацыянальнасці знаходзілі магчымасці для свайго функцыянавання, прыстасаваліся да новых умоў існавання.

Выяўлена залежнасць паміж асаблівасцямі правядзення палітыкі беларусізацыі і рэлігійнага жыцця нацыянальных меншасцей у 1920-я гг. Беларусізацыя стымулявала нацыянальную і рэлігійную актыўнасць этнічных груп, што дазваляла, у пэўнай ступені захоўваць нацыянальныя традыцыі і асаблівасці ў асяроддзі нацыянальных меншасцей БССР у наступнае дзесяцігоддзе.

Ва ўмовах пабудовы савецкай дзяржавы, у першую чаргу, менавіта рэлігійнае жыццё абшчын стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры нацыянальных меншасцей (палякаў, яўрэяў, татараў, літоўцаў, латышоў і немцаў). Шэраг нацыянальных меншасцей звязвалі рэлігійныя перакананні з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбываецца згуртаванне вернікаў на этнічнай аснове. Немцы, палякі, латышы, літоўцы не толькі не адракліся ад рэлігіі, але яна яшчэ больш кансалідавала іх.

Вернікі не выступалі ў якасці пасіўных сведкаў падзей, якія адбываліся па ініцыятыве Савецкай улады. Узмоцненая абмежавальна-рэпрэсіўная палітыка, якую праводзіла савецкая ўлада ў дачыненні да рэлігіі і царквы, выклікала адкрыты і латэнтны супраціў абшчын нацыянальных меншасцей. Рэлігійны актыў з'яўляўся ініцыятарам і арганізатарам супрацьстаяння значнай часткі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей афіцыйнаму гвалту ўлады.

У неспрыяльных абставінах 1930-х гг., ва ўмовах гвалтоўнага правядзення калектывізацыі, падрыхтоўкі і прыняцця Канстытуцый СССР і БССР, правядзення Усесаюзнага перапісу насельніцтва (1936–1937) ў БССР актывізавалась прыхаваная і адрытая па-за культавая дзейнасць вернікаў у асяродку нацыянальных меншасцей. Выкарыстоўваліся наступныя формы і метады: дзейнасць па тлумачэнню і сістэматызацыі рэлігійных ідэй, місіянерская, дабрачынная, выхаванне ў сям'і, па захаванню прынцыпаў і правілаў жыцця, кіраўніцтва і дзейнасць рэлігійных арганізацый, асветная, адукацыйная. У выніку аналіза вызначаны прычыны актывізацыі рэлігійнай дзейнасці абшчын і асобных вернікаў.

Не апраўдалася надзея камуністычнай улады таму, што новыя савецкія святы паступова заменяць традыцыйныя рэлігійныя. Рэлігійныя святы адзначаліся значнай часткай латышскага, нямецкага, польскага, рускага і яўрэйскага насельніцтва БССР. Уплыў рэлігіі выразна прасочваўся ва ўсіх сферах жыцця нацыянальных меншасцей. Нават члены камуністычнай партыі (бальшавікоў) не цураліся рэлігійнай абраднасці.

Актывізацыя вернікаў справакавала новую хвалю рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва.

У выніку рэпрэсіўных дзеянняў партыйна-савецкага кіраўніцтва БССР у сярэдзіне і другой палове 1930-х гг. рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей засталіся без святароў і рэлігійнага актыву, што дазволіла цалкам забраць культавую маёмасць (пабудовы) у дзяржаўную ўласнасць. Застаўшыяся вернікі былі не ў стане абараніць маёмасць абшчын ад супрацьпраўных дзеянняў улад.

**Высновы.** 1920–1930-я гг. – гады пабудовы сацыялізму, увайшлі ў гісторыю нашай краіны як адны з самых складаных і супярэчлівых. У гэты час сфарміраваліся асновы сацыялістычнай сацыяльна-класавай структуры насельніцтва. Жыццё грамадства праходзіла ў асноўным у мірных умовах і было адзначана самаадданай працай народа, вонкава мажорным пафасам сацыяльна-эканамічнага, грамадскага і культурнага развіцця ў кірунку пабудовы сацыялізма.

Сацыяльныя ўзрушэнні ў міжваенны час пацягнулі за сабой змены форм грамадскага побыту беларускага насельніцтва. Пад уплывам сацыяльна–палітычных працэсаў сталі закладвацца асновы грамадскага жыцця, формы якога адпавядалі новай сацыялістычнай ідэалогіі. Увайшлі ў жыццё мітынгі, дэманстрацыі, сходы. Старыя формы мясцовага самакіравання ліквідаваліся, іх функцыі перайшлі да саветаў. Новыя грамадскія адносіны знайшлі праяўленне ў партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай рабоце.

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей БССР праявілі сваю актыўнасць ва ўсіх сферах тагачаснай палітычнай сістэмы. Значная частка з іх супольна з беларусамі, а некаторыя нават больш актыўна, ўдзельнічала ў справе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. Аналіз нацыянальнага складу партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1920–1930-я гг. дазваляе казаць аб тым, што прадстаўнікі нацыянальных меншасцей адыгрывалі больш значную ролю ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі, чым беларусы. Амаль паўсюль удзельная вага нацыянальных меншасцей у органах цэнтральнай прадстаўнічай і выканаўчай улады была вышэйшая за іх працэнт у агульным складзе насельніцтва БССР. Асаблівасцю было тое, што нацыянальныя меншасці хутчэй арганізоўваліся, рэагавалі на грамадскія змены, для іх асяродка ўласціва наяўнасць працаздольнага і дзейнага актыву. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей часцяком выступалі з ініцыятывамі пад уплывам партыйна-дзяржаўнай прапаганды, што дазваляла ім у міжваенны час ва ўмовах недахопу кадраў (“кадравы голад”) займаць адказныя пасады і паляпшаць свой сацыяльны статус.

У выніку індустрыяльнага развіцця рэспублікі, павышэння адукацыйнага ўзроўню прадстаўнікоў тытульнай нацыі, адміністратыўнага шляху фарміравання кіруючых кадраў напрыканцы 1930-х гг. усталяваўся нацыянальны склад партыйна-дзяржаўнай наменклатуры БССР. Пры яе фарміраванні пад увагу бралася, у першую чаргу, адданасць ідэалам сацыялістычнага грамадства. Рэспубліканскія органы ўлады знаходзіліся пад кантролем Масквы і не маглі ў поўнай меры ўздзейнічаць на нацыянальныя працэсы.

У 1920-я гады ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі вылучыліся дзве тэндэнцыі: адміністрацыйна-бюракратычная і нацыянальна-дэмакратычная. Першая паступова набірала сілу, другая знікала, бо ўмовы для яе развіцця

няўхільна абмяжоўваліся. У гэты перыяд вылучаюцца па сваёй значнасці 1921 і 1929 гг., гэта пачатак і заканчэнне перыяду найбольш спрыяльнага для развіцця нацыянальных меншасцей у Беларусі, калі яны прымалі найбольш актыўны і творчы ўдзел у грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці. У 1930-я гг. прасочваюцца тэндэнцыі, накіраваныя на разбурэнне традыцыйнай народнай культуры нацыянальных меншасцей, да страты пераемнасці духоўных каштоўнасцей, у гэты час прадстаўнікі нацыянальных меншасцей спрабуюць захаваць свае этнічныя асаблівасці праз дзейнасць рэлігійных арганізацый, працягваючы ўдзельнічаць у пабудове сацыялістычнага грамадства.

Для грамадска-палітычнага жыцця нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд таксама характэрны дзве тэндэнцыі: па-першае, гэта быў апошні перыяд дзейнасці нацыянальных партый, арганізацый і аб'яднанняў, якія паступова выцясняюцца з жыцця, па-другое, адбываецца далучэнне нацыянальных меншасцей у новыя працэсы праз уцягненне іх у прасавецкія грамадска-палітычныя аб'яднанні.

Нацыянальныя меншасці Беларусі ў 1920–1930-я гг. мелі магчымасць рэалізаваць свой патэнцыял і самасвядомасць праз удзел у грамадска-палітычных, нацыянальна-палітычных і культурна-асветніцкіх аб'яднаннях БССР. Існавала толькі адна асаблівасць: улады Беларусі спрыялі дзейнасці розных арганізацый, аб'яднанняў і таварыстваў толькі з мэтай ахопу праз іх дзейнасць найбольшай колькасці насельніцтва сваімі ідэалагічнымі ўстаноўкамі, накіраванымі на ўзмацненне існуючай улады. Уся дзейнасць іншых арганізацый нацыянальных меншасцей, не падначаленых КП(б)Б, аб'яўлялася шкоднай і варожай, іх удзельнікаў аб'яўлялі нацыяналістамі і шавіністамі і заклікалі насельніцтва да бязлітаснай барацьбы з імі.

У выніку розных прычын большасць грамадска-палітычных аб'яднанняў нацыянальных меншасцей знаходзілася ў апазіцыі да камуністычнай партыі і адпаведна, часткова, да савецкай улады. Напрыканцы 1920-х гг. практычна ўсе нацыянальныя грамадскія арганізацыі былі ліквідаваны, большасць членаў аб'яднанняў нацыянальных меншасцей абвінавачаны ў контррэвалюцыйный дзейнасці, арганізацыйна разгромлены і высланы за межы БССР. Асобныя глыбока законспіраваныя групы праіснавалі да сярэдзіны 1930-х гг.

Выяўлены не лінейны характар працэсаў ліквідацыі нацыянальна-грамадскіх арганізацый нацыянальных меншасцей на тэрыторыі БССР у 1920–1930-х гг. і выяўлена гістарычная заканамернасць якая складаецца ў тым, што ў пачатку 1920-х гг. ім удалося прыстасавацца да ўмоў савецкай рэчаіснасці і навучыцца выжываць у неспрыяльных абставінах, у сярэдзіне 1920-х і 1936, 1937 гг. назіралася пэўная актывізацыя грамадскага жыцця нацыянальных меншасцей, рэзкае пагаршэнне становішча адбылося ў канцы 1930-х гг.

Пабудова асноў сацыялізму суправаджалася правядзеннем палітыкі беларусізацыі, індустрыялізацыі і калектывізацыі. Гэта прывяло да пераўтварэння БССР у аграрна-індустрыяльную рэспубліку і значных сацыяльных зрухаў, якія непасрэдным чынам закранулі грамадскае жыццё нацменшасцей Беларусі. Характэрнай асаблівасцю жыцця нацыянальных меншасцей у міжваенны час

з'яўляўся нарастаючы ўціск з боку партыйна-дзяржаўных структур. Нацменшасці БССР аднымі з першых адчулі на сабе недавер з боку ўлад.

Важнай формай прыцягнення нацыянальных меншасцей да грамадскага і культурна-асветніцкага жыцця была арганізацыя нацыянальных саветаў. Практыка міжваеннага часу паказала, што палітычнае, гаспадарчае і культурнае жыццё, у патрэбным для камуністычных уладаў кірунку, на тэрыторыі падпарадкаванай нацсаветам, развівалася хутчэй, чым у іншых месцах Савецкай Беларусі. У той жа час спроба суцэльнай саветызацыі палякаў, літоўцаў, латышоў, немцаў і іншых з дапамогай створаных форм нацыянальнай аўтаноміі не прывяла да чакаемых вынікаў. Сведчаннем гэтага быў супраціў з боку значнай колькасці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей БССР сацыялістычным пераўтварэнням: калектывізацыі, рэлігійнай палітыцы савецкай дзяржавы, а таксама шматлікія праявы сімпатыі да сваёй гістарычнай радзімы. Канчатковае фарміраванне ў 1930-х гадах таталітарнай дзяржавы не толькі не дазволіла разгарнуць працу па далейшаму ўзнікненню нацсаветаў і прывяло да паступовай ліквідацыі існаваўшых.

Устаноўлена, што стварэнне нацыянальных мястэчковых і сельскіх саветаў – гэта найлепшая форма арганізацыі і развіцця самакіравання для нацыянальных меншасцей ва ўмовах станаўлення плюралістычнай культуры. Але іх існаванне ва ўмовах фарміравання сталінскіх форм кіравання (адміністратыўна-каманднай сістэмы) і правядзення палітыкі інтэрнацыялізму прыводзіла да разумення іх сутнасці як асяродка праяў нацыянальнага сепаратызму.

За гады савецкай улады на аснове рэалізацыі нацыянальнай палітыкі былі атрыманы важкія здабыткі ў эканамічным жыцці, культуры, адукацыі, кнігавыдавецкай справе, мастацтве нацыянальных меншасцей. Нацыянальныя школы, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, недахоп падручнікаў і настаўнікаў, даволі якасна абучылі значную колькасць людзей на роднай мове і забяспечылі культурнае развіццё нацыянальных меншасцей БССР. Але і ў культурна-асветніцкай сферы вырашэнне нацыянальнага пытання на тэрыторыі БССР з самага пачатку было падпарадкавана інтарэсам умацавання бальшавіцкай улады, яе ўнутраным і знешнепалітычным мэтам, што не заўсёды садзейнічала развіццю нацыянальных меншасцей. Мова выступала як сродак саветызацыі, пранікнення ў асяродак нацыянальных супольнасцей для агітацыі і прапаганды новых ідэй і разумення мэтаў і задач камуністычнага будаўніцтва ў перыяд замацавання ўлады (1920-я), і не было неабходнасці захоўвання нацыянальных моў у 1930-я гг. калі ўмацавалася адміністратыўна-камандная сістэма і размовы пра неабходнасць нацыянальна-культурнага развіцця былі не больш чым палітычная рыторыка не падмацаваная канкрэтнымі дзеяннямі.

Партыйна-савецкімі ўладамі былі створаны магчымасці для самарэалізацыі, праяў ініцыятывы і культурна-асветніцкай дзейнасці ў межах існуючай сістэмы. У 1920–1930-я гг. улады прапаноўвалі шэраг новых праектаў, а новае заўжды, асабліва ў моладзі, выклікала зацікаўленасць і жаданне праявіць ініцыятыву, тым больш з'яўляліся магчымасці, атрымаўшы адукацыю, да кар'ернага росту і паляпшэння сацыяльнага становішча, што

прывяло да значнага развіцця культуры нацыянальных меншасцей. Аднак на фоне ўсяго выдатнага ў эканамічна-сацыяльнай і культурна-асветнай сферы, нацыянальна-духоўнае жыццё Беларусі панесла сур’ёзныя страты ў справе захавання традыцыйнай (народнай) культуры. Устаноўлена гістарычная заканамернасць, якая заключаецца ў тым, што ў працэсе правядзення культурнай рэвалюцыі, органы ўлады паступова перайшлі да адміністрацыйных метадаў, упадабаючы іх метадам масавай прапаганды (масавая, тлумачальная праца) і ініцыятыве “свядомага” актыўнага насельніцтва на месцах.

У 1930-я гг. вялося жорсткае, бязлітаснае, няўмольнае і ў той жа час паслядоўнае, спланаванае змаганне сталінскага кіраўніцтва з лепшымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, працоўнага класа, сялянства, нават з часткай партыйнага і савецкага апарата, грамадскімі арганізацыямі і г.д. У краіне ўсталявалася сталінская дыктатура. Апорай яе была адміністрацыйна-камандная сістэма кіравання сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыццём. На першым месцы знаходзілася саветызацыя насельніцтва, у тым ліку нацменшасцей, і выхаванне адданасці камуністычным ідэалам. Менавіта гэтым тлумачыцца пачатак пераводу навучання на рускую мову. Форма кіравання, якая абапіралася на апарат камуністычнай партыі, стала дамінуючай і не падлягала абмеркаванню.

Палітыка калектывізацыі не пакінула ў баку нацыянальныя меншасці Беларусі. Калгасы з’яўляліся своеасаблівай формай грамадскага самакіравання і кіравання не толькі сродкамі вытворчасці, але і грамадскага жыцця. Вельмі хутка ўзрастала роля калгасаў і яго кіраўніцтва ў грамадска-палітычным жыцці ў параўнанні з сельскімі і мястэчковымі саветамі. Па меры ўмацавання калгаснага ладу ў другой палове 1930-х гг. бачна, што дзейнасць калгасаў усё больш абгрунтоўвалася не эканамічнай мэтазгоднасцю, а грамадска-палітычнай. Нацыянальныя калгасы (да іх стварэння розныя формы кааперацыі) – гэта адна з формаў грамадскага жыцця, якая характарызуецца грамадзянскай пазіцыяй, грамадскай дзейнасцю, калектыўным прыняццем адказных рашэнняў, вылучэннем і фарміраваннем актыву і інш. Аналіз правядзення калектывізацыі выявіў новыя формы і метады грамадскай дзейнасці, актывізавалася прыхаваная і адкрытая па-за культавая дзейнасць вернікаў у асяродку нацыянальных меншасцей.

Рэлігійнае жыццё ў 1920–1930-я гг. стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры нацыянальных меншасцей. Выяўлена гістарычная заканамернасць, якая складалася ў тым, што ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбываецца згуртаванне вернікаў на этнічнай аснове. Немцы, палякі, латышы, літоўцы не толькі не адракліся ад рэлігіі, але яна яшчэ больш кансалідавала іх. Сярод нацыянальных меншасцей яшчэ больш умацоўваецца сувязь рэлігійных перакананняў з нацыянальнай ідэнтычнасцю.

Уплыў рэлігіі выразна прасочваўся ва ўсіх сферах жыцця нацыянальных меншасцей. Зафіксавана асаблівасць, што, нягледзячы на сістэматычны захоп культавых збудаванняў савецкімі актывістамі і органамі ўлады, на працягу 1920–1930-х гг. назіраліся выпадкі адкрыцця новых сінагог, спробы

будаўніцтва касцёлаў і вяртання ўласнасці абшчын. Устаноўлена заканамернасць, якая складаецца ў тым, што нацыянальныя рэлігійныя абшчыны прыпынялі сваю дзейнасць павольней, чым праваслаўныя, некалькі даўжэй захоўвалі свае культавыя будынкі, праяўлялі вялікую вынаходлівасць для самазахавання ў самых цяжкіх умовах савецкай рэчаіснасці.

Аднак спробы рэлігійных абшчын нацыянальных меншасцей прыстасавацца да савецкай рэчаіснасці ва ўмовах згортвання палітыкі беларусізацыі і бязлітаснага вынішчэння рэлігійных вераванняў аказаліся беспаспяховымі. Гістарычнай заканамернасцю з'яўлялася тое, што рэлігійныя абшчыны нацыянальных меншасцей, якія засталіся без святароў і рэлігійнага актыву цалкам пазбавіліся культавай маёмасці. Яна была перададзена ў дзяржаўную ўласнасць, неэфектыўна выкарыстоўвалася і знішчалася, чым была нанесена незаменная шкода гісторыка-культурнай спадчыне беларускага народа.

Праведзены комплесны аналіз усіх форм і метадаў па-за культавай дзейнасці вернікаў дазволіў выявіць гістарычную заканамернасць у тым, што вернікі не выступалі ў якасці пасіўных сведкаў падзей, якія адбываліся па ініцыятыве Савецкай улады. Узмоцненая абмежавальна-рэпрэсіўная палітыка, якую праводзіла савецкая улада ў дачыненні да рэлігіі і царквы, выклікала адкрыты і латэнтны супраціў абшчын нацыянальных меншасцей. Рэлігійны актыў з'яўляўся ініцыятарам і арганізатарам супрацьстаяння значнай часткі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей афіцыйнаму гвалту ўлады. Гэта дазволіла вылучыць яшчэ адну гістарычную заканамернасць, якая складалася ў тым, што актывізацыя вернікаў справакавала новую хвалю рэпрэсіўных дзеянняў у адносінах да рэлігійнага актыву і святароў з боку партыйна-савецкага кіраўніцтва.

Правядзенне ў Савецкай Беларусі міжваеннага часу раскулачвання, антырэлігійнай барацьбы, палітычных рэпрэсій у адносінах да іншадумцаў і проста грамадзян, дэпартацый негатыўна ўплывала на грамадска-палітычную дзейнасць нацыянальных меншасцей БССР і на змяненне іх узроўня нацыянальнай самасвядомасці, асабліва пры кантактах з уладамі.

# ГЛАВА 4
# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Для насельніцтва Заходняй Беларусі Другая сусветная вайна пачалася 01.09.1939 г. З'яўляючыся грамадзянамі Польшчы, шмат ураджэнцаў рэгіёна розных нацыянальнасцей знаходзіліся ў войску і з першых дзён прымалі ўдзел у баявых дзеяннях супраць нямецкіх захопнікаў. Для жыхароў БССР вайна пачалася 17.09.1939 г. і ўсведамлялася як вызваленчы паход, як аднаўленне гістарычнай справядлівасці, якая прывядзе да аб'яднання ўсёй тэрыторыі Беларусі, як крок да сусветнай рэвалюцыі і ўсталявання справядлівага, сацыялістычнага грамадства.

Пэўная частка жыхароў Заходняй Беларусі ўсведамляла сябе грамадзянамі Польшчы і разглядала нямецкія і савецкія войскі як агрэсараў. Большасць, а гэта ў асноўным бядняцкае насельніцтва і пераважная частка беларусаў, вітала прыход Чырвонай Арміі і спадзявалася на паляпшэнне свайго грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча. У гэтым кантэксце і раглядаюцца складаныя грамадскія працэсы, якія адбываліся на прасторах Заходняй Беларусі на першым этапе Другой сусветнай вайны і на тэрыторыі БССР падчас Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг.

## 4.1 Грамадскае і культурна-асветніцкае жыццё нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1939–1941 гг.

Крыніцы сведчаць, што большасць беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі з вялікай радасцю, як вызваліцеляў і абаронцаў сваіх нацыянальных інтарэсаў, сустрэла Чырвоную Армію. Стаўленне народаў Заходняй Беларусі да савецкай улады абумовіла нацыянальная палітыка Польшчы і пазіцыя польскага каталіцкага касцёла, які падтрымліваў каланіяльныя дамаганні польскіх кіруючых кругоў.

Досыць выразна характарызуе польскую палітыку па нацыянальным пытанні дакладная запіска Беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, адпраўленая 23.06.1939 г., за некалькі месяцаў да прыходу савецкай улады. Нават назва дакладной запіскі ваяводы вызначае яе сацыяльную і нацыянальную накіраванасць "Праблемы ўмацавання польскага ўладальніцкага стану ў Беластоцкім ваяводстве"[840]. Фактычна ў запісцы распрацоўваецца комплексная, канцэптуальная палітыка паланізацыі Заходняй Беларусі ("усходніх крэсаў"), якая прадугледжвала рашэнне нацыянальнага пытання.

Згодна сцвярджэнняў ваяводы, ваяводства характарызавалася наступным "станам нацыянальна–рэлігійных адносін". Палякі складалі 66,85 % насельніцтва, беларусы – 18 %, яўрэі – 12,5 %, рускія – 1,6 %, немцы – 0,4 %, літоўцы – 1,15 %.

[840] Дакладная запіска Беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў МУС Польшчы ад 23.06.1939 г. // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 28. Арк. 9–11.

У Гродна: палякаў – 49,5 %, беларусаў – 40,5 %, яўрэяў – 6,5 %, іншых – 3,5 %. Г. Асташэўскі лічыў, што "пры панаванні польскага насельніцтва галоўныя перашкоды для сістэматычнай асіміляцыі складаюць беларусы і яўрэі. Іншыя этнасы малалікія (не больш 2 % насельніцтвы), а такім чынам, лёгкакіравальныя. І хоць беларусаў і яўрэяў відавочна менш асноўнага польскага насельніцтва (67 % супраць 18 і 12 % – сукупнасць апошніх складае толькі 30 % насельніцтвы), але іх асіміляцыя абцяжараная з–за кампактнасці іх пражывання …працэнт яўрэяў у гарадах і мястэчках (даходзіць да 60 %, а беларусаў у некаторых усходніх паветах да 40 з лішнім) не можа стаць вызначальным (сацыяльна і культурна) у ваяводстве". Гэта настойліва падкрэсліваецца ў запісцы: "Сённяшні ўзровень гарадоў і мястэчкаў вельмі нізкі, большасць яўрэйскага насельніцтва ў іх надае ім спецыфічны выгляд і характар"; рэфармаванне "сельскіх воласцей, дзе жыве беларускае насельніцтва", патрабуе выразнай палітычнай і эканамічнай палітыкі ў стаўленні да апошніх. Варта падкрэсліць, што адзіным метадам рашэння нацыянальнага пытання лічылася асіміляцыя – "апалячванне", што, у выніку, азначала этнічную, нацыянальную анігіляцыю народаў, меўшых на гэтай тэрыторыі доўгую гісторыю ўласнага развіцця. Нават самая сціплая па формах нацыянальная і культурная аўтаномія малых народаў прызнавалася ваяводаю непрымальнай[841].

Яўрэйскую праблему прапаноўвалася вырашаць інакш, чым беларускую. Паколькі яўрэі, якія жывуць у ваяводстве, валодалі значнай уласнасцю, мелі адмысловы менталітэт ("літвакі"), нават валодалі "сурагатам культурна-нацыянальнай аўтаноміі", а іх стаўленне "да дзяржаўнасці і польскай культуры" насіла выразна адмоўны, "пераважна разбуральны элемент", то "аб далучэнні гэтага элемента да дзяржавы або ўключэнне яго ў якую-небудзь крыніцу жыцця дзяржаўнага арганізма не можа быць і размовы". Неабходны "хуткія і належныя рашэнні". Лёгка здагадацца якія, хоць адкрыта пісаць аб іх нават у сакрэтнай запісцы ваявода не наважыўся. Што датычыцца іншых "нацыянальных меншасцей" (рускія, немцы, літоўцы), то яны, па меркаванні ваяводы, для польскай экспансіі "не складаюць істотнай небяспекі". Вылучаюцца пры гэтым рускія, але першым чынам таму, што стаўленне да іх павінна карэктавацца ўзаемаадносінамі Польшчы і СССР. Менавіта ў рускіх і праваслаўнай царкве бачыць галоўны ўплыў "праруаскага духу" на "беларускія массы"[842].

Такім чынам, зразумела, што ў цэлым польская палітыка ў нацыянальным пытанні на "ўсходніх крэсах" была жорсткай, экспансіяністкай, якая імкнулася фактычна (сацыяльна і культурна) да асіміляцыі "нацыянальных меншасцей".

Нямецкае кіраўніцтва, спасылаючыся на дамоўленасць пры падпісанні дагавора ад 23.08.1939 г., падштурхоўвала савецкі бок хутчэй выступіць

---

[841] Дакладная запіска Беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў МУС Польшчы ад 23.06.1939 г. // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 28. Арк. 9 ; *Розенфельд У.Д.* Этнонациональные процессы в Западной Беларуси (1939 г.) // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф. Мінск 17–18 верасня 1999 г. Мінск, 2000. С. 96–97.

[842] Дакладная запіска Беластоцкага ваяводы Г. Асташэўскага ў МУС Польшчы ад 23.06.1939 г. // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 28. Арк. 9–11 ; *Розенфельд У.Д.* Этнонациональные процессы в Западной Беларуси (1939 г.). С. 98.

супраць Польшчы, каб ускласці адказнасць за вайну і на СССР. Але Сталін, каб стварыць уражанне нейтралітэту, не згаджаўся з гэтым і адцягваў выступленне. Толькі 17 верасня, калі польская армія ў цэлым была разбіта і амаль уся тэрыторыя карэннай Польшчы занята нямецкімі войскамі, і заставаліся толькі асобныя пункты супраціўлення, Савецкі ўрад аддаў распараджэнне Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

17 верасня зранку распачаўся паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Прасоўванне войск ішло хутка. Месцамі ім дапамагала насельніцтва, дзейнічалі партызанскія групы. Пераважная большасць польскіх войск здавалася без бою, бо ў ім было шмат ураджэнцаў Заходняй Беларусі і яны, зведаўшы польскі прыгнёт, не збіраліся бараніць польскую дзяржаву. Згодна з афіцыйным паведамленнем Галоўнага камандавання Чырвонай Арміі, у час паходу ў Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь загінула 737 і паранена 1862 салдаты і афіцэры. Палітычныя ўзаемаадносіны і разлікі былі такімі, што 25 верасня 1939 г. у Брэсце адбыўся парад савецкіх і гітлераўскіх войск, які сяточна сімвалізаваў сумесную перамогу над Польшчай.

Асноўная частка насельніцтва Заходняй Беларусі – рабочыя, сяляне, рамеснікі, працоўная інтэлігенцыя сустракалі савецкіх салдат як вызваліцеляў, як родных братоў, кветкамі, хлебам-соллю. На месцах утвараліся часовыя ўправы і сялянскія камітэты. Ажыццяўляліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні: падзел памешчыцкай і царкоўнай зямлі, нацыяналізацыя і рабочы кантроль на фабрыках і заводах, адкрыццё новых школ і дэмакратызацыя школьнай сістэмы, адкрываліся бальніцы і амбулаторыі з бясплатным абслугоўваннем насельніцтва.

Неабходна было вырашаць галоўнае пытанне аб дзяржаўнай уладзе, аб самавызначэнні Заходняй Беларусі і заканадаўчым замацаваннем праведзеных пераўтварэнняў. Таму 05.10.1939 г. часовая ўправа г. Беластока звярнулася да ўсіх з прапановай склікаць народны сход.

Выбары дэпутатаў Народнага сходу прайшлі 22.10.1939 г. Прысутнасць Чырвонай Арміі паўплывала на становішча ў краі. Палітычныя партыі, акрамя камуністаў, адкрыта ў выбарах не ўдзельнічалі, ды ў іх не было такой магчымасці. Было абрана 926 дэпутатаў: 621 беларус, 127 палякаў, 72 яўрэі, 43 рускія, 53 украінцы і 10 прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей (нацыянальныя меншасці складалі 32,9 %).

Народны сход Заходняй Беларусі пачаў работу 28.10.1939 г. у г. Беластоку. Падчас яго былі прыняты рашэнні аб: усталяванні ў краі савецкай улады, канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. 29.10.39 г. была прынята Дэкларацыя аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР. 02.11.1939 г. нечарговая V сесія Вярхоўнага савета СССР першага склікання вырашыла задаволіць просьбу Народнага сходу Заходняй Беларусі і ўключыць Заходнюю Беларусь у склад СССР з уз’яднаннем яе з БССР. Завяршальным заканадаўчым актам аб уз’яднанні беларускага народа з’явілася прыняцце нечарговай ІІІ сесіяй Вярхоўнага Савета БССР 14.11.1939 г. закона, у якім было запісана: “Прыняць Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Савецкай

Сацыялістычнай Рэспублікі і ўз’яднаць тым самым вялікі беларускі народ у адзінай Беларускай дзяржаве”. У склад БССР увайшла тэрыторыя плошчай 100 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 4,7 млн чалавек. Пераважную большасць насельніцтва складалі беларусы.

Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Усходняй ў адзіную БССР было актам гістарычнай справядлівасці. Нягледзячы на далейшую прымусовую калектывізацыю, забарону дзейнасці дэмакратычных і нацыянальных партый і арганізацый, дэпартацыі і рэпрэсіі, уз’яднанне паклала канец падзелу Беларусі, аднавіла яе тэрытарыяльную цэласнасць, аб’яднала беларускі народ.

У цэнтральняй і ўсходняй частцы БССР працягваліся працэсы характэрныя для 1930-х гг., абцяжараныя ўмовамі Другой сусветнай вайны: змаганне з “варожымі агентамі і ўнутранымі ворагамі”, уз’яднаннем Заходняй Беларусі з БССР, эканамічнай мабілізацыяй і мілітарызацыяй гаспадаркі, удзелам у вайне СССР і Фінляндыі, далучэннем да савецкай краіны прыбалтыйскіх дзяржаў і г.д. Ва ўсіх гэтых працэсах бралі ўдзел прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі. Так, напрыклад, шмат латышоў, літоўцаў, рускіх, эстонцаў, яўрэяў былі адкамандзіраваны на працу партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі кіраўнікамі ў Заходнюю Беларусь, Латвію, Літву, Эстонію[843].

Аналізуючы грамадскае і культурна-асветніцкае жыццё нацыянальных меншасцей у Заходняй Беларусі, можна вызначыць шэраг асаблівасцей: 1) змяніліся адносіны да нацыянальных меншасцей, улады БССР імкнуліся абапірацца на ўвесь спектр нацыянальных сіл; 2) адбывалася фарміраванне новага кіруючага апарата; 3) становішча нацыянальных партый і легальнай прэсы; 4) змены ў эканамічным і сацыяльным жыцці, якія характарызаваліся нацыяналізацыяй, правядзеннем калектывізацыі, барацьбой з рэлігіяй, палітычнымі рэпрэсіямі і дэпартацыямі насельніцтва; 5) існаванне польскага антысавецкага і антыкамуністычнага супраціву.

**Адносіны да нацыянальных меншасцей Заходняй Беларусі з боку савецкай улады.** Улады БССР, імкнучыся абапірацца на ўвесь спектр нацыянальных сіл, у той жа час праводзілі палітыку, накіраваную на падаўленне польскасці.

На вызваленай тэрыторыі ствараліся часовыя органы мясцовай улады і сялянскія камітэты, якія займаліся наладжваннем гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцця. Дэклараванне і правядзенне карэнных зменаў у сацыяльнай, культурнай і нацыянальнай палітыцы стваралі спрыяльныя ўмовы для прыняцця савецкай улады, асабліва ў асяродку працаўнікоў. Аднак рэчаіснасць аказалася супярэчлівей. Трагічным дысанансам сталі дэпартацыі палякаў (дзяржаўных службоўцаў, інтэлігенцыі, асаднікаў і г.д.), якія ў той час былі зразумелымі для

[843] Спіс членаў і кандыдатаў УсеКП(б) па нацыянальнасці літоўцаў, латышоў і эстонцаў Магілёўскай вобласці. Характарыстыкі партыйных арганізацый, НКУС. Аўтабіяграфіі, асабістыя лісткі па ўліку кадраў // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 6а. Спр. 197. Арк. 2–4, 9–14, 25, 47, 74–75 адв., 80, 85–88, 113–116, 164–167, 207 ; *Пушкин И.А.* Латышская партийная элита Могилевщины в предвоенные годы // Латыши и белорусы: вместе сквозь века: сб. науч. ст. Вып. 4. Минск, 2015. С. 49–58.

асноўнай часткі насельніцтва, улічваючы тую жорсткую сацыяльную і нацыянальную палітыку, якую праводзіла польская ўлада на гэтых землях.

Новыя ўлады імкнуліся вырашаць складаныя міжнацыянальныя пытанні ў Заходняй Беларусі, строга прытрымліваючыся класавага прынцыпу. З першых дзён уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у органы мясцовай улады ў першую чаргу выбіраліся прадстаўнікі сялян, пераважна беднякі і парабкі, актывісты працоўнага руху і інтэлігенцыі, актыўныя ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчага змагання. Савецкая ўлада забараніла дзейнасць усіх апазіцыйных партый, арганізацый і рухаў. Камуністычная партыя стала адна ажыццяўляць кіраўніцтва грамадска-палітычным жыццём краіны. Тэрыторыя, на якой праводзілі выбары, кантралявалася вайсковымі часткамі Чырвонай Арміі, існавалі шэраг абмежаванняў на ўдзел у выбарах часткі насельніцтва. Дарэчы, на выбарах у Нацыянальны сход не ўдзельнічала ў галасаванні і выказалася супраць больш 353 тыс. выбаршчыкаў, прычым супраць галасавала амаль 263 тысячы чалавек[844]. Улады адміністратыўным шляхам памяншалі працэнт палякаў, каб на сход і ў мясцовыя органы ўлады ў месцах кампактнага пражывання палякаў была абрана большасць беларусаў.

З прыходам савецкай улады палякі страцілі дамінуючую пазіцыю, пазбавіліся сваіх прывілеяў (у адміністрацыі, школах, паліцыі, войску і г.д.). Яўрэйскае насельніцтва заяўляла: "Хопіць, скончылася ваша ўлада". У многіх кутках Заходняй Беларусі адбылося нематываванае зняцце палякаў з займаемых пасад. Напрыклад, з 70 палякаў-аграномаў Беластоцкай вобласці было пакінута толькі 19. Падобнае мела месца ў школах, бібліятэках, кнігарнях, дзе нават меліся загады аб забароне карыстацца вядомымі на Беларусі творамі Міцкевіча, Ажэшкі. Цэнтральныя органы ўлады БССР, каб крыху суцішыць "энтузіязм" мясцовых кіраўнікоў, прынялі спецыяльную партыйную пастанову аб недахопах у рабоце органаў улады ў заходніх абласцях Беларусі[845]. Штосьці было выпраўлена, але падзеі вайны 1941–1945 гг. не дазваляюць прааналізаваць, што рабілася па ініцыятыве мясцовых органаў улады, а што – па сакрэтных указаннях "зверху".

З кастрычніка 1939 г. па чэрвень 1941 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбыліся ашаламляльныя нацыянальныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Ужо ў першы год далучэння былі ліквідаваны ўсе формы нацыянальнай няроўнасці, пра што сведчыць працэс развіцця народнай адукацыі і культурна-нацыянальнага адраджэння.

Адразу пасля далучэння Заходняй Беларусі там працавалі 6199 пачатковых школ, дзе вучыліся 804472 вучні, з іх у гарадах – 1142 школы. Польскіх – 5932, рускіх – 3, яўрэйскіх – 263, немецкіх – 1, беларускіх – ніводнай[846].

У наркамаце адукацыі пасля ўважлівага азнаямлення з шэрагам звестак аб стане школьнай адукацыі ў далучаным краі было прызнана неабходным былыя

---

[844] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 39.

[845] *Селяменёў Д., Бараноўскі І.* Вяртанне нацыянальнага адзінства // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. С. 190.

[846] Дакладная запіска аб стане народнай адукацыі // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 37 ; *Селяменёў Д., Бараноўскі І.* Вяртанне нацыянальнага адзінства. С. 188.

польскія гімназіі і ліцэі замяніць пачатковымі, няпоўнасярэднімі і поўнасярэднімі школамі, уключыць у школьныя праграмы выкладанне беларускай і рускай моў, адкрыць у кожнай вобласці і буйным горадзе па адной беларускай і рускай школе, выдаць новыя падручнікі для школьнага выкарыстання на беларускай, рускай, польскай, яўрэйскай мовах. Выйшла дзяржаўная пастанова аб адмене платы за вучобу як дзецьмі працоўных, так і тых грамадзян, якія лічыліся ўласнікамі пэўнай нерухомасці[847].

У 1939/1940 н.г. у аб'яднанай БССР працавала 5643 школы, з іх у 4278 навучанне ішло на беларускай мове, а ў астатніх 1365 – на рускай, польскай, яўрэйскай і літоўскай мовах. На мовах нацыянальных меншасцей вучылася 11,6 % ад агульнай колькасці вучняў школ[848]. У заходніх абласцях былі адчыненыя 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы і 12 тэхнікумаў. Ва ўсіх абласных гарадах і раённых цэнтрах пачалі выдавацца газеты на беларускай мове, адкрылася 5 драматычных тэатраў і 100 кінатэатраў[849].

Праблема моўнай адукацыі на тэрыторыі заходніх абласцей вырашалася, зыходзячы з наступных момантаў. Сакратар ЦК КПБ Панамарэнка 25.09.1939 г., адзначаючы абстаноўку ў Заходняй Беларусі, падкрэсліў, што ва ўсіх гарадах усё насельніцтва валодае рускай мовай. Сяляне гаварылі на сапраўднай беларускай мове, прычым ужывалі шмат слоў, аб якіх у БССР пераконвалі, што яны выдуманы нацдэмамі: "Нацдэмы маглі выдумаць у літаратуры, але народу прышчапіць не маглі, тым больш заходнім беларусам". Сярод насельніцтва Польшчы, нават у яўрэяў, карыстаецца папулярнасцю Пілсудскі[850].

Красамоўнай палітызаванай заявай на карысць новай улады выглядае выступ (не адзінкавы ў той час) студэнта Рудніцкага – яўрэя, які выступаў на сходзе студэнтаў 09.10.1939 г. на яўрэйскай мове: "Упершыню за гады існавання былой польскай дзяржавы нацыянальныя меншасці маюць магчымасць гаварыць і вучыцца на сваёй роднай мове. Дзякуй таварышу Сталіну, які накіраваў у Заходнюю Беларусь Чырвоную Армію, якая назаўжды вызваліла народы Заходняй Беларусі ад ярма і кабалы польскіх паноў"[851]. Як вынік, у 1939–1940 гг. толькі ў Заходняй Беларусі было адкрыта 150 яўрэйскіх школ. Дзякуючы ім у перадваенныя гады адукацыйны ўзровень яўрэяў значна павялічыўся. У 1939 г. на 1000 чалавек яўрэйскага насельніцтва даводзілася 205 асобаў з вышэйшай і сярэдняй (поўнай і няпоўнай) адукацыяй. Па гэтым паказчыку яўрэі займалі другое месца і саступалі толькі рускім[852].

Адкрыццё інстытутаў і вучылішчаў у Заходняй Беларусі садзейнічала не толькі вырашэнню педагагічных кадравых праблем, але і павышэнню

---

[847] *Селяменёў Д., Бараноўскі І.* Вяртанне нацыянальнага адзінства. С. 188.

[848] *Лыч Л.М.* Ликвидация экономического и социально-культурного неравенства союзных республик: На примере БССР (1917–1941). С. 247.

[849] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 40.

[850] Ліст сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі І.В. Сталіну аб становішчы ў Заходняй Беларусі // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 18–19.

[851] Аператыўная зводка аб настроях насельніцтва // Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 33.

[852] *Батяев В.Ф.* Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей) // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. С. 71.

аўтарытэту савецкай улады, якая дала магчымасць атрымаць сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю. Усё гэта дазваляла савецкаму кіраўніцтву вырашыць галоўную задачу – саветызаваць заходнебеларускае насельніцтва.

Улічваючы, што новую ўладу падтрымлівала беларускае сялянства, яна адміністратыўна-каманднымі метадамі павялічвала колькасць студэнтаў-беларусаў у навучальных установах.

Даследчык А. Трафімчык нават адзначае, што сутнасць нацыянальнай вышэйшай школы пры адкрыцці інстытутаў у заходніх абласцях БССР была ўтрыравана. Пры паступленні ўвага надавалася нацыянальнасці і сацыяльнаму паходжанню. Прадметы ў ВНУ і сярэднеспецыяльных навучальных установах выкладаліся на рускай мове, што ўплывала на выбар насельніцтва на карысць рускіх школ. Бацькі жадалі вучыць дзяцей не на роднай мове, а на найбольш “перспектыўнай” рускай[853].

У 1940 г. у 4 заходнебеларускіх інстытутах (Пінск, Баранавічы, Беласток, Гродна) небеларусаў у складзе абітурыентаў было ў сярэднім каля 68 %. У Беластоцкім ДПІ працэнт нацменшасцей на асобных факультэтах даходзіў да 84, 44 % (гл. табліцу 22). Але ўлады разлічвалі прыняць беларусаў не менш за палову.

Табліца 22 – Нацыянальны склад Беластоцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута першага года навучання (1939/40 н. г.)[854]

| **Назва факультэта** | **Усяго** | **Бел.** | **Пал.** | **Рус.** | **Яўр.** | **Укр.** | **Працэнт нацменшасцей** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Фізіка-матэматычны | 90 | 14 | 17 | 4 | 53 | 2 | 84,44 |
| Літаратурны | 94 | 26 | 14 | 11 | 43 | – | 72,34 |
| Замежных моў | 85 | 28 | 12 | 22 | 23 | – | 67,05 |
| Усяго | 269 | 68 | 43 | 37 | 119 | 2 | 74,72 |

Акрамя як у настаўніцкім інстытуце ў Баранавічах, пераважалі заявы ад яўрэяў, якія і складалі большую частку інтэлігенцыі на далучаных тэрыторыях. Малую колькасць пададзеных заяў ад палякаў А. Трафімчык тлумачыць, з аднаго боку, непрыняццем імі савецкай улады і яе новаўвядзенняў, з другога – уціскам і нават рэпрэсіямі супраць палякаў як прадстаўнікоў былога рэжыму. У выніку адміністратыўных мер з боку партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва да лета 1940 г. колькасць беларусаў была павялічана ў 2 разы, а яўрэяў паменшана ў 2 разы. Так, у трох педагагічных вучылішчах Беластоцкай вобласці (Беласток, Гродна, Ваўкавыск) з 545 навучэнцаў беларусаў было 275 чалавек (50,5 %), яўрэяў 212 чалавек (38,9 %)[855].

[853] *Трафімчык А.* Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у заходніх абласцях БССР (1939–1941гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 10. С. 29 ; Яго ж. Станаўленне савецкай сістэмы школьнай асветы ў заходніх абласцях БССР і яе асаблівасці на Гарадзеншчыне (1939–1941) // Гарадзенскі социум 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст. Гродна, 2014. С. 293–303

[854] Падлічана па: *Трафімчык А.* Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у заходніх абласцях БССР (1939–1941гг.). С. 27.

[855] Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў у заходніх абласцях БССР (1939–1941гг.). С. 26–27.

Камуністычныя ўлады надавалі ўвагу і іншым бакам нацыянальнага развіцця заходняга рэгіёна. У 1940 г. у Беластоку працавалі дзяржаўны польскі і яўрэйскі драматычныя тэатры. Польскі тэатр у 1939–1940 гг. дзейнічаў спачатку ў Гродна, затым ў Беластоку[856]. Дазваляліся пастаноўкі толькі на рэвалюцыйна-камуністычную тэматыку. 02.12.1939 г. быў створаны абласны рускі драматычны тэатр у Брэсце[857]. Там жа мясцовае партыйна-савецкае кіраўніцтва 13.01.1940 г. разгледзела пытанне аб адкрыцці абласнога яўрэйскага драматычнага тэатра[858].

Увосень 1940 г. грамадскасць рэспублікі шырока адзначала 85-я ўгодкі са дня смерці Адама Міцкевіча. Вечары памяці прайшлі ў Мінску, Беластоку, Гродна, а ў Наваградку быў адчынены музей паэта. 16.04.1941 г. бюро ЦК КП/б/Б прыняло рашэнне аб стварэнні ў Гродна музея польскай літаратуры імя Элаізы Ажэшкі. Варта адзначыць, што на з'яўленне нацыянальных польскіх школ, тэатра, музея А. Міцкевіча паўплывала змена знешнепалітычнага становішча.

Новыя ўлады Заходняй Беларусі дзялілі культурную работу на некалькі накірункаў, сярод якіх сваё месца было адведзена дзеячам літаратуры. У канцы 1939 г. старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР М. Лынькоў накіраваў у ЦК КПБ даведку аб заходнебеларускіх празаіках, паэтах, выдаўцах. Дакумент складаецца з некалькіх частак, прысвечаных асвятленню літаратурных асобаў розных нацыянальнасцей. Сярод іх: беларускія літаратары – М. Танк, П. Пестрак, Н. Тарас, М. Засім, А. Іверс, М. Машара; польскія літаратурныя дзеячы – К. Анзельм, Я. Бранеўская, Г. Селем, Э. Бойе, А. Мазурэк; яўрэйскія пісьменнікі – Э. Каганоўскі, В. Геллер, М. Гросман, Рубінштэйн, Рашкін, Маргентой. Былі разгледжаны пытанні ўтварэння польскага сектара ў дзяржвыдавецтве рэспублікі, пашырэння выдання яўрэйскага літаратурна-мастацкага часопіса "Штэрн", выдзялення заходнебеларускім пісьменнікам матэрыяльнай дапамогі, кватэр. Як адзначаюць даследчыкі Д. Селямянёў і І. Бараноўскі, за ўвагу да сябе творчыя людзі Заходняй Беларусі, асабліва музыканты, аказалі ўсходнікам падзяку шэрагам канцэртаў, якія перасягнулі нават межы БССР. Першым сярод такіх гасцей аказаўся таленавіты музыкант Эдзі Рознер са сваім вядомым джаз-аркестрам. Славуты музыкальны калектыў, аб якім многа чулі ў СССР, пабываў з гастролямі ў 1939–1940 гг. у Маскве, Ленінградзе, Адэсе, дзе паказаў сябе, як сведчылі газеты таго часу, на высокім мастацкім узроўні[859].

Культурная праца мела два колеры: нацыянальны і інтэрнацыянальны. Ролю апошняга выконвала шырокае распаўсюджванне ў школах, дзяржаўных установах, побыце рускай мовы, на якую ўскладваліся функцыі міжнацыянальных і міждзяржаўных зносін. Інтэрнацыянальны фактар праяўляўся і ў нацыянальным складзе спецыялістаў, прыбыўшых у 1939–1940 гг. у Заходнюю Беларусь для выканання тут "дапаможных работ" па ўвядзенні новага дзяржаўнага ладу,

---

[856] Ліст дырэктара Польскага тэатра БССР І.Ламакінай І.Сталіну аб становішчы ў тэатры // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 212–214.
[857] Аб стварэнні абласнога рускага драматычнага тэатра // ДАБр. Ф. 1. Воп. 1б. Спр. 1. Арк. 7 ; План абласнога рускага тэатра ў Брэсце на 1940 г. // Там жа. Спр. 5. Арк. 19–20.
[858] Аб арганізацыі абласнога яўрэйскага драмтэатра // Там жа. Спр. 5. Арк. 20.
[859] *Селяменёў Д., Бараноўскі І.* Вяртанне нацыянальнага адзінства. С. 186–187.

фарміраванні новых сацыяльна-класавых адносін.

Тут прыведзены нешматлікія прыклады развіцця нацыянальна-духоўнай сферы, але і яны пераканаўча сведчаць аб тым, што кіраўніцтва рэспублікі, мясцовыя партыйныя і савецкія органы, каб замацаваць сваю ўладу, імкнуліся развіваць культуру, духоўныя асаблівасці нацыянальных меншасцей.

**Фарміраванне кіруючага апарату.** Ён падбіраўся адміністратыўным шляхам, з улікам нацыянальнага складу насельніцтва, а таксама пераводам на кіруючыя і адказныя пасады (нават на дробныя) у Заходнюю Беларусь асобаў з усходу. Якімі, часам, замяняліся мясцовыя кадры, у тым ліку з прадстаўнікоў нацменшасцей. Менавіта "усходнікі" сталі асновай новай сістэмы кіравання[860].

У кіруючым апараце новай улады ў Заходняй Беларусі пераважалі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Возьмем у якасці прыкладу дзяржаўны апарат. У звестках аб кадравым складзе Беластоцкага гарвыканкама 1939 г. адзначаецца наступнае размеркаванне па нацыянальнасцях: сярод 20 загадчыкаў аддзеламі прадстаўнікі нацменшасцей складалі 65 % (7 беларусаў, 5 яўрэяў, 7 рускіх, 1 іншай нацыянальнасці); сярод 4 членаў прэзідыуму было 2 беларусы (50 %), 1 паляк, 1 яўрэй; з 15 работнікаў гарадскога аддзела адукацыі 66,7 % былі з ліку прадстаўнікоў не тытульнай нацыі (5 беларусаў, 4 палякі, 5 яўрэяў, 1 рускі); такіж працэнт нацменшасцей быў сярод 6 работнікаў гарадскога аддзела аховы здароўя (2 беларусы, 2 палякі, 2 яўрэі); з 9 работнікаў апарату кіравання гарадскім гандлем было 55,6 % нацменшасцей (4 беларусы, 4 яўрэі, 1 рускі)[861].

А вось якая карціна па так званых спецыяльных органах (гл. табліцу 23). Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 37,5 % ад агульнай колькасці супрацоўнікаў міліцыі, 43,4 % работнікаў абласной пракуратуры, 65,8 % кадраў упраўлення юстыцыі і толькі 31,2 % работнікаў, якія адносіліся да ліку "абарончых кадраў".

На пачатак 1940 г. у Беластоцкай вобласці (у склад якой уваходзілі Гродна і значная частка сённяшняй Гродзенскай вобласці) сярод сакратароў першасных арганізацый КП(б)Б прадстаўнікоў нацменшасцей было 62,2 %, а менавіта: рускіх – 46,6 %, яўрэяў – 7,8 %, украінцаў – 3,7 %, палякаў – 2,3 %, іншых – 1,8 %[862]. Гэта былі, на думку цэнтральных уладаў, найбольш правераныя кадры, на якія ўскладалася непасрэдная праца па сацыялістычных пераўтварэннях у краі.

---

[860] *Струнец С.И.* Особенности советской национально-кадровой политики при формировании представительных органов власти западных областей БССР в 1939–1941 гг. // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. 2012. № 3. С. 34 ; *Понуждаев Д.Н.* Советская рабоче-крестьянская милиция в устранении политической оппозиции на территории Западных областей БССР в конце 1939 – первой половине 1941 г. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2013. № 2. С. 59

[861] *Розенфельд У.Д.* Этнонациональные процессы в Западной Беларуси (1939 г.). С. 99–100.

[862] Склад сакратароў першасных партарганізацый згодна нацыянальнасці ў Беластоцкай вобласці // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 137.

Табліца 23 – Нацыянальны склад работнікаў міліцыі, суда, пракуратуры і абаронных кадраў Беластоцкай вобласці на пачатак 1940 г.[863]

| | Усяго | Рус. | Бел. | Пал. | Укр. | Яўр. | Нем. | Татар. | Арм. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Міліцыя | 1714 | 352 | 1071 | 70 | 32 | 188 | | 1 | |
| Абласная пракуратура | 106 | 27 | 60 | 1 | 3 | 13 | | 1 | 1 |
| Упраўленне юстыцыі | 196 | 34 | 67 | 41 | 4 | 48 | 1 | 1 | |
| Абаронныя кадры | 32 | 6 | 22 | 1 | 1 | 2 | | | |

Можна параўнаць з нацыянальным складам адной з усходніх абласцей. У складзе сакратароў першасных арганізацый Магілёўскай абласной арганізацыі ў 1941 г. нацменшасці складалі 33,2 %, з іх : яўрэяў – 22,3 %, рускіх – 6,6 %, іншых – 4,3 % [864].

У Вілейскай вобласці (май 1941) з 310 чалавек кіруючых кадраў раёнаў нацменшасці складалі 37,1 % (195 беларусаў, 41 яўрэй, 59 рускіх, 3 палякі, 13 іншых), з 21 сакратара па кадрах 57,15 % былі небеларусамі (9 беларусаў, 5 рускіх, 5 яўрэяў, 2 іншых), з 20 загадчыкаў ваеннымі аддзеламі нацменшасці складалі 55 %, з 21 райгарпракурораў – 57,15 %. У той жа час з 21 старшыні выканкамаў райсаветаў нацменшасці складалі толькі 28,6 %[865].

Адзначаючы шырокае прадстаўніцтва нацменшасцей у кіруючым апараце новай улады, можна заўважыць іх меншае прадстаўніцтва ў органах правапарадку і падаўлення. Гэта выклікана адміністратыўнымі шляхамі фарміравання ўладнай наменклатуры.

У дзяржаўных органах заходніх абласцей БССР былі прадстаўлены ўсе нацыянальнасці і часцяком (не заўсёды, праўда, карэктна) у прапорцыях, якія адпавядалі колькаснаму складу народаў, што пражывалі на гэтых тэрыторыях.

Падцвярджэнне гэтаму можна знайсці ў выніках выбараў як у цэнтральныя выбарныя органы ўлады, так і, для прыкладу, у мясцовыя прафсаюзныя органы.

У 1940 г. у Вярхоўны савет СССР і Вярхоўны савет БССР у заходніх абласцях БССР было выбрана: беларусаў – 136 чал. ці 67,3 %; рускіх – 33 ці 16,3 %; украінцаў – 4 ці 2 %; яўрэяў – 12 ці 6 %; палякаў – 15 ці 7,4 %; грузінаў – 1 ці 0,5 %; літоўцаў – 1 ці 0,5 %[866].

---

[863] Дакладная запіска па нацскладзе работнікаў па абласному ўпраўленню // ДАГАГр. Ф. 6195. Воп. 1. Спр. 12. Арк. 106.

[864] Справаздачы. Нацсклад // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 2а. Спр. 194. Арк. 82 ; *Пушкин И.А.* Роль и значение национальных меньшинств в партийно-советском руководстве Могилёвщины. С. 389.

[865] Падлічана па : Даведка аб нацыянальным складзе кіруючых кадраў // “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…”. С. 249.

[866] Дакладная запіска аб выніках выбараў // “Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…”. С. 165.

Паказальная ў гэтым стаўленні карціна вынікаў выбараў у новыя прафсаюзы (фабзаўкомы) – самыя распаўсюджаныя органы самакіравання (па нацыянальным складзе): прафсаюз працоўных ваўнянай прамысловасці (усяго 300 чалавек): беларусаў – 67 (22,3 %), палякаў – 112 (37,3 %), яўрэяў – 89 (29,7 %), рускіх – 29 (9,7 %), іншых нацыянальнасцей – 3; прафсаюз лесапільнай і дрэваапрацоўчай прамысловасці (усяго 185 чалавек): беларусаў – 101 (54,6 %), палякаў – 35 (19,0 %), яўрэяў – 37 (20 %), рускіх – 12 (6,5 %); прафсаюз гарбароў (усяго 118 чалавек): беларусаў – 31 (26,3 %), палякаў – 15 (12,7 %), яўрэяў – 59 (50,0 %), рускіх – 5 (4,2 %), іншых нацыянальнасцей – 8; прафсаюз харчовай прамысловасці (усяго 207 чалавек): беларусаў – 43 (20,8 %), палякаў – 47 (22,7 %), яўрэяў – 103 (49,8 %), рускіх – 10 (4,8 %), іншых нацыянальнасцей – 4; прафсаюз пачатковай і сярэдняй школы (усяго 96 чалавек): беларусаў – 22 (22,9 %), палякаў – 50 (52 %), яўрэяў – 19 (19,8 %), рускіх – 3 (3,1 %), іншых нацыянальнасцей – 2; прафсаюз чыгункі (усяго 549 чалавек): беларусаў – 304 (55,4 %), палякаў – 6 (1,1 %), яўрэяў – 112 (20,4 %), рускіх – 124 (22,6 %), іншых нацыянальнасцей – 3[867].

Прадстаўленая выбарка сведчыць фактычна аб стыхійным характары выбараў у фабзаўкомы. Таму і нацыянальны склад абраных кадраў быў не прапарцыйным складу прадстаўленых ім народаў. У дакладной запісцы Беластоцкага абкама ў ЦК КП(б)Б, падводзячы вынікі прафсаюзных выбараў, адзначаецца, што выбрана 363 фабзаўкома прафсаюзаў з колькасцю членаў 2045 чалавек, па нацыянальным складзе: беларусаў – 724 (35 %), яўрэяў – 623 (31 %), палякаў – 424 (21 %), рускіх – 222 (11 %). Ён сведчыў і аб нацыянальнай талерантнасці ў краі. Аднак гэтае натуральнае волевыяўленне народаў пры выбарах прафсаюзных арганізацый было пасля прызнана няправільным, якое не адпавядае мэтам новай улады і таму патрабуе карэкцыі. Напрыклад, у лісце першага сакратара Беластоцкага абкама ў ЦК КП(б)Б у 1941 г., рэтраспектыўна адзначалася, што "абласныя камітэты прафсаюзаў былі створаныя ў канцы 1939 г. без дастатковага ў той час вывучэння прафсаюзнага актыву, з прычыны чаго ў прафсаюзныя органы прайшоў шэраг асобаў, якіх немэтазгодна пакідаць у кіраўніцтве па дзелавых і палітычных меркаваннях"[868]. Стаўка рабілася на беларусаў і асобаў прысланых на працу з усходняй часткі БССР і іншых рэгіёнаў СССР.

Для ўмацавання партыйна-савецкай наменклатуры і безумоўнага выканання ўсіх рашэнняў і загадаў цэнтральных органаў улады, да 1940 г. у заходнія вобласці БССР ЦК КП(б)Б накіраваў 16359 работнікаў, з іх беларусаў – 6937 (42,4 %), прадстаўнікі нацменшасцей склалі – 57,6 %; членаў і кандыдатаў КПБ – 9968 чал., членаў УЛКСМ – 4379, у асноўным беларусаў, украінцаў і рускіх, беспартыйных – 2012. Найбольш работнікаў у гаспадарча-кааператыўную сферу – 6498, затым НКУС – 4430, на савецкую работу – 2558, у партыйныя органы кіравання – 2070 чал. Па так званых пуцёўках 951 чалавек,

[867] Падлічана па: *Розенфельд У.Д.* Этнонациональные процессы в Западной Беларуси (1939 г.). С. 99–100.
[868] *Розенфельд У.Д.* Этнонациональные процессы в Западной Беларуси (1939 г.). С. 101.

у тым ліку небеларусаў – 42,5 %[869]. Пры камплектаванні органаў кіравання і падтрымання парадку заходніх абласцей БССР ад пачатку замацаваўся класава-нацыянальны падыход, у выніку фармаваўся ідэйна моцны, у пераважнай большасці не звязаны сваяцкімі сувязямі і нацыянальным адзінствам апарат кіравання.

**Адносіны да партый і легальнай прэсы, змены ў эканамічным і сацыяльным жыцці.** Нацыянальныя партыі забараняліся. Межы Заходняй Беларусі вымушаныя былі пакінуць лідэры і актыўныя прыхільнікі нацыяналістычных партый і арганізацый, у тым ліку і беларускіх, якія былі заўзятымі праціўнікамі знаходжання Беларусі ў складзе СССР.

Пасля 1939 г. у рэспубліцы выдаваліся газеты на польскай мове: у Мінску штодзённая грамадска-палітычная газета "Штандар Вольнасці" ("Сцяг свабоды"), у Граева – "Новае жыццё". На польскай і беларускай мовах выходзіла газета "Новая Ломжа". У Заходняй Беларусі частка наклада абласной газеты "Свабодная праца" (5 тыс. асобнікаў – 20 %) выдавалася на польскай мове (1940). Газета "Беластокер Штэрн" ("Беластоцкая зорка") на яўрэйскай мове (1940 г., 6 тыс. асобнікаў)[870]. Газеты на мовах нацыянальных меншасцей з-за малых накладаў былі маладаступнымі і не аказвалі вялікага ўплыву на грамадскае жыццё нацыянальных груп.

Змены ў эканамічным і сацыяльным жыцці характарызаваліся нацыяналізацыяй, правядзеннем калектывізацыі, барацьбой з рэлігіяй і звязанымі з імі палітычнымі рэпрэсіямі, некалькімі (чатыры) буйнымі дэпартацыямі насельніцтва ў лютым, красавіку і чэрвені 1940 г., а таксама ў маі-чэрвені 1941 г. Трэба адзначыць наступнае, на падставе даступных дакументаў польскі даследчык Д. Бацькоўскі сцвярджае, што прадстаўленыя гісторыкамі-эмігрантамі і часткай даследчыкаў, а таксама былымі высланымі людзьмі, ацэнкі, якія кажуць пра, самае меншае, мільён дэпартаваных грамадзян Другой Рэчы Паспалітай (палякаў, яўрэяў, беларусаў, украінцаў), не знаходзяць пацвярджэння ў крыніцах[871].

Эканамічныя змены ў Заходняй Беларусі прывялі да таго, што бяднейшыя слаі насельніцтва атрымалі зямлю, у гарадах ліквідоўвалася беспрацоўе, адбылася нацыяналізацыя прамысловасці і банкаўскай сферы. Апошняе прывяло да развіцця нацыянальных і сацыяльных супярэчнасцей. Адбылося адхіленне ад уласнасці значнага ліку ўладальнікаў фабрык, заводаў і майстэрняў, а гэта ў асноўным былі прадстаўнікі польскага і яўрэйскага насельніцтва[872].

Правядзенне калектывізацыі ў вёсцы таксама прывяло да абвастрэння нацыянальна-палітычнага супрацьстаяння. Палітыка ліквідацыі кулакоў выклікала

---

[869] Звесткі ЦК КП(б)Б аб колькасці работнікаў, накіраваных у заходнія вобласці БССР // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 219 ; *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 37 ; *Селяменеў Д., Бараноўскі І.* Вяртанне нацыянальнага адзінства. С. 189–190.
[870] Пастановы ЦК КП(б)Б аб выданні газет // "Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі…". С. 152–153.
[871] *Boćkowski Daniel.* Deportacje ludności z zachodnich obwodów Białoruskiej SRR w głąb ZSRR w latach 1939–1941 // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 271–281.
[872] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 37.

асабліва рэзкі супраціў з боку польскіх вайскоўцаў, каланістаў-асаднікаў, абшарнікаў і шляхты. Сярод асаднікаў былі і беларусы, прадстаўнікоў нацменшасцей было – 95,1 %[873]. Да іх сем'яў былі прадпрынятыя рэпрэсіўныя меры. Асаднікі, ляснікі і ўцекачы, хто не прыняў савецкае грамадзянства, былі высланыя ўпачатку 1940 г. ва ўсходнія і паўночныя раёны СССР[874]. Дадзеная палітычная акцыя закранула не толькі польскую частку насельніцтва, але і ўсе іншыя нацыянальнасці, якія пражывалі ў заходніх рэгіёнах БССР і па тых або іншых прычынах не падзялялі існуючай палітычнай сістэмы. На красавік 1941 г. сярод іх было асаднікаў 107312 чал.: палякаў – 88654 (82,6 %), яўрэяў – 179 (0,16 %), украінцаў – 7811 (7,25 %), немцаў – 152 (0,14 %), беларусаў – 9002 (8,4 %), іншых нацыянальнасцей – 1514 (1,45 %)[875].

Частка нямецкага насельніцтва добраахвотна-прымусова пакінула тэрыторыю Заходняй Беларусі згодна падпісанага 16.11.1939 г. савецка-нямецкага пагаднення аб узаемным перасяленні з СССР асобаў нямецкай нацыянальнасці, а з вобласці дзяржаўных інтарэсаў Германіі (акупіраванай тэрыторыі Польшчы) – асобаў украінскай, беларускай і рускай нацыянальнасцей[876].

У Беларусі перасяленне немцаў ажыццяўлялася пераважна з Беластоцкай і Брэсцкай абласцей. Аналізуючы перасяленчую акцыю, даследчык А. Вялікі падкрэслівае, што ў пагадненні ад 16.11.1939 г. дэкларавалася, што “эвакуацыя з'яўляецца добраахвотнай”, аднак умовы яе правядзення былі далёкімі ад добраахвотнасці. Фактычна людзям не пакінулі ні выбару, ні часу. Для нямецкіх каланістаў, якія пражывалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі (у Столінскім раёне, Бельску, Беластоку, Ізорцы ды іншых гарадах і мястэчках), не было шанцаў застацца ў Беларусі, бо органы НКУС разглядалі ўсіх немцаў як патэнцыяльных ворагаў, своеасаблівую “пятую калону” ў прыгранічнай тэрыторыі. Так, нарком НКУС Л. Цанава паведамляў першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку наступнае (студзень 1940): “Па даных НКУС БССР, у гэтым раёне (Столінскім

[873] Склад асаднікаў у Заходняй Беларусі // ДАБр. Ф. 7580. Воп. 1. Спр. 29. Арк. 27.

[874] *Блада Б.* Дэпартацыі польскага насельніцтва ў глыб СССР у 1939-1941 гг. // Дэпартацыя як сацыяльная праблема: Тэматычны зборнік навуковых прац. Брэст, 1997. С. 28–31 ; *Багровіч А.* Жыхарства Беларускае ССР у святле перапісу 1959 г. Нью-Ёрк, Мюнхен, 1962. С. 31 ; *Пушкін І.* Дэпартацыі і перасяленні ў БССР у 1920–1930-я гг. С. 21–22.

[875] Падлічана па: *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 38.

[876] Для правядзення перасялення была створана Змешаная савецка-германская камісія і прызначаны ўпаўнаважаныя. У Заходняй Беларусі савецкія ўпаўнаважаныя размяшчаліся ў Гродне, Баранавічах, Навагрудку, Беластоку, Брэсце. Да месца свайго прызначэння савецкія ўпаўнаважаныя прыбылі 20–22 лістапада, але да канца снежня не пачыналі працу з-за “адсутнасці даных аб колькасці чалавек, якія належаць эвакуацыі і ўладкаванню”. На самой справе Перасяленчае ўпраўленне першапачаткова не ўяўляла, колькі чалавек можа перасяліцца ў СССР з тэрыторыі, якая ўвайшла ў “сферу інтарэсаў Германіі”. Савецкі Саюз меў намер прыняць каля мільёна чалавек. Германскі бок ацэньваў колькасць немцаў на тэрыторыях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на парадак менш – каля 100 тыс. чалавек. Немцы практычна не памыліліся ў сваіх разліках. Дакладныя даныя аб колькасці ўкраінцаў, беларусаў, рускіх, якіх намерваўся прыняць Савецкі Саюз, вызначыліся толькі 24.01.1940 г. У гэты дзень у наркома замежных спраў СССР В. Молатава адбылася нарада з яго намеснікамі, на якой разглядалася адно пытанне: “Аб ходзе работы па эвакуацыі нямецкіх каланістаў і рабоце нашых упаўнаважаных на германскай тэрыторыі”. Ні аб якім мільёне эвакуіруемых, якіх, паводле папярэдніх разлікаў Перасяленчага ўпраўлення, планавалася прыняць у СССР, гаворка не ішла. Савецкі Саюз, каб “зняць дрэннае ўражанне немцаў”, пагадзіўся прыняць усяго каля 20 тыс. чалавек. *Вялікі А.Ф.* Савецка–германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі // Весці БДПУ. Серыя 2. 2006. № 3. С. 16.

раёне Пінскай вобласці) знаходзіцца нямецкая калонія “Сафійка”. Агентурнай распрацоўкай каланістаў “Сафійкі” устаноўлена, што значная іх частка настроена варожа ў адносінах да савецкай улады. Гітлераўцы калоніі “Сафійка” сістэматычна збіраюцца дома ў Марціна Рыля, слухаюць радыёперадачы і праводзяць работу сярод немцаў за выезд у Германію. Агентурная справа “Сафійка” актывізуецца з мэтай яе ліквідацыі ў бліжэйшы час”[877].

А. Вялікі спасылаецца на беларускага гісторыка У. Снапкоўскага, паводле дадзеных якога, з акупаванай Германіяй тэрыторыі Польшчы ў Беларусь, на аснове савецка-нямецкага пагаднення аб перасяленні, выехала каля 15 тысяч беларусаў. З Заходняй Беларусі ў Германію выехала каля 25 тысяч немцаў. Адзначым, што з тэрыторыі, якая адышла да СССР, у Германію перасяляліся галоўным чынам немцы. Астатніх немцы лічылі непажаданым “элементам” і не “пускалі” ў Германію. Так, за перыяд працы змешанай савецка-германскай камісіі праз Брэст у Германію выехала (дадзеные па стане на 05.01.1940 г.): немцаў – 5335 чалавек, палякаў – 108, украінцаў – 10, рускіх – 8, чэхаў – 1. Як вынікае з гэтага, ніводны беларус не выехаў у Германію. У той жа час савецкі раённы прадстаўнік па перасяленню адзначаў, што многія палякі выказвалі жаданне перасяліцца ў Германію: “Асобныя жыхары Бельска, палякі, з’яўляюцца ў камісію і патрабуюць, каб іх вывезлі ў Германію. Да таго ж выказваюць рэзкую незадаволенасць савецкай уладай”. Так, жыхар Бельска Ян Касцюк, па нацыянальнасці паляк, 12 снежня з’явіўся ў камісію і заявіў аб сваім жаданні выехаць з СССР. Пры гэтым кажучы: “У час вайны маё сэрца было за немцаў. Калі вы мяне не выпусціце, то я нелегальна перабяруся ў Германію, я не цярплю бальшавікоў”[878].

**Саветызацыя і пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.** Саветызацыя і “камуністычныя” пераўтварэнні выклікалі польскі супраціў. Актыўна падтрымлівала савецкую ўладу толькі невялічкая колькасць палякаў, у асноўным, прыхільнікі камуністаў.

Савецкая ўлада патрабавала не толькі лаяльнасці, але і поўнай пакорнасці ёй. Даследчык С. Сільвановіч звяртае ўвагу на тое, што “палякі павінны былі прагаласаваць за ліквідацыю сваёй дзяржавы і прызнаць сябе савецкімі грамадзянамі, удзельнічаючы ў выбарах у Народны сход у той час, калі многія польскія салдаты яшчэ не вярнуліся дахаты, а асобныя “афіцэрскія банды” уступалі ў сутычкі з савецкімі войскамі ў лясах. Стаўшы савецкімі грамадзянамі, яны набывалі і ўсе выцякаючыя адсюль абавязкі, а іх было значна больш, чым правоў. Больш таго, іх трактавалі не толькі як сённяшніх грамадзян СССР, але і як быўшых такімі ад пачатку свайго жыцця. Судзілі, напрыклад, як контррэвалюцыянераў за ўдзел у палітычным, дзяржаўным і грамадскім жыцці II Рэчы Паспалітай, як здраднікаў – за ўдзел у вайне 1919–1920 гг. Палякі павінны былі выслухоўваць на сходах прамовы, якія абражалі польскую дзяржаву, лад, гісторыю, каштоўнасці, а калі вызначаць – самім гаварыць ці чытаць прамовы,

[877] *Вялікі А.Ф.* Савецка–германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі // Весці БДПУ. Серыя 2. 2006. № 3. С. 17.
[878] Там жа.

ухваляючыя новую ўладу і яе правадыроў. Але не толькі гэта. Савецкая ўлада непасрэдна ўмешвалася ў сферу іх перакананняў. Хрысціянская рэлігія і наогул усякая вера ў Бога высмейвалася на сходах і лекцыях, у школах і друку. У дзяцей знімалі ў школах медалікі і крыжыкі, са сцен школьных класаў знімалі крыжы. Усюды, дзе толькі можна, уводзіліся элементы атэізму. За няўдзел у гэтых публічных мерапрыемствах можна было быць пакараным дадатковымі падаткамі і абавязкамі або проста праслыць ворагам народа, быць арыштаваным, пасаджаным у турму, высланым у лагер. Таму сярод польскага насельніцтва Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гг. сталі праяўляцца розныя формы супраціўлення савецкай уладзе"[879].

Шырока распаўсюджана думка, што менавіта сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні савецкай улады паспрыялі развіццю польскага нацыяналістычнага супраціву[880]. Акрамя таго, нацыянал-патрыятычныя сілы другой Рэчы Паспалітай не жадалі змірыцца з ваенным разгромам і падзелам краіны паміж Германіяй і СССР. У канцы 1939 г. на тэрыторыі гістарычнай Польшчы, а таксама абшарах Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, пачалося стварэнне падпольных арганізацый і груп. Мэтай змагання польскага нацыяналістычнага падполля было ўзнаўленне польскай дзяржаўнасці ў межах, існаваўшых да верасня 1939 г.

Працэс стварэння польскага падполля ў Беларусі быў непасрэдна звязаны з дзейнасцю падпольных арганізацый на тэрыторыі этнічнай Польшчы. Ужо 25.09.1939 г., напярэдадні акупацыі Варшавы войскамі вермахта, рашэннем вышэйшых афіцэраў Войска Польскага была створана першая і найбольш моцная сярод іх "Служба звыценству Польскі" (СЗП – "Служба Перамогі Польшчы"). Яе камендантам быў прызначаны генерал-брыгадзір Міхаіл Карашэвіч-Такаржэўскі. У лістападзе 1939 г., калі ўсталявалася сувязь фарміраванняў СЗП з Парыжам, дзе да капітуляцыі Францыі знаходзіўся польскі эміграцкі ўрад, яго кіраўнік У. Сікорскі даў даручэнне генералу К. Сасноўскаму стварыць на падставе СЗП усепольскую ваенную арганізацыю – Саюз узброенай барацьбы ("Звёнзек валькі збройнэй"), які з лютага 1942 г. быў перайменаваны ў Армію Краёву (АК)[881]. Актыўна дзейнічалі арганізацыі "Стралецкі звяз", "Батальёны смерці" і інш.[882]

Маючы пэўную апору сярод польскага насельніцтва заходніх абласцей рэспублікі, канспіратыўная сетка польскага супраціву атрымала досыць

[879] *Сільвановіч С.* Палітыка савецкіх улад у адносінах да польскага насельніцтва паміж вераснем 1939 і чэрвенем 1941 г. // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. Гродно, 2003. С. 202.

[880] Як адзначаюць беларускія даследчыкі В. Ермаловіч, З. Жумар, Е. Сямашка, некаторыя падпольныя арганізацыі і групы былі сфармаваныя загадзя, яшчэ да польска-германскай вайны, польскім генеральным штабам, прадбачыўшым магчымую акупацыю некаторых раёнаў краіны патэнцыяльным праціўнікам у выніку вайны.

[881] *Ермаловіч В.І.* Дзейнасць саюза ўзброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі (1939–1941 гг.) // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць. С. 191 ; *Сташкевич Н.С.* Польские антисоветские военные формирования в Западной Беларуси (сентябрь 1939–1953 гг.): организационная структура, тактика вооружённой борьбы // Романовские чтения – 6: сб. статей Международной науч. конференции. Могилёв, 2010. С. 16–17.

[882] *Понуждаев Д.Н.* Советская рабоче-крестьянская милиция в устранении политической оппозиции на территории Западных областей БССР в конце 1939 – первой половине 1941 г. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2013. № 2. С. 60

шырокае развіццё. Толькі з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. было створана 109 розных падпольных арганізацый, якія аб'ядноўвалі 3231 удзельніка, з якіх 2904 былі польскай нацыянальнасці. У шэрагах польскага супраціву, нараўне з палякамі, знаходзіліся яўрэі, беларусы, украінцы. Так, у канцы 1940 г. органы НКУС арыштавалі ў Лідзе яўрэя, былога польскага маёра Рыпера. Падчас дазнання ён выдаў усю сетку Лідскага абводу. НКУС арыштавала звыш 200 актыўных удзельнікаў канспіратыўнай сеткі. Гэта быў самы буйны правал польскага падполля напярэдадні вайны 1941–1945 гг.[883]

Цяжка не пагадзіцца з высноваю даследчыка В. Ермаловіча, што, шчыра жадаючы змагацца за свабоду і незалежнасць сваёй айчыны, большасць польскіх патрыётаў так і не здолелі асэнсаваць сапраўдных прычын паражэння краіны і знікнення Другой Рэчы Паспалітай з палітычнай карты свету. Памылкова перадваенны знешнепалітычны курс урада "санацыі" быў заменены на таксама бесперспектыўную "тэорыю двух ворагаў". У сваю чаргу гэта пацягнула за сабой непаслядоўнасць у дзеянні антыгітлераўскіх сіл, перашкаджала выпрацоўцы правільнай тактыкі польскага руху супраціўлення ў час Другой сусветнай вайны і ў канчатковым выніку прывяло яго да палітычнага тупіка[884].

Такім чынам, значны ўплыў на характар міжнацыянальных адносін у Заходняй Беларусі аказвала афіцыйная палітыка Польшчы і СССР. Аналіз асаблівасцяў грамадскага і нацыянальна-культурнага жыцця нацыянальных меншасцей Заходняй Беларусі на першым этапе Другой сусветнай вайны дазваляе нам сцвярджаць наступнае.

Уз'яднанне беларускіх земляў у адзінай савецкай дзяржаве з'явілася найважнейшым палітычным актам у жыцці нашага народа, што паўплывала на карэннае тэрытарыяльна-дзяржаўнае, палітычнае ўладкаванне рэспублікі і нацыянальна-дэмаграфічную сітуацыю ў Беларусі.

У дзяржаўных органах заходніх абласцей БССР былі прадстаўлены ўсе нацыянальнасці і часцяком у прапорцыях, якія адпавядаюць колькаснаму складу народаў, што пражывалі на гэтых тэрыторыях. Кіруючы апарат падбіраўся адміністратыўным шляхам, з улікам нацыянальнага складу насельніцтва, а таксама пераводам на кіруючыя і адказныя пасады (нават на дробныя) у Заходнюю Беларусь асобаў з усходу. Часам, замяняючы імі мясцовыя кадры, у тым ліку прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, адсюль іх меншае прадстаўніцтва ў органах правапарадку і падаўлення.

Кіраўніцтва рэспублікі, мясцовыя партыйныя і савецкія органы, каб замацаваць сваю ўладу імкнуліся развіваць культуру, духоўныя асаблівасці нацыянальных меншасцей. Культурная праца мела два колеры: нацыянальны і інтэрнацыянальны. Ролю апошняга выконвала шырокае распаўсюджванне ў школах, дзяржаўных установах, побыце рускай мовы, на якую ўскладваліся функцыі міжнацыянальных і міждзяржаўных зносін. Інтэрнацыянальны фактар

[883] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 39.
[884] *Ермаловіч В.І.* Дзейнасць саюза ўзброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі (1939–1941 гг.). С. 191.

праяўляўся і ў нацыянальным складзе спецыялістаў, прыбыўшых у 1939–1940 гг. у Заходнюю Беларусь.

Стварэнне нацыянальных культурна-адукацыйных асяродкаў садзейнічала не толькі вырашэнню кадравых праблем, але і павышэнню аўтарытэту савецкай улады, якая дала магчымасць атрымаць сярэднюю і вышэйшую педагагічную адукацыю большасці жыхароў Заходняй Беларусі. Усё гэта дазваляла савецкаму кіраўніцтву вырашыць галоўную задачу – саветызаваць заходнебеларускае насельніцтва.

Ідэалогія класавага падыходу ў рашэнні сацыяльна-палітычных праблем прывяла да нацыянальна-палітычных супярэчнасцей, да ўзнікнення і росту польскага нацыяналістычнага падполля. Таксама незадаволенасць і супраціў выклікала практыка калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Актыўна падтрымлівала савецкую ўладу толькі невялічкая колькасць палякаў, у асноўным, прыхільнікі камуністаў.

Нацыянальныя партыі забараняліся. Межы Заходняй Беларусі вымушаныя былі пакінуць іх лідэры і актыўныя прыхільнікі. Тыя, што засталіся, перайшлі на нелегальныя формы дзейнасці.

Змены ў эканамічным і сацыяльным жыцці, якія характарызаваліся нацыяналізацыяй, правядзеннем калектывізацыі, барацьбой з рэлігіяй суправаджаліся палітычнымі рэпрэсіямі і буйнымі дэпартацыямі насельніцтва.

## 4.2 Асаблівасці палітыкі гітлераўскіх акупантаў у адносінах да нацыянальных меншасцей і іх удзел у калабарацыянісцкім руху ў Беларусі

Аналіз удзелу нацыянальных меншасцей Беларусі ў грамадскім і культурным жыцці падчас вайны мае шэраг складанасцей з-за адсутнасці поўнай дакументальнай базы. Дзейнасць прадстаўнікоў розных этнічных супольнасцей залежыла ад палітыкі гітлераўскіх акупантаў, ва ўмовах тэратарыяльнага падзелу Беларусі. У выніку ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі апынуліся прадстаўнікі розных народнасцей СССР і нават іншых краін, а таму паўстае пытанне ці патрэбна разглядаць іх як прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі. Прычым як ў складзе савецкіх партызан, так і ў складзе рускіх, латышскіх, украінскіх калабарацыянісцкіх (паліцэйскіх) частак. Цяжка паддаецца аналізу ўдзел нацыянальных меншасцей Беларусі ў складзе Чырвонага (савецкага) войска як на тэрыторыі Беларусі падчас ваенных дзеянняў 1941, 1943–45 гг., так і на акупаванай і неакупаванай тэрыторыі СССР. Цяжкасці і складанасці з-за адсутнасці дакладных звестак узнікаюць пры аналізе ўдзелу нацменшасцей БССР у дзейнасці калабарацыйных органаў, антыгітлераўскіх і антысавецкіх аб’яднанняў (АК, “батальёны хлапечыя” і г. д.), арміі генерала У. Андэрса[885].

[885] *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей Беларусі ў падзеях Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.) // Актуальные проблемы современного гуманитарного познания : материалы международной научной конференции, Витебск, 29–30 октября 2009 г. С. 157–160.

Значным унёскам у даследаванне жыцця нацыянальных меншасцей Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі з'явіліся публікацыі і манаграфія Д. Крывашэя[886]. У сваёй манаграфіі аўтар раскрыў характар нацыянальнай палітыкі германскіх акупацыйных уладаў у розных зонах акупацыі Беларусі, прааналізаваў спецыфіку нацыянальна-культурнага становішча народаў краіны, выявіў і асвятліў асноўныя аспекты нацыянальных і этнасацыяльных праблем, якія праявіліся ў жыцці мясцовага насельніцтва ў час Вялікай Айчыннай вайны[887]. Паказаў становішча мясцовых немцаў, палякаў, украінцаў, яўрэяў, рускіх, цыганоў, латышоў і літоўцаў, не абмінуў і татарскую супольнасць. Сцвярджае, што на пачатку акупацыі становішча палякаў у Беларусі можна лічыць лепшым у параўнанні з іншымі этнасамі. Аўтар прыводзіць звесткі пра развіццё ўкраінскай школьнай справы, параўноўваючы яе са станам беларускай і польскай адукацыі, вывучае дзейнасць украінскіх нацыянальна-культурных арганізацый[888].

Прывёўшы архіўныя звесткі пра становішча рэйхсдойчэ і фольксдойчэ, Д. Крывашэй рашуча абвяргае міф пра існаванне ў Беларусі ў час вайны нямецкай "пятай калоны"[889]. Гэта пацвярджаюць факты і па ўсходу Беларусі. У прыватнасці, па Нараўлянскім раёне Гомельскай вобласці, дзе калісьці існаваў нямецкі нацыянальны сельсавет. Падчас вайны там ніхто з мясцовых немцаў на бок гітлераўцаў не перайшоў. Больш таго, напрыклад, Мерцін В.Г. змяніў прозвішча на Маркіна У.Я., каб пайсці дабраахвотнікам на фронт, бо немцаў не бралі ў Чырвоную Армію[890]. У манаграфіі аўтар робіць выснову, што векавыя традыцыі талерантнага стаўлення да чужой самабытнасці, якія былі выпрацаваны на тэрыторыі Беларусі, спрыялі краху палітыкі акупантаў, скіраванай на культываванне этнічнай напружанасці. Простае насельніцтва не цікавілася палітычнымі гульнямі калабарантаў, яно вымушана было супольна шукаць шляхі выжывання ў драматычных умовах вайны[891].

Паважаючы манаграфію Д. Крывашэя як грунтоўнае даследаванне грамадскага і культурнага жыцця нацыянальных меншасцей і публікацыі Я. Грэбеня[892], Я. Мірановіча[893], А. Цымбала[894] аб стане эканомікі і працоўнай

[886] *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). Мінск, 2009 ; *Яго ж.* Нацыянальныя меншасці Беларусі ў гады нямецкай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006. С. 104–108.

[887] Д. Крывашэй свядома адмовіўся ад вывучэння ўдзелу прадстаўнікоў розных нацыянальных меншасцей у партызанскім руху, дзейнасці нацыяналістычных (літоўскіх і латышскіх) паліцэйскіх батальёнаў на тэрыторыі акупаванай Беларусі і толькі ўскосна закрануў пытанне пра дзейнасць Арміі Краёвай і рускіх калабарацыяністцкіх узброеных фарміраванняў (казацкіх атрадаў, Рускай вызваленчай арміі і інш.).

[888] *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 95–98, 102–106.

[889] Там жа. С. 39.

[890] Ліст упаўнаважанага савета па справах рэлігій па Гомельскай вобласці А. Ятчэнка ад 12.11.1974 г. на імя Упаўнаважанага савета па справах рэлігій пры СМ СССР па БССР А. Залескаму // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36. Арк. 101.

[891] *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 167.

[892] *Гребень Е.А.* Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.). Минск, 2016 ; *Яго ж.* Предпринимательская деятельность населения в период нацистской оккупации Беларуси // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. 2015. № 9. С. 149–155 ;

паўсядзённасці ў час гітлераўскай акупацыі Беларусі, мы прыпынемся на некаторых аспектах. Яны дазволяць, у цэлым, асвятліць ролю і значэнне прадстаўнікоў нацменшасцей у падзеях вайны. На нашу думку, грамадскае і культурнае жыццё Беларусі часоў гітлераўскай акупацыі выяўляецца, з аднаго боку, як барацьба з гітлераўскімі захопнікамі, з другога – супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі.

**Палітыка гітлераўскіх акупантаў у адносінах да нацыянальных меншасцей.** Раніцай 22.06.1941 г. гітлераўская Германія напала на СССР. Пачалася вайна, у якой размова шла не аб захаванні сацыяльнага ладу ці нават дзяржаўнасці, а аб фізічным існаванні народаў, якія жылі ў СССР. У Беларусі пад акупацыяй засталіся каля 8 млн жыхароў і 900 тыс. ваеннапалонных. Згодна планаў ваенна-тэрытарыяльнага падзелу акупаваных рэгёнаў СССР, германскія акупацыйныя ўлады імкнуліся раздрабніць этнічную цэласнасць Беларусі. У выніку такога ваенна-палітычнага падыходу беларуская тэрыторыя была падзеленая і ўвайшла ў розныя тэрытарыяльна-акупацыйныя адзінкі.

Усходнія раёны (Віцебшчына, Магілёўшчына, амаль уся Гомельшчына) з’яўляліся часткай тылу групы армій “Цэнтр.” Цэнтральныя раёны належылі да генеральнай акругі “Беларусь” рейхскамісарыята “Остланд”. Частка паўночна-заходніх аднесена да генеральнай акругі “Літва”. Заходнія раёны Гродзеншчыны, Беласточчына, паўночныя раёны Брэстчыны былі ўключаны ў акругу “Беласток”, якая з’яўлялася часткай Усходняй Прусіі. Паўднёвыя раёны тагачасных Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей увайшлі ў рэйхскамісарыят “Украіна”.

Падзеі вайны 1941–1945 гг. значна абвастрылі нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў акупаванай Беларусі. На тэрыторыі Беларусі акупацыйныя ўлады здзяйснялі нацыянальную палітыку, якая была накіравана на дамінаванне германскай расы, анямечванне і эксплуатацыю часткі славянскага насельніцтва (у сувязі з гэтым дазвалялася пэўная сацыяльна-эканамічная і культурна-грамадская дзейнасць мясцовага насельніцтва), генацыд (яўрэяў, цыганоў). Акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі тактыку “падзяляй і ўладай”. Асноўныя палажэнні практычнай рэалізацыі расавых ідэй былі выкладзеныя ў генеральным плане “Ост”. Падчас карных акцый за час вайны ў Беларусі было знішчана больш за 600 тыс. яўрэяў[895]. Даследчык І. Саракавік лічыць, што ахвярамі нацысцкага

---

Предпринимательская деятельность жителей г. Витебска в период немецкой оккупации (1941–1943 гг.) // Vesture: avoti un cilveki : proceedings of the 17th International Scientific. Readings of the Faculty of Humanities. History XI. Daugavpils : Saule, 2009. С. 108–115.

[893] *Мірановіч Я.* Штодзённае жыццё беларускай правінцыі пад нямецкай акупацыяй (1941–1944) // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зборнік навуковых прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф., 25–26 чэрвеня 2015 г., г. Магілёў / уклад. А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. Магілёў, 2015. С. 242–249 ; *Mironowicz E.* Wojna wszystkich ze wszystkimi Białoruś 1941–1944. Kraków, 2015.

[894] *Цымбал А.Г.* Стан гаспадаркі ў акупаванай Беларусі ў святле калекцыі дакументаў генеральнай акругі Беларусь // Современная молодёжь и общество: сб. науч. статей. Вып. 6. Минск, 2018. С. 24–28 ; *Яго ж.* Працоўная штодзённасць акупаванай Беларусі (паводле матэрыялаў Калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі “Мінск” // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2015. Т. 2. С. 121–129.

[895] Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны): учеб. пособие. Минск, 2004. С. 99.

генацыду сталі звыш 700 тыс. беларускіх яўрэяў[896], прафесар Э. Іофе называе лічбу 810 тыс.[897] У Мінскім гета, Трускаўцы, урочышчы Гай пад Баранавічамі і ў іншых месцах загінула мноства цыган. Паводле дадзеных, за гады вайны ў канцлагерах і гета папакутавала каля паўмільёна чалавек[898].

Вызначаючы нацыянальную палітыку на акупаванай усходняй прасторы, А. Гітлер неаднаразова падкрэсліваў, што нямецкая "палітыка адносна народаў, якія насяляюць прасторы Расіі, павінна складацца з таго, каб заахвочваць любую форму рознагалоссяў і расколу"[899]. Таму гітлераўскія агрэсары з першых дзён вайны імкнуліся распальваць супярэчнасці, якія мелі месца паміж палякамі, беларусамі і яўрэямі.

Палітыка на раз'яднанне людзей і на іх усеагульнае ці частковае вынішчэнне знаходзіла розныя праявы ў працэсе яе здзяйснення. Нярэдка акупанты аддавалі перавагу нацыянальным меншасцям, каб супрацьпаставіць іх карэннай нацыі[900].

Аднак традыцыйныя добразычлівыя ўзаемадачыненні паміж прадстаўнікамі розных народаў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны былі захаваны. Шырока вядома самаахвярнасць з боку беларусаў, рускіх, палякаў, прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцей на тэрыторыі Беларусі ў дапамозе яўрэям, адносна якіх праводзілася гітлераўская палітыка генацыду.

У першыя месяцы акупацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі была разгорнута кампанія па "аднаўленню польскасці" (школы, назвы, перавагі пры прызначэнні на пасады і г.д.). Была падтрымка гэтых дзеянняў з боку мясцовага польскага насельніцтва. З восені 1941 г. нацыянальная палітыка акупантаў мяняецца. У маі 1942 г. на тэрыторыі Беларусі акупанты разгортваюць "Палекнацыён" – антыпольскую кампанію тэрору[901]. Стаўка робіцца на этнічныя меншасці былой Польшчы (у акрузе "Літва" на літоўцаў, "Беларусь" на беларусаў). Аказваючы падтрымку нацыянальным рухам, гітлераўцы не прадастаўлялі ім сур'ёзных уладных паўнамоцтваў. Аднак пасля паражэння пад Масквой актывізацыя партызанскага руху прымусіла гітлераўцаў пайсці насустрач калабарацыяністам і дазволіць стварэнне ваенізаваных фарміраванняў.

Акупацыйныя ўлады, знішчаючы яўрэяў, усіх не згодных з іх дзеяннямі, праводзячы палітыку германізацыі, у той жа час стваралі ўмовы для пэўнага эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця неяўрэйскай часткі насельніцтва. Гэта паспрыяла таму, што нацыянальнае жыццё часткі нацыянальных

---

[896] *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Мінск, 2006. С. 323.

[897] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси : Краткий науч.-попул. очерк . Минск, 1996. С. 162.

[898] *Болотова Ю.Г.* Субкультура белорусских цыган // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. Гродно, 2010. С. 324–329.

[899] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 42.

[900] *Касцюк М.П.* Узаемаадносіны этнічных супольнасцей на Беларусі ў ХХ ст. // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 29 ; *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 65, 69, 71.

[901] *Барабаш В.* Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: Материалы Междунар. науч. конф. С. 205–206.

меншасцей Беларусі ажывілася. Дзейнасць нацыянальных аб'яднанняў у асноўным мела культурна-дабрачынны кірунак.

**Палітычная і эканамічная калабарацыя.** Неабходна адзначыць, што існуюць розныя формы супрацоўніцтва насельніцтва з акупантамі. Да палітычнай калабарацыі адносяцца асобы, якія працавалі ў створаных акупантамі ці з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах, грамадскіх арганізацыях, з'яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Ваенная калабарацыя: а) мясцовы паліцэйскі апарат, служба парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фарміраванні, чыгуначныя батальёны, агенты абвера, СД, ГФП, паліцыі, дапаможныя будаўнічыя і іншыя часткі; б) мясцовая самаахова і яе ваенізаваныя часткі, члены абарончых ваенных паселішчаў. Эканамічная (гаспадарчая) калабарацыя ўключае кіраўнікоў і служачых гаспадарчых органаў, прадпрыемстваў і арганізацый, якія непасрэдна ці ўскосна працуюць на акупантаў[902]. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Беларусі былі ў складзе розных груп калабарантаў[903].

Нацыянальна-культурная палітыка акупантаў на тэрыторыі Беларусі, якая кантралявалася ваенным камандаваннем і ўваходзіла ў склад тылавых раёнаў групы армій "Цэнтр", значна адрознівалася ад той, што праводзілася на тэрыторыях, якія знаходзіліся пад кантролем цывільнай адміністрацыі. Тылавыя раёны армій разглядаліся ў якасці мясцовасцей, дзе адбывалася разгортванне рускіх калабарацыяніcцкіх ваенных фарміраванняў, у прыватнасці 19.09.1941 г. у Магілёве быў створаны і прысягнуў на вернасць Гітлеру 120-ы данскі казацкі полк. Таму асновай прапагандысцкай апрацоўкі насельніцтва з'яўляўся пад'ём рускага духу[904]. Рускае насельніцтва вяло актыўнае нацыянальнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё, былі створаны Нацыянальны камітэт самадапамогі, Саюз рускай моладзі, школы, выдаваліся газеты на рускай мове.

У якасці прыкладу палітычнай і эканамічнай калабарацыі ў тылавой частцы армій групы "Цэнтр" можна разгледзець сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі.

Гітлераўскія захопнікі канчаткова авалодалі Магілёвам толькі 28.07.1941 г. Магілёўшчына апынулася і, да моманту вызвалення летам 1944 г., знаходзілася ў тылавой частцы армій групы "Цэнтр". Яўрэйскае насельніцтва павінна было пражываць на тэрыторыі гета і падлягала поўнаму знішчэнню. На тэрыторыі Магілёва было знішчана каля 10–12 тыс. яўрэяў. Доктар гістарычных навук Э. Іофе называе лічбу 14 тыс.[905]

Згодна перапісу неяўрэйскага насельніцтва, у Магілёве на 01.10.1941 г. пражывала 47 048 чалавек, з іх 28758 жанчын і 18290 мужчын, 16785 дзяцей да

---

[902] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Мінск, 2006. С. 511.

[903] *Пушкин И.А.* Национальные особенности коллаборационизма в Беларуси в годы Великой Отечественной войны // Молодежная Галактика. СПб. 2018. № 14. С. 91–103.

[904] *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 123.

[905] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 114.

14 год, 2864 асобы старэйшыя за 60 год, працаздольнага насельніцтва каля 27,5 тысяч (мужчын каля 9000). Па нацыянальнасці: рускіх – 28705, беларусаў – 15707, украінцаў – 1085, палякаў – 1063, немцаў – 82, эстонцаў – 13, латышоў – 192, літоўцаў – 72 і іншых – 129[906]. Нацыянальныя меншасці Беларусі складалі 66,62 %. Летам 1942 г. у горадзе жыло крыху болей за 50000.

Пры гарадскім упраўленні Магілёва былі ўтвораны некалькі аддзелаў: медыка-санітарны, адукацыі, агульна-тэхнічны і г.д. Яны курыравалі розныя бакі дзейнасці і жыцця насельніцтва горада. Так, пры агульна-тэхнічным аддзеле існавалі восем пададдзелаў з назваў якіх бачна якой справай яны займаліся: будаўнічы, санітарна-тэхнічны, электраэнэргетычны, дарожны, азелянення і добраўпарадкавання, вадаправоду і каналізацыі, грамадскіх работ і інш.[907] Некаторыя з іх прызначаліся для забеспячэння патрэбаў гітлераўцаў (напрыклад, пра якое электраасвятленне дамоў жыхароў магла ісці размова, калі ў 1942 г. спецыяльным загадам акупацыйныя ўлады адключылі грамадзянскае насельніцтва ад электрасеткі), іншыя дзейнічалі на карысць усіх. Так, пададдзел азелянення і добраўпарадкавання перыядычна высаджваў на вуліцах горада дрэвы і кусты, займаўся разбіваннем сквераў і паркаў.

Усё працаздольнае насельніцтва горада (з 16 год) павінна было працаваць. Пенсіянеры са снежня 1941 г. атрымоўвалі штомесяц дапамогу (каля 50 руб. кожны), для параўнання, санітарка ў бальніцы зарабляла 200 руб., дырэктар торфазавода – 800 руб., артыст тэатра – 1000 руб.). Для тых, хто не атрымаў працу на прадпрыемствах арганізоўваліся грамадскія працы. Разлік за выкананую працу з імі рабіўся штодзень. Падчас акупацыі ў Магілёве была часткова ці цалкам наладжана работа наступных прадпрыемстваў і ўстаноў: заводаў газіраванай вады, піваваранага, трубаліцейнага, гарбарнага, лесахімічнага, аўтарамонтнага, цагляна-дахоўнага “Днепр”, косцеклеявага, пяці цагляных, торфазавода, металакамбіната “Дзімітрава”, чыгункі, фабрык шаўковай і мэблева-сталярнай, мясакамбіната, ТЭЦ (на іх працавала ад 20 да 300 чалавек на кожным), гарадской бібліятэкі, васьмі школ, рамесніцкага і будаўнічага вучылішч, 7 сталовак, прыватных кавярняў і цырульняў, 3 лазняў, гарадскога тэатра, гарадской бальніцы, паліклінікі з філіяламі, дыспансераў (сухотны і венерычны), санітарна-эпідэмічнай станцыі, хлебапякарняў, аптэк і г. д. У Магілёве працавала Метэралагічная станцыя, якая перыядычна паведамляла прагноз надвор’я[908]. Дзейнасць медыцынскіх устаноў даволі падрабязна асвятлена ў публікацыях аўтара[909].

---

906 Даведка // ДАМаг. Ф. 260. Воп. 1. Спр. 104. Арк. 3–3 адв.

907 *Беляев А.* Могилёвское городское управление в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944) // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: зборнік навуковых прац. Магілёў, 2001. С. 307–314.

908 *Беляев А.* Могилёвское городское управление в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944). С.307–314 ; *Пушкін І.А., Салагубава Т.В.* Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі // Великая Победа: героизм и подвиг народов: Материалы междунар. научн. конф. (Минск, 28–29 апреля 2005 г.): В 2 т. Т. 2. Минск, 2006. С. 122–124 ; *Пушкін І.А.* Паўсядзённае жыццё насельніцтва горада ва ўмовах гітлераўскай акупацыі на прыкладзе Магілёва // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. Віцебск, 2009. С. 64–68.

909 *Пушкин И.А.* Тыловой район группы армий «Центр»: деятельность медицинских учреждений в условиях гитлеровской оккупации белорусско-российского пограничья (на примере города Могилева) // Studia

У сувязі з тым, што існавала вельмі простая сістэма падаткаабкладання – 10 % ад даходу, большага за 200 руб., шмат хто займаўся прыватным гандлем, рамесніцтвам. Так, толькі ў студзені 1944 г. 28 асобаў мелі патэнты на гандаль, 27 на занятак рамесніцтвам. З 1942 г. у горадзе дзейнічала 10 прыватных кавярняў, 11 цырульняў, летам было выдадзена 5 патэнтаў на выраб і продаж марожанага[910].

З мэтай найлепшага сацыяльнага забеспячэння патрэбаў работнікаў на цагляным заводзе, ТЭЦ, піўзаводзе, металакамбінаце, торфазаводзе "Грабянёва", аўтарэмзаводзе, шаўковай фабрыцы, у бальніцы, псіхлячэбніцы існавалі сталовыя. У 1942 г. на трубаліцейным заводзе былі арганізаваны яслі для немаўлятак работніц завода, у 1943 г. падобныя яслі для 30 немаўлятак былі арганізаваны пры Магілёўскай ТЭЦ. На шаўковай фабрыцы дзейнічаў асобны медыцынскі пункт. На працягу 1941–43 гг. у горадзе дзейнічала малочная дзіцячая кухня. Толькі за сем дзён лютага 1943 г. яе паслугамі скарысталіся бацькі 103 дзетак, а наогул за гэты тэрмін было выраблена 2618 порцыяў-сумесяў. У маі і чэрвені 1942 г. кухня забяспечвала неабходным дзіцячым харчаваннем 160 дзетак.

У Магілёве летам 1942 г. у цэнтры горада былі адноўлены 6 вадаправодных магістраляў (3 артэзіянскія свідравіны), у іншых месцах для забеспячэння насельніцтва вадою былі зроблены калодзежы (30 штук).

Любая грамадская і культурна-асветная дзейнасць без дазволу акупацыйных уладаў забаранялася. Таму яна была магчыма толькі ў рэчышчы дзеянняў гітлераўцаў. Адной з першых грамадскіх арганізацыяў было "Таварыства Чырвонага Крыжа", утворанае ў студзені 1942 г. Але вельмі хутка яно змяніла назву на "Таварыства пацярпелых ад вайны". За 1942 г. па Магілёву ў яго шэрагі ўступіла 623 асобы. З красавіка 1943 г. яно стала звацца "Таварыства Беларускай народнай самапомачы ў г. Магілёве" і налічвала каля 700 чалавек[911].

У 1942–1943 гг. у Магілёве ўрачыста святкавалі: 1 мая – свята працы, 22 чэрвеня – дзень вызвалення ад бальшавізму, у школах ладзіліся "навагоднія ёлкі"[912]. Некалькі тысячаў чалавек былі на мітынгу і агульнагарадскіх "гуляннях", якія адбыліся на Тэатральнай плошчы горада 22.06.43 г. Але, нягледзячы на масавасць, значная частка гараджан ухілілася ад удзелу ў мерапрыемствах.

У 1942/43 навучальным годзе ў Магілёве працавала 8 школ (1 чатырохгадовая, 4 сямігадовых і 3 васьмігадовых з камерцыйным і справаводчым прафухіламі). Сярод іх было 5 беларускіх і 3 рускія. Мелася 114 класаў, у якіх выкладалі 146 настаўнікаў (120 беларусаў, 71 з вышэйшай адукацыяй). У 1942/1943 н.г. пачалі вучобу 3963 вучні, завяршылі 2145. У праграмах усіх школ адсутнічаў такі прадмет як гісторыя. Сцвярджалася, што "Берлін – сталіца нашай радзімы". Пры вывучэнні твораў рускай літаратуры з дарэвалюцыйных

---

internationalia: Материалы IV международной научной конференции «Западный регион России в международных отношениях X–XX вв.» (1–3 июля 2015 г.). Брянск, 2015. С. 336–343 ; *Яго ж.* Деятельность медицинских учреждений на территории Восточной Беларуси во время гитлеровской оккупации (на примере города Могилева) // Молодёжная Галактика. СПб. 2014. № 10. С. 207–212.

[910] Справаздача // ДАМаг. Ф. 271. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 1 ; Пушкін І.А., Салагубава Т.В. Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі. С. 122–124.

[911] Справаздача // ДАМаг. Ф. 274. Воп. 1. Спр. 5. Арк. 10–11, 29.

[912] Новый путь. Бобруйск. 1942. 9 мая ; 1943. 1 студз. ; Новый путь. Могилёв. 1943. 28 чэрв.

паэтаў і пісьменнікаў у школьных праграмах былі шырока прадстаўлены ўсе без выключэння класікі, а з савецкіх дазваляўся толькі “Ціхі Дон” М. Шолахава. Па беларускай літаратуры ў праграме засталося вывучэнне твораў М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ш. Ядзвігіна, Ц. Гартнага, К. Буйло і інш.[913]

У горадзе дзейнічалі рамеснае і будаўнічае вучылішчы, платная музычная школа. 13.05.1943 г. у Магілёве ў памяшканні былой фельчарскай школы распачаў сваю працу медыцынскі інстытут[914].

У маі 1942 г. прайшла навуковая канферэнцыя ўрачоў у Магілёўскай гарадской бальніцы. У красавіку 1943 г. у горадзе працавалі кароткатэрміновыя курсы каморнікаў, у чэрвені – прапагандыстаў РВА. Ладзіліся рамесна-саматужніцкія выставы, непрацяглы час працавала гарадская бібліятэка, з якой былі канфіскаваны кнігі савецкіх аўтараў. Дзейнічалі 7 клубных устаноў (памяшканні былых клубаў: прамкааперацыі, гарадскіх прадпрыемстваў, швейнікаў, спартыўнага, дома Чырвонай Арміі, партыйнага клуба), у якіх ладзіліся “танцы” для моладзі. Кожны дзень дэманстраваліся кінафільмы ў кінатэатрах “Зорька” і “Луч”.

У жніўні 1941 г. група артыстаў распачынае справу стварэння рускага Магілёўскага драматычнага тэатра. 25.12.41 г. адбылося яго ўрачыстае адкрыццё. Тэатральная трупа з 18 артыстаў за 2 гады здзейсніла 15 буйных пастановак на рускай мове. Сярод іх: “Коварство и любовь“, “Без вины виноватые“, “Хозяйка гостиницы“, “Свадьба Кречинского”, “Гроза”, “Бесприданница“ і інш. Тэатр у Магілёве паказаў гледачам 142 спектаклі, якія пабачыла 45000 чал. Трупа выязджала на гастролі ў Оршу і Чавусы[915]. У 1943 г. у горадзе быў створаны дзіцячы тэатр, які паказаў гледачам п’есы “Дорогая гостья”, “Жар-птица”, музычную інсцэніроўку “Свята кветак”. Дарэчы білеты на вечаровыя спектаклі з’яўляліся пропускамі пасля каменданцкай гадзіны.

У гады акупацыі ў Магілёве былі створаны і выступалі з канцэртамі: ансамбль народных інструментаў, дзіцячы хор вучняў музычнай школы, хоры Мікалаеўскага сабора і Барыса-Глебскай царквы, калектыў гарадской эстрады, духавы аркестар службы парадку. Вельмі часта іх можна было пачуць па магілёўскім радыё. Магілёўскія паэты друкавалі свае вершы ў мясцовых газетах. Выдаваліся на рускай мове газеты “Новый путь” і “Последние известия”. Цікавай і разнастайнай была праграма штодзённага мясцовага радыё, якая публікавалася ў мясцовым друку. Вяшчанне вялося праз узмацняльнікі на вуліцах горада з 6.30 да 21 гадзіны. Так, у праграме радыё за 28–30.06.43 г. значыліся: тры разы на дзень

---

[913] *Пушкін І.А., Салагубава Т.В.* Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі. С. 122–124 ; *Каралькоў, П.* Школьная адукацыя ў г. Магілёве ў перыяд нямецкай акупацыі (1941–1944 гг.) // Магілёўская даўніна. Магілёў, 2001. С. 107–110.

[914] *Пушкін І.* Першая вышэйшая навучальная ўстанова на Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі // Магілёўская даўніна. Магілёў, 2001. С. 123–128 ; *Пушкина Т.И.* Деятельность медицинских учреждений в Могилеве во время оккупации (1941–1944гг.) // Великая Победа: героизм и подвиг народов: Материалы междунар. научн. конф. (Минск, 28–29 апреля 2005 г.): В 2 т. Т. 2. С. 124–127 ; *Туронак Ю.* Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мінск, 1993. С. 222.

[915] *Пушкін І.А., Салагубава Т.В.* Эканамічнае і сацыяльна-культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі. С. 122–124 ; *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 120.

весткі і навіны, музыка, выступленні магілёўскіх хораў, даклады і паведамленні на эканамічную тэматыку, нарысы аб пісьменніках (аб Ф. Дастаеўскім), канцэрты, антыяўрэйская прапаганда, цыкл перадач пра носьбітаў еўрапейскай культуры (пра Лопе дэ Вега), перадачы для сялян, з вобласці прыродазнаўства "У глыбінях мора", дзіцячыя перадачы, аповед пра мастака Нарбута, сімфанічная музыка, "Тэатр ля мікрафона" і г.д.[916]

Акупацыйныя ўлады далі дазвол на правядзенне набажэнстваў у шэрагу хрысціянскіх храмаў, якія былі гвалтоўна закрыты ў 1930-я гг. савецкай уладаю. У Магілёве распачалі працу Трохсвяціцельскі кафедральны сабор, Барыса-Глебская царква, Петра-Паўлаўская царква, Іоана-Багаслоўская царква на Машэкаўскіх могілках, праваслаўная царква на Успенскіх могілках, з 12.12.1941 г. рыма-каталіцкі касцёл. У горадзе ў 1942 г. налічвалася 8 святароў і дыяканаў. Праваслаўны архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Філафей браў актыўны ўдзел у Мінскім саборы епіскапаў Беларускай Праваслаўнай царквы (11–17.05.1944 г.)[917].

На думку некаторых даследчыкаў, праз адкрыццё касцёлаў і цэркваў, мячэцяў і евангельскіх збораў акупанты імкнуліся захаваць нацыянальную замкнёнасць часткі татараў, немцаў, палякаў, рускіх. У сваю чаргу святары станавіліся праваднікамі нацыяналістычных ідэяў, заклікалі да этнічнай кансалідацыі. Ворагамі станавіліся прадстаўнікі іншых канфесій і нацыянальнасцей[918].

Такім чынам, у перыяд вайны заўважаны рост значэння фактару этнічнасці для насельніцтва Беларусі. Дзейнічалі нацыянальныя аб'яднанні, якія мелі ў асноўным культурна–дабрачынны характар[919]. Прычым, намаганні акупантаў па культывацыі напружанасці паміж рознымі этнасамі не далі чаканых вынікаў.

**Нацыянальныя асаблівасці ваеннай калабарацыі ў Беларусі.** Пры асвятленні пытанняў ваеннай калабарацыі ў асяродку нацыянальных меншасцей Беларусі трэба мець на ўвазе, што дакументы акупацыйных уладаў патрабавалі пры стварэнні мясцовых паліцэйскіх частак: "неабходна прыцягваць у дапаможную паліцыю надзейных фольксдойчэ, беларусаў, калі такіх не будзе, тады і палякаў"[920].

Акупацыя Беларусі, яе тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел спрыялі актывізацыі дзейнасці розных нацыяналістычных сіл. На захадзе Беларусі вялікую працу разгарнулі польскія нацыяналісты, якія імкнуліся выкарыстаць сітуацыю для рэалізацыі сваіх палітычных памкненняў. Польскія лідары і камандзіры Арміі Краёвай (АК) разглядалі Заходнюю Беларусь як частку будучай польскай

[916] Новый путь. Могилёв. 1943. 28 чэрв.
[917] Справаздачы, даведкі // ДАМаг. Ф. 289. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 2–11 адв. ; *Mironowicz E.* Wojna wszystkich ze wszystkimi Białoruś 1941–1944. Kraków, 2015. S. 195, 220.
[918] *Крывашэй Д.А.* Нацыянальныя меншасці Беларусі ў гады нямецкай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944 г.) // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф. С. 107.
[919] *Пушкін І.А.* Сацыяльнае, грамадскае і культурна-асветнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі. 1941–1944 гг. // Проблемы славяноведения. Сб. научных статей и материалов. Брянск, 2002. Вып. 4. С. 228–237.
[920] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 43–44.

дзяржавы. У паўднёвых раёнах Беларусі дзейнічала Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН-УПА). Імкнуліся выкарыстаць пэўныя магчымасці і беларускія нацыяналісты, якія меліся рэалізаваць свае даўнія дзяржаўна-нацыянальныя ідэі ва ўмовах германскай акупацыі.

З пачаткам вайны актывізавалася дзейнасць польскага нацыяналістычнага руху. Вядомы выпадкі, калі пэўныя прадстаўнікі польскага насельніцтва сустракалі гітлераўскіх захопнікаў хлебам-соллю, абстрэльвалі адступаючыя часткі Чырвонай Арміі. Напрыклад, у Пінску, Нясвіжы, Лунінцу. Лідары польскага падполля, маючы далёка ідучыя мэты, з першых дзён акупацыі Заходняй Беларусі імкнуліся заняць кіруючыя месцы ў мясцовай акупацыйнай адміністрацыі. Адным з фактараў, якія паўплывалі на гэта, была палітыка рэпрэсій савецкай улады ў адносінах да палякаў ў 1939–41 гг. Пасля прыходу гітлераўцаў палякі сталі помсціць тым, каго падазравалі ў антыпольскіх і прасавецкіх настроях, у тым ліку і сярод мірнага насельніцтва.

Палякі лічыліся пакрыўджанымі савецкай уладай, таму акупанты зрабілі стаўку на прыцягненне іх на свой бок. Прадстаўнікі гэтай супольнасці былі ў значнай колькасці прадстаўлены ў мясцовай адміністрацыі і школе, што прывяло да ажыццяўлення імі спробаў паланізацыі і акаталічвання беларускага і рускага насельніцтва. Для дасягнення сваёй мэты выкарыстоўвалі даносы і правакацыі ў адносінах да беларусаў і яўрэяў. Згодна даследаванняў А. Кавалені і А. Мацко, у верасні 1941 г. у Глыбоцкай акрузе па даносах палякаў былі арыштаваны 40 беларусаў. Але следства ўстанавіла, што яны не маюць адносін да камуністычнага, антыгітлераўскага супраціву. Даследчыкі прыводзяць паведамленні гітлераўскіх спецслужбаў, што “ва ўсіх выпадках даносаў, якія паступаюць ад палякаў, гаворка ідзе аб імкненні палякаў прыбраць ненавісных ім беларусаў, а таму ў большасці выпадкаў такія абвінавачванні неабгрунтаваныя”. Існавалі супярэчнасці паміж палякамі і ўкраінцамі. Так, увосень 1942 г. з Брэст-Літоўскага камісарыяту паведамлялі аб іх упартай барацьбе: “Абедзве гэтыя нацыянальныя групы імкнуцца кожная са свайго боку ачарніць перад нямецкімі ўладамі адзін аднаго. У цэлым можна сказаць, што палякі інтэлігентней за ўкраінцаў, так што ў цяперашні час цяжка будзе запоўніць адказныя пасты ўкраінцамі... Украінцы вельмі ўзлаваныя тым, што ва ўсіх установах сядзяць палякі. Аднак прызначэнне на гэтыя пасады ўкраінцаў немагчыма, бо апошнія не ведаюць нямецкай мовы, а таксама сярод іх мала пісьменных асобаў”[921].

З гэтых прыкладаў бачна, чаму антыпольскія настроі сярод мясцовага насельніцтва былі шырока распаўсюджаны. Назіралася абвастрэнне канкурэнцыі паміж польскай і беларускай нацынальна свядомымі элітамі.

Украінскія і польскія нацыяналістычныя элементы дамінавалі ў мясцовых паліцэйскіх фарміраваннях. Камандуючы мясцовымі паліцэйскімі сіламі адзначаў, што “па нацыянальным складзе, асабліва ў заходніх абласцях Беларусі, у паліцыі службы парадку знаходзілася шмат палякаў, а таксама вялікаросаў і ўкраінцаў,

[921] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 48–49.

якія пры адыходзе савецкага войска змяшаліся з мясцовым насельніцтвам і пазней выдавалі сябе за беларусаў”[922].

Аналіз нацыянальнага складу паліцэйскіх па 9 гарнізонах Брэст-Літоўскай акругі ў 1942 г. (гл. табліцу 24) паказвае, што 88,8 % паліцэйскіх складалі асобы польскай і ўкраінскай нацыянальнасці, пры яўнай перавазе апошніх. У заходніх гэбітсакругах перавага была за палякамі. Аднак, на думку даследчыка В. Барабаша, немцам не ўдалося стварыць калабарацыянісцкія фарміраванні цалкам з польскага насельніцтва[923].

Табліца 24 – Нацыянальны склад паліцэйскіх сілаў Брэст-Літоўскай акругі[924]

| **Усяго (чал.)** | **Нацыянальны склад** | | | |
|---|---|---|---|---|
| | **Беларусы** | **Рускія** | **Палякі** | **Украінцы** |
| 277 | 15 | 10 | 62 | 190 |

У сувязі з актывізацыяй дзейнасці Арміі Краёвай гітлераўскія акупацыйныя ўлады сталі бачыць у паляках небяспечнага праціўніка. З сярэдзіны 1942 г. пачалося мэтанакіраванае адхіленне асоб польскай нацыянальнасці ад гаспадарчых, кіруючых і паліцэйскіх структур акупацыйнай улады. У гэты ж час пачынаюцца шматлікія выпадкі нападу атрадаў АК на беларускія вёскі і партызан, супрацоўніцтва АК з гітлераўцамі ў барацьбе супраць беларускіх, савецкіх партызан.

У Беларусі дзейнічалі калабарацыянісцкія батальёны “Дзвіна”, “Бярэзіна”, “Волга”, “Дняпро”, “Прыпяць”, казацкі, чатыры так званыя ўсходнія батальёны, 2 казацкія сотні, французскі полк[925]. Ёсць звесткі аб прадстаўніцтве нацыянальных меншасцей у беларускіх арганізацыях, такіх як Беларускі корпус самаахoвы, Беларуская краёвая абарона, Беларуская народная самапомач.

У ліпені 1941 г. у Мінску быў сфарміраваны асобны паліцэйскі батальён службы парадку колькасцю ў 910 чалавек, які складаўся з вызваленых ваеннапалонных украінскай нацыянальнасці. Да снежня 1941 г. мясцовая паліцыя налічала 3682 паліцэйскіх. Узімку 1941 г. для выканання паліцэйскіх задач былі прыцягнуты 2 літоўскія паліцэйскія батальёны, а ўлетку 1942 г. перакінуты ў Беларусь дадаткова літоўскія, латышскія і эстонскія паліцэйскія батальёны. Яны выкарыстоўваліся для аховы камунікацый, барацьбы з партызанамі, а таксама ўдзельнічалі ў масавым знішчэнні мірнага насельніцтва (яўрэяў, цыганоў і інш.)[926]. У прыватнасці ў Магілёве аховай найбуйнейшага канцлагера ў горадзе (знішчана больш за 40 тыс. ваеннапалонных і мірнага насельніцтва) – Лупалаўскага,

[922] Там жа. С. 49.
[923] *Барабаш В.* Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации. С. 209–211.
[924] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 49.
[925] *Пасэ У.С.* Вялікая Айчынная вайна 1941–45 гг. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2. Мінск, 1994. С. 428.
[926] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. С. 486.

займаўся "украінскі" 51-ы ахоўны батальён, які таксама прымаў удзел у знішчэнні магілёўскіх яўрэяў[927].

Вялі барацьбу з партызанамі, расстрэльвалі мірных жыхароў так званыя "усходнія нацыянальныя" фарміраванні. Толькі на тэрыторыі "генеральнай акругі Беларусь" вясной 1943 г. дзейнічалі 3-ці і 12-ты літоўскія паліцэйскія батальёны, шэраг украінскіх, латышскіх, паўночнакаўказскіх, татарскіх, эстонскіх і інш. Па стану на 29.02.1944 г. начальніку СС і паліцыі "генеральнай акругі Беларусь" непасрэдна падпарадкоўваліся наступныя паліцэйскія фарміраванні калабарантаў: Баранавіцкі паліцэйскі ўчастак мясцовай паліцыі (26 чалавек), 7 беларускіх паліцэйскіх батальёнаў у Слоніме, Мінску, Баранавічах, Глыбокім, Навагрудку, Слуцку, Лідзе (агульнай колькасцю 2167 чалавек); 5 украінскіх у Мінску, Гарадзішчы, Капылі, Слоніме, Лідзе (2239 чалавек): 3 літоўскія ў Параф'янаве, Мінску, Старобіне (1400 чалавек), латышскі ў Докшыцах (271 чалавек)[928].

На тэрыторыі Беларусі служылі або працавалі ў якасці перакладчыкаў, унтэр-афіцэраў, салдат, спецыялістаў (дараднікі, агенты, следчыя) асобы латышскай нацыянальнасці. Менавіта імі пераважна было ўкамплектавана спецыяльнае падраздзяленне вышэйшага начальніка СС і паліцыі Остланда, якое дыслацыравалася пры Мінскім СД. Галоўнай яго задачай было аказанне дапамогі ў барацьбе супраць антыгітлераўскага падполля і партызанскага руху, а таксама актыўны ўдзел у акцыях знішчэння яўрэйскага насельніцтва Беларусі.

З восені 1941 і да канца 1943 г. знаходзіліся і ўдзельнічалі ў карных аперацыях на тэрыторыі Беларусі розныя латышскія фарміраванні. На 01.07.1942 г. – чатыры латышскіх паліцэйскіх батальёны: 18-ты, 24-ты, 26-ты і 266-ты "Е". У розны час знаходзіліся, таксама, 15-ты, 17-ты, 25-ты, 208-мы, 268-мы, 271-шы, 432-гі і іншыя латышскія паліцэйскія батальёны. Як адзначаюць даследчыкі У. Тугай і У. Грыгор'еў: "У гістарычнай памяці беларускага народа аб латышскіх паліцэйскіх батальёнах, што ў розны час дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, засталіся негатыўныя звесткі і ўспаміны як аб карніках, якія вылучаліся лютасцю і жорсткасцю ў адносінах да беларусаў"[929].

З верасня 1943 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі два буйныя рускія ўзброеныя фарміраванні, якія ў асноўным складаліся з рускіх ваеннапалонных: паліцэйская 10-тысячная брыгада СС Б. Камінскага – так званая Руская вызваленчая народная армія (РВНА) і 2,5-тысячная паліцэйская брыгада Гіль-Радзівонава. Пяць палкоў РВНА размясціліся ў Лепелі, Сянно, Бешанковічах, Чашніках. Яны прынялі непасрэдны ўдзел у карных аперацыях гітлераўскіх

---

[927] *Шендерович И.* Забытое гетто // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: зборнік навуковых прац удзельнікаў Трэццяй Міжнароднай навуковой канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" у 2 ч. Ч. ІІ. Магілёў, 2003. С. 94.

[928] *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 322 ; *Барабаш В.* Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации. С. 208 ; *Mironowicz E.* Wojna wszystkich ze wszystkimi Białoruś 1941–1944. S. 60.

[929] *Тугай У.В., Грыгор'еў У.У.* Адносіны латышоў да ваенна-палітычных падзей у Беларусі ў час другой сусветнай вайны // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 51 ; Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 194–198.

акупантаў “Рэгеншауэр”, “Свята вясны” (красавік – май 1944 г.) і амаль цалкам ачысцілі Лепельшчыну на Віцебшчыне ад савецкіх партызанскіх атрадаў. За ўдзел у гэтых аперацыях Б. Камінскі быў узнагароджаны жалезным крыжом І класа[930]. У барацьбе з савецкімі партызанамі ўдзельнічалі воінскія падраздяленні рускіх казакаў, якія служылі гітлераўскім акупантам, напрыклад, у Навагрудскім раёне.

Адным з цэнтраў рускіх калабарантаў быў Бабруйск. Нацысты ў горадзе стварылі руская нацыяналістычныя арганізацыі. Туды накіравалі рускіх калабарантаў з Арла і Смаленска, у горад пераехалі нацысцкія газэты „Новый путь“ і „Речь“. Там дзейнічаў адзін з галоўных нацысцкіх прапагандыстаў М. Актан. Ён стварыў у Бабруйску Саюз барацьбы супраць бальшавізму. Там жа быў створаны Саюз рускай моладзі, куды рэкрутавалі і запрашалі беларускіх хлопцаў і дзяўчат.

У асобных раёнах Беларусі вялася актыўная шавіністычная дзейнасць літоўскіх калабарантаў, асабліва тых, што прыбылі з Ковенскай Літвы. Літоўскія калабаранты (фарміраванні генерала П. Плехавічуса) утварылі шэраг гарнізонаў на тэрыторыі паўночна-заходніх раёнаў Гродзеншчыны. Гітлераўцы падтрымлівалі антыпольскую і антыбеларускую дзейнасць літоўцаў.

825-ы “Остмусульманскі” батальён “Волга-татарскага легіёна” быў створаны гітлераўцамі ў жніўні-верасні 1942 г. з палонных татараў, башкіраў, мардвы, чувашаў і інш. Перад ім ставіліся задачы – барацьба з партызанамі, выведка і дыверсіі, прапагандысцкая праца па прыцягненню на гітлераўскі бок перабежчыкаў з ліку прадстаўнікоў розных народаў, арганізацыя антысавецкіх паўстанняў на тэрыторыі нацыянальных рэспублік.

Акупанты вырашылі выкарыстаць батальён зімой 1943 г. пры правядзенні карных аперацый на тэрыторыі Віцебшчыны. Батальён (каля 900 чал.) размясціўся ў вёсках Гралёва, Сувары, Сенькава. Амаль адразу яго прадстаўнікі ўстанавілі сувязь з кіраўніцтвам мясцовых партызанскіх атрадаў. І ў лютым 1943 г. 825-ы батальён перайшоў на бок савецкіх партызан. Як сцвярджае даследчыца Г. Шышкова, у татарскім народзе да сённяшняга часу жыва легенда аб тым, што татары пазбеглі пры Сталіне высылкі ў Казахстан і Сярэднюю Азію разам з іншымі народамі толькі дзякуючы таму, што адбыўся гэты пераход да партызанаў[931].

У перыяд акупацыі назіраюцца значныя адрозненні ў становішчы розных нацыянальных груп насельніцтва ў розных зонах акупаванай Беларусі. Найбольш актыўнымі ў Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі ў пэўных рэгіёнах былі руская, у асобных палякі і ўкраінцы. Найменш цікавіліся

[930] *Mironowicz E.* Wojna wszystkich ze wszystkimi Białoruś 1941–1944. S. 60 ; *Котаў А.С.* Дзейнасць рускай вызваленчай народнай арміі на Віцебшчыне // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 97–100.
[931] *Шишкова А.М.* 825-й батальон “Волго-татарского легиона” и его переход на сторону партизан в феврале 1943 года // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 157–161.

“палітыкай” татары, прычым Д. Крывашэй адзначае лаяльнасць татар да немцаў і немцаў да татар[932].

Рускае насельніцтва вяло надзвычай актыўнае нацыянальнае і сацыяльна-палітычнае жыццё, што ўвасобілася ў стварэнне ім Нацыянальнага камітэта самадапамогі, Саюза рускай моладзі, газет, школ і інш. Нацыянальная палітыка германскіх акупантаў актывізавала грамадска-культурную дзейнасць украінскага насельніцтва ў Беларусі. Можна адзначыць актыўную і плённую дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства “Просвіта”, развіццё ўкраінскага тэатра, клубаў і гурткоў, нацыянальнага друку. Імкненне да самавызначэння ўкраінскага народа выклікала рост напружання і варожасці паміж акупантамі і ўкраінскім насельніцтвам на апошнім этапе акупацыі.

У перыяд акупацыі прадстаўнікі татарскага насельніцтва Беларусі бралі ўдзел як у татарскім, так і беларускім нацыяналістычных рухах пад эгідай акупацыйных улад. У гэтых умовах беларускія татары змаглі захаваць адметнасць сваёй нацыянальнай культуры і пашырыць рэлігійную адукацыю. Даследчык С. Грыбава адзначае, што гітлераўскія акупацыйныя ўлады дастаткова лаяльна ставіліся да прыхільнікаў ісламу. Напрыканцы вайны яны выкарыстоўвалі некаторых прадстаўнікоў з беларускіх татараў у сваіх ваенна-палітычных мэтах. У маі 1944 г. быў створаны прагітлераўскі Саюз татарскай моладзі[933].

Неабходна адзначыць наступнае – быў створаны толькі штаб Саюза татарскай моладзі, але па-сапраўднаму ён не разгарнуў сваёй дзейнасці. З аднаго боку, перашкаджала невялікая колькасць татарскай моладзі ў большасці населеных пунктаў Беларусі, а з другога – стаўленне да падобных арганізацый з боку мясцовага татарскага насельніцтва. Напрыклад, зімой – вясною 1944 г. у г.п. Узда дыслакаваўся вядомы сваімі жорсткімі расправамі з цывільным насельніцтвам батальён эсэсаўца О. Дэрлівангера. У ім служылі прадстаўнікі шэрагу народаў СССР, у тым ліку крымскія татары, карачаеўцы. Як адзначае прафесар Л. Лыч, няма сумнення ў тым, што ўздзенскія татары нешта этнічна агульнае з сабой бачылі ў названых прадстаўніках савецкіх народаў. Аднак не засведчана аніводнага факта супрацоўніцтва ўздзенскіх татараў з блізкімі ім па крыві прадстаўнікамі нацменшасцей з батальёна Дэрлінвангера[934].

Варта пагадзіцца з высновамі даследчыкаў А. Кавалені і А. Мацко: “Міжнацыянальныя адносіны на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады вайны 1941–1945 гг. шмат у чым вызначаліся палітыкай акупацыйных уладаў. Разам з тым мелася свая ўнутраная логіка іх развіцця, якая абапіралася на гістарычны досвед міжнацыянальных адносін, абумоўлівалася ўплывам палітычных памкненняў розных груп нацыянальных эліт. Прыкметнымі станавіліся супярэчнасці паміж набіраўшым моц інтэрнацыянальным антыфашысцкім,

[932] *Крывашэй Дз. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944). С. 159.

[933] *Грыбава С.У.* Палітыка нямецкіх улад у дачыненні да татарскага насельніцтва Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 102, 104 ; *Яе ж.* Беларускія татары напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны: Аўтарэф.дыс...канд. гіст. навук. Мінск, 2016. С. 10–20.

[934] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI стст.). С. 30–31.

камуністычным супрацівам, польскім нацыяналістычным рухам, АУН–УПА і беларускімі нацыянальнымі сіламі. Узаемаадносіны паміж імі і некаторымі іншымі нацыянальнымі групамі і палітыкай германскіх агрэсараў вызначала складанасць і супярэчлівасць нацыянальна-дэмаграфічных працэсаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

Імкненне германскіх уладаў да падштурхоўвання міжнацыянальных канфліктаў спалучалася з тактыкай палітычнай ізаляцыі, недапушчэння самастойнага нацыянальнага ўплыву на акупаваных тэрыторыях. Аднак і гэтая палітыка гітлераўскіх акупантаў не апраўдалася, пацярпела паразу.

Нягледзячы на ўсю складанасць міжнацыянальных адносін, дэмаграфічных працэсаў, наяўнасць вострых супярэчнасцяў, якія прыводзілі часам да крывавых сутыкненняў і падзей, галоўнай рысай з'яўлялася мацнеючае антыфашысцкае адзінства народаў, што насялялі Беларусь, у змаганні супраць гітлераўскіх захопнікаў. Менавіта гэтая з'ява была адной з найважных крыніц перамогі над гітлераўскай Германіяй у вайне"[935].

У той жа час, прадстаўнікі нацменшасцей Беларусі былі ў складзе розных груп калабарантаў. Яны працавалі ў створаных акупантамі ці з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах (старасты, бургамістры, юдэнраты і г.д.), грамадскіх арганізацыях, з'яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Частка з іх уваходзіла ў мясцовы паліцэйскі апарат, службу парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фарміраванні, чыгуначныя батальёны, "усходнія" батальёны, казацкія фарміраванні і іншыя часткі.

### 4.3 Уклад у перамогу над фашысцкай Германіяй

Адзначаючы ўклад нацыянальных меншасцей у перамогу над гітлерызмам, трэба асвятліць іх удзел і ролю ў ваенных падзеях, працу ў тыле, барацьбу з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў Беларусі, а таксама ў складзе атрадаў антыгітлераўскага несавецкага супраціву ў Беларусі.

**Удзел нацыянальных меншасцей Беларусі ў ваенных падзеях на франтах і падчас працы ў тыле**. Нацыянальныя меншасці Беларусі разам з прадстаўнікамі тытульнага этнасу прынялі самы актыўны ўдзел у абарончых баях лета 1941 г., франтавых дзеяннях 1941–1945 гг. Шмат хто быў прызваны ў дзеючае войска. За лета 1941 г. з Беларусі было прызвана ў Чырвоную Армію больш за 500 тыс. чалавек[936]. У некаторых выданнях сцвярджаецца, што за 1941 г. было мабілізавана 600 тыс. чалавек[937]. З добраахвотнікаў, якія не падлягаліся прызыву ў армію, у Беларусі было створана 78 знішчальных батальёнаў (звыш 13 тыс. чалавек) і больш за 200 фарміраванняў народнага апалчэння (больш чым 33 тыс. чалавек), якія вялі барацьбу з дэсантамі праціўніка, шпіёнамі, ахоўвалі

[935] *Коваленя А.А., Мацко А.Н.* Национально-демографические процессы в Беларуси (1939–1945 гг.). С. 54.
[936] *Пасэ У.С.* Вялікая Айчынная вайна 1941–45 гг. С. 428 ; Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. С. 482.
[937] Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй Мировой войны). С. 59

прамысловыя аб’екты, дзяржаўныя ўстановы, лініі сувязі і г.д.[938] Асабліва народнае апалчэнне адзначылася пры гераічнай абароне Магілёва, Гомеля[939].

Вялікі ўклад, у складзе ўсяго насельніцтва Беларусі, унеслі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей у пабудову абарончых аб’ектаў і рубяжоў, дзе было занята каля 2 млн. чалавек[940]. Яны актыўна ўдзельнічалі ў эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцей рэспублікі на ўсход СССР. У адносна кароткі час з Беларусі было эвакуіравана звыш 1,5 млн чалавек, звыш 120 прадпрыемстваў і г.д.[941]

Усяго на франтах вайны 1941–1945 гг. змагалася больш за 1,3 млн беларусаў і выхадцаў Беларусі. Напрыклад, у Чырвонай Арміі і флоце падчас вайны служылі 62 генералы і 4 адміралы-яўрэі – выхадцы Беларусі. 23 беларускія яўрэі сталі Героямі Савецкага Саюза[942]. Кавалерам ордэнаў Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступені, Чырвонай зоркі стаў беларускі татарын Б. Смольскі, у званні генерал-лейтэнанта скончыў вайну татарын з Нясвіжа Б. Паўтаржыцкі і інш.[943] Яскрава паказаны ўдзел яўрэйскага насельніцтва Магілёва ў баявых дзеяннях на франтах вайны, падпольным і партызанскім рухах у выданні А. Ліціна[944].

Выхадцы Беларусі адзначыліся ў змаганні з гітлерызмам у складзе польскіх вайсковых адзінак, так званых армій З. Берлінга і У. Андэрса[945]. Даследчык Ю. Грыбоўскі адзначае, што адсутнасць дакументальных крыніц не дазваляе вызначыць дакладны этнічны склад польскіх армій Андэрса і Берлінга. Факталагічныя падставы дазволілі яму казаць пра наяўнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі ў шэрагах гэтых фарміраванняў. Экстэрытарыяльная сістэма ваеннага набору ў СССР стварала сітуацыю, пры якой прадстаўнікі розных нацыянальнасцей траплялі ў шэрагі вайсковых адзінак іншай краіны[946].

Значная частка жыхароў Заходняй Беларусі, якія былі дэпартаваны напярэдадні вайны ў Сібір, адтуль трапілі ў 75-тысячную польскую армію генерала У. Андэрса. Яна была сфарміравана ўлетку 1941 г. на тэрыторыі СССР па настойліваму патрабаванню англічан за кошт палякаў, украінцаў, беларусаў і іншых нацыянальнасцей, якія пасля верасня 1939 г. сталі грамадзянамі СССР. Этнічны склад арміі атрымаўся неаднастайны. Пры адсутнасці дакладных звестак аб нацыянальным складзе вядомы факты існавання ў войску пэўнай колькасці асобаў украінскай, яўрэйскай і беларускай нацыянальнасцей, спробы

---

[938] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. С. 482. ; Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны). С. 59.
[939] *Пушкін І.А.* Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва. Магілёў, 2006. С. 122–123 ; Памяць: Гіст. дакум. хроніка Магілёва. Мінск, 1998. С. 224–225.
[940] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. С. 428.
[941] Там жа.
[942] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 154, 156.
[943] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 33.
[944] История могилёвского еврейства : Документы и люди : науч.-популяр. Очерки и жизнеописания. В 2 кн. Кн. 2, ч. 2. С. 271–381.
[945] Армія У. Андэрса стваралася пад назвай Польская армія ў СССР. Пасля эвакуацыі ў Іран і Ірак была аб’яднана з Войскам Польскім на Сярэднім Усходзе і атрымала назву – Польская армія на Ўсходзе.
[946] *Грыбоўскі Ю.В.* Этнічны склад польскіх армій Андэрса і Берлінга ў 1941–1945 гг.: параўнальны гістарычны аналіз // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 284.

ўтварэння асобнага літоўскага падраздзялення. Сярод жаўнераў арміі былі беларускія татары М. Абрамовіч і Р. Смайкевіч[947]. Армія Андэрса на працягу лета 1942 г. пакінула СССР, была эвакуіравана ў Іран, а затым прыняла ўдзел у цяжкіх баях у Афрыцы і пры вызваленні Італіі.

Пасля таго, як армія Андэрса пакінула тэрыторыю Савецкага Саюза, працягваліся спробы стварэння польскіх узброеных падраздзяленняў. У сярэдзіне 1943 г. па ініцыятыве Саюза польскіх патрыётаў у СССР пачалося фарміраванне 1-й польскай пяхотнай дывізіі імя Т. Касцюшкі. Пазней былі створаны польскія 2-я пяхотная дывізія імя Г. Дамброўскага, 1-я брыгада артылерыі імя Ю. Дэма, 1-я танкавая брыгада імя герояў Вэстэрплятэ, 1-ы полк знішчальнікаў "Варшава". Да лета 1944 г. польскія ўзброеныя сілы ў СССР налічвалі каля 100 тыс. чалавек пад камандаваннем З. Берлінга[948]. Аналіз груп асоб, з якіх складалася Польская армія Берлінга, дазваляе казаць аб тым, што большасць яе асабовага складу была з ураджэнцаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

У бітве пад Леніно (Магілёўшчына) 12.10.1943 г. адзначылася першая польская нацыянальная дывізія імя Т. Касцюшкі, якая ўвайшла ў аператыўнае падпарадкаванне 33-й арміі Заходняга фронту 01.09.1943 г.[949] У ліку 3054 загінуўшых пад Леніно салдат і афіцэраў дывізіі сустракаюцца беларускія, украінскія, польскія прозвішчы, радзей рускія і яўрэйскія.

Красамоўным прыкладам таго, што ў складзе польскай дывізіі імя Т. Касцюшкі былі ўраджэнцы Беларусі, з'яўляецца жыццёвы лёс А. Ширкаўца. Ён нарадзіўся ў 1923 г. у вёсцы Гірычы Ваўкавыскага павета на Гродзеншчыне. Аляксандр быў разам з маці высланы ў Сібір. Пасля пачатку вайны спрабаваў трапіць у войска У. Андэрса. Не атрымалася. Тым не менш дамогся свайго – пайшоў служыць у першую нацыянальную польскую дывізію імя Т. Касцюшкі. А. Шыркавец прайшоў з дывізіяй Касцюшкі ўвесь яе шлях, пачаўшы ад першага бою пад беларускай вёскай Леніно, у якім загінула большая частка яго саслужыўцаў. Вайну скончыў афіцэрам, камандзірам батарэі самаходных гармат. Сярод ягоных шматлікіх узнагародаў – найвышэйшая вайсковая адзнака Польшчы "Віртуці Мілітары" і савецкі ордэн Чырвонай Зоркі.

Жыхары з Беларусі ўдзельнічалі ў еўрапейскім руху Супраціву. Напрыклад, у французскім добра вядомы асобны жаночы атрад "Радзіма", які быў арганізаваны былымі беларускімі партызанкамі і падпольшчыцамі. У яго складзе, акрамя беларусак, былі прадстаўніцы іншых нацыянальнасцей. Так, пасля мінчанкі Н. Лісавец камандзірам атрада была Р. Фрыдзан-Сямёнава[950].

Шмат выхадцаў з Беларусі мацавалі перамогу ў тыле СССР, працуючы на эвакуіраваных прадпрыемствах (варта асабліва адзначыць за высокія вытворчыя паказчыкі працу рабочых і інжынерна-тэхнічных працаўнікоў Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С. Кірава, які быў размешчаны ў Свярдлоўску),

---

[947] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). С.34.
[948] *Грыбоўскі Ю.В.* Этнічны склад польскіх армій Андэрса і Берлінга ў 1941–1945 гг.: параўнальны гістарычны аналіз. С. 283.
[949] *Курков И.Н., Пушкин И.А.* Могилёвщина: легенды, события, люди. Минск, 2008. С. 339.
[950] Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй Мировой войны). С. 197–198.

навукова-даследчых установах, газетах і часопісах, у культурна-агітацыйнай сферы і г.д.[951] Сярод дзесяткаў тысяч прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей з Беларусі вядомымі з'яўляюцца акадэмік Я. Зальдовіч, дырэктар Каломенскага машынабудаўнічага і Горкаўскага заводаў Х. Рубінчык, дырэктар артылерыйскага завода А. Быхаўскі, наркам па будаўніцтву СССР С. Гінзбург (усе яўрэі), якія падчас вайны працавалі на перамогу, знаходзячыся ў тыле на неакупаванай тэрыторыі СССР[952].

**Дзейнасць атрадаў антыгітлераўскага несавецкага супраціву.** Кажучы пра антыгітлераўскі несавецкі супраціў у Беларусі ў кантэксце нацыянальных меншасцей, размова павінна весціся найперш пра дзейнасць польскай Арміі Краёвай і ўкраінскіх нацыянальных узброеных фарміраванняў у Беларусі.

Ад пачатку Другой сусветнай вайны палякамі была сфармулявана тэорыя двух ворагаў – СССР і Германіі. На тэрыторыі Заходняй Беларусі з'яўляецца польскае антысавецкае падполле. Падчас гітлераўскай акупацыі праводзілася палітыка раз'яднання і распальвання варожасці паміж этнічнымі супольнасцямі. Але, нягледзячы на тэрор і правакацыі акупацыйнага рэжыму, як беларусы, так і палякі Заходняй Беларусі прымалі дзейны ўдзел у антыгітлераўскім супраціве. Асаблівасць гэтай барацьбы ў рэгіёне была ў тым, што мясцовае насельніцтва змагалася з ворагам у складзе розных рухаў Супраціву як у савецкім, так і ў шэрагах Арміі Краёвай (АК). У большасці сваёй беларусы падтрымлівалі савецкіх партызан і падпольшчыкаў, палякі АК змагаліся за аднаўленне незалежнасці польскай дзяржавы.

Найбольшай па колькасці сярод нацыянальных узброеных фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны была польская Армія Краёва – падпольная ваенізаваная арганізацыя, якая дзейнічала на тэрыторыі Польшчы, Украіны, Беларусі, Літвы. Падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду В. Сікорскага ў Лондане. АК была ўтворана 14.02.1942 г., фармальна дзейнічала да 09.01.1945 г. (некаторыя баявыя групы працягвалі існаваць да 1954 г.). Папярэднік АК – "Саюз узброенай барацьбы" (створаны ў канцы 1939 г.). Галоўная мэта АК – адраджэнне Польшчы ў межах, якія існавалі да 1939 г. Налічвала Армія Краёва ў сваіх шэрагах 250–300 тыс. чалавек[953]. Вясной 1942 г. СД пачалі чыстку мясцовай адміністрацыі ад палякаў і замены іх на беларусаў. Гэта абвастрыла адносіны палякаў і беларускіх калабарантаў, зблізіла АК з мясцовымі партызанамі і паспрыяла росту радоў "акаўцаў", фарміраванню іх баявых атрадаў. Да вясны 1943 г. вядомы сумесныя савецка-польскія баявыя аперацыі супраць гітлераўцаў і іх памагатых.

Варта адзначыць, што АК аб'ядноўвала ў сваіх шэрагах не толькі тысячы палякаў, але і тысячы беларусаў, якія пражывалі ў зонах яе актыўнага дзеяння. На жаль, у даследчыка няма дастатковай колькасці матэрыялаў для правядзення

---

[951] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. С. 554– 58.
[952] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 161–162.
[953] *Літвін А.М.* Армія Краёва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1. Мінск, 1993. С. 152–153.

аналізу нацыянальнага складу структуры АК, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі. Разам з тым выяўленыя асобныя дакументы дазваляюць адзначыць, што асабісты склад акаўскіх фарміраванняў Наваградскай акругі ў 1944 г. на 30–40 % складаўся з праваслаўных беларусаў[954]. Даследчыкам В. Ермаловічам праведзены аналіз спісу былых акаўцаў з ліку тых, якія перайшлі да савецкіх партызанаў і што ўступілі ў склад брыгады імя Г. Жукава. З 27 былых удзельнікаў Арміі Краёвай – 22 былі палякі, або 81,5 %, а 5 чалавек, або 18,5 % – беларусы. Пры гэтым беларусы былі мабілізаваныя ў Армію Краёву гвалтоўнымі спосабамі. Тых, хто адмаўляўся ўступаць у атрады АК, польскія карныя групы забівалі разам з сем'ямі. Ва ўмовах тэрору прадстаўнікі беларускай нацыянальнасці змушаныя былі выбіраць не толькі паміж сваім жыццём і смерцю, але і жыццём сваіх дзяцей, родных і блізкіх[955].

Беларусам і палякам Заходняй Беларусі прыйшлося перажыць цяжкія выпрабаванні ў перыяд Другой сусветнай вайны. Пэўныя канфлікты, у асобных раёнах, паміж імі ўзнікалі не на нацыянальнай глебе, а былі ў асноўным прадвызначаны "зверху", "вялікай палітыкай", савецка-польскай барацьбой за дамініраванне ў рэгіёне[956]. Абстаноўка ваенных гадоў прымушала беларускае і польскае насельніцтва шукаць шляхі да супрацоўніцтва. Сітуацыя змянілася летам–восенню 1943 г. Распачаліся і працягваліся да лета 1944 г. узброеныя сутычкі паміж АК і савецкімі партызанамі. У гэты час сталі назірацца шырокія кантакты паміж высокімі чынамі акупацыйнай адміністрацыі, СС і вермахта з палявымі камандзірамі АК.

З 1943 г. польскае і літоўскае падполле пачалі рыхтаваць узброеныя паўстанні для захопу ўлады ў момант адступлення гітлераўскіх войск. На гэты выпадак 20.11.1943 г. кіраўніцтвам АК быў распрацаваны план аперацыі "Бура", у адпаведнасці з якім прадугледжваўся захоп улады ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Дзеля рэалізацыі гэтага плана разгарнулася актыўная работа па арганізацыі партызанскіх атрадаў. Так, калі ў пачатку 1944 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 10 партызанскіх атрадаў АК з агульнай колькасцю 1266 чалавек, то вясной 1944 г. толькі на тэрыторыі Навагрудскай акругі ў 5 вайсковых злучэннях Арміі Краёвай налічвалася каля 7 тыс. чалавек. Летам 1944 г. асобныя атрады АК разам з Чырвонай Арміяй прымалі ўдзел у вызваленні ад гітлераўцаў Вільні і Львова[957].

Нягледзячы на выпадкі ўзаемадзеянняў, вострыя канфлікты паміж нацыянальнымі рухамі існавалі на тэрыторыі Беларусі да заканчэння акупацыі. З пачатку і да вясны 1944 г. вялася ўзброеная барацьба атрадаў АК з літоўскімі

---

[954] *Барабаш В.В.* Белорусско–польские межнациональные отношения в Западной Беларуси в период Второй мировой войны // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф. С. 57–58 ; Яго ж. Белорусско-польское антифашистское сотрудничество на территории Беларуси в период гитлеровской оккупации (1941–1944гг.) // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г. Гродна, 2004. С. 208–213.

[955] *Ермолович В.И.* Национальный состав антифашистского подполья в Беларуси в 1941–1944 гг. // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. С. 110–111.

[956] *Барабаш В.В.* Белорусско–польские межнациональные отношения в Западной Беларуси в период Второй мировой войны. С. 58.

[957] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 2. С. 308–309.

калабарантамі. Тыя ў адказ праводзілі карныя акцыі пераважна супраць мясцовага польскага насельніцтва. Тады ж пачалася тэрарыстычная дзейнасць АК супраць беларускага нацыянальнага руху. Напрыклад, у выніку тэрору АК у Лідзе быў цалкам ліквідаваны ўплыў беларускіх нацыянальных сіл[958].

Пасля вызвалення ад акупантаў заходняй тэрыторыі Беларусі частка атрадаў Арміі Краёвай была абяззброена органамі НКУС, а салдаты і афіцэры – інтэрніраваны. Гэта выклікала яшчэ больш жорсткае змаганне ўцалэлых атрадаў АК супраць савецкай улады на тэрыторыі Беларусі. Са жніўня 1944 па чэрвень 1945 гг. у раёнах былой Заходняй Беларусі акаўцы ўчынілі больш за 300 тэрарыстычных актаў, забіўшы 36 работнікаў раённага звяна, 24 старшыняў сельсаветаў і 35 супрацоўнікаў міліцыі. За гэты час у Лідскім раёне было забіта і паранена 113 чалавек, у Воранаўскім – 97. У некаторых населеных пунктах ад рук акаўцаў загінула больш людзей, чым ад гітлераўскіх рэпрэсій і на франтах Другой сусветнай вайны[959].

Пасля вайны падраздзяленні АК вялі падпольную ўзброеную барацьбу з савецкай уладаю. Ад іх тэрарэстычнай дзейнасці загінула вельмі шмат беларусаў. І. Саракавік лічыць, што як бы ні мянялася тактыка Арміі Краёвай, яе дзейнасць заўсёды мела выразны антыбеларускі характар і была апошняй спробай захаваць пальшчызну на “крэсах всходніх”[960].

На тэрыторыі Украінскага і Беларускага Палесся з 1933 г. дзейнічала падпольная арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў “Украінскае нацыянальнае адраджэнне” (УНА). Дзейнасць арганізацыі была накіравана на распаўсюджванне ўкраінскай нацыяналістычнай прэсы і літаратуры. Умацаваўшыся, УНА накіравала сваю дзейнасць на выхаванне моладзі ў духу ваенна-рэвалюцыйных традыцый і стварэнне арганізацыі ваеннага тыпу. Як вынік, у чэрвені 1941 года на базе падпольнай арганізацыі УНА было створана ўзброенае фарміраванне ўкраінскіх нацыяналістаў “Палеская Сеч Украінскай Паўстанцкай Арміі” (ПС УПА), кіраўнік Т. Дз. Баравец па мянушцы “Бульба”. Дзейнічала ў саюзе з прадстаўнікамі беларускіх нацыяналістычных арганізацый. Да лістапада 1941 г. супрацоўнічала з гітлераўскімі спецслужбамі, выконвала функцыі паліцыі, вяла барацьбу з савецкімі партызанамі. Восенню 1941 года самараспусцілася. Зімой 1942 г. адноўлена Т. Бараўцом як партызанскае фарміраванне. Найбольшы ўплыў у Беларусі ўкраінскія нацыяналісты мелі на тэрыторыі Століншчыны[961].

У паўднёвых раёнах Гомельскай і Брэсцкай абласцей Беларусі дзейнічалі атрады Украінскай паўстанцкай арміі (УПА), створанай у 1942 г. Яны вялі барацьбу як з гітлераўцамі, так і з “саветамі” за незалежнасць Украінскай народнай рэспублікі (УНР). Ва УПА знаходзілася ад 120 да 500 тыс. чалавек.

---

[958] *Барабаш В.* Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации. С. 209–210.

[959] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). Мінск, 2009. С. 20.

[960] *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 339–340.

[961] *Гуленка У.* Палеская Сеч Украінскай Паўстанцкай Арміі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.5. С. 385 ; *Черняк Ю.В.* Деятельность украинских националистов на территории БССР в 1939–1941 гг. // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 12–16.

На абшарах Беларускага Палесся дзейнічалі ў асноўным атрады Паўночнай групы УПА. У 1943 г. была ўтворана ваенная акруга “Тураў” пад камандаваннем Ю. Сцельмашука (“Руды”). У яе склад ўваходзілі некаторыя раёны Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей[962]. Летам 1943 г. ПС УПА была падпарадкавана Арганізацыя Украінскіх нацыяналістаў (АУН).

Часткі АУН актыўна дзейнічалі ў паўднёвай частцы Беларусі. У ліпені 1944 г. яны былі аб’яднаны Брэсцкім акруговым “провадам” пад кодавай назвай “Крычаўскі” або “№ 100”. Яго ўзначальваў З. Саўчук (“Шварц”, “Аляксандр”)[963]. Летам 1944 г. на тэрыторыі Беларусі падпольныя фарміраванні АУН-УПА налічвалі прыкладна 12–14 тыс. чалавек. Напрыканцы 1944 г. на тэрыторыі Брэсцкай вобласці дзейнічала 120 невялікіх атрадаў (па 7–10 чал.), а ў Пінскай вобласці – 114 атрадаў, колькасны склад якіх быў ад 25 да 500 чал. Найбольш упартая барацьба вялася ў Дывінскім (Дзівінскім) раёне Брэсцкай вобласці, дзе ў УПА ўваходзілі ад 2 да 3 тыс. чалавек[964]. УПА дзейнічала ў падполлі да сярэдзіны 1950-х гг.

**Змаганне нацыянальных меншасцей Беларусі з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў.** Першыя акты ўзброенага супраціву гітлераўцам з боку савецкіх партызан адносяцца да ліпеня 1941 г.

Агульны лік партызан у гады вайны ў Беларусі – больш за 374 тыс. чалавек. Каля 440 тыс. налічвалася ў партызанскім рэзэрву. Партызанскі рух, які пачаў разгортвацца на акупаванай тэрыторыі Беларусі з самага пачатку вайны, насіў шматнацыянальны характар. У вучэбным дапаможніку пра падзеі вайны для вучняў школ пазначана, што больш 70 % партызан гэта былі беларусы, каля 20 % – рускія, 4 % – украінцы, 3 % – яўрэі. У партызанскіх атрадах змагаліся каля 4 тыс. замежных грамадзян, у тым ліку 3 тыс. палякаў, 400 славакаў і чэхаў, 235 югаславаў, каля 100 немцаў і прадстаўнікоў іншых еўрапейскіх народаў[965]. Прыводзячы гэтыя лічбы, аўтары не тлумачаць, чаму палякі аднесены да замежнікаў. У некаторых іншых выданнях нацыянальны склад партызан падаецца наступным: беларусаў – 71,2 %, рускіх – 19,3 %, украінцаў – 3,8 %, яўрэяў – 2,1 %, палякаў – 0,8 %, іншых нацыянальнасцей (каля 68 нацый і народнасцей) – 2,8 %[966].

---

[962] *Белозорович В.А.* Террор “бульбовцев” в западнобелорусской деревне во второй половине 1940-х годов // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар.навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003г.). Мінск, 2004. С. 304 ; *Валаханович И.А.* Деятельность спецгрупп НКГБ БССР по выявлению и ликвидации подпольных структур ОУН-УПА на оккупированной территории Беларуси (1943–1944 гг.) // Там жа. С. 300 ; Історія України: Джерельний літопис / Упоряд.: В.І. Червінський, М.І. Обушний, Т.Ю. Горбань, В.Є. Кругляков та ін. К., 2008. С. 557–564.

[963] *Валаханович И.А.* Деятельность спецгрупп НКГБ БССР по выявлению и ликвидации подпольных структур ОУН–УПА на оккупированной территории Беларуси (1943–1944 гг.). С. 300.

[964] *Стрелец М.В., Коршак М.А.* К вопросу об оценке деятельности украинских национальных организаций в годы Второй мировой войны // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. С. 303 ; Історія України: Джерельний літопис. С. 557–564.

[965] Великая Отечественная война советского народа. С. 114.

[966] *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 331–332 ; Ермолович В.И. К вопросу о национальном составе партизан и подпольщиков Беларуси периода войны (1941–1944гг.) // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. Мінск, 1997. С. 116, 123.

Пытанне аб удзельнай вазе беларусаў і нацыянальных меншасцей сярод партызан у савецкі час было спрэчным па ідэалагічных матывах. Як адзначыў у сваім выступе народны пісьменнік Беларусі Я. Брыль: "У 1970 г. у нас павінна была выдавацца кніга па гісторыі партызанскага руху ў Беларусі, але выданне на нейкім этапе было прыпынена. З яе быў зняты для пераробкі раздзел аб беларускім нацыянальным руху, у якім гаварылася, што ў Беларусі было 440 тыс. патрызан, 90 тыс. падпольшчыкаў, што гэта была вялікая армія, якая складалася на 71 % з беларусаў, на 19 % з рускіх, на 10 % з іншых нацыянальнасцей. І вось у гэтым была ўбачана крамола – вельмі шмат беларусаў-партызан"[967].

Больш за 52 % партызан Беларусі ўступілі ў атрады ў час Сталінградскай бітвы. 30.05.1942 г. пры Стаўцы вярхоўнага галоўнакамандуючага быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР, начальнік штаба П. Панамарэнка), 09.09.1942 г. – Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР, начальнік штаба П. Калінін)[968], якія каардынавалі антыгітлераўскі савецкі супраціў на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі. Супраць правага крыла групы арміі "Цэнтр" разам з беларускімі партызанамі змагаліся ўкраінскія партызанскія злучэнні С. Каўпака, А. Сабурава, А. Фёдарава; у тыле левага крыла на стыку з групай армій "Поўнач" – партызаны Літвы і Калінінскай вобласці; у цэнтры – партызанскія фарміраванні Арлоўскай і Смаленскай абласцей.

У пачатку вайны ў радах беларускіх партызан аказваліся мясцовыя патрыёты, а таксама байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, якія вырваліся з акружэння і германскага палону. Колькасць і нацыянальны склад беларускіх партызан пастаянна пашыраліся не толькі за кошт мясцовых жыхароў, але і накіравання з савецкага тылу партыйных і камсамольскіх арганізатараў падпольнай барацьбы ў тыле ворага, спецыялістаў ваенна-каманднага складу, мінёраў-дыверсантаў, інструктараў-падрыўнікоў, радыстаў і шэрагу іншых спецыялістаў. Так, на захопленую тэрыторыю Беларусі за ўвесь час было накіравана 8800 чалавек у складзе арганізацыйных груп. Сярод іх былі прадстаўнікі розных нацый і народнасцей. Напрыклад, сярод камсамольскіх арганізатараў, якія былі засланы летам 1942 г. у былую Пінскую вобласць, было 42 беларусы, 58 рускіх, 7 украінцаў, яўрэй, асецін, грузін, латыш.

Неабходна асабліва падкрэсліць, што для актывізацыі сумеснай барацьбы супроць гітлераўцаў і аказання дапамогі беларускаму народу, у Расіі былі сфарміраваны і накіраваны на акупіраваную тэрыторыю некалькі партызанскіх атрадаў, а ЦК УЛКСМ абавязаў у маі 1942 г. Маскоўскі, Навасібірскі, Варонежскі, Молатаўскі, Татарскі, Чувашскі, Пензенскі, Тамбоўскі і Чэлябінскі абласныя камітэты камсамола падабраць не менш як 450 камсамольцаў-дабрахвотнікаў для

[967] Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, працы творчых саюзаў, дзейнасці Народнага фронта, Мартыралога Беларусі і інш. 17.11.1988 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1168. Арк. 14.

[968] *Пасэ У.С.* Вялікая Айчынная вайна 1941–45 гг. С. 429–430.

накіравання іх у спецшколы і засылкі на акупаваную тэрыторыю Беларусі[969]. Значны ўплыў на пашырэнне партызанскага руху на поўначы Віцебшчыны і іншых рэгіёнах Беларусі ўнеслі атрады НКУС СССР і РСЧА, накіраваныя сюды вясной–летам 1942 г.[970] Тым не менш, нягледзячы на гэта, асноўную масу партызан Беларусі складалі беларусы і нацыянальныя меншасці, якія пражывалі тут у даваенны перыяд. Так, згодна статыстычных дадзеных Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР), 88,84 % беларускіх партызан складалі жыхары Беларусі (рускія, беларусы, палякі, яўрэі, татары, украінцы і іншыя нацыянальнасці, якія да вайны 1941–1945 гг. пражывалі на тэрыторыі рэспублікі).

Шэраг мэтанакіраваных крокаў камандавання Чырвонай Арміі і партыйнага кіраўніцтва СССР прывялі да бурнага росту колькасці беларускіх партызан, пашырэння іх нацыянальнага складу (гл. табліцу 25).

Табліца 25 – Нацыянальны склад беларускіх партызан (1942–1944)[971]

| **Нацыянальнасць** | **На канец 1942 г. па 194 улічаных атрадах** | **На ліпень 1943 г.** | **На ліпень 1944 г.** | **За ўвесь час** |
|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 4818 | 28588 | 131990 | 201101 |
| Рускія | 1955 | 10947 | 41471 | 54322 |
| Украінцы | 233 | 1666 | 9021 | 10968 |
| Яўрэі | 205 | 1390 | 5977 | 6031 |
| Палякі | – | 409 | 1654 | 2410 |
| Іншыя | 195 | 829 | 5495 | 7626 |
| Усяго | 7406 | 43829 | 194708 | 282458 |
| Працэнт наменшасцей | 35 % | 34,8 % | 32,3 % | 28,8 % |

Аналіз дынамікі нацыянальнага складу беларускіх партызан паказвае, што калі параўноўваць удзельную вагу, дык колькасць рускіх і яўрэяў паменшылася, адпаведна, з 26,4 % (канец 1942) да 19,2 % (ліпень 1944) і з 2,7 % да 2,14 %. Украінцаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей пабольшала, адпаведна, з 3,2 % да 3,89 % і з 2,6 % да 2,71 %[972].

У красавіку 1943 г. Гітлер сваёй дырэктывай пацвердзіў, што барацьба з партызанамі лічыцца раўназначнай баявым дзеянням на франтах. Супраць беларускіх партызан былі накіраваны значныя вайсковыя сілы, у тым ліку 10 тыс. брыгада Б. Камінскага, так званая "Руская вызваленчая народная армія".

---

[969] *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР) // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. С. 77–78.

[970] *Крыварот А.А.* Узаемадзеяннне беларускіх і расійскіх партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці і сумежных раёнаў РСФСР (1941 – лістапад 1942 гг.) // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 144.

[971] Складзена па: *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 78.

[972] *Каваленя А.А., Мацко А.Н.* Камсамольска-маладзёжнае падполле Беларусі – фактар уключэння нацыянальных меншасцей у барацьбу з ворагам (1941–1944гг.) // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. Мінск, 1997. С. 129, 145.

Нацыянальны склад беларускіх партызан істотна пашырыўся з другой паловы 1943 г. і быў цесна звязаны з агульным ростам партызанскіх сіл[973]. Так, на 01.01.1943 г. у Беларусі налічвалася 56 724 партызаны, напрыканцы 1943 г. – 153 488 байцоў[974].

Пасля Курскай бітвы летам 1943 г. пад уплывам становішча на франтах вайны і прапаганды партызан на іх бок пачынаюць пераходзіць многія былыя салдаты германскай арміі, асабліва з краін Еўропы і нацыянальных фарміранняў з былых палонных Чырвонай Арміі. Пераходзілі ў адзіночку і групамі, нават цэлымі падраздзяленнямі. Напрыклад, у верасні і кастрычніку 1942 г. да партызан Мінскага паўднёвага злучэння перайшлі 2 групы славакаў у колькасці 81 чалавека. У кастрычніку 1943 г. у партызанскі атрад С. Ваупшасава з Мінска прыбыла група славацкіх салдат, якімі камандаваў Рудольф Заяц. З дапамогай партызан ноччу з 29 на 30 ліпеня 1943 г. на бок беларускіх патрыётаў перайшло каля 140 сербаў і харватаў[975]. З паліцэйскіх частак: эскадрон казакоў з “дабраахвотніцкага” палка на чале з М. Гагарыным, больш за 1,5 тыс. салдат (І. Саракавік называе лічбу – 2800 чалавек) на чале з палкоўнікам Гіль-Радзіёнавым з 1-й Рускай нацыянальнай брыгады СС, 825-ы “Остмусульманскі” карны батальён і інш. Большая частка з перайшоўшых да часу вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў удзельнічала ў барацьбе з імі.

Дарэчы, па ўспамінах мясцовых жыхароў Усходняй частцы Беларусі (Клімавіцкі, Аршанскі, Крычаўскі і іншыя раёны), больш жорстка, чым нават немцы, паводзілі сябе ў адносінах да мясцовага насельніцтва французы, фіны, венгры (мадзьяры). У выніку мэтанакіраванай работы падпольшчыкаў і партызан павярнулі зброю супраць гітлераўскіх захопнікаў 24 аўстрыйцы, 31 бельгіец, 70 венграў, 16 галандцаў, 100 немцаў, 300 славакаў, 235 сербаў і харватаў, 100 чэхаў, 60 французаў[976].

Нацыянальны склад партызанскіх фарміраванняў напрыканцы вайны быў даволі стракатым. У ліпені 1944 г. у Лідскай зоне было 4852 партызаны, з іх беларусаў – 2371, рускіх – 831, украінцаў – 182, яўрэяў – 1356, палякаў – 25, іншых нацыянальнасцей – 87 чалавек[977]. Нацыянальныя меншасці складалі 51,2 %.

У атрадах “Штурм” брыгады “Штурмавая” і “Іскра” брыгады “Разгром”, якія дзейнічалі ў Мінскай вобласці, знаходзіліся прадстаўнікі, адпаведна, 26 і 28 нацыянальнасцей. Больш наглядна гэта можна паказаць на прыкладзе шэрагу

---

[973] Дадзеныя абставіны былі выкліканы шэрагам прычын. Па-першае, падзеі на савецка-германскім фронце ўлетку 1943 г. вымусілі германскае кіраўніцтва больш шырока выкарыстоўваць у вайне нацыянальныя часці краін Еўропы і нацыянальныя фарміраванні з савецкіх ваеннапалонных. Па-другое, пералом вайны на карысць СССР вымусіў многіх германскіх сатэлітаў пераасэнсаваць свае адносіны да падзей на фронце і ў тыле і ўліцца ў рады антыфашыстаў. Па-трэцяе, шырока разгорнутая на тэрыторыі Беларусі актыўнае антыгітлераўскае супраціўленне, масавая прапаганда і агітацыя, якая была разгорнута партызанамі і падпольшчыкамі, на фоне агульных поспехаў Чырвонай Арміі давала станоўчыя вынікі.

[974] Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. С. 497.

[975] *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 79.

[976] Там жа.

[977] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 149.

партызанскіх брыгад, якія вялі барацьбу ў розных рэгіёнах рэспублікі (гл. табліцу 26). У складзе брыгад, у сярэднім, нацыянальныя супольнасці складалі 28,25 %.

Табліца 26 – Нацыянальны склад партызанскіх брыгад на дзень злучэння з Чырвонай Арміяй[978]

| **Назва партызанскіх брыгад і месца дыслакацыі** | **Беларусы** | **Рускія** | **Украінцы** | **Яўрэі** | **Палякі** | **Іншыя** | **Усяго** | **Працэнт нацменшасцей** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Імя М.В. Фрунзе, Баранавіцкая вобласць | 462 | 154 | 39 | 50 | 5 | 25 | 735 | 37,2 |
| Імя А. Неўскага, Беластоцкая вобласць | 307 | 137 | 49 | 37 | 8 | 22 | 560 | 45,2 |
| "За Радзіму" імя А. Флегонтава, Брэсцкая вобласць | 577 | 55 | 178 | 35 | 10 | 22 | 895 | 35,5 |
| 4-я Беларуская, Вілейская вобласць | 366 | 85 | 9 | 58 | 7 | 17 | 542 | 32,5 |
| 3-я Беларуская, Вілейская вобласць | 976 | 120 | 18 | 2 | 1 | 9 | 1126 | 13,4 |
| Імя П. Панамарэнкі, Гомельская вобласць | 771 | 121 | 32 | – | – | 14 | 938 | 17,8 |
| 12-я Кавалерыйская імя І. Сталіна, Мінская вобласць | 433 | 114 | 17 | – | – | 15 | 579 | 25,2 |
| 13-я Касцюковіцкая, Магілёўская вобласць | 693 | 301 | 37 | – | – | 49 | 1080 | 35,8 |
| "Савецкая Беларусія", Пінская вобласць | 342 | 63 | 26 | – | – | 38 | 469 | 27,1 |
| 130-я Петрыкаўская, Палеская вобласць | 1060 | 101 | 24 | – | – | 30 | 1215 | 12,8 |

У гады вайны 1941–1945 гг. на тэрыторыі Беларусі супраць гітлераўскіх акупантаў дзейнічала каля 4 тыс. тэрытарыяльных падпольных арганізацый, якія налічвалі звыш 70 тысяч патрыётаў. Аднак, у адрозненне ад партызанскіх фарміраванняў рэспублікі, дакладнай і дэталёвай статыстыкі аб нацыянальным складзе ўдзельнікаў антыгітлераўскіх падпольных арганізацый Беларусі не існуе. І гэта заканамерна, бо па прычыне канспірацыі спісы ўдзельнікаў

[978] Згодна: *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 79–80.

падпольных арганізацый і груп не складаліся. У шматлікіх выпадках падпольшчыкі нават не ведалі сапраўдных імёнаў і прозвішчаў сваіх паплечнікаў па змаганню.

Безумоўна, ад пачатку гітлераўскай акупацыі Беларусі асноўную частку складу антыгітлераўскага супраціву, асабліва ў падпольных арганізацыях, складалі прадстаўнікі тытульнай нацыі. Такое назіралася да моманту вызвалення Беларусі ад захопнікаў у 1944 г. Тым не менш, варта адзначыць і актыўны ўдзел прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. У прыватнасці, рускіх і ўкраінцаў. Наогул, прадстаўнікі рускай нацыянальнасці разам з беларусамі з'яўляліся прэваліраванымі нацыянальнасцямі ў складзе антыгітлераўскага падполля ў Беларусі. У 1942 г. склад арганізацый істотна папоўніўся за кошт рускіх і ўкраінцаў. У 1943 г. у выніку шэрагу абставін рэзка ўзрасла колькасць антыгітлераўскіх падпольных арганізацый, дзякуючы павелічэнню ліку беларусаў, асабліва ў Заходнім рэгіёне Беларусі. У той жа час значным было папаўненне ўкраінцамі. У 1944 г. нацыянальныя меншасці складалі 32 % ад агульнай колькасці выяўленых членаў антыгітлераўскіх падпольных арганізацый, прычым рускіх было 20 %.

Даследчыкам В. Ермаловічам, на падставе матэрыялаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, прааналізаваны найбольш тыповыя арганізацыі, якія дзейнічалі ў розных рэгіёнах Беларусі ў перыяд акупацыі 1941–44 гг., з мэтай аднаўлення агульных тэндэцый структуры нацыянальнага складу антыгітлераўскіх падпольных арганізацый рэспублікі. Аб'ектам яго аналізу стаў нацыянальны склад Мінскай, Баранавіцкай, Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай, Асінторфаўскай, Асіповіцкай, Аршанскай, Пінскай, Слонімскай і Слуцкай падпольных арганізацый. У цэлым аналіз даследчыка дазваляе зразумець удзел нацыянальных меншасцей Беларусі ў савецкіх падпольных арганізацыях (гл. табліцу 27).

Калі абагульніць дадзеныя за перыяд 1941–1944 гг., у сярэднім нацыянальныя меншасці ў структуры падпольных арганізацый складалі 25,7 % ад агульнага ліку падпольшчыкаў: рускія – 17,1 %, украінцы – 3,6 %, палякі – 1,6 %, яўрэі – 1,3 %, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей – 2,1 %. У партызанскіх фарміраваннях Беларусі ў гэты перыяд нацыянальныя меншасці складалі 28,9 % ад агульнай колькасці партызан рэспублікі: рускія – 19,3 %, украінцы – 3,9 %, яўрэі – 2,1 %, палякі – 0,9 % і 2,7 % складалі прадстаўнікі 68 нацый і народнасцей СССР і замежных краін. Варта адзначыць, што ўдзельная вага нацыянальных меншасцей у падпольных арганізацыях Беларусі была ніжэй, чым у партызанскіх атрадах і брыгадах рэспублікі ўжо з першага года гітлераўскай акупацыі беларускіх зямель. Так, колькасць прадстаўнікоў нацменшасцей у антыгітлераўскіх падпольных арганізацыях рэспублікі ў 1941 г. складала 25,6 %, а ў партызанскіх фарміраваннях, якія дзейнічалі на захопленай ворагам тэрыторыі Беларусі ў 1941 г., гэты паказчык перавышаў 70 % ад агульнага ліку іх асабістага складу. Колькасць прадстаўнікоў рускай нацыянальнасці ў партызанскіх

фарміраваннях складала ў 1941 г. каля 56 %[979].

Табліца 27 – Нацыянальны склад выяўленых удзельнікаў антыгітлераўскіх падпольных арганізацый Беларусі ў 1941 г.[980]

| | Працэнт нацменшасцей | Беларусы | | Рускія | | Яўрэі | | Украінцы | | Палякі | | Іншыя | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Колькасць | Працэнт | Колькасць | Працэнт | Колькасць | Працэнт | Колькасць | Працэнт | Колькасць | Працэнт | Колькасць | Працэнт |
| Агульная колькасць падпольшчыкаў | 25,6 | | 74,4 | | 17,5 | | 2,3 | | 2,2 | | 1,7 | | 1,9 |
| Усходні рэгіён | 24,9 | | 75,1 | | 16,5 | | 2,4 | | 2,2 | | 1,6 | | 2,1 |
| Заходні рэгіён | 40 | | 60 | | 36 | | | | 2 | | 2 | | |
| Мінскае падполле | 28,3 | 387 | 71,7 | 90 | 16,7 | 21 | 3,8 | 14 | 2,6 | 13 | 2,4 | 15* | 2,8 |
| Магілёўскае падполле | 21,5 | 51 | 78,5 | 9 | 13,9 | 1 | 1,5 | 1 | 1,5 | 1 | 1,5 | 2** | 3,1 |
| Асіповіцкае на чыгунцы | 13,15 | 66 | 86,8 | 7 | 9,2 | | | 3 | 3,95 | | | | |
| Гродзенскае падполле | 65,2 | 8 | 34,8 | 14 | 60,9 | | | | | 1 | 4,3 | | |

* 6 татар, 5 латышоў, армянін, балгарын, лезгін, немец
** 2 асяціны

Адной з савецкіх падпольных груп у Віцебску кіраваў кітаец з рускім прозвішчам, камуніст А. Лептыну. Яна дзейнічала з красавіка 1942-га да верасня 1943-га і была нешматлікай. Яе членамі былі: уладальнік пральні, беспартыйны Васіль Чу Чалін, кандыдат у члены УсеКП(б) С. Сюдоболь, камсамолка З. Шаракова (Матвіевіч), сёстры – кітаянкі Ірына і Света Джанванфу (Камкіна). Дзяўчыны выконвалі ролю сувязных. У верасні 1943 г. фашысты раскрылі групу. Лептыну, Чу Чаліна і Сюдоболя арыштавалі. Пасля катаванняў Лептыну і Чу Чаліна расстралялі. А Сюдоболь дрэнна гаварыў па-руску, і немцы палічылі, што ён не падыходзіць для падпольных спраў. Яго адправілі ў канцлагер. Мужчыне ўдалося адтуль збегчы і прабіцца да байцоў наступаўшай Чырвонай Арміі. Кіраўніком Капыльскай падпольнай антыгітлераўскай арганізацыі быў беларускі татарын С. Александровіч, ад яго рукі загінуў бургамістр Капыльскага раёна Лобашэле. Удзельнічаў у падпольным выданні ў акупаваным Мінску газеты “Звязда” татарын Х. Александровіч і г.д.[981]

[979] *Ермолович В.И.* Национальный состав антифашистского подполья в Беларуси в 1941–1944 гг. С. 109.
[980] Там жа. С. 106–107.
[981] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 31–33.

Нацыянальны склад падпольных арганізацый Беларусі ў значнай ступені адпавядаў агульнай структуры этнічных груп, якія пражывалі ў рэспубліцы ў перадваенны час. Выключэнне складаюць прадстаўнікі яўрэйскай і польскай нацыянальнасцей. У даваеннай Беларусі агульная колькасць насельніцтва яўрэяў і палякаў перавышала 20 % ад агульнага насельніцтва рэспублікі. У складзе да антыгітлераўскага падполля рэспублікі знаходзілася толькі 1,6 % палякаў і 1,3 % яўрэяў.

У партызанскім руху і антыгітлераўскім падполлі ў Беларусі ўдзельнічалі звыш 15 тыс. яўрэяў. Нізкі працэнт удзелу яўрэйскага насельніцтва ў падпольных арганізацыях Беларусі можна патлумачыць тым, што з першых дзён акупацыі яўрэі былі пераселеныя ў гета і тым самым ізаляваныя ад актыўнага грамадска-палітычнага жыцця і змагання на тэрыторыі рэспублікі. Хто з іх не падпарадкаваўся патрабаванням акупантаў, змушаныя былі шукаць паратунак у партызанскіх атрадах або сельскай мясцовасці. Нягледзячы на невялікі працэнт, добра вядома дзейнасць яўрэйскіх падпольных груп у гета Баранавіч, Брэста, Гродна, Мінска, Нясвіжа, Слоніма і інш.[982]

У партызанскім руху яўрэі прымалі самы непасрэдны ўдзел. Згодна няпоўных дадзеных у гады вайны 1941–1945 гг. у барацьбе з гітлерызмам на тэрыторыі Беларусі загінуў 721 яўрэй-партызан[983]. Найбольш вядомы яўрэйскі сямейны партызанскі атрад (пазней атрымаў назву імя Калініна), утвораны пад Навагрудкам Т. Бельскім з братамі. Напачатку ў ім было 17 чалавек. У ліпені 1944 г. налічвалася 1230 чалавек[984]. У Налібоцкай пушчы з 20 тыс. партызан 3 тыс. былі яўрэямі.

Зыходзячы з меўшых месца фактаў антысемітызму ў некаторых атрадах прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці не афішыравалі сваю нацыянальнасць і нават змянялі імёны і прозвішчы[985].

Яўрэямі па нацыянальнасці былі: першы намеснік БШПР, сакратар ЦК КП(б)Б Р. Эйдзінаў, член Мінскага падпольнага гаркома кампартыі І. Казінец, сакратары Рагачоўскага, Асіповіцкага, Ельскага, Петрыкаўскага, Мехоўскага, Асвейскага, Чачэрскага, Мінскага сельскага райкамаў кампартыі; Ш. Беркавіч узначальваў Пінскі падпольны абкам і райкам камсамола, Д. Фядотаў – камандзір

---

[982] *Лошенкова Д.М.* Участие еврейских женщин в сопротивлении фашистам в некоторых гетто Беларуси // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-практической конференции, Витебск, 19–20 апреля 2007 г. Витебск, 2007. Ч. I. С. 135 ; *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 124–126.

[983] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 150–154.

[984] Доктар гістарычных навук Э. Іофе сцвярджае, што Беларускі штаб партызанскага руху ўсяляк перашкаджаў стварэнню асобных яўрэйскіх партызанскіх атрадаў, а існуючыя рэарганізоўваў. Можна выказаць думку, што гэта тычылася не толькі яўрэйскіх, бо праводзілася палітыка стварэння інтэрнацыянальных атрадаў, без падкрэслівання нацыянальнага характару барацьбы з гітлерызмам. Тым не менш, вядомы шматлікія прыклады выпадкаў праяў антысемітызму як з боку АК, так і сярод савецкіх партызан Беларусі. *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 148, 151–153.

[985] *Корсак А.І.* Стаўленне кіраўніцтва СССР да генацыду яўрэйскага насельніцтва на Беларусі // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-практической конференции. С. 144.

Бялыніцкай ваенна-аператыўнай групы. Двое яўрэяў былі камандзірамі партызанскіх брыгад, чацвёра – камісарамі партызанскіх брыгад, 18 – камандзірамі партызанскіх атрадаў, 32 – камісарамі партызанскіх атрадаў, 21 – начальнікі штабаў партызанскіх атрадаў.

Што тычыцца нізкай колькаснай праслойкі польскага насельніцтва ў савецкім антыгітлераўскім падполлі, то адказ на гэтае пытанне варта шукаць як у праводзімай у перадваенны перыяд палітыцы савецкіх уладаў у стаўленні да шэрагу сацыяльных груп палякаў у Заходняй Беларусі ў 1939–1941 гг., так і ў існаванні ў тым жа рэгіёне актыўна дзеючага польскага нацыяналістычнага падполля – Арміі Краёвай. Пераважная большасць прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці, якая ўступіла ў савецкія антыгітлераўскія арганізацыі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд нямецкай акупацыі, з'яўляліся жыхарамі ўсходніх раёнаў БССР і ўступілі ў арганізацыі, якія дзейнічалі ва Усходнім рэгіёне рэспублікі.

Жорсткасць акупацыйнага рэжыму прывяла да таго, што ў беларускіх лясах змагаліся прасавецкія латышскія партызанскія атрады. Актыўныя баявыя дзеянні латышскіх партызан пачаліся пасля таго, як у варожы тыл з асобым заданнем ЦК КП(б) Латвіі прыбыў спецыяльны атрад пад камандаваннем В. Самсонса (пазней ператвораны ў партызанскую брыгаду). Пасля першых паспяховых дыверсій байцы атрада В. Самсонса былі вымушаны з цяжкімі баямі адступіць у Расонска-Асвейскую партызанскую зону ў Віцебскай вобласці. Кіравалі латышскімі партызанамі, якія дзейнічалі і на тэрыторыі Беларусі, К. Озаліньш, О. Ошкалн і інш. Да канца 1942 г. намаганнямі беларускіх, рускіх і латышскіх партызан на стыку мяжы БССР, РСФСР і ЛатССР была вызвалена значная тэрыторыя і створаны партызанскі край. Ён займаў плошчу каля 10 тыс. кв. км. з насельніцтвам звыш 100 тыс. чалавек і з'яўляўся непрыступным бастыёнам для ворага[986].

Сярод тых латышоў, што стойка змагаліся з гітлераўцамі ў складзе партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый на беларускай зямлі, варта адзначыць загінуўшых кіраўнікоў падпольных груп у Мінску: А. Платайса, А. Арндта і яго сына Аляксандра, М. Думбра, Р. Бруціса, Э. Бумбіерыс. За мужнасць, праяўленую ў час вайны, 16-ці латышам было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, у тым ліку трое (І. Судмаліс, В. Самсонс, О. Ошкалн) удастоены гэтага звання за барацьбу з захопнікамі на акупаванай тэрыторыі Беларусі[987].

Безумоўна, у барацьбе з моцным ворагам партызаны неслі значныя страты. Згодна распрацовак БШПР, страты беларускіх партызан за час барацьбы супраць гітлераўскіх захопнікаў склалі 44791 чалавек. Сярод загінуўшых былі прадстаўнікі розных нацыянальнасцей. Аналіз нацыянальнага

---

[986] *Тугай У.В., Грыгор'еў У.У.* Адносіны латышоў да ваенна-палітычных падзей у Беларусі ў час другой сусветнай вайны // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. С. 49–50.

[987] Там жа. С. 50, 52 ; Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 202 ; *Тугай, У.В.* Латышы на Беларусі. Мінск, 1999. С. 125.

складу страт беларускіх партызан (гл. табліцу 28) сведчыць, што нацыянальныя групы насельніцтва за час вайны 1941–1945 гг. панеслі вялікія страты. У барацьбе з ворагам загінуў амаль кожны сёмы партызан-беларус. Ахвярамі ваеннага ліхалецця сталі кожны шосты партызан – яўрэй, рускі, паляк. Кожнага пятага партызана-ўкраінца напаткала варожая куля. Яшчэ больш высокімі былі страты ў групе іншых, дзе загінуў амаль кожны чацвёрты партызан.

Табліца 28 – Нацыянальны склад страт беларускіх партызан 1941–1944 гг.[988]

| **Нацыянальнасць** | **Усяго партызан** | **Загінула і памерла ад ран** | **Прапала без вестак** | **Патрапіла ў палон** | **Выбылі па іншых прычынах** | **Усяго страт** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 201101 | 16804 | 8624 | 838 | 4392 | 30658 |
| Рускія | 54322 | 5599 | 2243 | 143 | 1113 | 9098 |
| Украінцы | 10968 | 1258 | 335 | 32 | 322 | 1947 |
| Яўрэі | 6031 | 721 | 124 | 1 | 108 | 954 |
| Палякі | 2410 | 206 | 57 | 4 | 108 | 375 |
| Іншыя нацыянальнасці | 7626 | 1093 | 314 | 12 | 340 | 1759 |
| Усяго | 282458 | 25681 | 11697 | 1030 | 6383 | 44791 |
| Працэнт нацменшасцей | 28,81 | 34,6 | 26,3 | 18,7 | 31,2 | 31,6 |

Аналізуючы дзейнасць партызанскіх атрадаў у Беларусі цяжка пазбегнуць праблему ўзаемаадносінаў партызан і мясцовага насельніцтва. Па шматлікіх успамінах, перажыўшых вайну, партызаны дзяліліся на “сапраўдных” і “бандытаў”, якія прыходзілі ноччу і рабавалі сялян. Прычым казалі: “Сапраўдныя былі ў тых лясах, недзе там, а побач з намі ў лесе сядзелі бандыты”. Праведзенае ў 2008–2009 гг. апытванне мясцовага насельніцтва вёсак Крычаўскага, Шклоўскага раёнаў засведчыла яшчэ адну цікавую акалічнасць. Жыхары вёсак на пытанне “Ці пайшоў хто з вашай вёскі служыць у паліцыю?”, адказвалі адмоўна, адначасова падкрэсліваючы, што паліцаямі былі жыхары суседняга паселішча, а тыя казалі наадварот.

Кіраўніцтва партызанскім рухам і атрадамі жостка змагалася з негатыўнымі праявамі ў сваім руху. На акупаванай тэрыторыі дзейнічалі партызанскія суды па разгляду злачынстваў партызан. Нягледзячы на суровыя меры пакарання парушэнняў, злачынстваў было дастаткова многа. Аб чым сведчыць той факт, што за час барацьбы па прыгавору партызанскіх судоў было расстраляна 2345 чалавек

[988] Згодна: *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 83.

за рабаўніцтва, насілле, марадзёрства ў адносінах да мясцовага насельніцтва. Так, да вышэйшай меры пакарання было асуджана 7 камандзіраў рот, 49 камандзіраў узводаў, 79 малодшых камандзіраў, 2173 радавых байцоў партызанскіх атрадаў[989].

Даследчыкі А. Каваленя і А. Калеснікава адзначаюць, што дакладная статыстыка аб нацыянальным складзе асуджаных маецца толькі за 1943–1944 гг.[990] (гл. табліцу 29).

Табліца 29 – Нацыянальны склад асуджаных партызанскімі судамі ў 1941–1944 гг.[991]

| **Нацыянальнасць** | **Да 1944 г.** | **За 1944 г.** | **Усяго** | **У % да ўсіх расстраляных** |
|---|---|---|---|---|
| Беларусы | 909 | 502 | 1411 | 60,2 |
| Рускія | 185 | 372 | 557 | 23,8 |
| Украінцы | 64 | 73 | 137 | 5,8 |
| Яўрэі | 12 | 32 | 44 | 1,8 |
| Палякі | 4 | 43 | 47 | 2,0 |
| Іншыя | 19 | 130 | 149 | 6,4 |
| Усіх нацыянальнасцей | 1193 | 1152 | 2345 | 100 |

На аснове распрацовак БШПР даследчыкі А. Каваленя і А. Калеснікава падлічылі суадносіны нацыянальнага складу загінуўшых і расстраляных, а таксама паміж агульнай нацыянальнай колькасцю партызан Беларусі і асуджаных партызанскімі судамі да вышэйшай меры пакарання. Прадстаўнікі нацменшасцей склалі 31,6 % ад агульнай колькасці беларускіх партызан, загінуўшых за гады вайны 1941–1944 гг. У той жа час за розныя злачынствы былі асуджаны да расстрэлу 934 прадстаўнікі нятытульнай нацыі, што складае 39,8 % ад агульнай колькасці расстраляных[992].

Вучоныя падкрэслілі, што ў час барацьбы за самыя розныя парушэнні партызанскія суды прыгаварылі да вышэйшай меры пакарання 2345 партызан і партызанак. Гэта не надта вялікая колькасць – толькі 0,83 % ад усіх партызан

[989] *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 84–87.

[990] Яны падкрэсліваюць, што існуючыя даныя за 1942 г. не заўсёды можна аднесці да дакладных. Па-першае, у гэты час у многіх мясцовасцях адбываўся працэс станаўлення партызанскага руху, партызанскія суды яшчэ не дзейнічалі, многае залежала ад рашэнняў, якія прымалі камандзіры партызанскіх атрадаў. Па-другое, частка дакументаў на асуджаных была страчана ў выніку шматлікіх карных экспедыцый ворага супраць беларускіх партызан. Больш таго, камандуючы склад партызанскіх атрадаў часта мяняўся, вялікія змены адбываліся ў іх асабовым складзе, зводак падзей было вельмі мала. Таму звестак у БШПР аб падзеях таго часу паступала нязначная колькасць.

[991] Згодна: *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 87.

[992] Сярод усіх страт партызан рускія склалі – 20,3 %, сярод расстраляных за злачынствы – 23,8 %; адпаведна: украінцы – 4,4 % і 5,8 %, палякі – 0,8 % і 2,0 %, яўрэі – 2,2 % і 1,8 %, беларусы – 68,4 % і 60,2 %, іншыя нацыянальнасці – 3,9 % і 6,4 %. *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 88.

Беларусі, ці 1,8 % выпадкаў на кожны партызанскі атрад. Аднак, калі параўноўваць колькасць расстраляных партызан з агульным лікам страт, якія панеслі беларускія партызаны за перыяд вайны (44791), становіцца відавочным іншае. Амаль кожная 20-я ахвяра з партызанскага асяроддзя лічыцца на рахунку партызанскіх судоў, што складае 5,2 % усіх страт, якія панеслі партызаны Беларусі за гады вайны 1941–1944 гг.[993]

Аналіз суадносін агульнай нацыянальнай колькасці партызан і расстраляных, а таксама агульнай нацыянальнай колькасці загінуўшых і асуджаных партызанскімі судамі яскрава сведчыць аб існаваўшых у партызанскім асяроддзі роўных адносінах да ўсіх нацыянальных груп. За парушэнні караліся ўсе без выключэння, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці.

Праведзеныя даследаванні яскрава сведчаць, што ў партызанскім асяроддзі адбываліся складаныя нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы, якія ахапілі ўсе сацыяльныя і нацыянальныя слаі беларускага народа, аказалі значны ўплыў на дэмаграфічную сітуацыю Беларусі ў пасляваенны час. Вынікам антыгітлераўскай барацьбы беларускіх партызан была гібель 30058 сыноў і дачок беларускага народа, 14733 прадстаўнікоў рускага, украінскага, польскага і іншых народаў. У барацьбе з германскімі акупантамі загінула 20104 прадстаўнікоў інтэлектуальнай працы[994]. Вельмі значным быў унёсак нацменшасцей у барацьбу з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў Беларусі.

**Высновы.** Пасля пачатку Другой сусветнай вайны адбылося ўз'яднанне беларускіх земляў у адзінай савецкай дзяржаве, што з'явілася найважнейшым палітычным актам у жыцці беларускага народа. Большая частка (бяднейшая) народа з энтузіязмам сустрэла ўсталяванне ў Заходняй Беларусі савецкай улады. У той жа час ідэалогія класавага падыходу ў рашэнні сацыяльна-палітычных праблем прывяла да нацыянальна-палітычных супярэчнасцей. У Заходняй Беларусі прадстаўнікі былога кіруючага апарату, заможнае насельніцтва, уладальнікі прадпрыемстваў і фінансавых структур, патрыёты Другой Рэчы Паспалітай варожа ўспрынялі дзеянні новай улады, што прывяло да ўзнікнення і росту польскага нацыянальнага падполля.

Кіраўніцтва БССР, мясцовыя партыйныя і савецкія органы, каб замацаваць сваю ўладу і саветызаваць заходнебеларускае насельніцтва, імкнуліся развіваць культуру, духоўныя асаблівасці нацыянальных меншасцей. У дзяржаўных органах кіравання заходніх абласцей БССР былі прадстаўлены ўсе нацыянальнасці. Кіруючы апарат падбіраўся адміністратыўным шляхам, з улікам нацыянальнага складу насельніцтва, а таксама пераводам на кіруючыя і адказныя пасады ў Заходнюю Беларусь асобаў з усходу.

Змены ў эканамічным і сацыяльным жыцці Заходняй Беларусі, якія характарызаваліся нацыяналізацыяй, правядзеннем калектывізацыі, барацьбой з рэлігіяй, суправаджаліся палітычнымі рэпрэсіямі і буйнымі дэпартацыямі

[993] *Каваленя А.А., Калеснікава А.А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР). С. 88–89.
[994] Там жа. С. 89.

насельніцтва. Сацыялістычныя пераўтварэнні, падаўленне польскасці і тое, што новая эліта ў Заходняй Беларусі часцяком фарміравалася не з прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, прывялі пазней да развіцця калабарацыянізму ў Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі рэспублікі.

З першых дзён вайны 1941–1945 гг. на тэрыторыі Беларусі акупацыйныя ўлады здзяйснялі нацыянальную палітыку, якая была накіравана на дамінаванне германскай расы, анямечванне і эксплуатацыю пэўнай часткі славянскага насельніцтва, генацыд (яўрэяў, цыганоў). Гітлераўскія агрэсары імкнуліся распальваць супярэчнасці, якія мелі месца паміж палякамі, рускімі, беларусамі і яўрэямі.

Акупацыйныя ўлады, знішчаючы яўрэяў, усіх не згодных з іх дзеяннямі, праводзячы палітыку германізацыі, у той жа час стваралі ўмовы для пэўнага эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця неяўрэйскай часткі насельніцтва. Гэта паспрыяла таму, што нацыянальнае жыццё часткі нацыянальных меншасцей Беларусі ажывілася. Найбольш актыўнымі ў Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі ў адных рэгіёнах былі беларусы і рускія, у іншых палякі і ўкраінцы. Найменш цікавіліся “палітыкай” татары. У той жа час, рост значэння фактару этнічнасці для насельніцтва Беларусі і дзейнасць нацыянальных аб’яднанняў, якая ў асноўным мела культурна-дабрачынны характар, не прывялі да антаганістычных міжнацыянальных канфліктаў, як таго чакалі акупанты. Іх намаганні па культывацыі напружанасці паміж рознымі этнасамі не далі чаканых вынікаў. Акупацыя Беларусі, яе тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел паспрыялі актывізацыі дзейнасці розных нацыяналістычных сіл. На захадзе Беларусі вялікую працу разгарнулі польскія нацыяналісты, якія імкнуліся выкарыстаць сітуацыю для рэалізацыі сваіх палітычных памкненняў. У паўднёвых раёнах Беларусі дзейнічала Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН–УПА).

Вельмі значнымі былі ўдзел і роля нацменшасцей Беларусі ў ваенных падзеях на франтах, працы ў тыле, барацьбе з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў, а таксама ў складзе атрадаў антыгітлераўскага не савецкага супраціву (у польскім, украінскім, літоўскім і інш. падполлях). Усім патрэбна была перамога над гітлераўскімі акупантамі.

Антыгітлераўскі савецкі супраціў ініцыіраваўся мясцовым насельніцтвам, партыйна-савецкім актывам БССР, кіраўніцтвам СССР і каардынаваўся на тэрыторыі Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі. Калі абагульніць вядомыя дадзеныя за перыяд 1941–1944 гг. у партызанскіх фарміраваннях Беларусі, нацыянальныя меншасці складалі 28,8 % ад агульнай колькасці партызан рэспублікі: рускія – 19,3 %, украінцы – 3,8 %, яўрэі – 2,1 %, палякі – 0,8 % і 2,8 % складалі прадстаўнікі 68 нацый і народнасцей СССР і замежных краін. Асноўную масу партызан Беларусі складалі беларусы і нацыянальныя меншасці, якія пражывалі тут у даваенны перыяд. У структуры падпольных арганізацый, у сярэднім, нацыянальныя меншасці складалі 25,7 % ад агульнага ліку падпольшчыкаў: рускія – 17,1 %, украінцы – 3,6 %, палякі – 1,6 %, яўрэі – 1,3 %, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей – 2,1 %.

У гады Другой сусветнай вайны прадстаўнікам нацыянальных меншасцей Беларусі давялося сутыкнуцца з такімі з’явамі, якія паставілі іх перад фактам самаго іх існавання. Грамадства раскалолася на два супрацьборуючыхся бакі: адзін у сувязі з рознымі прычынамі падтрымаў акупантаў, другі са зброяю ў руках выступіў супраць. Дзейнасць нацыянальных фарміраванняў на тэрыторыі БССР і СССР уяўляе з сябе частку складанага гістарычнага працэса перыяда самай разбуральнай у гісторыі чалавецтва вайны. Нацыянальныя фарміраванні, якія выступілі на баку гітлераўскай Германіі адзначыліся асаблівай жорсткасцю ў знішчэнні мірнага насельніцтва. Нацыянальныя фарміраванні ў складзе партызанскіх атрадаў і груп, а таксама ў складзе Чырвонай Арміі праявілі масавы гераізм у барацьбе з нацыстамі і іх саюзнікамі.

У Беларусі існавалі розныя формы супрацоўніцтва з акупантамі пэўнай часткі насельніцтва. Да палітычнай калабарацыі адносяцца асобы, якія працавалі ў створаных акупантамі ці з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах (старасты, бургамістры, юдэнраты і г.д.), грамадскіх арганізацыях, з’яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Ваенная калабарацыя: а) мясцовы паліцэйскі апарат, служба парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фарміраванні (у прыватнасці латышскія), чыгуначныя батальёны, “усходнія” батальёны, казацкія фарміраванні, агенты абвера, СД, ГФП, паліцыі, дапаможныя будаўнічыя і іншыя часткі; б) мясцовая самаахова (БКС, БКА), фарміраванні польскай АК і ўкраінскай АУН-УПА, якія супрацоўнічалі з немцамі, члены абарончых ваенных паселішчаў (абарончыя вёскі), рускія казацкія часткі, атрады арміі Камінскага. Эканамічная (гаспадарчая) калабарацыя ўключае кіраўнікоў і служачых гаспадарчых органаў, прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянавалі ў гады вайны, непасрэдна ці ўскосна працуючы на акупантаў. Частка беларусаў і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі былі ў складзе розных груп калабарантаў. Акрамя таго на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі нацыянальныя вайсковыя часці калабарацыяністаў, якія складаліся з асоб, якія не з’яўляліся мясцовымі жыхарамі і апынуліся тут пасля пачатку і ў ходзе вайны.

Нягледзячы на супрацоўніцтва часткі беларусаў і іншых этнічных супольнасцей з гітлераўскімі акупантамі, традыцыйныя добразычлівыя ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных народаў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны былі захаваныя. Яны ўмацаваліся ў выніку сумеснай барацьбы з агульным ворагам – гітлераўскімі захопнікамі.

## ГЛАВА 5
## УДЗЕЛ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ У ГРАМАДСКІМ І КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІМ ЖЫЦЦІ БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД, СПРОБАЎ РЭФОРМ, НАРАСТАННЯ КРЫЗІСУ І ЗАКАНЧЭННЯ ІСНАВАННЯ САВЕЦКАЙ СІСТЭМЫ (1945–1991)

Асабліва важным падаецца аналіз удзелу нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці ў пасляваенны час, перыяд рэформ, крызісу і заканчэння існавання савецкай сістэмы (1945–1991). Тады ў шматнацыянальнай і шматканфесіянальнай краіне за кароткія тэрміны быў створаны новы навукова-тэхнічны і развіты існуючы інтэлектуальны патэнцыял, але адбыліся пэўныя дэфармацыі ў нацыянальнай сферы.

На грамадскае і эканамічнае развіццё пасляваеннай Беларусі ўплывалі як аб'ектыўныя фактары – вынікі вайны і адпаведныя страты, неабходнасць аднаўлення гаспадаркі і мінімальны бюджэт, кадравае пытанне, так і суб'ектыўныя ў выглядзе накірункаў дзеянняў улад – інтэрнацыяналізм, эміграцыя, дэпартацыі, павышэнне ўзроўню адукацыі, правядзенне рознага роду кампаній і г. д.

Даследуемы перыяд характарызуецца лёсавызначальнымі гадамі для нашай краіны: 1945, 1953, 1956, 1964, 1985, 1990 гг. Аналіз падзей, што адбыліся, дазваляе адзначыць некаторыя тэндэнцыі, якія паўплывалі на прадстаўніцтва і магчымасці ўдзелу нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурным жыцці рэспублікі.

### 5.1 Дынаміка, асноўныя тэндэнцыі і кірункі ў дзейнасці

Развіццё грамадскага жыцця беларускага насельніцтва ў пасляваенны час ішло ў рэчышчы тых палітычных, сацыяльна–эканамічных, культурных задач, якія ставіліся перад рэспублікай. Грамадская дзейнасць нацыянальных меншасцей выяўлялася ў руху за камуністычныя адносіны да працы, настаўніцтве, у масавым распаўсюджанні працоўных пачынаў па стварэнні ўдарных і гаспадарча–разліковых брыгад высокай якасці, сацыялістычным спаборніцтве і суправаджалася павелічэннем пераважна колькасных паказчыкаў грамадскай актыўнасці, ростам колькасці актывістаў. Гэта не заўсёды прыводзіла да якаснага паляпшэння грамадскай работы і часта насіла фармальны характар.

Грамадскае і культурнае жыццё краіны залежыць ад сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі летам 1944 г. перад урадам БССР паўстала вострая патрэба ў матэрыяльных і фінансавых сродках. Цэнтральны ўрад СССР вызначыў Беларусі, у параўнанні з некаторымі іншымі саюзнымі рэспублікамі, больш высокі працэнт адлічэнняў у свой бюджэт ад сабраных на яе тэрыторыі паступленняў ад ваеннага падатку, дзяржаўных пазык, размешчаных сярод насельніцтва і калгасаў. Аднаўляць разбураную вайной і гітлераўскай акупацыяй народную гаспадарку Беларусі дапамагалі ўсе саюзныя рэспублікі СССР. Аднак асноўная нагрузка лягла на плечы яе насельніцтва, як беларусаў, так і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Не было такога віду

вытворчасці, дзе б яны не працавалі. Складанасць вывучэння гэтага пытання ў тым, што ў тагачаснай навуковай літаратуры, перыядычным друку пры асвятленні вытворчых дасягненняў не падкрэслівалася прыналежнасць перадавікоў да той ці іншай традыцыйнай этнічнай супольнасці рэспублікі.

У пятай пяцігодцы (1951–1955) быў узяты курс на стварэнне ў Беларусі такіх відаў вытворчасці, для якіх на месцы амаль поўнасцю адсутнічала патрэбная сыравіна. Гэтым самым усталёўвалася празмерная вытворча-эканамічная і тэхнічная залежнасць Беларусі ад іншых рэгіёнаў саюзнай дзяржавы. З году ў год павялічваліся маштабы гаспадарчай дзейнасці. Ідэалагічным службам кампартыі і камсамола, розным адміністратыўна-гаспадарчым і прафсаюзным структурам удалося пасеяць у масах веру ў перавагу, гістарычную перспектыву сацыялізму, і дзеля яго немінучай перамогі людзі працавалі з вялікім напружаннем і энтузіязмам[995]. Афіцыйная дактрына сцвярджала, што вырашальным фактарам магутнасці савецкай дзяржавы з'яўляецца дружба народаў СССР, іх маральна-палітычнае адзінства. Гэта ўплывала на размяшчэнне прадукцыйных сіл, нават не звяртаючы ўвагу на тое як гэта адаб'ецца на захаванні і развіцці традыцыйнага ўкладу жыцця. Сцвярджалася, што калі і надалей так будуць жыць і працаваць усе савецкія нацыі і народнасці, ім не будзе роўных у свеце па ўзроўні эканамічнага і сацыяльна-культурнага развіцця, ступені інтэрнацыяналізацыі і маналітнасці грамадства.

У савецкі час паступовасць, дабраахвотнасць і цярплівасць не прымаліся ў разлік, мясцовыя ўмовы, нацыянальныя культурна-гістарычныя асаблівасці не ўлічваліся. Асноўны ціск у рабоце рабіўся на фарсіраваныя тэмпы развіцця з прымяненнем каманднa-бюракратычных метадаў. Пры рашэнні нацыянальнага пытання, больш чым у іншых сферах нашага жыцця, праяўляўся класавы дагматызм, асабліва моцна – у падыходзе да праблемы нацыянальнай самасвядомасці. Класавый дэтэрмінізм закрыў сабою агульначалавечыя каштоўнасці, якія арганічна ўваходзяць у нацыянальнае пытанне. Акадэмік І. Ігнаценка лічыў: ”Дагматызм перашкаджаў зірнуць на нацыянальныя адносіны і нацыянальнае будаўніцтва дастаткова шырока і аб'ектыўна з пазіцый агульначалавечых інтарэсаў, не кажучы ўжо аб інтарэсах усіх слаёў і груп насельніцтва той ці іншай нацыі альбо народнасці, уключаючы рэлігійныя колы і інтарэсы адной асобы”[996].

Найбольш спрыяльныя ўмовы для развіцця БССР склаліся ў 1965–1975 гг. Рэспубліка аднавіла свой эканамічны патэнцыял, прычым на той час на вышэйшай тэхнічнай аснове. Ва ўсіх галінах была праведзена рэканструкцыя, уводзілася больш дасканалае абсталяванне, прымяняліся новыя метады вытворчасці, павышалася ступень механізацыі, электрыфікацыі і аўтаматызацыі. Створаны новыя галіны прамысловасці. Істотна павысілася кваліфікацыя і прафесійная падрыхтоўка кадраў усіх узроўняў. Сярэднегадовы тэмп прыросту нацыянальнага даходу ў перыяд 1976–1986 гг. склаў па рэспубліцы 5,4 % у параўнанні з 3,9 % у

---

[995] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 70.

[996] *Игнатенко И.М.* Национальный вопрос и современность // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. С. 34.

СССР, прамысловай вытворчасці – 6,3 % супраць 4,1 %. Апераджальнае развіццё рэспублікі па асноўных эканамічных паказчыках захоўвалася і ў 1986–1990 гг.[997]

У пасляваенныя дзесяцігоддзі ў БССР на большасці пасадаў знаходзіліся прыезджыя, недахоп кадраў запоўняўся перасяленцамі – небеларусамі з іншых рэгёнаў СССР. Працэс папаўнення ў значных памерах іншанацыянальнымі элементамі штатаў дзяржаўных і грамадска-палітычных структур ці сфераў культуры, навукі, народнай адукацыі і г.д. адбываўся двума шляхамі – праз цэнтралізаванае размеркаванне (каб забяспечыць кіруючыя пасады савецкімі і партыйнымі кадрамі, адданымі савецкай дзяржаве і камуністычнай партыі) і добраахвотны прыезд людзей. Сітуацыя з кадрамі стала паступова мяняцца толькі ў 1970–1980-я гг., калі стала адбывацца рэгіяналізацыя працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, а таксама тэндэнцыя да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых кадравых рэсурсаў для папаўнення складу кіруючых супрацоўнікаў і іншых спецыялістаў.

**Асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці нацыянальна-культурнага жыцця ў 1945–1985 гг.** Актыўнасць насельніцтва ў грамадскім жыцці вызначалася не толькі сацыяльна-эканамічным станам, але і шэрагам іншых прычын, найбольш важныя з іх: узрост, адукацыя, сацыяльна–прафесійны статус, сямейнае становішча, асабістыя схільнасці. На грамадскую актыўнасць жыхароў БССР пэўны ўплыў аказваў тып горада: у невялікіх гарадах з насельніцтвам менш за 50 тыс. чалавек яна ніжэйшая, чым у буйных гарадскіх паселішчах. Як паказалі матэрыялы этнасацыялагічнага даследавання 1986 г., сельскія жыхары па грамадскай актыўнасці прыкметна саступалі гараджанам. Характэрна, што па меры павышэння адукацыі, сацыяльна-прафесійнага статусу чалавека, сярод камуністаў і камсамольцаў грамадская актыўнасць узрастала.

Бясспрэчным застаецца той факт, што пераважная частка народа актыўна ўдзельнічала ў выбарах, падтрымлівала афіцыйную палітыку. Аднак гэты высокі ўзровень палітычнага ўдзелу ў выбарах меў у асноўным мабілізацыйны, а не добраахвотны характар.

Шмат каму грамадская праца прыносіла маральнае задавальненне, якое было заснавана на ўсведамленні яе карысці для людзей. Разам з тым, некаторыя тлумачылі сваю пасіўнасць у грамадскай дзейнасці занятасцю вучобай, доглядам дзяцей ці фармальным характарам гэтай працы, іншы раз не звязанай з канкрэтным жыццём чалавека. Папулярнасцю ў моладзі карысталіся аматарскія аб’яднанні, мастацкая самадзейнасць, турызм, спорт, выезды за горад, прагулкі ў парку, на беразе возера ці ракі.

У рэспубліцы дзейнічаў цэлы шэраг добраахвотных арганізацый: таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, таварыства аховы прыроды, добраахвотнае таварыства садзеяння арміі, авіяцыі і флоту (ДТ СААФ), таварыства Чырвонага Крыжа, таварыства выратавання на водах (ТВВОД), таварыства аматараў кнігі, таварыства ведаў, таварыства паляўнічых і рыбаловаў,

[997] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 299.

геаграфічнае таварыства і шмат іншых. Усе яны мелі свой актыў і, як правіла, пярвічныя ячэйкі ў працоўных калектывах. Колькасна яны ахапілі значную частку насельніцтва, аднак іх дзейнасць не набыла масавага характару і не аказвала істотнага ўплыву на побыт нацыянальных меншасцей БССР[998]. З прычыны рэгламентацыі і татальнага кантролю за іх дзейнасцю з боку партыйных органаў.

Усе гэтыя арганізацыі ствараліся па ініцыятыве кампартыі і таму яе кіруючыя структуры кантралявалі падбор кіраўніцтва, колькасны склад добраахвотных таварыстваў і саюзаў, мерапрыемствы, якія праводзіліся, а таксама іншыя пытанні іх арганізацыі і дзейнасці. Пры гэтым імкнуліся падпарадкаваць свайму ўплыву і кантролю дзейнасць любой грамадскай арганізацыі, незалежна ад таго, у якой сферы яна праходзіла, нават знешне вельмі далёкай ад палітыкі.

Практычна ўсе кіраўнікі грамадскіх арганізацый падбіраліся і зацвярджаліся непасрэдна партыйнымі органамі. Так, у сакавіку–чэрвені 1949 г. абкамы, гаркамы і райкамы КП(б)Б, выконваючы ўказанні ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, падабралі і зацвердзілі на сваіх паседжаннях старшыняў абласных, гарадскіх і раённых камітэтаў ДТ СААФ. Нават старшыні вулічных камітэтаў – далёка не першых па значэнні грамадскіх аб’яднанняў (іх у гарадах Беларусі па стане на 20.04.1953 г. было арганізавана 772) – падбіраліся і прызначаліся райкамамі партыі. Кіраўнікі найбольш масавых грамадскіх арганізацый, пачынаючы з узроўню горада і раёна, уключаліся ў наменклатуру абкамаў партыі[999].

Афіцыйна прынята лічыць, што ў СССР была адзіная ідэалогія, адзіныя каштоўнасці, але гэта з’яўляецца слушным толькі ў дачыненні да правячай эліты. У народа не было духоўнага адзінства, які падзяляўся на дзве часткі – наменклатуру і звычайных грамадзян. У пэўнай часткі грамадзян захоўваліся свае нацыянальныя і рэлігійныя каштоўнасці. Гэта прызнавалі нават улады, якія запісамі ў анкетах падкрэслівалі нацыянальнасць грамадзян.

У сферы рэгулявання нацыянальна-культурнага жыцця БССР панавалі праграмныя палажэнні, неаднаразова падкрэсліваемыя ў адпаведных пастановах і рэзалюцыях цэнтральных і рэгіянальных органаў улады. Грамадству прапаноўвалася “весці непрымірымую барацьбу супраць праяваў буржуазнага нацыяналізму, супраць тэндэнцый да ідэалізацыі і затушоўвання сацыяльных супярэчнасцяў мінулага, да фальсіфікацыі сапраўднай гісторыі той ці іншай нацыі і яе ўзаемаадносін з іншымі народамі СССР, супраць асобных праяваў нацыянальнай замкнёнасці і выключнасці”. Падкрэслівалася, што “савецкі патрыятызм па сутнасці сваёй інтэрнацыянальны і несумяшчальны з тэндэнцыямі да нацыянальнай абмежаванасці, незалежна ад таго, у якой форме яны праяўляюцца”, а “выхаванне савецкага патрыятызму, любові да сацыялістычнай Радзімы, да вялікай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза – важнейшая, першачарговая задача ідэалагічнай работы”. Асаблівая ўвага партыйных органаў звярталася на неабходнасць весці барацьбу супраць

[998] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 360.
[999] Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: ХХ стагоддзе. С. 425–426.

нацыяналізму, які "па сваёй сутнасці з'яўляецца варожым сацыялізму, дружбе народаў, супярэчыць аб'ектыўнаму працэсу развіцця і збліжэння сацыялістычных нацый"[1000]. У культурна-асветніцкай дзейнасці гэта прыводзіла да паслядоўнай і сістэматычнай русіфікацыі.

У 1964 г. пачынаецца "эпоха застою", якая найперш характарызуецца тым, што на працягу двух дзесяцігоддзяў наша краіна не была ахоплена стыхіяй рэзкіх палітычных перамен. У тым годзе лідарам камуністычнай партыі быў выбраны Л. Брэжнеў. Завяршыўся час спробаў абнаўлення камандна-адміністратыўнай палітычнай сістэмы краіны. Кампартыя нязменна заставалася вядучым звяном грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны. Яшчэ больш узрасла ступень "абдзяржаўлення" прафсаюзаў і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Яны пераўтварыліся ў элементы партыйна-дзяржаўнай сістэмы[1001].

Кіраўніцтва БССР на чале з К. Мазуравым, а затым П. Машэравым усё рабіла для таго, каб выканаць указанне ЦК КПСС аб зліцці нацый і ўтварэнні новай сацыяльнай супольнасці – савецкага народа, які ўтворыцца на грунце рускай мовы і культуры. Таму практычна мала што здзейсніла для развіцця этнічнай самасвядомасці беларусаў і нацыянальных меншасцей, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі.

Дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей насіла інтэрнацыянальны характар таму, што вызначалася асноўнымі кірункамі знешняй і ўнутранай палітыкі. Інтэрнацыяналізм ва ўнутранай палітыцы СССР быў запатрабаваны і знешнімі абставінамі – утварэннем "сацлагеру", аб'яднання краін сацыялістычнай арыентацыі. А на базе рускай культуры таму, што ў гады вайны зварот да самасвядомасці і гераічнай гісторыі Расіі (асабліва ваенна-захопніцкай) паспрыяў вялікай перамозе[1002] (спробаў звярнуцца да славутага мінулага іншых народаў не было). У выніку амаль цалкам аформіўся і адпавядаў установкам ідэолагаў КПСС–КПБ выхаваны ў камуністычна-імперскім духу, рускамоўны "савецкі народ" – як новая гістарычная супольнасць.

Нацыянальна-культурнае жыццё нацыянальных меншасцей Беларусі, за выключэннем рускіх, ад пачатку 1950-х да сярэдзіны 1980-х гг. фактычна было абмежавана рамкамі рэлігійнай сферы.

Абумоўлена гэта было ў значнай меры тым, што ў БССР практычна не існавала на той час ніводнай школы для нацыянальных меншасцей, не выпускаліся кнігі і перыядычныя выданні на нацыянальных мовах. Ды і

---

[1000] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 298, 300.

[1001] Прафсаюзы ўсёй краіны, у 1950–80-я гады займаліся самымі рознымі праблемамі жыцця прадпрыемстваў і ўстаноў. У поле іх зроку знаходзіліся пытанні сацыялістычнага спаборніцтва і павышэння прадукцыйнасці працы, тэхнічнага прагрэсу, рацыяналізатарства і вынаходніцтва, аховы працы, заключэння калектыўных дамоў, кіравання вытворчасцю, вытворчыя нарады, грамадскія канструктарскія, тэхналагічныя бюро, будаўніцтва жылля і яго размеркавання, спорту, фізкультуры і турызму, аховы грамадскага парадку і дзейнасці таварыскіх судоў, сацыяльнага страхавання і санітарна-курортнага аздараўлення і шматлікія іншыя. Фактычна дзяржава пераклала частку сваіх функцый на грамадскую арганізацыю. Гэта падвышала аўтарытэт прафсаюзаў, але адначасова вяло да большага іх адзяржаўлення. *Агеев А.Г., Пушкин И.А.* История профсоюзного движения Могилёвщины. С. 145–146, 170–171.

[1002] *Кожинов В.В.* Наследники победы. М., 2007. С. 456.

колькасць тых прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, што карысталіся роднай мовай у паўсядзённым жыцці, увесь час памяншалася і стала невялікай, сярод татараў літаральна адзінкі маглі чытаць і пісаць на роднай мове.

Вядома, што рэлігія дае нацыі (альбо этнасу) інтэрпрэтацыю быцця, паказвае сэнс і мэту існавання чалавека. Нацыянальная ідэя і рэлігія ў сацыяльнай прасторы выконваюць агульныя функцыі і складаюць сістэму значных для грамадства каштоўнасцей, выпрацаваных традыцыямі і сацыяльнай практыкай, якія адлюстроўваюць аснову гэтага грамадства, злучаюць мінулае, сучаснае і будучае[1003]. Нацыянальна-рэлігійная кансалідацыя з'уляецца фактарам самазахавання той ці іншай нацыі альбо дзяржавы.

У савецкія часы перапісы насельніцтва не ўлічвалі колькасць вернікаў. Немагчыма дакладна вызначыць працэнт прадстаўнікоў нацменшасцей таго ці іншага веравызнання. Таму па-за нашай увагаю засталася дзейнасць праваслаўнай царквы (РПЦ), у склад якой пераважна ўваходзілі беларусы, рускія, украінцы, цыганы. Аб'ектам нашага аналізу стала каталіцкая царква, стараабраднікі, іслам і іўдаізм, што дазволіла вызначыць пэўны ўзровень грамадскай актыўнасці літоўскага, польскага, часткі рускага, татарскага і яўрэйскага насельніцтва Беларусі.

Рэлігійная сфера жыцця нацыянальных меншасцей Беларусі ў той час знаходзілася пад татальным кантролем партыйна-савецкіх органаў. Дзяржаўна-канфесійная палітыка была накіравана на поўнае выцясненне рэлігіі з духоўнай сферы жыцця чалавека і ўплыву на грамадства. У яе развіцці вылучаюцца некалькі этапаў, кожны з якіх меў свае асаблівасці і спецыфіку[1004]. 1944–1953 гг. – этап характарызаваўся пэўнай лібералізацыяй дзяржаўна-канфесійнай палітыкі. 1954–1964 гг. – перыяд жорсткай канфрантацыі дзяржавы з рэлігійнымі арганізацыямі, перыяд ганенняў і рэпрэсій. 1965–1988 гг. – параўнальна стабільны стан рэлігійных арганізацый пры вонкава лаяльным заканадаўстве і пры татальным кантролі за іх дзейнасцю[1005]. Неабходна ўлічваць тое, што антырэлігійная праца ў СССР праводзілася ўвесь час, але ў выглядзе "кампаній". Яна станавілася актыўнай і жорсткай з прыходам да ўлады новага кіраўніка дзяржавы – генеральнага сакратара ЦК КПСС, а затым паціху ўсё супакойвалася. Кантроль за

[1003] *Кутузова Н.* Государство, нация, религия: опыт взаимодействия в Беларуси в контексте истории // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 2. Мінск, 2003. С. 182.

[1004] *Балтрушэвіч Н.Г.* Пратэстанцкія арганізацыі БССР у 1944–1985 гг.: структура, формы дзейнасці, узаемаадносіны з дзяржавай (асноўныя тэндэнцыі развіцця) // Проблемы человека в современном социально-гуманитарном знании: материалы Международного научно-практического семинара, Витебск, 14 мая 2010 г. Ч. 1. Витебск, 2010. С. 221.

[1005] У той жа час, асабліва жорсткія адносіны ўладаў былі да вернікаў, якія не жадалі, каб пазбегнуць татальнага кантролю, афіцыйна рэгістраваць свае абшчыны ў органах улады. У гэтым партыйна-савецкае кіраўніцтва бачыла праявы іншадумства, непадпарадкавання савецкай уладзе, незадаволенасць гэтай групы вернікаў існуючымі парадкамі ў СССР і БССР. Улады лічылі, што ў краіне існуе сектанцкае падполле. За правядзенне рэлігійных сходаў, рэлігійнае выхаванне дзяцей вернікаў і іх лідараў жорстка каралі. Судовыя выракі: "Пяць гадоў зняволення за незаконную рэлігійную дзейнасць" не рэдкасць у БССР у 1970-я гг. Улады бачылі ў пашырэнні рэлігійнасці сярод насельніцтва – велізарную крамолу ў савецкай, сацыялістычнай краіне, з атэістычным і матэрыялістычным светапоглядам.

выкананнем заканадаўства аб культах і дзейнасцю рэлігійных арганізацый ажыццяўляў інстытут упаўнаважаных Савета па справах рэлігіі[1006].

Дзякуючы палітыцы лібералізацыі, якая была выклікана роляй царквы ў гады вайны 1941–1945 гг., у першыя пасляваенныя гады ішло некаторае ажыўленне рэлігійнасці насельніцтва. У рэлігійна-грамадскім жыцці ўзнаўляліся хросныя ходы, паломніцтва да святых месцаў. Кожны другі сельскі жыхар і кожны чацвёрты гараджанін свядома называў сябе вернікам.

У перыяд параўнальна стабільнага стану рэлігійных арганізацый пры татальным кантролі за іх дзейнасцю (1965–1985) вернікаў найбольш адольвалі дзве напасці: па-першае, катастрафічны недахоп дзейных храмаў і святароў; па-другое, павялічваліся выпадкі крадзяжоў з касцёлаў і цэркваў найбольш каштоўных прадметаў рэлігійнага культа.

Аналіз колькасці культавых будынкаў, якія абслугоўвалі вернікаў польскай, літоўскай, рускай і яўрэйскай нацыянальнасцей у гэты час практычна заставаўся нязменным (гл. табліцу 30). Вернікі пастаянна ўздымалі перад партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам пытанні аб падрыхтоўцы святароў, вяртанні храмаў і рэгістрацыі прыходаў, дзе яны існавалі раней. Дарэчы, у выкананне пастаноў II Ватыканскага сабору аб правядзенні набажэнстваў на родных мовах насельніцтва, ад святкавання Ражства Хрыстова ў снежні 1969 г., у Гродзенскай вобласці ў касцёлах ужо не выкарыстоўвалася лацінская мова, а толькі польская[1007]. Гэта значна перашкодзіла поўнай моўнай асіміляцыі палякаў. Адносна стабільным заставаўся лік стараабрадных прыходаў у месцах традыцыйнага пражывання асобаў рускай супольнасці ў Беларусі. У Віцебску, Гомелі, Барысаве на ўсяночных прысутнічала ад 200 да 800 вернікаў сталага ўзросту, у асноўным жанчын[1008]. Памяншэнне колькасці сінагог было выклікана не толькі адыходам яўрэяў ад рэлігіі, перашкодамі з боку ўладаў, але і скарачэннем колькасці яўрэйскага насельніцтва ў БССР. Асіміляцыйныя працэсы (інтэграцыйныя, русіфікацыя, змешаныя шлюбы і г.д.) прывялі да памяншэння ролі рэлігіі ў асяродку татараў.

Святароў не хапала таму, што не было дастатковых магчымасцей для іх падрыхтоўкі. Ксяндзоў для рыма-каталіцкай царквы рыхтавалі у Рыжскай каталіцкай духоўнай семінарыі і Каўнаскай каталіцкай міжепархіяльнай

[1006] У Савецкім Саюзе інстытут упаўнаважаных Савета па справах рэлігіі пры Савеце Міністраў СССР узначальваў старшыня. На тэрыторыі Беларусі яму непасрэдна падпарадкоўваўся Упаўнаважаны па БССР, які размяшчаўся ў Доме Урада (Мінск) і каардынаваў адзначаную працу ў рэспубліцы праз адпаведныя структуры па абласцях. У сферы ідэйна-выхаваўчай і атэістычнай працы ён меў вельмі шырокія паўнамоцтвы. Адной з асноўных задач упаўнаважаных з’яўлялася недапушчэнне росту колькасці вернікаў і рэлігійных абшчын, а таксама вывучэнне грамадска-палітычных поглядаў і настрояў сярод дадзенай катэгорыі грамадзян. Неабходна падкрэсліць, што за ўсе гады савецкай улады якога-небудзь, належным чынам наладжанага, уліку колькасці насельніцтва паводле яго канфесійнай прыналежнасці не праводзілася. Упаўнаважаныя ў сваіх справаздачах прыводзілі колькасць вернікаў, прыблізна падлічыўшы іх прысутнасць пад час набажэнстваў у храмах.

[1007] Інфармацыя аб ходзе свята Ражства Хрыстова сярод вернікаў Гродзенскай вобласці. 15.01.1970 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 9

[1008] “Аб выніках назірання за выкананнем заканадаўства аб культах у дні святкавання Пасхі ліст у ЦК КПБ упаўнаважанага савета па спрвах рэлігій па БССР А.Залескага за № 152 ад 27.05.1983 г. // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 65.

духоўнай семінарыі[1009]. З 1975 па 1985 гг. Рыжскую рыма-каталіцкую семінарыю скончылі – 38 асоб, якія атрымалі статус ксяндза. 1975 г. – 3; 1976 – 3; 1977 – 2; 1978 – 3; 1979 – 1; 1980 – 5; 1981 – 8; 1982 – 1; 1983 – 6; 1984 – 6[1010]. На 01.10.1985 г. у семінарыі навучаліся на 6 курсах – 62 слухача 7 нацыянальнасцей: латышоў – 13, палякаў – 21, украінцаў – 12, беларусаў – 6, немцаў – 7, эстонцаў – 2, рускіх – 1. У пастанове Савета па справах рэлігій пры СМ СССР "Аб мерах па ўзмацненню кантроля за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах каталіцкімі аб'яднаннямі ў БССР" (1982 г.) адзначалася, што апаратам Упаўнаважанага Савета ўвесь час вядзецца праца па адбору кандыдатаў на вучобу ў Рыжскую каталіцкую духоўную семінарыю з ліку лаяльных вернікаў і з улікам іх месца жыхарства. У 1982 і 1983 гг. паступілі на вучобу ў гэту семінарыю 6 чал.[1011]

Табліца 30 – Колькасць дзейных храмаў і святароў у БССР, 1970-я гг.[1012]

| **Назва канфесіі / год** | **1970** | **1974** | **1978** | **1980** |
|---|---|---|---|---|
| Рыма-каталіцкая царква: колькасць храмаў (святароў) | 104 (65) | 104 (58) | 105 (51) | 109 (53) |
| Іудаізм: колькасць сінагог | 26 | 21 | 18 | 15 |
| Стараабрадная царква –белакрыніцкай згоды і беспапоўцы: колькасць храмаў (святароў і настаўнікаў) | 27 (22) | 26 (24) | 25 (22) | 24 (20) |

У 1985 г. былі прыняты 3 украінцы, 2 палякі, 2 беларусы, эстонец. З іх 2 з Гродзенскай вобласці БССР. У той час нярэдкімі былі выпадкі, калі ў семінарыю прымаліся асобы, якія раней пражывалі на тэрыторыі БССР і для паступлення ў семінарыю спецыяльна пераехалі ў Латышскую ССР. Яны ўладкоўвалася на працу качагарамі, вартаўнікамі ў мясцовыя касцёлы, align="left"рознарабочымі на дзяржаўныя прадпрыемствы[1013].

Свецкімі ўладамі было дазволена прымаць на абучэнне ў Каунаскую каталіцкую міжепархіяльную духоўную семінарыю штогод да 20 клерыкаў. У 1978 г. паступіла вучыцца 20 асоб. Наогул у той год у семінарыі вучылася 72 клерыка: 1 курс – 19, 2 курс – 21, 3 курс 15, 4 курс – 11, 5 курс – 6 клерыкаў. У 1979 г. у семінарыю прынялі 19 чалавек. Усяго навучалася 82 клерыка.

---

[1009] *Пушкин И.А.* Латвийское влияние на религиозную жизнь советской Беларуси // Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 230–238.

[1010] Інфармацыя Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій па Латвійскай ССР ад 19.04.1985 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3138. Арк. 5

[1011] Інфармацыя аб ходзе выкання пастановы Савета па справах рэлігій пры СМ СССР "Аб мерах па ўзмацненню кантроля за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах каталіцкімі аб'яднаннямі ў БССР" ад 25.10.1983 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3080. Арк. 41.

[1012] Звесткі аб наяўнасці рэлігійных аб'яднанняў, служкаў культу па абласцям БССР // Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 3, 8, 10, 15, 17, 22, 24, 30, 33, 38, 40, 45 ; Спр. 33. Арк. 46, 50, 54, 57, 61, 65, 69, 73, 77, 81, 84, 88 ; Спр. 49. Арк. 34, 48, 61, 67, 90, 99, 115, 124, 125, 148, 151, 165, 171 ; Спр. 59. Арк. 29, 33, 38, 41, 55, 59, 47, 51, 62, 66, 69, 73.

[1013] Дакладная запіска па выніках камандзіроўкі намесніка загадчыка аддзела Савета па справах рэлігій па Латвійскай ССР. 22–29.09.1985 г. // Там жа. Спр. 3138. Арк. 6–8.

У семінарыі была добрая матэрыяльная база, працэс навучання быў забяспечаны высокакваліфікаванымі выкладчыкамі. У 1978 г. Каунаская семінарыя выпусціла 6 ксяндзоў, але за год каталіцкі касцёл у Літве згубіў 13 ксяндзоў (памерлі)[1014], семінарыя не задавальняла нават попыт на святароў у савецкай Літве, не кажучы пра БССР.

На працягу 1970-х гг. у БССР, як і па ўсім СССР, павялічваліся выпадкі крадзяжоў з каталіцкіх касцёлаў і праваслаўных цэркваў найбольш каштоўных прадметаў рэлігійнага культа (сотні абразоў, келіхаў, крыжоў, падсвечнікаў, даразахавальніц, евангелляў), шмат з іх мелі гістарычную і мастацкую каштоўнасць, нават знаходзіліся на ўліку ў адпаведных органах Міністэрства культуры БССР. Прычым характэрным з'яўлялася тое, што з кожным годам колькасць падобных злачынстваў павялічвалася. Напрыклад, за 1973–1977 гг. было зафіксавана 48 крадзяжоў. З іх у 1973–1975 гг. – 10, а за 1976–1977 гг. – 38 крадзяжоў. За гэтыя два гады здзейснены крадзяжы з культавых будынкаў: у Віцебскай вобласці – 9, Магілёўскай – 10, Гродзенскай – 7, Мінскай – 5, Гомельскай – 4, Брэсцкай – 3. Аб фактах крадзяжоў з касцёлаў і цэркваў выканаўчыя органы рэлігійных аб'яднанняў своечасова паведамлялі мясцовым органам МУС. Аднак гэтым фактам не давалася належная ацэнка, крымінальныя справы па ім не ўзбуджаліся, злачынцы заставаліся не знойдзенымі. Сітуацыя крыху змянілася пасля звароту ў 1977 г. упаўнаважанага савета па справах рэлігій пры СМ СССР па БССР А. Залескага ў МУС БССР. У выніку знайшлі рабаўнікоў касцёла ў Нясвіжы і царквы ў Мінску[1015].

12.11.1979 г. СМ СССР прыняў пастанову "О мерах по предотвращению незаконнного вывоза культовых ценностей за пределы СССР", якая прадугледжвала парадак уліку культавых каштоўнасцей, якія знаходзіліся і выкарыстоўваліся рэлігійнымі аб'яднаннямі. Але ў ёй нічога не казалася пра тыя храмы, што былі на ўліку ў мясцовых органах улады і дзе заставаліся ўнікальныя артэфакты мінуўшчыны. Па дакументах тых часоў можна вызначыць сапраўдную прычыну клопату ўладаў фактамі крадзяжоў з культавых будынкаў. Улады адзначалі, што адказнасць за захаванасць прадметаў рэлігійных культаў у храмах, якія дзейнічалі, неслі рэлігійныя аб'яднанні. У той жа час у БССР налічвалася 28 культавых будынкаў, якія былі зняты з уліку дзейных, прычым за захаванасць маёмасці каторых неслі адказнасць выканкамы мясцовых саветаў дэпутатаў. Але практычна яны нікім не ахоўваліся. А ў гэтых будынках знаходзіліся прадметы, якія мелі гістарычную і мастацкую каштоўнасць[1016]. Іх было магчыма без складанасцей і цяжкасцей скрасці. Таму, ідэалагічнае кіраўніцтва рэспублікі палохалася, што

---

[1014] Інфармацыйная справаздача "Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1979 г." // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 102. Арк. 10, 12.

[1015] Даведка аб раскраданні прадметаў рэлігійнага культа з цэркваў рэспублікі за № 15 ад 09.02.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 17–20 ; *Пушкін І.А.* Лёс царкоўнай маёмасці храмаў Магілёўшчыны ў Савецкі час // Религия и мораль: традиции в духовной культуре Беларуси : сборник материалов республиканской научно-практической конференции. 20 апреля 2016 года, г. Могилѐв. Могилѐв, 2016. С. 17–20.

[1016] Даведка аб раскраданні прадметаў рэлігійнага культа з цэркваў рэспублікі за № 15 ад 09.02.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 21.

вакол гэтых цэркваў і касцёлаў у любы час магла скласціся непажаданая для ўладаў сітуацыя. Калі на падставе крадзяжоў і захаванасці маёмасці вернікі могуць узняць пытанне аб вяртанні ім і адкрыцці гэтых цэркваў і касцёлаў.

Аб тым, што такое было магчымым, сведчаць наступныя факты. У першым паўгоддзі 1978 г. упаўнаважаным савета па справах рэлігій па БССР паступіла скаргаў больш чым раней – 286 (у першым паўгоддзі 1977 г. – 199)[1017]. Большасць лістоў, скаргаў і заяў паступала ад католікаў і так званых "сектантаў"[1018], якія ў той час праяўлялі найбольшую актыўнасць па ўмацаванні сваёй веры. Сярод іншых звароты жыхароў: шэрагу вёсак Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці (10 заяў) аб адкрыцці касцёла ў в. Параф'янава (зняты з рэгістрацыі ў 1950-х гг.), аб адкрыцці касцёлаў у в. Плюсы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, г.п. Свір Мядзельскага раёна Мінскай вобласці і інш. Паступілі тры калектыўных заявы ад ксяндзоў і вернікаў з патрабаваннямі адкрыць каталіцкую семінарыю, заснаваць епіскапат. Усім ім былі дадзены адмоўныя адказы, іх звароты былі не задаволены[1019].

За першае паўгоддзе 1980 г. упаўнаважаным савета па справах рэлігій па БССР і абласцей паступіла 249 заяў і скаргаў, ці на 32 больш, чым іх было ў першым паўгоддзі 1979 г. Аб адкрыцці цэркваў і касцёлаў, якія былі раней зняты з рэгістрацыі – 30 зваротаў грамадзян[1020]. Па заявах і скаргах вернікаў аб адкрыцці раней знятых з рэгістрацыі цэркваў і касцёлаў работнікамі саветаў па справах рэлігій і мясцовых органаў улады праводзілася тлумачальная праца з іх ініцыятарамі на прадмет змяншэння іх актыўнасці ў гэтай справе[1021]. Афіцыйныя ўлады казалі, што вернікі маюць магчымасць задаволіць свае рэлігійныя

---

[1017] З іх ад вернікаў – 171 (125), ад дваццатак – 12 (13), ад царкоўных выканаўчых органаў – 54 (46), ад служыцеляў культа – 18 (11), ад іншых асоб – 31 (4). Па зместу: аб адкрыцці цэркваў, якія былі раней зняты з рэгістрацыі – 40 (18), аб рэгістрацыі рэлігійных таварыстваў – 33 (17), аб неправамерных дзеяннях мясцовых органаў улады – 31 (35), аб рэгістрацыі служыцеляў культа – 22 (17), аб злоўжываннях з боку царкоўных выканаўчых органаў – 19 (17), аб парушэнні заканадаўства аб культах з боку святароў – 18 (14). Звесткі ад паступіўшых лістах, скаргах і заявах упаўнаважаным Савета па справах рэлігій у БССР і аб прыёме наведвальнікаў у першым паўгоддзі 1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 49. Арк. 5.

[1018] Пад імі кіраўнічыя структуры партыйна-савецкай улады разумелі прадстаўнікоў баптысцкіх, пяцідзесятніцкіх і адвентысцкіх рэлігійных арганізацый.

[1019] "Аб працы з лістамі і заявамі, аб прыёме наведвальнікаў у першым паўгоддзі 1978 г." ліст старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР ад 20.07.1978 г. // Там жа. Арк. 1–3.

[1020] Заявы паступілі ад: вернікаў – 147, членаў выканаўчых органаў – 30, служыцеляў культаў – 19, членаў устаноўчых дваццатак – 12, ад іншых асоб – 28. Аналіз паказаў, што найбольшая колькасць заяў і скаргаў паступіла ад вернікаў са зваротамі аб рэгістрацыі рэлігійных аб'яднанняў – 35, аб неправамерных дзеяннях мясцовых органаў улады і пасадавых асобаў – 33, аб адкрыцці цэркваў і касцёлаў, якія былі раней зняты з рэгістрацыі – 30, аб парушэнні заканадаўства аб культах з боку святароў – 19, аб злоўжываннях царкоўных выканаўчых органаў – 20, аб рэгістрацыі служыцеляў культу – 18. Там жа. Спр. 59. Арк. 13–14.

[1021] У першым паўгоддзі 1980 г. рэспубліканскімі і абласнымі упаўнаважанымі савета быў прыняты 881 наведвальнік. У іх ліку былі: 369 прадстаўнікоў духавенства, 234 члена выканаўчых органаў рэлігійных аб'яднанняў, 48 членаў устаноўчых дваццатак, 126 вернікаў, 99 асоб з ліку партыйна-савецкага актыва. Найбольшую колькасць наведвальнікаў склалі прадстаўнікі РПЦ – 407 чал., і ЕХБ – 210 асоб. Значная колькасць наведвальнікаў з ліку святарства і членаў выканаўчых органаў рэлігійных аб'яднанняў можа быць патлумачана праводзімымі у БССР мерапрыемствамі "выхаваўчага парадку" з гэтай катэгорыяй служыцеляў царквы. Яны групамі "запрашаліся" (рэальна адмовіцца было немагчыма) да упаўнаважаных савета, дзе ім чыталі лекцыі і даклады па міжнародным і ўнутраным пытанням, эканамічным праблемам, тлумачыліся асноўныя палажэнні Канстытуцыі СССР і заканадаўства аб культах. Там жа. Арк. 18–19.

запатрабаванні ў бліжэйшых касцёлах і цэрквах[1022], таму іх звароты заставаліся без задавальнення. Падобныя тэндэнцыі ў дзейнасці вернікаў – прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей БССР і практыка дзеянняў партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва ў 1940–1980-я гг. былі стабільнымі і нязменнымі.

**Асаблівасці нацыянальна-рэлігійнага жыцця рускай супольнасці.** Рускія ў рэспубліцы былі прадстаўлена асобамі, якія па розных прычынах пераехалі ў Беларусь у савецкі час і тымі, хто пражываў на яе тэрыторыі ў дакастрычніцкі перыяд – гэта ў асноўным прадстаўнікі стараабраднікаў.

У першыя дзесяцігоддзі Савецкай улады колькасць стараабраднікаў змяншаецца. Гэтаму садзейнічалі адміністрацыйныя меры па закрыцці стараабрадніцкіх цэркваў і малелен. Аднак у час Вялікай Айчыннай вайны колькасць вернікаў стараабраднікаў павялічваецца. Па звестках Упаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР па Беларусі ў 1945 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 63 абшчыны стараабраднікаў-беспапоўцаў, з прыблізнай колькасцю ў 12123 чалавекі, 4 абшчыны стараабраднікаў белакрыніцкага согласу – 242 чалавекі, 1 абшчына беспапоўцаў-федасееўцаў – 200 чалавек, 1 абшчына беглапапоўцаў – 43 чалавекі. Стараабраднікі больш за ўсё былі расселяны ў Мінскай, Бабруйскай, Гомельскай, Віцебскай, Полацкай і Маладзечанскай абласцях. На тэрыторыі Бабруйскай вобласці стараабраднікі пражывалі ў Бабруйску, у вёсках Парычскага раёна: Зарэчча, Нова-Аляксандраўка, Салоціна, Каралеўская Слабада, Завічча, Манімоны, Дражна; Бабруйскага раёна – Туркаўская Слабада, Лекерта, Бараціна, Вуглы, Баранавічы, Багушоўка, Станы, Новая-Шараеўшчына; Кіраўскага раёна – Капусціна, Скрыпліца. У чэрвені 1945 г. у Бабруйскай вобласці дзейнічала 13 абшчын стараабраднікаў-беспапоўцаў. З іх 12 паморскага согласу і 1 федасееўскага[1023].

На вызваленых ад гітлераўскіх захопнікаў тэрыторыях савецкае кіраўніцтва вярнулася да даваеннай практыцы закрыцця храмаў. Свае дзеянні ўлады абгрунтоўвалі тым, што гэтыя культавыя будынка былі адкрыты ва ўмовах вайны на кантраляванай ворагам тэрыторыі, г.зн. не законна, бо на іх адкрыццё не было дазволаў мясцовых райвыканкамаў і вышэйшых савецкіх інстанцый[1024].

У адпаведнасці з устаноўленым заканадаўствам у перыяд 1945–1947 гг. на Гомельшчыне былі зачынены стараверскія храмы і малітоўныя дамы: у Ветцы

---

[1022] Звесткі ад паступіўшых лістах, скаргах і заявах упаўнаважаным Савета па справах рэлігій у БССР і аб прыёме наведвальнікаў // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 59. Арк. 15.

[1023] Справаздача аб рабоце ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў пры СНК СССР па Беларусі за 1945 г. // Там жа. Ф. 952. Воп. 2. Спр. 2. Арк. 288-290 ; Дакладныя запіскі ўпаўнаважаных, звесткі аб абшчынах, сектах і дзеючых касцёлах і малітоўных дамах, даведкі, спісы вернікаў (12.01.46 г. – 26.12.46 г.) // Там жа. Спр. 7. Арк. 86–87 ; *Хурсан Т.І.* Стараабрадніцтва Бабруйшчыны // Религия и мораль: традиции в духовной культуре Беларуси : сборник материалов республиканской научно-практической конференции. 20 апреля 2016 года, г. Могилѐв. С. 144.

[1024] Аб рэлігійнай дзейнасці стараверскіх абшчын і груп. Справаздача за першае паўгоддзе 1954 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 61. Спр. 73. Арк. 140 ; *Рогинский, Р.М.* Закрытие старообрядческих храмов и молелен на Гомельщине, как фактор конфессиональной политики И.В. Сталина в предвоенный и послевоенный период // Религия и общество – 9 : сборник научных статей. Могилев, 2015. С. 27–29.

(перададзены пад сховішча сельгасзабеспячэння) і вёсках Веткаўскага раёна: Тарасаццы, Лявонцьева, Касіцкая (перададзеныя пад калгасныя свірны), Барацьба (пераабсталяваны, а затым перададзены пад лякарню), Папсуяўцы (пераабсталяваны і перададзены пад школу)[1025]. У 1949 г. у вёсцы Агародня-Гомельская Добрушскага раёна была зачынена стараверская царква (перададзена пад клуб, які у 1953 г. згарэў па халатнасці кінамеханіка)[1026]. У 1950 г. мясцовым калгасам быў адабраны малітоўны дом у вёсцы Зарэчча Парычскага (Светлагорскага) раёна[1027]. Такім чынам, масавае закрыццё культавых будынкаў ў 1930-я гг. і ў другой палове 1940-х гг. практычна паралізавала рэлігійную жыццё старабраднікаў Гомельшчыны, якія пераважна прадстаўлялі рускую супольнасць, што фактычна абумовіла іх пераход на нелегальнае становішча[1028].

У 1953 г. стараабраднікі-беспапоўцы вёсак Завічча, Манімоны, Дражна Бабруйскай вобласці звярнуліся ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР з просьбай адкрыць малітоўню. Аднак мясцовыя ўлады іх просьбу не падтрымалі. У 1960-я гг. колькасць стараабраднікаў у сельскіх абшчынах паменшылася. У гэты перыяд павялічваецца іх колькасць у гарадах. Гэтаму садзейнічалі міграцыйныя працэсы. Па дадзеным упаўнаважаных, у 1960-х гг. звесткі падаваліся не па колькасці стараабраднікаў, а па колькасці абшчын без назвы мясцовасці. Да 1961 г. з рэгістрацыі па розных прычынах былі зняты абшчыны ў Магілёўскай вобласці, Назараўская і Гарадская абшчыны ў горадзе Бабруйску, абшчыны ў весках Скрыпліца і Падлешчанка. Усе яны былі паморскага кірунку. Максімальная колькасць стараабраднікаў вызначалася ўладамі па іх прыкладнай колькасці на царкоўных службах у вялікія рэлігійныя святы. Напрыклад, на 1961 г. па Магілёўскай вобласці колькасць стараабраднікаў была наступная: у Фарштадскай абшчыне горада Бабруйска – 190 чалавек, у Гарадской абшчыне – 130, у вёсцы Багушоўка – 250, у вёсцы Трэція Баранавічы – 150, у Туркаўскай Слабадзе – 60, у Вуглах – 170, у Капусціна – 200, у Скрыпліцы – 50, у Падлешчанцы – 50. Разбуральная палітыка ўлад у гады хрушчоўскай адлігі амаль не закранула стараабраднікаў. Лічылі, што стараабрадніцкія абшчыны знікаюць, таму патрэбна займацца іншымі канфесіямі. З канца 1980-х гг. некаторыя беларускія абшчыны прынялі апеку Расійскага Савета Стараправаслаўнай Паморскай Царквы (РС СПЦ), утворанага ў 1989 г.[1029]

[1025] Пратакол пазачаргowага пасяджэння бюро Веткаўскага райвыканкама КП(б)Б ад 17.10.1928 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 60. Спр. 119. Арк. 148

[1026] Аб рэлігійнай дзейнасці стараверскіх абшчын і груп. Справаздача за першае паўгоддзе 1959 г. // Там жа. – Спр. 306. – Арк. 144.

[1027] Справаздача Саюза ваяўнічых бязбожнікаў аб правядзенні працы сярод моладзі // Там жа. Ф. 265. Воп. 1. – Спр. 101. Арк. 25.

[1028] *Рогинский Р.М.* Закрытие старообрядческих храмов и молелен на Гомельщине, как фактор конфессиональной политики И.В. Сталина в предвоенный и послевоенный период. С. 27–29

[1029] Звесткі аб рэлігійных аб'яднаннях і малітоўных будынках, узятых на аднаразовы ўлік па Магілёўскай вобласці за 1961 г. // ДАМаг. Ф. 2336. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 15–16, 24–27, 42–49 ; *Хурсан Т.І.* Стараабрадніцтва Бабруйшчыны // Религия и мораль: традиции в духовной культуре Беларуси : сборник материалов республиканской научно-практической конференции. С. 144–147.

**Кірункі дзейнасці яўрэйскага насельніцтва.** Падзеі часоў гітлераўскай акупацыі вельмі істотна паўплывалі на ўзровень рэлігійнасці яўрэйскага насельніцтва Беларусі. У першы пасляваенны год, нават не паспеўшы аднавіць жыллё, вернікі іўдзеі ствараюць абшчыны, выбіраюць кіруючыя органы, падаюць заявы на іх рэгістрацыю ўпаўнаважаным Саветаў па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР па адпаведных абласцях і пачынаюць будаўніцтва або аднаўленне будынкаў сінагог[1030].

Антысеміцкая накіраванасць палітыкі Сталіна ў пасляваенныя гады абмяжоўвала магчымасць рэгістрацыі іудзейскіх абшчын у БССР. Некаторыя мясцовыя чыноўнікі палічылі, што яўрэі да вайны не праяўлялі моцнага імкнення да рэлігіі, а пасля вайны яны зрабілі вялікі ўхіл у бок рэлігійнага фанатызму, верагодна, больш, чым якая-небудзь іншая нацыянальнасць. Звярталася ўвага, што "пад выглядам рэлігійнасці нацыяналісты заклікаюць яўрэяў больш шчыльна гуртавацца, аднаўляць і падтрымліваць сувязь з замежнымі сіяніссцкімі арганізацыямі, весці гутарку пра ахвярнасць яўрэйскага народа ў гады вайны, ставіць помнікі загінуўшым"[1031]. Сінагогі і міньяны ўлады даволі часта разглядалі як асяродкі нацыяналізму і сіянізму.

Праблемы ўзнікалі нават пры спробе ўвекавечыць памяць яўрэяў, загінуўшых у выніку гітлераўскага генацыду. У Мінску, Чэрвені, мястэчку Ленін Жыткавіцкага раёна і ў іншых месцах яўрэі неаднаразова збіралі сродкі і імкнуліся пабудаваць помнікі ахвярам Катастрофы. Але ўлады ім не дазвалялі рабіць надпісы на іўрыце або на ідыш, словы "яўрэйскія грамадзяне" прымушалі замяняць на "савецкія". Так, у пачатку 1946 г. гарадскія ўлады не дазволілі ўстанавіць помнік на магіле расстраляных у 1942 г. вязняў Мінскага гета. Нягледзячы на гэта, у жніўні 1946 г. на брацкай магіле "Яма" быў устаноўлены несанкцыянаваны помнік у выглядзе гранітнай стэлы з надпісам на ідыш "Яўрэям – ахвярам нацызму"[1032]. У 1960–70-я гг. у БССР на месцах пахаванняў яўрэяў былі ўстаноўлены стэлы, на якіх не была пазначана нацыянальнасць ахвяраў генацыду.

Наяўнасць равіна была прывязаная абавязковаю ўмоваю для адкрыцця сінагогі, якую яўрэйскім абшчынам выканаць было вельмі складана па прычыне адсутнасці такой духоўнай асобы. Разам з тым, у адпаведнасці з пастулатамі іўдаізму дазвалялася паўнавартаснае існаванне абшчыны і ў адсутнасці равіна, але з гэтым улады даволі доўгі час не пагаджаліся. Вернікі настойвалі на тым, што адсутнасць равіна не можа быць перашкодаю для рэгістрацыі абшчыны. Але прыклад з жыцця яўрэйскай абшчыны Бабруйска сведчыць аб тым, што ўлады дзейнічалі па-свойму. У красавіку 1946 г. з дазволу гарадскіх уладаў Бабруйска іудзейская абшчына сабрала сродкі і адрамантавала разбураны дом, у якім планавалася адкрыць сінагогу. Але ўжо ў чэрвені 1946 г. Бабруйскі гарвыканкам абвясціў, што рэгістрацыя яўрэйскай рэлігійнай абшчыны была праведзена з

[1030] *Карпекін К.Р.* Іўдзейская абшчына Оршы ў сярэдзіне 1940-х – 1970-я гг. // Віцебскі край: матэрыялы II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 24.11.2016 г., г. Віцебск. Мінск, 2017. С. 274–275.
[1031] *Смиловицкий Л.* Евреи Беларуси: из нашей общей истории. 1905–1953. Сборник статей. С. 244–245.
[1032] Там жа. С. 289.

парушэннем працэдуры (адсутнасць равіна). Пазней, нягледзячы на рашэнне Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР аб задавальненні хадатайніцтва вернікаў яўрэяў аб адкрыцці сінагогі ў Бабруйску[1033], гарвыканкам адмяніў рэгістрацыю абшчыны, а адрамантаванае памяшканне гарадскія ўлады перадалі Бабруйскай савецка-партыйнай школе[1034].

Сітуацыя, якая склалася з рэгістрацыяй абшчыны ў Бабруйску, не была нейкім выключэннем з правілаў. У г. Чэрвень пасля заканчэння вайны вярнуліся некалькі яўрэйскіх сем'яў, якія прытрымліваліся іўдаізму, але ўлады не толькі не далі ім дазволу на арэнду малітоўнага дома, але і забаранілі сабраць міньян. Былі і прыклады паспяховых намаганняў вернікаў. Так, іўдзеі Калінкавічаў дабіліся рэгістрацыі абшчыны і за свае сродкі пабудавалі сінагогу. Абшчыну ў Калінкавічах узначаліў З. Глухоўскі. У 1954 г. у складзе гэтай абшчыны налічвалася больш за 150 чалавек[1035].

У пачатку 1960-х гг. уладамі была закрыта Цэнтральная сінагога ў Мінску, адхілены ад пасады кіраўніка яўрэйскай рэлігійнай абшчыны Х. Фрыд. Ён у сярэдзіне 1950-х гг. праявіў вялікую актыўнасць у пытанні пашырэння плошчы, якую займала сінагога. У сувязі з закрыццём сінагогі Мінская яўрэйская абшчына накіравала на імя М. Хрушчова 07.12.1962 г. ліст са скаргай на дзеянні Мінскага гарсавета. Упаўнаважаны па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР, у якога апынуўся накіраваны М. Хрушчову ліст, як сведчаць дакументы, "пакінуў заяву працоўных яўрэяў без разгляду і вырашэння па-сутнасці". Не атрымалі станоўчага адказу прадстаўнікі Мінскай яўрэйскай рэлігійнай абшчыны і на сваю заяву, накіраваную 25.01.1963 г. на імя старшыні Вярхоўнага Савета БССР В. Казлова, у якой прасілі "зрабіць неабходнае ўказанне Пахавальнаму бюро г. Мінска аб тым, каб паводле патрабавання сваякоў пахаванні яўрэяў праводзіліся на яўрэйскіх могілках, а прымусовыя пахаванні яўрэяў на агульных могілках тэрмінова спыніць"[1036].

У канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг., у сувязі з падзеямі на Бліжнім Усходзе, асабліва пасля заканчэння пераможнай для Ізраіля шасцідзённай вайны (1967), павялічылася цікавасць да сінагогі ў яўрэйскай моладзі і асобаў з сіяніцкімі поглядамі. Частка вернікаў іўдзеяў, якія не хадзілі ў сінагогу Мінска з-за яе адлегласці, пад час святаў у розных частках горада стваралі, так званыя міньяны, дзе на малітоўныя сходы збіраліся да 30–40 чал. За тое, што ім прадастаўлялі памяшканне, плацілі гаспадарам кватэр па 100–135 руб.[1037]

Гэта моцна хвалявала кіраўніцтва Савецкай Беларусі. 16.03.1970 г. Упаўнаважаны савета па БССР Р. Кавалёў накіраваў усім упаўнаважаным абласных саветаў сакрэтны цыркуляр, у якім прадпісвалася: "Сёлета рэлігійнае

---

[1033] Пратакол № 6 пасяджэння Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 4. Спр. 19. Арк. 134.
[1034] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). С. 261.
[1035] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 222.
[1036] Там жа. С. 224.
[1037] Дакладная запіска па выніках праверкі стану кантроля за выкананнем заканадаўства аб культах у раёнах г. Мінска за студзень – сакавік 1974 г. ад 20.03.1974 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 57.

свята Пурым яўрэі будуць адзначаць 22 сакавіка гэтага года і Пасху 21 красавіка. Там дзе маюцца групы (міньяны), неабходна ўсталяваць назіранне за падрыхтоўкай і правядзеннем дадзеных святаў. У сувязі з абвастрэннем становішча на Блізкім Усходзе і актывізацыяй міжнароднага сіянізму, прашу Вас усімі даступнымі сродкамі вывучыць настрой вышэйпаказаных яўрэйскіх груп і інфармаваць нас пра святкаванне Пурыма да 25 сакавіка, а пра святкаванне Пасхі да 25 красавіка”[1038].

Не ў першы раз мясцовыя органы ўлады атрымалі падобнае заданне, таму былі мабілізаваны шэраг службоўцаў і супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Зрэшты, ужо не ў першы раз, ды і не ў апошні. Справа ўскладнілася толькі адным – “інфарматары” ўпаўнаважанага недакладна паведамілі яму дату святкавання.

Па выніках праведзенай працы выканаўчы камітэт Магілёўскага абласнога савета дэпутатаў працоўных 25.03.1970 г. паведаміў Р. Кавалёву: “Паводле Вашага ліста упаўнаважаны савета па Магілёўскай вобласці паведаміў старшыням райгарвыканкамаў пра яўрэйскае рэлігійнае свята Пурым з просьбай арганізаваць назіранне за міньянамі і па магчымасці вывучыць настрой яўрэйскіх груп, якія дзейнічаюць у гарадах Бабруйску, Магілёве, Шклове, Мсціславе і іншых месцах. 22 сакавіка прадстаўнікі гаррайвыканкамаў наведалі адрасы, якія з’яўляюцца месцам зборышчаў вернікаў іудзейскага веравызнання, але ў гэты дзень малітоўных збораў не праводзілася. Высветлена, што яўрэі адзначалі Пурым 20 сакавіка. Шмат вернікаў яўрэяў адзначалі гэта свята ў сямейным крузе, асобныя наладжвалі вечарыны, на якія запрашалі сваякоў і знаёмых”[1039].

У г. Бабруйску супрацоўнікі міліцыі і члены камісіі садзейнічання па кантролю за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах пры Бабруйскім гарвыканкаме выявілі, што свята Пурым яўрэі ў міньянах не адзначалі. Яны часова спынілі зборы ў гэтых месцах з-за страху аб магчымых рэпрэсіях, бо ў той час у друку, па радыё і тэлебачанню даваўся “адпор міжнароднаму сіянізму”, выкрывалася “правакацыйная дзейнасць кіраўнікоў дзяржавы Ізраіль”, накіраваная на перасяленне яўрэйскага насельніцтва з СССР на “запаветную зямлю”. Участковы ўпаўнаважаны міліцыі ў сваім рапарце на імя намесніка старшыні Ленінскага раёна горада Магілёва паведамляў пра свае назіранні за міньянам, які знаходзіўся ў хаце грамадзяніна М. Мотуса па 1-му Крутому завулку. Адзначыў, што з лютага 1970 г. яўрэі ў гэтай хаце не збіраюцца. У выніку апытання суседзяў было выяўлена, што гаспадар хаты казаў: “Голда Меір нарабіла шмат шуму, як бы гэта ўсё не абярнулася супраць нас. Нашы маленні могуць разглядацца па-іншаму, дык лепш пакуль маліцца па адным”. Лагічным завяршэннем гэтага невялікага эпізоду з жыцця магілёўскіх яўрэяў 1970-х гг. з’яўляецца фраза ўпаўнаважанага савета па справах рэлігіі па Магілёўскай вобласці П. Пятрова: “Вывучэнне груп іудзейскага веравызнання працягваецца”[1040].

---

[1038] Ліст Упаўнаважанага савета Р. Кавалёва ад 16.03.1970 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 70.
[1039] Ліст Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэту ад 25.03.1970 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 94.
[1040] Там жа. Арк. 95

Па дадзеных "Звестак пра наяўнасць рэлігійных аб'яднанняў, служак культу па абласцях БССР" на тэрыторыі Магілёўскай вобласці дзейнічалі, але не прайшлі афіцыйную рэгістрацыю іудзейскія рэлігійныя аб'яднанні ў 1970 г. – 10, 1974 г. – 10, 1978 г. – 5, 1980 г. – 3 абшчыны[1041].

16.09.1974 г. Мінскую сінагогу на свята Новага году Рош-Ашоно наведала 300 чал. У той жа час, як адзначалі назіральнікі ад апарата ўпаўнаважанага, у сінагозе знаходзіліся тры маладыя жанчыны і два мужчыны яўрэйскай нацыянальнасці, якія ніякага ўдзелу ў маленнях не прымалі. Яны актыўна ўдзельнічалі ў размовах на двары сінагогі з некаторымі веруючымі і асабліва з мясцовым сіяністам, былым падпалкоўнікам савецкага войска Альшанскім. Размовы вяліся выключна на яўрэйскай мове. Наогул, у 1974 г. на святы сінагогу Мінска наведвала каля 300 чал., у 1973 г. – каля 200. 30 маладзёнаў было 08.10.1974 г. на свяце Сімхас-Тора (Радасць Торы). У сінагозе і на двары шмат танчылі і спявалі на яўрэйскай мове[1042].

Характарызуючы рэлігійную сітуацыю ў рэспубліцы за 1976 г., упаўнаважаны Савета па справах рэлігій пры Савеце міністраў СССР па БССР А. Залескі зрабіў выснову пра некаторае зніжэнне актыўнасці рэлігійнай абшчыны іўдзейскага веравызнання, зарэгістраванай у Мінску. Ён адзначаў, што ў 1976 г. прыкметна менш было багамольцаў у такія рэлігійныя святы, як Рош-Ашона, Іом-кіпур, Сімхат-тора, а максімальная колькасць вернікаў у сінагоге не перавышала 300 чалавек старэйшага ўзросту[1043]. У той жа час адзначаліся факты наведвання караімамі БССР на рэлігійныя святы іўдзейскай рэлігійнай абшчыны ў г. Тракай Літоўскай ССР[1044].

Пад час святкавання Новага году, Іом-Кіпура ў 1978 г. у сінагогу Мінска зайшло ўсяго каля 250–300 чал. Аднак, двор сінагогі быў перапоўнены асобамі яўрэйскай нацыянальнасці, якія ў маленнях не ўдзельнічалі, а абменьваліся навінамі аб яўрэях, якія выехалі ў Ізраіль, чыталі іх лісты, перапісвалі адрасы. Іншыя кансультаваліся аб парадку афармлення дакументаў на выезд[1045]. Актыўнасць яўрэяў набывала не рэлігійны, а палітычны кірунак. На думку ўладаў, небяспечнай выглядала актыўнасць некаторых асобаў. У першую чаргу агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць былога падпалкоўніка Альшанскага. У размове з супрацоўнікам апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій ён заяўляў: "У нашай краіне квітнее антысемітызм. Яўрэяў не прымаюць на працу, гоняць з камандных пасадаў у войску." Малады яўрэй, які стаяў побач заявіў: "Я скончыў

[1041] Звесткі пра наяўнасць рэлігійных аб'яднанняў, служак культу па абласцях БССР // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 40 ; Спр. 33. Арк. 84 ; Спр. 49. Арк. 165 ; Спр. 59. Арк. 69.

[1042] "Інфармацыя аб ходзе яўрэйскіх восенскіх святаў "Рош-Ашоно", "Іом-Кіпур", "Сімхас-Тора" у іўдзейскім рэлігійным таварыстве г. Мінска". Ліст упаўнаважанага савета па справах рэлігіі па Мінскай вобласці за № 76 ад 14.10.1974 г. // Там жа. Спр. 36. Арк. 95–96.

[1043] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 226.

[1044] Інфармацыйная справаздача "Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1978 г." // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 102. Арк. 49.

[1045] Інфармацыя аб ходзе яўрэйскіх восеньскіх святаў "Рош-Ашоно", "Іом-Кіпур", "Сукос-Кушчы", "Сімхас-Тора" у іўдзейскім рэлігійным таварыстве г. Мінска за № 172 ад 02.11.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 89–90.

палітэхнічны інстытут і працую толькі таму, што ў мяне маецца моцнае пратэжэ. А вось паспрабуйце ўзяць мой дыплом і пашпарт, вас нідзе не прымуць на працу”[1046].

Камітэт дзяржаўнай бяспекі рэспублікі пільна адсочваў усе памкненні яўрэяў, якія былі накіраваны на актывізацыю палітычнай дзейнасці, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці і развіццё сваёй культуры. За вывучэнне і распаўсюджванне сіяністкай літаратуры па ўказанню КДБ БССР былі звольнены з працы ў 1969 г. выкладчыкі БПІ Д. Мінкоўскі і Я. Слепян, начальнік тэхнічнага аддзелу інстытута “Энергасеткапраект” С. Дэйч і іншыя. Сіяніст, на думку ўладаў, Л. Аўсішчэр пераконваў некаторых яўрэяў каб тыя падавалі дакументы на выезд з СССР, заклікаў падаваць заявы да таго часу, пакуль не задаволяць іх просьбу. Пільна сачылі за студэнтам 3 курса Мінскага медыцынскага інстытута К. Лук, 1960 г.н., які рэгулярна наведваў сінагогу і актыўна маліўся[1047]. Ён выкладаў іўрыт для тых яўрэяў, якія рыхтаваліся выехаць у Ізраіль[1048]. К. Лук акрамя іўрыта добра валодаў англійскай, іспанскай, французскай мовамі. У БССР пачалі дзейнічаць нелегальныя гурткі па вывучэнню іўрыта, гісторыі яўрэйскага народа і яўрэйскай філасофіі, распаўсюджваўся самвыдат, у Мінску працаваў культурна-гістарычны семінар[1049].

У 1979 г. святкавалі іўдзейскую Пасху ў Мінске, Бабруйске, Оршы, Пінске, Гомелі і інш., але прысутнічала невялікая колькасць вернікаў сталага ўзросту. У Мінскай сінагоге было толькі 130 чал., у Бабруйскай – 32 чал.[1050]. Яшчэ больш нізкая наведваемасць сінагогі ў Мінску адзначалася ў 1983 г. Напярэдадні свята малілася 35 мужчын і 5 жанчын, у першы дзень Пасхі ў сінагозе было каля 100 чал., у апошні – 50. Аб памяншэнні колькасці вернікаў сведчыць і такі факт, што было выпечана 19 т мацы, на 2 т менш, чым у 1982г.[1051] За 1985 г. перасталі дзейнічаць 2 іўдзейскіх незарэгістраваных міньяна ў Магілёве, ў рэспубліцы іх засталося толькі 8.

Памяншэнне колькасці вернікаў сярод яўрэйскага насельніцтва БССР адбылося з-за натуральных прычынаў (сталы ўзрост вернікаў) і масавага ад’езду ў Ізраіль. Тым не менш, дзякуючы рэлігійнасці, яўрэйскай супольнасць здолела захаваць элементы сваёй традыцыйнай культуры.

---

[1046] Дакладная запіска па выніках назірання за ходам рэлігійнага свята Пасха у рэлігійных аб’яднаннях Мінска ад 16.04.1974 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 71.

[1047] Інфармацыя аб ходзе яўрэйскіх восеньскіх святаў “Рош-Ашоно”, “Іом-Кіпур”, “Сукос-Кушчы”, “Сімхас-Тора” у іўдзейскім рэлігійным таварыстве г. Мінска за № 172 ад 02.11.1978 г. // Там жа. Спр. 52. Арк. 89–90.

[1048] У СССР ствараліся спецыяльныя летнія лагеры толькі для асобаў яўрэйскай нацыянальнасці. Летнія лагеры з’яўляліся формаю семінару для будучых выкладчыкаў іўрыта. На занятках слухачам чыталі лекцыі па яўрэйскай гісторыі і рэлігійных традыцыях. У 1970 г. такі лагер быў арганізаваны на беразе Чорнага мора, у які з’ехаліся прасіяніцкія элементы з Кіева, Адэсы, Мінска, Кішынёва, Рыгі, Масквы і Свярдлоўска.

[1049] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 225.

[1050] Інфармацыя аб выніках назіранняў за святкаваннем “Пасхі” у рэлігійных аб’яднаннях, якія дзейнічаюць на тэрыторыі БССР у 1979 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558. Арк. 27–28

[1051] “Аб выніках назірання за выкананнем заканадаўства аб культах у дні святкавання Пасхі ліст у ЦК КПБ упаўнаважанага савета па спрвах рэлігій па БССР ад 27.05.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 64.

**Захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці польскім насельніцтвам БССР.** За пасляваенныя дзесяцігоддзі савецкай улады былі атрыманы пэўныя здабыткі ў эканамічным жыцці і адукацыі польскага насельніцтва БССР. Але з-за моцнага ідэалагічнага ўціску яго нацыянальная культура не магла паўнавартасна развівацца і фактычна абмяжоўвалася пераважна сфераю рэлігійнага жыцця, дзе захоўваліся элементы традыцыйнай культуры. Партыйна-савецкія ўлады БССР рабілі ўсё, каб зліквідаваць гэты асяродак падтрымання "пальшчызны" – абшчыны вернікаў пазбаўляліся святароў, забіраліся і выкарыстоўваліся пад культурныя і гаспадарчыя патрэбы культавыя будынкі. Напрыклад, у в. Валеўка Карэліцкага раёна Баранавіцкай вобласці БССР касцёл перадалі пад жыллё рабочых (1947)[1052].

Згодна высноў даследчыка В. Мазца: "Нацыянальна-культурнае жыццё палякаў у БССР працякала ў даволі складаных умовах. Гэта было абумоўлена ліквідацыяй польскіх школ і тым самым немагчымасцю атрымоўваць адукацыю на роднай мове. Нацыянальна-культурнае жыццё палякаў ад пачатку 1950-х да сярэдзіны 1980-х гадоў фактычна было абмежавана рамкамі рэлігійнай сферы, калі не лічыць дзён польскай культуры… Дні польскай культуры, арганізатары якіх ставілі ў першую чаргу ідэалагічна-прапагандысцкія мэты, не маглі зрабіць істотнага ўплыву на ўзровень самасвядомасці палякаў у БССР"[1053].

Асаблівасцю нацыянальна-культурнага жыцця "палякаў паводле пашпарту" была перавага ў шэрагу выпадкаў канфесійнай прыналежнасці над этнічнай, што давала падставы для атаясамлення каталік – значыцца паляк[1054]. Атаясамленне этнічнай і рэлігійнай прыналежнасці прасочваецца ў шэрагу заяваў, якія падавалі ў другой палове 1950-х гг. вернікі каталіцкага веравызнання ў розныя інстанцыі, дамагаючыся задавальнення сваіх рэлігійных патрэбаў. У лісце "Упаўнаважанаму па справах храмаў і царквы пры Саўміне БССР" ад 21.07.1958 г., вернікі, патрабуючы дазволу адчыніць адзін з 2-х храмаў у Мінску, падкрэслівалі: "Мы – абшчына польскай нацыянальнасці, каталіцкага веравызнання...". У пісьме жыхаркі в. Азярцы Талочынскага раёна Г.Марынскай, накіраваным 08.08.1957 г. на імя старшыні прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. Казлова, адзначалася, што яна звяртаецца па даручэнню каля 400 "вернікаў па нацыянальнасці палякаў". Аналагічны характар меў зварот 4-х тысяч грамадзянаў Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, якія патрабавалі ад мясцовых уладаў выканання гарантаванага Канстытуцыяй СССР артыкула пра свабоду сумлення. У іх звароце, у прыватнасці, адзначалася: "Мы людзі польскай нацыянальнасці. Па веравызнанню каталікі". Рост актыўнасці вернікаў, якія патрабавалі забеспячэння гарантаваных канстытуцыяй правоў на свабоду веравызнання, даволі моцна непакоілі прадстаўнікоў партыйна-савецкіх органаў БССР. Пра гэта сведчыць

---

[1052] Пратакол № 12 пасяджэння Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР ад 03.07.1947 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 4. Спр. 19. Арк. 404, 151–153

[1053] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі // Репрессивная политика советской власти в Беларуси: сб. науч. работ. Вып. 3. Минск, 2007. С. 216.

[1054] Прычым вядома, што ў Беларусі большая частка палякаў з'яўляецца акаталічанымі беларусамі. Гэтае меркаванне пацвярджаецца дадзенымі перапісаў 1970–1989 гг, згодна якіх ад 76,4 да 63,9 % палякаў называлі роднай беларускую мову.

“Даведка пра стан навукова-атэістычнай прапаганды сярод насельніцтва Гродзенскай вобласці”. Паводле падлікаў, праведзеных лектарамі аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, у 1958 г. у Гродзенскай вобласці налічвалася прыкладна 176 тыс. каталікоў[1055].

Улады падкрэслівалі, што ў многіх прыходах навучэнцы школ на чале з настаўнікамі калектыўна наведваюць касцёлы, дзе ксяндзы выкладаюць ім польскую мову і “прывіваюць дзецям нацыяналістычныя антысавецкія погляды”. Адзначалі, што польскае каталіцкае духавенства ўзмацніла сваю дзейнасць па далейшаму апалячванню і акаталічванню дарослага беларускага насельніцтва. З 246 ксяндзоў, якія не выехалі ў Польшчу, толькі 4 прынялі на той момант савецкае грамадзянства, астатнія лічылі сябе грамадзянамі Польшчы.

З аднаго боку, ганебныя рэпрэсіі ў адносінах да рэлігіі, ксяндзоў. З другога, слушным выглядае сцвярджэнне прафесара Л. Лыча, што калі б не было мэтанакіраванай дзейнасці партыйных і савецкіх органаў па згортванню дзейнасці праваслаўных і каталіцкіх храмаў, іх намаганні па русіфікацыі і апалячванні беларусаў былі б куды больш прыкметнымі[1056].

У сувязі з ўзмацненнем барацьбы з рэлігіяй у другой палове 1950-х гг., кантролем за дзейнасцю рэлігійных аб’яднанняў, памяншэннем колькасці храмаў у 1960-я гг. назіраўся часовы спад праяў рэлігійнасці насельніцтва. Паводле падлікаў прафесара У. Навіцкага, за 1955–1959 гг. з Беларусі выехала каля 30 ксяндзоў[1057]. Гэта ў сваю чаргу прыводзіла да значнага скарачэння колькасці парафій, ліквідацыі рэлігійных аб’яднанняў. Калі ў 1955 г. у БССР дзейнічалі 152 касцёлы, то да 01.01.1965 г. засталося толькі 90 парафій са служыцелямі культу і 39 – без ксяндзоў[1058]. Наведвальнікі праваслаўных цэркваў – у асноўным сталыя людзі, у большасці сваёй жанчыны. У той жа час на багаслужэннях у асобных касцёлах Міншчыны моладзь складала да 30–35 % усіх вернікаў[1059].

У 1970–80-я гг. назіраецца павелічэнне актыўнасці католікаў і моўна-этнічнай самасвядомасці палякаў, што было абумоўлена некалькімі прычынамі. Сярод іх варта адзначыць некаторыя, якія засталіся па-за ўвагаю даследчыкаў[1060].

Па-першае, абранне ў кастрычніку 1978 г. кракаўскага архіепіскапа, кардынала Караля Вайтыла на пасаду Папы пад імем Яна Паўла ІІ і яго візіты ў новай якасці на сваю радзіму ў чэрвені 1979 і 1983 гг.[1061] Пад уплывам гэтых важных для палякаў падзей на Гарадзеншчыне актывізавалася дзейнасць рэлігійнага актыву і польскіх місіянерскіх арганізацый пад патранажам

[1055] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 212–213.
[1056] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 162.
[1057] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). С. 281.
[1058] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 213.
[1059] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 354.
[1060] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ).
[1061] *Пушкін І.А.* Польскае пытанне ў БССР у святле візітаў Папы Рымскага Яна Паўла ІІ у Польшчу // Религия и общество – 5: актуальные проблемы свободы совести: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф. Могилёв, 2010. С. 62–64.

каталіцкай царквы. У раней узгаданым дакладзе У. Кураедава адзначалася: "… у каталіцызме сярод ксяндзоў ўсё больш прыкметны рост рэлігійнага экстрэмізму ... Гэта ў значна ступені звязана з прыходам на папскі прастол польскага арцыбіскупа Вайтылы, які далёка не сімпатызуе сацыялістычнаму ладу ... Не без блаславення Ватыкана ў Літоўскай ССР створаны «Камітэт абароны правоў каталікоў» ... Папа Ян Павел ІІ заявіў, што цяпер яго вуснамі будзе казаць ўціскай ў СССР «маўчашчая» каталіцкая царква, што палова яго сэрца знаходзіцца ў Літве…"[1062]. Другая палова належыла палякам.

Па-другое, рэлігійная інфармацыя праз польскія радыё і тэлебачанне. Напрыклад, у 1982 г. пра кананізацыю былога манаха Гродзенскага Францысканскага манастыра Максіміліяна Кольбе, які загінуў у Асвенцыме [1063]. У сувязі з гэтай падзеяй у касцёлах Гродна былі праведзеныя ўрачыстыя богаслужэнні. Насельніцтва, якое пражывала ў Гродна, Гродзенскім, Бераставіцкім, Свіслацкім, Шчучынскім, часткова Ваўкавыскім раёнах, мела магчымасць глядзець прамыя тэлетрансляцыі з Польшчы па 1 праграме Польскага ТБ[1064].

Узровень рэлігійнасці насельніцтва каталіцкага веравызнання, у пэўнай ступені, дазваляюць зрабіць прыкладныя назіранні прадстаўнікоў апарата ўпаўнаважанага па справах рэлігій у касцёлах пад час святкавання Пасхі і Ражства Хрыстова. Напрыклад, на Пасху 26.03.1978 г. у касцёлах было каля 100 тыс. вернікаў, што на 7–8 тыс. больш чым у 1977 г. Было заўважана павялічэнне вернікаў у Гродзенскай і Мінскай абласцях. У шэрагу касцёлаў Мінскай вобласці было шмат вернікаў з горада Мінска. Так, з электрычкі, якая прыбыла а трэццяй гадзіне ночы ў в. Краснае, сыйшло і накіравалася ў касцёл больш за 500 мінчукоў. У Гродзенскай вобласці частка вернікаў не здолела памясціцца ў касцёлах і стаяла на двары. Прычым гэта былі, як падкрэслівалі супрацоўнікі апарата ўпаўнаважанага: "Не празныя назіральнікі. У адрозненні ад праваслаўнай царквы, дзе на Пасху збіраецца шмат цікаўных з ліку моладзі, у касцёлах гэтага не бывае, усе хто прысутнічаюць, прымаюць удзел у набажэнстве"[1065].

У 1979 г. на святкаванні каталіцкай Пасхі прысутнічала 111 тыс чалавек, што на 11 тыс. больш чым у 1978 г. У асноўным асобы да 50 год, палова мужчыны, шмат моладзі (г. Ліда да 30 % ад прысутных). У Гродзенскай вобласці на набажэнствах прысутнічала да 1,5 тыс. падлеткаў і дзяцей. Шмат школьнікаў

---

[1062] Даклад старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР У. Кураедава "Аб асаблівасцях сучаснай рэлігійнай абстаноўкі і задачах па павышэнню эфектыўнасці кантролю за выкананнем заканадаўства ў рэлігійных культах" на Усесаюзнай нарадзе ўпаўнаважаных савета (1980) // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 106. Арк. 11–12.

[1063] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 215.

[1064] "Аб водгуках служыцелей каталіцкага культу і касцёльнага актыву на візыт Іаана Паўла ІІ у ПНР з 16 па 23.06.1983 г." ліст у ЦК КПБ упаўнаважанага савета па справах рэлігій па БССР ад 04.07.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 78–81.

[1065] Інфармацыя аб выніках назірання за святкаваннем каталіцкай Пасхі ў рэлігійных аб'яднаннях, якія дзейнічалі ў БССР. Красавік 1978 г. // Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 51. Арк. 63.

было ў касцёлах Віцебскай вобласці[1066]. У Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці, дзе на той час дзейнічала 5 касцёлаў: два ў Астраўцы, па аднаму ў Гервятах, Міхалішках і Варнянах, у 1979 г. выявілі 6 камуністаў і 40 камсамольцаў, што бралі ўдзел у рэлігійных абрадах![1067]

Вернікі Мінскай і Гродзенскай абласцей у 1978 г. звярнуліся да Упаўнаважанага па справах рэлігій пры СМ СССР з лістом у якім сцвярджалі, што ў БССР 3 млн вернікаў-католікаў і толькі 52 ксяндза сталага ўзросту. Прасілі каб у Беларусі быў свой епіскап і семінарыя[1068]. Працягвалася замаганне за рэгістрацыю рэлігійных аб'яднанняў. Напрыклад, у 1979 г. вернікі сабралі 606 подпісаў аб адкрыцці касцёла ў в. Дарава Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці[1069], у тым жа годзе ўлады адмовілі ў рэгістрацыі рэлігійнага аб'яднання ў в. Старыя Васілішкі Гродзенскай вобласці[1070].

Не спынялася дзейнасць не зарэгістраваных каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў. Так, нягледзячы на тое, што аб'ядненне было знята з рэгістрацыі ў 1967 г., вернікі в. Ішкалдзь Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці працягвалі сумесна выконваць абрады, пры чым дамагліся ад уладаў дазволу, каб ксёндз з Баранавіч Г. Расяк час ад часу абслугоўваў прыход па сумяшчальніцтву[1071].

На пачатку 1980-х гг. у БССР дзейнічала 109 каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў (з іх 6 не зарэгістраваных), якія абслугоўвалі 45 ксяндзоў (не ўлічаны святары касцёлаў Мінскай вобласці і г. Мінска). Найбольшая колькасць – 71, знаходзілася ў Гродзенскай вобласці, у Гомельскай і Магілёўскай не было ніводнага дзейнага (у 1974 г. улады зафіксавалі існаванне 2-х не зарэгістраваных аб'яднанняў католікаў у Магілёўскай вобласці)[1072].

Аналіз рэлігійнай абраднасці за 1982 г. паказвае, што ўсяго ў рэспубліцы нарадзілася 160 953 дзіцяці, былі ахрышчаны ў касцёлах – 3 529 (2,19 % ад агульнай колькасці нарадзіўшыхся ці 10,99 % ад агульнай колькасці хрышчаных). Зарэгістравана шлюбаў у ЗАГСе – 100 356, пабраліся царкоўным шлюбам у касцёлах – 917 (адпаведна 0,91 % і 54,13 %). Больш за палову ўсіх царкоўных шлюбаў па БССР былі ў асяродку католікаў! Памерла за год – 94 133 асобы, з іх пахавалі па царкоўнаму абраду ў касцёлах – 2 394 (адпаведна 2,54 % і 13,39 %)[1073].

---

[1066] Інфармацыя аб выніках назіранняў за святкаваннем "Пасхі" у рэлігійных аб'яднаннях, якія дзейнічаюць на тэрыторыі БССР у 1979 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558. Арк. 26–27

[1067] Даклад старшыні Савета па справах рэлігій пры СМ СССР У. Кураедава "Аб асаблівасцях сучаснай рэлігійнай абстаноўкі і задачах па павышэнню эфектыўнасці кантролю за выкананнем заканадаўства ў рэлігійных культах" // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 106. Арк. 23.

[1068] Заява групы вернікаў католікаў БССР да Упаўнаважанага па справах рэлігій пры СМ СССР ад 26.04.1978 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 1558. Арк. 14–15

[1069] Ліст Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій па БССР ад 20.06.1979 г. // Там жа. Арк. 55–56

[1070] Справаздача аб працы з лістамі і заявамі, аб прыёме наведвальнікаў у 1 паўгоддзі 1979 г. па БССР // Там жа. Арк. 76–83

[1071] Ліст Упаўнаважанага Савета па справах рэлігій па БССР ад 07.02.1979 г. на імя загадчыка аддзела Савета па справах рэлігій пры СМ СССР // Там жа. Арк. 5

[1072] Звесткі аб наяўнасці рэлігійных аб'яднанняў, служкаў культу па абласцям БССР // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 17. Арк. 38–45 ; Спр. 33. Арк. 81–88 ; Спр. 49. Арк. 151–171 ; Спр. 59. Арк. 66–73; *Пушкін І. А.* Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). С. 249.

[1073] Звесткі аб асноўнай рэлігійнай абраднасці ў БССР за 1982 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 38–39 ; *Пушкін І.А.* Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.). Мінск, 2010. С. 250.

Трэба ўлічваць тое, што гэтыя звесткі адпавядаюць афіцыйным дадзеным, якія грунтуюцца на запісах, зробленых адказнымі прадстаўнікамі рэлігійнай абшчыны. Праз царкоўныя абрады прайшла значна большая частка жыхароў Беларусі. А менавіта, праз абрады, здзейсненыя, на думку ўладаў, "нелегальна", на даму, святарамі ў раёнах, дзе не было афіцыйна зарэгістраваных абшчын; абрады, якія не рэгістраваліся па просьбе саміх грамадзян таму, што апошнія, будучы членамі ЛКСМБ і КПБ, не жадалі каб аб гэтым даведаліся органы ўлады; абрады, здзейсненыя без рэгістрацыі па ініцыятыве святароў, з фінансавых прычын.

Заўважалася актыўнасць і на ўсходзе Беларусі. У 1982 г. сакратар Бабруйскага ГК КПБ З. Зарэцкая, паведамляючы аб праробленай працы па выкананню пастановы ЦК КПСС "Аб мерах па супроцьдзеянню палітыцы Ватыкана ў адносінах сацыялістычных краін", падкрэсліла: "Састарэлыя каталікі (Гайдукова Ю. І., Прафірэнка Э. І., Слязь Ю. А. і інш.) перыядычна збіраюцца па вялікім прастольным святам на гарадскіх могілках каля магілы былога ксяндза. На працягу шэрагу гадоў гэтая група каталікоў піша ў розныя інстанцыі аб вяртанні ім былога будынка касцёла. Ім неаднаразова тлумачылася на безгрунтоўнасць гэтай просьбы". Далей партыйны функцыянер адзначыла: "Палепшаны кантроль за выкананнем заканадаўства аб культах, ўзмацнілася праца па спыненні супрацьпраўных дзеянняў рэлігійных фанатыкаў"[1074].

Аб высокай арганізаванасці каталіцкай царквы і вернікаў сведчыць інфармацыя намесніка упаўнаважанага савета па справах рэлігій Т. Купчэні аб рэлігійнай абстаноўцы ў г. Пінску: "Ксёндз Свёнтак перад усім падтрымлівае жорсткую рэлігійную дысцыпліну. Каталікі горада хрысьцяць амаль усіх дзяцей. …Ксёндз Свёнтак лічыць сябе поўнапраўным гаспадаром у каталіцкім аб'яднанні, а каталіцкі камітэт паслухмяна яму падпарадкоўваецца. Калі размова зайшла аб устанаўленні фіксаванай таксы за выкананне рэлігійных абрадаў, ксёндз заявіў: "Пакуль я тут гаспадар, ніякай таксы ўстанаўліваць не буду. Хто колькі дасі". Нежаданне царкоўнага лідара каталікаў Беларусі (у будучым кардынала) пераводзіць абраднасць на камерцыйныя рэйкі, знайшло зусім іншае тлумачэнне ў правяраючага, якога цікавіў падатак з фіксаванай таксы: "Такое высокароднае абурэнне ксяндза выклікана, безумоўна, не клопатам аб верніках, а асабістымі меркантыльнымі інтарэсамі"[1075].

У 1983 г. каталіцкай царквой да велікоднага свята быў прыурочаны пачатак юбілейнага году – 1950-годдзе ўкрыжавання Хрыста. У 103 касцёлах Беларусі на Пасху малілася каля 110 тыс. чалавек. Найбольш перапоўненымі былі: г. Гродна – Фарны (больш за 3000 чал.), Бернардзінскі (каля 3000), Францысканскі (1500), у г. Глыбокае (каля 2000), у вёсцы Солы Смаргонскага раёна (больш за 1000), в. Вішнева Смаргонскага раёна (каля 900). Былі перапоўнены касцёлы ў Лідзе, Баранавічах, Браслаўе, Міёрах, Нясвіжы, г.п. Іўе, вёсках Мсцібава Ваўкавыскага раёна, Осава Воранаўскага, Адэльск Гродзенскага, Канстанцінава і Шэметава Мядзельскага, Ліпнішкі Іўеўскага,

---

[1074] Даведка аб працы па выкрыццю рэакцыйнай сутнасці каталіцызму Бабруйскага ГК КПБ ад 06.12.1982 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 106. Арк. 201.
[1075] Даведка аб рэлігійнай абстаноўцы ў г. Пінску. 09.08.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 32.

Жупраны Ашмянскага, Васілішкі Шчучынскага раёнаў і іншыя. Склад вернікаў пераважна асобы сярэдняга ўзросту, 60–70 % жанчыны, 10–20 % моладзь[1076]. У шэрагу касцёлаў было даволі шмат падлеткаў. У Гродзенскай вобласці іх было каля 1400 чал.[1077] Набажэнствы праходзілі ўрачыста.

Пасля візыту Папы Рымскага Яна Паўла II у ПНР з 16 па 23.06.1983 г. апарат Упаўнаважанага па справах рэлігій правёў размовы з ксяндзамі і касцёльным актывам. У прыватнасці, з ксяндзамі: Зубяловічым (в. Канвелішкі Воранаўскага раёна), Банькоўскім (в. Осава Воранаўскага раёна), Арлоўскім (в. Адамовічы Гродзенскага раёна), Масальскім (в. Солы Смаргонскага раёна), Р. Юнікам (в. Рубяжэвічы Сталпцоўскага раёна), С. Лазарам (Брэст), Пацына (в. Мінойты Лідскага раёна), Трубовічам (Гродна). Ксёндз-дзекан Арановіч (Гродна) ухіліўся ад сустрэчы з упаўнаважаным, сказаў, што хворы і прасіў перанесці сустрэчу на пазнейшы час. Як адзначылі супрацоўнікі апарату, ксяндзы не выказалі якіх-небудзь асаблівых думак. Яны, безумоўна, праслухалі ўсе радыёперадачы пра візіт Папы Рымскага ў ПНР[1078] і глядзелі тэлеперадачы па тэлебачанню, але ў размовах былі вельмі асцярожнымі.

Візіты Папы Рымскага Яна Паўла II у Польшчу паспрыялі таму, што ў Беларусі ў 1983 г. пашырыліся выказванні кшталту: “Візіт Яна Паўла II ставіў перад сабой мэту яднання польскага насельніцтва” (П. Вент – прадстаўнік касцёльнага актыву Францысканскага касцёла г. Гродна); “Кожны паляк павінен быць сапраўдным каталікам. Менавіта палякі-каталікі павінны паказваць вернасць касцёлу, быць прыкладам паводзін у быту, сям’і, на працы” (ксёндз Масальскі з в. Солы); “Які ж гэта паляк, які ж гэта католік, калі ён на пытанне “ці вернік ты?”, адказвае “не”. Кожны веруючы паляк не павінен хаваць сваёй веры перад кім бы то не было, яму няма чаго баяцца, тым больш калі ён працуе не на кіруючай пасадзе” (ксёндз Цярэшка з Бернардзінскага касцёла г. Гродна); “Дзеці без касцёла і хрысціянскага выхавання не могуць стаць сапраўднымі каталікамі, што з’яўляецца безумоўным атрыбутам польскай нацыі” (ксёндз Занеўскі з в. Жупраны Ашмянскага раёна) і інш.[1079] Каталіцкія святары ў сваіх прамовах пад час набажэнстваў казалі аб рэлігійна-хрысціянскіх нормах паводзінаў каталікоў, аб нерушнасці і вечнасці веры,

---

[1076] “Аб выніках назірання за выкананнем заканадаўства аб культах у дні святкавання “Пасхі” ліст у ЦК КПБ упаўнаважанага савета па спрвах рэлігій па БССР ад 27.05.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 63–64.

[1077] У 1983 г. падчас святкавання Пасхі ўпаўнаважаныя саветаў па справах рэлігій выявілі ў 10 рэлігійных аб’яднаннях парушэнні заканадаўства аб культах: у касцёле г. п. Радунь Воранаўскага раёна ў крыжовым ходзе ўдзельнічалі 75 падлеткаў, якія былі апрануты ў “ангельскія” касцюмы, усе яны неслі прадметы культу; 27 падлеткаў былі ў касцёле Жупраны; 15 – у касцёле в. Баруны Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. У Францысканскім касцёле Гродна, касцёлах в. Васілішкі Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, Шэметава і Будслаў Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, падлеткі далучаліся да набажэнства (дапамагалі ксяндзам у алтары) і г.д. “Аб выніках назірання за выкананнем заканадаўства аб культах у дні святкавання Пасхі” ліст у ЦК КПБ упаўнаважанага савета па спрвах рэлігій па БССР А.Залескага за № 152 ад 27.05.1983 г. // Там жа. Арк. 66.

[1078] Даведнік па замежным радыёвяшчальным станцыям, якія вялі перадачы на мовах СССР па стану на 10.06.1981 г. // РДАНГ. Ф. 5. Воп. 55. Спр. 1013. Арк. 2–32.

[1079] “Аб водгуках служыцеляў каталіцкага культу і касцёльнага актыву на візыт Яна Паўла II у ПНР з 16 па 23.06.1983 г.” ліст у ЦК КПБ ад 04.07.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 56. Арк. 81–82 ; Інфармацыя аб ходзе выкання пастановы Савета па справах рэлігій пры СМ СССР “Аб мерах па ўзмацненню кантроля за выкананнем заканадаўства аб рэлігійных культах каталіцкімі аб’яднаннямі ў БССР” ад 25.10.1983 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3080. Арк. 43–44

імкнуліся даказаць выключна рэлігійны характар палякаў, абгрунтаваць "адзінства нацыянальнай і хрысціянскай ідэяў", а каталіцкую царкву прадставіць як неад'емны элемент духоўнай структуры польскай нацыі.

Улады ўсяляк перашкаджалі памкненням польскага насельніцтва Беларусі задаволіць свае рэлігійныя запатрабаванні. Напрыклад, у 1980–1985 гг. вернікі неаднаразова пісалі калектыўныя лісты-звароты з просьбай зарэгістраваць каталіцкія рэлігійныя аб'яднанні горада Барысава Мінскай вобласці і г.п. Івенец Валожынскага раёна (1983 г. – 10 лістоў, 1984 г. – 29, 1985 г. – 3)[1080]. На ўсе звароты атрымалі адмоўны адказ. Наогул, за дзесяць год (1976–1985) у БССР было зарэгістравана 73 рэлігійных аб'яднання, з іх толькі 2 рыма-каталіцкіх, адначасова 1 каталіцкае рэлігійнае аб'яднанне было знята з уліку зарэгістраваных. Варта асобна адзначыць, што ў адрозненні ад Гродзенскай і Мінскай абласцей, у Віцебскай вобласці (1985), дзе было 11 каталіцкіх рэлігійных аб'яднанняў, адзначаўся рост наведваемасці касцёлаў (усяго/моладзі): 1980 г. – 9314/654; 1984 – 11539/800; 1985 – 11360/804 чал.[1081]

Тым не менш, менавіта каталіцкая царква не дала знікнуць у польскага насельніцтва Савецкай Беларусі памяці аб асноўных традыцыях і ўласнай ідэнтычнасці, тым самым выканала галоўную ролю – захаванне нацыянальных каштоўнасцей традыцыйнай культуры.

**Узровень нацыянальнай свядомасці прадстаўнікоў літоўскай і нямецкай нацыянальнасці.** Каталіцкая рэлігія займала важнае месца і ў культуры літоўцаў, у тым ліку і тых, што жылі на тэрыторыі Беларусі. Натуральнае літоўскае этнакультурнае асяроддзе было найбольш прадстаўленае ў вёсцы Пеляса і мястэчках Гервяты і Вавюрка на Гродзеншчыне. Пасля Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Радуньскага раёна, ў вёсцы Пеляса, быў заснаваны каталіцкі прыход для вернікаў-літоўцаў, у склад якога ўваходзіла насельніцтва 9 вёсак. На сродкі вернікаў быў пабудаваны касцёл, у якім пасля вайны да 1950 г. праводзіліся богаслужэнні. Але ў 1950 г. ксёндз быў арыштаваны. Прыхаджане неаднаразова звярталіся ў партыйныя і савецкія органы, як у раённыя і абласныя, так і рэспубліканскія, з просьбаю не чыніць перашкоды пры правядзенні богаслужэнняў і дазволіць мець свайго ксяндза, які б ведаў літоўскую мову. Аднак гэтыя звароты не мелі поспеху. Так, Упаўнаважаны Савета па справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў БССР заявіў, што вернікі-літоўцы ксяндза з Літоўскай рэспублікі не атрымаюць па прычыне таго, што няма закона, які дазволіў бы яго прапісаць у іншай саюзнай рзспубліцы[1082].

Праз дзейнасць касцёла ўмацоўвалася нацыянальная ідэнтычнасць літоўцаў. Шчыры водгук у сэрцах вернікаў літоўцаў знаходзілі словы ксяндзоў пад час

---

[1080] Заявы грамадзян католікаў у Савет па справах рэлігій пры СМ СССР // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3081. Арк. 7–16.
[1081] Інфармацыя аб святкаванні "Пасхі" у рэлігійных аб'яднаннях Віцебскай вобласці ў 1985 г. // Там жа. Спр. 3078. Арк. 4–10
[1082] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 233.

казанняў: “Католическая церковь единственная хранительница всего культурного наследия литовского народа, основной источник и проповедник высоких нравственных качеств населения, неустанный борец за прочность семейных очагов”, “Литовская нация религиозна, но чтобы все литовцы пошли по правильному пути, они должны ещё плотнее объединиться вокруг матушки церкви”[1083].

Пасля звароту ў Літоўскую каталіцкую курыю вернікі дамовіліся з ксяндзом Мітрыкасам Казісам, і ён у 1958 г. прыехаў для правядзення богаслужэнняў у Пелясы. Але прадстаўнікі мясцовых органаў міліцыі запатрабавалі, каб ён выехаў з раёна. Пасля гэтага 34 літоўцы каталіцкай абшчыны ў Пелясах ў 1959 г. накіравалі скаргу на дзеянні мясцовых уладаў на імя старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР К. Варашылава. У сваім лісце яны выказалі сваё неразуменне таго, чаму мясцовыя ўлады праследуюць іх за рэлігійныя перакананні і перашкаджаюць нармальнай працы каталіцкага касцёла Пеляскага прыхода. Пры гэтым яны адзначылі: “Мы выказваем Вам сваю глыбокую крыўду. Таму, што нас лічаць нераўнапраўнымі грамадзянамі нашай краіны. Чаму беларусы, палякі, рускія, татары, што насяляюць наш раён маюць магчымасць маліцца, і чаму ў гэтым адмаўляюць літоўцам?” Скарга, накіраваная ў Вярхоўны Савет СССР, была перасланая на разгляд Упаўнаважанаму Савета па справах рэлігійных культаў пры Гродзенскім аблвыканкаме М. Саласянкову. Ён у задавальненні просьбы літоўцаў зацвердзіць ксяндза Мітрыкаса адмовіў[1084]. Касцёл у в. Пелясы быў зачынены ўладамі ў 1962 г. Згодна афіцыйнай версіі з-за таго, што адсутнічаў ксёндз і не было сродкаў каб заплаціць зямельную рэнту і страхавыя плацяжы[1085].

Каталікі літоўскай нацыянальнасці маліліся ў касцёлах в. Радунь Воранаўскага раёна (БССР) і в. Дубічай Літоўскай ССР, ходзячы туды за 16 км.[1086] У 1978 г. група грамадзян літоўскай нацыянальнасці з в. Пеляса ўзнялі перад уладамі пытанне аб вяртанні вернікам касцёла, які быў зачынены ў 1962 г. Літоўцы, якія пражывалі ў Літве, усяляк імкнуліся падтрымліваць жыхароў в. Пелясы. Нават высылалі ў вёску шмат газет на літоўскай мове. На жаль недахоп ксяндзоў у Літоўскай ССР не дазволіў ім паслаць святара ў Беларусь[1087]. Аказваў ім дапамогу і створаны ў Літве “Камітэт па абароне праў вернікаў католікаў”. Як заяўлялі самі стваральнікі камітэта, яго мэтай было дамагацца роўных правоў вернікаў і атэістаў, сваёй дзейнасцю дапамагаць веруючым пераўтвараць у жыццё

[1083] Інфармацыйная справаздача “Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР” // LCVA. Ф. R–181. Воп. 3. Спр. 102. Арк. 22, 25

[1084] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 233.

[1085] Даведка па выніках выезда ў Іўеўскі і Воранаўскі раёны Гродзенскай вобласці ад 26.08.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 43–44.

[1086] Рыма-каталіцкія рэлігійныя супольнасці і іх матэрыяльная база (1944–1990) // LCVA. Ф. R-181. Воп. 2. Спр. 160. Арк. 166–177 ; Спр. 162. Арк. 240–251.

[1087] Некаторыя ксяндзы ў Літоўскай ССР абслугоўвалі па 2–3 касцёлы, у рэспубліцы існавала 100 касцёлаў (прыходаў), якія дзейнічалі і не мелі ксяндзоў. Інфармацыйная справаздача “Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1978 г.” // LCVA. Ф. R-181. Воп. 3. Спр. 100. Арк. 8 ; Інфармацыйная справаздача “Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1979 г.” // Там жа. Спр. 102. Арк. 10.

юрыдычнае і практычнае раўнапраўе вернікаў і атэістаў, інфармаваць кіраўніцтва касцёла і грамадскасць аб стане вернікаў у савецкіх рэспубліках. Члены камітэта выязжалі ў розныя прыходы, выступалі з пропаведзямі пад час якіх казалі, што ў краіне "няма свабоды сумлення, што правы вернікаў ушчамляюцца і заклікалі весці актыўную барацьбу за веру не шкадуючы сябе"[1088].

Асаблівы водгук знаходзілі ў вернікаў літоўцаў словы ксяндзоў пад час казанняў: "Каталіцкая царква адзіная захавальніца ўсёй культурнай спадчыны літоўскага народа, асноўная крыніца і прапаведнік высокіх маральных якасцяў насельніцтва, нястомны змагар за трываласць сямейных ачагоў", "Літоўская нацыя рэлігійная, але каб усе літоўцы пайшлі па правільным шляху, яны павінны яшчэ шчыльней аб'яднацца вакол матухны царквы"[1089]. Гэта вельмі сугучна з поглядамі на ролю каталіцкага касцёла ў асяродку польскага насельніцтва.

Высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці выклікаў незадавальненне ўладаў. На думку старшага інспектара савета па справах рэлігій А. Панамарова: "Магчыма, з нацыяналістычных імкненняў вернікі і ўзнімалі пытанне аб адкрыцці касцёла з наступным запрашэннем туды ксяндза-літоўца… Са свайго боку лічу, што касцёл у в. Пелясы быў зняты з рэгістрацыі правільна і зноўку аднаўляць яго дзейнасць немэтазгодна"[1090].

На тэрыторыі БССР пражывалі асобы нямецкай нацыянальнасці. У адпаведнасці з пастановай МУС БССР ад 16.07.1948 г. з Беларусі падлягалі высяленню ў Іркуцк 454 немцы-рэпатрыянты, якія жылі на яе тэрыторыі ў часы гітлераўскай акупацыі. З набліжэннем войскаў Чырвонай Арміі яны выехалі ў Германію, а затым вярнуліся ў Беларусь у парадку праведзенай рэпатрыяцыі. Акрамя зазначанай вышэй колькасці немцаў-рэпатрыянтаў, з Беларусі ў Іркуцкую вобласць былі высланы яшчэ 273 нямецкія сям'і (944 чал.) і 63 немцы-адзіночкі[1091]. У 1970-я гг. у Нараўлянскім раёне Гомельскай воласці жылі 124 чалавекі нямецкай нацыянальнасці. У тым ліку ў вёсках: Майдан – 20 чал., Антонаўка – 19, Бярозаўка (у 1920-я гады існаваў Нямецкі нацыянальны сельскі савет) – 30, Асінаўка – 27, Хаткі – 28. Яны вялі аднолькавы з беларусамі лад жыцця, разам працавалі і адпачывалі. Былі змешаныя беларуска-нямецкія сем'і. Прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці мясцовых сельскіх саветаў. Дэпутатамі былі абраны 2 немцы ў Даўлянскім сельскім савеце, трое – у Дарновічскам с/с. Адзін быў дэпутатам раённага савета. З ліку агульнай колькасці асобаў нямецкай нацыянальнасці ў 1974 г. навучаліся ў тэхнікумах – 9 чал., у ВНУ – 2 (1 – завочна). Шэсць асобаў нямецкай нацыянальнасці мелі дзяржаўныя ўзнагароды. У гады вайны 1941–1945 гг. Мерцін Вальтар Гербартавіч змяніў прозвішча на Маркіна Уладзіміра Ягоравіча таму, што немцаў не бралі ў савецкае войска і трапіў дабраахвотнікам на фронт. Быў паранены і вярнуўся ў Беларусь.

---

[1088] Інфармацыйная справаздача "Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР" за 1978, 1979 гг. // LCVA. Ф. R–181. Воп. 3. Спр. 100. Арк. 8, 16 ; Спр. 102. Арк. 10, 11, 25.

[1089] Інфармацыйная справаздача "Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1979 г." // Там жа. Спр. 102. Арк. 22, 25

[1090] Даведка па выніках выезда ў Іўеўскі і Воранаўскі раёны Гродзенскай вобласці ад 26.08.1978 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 43–44.

[1091] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 89.

Працаваў механізатарам у саўгасе "Дзярновічы". Некаторыя, напрыклад Э. Блох, перапісваліся са сваякамі, якія жылі за мяжой, атрымлівалі ад іх пасылкі. З усіх немцаў толькі 2 з'яўляліся вернікамі ЕХБ і наведвалі зарэгістраваную абшчыну ЕХБ у Кіеўскай вобласці. Былі сярод немцаў праваслаўныя. У хатах мелі абразы. Было шмат і атэістаў. На асобныя сумесныя малітоўныя сходы немцы не збіраліся[1092].

**Нацыянальна-рэлігійнае жыццё татараў у БССР.** Другая сусветная вайна і першыя пасляваенныя гады прывялі да значнага скарачэння колькасці татараў у Беларусі. Абумоўлена гэта было тым, што шмат іх гераічна змагаліся і загінулі на франтах Другой сусветнай вайны, а пасля вайны падаліся ў эміграцыю: у Польшчу, ЗША, Турцыю і іншыя краіны.

Пазней адбывалася паступовае, нязначнае павелічэнне колькасці татараў, пры гэтым удзельная вага іх у агульнай колькасці насельніцтва БССР заставалася аднолькавай і складала 0,1 %. Пражывалі татары кампактнымі групамі, большая частка з іх у месцах традыцыйнага рассялення – на тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай абласцей, а таксама ў г. Мінску. Па стану на 1946 г. з 16 мячэцяў 10 былі нацыяналізаваны і заняты культурна-асветнымі ўстановамі, 3 разбураны ў выніку ваенных дзеянняў і 3 заставаліся пустымі[1093].

Паводле падлікаў прафесара У. Навіцкага, у першыя пасляваенныя месяцы дзейнічала 13 мусульманскіх абшчын у месцах кампактнага пражывання беларускіх татараў[1094]. На працягу 1944–1960-х гг. дзейнічалі як зарэгістраваныя, так і не, наступныя мусульманскія абшчыны беларускіх татараў у г. Мінску (214 вернікаў), в. Мураўшчына (сёння частка г. Іўе, 270 вернікаў) Маладзечанскай (з 1954 г. – Гродзенскай) вобласці, у Клецку (знята з рэгістрацыі ў 1960 г.) Баранавіцкай (з 1954 г. – Мінскай) вобласці, в. Стары Мядзель Мядзельскага раёну (138 вернікаў, абшчына распушчана ў 1948 г. з-за адсутнасці мячэці), в. Даўбуцішкі Смаргонскага раёну (150 вернікаў, у 1949 г. адмоўлена ў рэгістрацыі), г. Навагрудка (да 1000 вернікаў, у 1948 г. мячэць пераўтворана ўладамі ў клуб), Слоніме (220 вернікаў), Докшыцах Полацкай вобласці, Ляхавічах (150 вернікаў, мячэць выкарыстоўвалася ўладамі пад ільносховішча), невялікія абшчыны (20–30 вернікаў) в. Лоўчыца Навагрудскага раёна, Ластаі Смаргонскага раёна, Некрашунцы Воранаўскага, Сандыкаўшчына Шчучынскага раёнаў. У 1950-я гг. цэнтрам рэлігійнай актыўнасці беларускіх татар была абшчына в. Мураўшчызна[1095].

Адной з першых была зарэгістравана 26.03.1945 г. абшчына татараў-мусульман у Мінску на чале з 53-гадовым мулой М. Хасяневічам. У чэрвені 1945 г. дзейнічалі таксама мячэці у Клецку на чале з мулой М. Александровічам, у

---

[1092] Ліст упаўнаважанага савета па справах рэлігій па Гомельскай вобласці ад 12.11.1974 г. Упаўнаважанаму савета па справах рэлігій пры СМ СССР па БССР // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36. Арк. 100–101.
[1093] *Монзуль В.* Положение мусульманских общин в БССР в 1944–1960 годах (по документам Национального архива Республики Беларусь) // Архівы і справаводства. 2018. № 2. С. 83.
[1094] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). С. 262.
[1095] *Монзуль В.* Положение мусульманских общин в БССР в 1944–1960 годах (по документам Национального архива Республики Беларусь). С. 84–87.

мястэчку Мір, якую ўзначальваў М. Муха. Без рэгістрацыі дзейнічала мячэць у Навагрудку, заснаваная ў 1410 г., дзе мулой быў С. Сафарэвіч. Тут абшчына была самай шматлікай і налічвала каля 1000 чалавек. Богаслужэнні ў Асмолаўскай мячэці ў першыя пасляваенныя гады праводзіў без рэгістрацыі мула Ю. Халембек. Татара-мусульманская абшчына ў Асмолаве ў 1946 г. аб'ядноўвала каля 500 чалавек. Захаваліся мячэці таксама ў Любчы і Слоніме, але там не было мулы[1096].

У 1947 г. працавала без мулы мячэць у г. Ляхавічах. Богаслужэнні там праводзілі прадстаўнікі мясцовай мусульманскай абшчыны: А. Міцкевіч, Д. Мурзіч і І. Рафаловіч. Да 1946 г. ў вёсцы Некрашунцы Радунскага раёна дзейнічала рэлігійная абшчына татараў-мусульман, якая аб'ядноўвала татарскае насельніцтва не толькі Радуньскага раёна Гродзенскай вобласці, але і з памежных тэрыторый Літвы. Там жа захаваўся і будынак мячэці. Але ў сувязі з выездам у 1946 г. у Польшчу значнай часткі татарскага насельніцтва і мулы Мухля Люта Адамавіча, які лічыў сябе, паводле нацыянальнасці, польскім татарынам, мусульманская абшчына перастала функцыянаваць, а мячэць была закрыта. Нягледзячы на тое, што арганізаванага правядзення богаслужэнняў у гэтых месцах не праводзілася, татарскае насельніцтва падтрымлівала і выконвала Уразу, святкавалі Байрам, па пятніцах не працавалі і выконвалі ўсе іншыя рэлігійныя абрады ў адпаведнасці з патрабаваннямі Карана[1097].

Выезд большай часткі мусульманскай абшчыны Навагрудка на пастаяннае месца жыхарства ў Польшчу ў 1946 г. стаў падставай для ліквідацыі гэтай абшчыны і закрыцця мячэці. Рашэннем Баранавіцкага аблвыканкама 25.03.1948 г. абшчына была ліквідавана, а мячэць зачынена і неўзабаве пераабсталявана пад Дом піянераў[1098].

01.11.1948 г. у вёсцы Мураўшчына Іўеўскага раёну Гродзенскай вобласці было зарэгістравана мусульманскае рэлігійнае таварыства з мулой М. Шабановічам, муэдзінам Я. Багдановічам. У таварыства ўваходзіла да 400 чалавек вернікаў. Мячэць знаходзілася ў г. п. Іўя. Гэта таварыства не спыняла свайго існавання з моманту яго ўзнікнення. Дзейнічала яно і ў перыяд гітлераўскай акупацыі. Недзе ў 1946 г. стары мула памёр і пасля гэтага мулой быў выбраны М. Шабановіч. На вялікія святы Ураза-Байрам, Курбан-Байрам, Ашура збіраліся татары з усёй Беларусі[1099].

28.07.1949 г. Мінскі гарсавет дэпутатаў прыняў рашэнне аб закрыцці адзінай у Мінску мячэці з-за таго, што няшмат вернікаў і на працягу трох месяцаў не было мулы. Нягледзячы на зварот 163 вернікаў да Сталіна, татары-мусульмане Мінска былі пазбаўлены свайго храма, які быў перададзены ў верасні 1949 г. Рэспубліканскаму добраахвотнаму таварыству садзейнічання

---

[1096] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 227.
[1097] Там жа. С. 228.
[1098] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). С. 262.
[1099] Дакладная запіска аб выніках выезду ў Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці старшага інспектара савета па справах рэлігій па Гродзенскай вобласці ад 11.06.1974 г. // НА РБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 107 ; Даведка па выніках выезда ў Іўеўскі і Воранаўскі раёны Гродзенскай вобласці ад 26.08.1978 г. // Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 40–41.

флоту і выкарыстоўваўся ў якасці клуба. Знішчылі будынак мячэці – архітэктурны помнік, у 1962 г.[1100]

У пачатку 1953 г. функцыянавала па адной зарэгістраванай мусульманскай абшчыне ў вёсках Асмолава Нясвіжскага і Мураўшчызна Іўеўскага раёнаў. Акрамя іх дзейнічалі дзве незарэгістраваныя мусульманскія абшчыны ў в. Даўбуцішкі Смаргонскага і ў в. Некрашунцы Радунскага раёнаў. Да 1953 г. у вёсцы Даўбуцішкі засталося толькі 14 татарскіх сем’яў. На старажытных татарскіх могілках знаходзілася невялікая драўляная мячэць. У гэтай мячэці рэгулярна праводзіў богаслужэнні мула А. Рафаловіч. У 1948 г. ен атрымаў дазвол на правядзенне разавых богаслужэнняў. Смаргонскі райфінаддзел на падставе гэтай даведкі ўстанавіў для Рафаловіча падатак як для зарэгістраванага служыцеля культу. Кіруючыся рашэннем райфінаддзела, мула лічыў абшчыну зарэгістраванай. Абшчына аб’ядноўвала каля 200 вернікаў з 98 сямей татараў-мусульман, што жылі ў Смаргонскім, Валожынскім і Ашмянскім раёнах. Праўда, актыўнасць вернікаў была не вельмі высокай. Так, па пятніцах мячэць наведвалі не больш як 10–15 чалавек, а на свяце Ураза-байрам у 1953 г. было 70 вернікаў-мусульман[1101].

Цікава, што татары, якія пражывалі ў вясковай мясцовасці, карысталіся магчымасцю не працаваць па пятніцах і ў святочныя для мусульман дні. Калі ўпаўнаважаныя па справах рэлігіі цікавіліся ў мясцовых уладаў і старшынь калгасаў, чаму так лаяльна ставяцца да парушэнняў працоўнай дысцыпліны, пачулі ў адказ, што татары выпрацоўваюць мінімум працадзён і актыўна ўдзельнічаюць ў калчаснай вытворчасці[1102].

Рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўвых 15.03.1960 г. была пазбаўлена рэгістрацыі мусульманская абшчына ў вёсцы Асмолава Нясвіжскага раена, якая была зарэгістравана 09.12.1946 г. Падставай для прыняцця гэтага рашэння з’явілася скарачэнне колькаснага складу абшчыны з 95 чалавек на момант рэгістрацыі да 10–17 вернікаў – у 1960 г. Акрамя гэтага, у 1953 г. адмовіўся выконваць свае абавязкі 58-гадовы мула М. Александровіч. Па стану на 01.07.1960 г. у БССР дзейнічала толькі адна зарэгістраваная мусульманская абшчына ў в. Мураўшчызна Іўеўскага раёна. Абавязкі мулы ў гэтай абшчыне выконваў М. Шабановіч, якому на той час споўнілася 52 гады. Сітуацыя заставалася нязменнай і ў наступныя дзесяцігоддзі. Так, па стану на 01.01.1965 г. у рэспубліцы была зарэгістраваная адна мячэць, адзін мула, а колькасць вернікаў была каля 250 чалавек. Богаслужэнні па пятніцах у мячэці наведвала ад 40 да 60 чалавек. На асноўныя рэлігійныя мусульманскія святы збіралася ад 200 да 400 вернікаў з шэрагу раёнаў Гродзенскай і Мінскай абласцей, а таксама з Мінска[1103].

[1100] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.). С. 37–38.
[1101] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 229.
[1102] *Монзуль В.* Положение мусульманских общин в БССР в 1944–1960 гг. (по документам Национального архива Республики Беларусь). С. 88.
[1103] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 230.

У тыя гады адбывалася ліквідацыя месцаў пахаванняў (могілак), асабліва тых, што знаходзіліся ў цэнтры гарадоў і дзе меліся дарэвалюцыйныя пахаванні. Адбылося знішчэнне яўрэйскіх і татарскіх (мізараў) могілкаў. Яўрэйскія могілкі альбо знішчаліся, як у межах гарадскога пасёлка Радунь Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці (1974)[1104], ці пераўтвараліся ў агульныя, дзе дазваляліся пахаванні грамадзян незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, як у Магілёве.

Надмагільныя помнікі з татарскіх могілак – мізараў у шэрагу раёнаў рэспублікі былі забраныя на будаўніцтва шашы, а могільнікавыя палі заворваліся і займаліся пад выпас жывёлы. Так было знішчана святое для беларускіх татараў месца – магілы ля мястэчка Сіняўка Клецкага раёна. Яшчэ ў пачатку 1950-х гг. яно было месцам сапраўднага паломніцтва для татараў. Што гэта за магілы, хто там пахаваны і чаму менавіта мусульмане шануюць гэтыя магілы, ніхто з іх дакладна не ведаў, але з пакалення ў пакаленне перадавалася ім, што гэта ёсць “святое месца”, бо на гэтых магілах нехта калісьці атрымаў збаўленне ад хваробаў. Магілы на той час уяўлялі сабой каля 40 ледзь прыкметных узгоркаў, на якіх ужо не захавалася ніякіх слядоў у выглядзе помнікаў або каменняў. Беларускія татары маліліся на гэтых могілках па адным і цэлы дзень у час малітвы захоўвалі пост. У канцы 1960-х гг. быў знішчаны мізар у Мінску, ад якога цэлай засталася толькі магіла ўдзельніка Мінскага антыфашысцкага падполля Х. Александровіча[1105].

Слушна адзначае У. Монзуль, што пазбавіўшыся святароў (мулла), якія мелі адпаведную адукацыю, з-за эміграцыі ў Польшчу і, адчуўшы супрацьдзеянне ўладаў, беларускія татары напрыканцы 1940-х гг. сутыкнуліся з неабходнасцю самаарганізацыі, але у пачатку 1960-х гг. практычна ўсе абшчыны спынілі сваё легальнае існаванне[1106].

У 1970-я гг. цэнтрам мусульманскага жыцця беларускіх татараў заставаўся г. п. Іўе, дзе на малітоўныя сходы ў мячэць хадзіла да 50–60 чал. сталага ўзросту. У дні гадавых рэлігійных святаў збіралася да 200–250 чал. 04.01.1974 г. на свята Курбан-Байрам сабраліся вернікі Іўя, Мінска, Навагрудка, Смаргонскага раёна колькасцю звыш 280 чал. У мячэць хадзіла мала моладзі. Са слоў старшага інспектара савета па справах рэлігій па Гродзенскай вобласці. мула Шабановіч выказваў заклапочанасць, што са смерцю старэйшага пакалення знікне і мусульманская рэлігія ў Іўе[1107].

У Іўі спрабавалі наладзіць працу падпольнай школы для татарскіх дзетак. Вучыліся ў ёй каля 40 дзяцей, у пасляабедзенны час пасля заканчэння заняткаў у дзяржаўнай школе. Вось што пра гэта ўзгадваў былы вучань А. Шабановіч:

---

1104 Даведка аб ліквідацыі яўрэйскіх могілак у межах гарадскога пасёлка Радунь Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 36. Арк. 67–68.

1105 *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 230.

1106 *Монзуль В.* Положение мусульманских общин в БССР в 1944–1960 гг. (по документам Национального архива Республики Беларусь). С. 89.

1107 Дакладная запіска аб выніках выезду ў Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці старшага інспектара савета па справах рэлігій па Гродзенскай вобласці ад 11.06.1974 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 107.

“Кожны дзень мы рабілі справаздачу перад тоджыем (настаўнікам – гэта быў татарын Магамед), што новага вывучылі за гэты дзень. Калі на вуліцы з’яўляліся людзі з Іўеўскага сельскага савета або міліцыі, малеча, якая несла своеасаблівую варту на вуліцы, па эстафеце перадавала паведамленне пра небяспеку. Дзеці выбягалі з класа, хавалі падручнікі і сшыткі, ладзілі якія-небудзь гульні, пачыналі майстраваць вырабы з дрэва”. Як правіла, татарскія дзеці з вялікім стараннем ставіліся да вучобы ў гэтай школе. Большыня з іх ведала на памяць многія тэксты з Карана[1108]. Спрабавалі легалізаваць школу, але дарэмна. У размове са старшым інспектарам абласнога савета ў чэрвені 1974 г. мула Шабановіч казаў: “Было б добра, калі б мне дазволілі навучанне дзяцей рэлігіі, а то як мы памрэм і ніхто больш не зможа працягваць нашу справу”. Старшы інспектар у адказ тлумачыў існаваўшае заканадаўства аб рэлігійных культах і выказаў неправамернасць дадзенай справы[1109].

У 1978 г. старшы інспектар савета па справах рэлігій А. Панамароў адзначаў: “Усе татары, якія жылі ў Іўеўскім, Навагрудскім, Воранаўскім і іншых заходніх раёнах рэспублікі даўно зусім не ведаюць сваёй татарскай мовы, не ведае яе і сам мула. Усе татары даўно асіміляваліся з мясцовым насельніцтвам. Дзе-нідзе яшчэ старыя бяруць пакуль што верх над дзецьмі і прымушаюць браць шлюб з татарамі і татаркамі. Пры гэтым прымушаюць браць шлюб у мячэці. Са з’яўленнем дзяцей асобныя маладыя бацькі здзяйсняюць абрад надання імя таксама ў мячэці”[1110].

У той жа час улады Літоўскай ССР адзначалі (1978), што ў рэспубліцы пражывала каля 5 тысяч татар мусульман. У вёсцы Райжяй Алітускага раёна было зарэгістравана і дзейнічала рэлігійнае таварыства мусульман, якія прытрымліваліся сваіх нацыянальных традыцый (імам – М. Халецкі). На рэлігійных святах “Курбан-Байрам”, “Ураза-Байрам” у мячэці прысутнічалі не толькі члены рэлігійнага таварыства, але і мусульмане з розных гарадоў Літвы і БССР[1111].

У 1982 г. мула М. Шабановіч выказваў шкадаванне, што моладзь не жадае вучыцца чытаць Каран і ўдзельнічаць у маленнях, наведваючы мячэць толькі ў час асноўных рэлігійных святаў. Адной з прычынаў адыходу татарскай моладзі ад сваіх нацыянальна-рэлігійных традыцый было заключэнне шлюбаў з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. У самога мулы Шабановіча сын і ўнук былі жанаты не на прадстаўніцах сваёй нацыянальнасці і некаторыя вернікі папракалі яго за гэта. Тым не менш, менавіта на пачатак 1980-х гг. прыпадае пэўнае ажыўленне нацыянальна-рэлігійнага жыцця беларускіх татараў. Занепакоенасць мясцовых уладаў Навагрудка выклікала дзейнасць мулы А. Рафаловіча, які на працягу 1983 г. праводзіў пахаванне нябожчыкаў паводле

[1108] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). С. 38.

[1109] Дакладная запіска аб выніках выезду ў Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці старшага інспектара савета па справах рэлігій па Гродзенскай вобласці ад 11.06.1974 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 35. Арк. 108.

[1110] Даведка па выніках выезда ў Іўеўскі і Воранаўскі раёны Гродзенскай вобласці ад 26.08.1978 г. // Там жа. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 52. Арк. 40–41.

[1111] Інфармацыйная справаздача “Аб стане рэлігій у Літоўскай ССР у 1978 г.” // LCVA. Ф. R–181. Воп. 3. Спр. 102. Арк. 49–51

мусульманскіх традыцый не толькі ў Наваградку, але і ў Клецкім раёне Мінскай вобласці, а таксама збіраў у сябе дома вернікаў для правядзення багаслужэння[1112].

Нягледзячы на тое, што ў БССР практычна ўсе абшчыны татарскай супольнасці спынілі сваё легальнае існаванне, тым не менш вернікі працягвалі выковаць асноўныя календарныя абрады (не ў поўным фармаце). Памяць аб асноўных традыцыях садзейнічала захаванню татарамі ўласнай ідэнтычнасці і стварыла перадумовы для адраджэння іх рэлігіі ў 1990-я гг.

Такім чынам, у выніку ганенняў на вернікаў значна скарацілася колькасць зарэгістраваных абшчын і храмаў, паменшылася колькасць святароў, адзначалася некаторае памяншэнне колькасці прысутных на святочных набажэнствах у храмах[1113]. Але, нягледзячы на нястомнае змаганне з рэлігійнымі пачуццямі, уладам не ўдалося выкараніць іх з свядомасці людзей. Нават члены камуністычнай партыі (пад пагрозай выключэння з яе шэрагаў) выконвалі абрады і адзначалі рэлігійныя святы[1114]. Безумоўна, у БССР, былі і атэісты. У савецкія часы перапісы насельніцтва не ўлічвалі колькасць вернікаў. Таму немагчыма дакладна вызначыць працэнт прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, якія з'яўляліся вернікамі, аднак іх колькасць была даволі высокая. Шмат хто з іх выконваў абрады, наведваў царкву, але не дэклараваў гэта. Іншыя, страціўшы практыку выканання культавай абраднасці, лічылі сябе веруючымі. Пэўная частка насельніцтва па традыцыі лічыла сябе прыналежнымі да той ці іншай канфесіі, але не ведала ні малітваў, ні абраднасці. Іх варта аднесці да асобаў, якія з'яўляліся носьбітамі пэўных рэлігійных традыцый (каштоўнасцей). Усё гэта стварала ўмовы для адраджэння ролі рэлігіі ў грамадстве, але на іншым узроўні ўсведамлення.

На 01.01.1986 г. у БССР было храмаў: касцёлаў – 111, з іх 48 помнікі гісторыі і культуры, стараабраднікаў – 20 (рускія), мячэцяў – 1 (татары), сінагог – 1 (яўрэі). Дзейнічала рэлігійных аб'яднанняў: каталіцкіх – 104 (52 ксяндза) і 8 незарэгістраваных; старабраднікаў адпаведна 23, 19, 1; мусульман 1, 1, 0; іўдзеяў 1, 0, 8[1115] .

Аналіз архіўных крыніц і паведзенае даследаванне дазваляе нам зрабіць наступныя высновы. Нягледзячы на абмежаванні ў афіцыйнай рэгістрацыі і дзейнасці, праваслаўныя і старадраверскія (рускія), каталіцкія (палякі і літоўцы), іўдзейскія (яўрэі), пратэстанскія (латышы і немцы), мусульманскія (татары) абшчыны функцыянавалі ў БССР на працягу другой паловы 1940-х–1980-я гг. Паводле розных даных іх колькасны склад вагаўся ад некалькіх дзесяткаў асоб (якіх можна лічыць найбольш актыўнымі) да некалькіх сотняў. Асноўную частку вернікаў складалі асобы ва ўзросце пасля 50 гадоў. Калі ў першыя пасляваенныя

---

[1112] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 231.

[1113] Канфесіі на Беларусі (к. XVIII–XX стст. ). С. 280–285 ; Інфармацыя аб выніках назірання за святкаваннем рэлігійных свят // НАРБ. Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19, 20.

[1114] Пастанова бюро Гомельскага абкама КПБ ад 14.04.1961 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 99. Спр. 79. Арк. 330.

[1115] Справаздачная даведка Ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігій па БССР ад 14.01.1986 г. // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 3129. Арк. 1–61

гады абшчыны імкнуліся да легалізацыі сваёй дзейнасці, то пазней яны або абралі тактыку ўтойвання яе ад органаў мясцовай улады, або дзейнічалі пры ўмовах адсутнасці афіцыйнай рэгістрацыі. У сваю чаргу супрацьдзейнічанне ўладаў было дастаткова пасіўным і праяўлялася галоўным чынам у недапушчэнні іх рэгістрацыі. За пасляваенныя дзесяцігоддзі было страчана шмат нацыянальных традыцый. Менавіта рэлігія ў пасляваенны час выканала галоўную ролю – захаванне нацыянальных каштоўнасцей, традыцыйнай культуры нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі.

## 5.2 Удзел у партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве Савецкай Беларусі

Амаль семдзесят пяць год асновай палітычнай сістэмы нашага грамадства з'яўляліся камуністычная партыя і саветы. Рэальную ўладу мела толькі кампартыя, у першую чаргу яе бюракратычны апарат. Усе рашэнні прымаліся на пасяджэннях палітбюро, ЦК і з'яўляліся абавязковымі для выканання.

Неабходна адразу падкрэсліць, што ў СССР міжнацыянальная напружанасць была прыцішана высокай этнасацыяльнай мабільнасцю. Сярод кіруючага апарату было вельмі шмат прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. У залежнасці ад сітуацыі і кар'ернай неабходнасці ня рэдкімі былі змены прозвішча і нацыянальнасці. Паступова ішоў працэс стварэння "новай гістарычнай супольнасці" – рускамоўнай, але не рускай. Напрыканцы 1980-х гг. утварыўся адносна моцны пласт людзей, якія ўсведамлялі сябе нацыянальна "ніякімі" – толькі савецкімі. Гэта былі дзеці, народжаныя ў міжэтнічных шлюбах, якія даўно забылі зямлю продкаў, мову бацькоў. Палова грамадзян СССР напрыканцы 1980-х гг. лічылі сябе проста "савецкімі людзьмі"[1116].

У разглядаемы перыяд былі пэўныя асаблівасці ў фарміраванні партыйна-дзяржаўнай наменклатуры ў Заходняй Беларусі, асабліва ў першыя 10–15 год пасля вайны. Як адзначае акадэмік М. Касцюк, у гэты час да насельніцтва Заходняй Беларусі быў вялікі палітычны недавер, павышаная падазронасць, характэрная для сталінскай сістэмы ўлады. Гэта знайшло адлюстраванне ў прызначэнні кіруючых работнікаў, якія былі пераважна з усходняй і цэнтральнай Беларусі і іншых месцаў СССР. Як адзначалася ў дакладзе М. Зімяніна "Пастанова ЦК КПСС "Пытанні Беларускай ССР і задачы партарганізацый КП Беларусі", з якім ён выступіў 25–27.06.1953 г. на IV пленуме ЦК КП(б)Б, у заходніх абласцях рэспублікі амаль усе кіруючыя пасады заняты немясцовымі кадрамі. З 1175 партыйных работнікаў прадстаўнікоў тытульнай нацыянальнасці было толькі 121. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 89,7 %. З 1408 работнікаў абласных выканаўчых камітэтаў толькі чацвёртая частка з'яўлялася мясцовымі беларусамі, а з 231 работніка гарвыканкамаў такіх было 25. У абласным і гарадскім выканаўчых камітэтах Полацкай вобласці не было ні аднаго работніка-беларуса з заходніх раёнаў.

[1116] *Игнатенко И.М.* Национальный вопрос и современность. С.38.

Прыкладна такое ж становішча назіралася ў органах міністэрства ўнутраных спраў БССР, пракуратуры, сярод работнікаў гандлю і г. д.[1117]

Даследчык І. Саракавік сцвярджае, што палітычны недавер, павышаная падазронасць да беларусаў, якія патэнцыяльна маглі займаць кіруючыя пасады, асабліва да выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, што захоўваліся аж да 1991 г., прывялі да таго, што імі фактычна не займаліся вядучыя пасады ў органах дзяржаўнай улады і кіравання БССР, і тым самым правакавалі ўнутраныя супярэчнасці паміж гэтай часткай эліты і ўладаю. Так, у 1951 г. урад БССР складаўся з 33 чалавек, з якіх 22 былі рускімі, толькі 9 беларусамі, 1 грузінам, 1 яўрэям. Першымі асобамі Беларусі былі прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Гэта першы сакратар ЦК КПБ М. Гусараў, старшыня Савета Міністраў БССР А. Кляшчоў, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. Казлоў. Зыходзячы з гэтага і заключэнняў М. Касцюка, І. Саракавік робіць выснову, што "адбывалася мэтанакіраванае масавае запаўненне іншанацыянальным элементам штатных пасадаў дзяржаўных, грамадска-палітычных структур, сфер культуры, навукі, асветы, аховы здароўя і г. д., што прыводзіла да культурна-моўнай асіміляцыі, размывання этнічнага ядра нацыі, аслаблення развіцця этнічнай самасвядомасці беларусаў"[1118].

У шэрагах КПБ, органах выканаўчай і савецкай улады не магло быць іншадумства. Тым не менш, займаючы адказныя пасады ў кіраўніцтве КПБ і саветах, магчыма было нейкім чынам уплываць на ўсе бакі жыцця насельніцтва. Менавіта праз іх структуры вялікую актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці БССР праяўляла шмат прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Разгледзім гэтыя магчымасці, аналізуючы нацыянальны склад насельніцтва, а таксама найбольш уплывовых установ і апарата кіравання па БССР.

**Нацыянальны склад апарату КПБ.** Доля нацыянальных меншасцей у складзе ўсяго насельніцтва ў разглядаемы перыяд была практычна стабільнай – 18,9 % у 1959 г. і 22,1 % у 1989 г. (гл. дадатак А), але значна меншай, чым у камуністычнай партыі, дзе складала адпаведна 53,49 і 28,9 %. Найбольш вялікай і меўшай тэндэнцыю да павялічэння была руская супольнасць як у складзе ўсяго насельніцтва БССР, так і сярод членаў КПБ (гл. табліцу 31).

Колькасць беларусаў у КПБ у 1945–1951 гг. павялічылася на 473 %, у 1951–1961 гг. на 231 %, у 1961–1971 гг. на 202,9 %, у 1971–1981 гг. на 137,6 %, у 1981–1988 гг. на 117,4 %. Адначасова рост колькасці рускіх – членаў КПБ у 1945–1951 гг. склаў 288 %, 1951–1961 гг. – 146,3 %, 1961–1971 гг. – 176,4 %, 1971–1981 гг. – 142,4 %, 1981–1988 гг. – 114 %.

---

[1117] *Касцюк М.* Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. С. 104.
[1118] *Саракавік І.А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 353.

Табліца 31 – Нацыянальны склад КПБ у 1945–1990 гг. (на 01.01. адпаведнага года)[1119]

| Год | 1945 г. | 1951 г. | 1961 г. | 1971 г. | 1981 г. | 1989 г. | 1990 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго членаў КПБ | 29515 | 116663 | 225541 | 434527 | 595311 | 699159 | 697608 |
| Беларусы | 13726 | 64969 | 150352 | 305065 | 419816 | 497413 | 496751 |
| Нацменшасці (чал.) | 15789 | 51694 | 75189 | 129462 | 175495 | 201746 | 200857 |
| Нацменшасці (%) | 53,49 | 44,31 | 33,33 | 29,79 | 29,48 | 28,9 | 28,8 |
| Рускія (% ад агульнай колькасці членаў КПБ) | 36,88 | 26,88 | 20,34 | 18,62 | 19,35 | 19,08 | 19,09 |

Палякі на працягу 1950–80-х гг. стабільна займалі пятае месца ў агульным складзе КПБ (пасля беларусаў, рускіх, украінцаў, яўрэяў), а іх агульная колькасць з 0,6 % у 1950 г. узрасла да 1,8 % у канцы 1980-х гг. У лічбах гэта выглядае так (выбарачныя дадзеныя): у 1955 г. у КПБ было 828 палякаў, 30 казахаў, 7 узбекаў, 3 кіргізы, 42 грузіны, у 1970 г. – 7050 палякаў, 50 казахаў, 31 узбек, 2 кіргізы, 105 грузінаў[1120]. Але нягледзячы на абсалютную большасць, у параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, палякі вельмі часта ў выдадзеных справаздачах не ўзгадваліся асобным радком.

Колькасць украінцаў у складзе Камуністычнай партыі Беларусі вырасла з 1502 чалавек у 1945 г. да 28695 у 1985 г., або амаль у 19,1 раза, пры павелічэнні агульнай колькасці членаў КПБ у 22,2 разы. Разам з тым, у 1945 г. удзельная вага ўкраінцаў у складзе КПБ склала 5,08 %, у 1985 г. зменшылася да 4,37 %, а на 01.01.1990 г. яна была на ўзроўні 4,5 %. Удзельная вага ўкраінцаў у складзе КПБ істотна перавышала іх вагу ў складзе насельніцтва Беларусі. Пры гэтым у 1959 г. 6,13 % ад агульнай колькасці ўкраінцаў Беларусі былі камуністамі, у 1970 г. гэты паказчык павялічыўся да 9,57 %, а ў 1979 г. ён склаў 10,82 %. Удзельная вага камуністаў сярод беларусаў складала адпаведна 2,87; 4,0 і 5,2 %, а сярод рускіх – 6,8; 8,2 і 9,5 %[1121].

Значным быў уплыў нацменшасцей на грамадска-палітычнае жыццё і праз мясцовы партыйны апарат. І не толькі. Шэраговыя камуністы праз удзел у розных камісіях адыгрывалі істотную ролю ў грамадскім і гаспадарчым жыцці

---

[1119] Складзена і падлічана па: Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988. С. 112–115 ; Справаздачы. Нацыянальны склад партарганізацыі КПБ у 1989–1991 гг. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1125. Арк. 139 адв.–140 адв. ; Спр. 1054. Арк. 181–187 адв. ; Спр. 26. Арк. 86–86 адв. ; Спр. 929. Арк. 129–129 адв. ; Аб павялічэнні шэрагаў кампартыі. Матэрыялы II Пленума Брэсцкага абкама КПБ // ДАБр. Ф. 1. Воп. 20. Спр. 4. Арк. 67–128.

[1120] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 295.

[1121] *Мазец В.Г.* Роля ўкраінцаў у грамадскім і культурным жыцці Беларусі (1945–1989 гг.) // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар.навук. канф. С. 313.

рэспублікі. Напрыклад, у справаздачным дакладзе XXIV з'езду КПБ першага сакратара ЦК КПБ К. Мазурава адзначалася: "Вялікую дапамогу партыйным арганізацыям рэспублікі ў барацьбе з недахопамі ў працы прамысловых прадпрыемстваў аказвалі створаныя па рашэнню ЦК КПСС камісіі па ўвасабленню права кантролю за дзейнасцю адміністрацыі. Такіх камісій налічвалася 1780…"[1122]. Прычым, вядома шмат выпадкаў, калі камісіі займаліся неўласцівымі ім функцыямі, нават спрабавалі падмяняць адміністрацыю прадпрыемстваў у вырашэнні розных вытворчых пытанняў.

У партыйным апараце да 1970-х гг. вага нацменшасцей была большай, чым у агульным складзе насельніцтва рэспублікі, аднак меншай, чым прадстаўніцтва ў КПБ (гл. табліца 32).

Табліца 32 – Нацыянальны склад сакратароў абкамаў, гаркамаў і райкамаў КПБ 1950 – 1988 гг. (на 01.01. адпаведнага года)[1123]

| Год | 1950 г. | 1955 г. | 1960 г. | 1965 г. | 1970 г. | 1975 г. | 1980 г. | 1985 г. | 1988 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго | 579 | 839 | 528 | 412 | 478 | 482 | 503 | 509 | 508 |
| Беларусы | 406 | 576 | 366 | 283 | 361 | 395 | 404 | 414 | 407 |
| Рускія | 153 | 230 | 138 | 103 | 91 | 71 | 76 | 74 | 80 |
| Украінцы | 13 | 29 | 24 | 22 | 18 | 11 | 13 | 9 | 7 |
| Іншыя | 7 | 4 | – | 4 | 8 | 5 | 10 | 12 | 14 |
| Нацменшасці ў працэнтах | 29,9 | 31,3 | 30,9 | 31,3 | 24,5 | 18,1 | 19,7 | 18,7 | 19,9 |
| Рускія ў працэнтах ад агульнай колькасці | 26,4 | 27,4 | 26,1 | 25 | 19,04 | 14,73 | 15,1 | 14,53 | 15,7 |

Фармальна вышэйшым органам улады ў рэспубліцы лічыліся з'езды КПБ. Аналіз нацыянальнага складу дэлегатаў з'ездаў (гл. табліца 33) дазваляе нам казаць аб безумоўнай перавазе да сярэдзіны 1960-х гг. нацыянальных меншасцей сярод дэлегатаў у параўнанні з іх вагой у агульным складзе насельніцтва БССР. Затым гэтыя суадносіны практычна прыйшлі да адпаведнасці.

Статыстычныя дадзеныя дазваляюць прасачыць грамадска-палітычную актыўнасць прадстаўнікоў нятытульнай нацыі. Пры гэтым, аналізуючы нацыянальны склад дэлегатаў з'езда, трэба ўлічваць адміністратыўны фактар (імкненне цэнтральных органаў забяспечыць прыкладныя працэнтныя суадносіны колькасці дэлегатаў нацскладу насельніцтва і членаў партыі), а, таксама, нацыянальны склад гарадскога насельніцтва, павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў і нацыянальную палітыку, накіраваную на адміністратыўнае павелічэнне долі тытульнай нацыі ў складзе партыі, асабліва пасля прыходу да ўлады П. Машэрава.

[1122] Стэнаграма XXIV з'езда КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 244. Арк. 528.
[1123] Складзена і падлічана па: Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах 1918–1988. С. 218.

Табліца 33 – Нацыянальны склад дэлегатаў з'ездаў КПБ[1124]

| З'езд (год) / склад | Усяго дэлегатаў [1125] | Працэнт нацыянальных меншасцей | Рус. | Укр. | Інш. [1126] |
|---|---|---|---|---|---|
| XIX (1949) | 787 | 46,2 | 297 | 45 | 20 |
| XX (1952) | 709 | 42,3 | 255 | 33 | 10 |
| XXI (1954) | 745 | 44,2 | 280 | 41 | 8 |
| XXII (1956) | 812 | 44,6 | 296 | 70 | |
| XXIII (1959) | 664 / 86 | 38,1 / 34,9 | 214 / 21 | 32 / 6 | 7 / 3 |
| XXIV (1960) | 720 / 90 | 40,7 / 45,6 | 228 / 36 | 51 / 4 | 14 / 1 |
| XXV (1961) | 675 / 97 | 40,3 / 33 | 208 / 21 | 51 / 7 | 13 / 4 |
| XXVI (1966) | 781 (724 / 57) | 37,8 | 229 | 42 | 24 |
| XXVII (1971) | 794 (753 / 41) | 28,34 | 180 | 32 | 13 |
| XXVIII (1976) | 795 | 27,04 | 166 | 38 | 11 |
| XXIX (1981) | 799 | 22,78 | 142 | 22 | 18 |
| XXX (1986) | 807 | 23,54 | 148 | 24 | 18 |
| XXXI (1990) | 717 | 26,3 | 136 | 31 | 21 |

Так у перыяд XIX–XXIII з'ездаў дэлегаты-прадстаўнікі нацменшасцей складалі ў сярэднім крыху больш 44 %, у той жа час іх вага ў нацыянальным складзе насельніцтва БССР – 18,9 %. Пры гэтым рускіх было 8,2 %, а сярод дэлегатаў з'ездаў каля 36 %. На XXIV – XXVI з'ездах нацменшасцей было прыблізна 40 %, у той жа час у агульным складзе 19 % (рускіх адпаведна 28 % і 10,4 %). Сітуацыя кардынальна стала мяняцца з XXVII з'езда. На ім і на наступных вага прадстаўнікоў нятытульнай нацыі Беларусі стала складаць каля чвэрці дэлегатаў. Пры гэтым нацменшасцей было каля 20 % насельніцтва рэспублікі. Адпаведна працэс закрануў і прадстаўнікоў рускай нацыі ў дэлегацкім складзе. Пры П. Машэраве назіралася тэндэнцыя да іх памяншэння: 29 % – 22,6 % – 20,8 % – 17,8 % (1981), пасля яго смерці крыху пабольшала да 18,3 % – 18,9 %.

Прадстаўніцтва на з'ездах мясцовых камуністаў украінскага паходжання было стабільным і, таксама як і рускіх, прыкладна ў 2–3 разы большае, чым іх вага сярод усіх жыхароў рэспублікі.

Іншыя нацыянальнасці з агульнага складу дэлегатаў вылучыць цяжка, бо яны пазначаліся агулам у адной графе. У першыя пасляваенныя гады асобна вылучалі яўрэяў, у перабудовачныя – палякаў. У абодвух выпадках іх

[1124] Складзена і падлічана па: Стэнаграмы з'ездаў. Даклад мандатнай камісіі // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 213. Арк. 279 ; Спр. 218. Арк. 199 ; Спр. 225. Арк. 205, 208 ; Спр. 237. Арк. 349 ; Спр. 239. Арк. 126–127 ; Спр. 244. Арк. 67–68 ; Спр. 248. Арк. 62-64 ; Спр. 251. Арк. 96 ; Спр. 257. Арк. 72 ; Спр. 269. Арк. 149 ; Воп. 140. Спр. 1. Арк. 107 ; Воп. 160. Спр. 374. Арк. 92 ; Спр. 1029. Арк. 175 ; Спр. 1027. Арк. 175.

[1125] Пазначана колькасць: з рашаючым / дарадчым голасам.

[1126] XIX з'езд: з 20 асоб 8 былі яўрэямі ; XX з'езд: з 10 асоб 4 яўрэя ; XXX з'езд: з 18 асоб 14 былі палякамі ; XXXI з'езд: з 21 асобы 15 былі палякамі.

прадстаўніцва на з’ездах было ў 2 разы меншае, чым у агульнай колькасці насельніцтва БССР.

У часы сталінскага кіравання, як на ўсесаюзным, так і на мясцовых узроўнях, каб не дапусціць умацавання пры ўладзе каго-небудзь, распачыналі перастаноўку кадраў. Прычым выкарыстоўвалі адзін з найбольш правераных спосабаў – барацьба з рознага роду “нацыяналізмамі”. Напрыклад, у 1949 г. з рускім нацыяналізмам, у 1949–1950 гг. з яўрэйскім і г.д.[1127]

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў партыйным апараце ўсіх узроўняў прадстаўлены асноўныя нацыянальныя меншасці Беларусі: рускія, украінцы, палякі, яўрэі, на ўзроўні гаркамаў і райкамаў – армяне, латышы, карэлы, малдаване, кабардзінцы.

Вельмі высокі працэнт нацменшасцей – 55,6 % быў сярод загадчыкаў аддзелаў ЦК КПБ. У асяродку намеснікаў загадчыкаў аддзелаў ЦК – 55 %, сектараў ЦК – 40 %, сакратароў абкамаў КПБ – 46,7 % (гл. табліца 34).

На ўзроўні сярэдняга выканаўчага звяна партыйнага кіраўніцтва на месцах прадстаўнікоў нацменшасцей было менш. Так, нацменшасці на 01.07.1946 г.: сярод усіх сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ складалі 31,4 %, першых сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ – 37 %, другіх сакратароў гаркамаў і райкамаў КПБ – 31,4 %, сакратароў гаркамаў і райкамаў – 26,5 %, загадчыкаў аддзелаў гаркамаў і райкамаў – 43,4 %. Больш за ўсіх было рускіх у асяродку загадчыкамі аддзелаў ЦК КПБ і сакратароў абкамаў (недавер да мясцовых нацыянальных кадраў у дзейнасці якіх цэнтральныя органы бачылі праявы нацыяналізму і нацдэмаўшчыну). Амаль аднолькавая колькасць украінцаў была на ўсіх пасадах сярэдняга сакратарскага корпусу ў КПБ. Найбольшая колькасць яўрэяў была загадчыкаў аддзелаў і сектараў ЦК КПБ, а таксама сярод загадчыкаў аддзелаў райкамаў і гаркамаў і на пасадах другіх сакратароў. Па 1 паляку, армяніну, латышу былі першымі сакратарамі, 1 карэл – другім і 2 палякі – звычайнымі сакратарамі гаркамаў і райкамаў КПБ.

Да 1956 г. першымі асобамі БССР былі не прадстаўнікі тытульнай нацыі, а асобы з ліку нацыянальных меншасцей. У тым годзе ўпершыню з сярэдзіны 1920-х гг. ЦК КПБ узначаліў беларус – К. Мазураў. У 1965 г. у Беларусі кампартыю ўзначаліў П. Машэраў. З яго прыходам стала памяншацца ўдзельная вага нацыянальных меншасцей сярод кіруючых кадраў кампартыі. На гэта таксама паўплывалі змяненне нацыянальнага складу гарадскога насельніцтва і павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў. У суадносіны з працэнтным складам сярод членаў партыі прыйшла доля кіраўнікоў рускай нацыянальнасці. У 1980 г. П. Машэраў трагічна загінуў.

У табліцы 35 паказана доля нацыянальных меншасцей БССР у складзе партыйных кадраў КПБ у 1970–1990 гг. Аналіз кіруючых органаў дазваляе нам засведчыць, што працэнт нацыянальных меншасцей сярод апарату ў 1950–1980-я гг. быў меншы чым сярод шэраговых членаў КПБ, за выключэннем асобаў рускай нацыянальнасці да пачатку 1980-х гг.(гл. дадаткі Ж, К, Л).

---

[1127] *Кожинов В.В.* Наследники победы. С. 186.

Табліца 34 – Нацыянальны склад наменклатурных кадраў КПБ на 1.07.1946 г.[1128]

| | **Усяго чал.** | **Бел. %** | **Рус. %** | **Укр. %** | **Яўр. %** | **Пал. %** | **Інш. %** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Загадчыкі аддзелаў ЦК | 9 | 44,4 | 44,4 | – | 11,2 | – | – |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў ЦК | 20 | 45 | 35 | 10 | 10 | – | – |
| Загадчыкі сектараў ЦК | 30 | 60 | 30 | 3,3 | 6,7 | – | – |
| Сакратары абкамаў | 60 | 53,3 | 40,1 | 3,3 | 3,3 | – | – |
| Сакратары ўсіх гаркамаў і райкамаў | 576 | 68,6 | 26,4 | 2,1 | 1,9 | 0,5 | 0,5 |
| Першыя сакратары гаркамаў і райкамаў | 181 | 63 | 31,5 | 2,8 | 1,1 | 0,5 | 1,0 |
| Другія сакратары гаркамаў і райкамаў | 191 | 68,6 | 24,6 | 2,1 | 4,2 | – | 0,5 |
| Сакратары гаркамаў і райкамаў | 204 | 73,5 | 23,5 | 1,5 | 0,5 | 1,0 | – |
| Загадчыкі аддзелаў гаркамаў і райкамаў | 359 | 56,6 | 29,2 | 3,3 | 10,6 | 0,3 | – |

Рускіх было ў сярэднім 20–26 % ад агульнай колькасці займаючых пасаду, прычым іх удзельная вага з пачатку 1970-х гг. заставалася адносна стабільнай. Акрамя іх, пачынаючы з канца 1960-х гг., на ўзроўні вышэйшага партыйнага кіраўніцтва рэспублікі ўкраінцамі былі па 1 загадчыку і намесніку аддзелаў ЦК КПБ толькі ў 1970-я гг., па 1–2 асобы – сярод загадчыкаў сектараў і інструктараў ЦК КПБ у 1970–80-я гг.

Сярод сакратароў абкамаў былі 2 украінцы толькі ў 1971 г. Затым сакратарамі былі толькі беларусы і рускія. Сярод апарату абкамаў, гаркамаў і райкамаў у 1970–80-я гг. былі прадстаўлены: украінцы, пачынаючы з пасады загадчыка аддзела гаркама і райкама і да загадчыка аддзела абкама КПБ; палякі – ад загадчыка аддзела гаркама і райкама і да інструктара абкама КПБ. У 1978 г. адзін паляк быў намеснікам загадчыка аддзела абкама. Яўрэі былі сярод загадчыкаў аддзелаў гаркамаў і райкамаў КПБ і па адным загадчыку аддзела абкама ў 1971 г. і намесніку загадчыка аддзелаў абкама ў 1978 г.

Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей працавалі на ўзроўні сакратароў гаркамаў і райкамаў і загадчыкаў аддзелаў гаркамаў і райкамаў КПБ. Трэба памятаць, што некаторыя асобы яўрэйскай нацыянальнасці, па розных прычынах, не паказвалі сваю нацыянальнасць, далучаючы сябе да беларусаў і рускіх[1129].

[1128] Падлічана па: Нацыянальны склад. Справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 968. Арк. 10–11, 22–23, 34–35, 57–58, 129–131, 142–144, 154–156, 166–168, 178–224.
[1129] Нацыянальны склад партыйных кадраў // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 968.

Табліца 35 – Нацыянальныя меншасці БССР у складзе партыйных кадраў КПБ у 1970–1990 гг. (у працэнтах, на 01.01. адпаведнага года)[1130]

| **Назва пасады / год** | **1971** | **1976** | **1981** | **1986** | **1987** | **1989** | **1990** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ | 25 | 42,8 | 43,8 | 37,5 | 42,9 | 25 | 25,5 |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў ЦК | 31,8 | 21,7 | 16,7 | 10 | 7,1 | 11,1 | 18,5 |
| Загадчыкі сектараў ЦК | 10,1 | 16 | 14,8 | 22,6 | 20 | 15,8 | 20,5 |
| Інструктары ЦК | 23,4 | 22,1 | 17,3 | 19,8 | 21,6 | 21,4 | 21,4 |
| Сакратары абкамаў КПБ | 23,2 | 23,2 | 20 | 21,7 | 20 | 17,2 | 16,67 |
| Загадчыкі аддзелаў абкамаў | 29,5 | 25,8 | 26,2 | 23,6 | 24,3 | 27,8 | 26,5 |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў абкамаў | 26,7 | 15,4 | 11,6 | 16,3 | 13,3 | – | 21,6 |
| Загадчыкі сектараў абкамаў | 25 | 24,5 | 32 | 26,5 | 24 | – | 25 |
| Інструктары абкамаў | 21,5 | 22,3 | 25,9 | 23,7 | 24,6 | 24,3 | 22,7 |
| Сакратары гаркамаў і райкамаў (усіх) | 22,4 | 18,3 | 18,9 | 19,2 | 18,7 | 19,8 | 19,7 |
| Першыя сакратары гаркамаў і райкамаў | 23,3 | 18 | 14,4 | 16,4 | 14,5 | 15,7 | 13,3 |
| Другія сакратары гаркамаў і райкамаў | 22,7 | 14,6 | 21,9 | 15 | 15,2 | 24,4 | 21,2 |
| Сакратары гаркамаў і райкамаў | 21,3 | 22,4 | 20,5 | 26,1 | 26,4 | 23,3 | 26,5 |
| Інструктары гаркамаў і райкамаў | – | 18,9 | 21,8 | 21,2 | 20,8 | 17,5 | 21,1 |
| Загадчыкі аддзелаў гаркамаў і райкамаў | 17,4 | 17,2 | 20,6 | 17,6 | 15,7 | 15,9 | 17,6 |

Нацыянальны склад партыйна-дзяржаўнай наменклатуры БССР змяніўся напярэдадні абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту пад уплывам дэмакратычных перамен, выкліканых палітыкай перабудовы (1986–1991). Паранейшаму, прадстаўнікоў нацменшасцей было, нязначна, але больш у складзе КПБ, чым у агульным складзе насельніцтва рэспублікі (гл. табліцу 36).

У асяродку кадравых работнікаў апарату КПБ у 1984–1989 гг. з ліку нацыянальных меншасцей на ўсіх пасадах працавалі рускія, амаль на ўсіх былі прадстаўлены ўкраінцы (гл. табліцу 37). Сярод іншых варта вылучыць палякаў і яўрэяў.

[1130] Складзена і падлічана па: Справаздачы. Нацыянальны склад партыйных кадраў (КПБ) // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 968. Арк. 10–248 ; Воп. 133. Спр. 70. Арк. 1–219 ; Спр. 71. Арк. 1–166.

Табліца 36 – Нацыянальны склад партарганізацыі КПБ у 1984–1991гг.[1131]

| | **01.01.1984 г.** | **01.01.1989 г.** | **01.01.1990 г.** | **01.01.1991 г.** |
|---|---|---|---|---|
| Усяго членаў і кандыдатаў (з вышэйшай адукацыяй) | 641015 (187603) | 699159 (228735) | 697608 (236183) | 617159 (223777) |
| Нацыянальныя меншасці, чал. (%) | 186020 (29 %) | 201746 (28,9 %) | 200857 (28,8 %) | 176401 (28,6 %) |
| рускія | 122613 | 133437 | 133221 | 117646 |
| украінцы | 28141 | 31083 | 31207 | 27902 |
| беларусы | 454995 | 497413 | 496751 | 440758 |
| узбекі | 78 | 127 | 144 | 128 |
| казахі | 104 | 113 | 111 | 91 |
| грузіны | 197 | 251 | 248 | 211 |
| азербайджанцы | 267 | 379 | 409 | 343 |
| літоўцы | 330 | 370 | 373 | 320 |
| латышы | 208 | 209 | 205 | 177 |
| малдаване | 187 | 272 | 278 | 251 |
| армяне | 415 | 501 | 549 | 534 |
| яўрэі | 15912 | 14289 | 13129 | 10052 |
| комі | 140 | 140 | 138 | 131 |
| мардва | 384 | 402 | 392 | 340 |
| немцы | 184 | 254 | 248 | 204 |
| палякі | 14253 | 16978 | 17225 | 15417 |
| татары | 1051 | 1134 | 1136 | 1036 |
| удмурты | 119 | 136 | 137 | 119 |
| чувашы | 434 | 461 | 476 | 409 |
| башкіры | 97 | 127 | 126 | 111 |
| марыйцы | 88 | 102 | 101 | 91 |
| іншыя | 818 | 981 | 1004 | 888 |

З 1959 па 1970 гг. колькасць украінцаў павялічылася на 40,7 %, з 1970 да 1979 г. – на 17,4 %, з 1979 да 1989 г. – на 20,6 %. У 1979 г. асобаў украінскай нацыянальнасці з вышэйшай і сярэднеспецыяльнай адукацыяй было 392 тыс., з іх 180 тыс. з вышэйшай; у 1989 г. адпаведна 476 тыс. і 222 тыс. Па колькасці служачых у 1989 г. украінцы знаходзіліся на трэцім месцы пасля рускіх і яўрэяў. Сярод украінцаў павялічылася колькасць такіх сацыяльных катэгорый, як навукова-тэхнічная інтэлігенцыя, настаўнікі, урачы, работнікі культуры і мастацтва і інш.[1132] Украінцы займалі даволі прыкметнае месца ў партыйнай

[1131] Падлічана па: НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1125. Арк. 139 адв. -140 адв. ; Спр. 1054. Арк. 181–187 адв. ; Спр. 26. Арк. 86–86 адв. ; Спр. 929. Арк. 129–129 адв.

[1132] *Курыловіч Г.М.* Украінцы на Беларусі // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. С. 29–30.

наменклатуры. У 1955 г. на пасадах кіруючых кадраў КПБ з агульнага ліку 5223 працавалі 298 украінцаў, што складала 5,7 %, а ў наменклатуры ЦК КПБ удзельная вага ўкраінцаў склала 4,45 %. У аддзеле навукі і культуры ЦК КПБ яна складала 5,74 %, у сельскагаспадарчым аддзеле – 8,01 %. У 1955 г. на пасадзе загадчыкаў сектараў абкамаў і ЦК КПБ працавалі 2 украінцы, што склала толькі 2,7 %. У 1960 г. удзельная вага ўкраінцаў, што займалі пасады загадчыкаў гарадскіх і раённых аддзелаў культуры, павялічылася да 10,5 %. Па стану на 01.01.1975 г. пасаду аднаго з пяці сакратароў ЦК КПБ займаў украінец. У 1985 г. украінцы ўзначальвалі 3 з 32 сектараў ЦК КПБ, або 9,37 %, 5 з 71 аддзелаў абкамаў КПБ, што склала 7,04 %. Са 172 загадчыкаў раённых аддзелаў народнай адукацыі было 5 украінцаў, або 2,9 %, а ў 170 раённых і гарадскіх аддзелах культуры загадчыкамі працавалі 11 украінцаў, што склала 6,4 %[1133].

Асобы польскай нацыянальнасці займалі пасады (першая лічба – 1984 г., у дужках – 1989 г.): інспектараў ЦК КПБ – 1 (0), загадчыкаў аддзелаў абкамаў КПБ – 1 (0), інструктараў абкамаў – 7 з 8 (2), першых сакратароў гаркамаў – 1 (2), першых сакратароў райкамаў – 1 (0), другіх і проста сакратароў гарадскіх райкамаў – 0 (1), другіх і проста сакратароў райкамаў – 8 з 9 (5 з 6). Адпаведна асобы яўрэйскай нацыянальнасці займалі пасады: намеснікаў загадчыкаў аддзелаў абкамаў і ЦК КПБ – 1 (0), кіраўнікоў лектарскіх груп абкамаў і ЦК КПБ – 1 (0), намеснікаў загадчыкаў аддзелаў абкамаў КПБ – 1 (0), лектараў аддзелаў прапаганды і агітацыі абкамаў – 2 (0), загадчыкаў аддзелаў гаркамаў, райкамаў, гаррайкамаў – 0 (1 з 7).

Не ўдалося вызначыць у 1984 г. нацыянальнасць 18 загадчыкаў аддзелаў гаркамаў, райкамаў, гаррайкамаў і 34 інструктараў гаркамаў, райкамаў, гаррайкамаў КПБ. У 1989 г. у дадзеных катэгорыях пасадавых асобаў, сярод 7 загадчыкаў было 6 палякаў і 1 яўрэй, з 36 інструктараў 34 былі польскай нацыянальнасці. Іншыя нацыянальнасці былі прадстаўлены ў 1984 г. 1 інструктарам абкама КПБ, сакратаром райкама, 2 сакратарамі гаркамаў.

Такім чынам, пры прызначэнні на пасады перавага аддавалася прадстаўнікам рускай і ўкраінскай нацыянальнасці. Улічваючы высокі ўзровень адукацыі сярод яўрэйскага насельніцтва, можна казаць аб адміністратыўных перашкодах пры прызначэнні іх на пасады ў КПБ. У той жа час, трэба мець на ўвазе, што гаворка ідзе аб тых асобах, якія паказвалі ў анкетах сваю нацыянальнасць як яўрэй (некаторыя ў анкетах пазначалі сябе ў якасці рускіх ці беларусаў). Падобныя абмежаванні існавалі і ў адносінах да палякаў, іх даволі вялікая колькасць на нізавых пасадах у 1989 г. Гэта вынік зменаў у нацыянальнай палітыкі пасля 1985 г.

[1133] *Мазец В.Г.* Роля ўкраінцаў у грамадскім і культурным жыцці Беларусі (1945–1989 гг.). С. 313.

Табліца 37 – Нацыянальны склад кадравых работнікаў апарата КПБ у 1984–1989 гг.[1134]

| | 01.01.1984 г. | | | | 01.01.1989 г. | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго чалавек | Нацыянальныя супольнасці (%) | рускія | украінцы | Усяго чалавек | Нацыянальныя супольнасці (%) | рускія | украінцы |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў ЦК | 30 | 10 | 3 | | 18 | 11,1 | 2 | |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў абкамаў і ЦК | 73 | 15,1 | 8 | 2 | | | | |
| Загадчыкі сектараў ЦК | 32 | 18,8 | 5 | 1 | 19 | 15,8 | 2 | 1 |
| Загадчыкі сектараў абкамаў і ЦК | 82 | 24,4 | 18 | 2 | | | | |
| Кіраўнікі лектарскіх груп абкамаў і ЦК | 7 | 42,9 | 2 | | | | | |
| Інспектары ЦК | 11 | 18,2 | 1 | | 2 | 0 | | |
| Інструктары ЦК | 114 | 20,2 | 22 | 1 | 70 | 21,4 | 13 | 2 |
| Заг. аддзелаў абкамаў | 70 | 24,3 | 11 | 5 | 70 | 21,4 | 14 | 1 |
| Намеснікі загадчыкаў аддзелаў абкамаў | 43 | 18,6 | 5 | 2 | | | | |
| Лектары абкамаў* | 19 | 57,9 | 8 | | | | | |
| Інструктары абкамаў | 243 | 25,1 | 48 | 5 | 70 | 24,3 | 15 | |
| Першыя сакратары гаркамаў | 33 | 18,2 | 4 | 1 | 34 | 20,6 | 4 | 1 |
| Першыя сакратары гарадскіх райкамаў | 25 | 40 | 9 | 1 | 25 | 24 | 6 | |
| Першыя сакратары райкамаў | 102 | 10,8 | 9 | 1 | 100 | 12 | 9 | 1 |
| Сакратары гаркамаў** | 67 | 31,4 | 18 | 3 | 67 | 37,3 | 20 | 3 |
| Сакратары гарадскіх райкамаў | 49 | 18,4 | 8 | 1 | 49 | 28,6 | 12 | 1 |
| Сакратары райкамаў** | 204 | 16,2 | 22 | 2 | 200 | 15 | 22 | 2 |
| Загадчыкі аддзелаў гаркамаў і райкамаў | 666 | 18 | 84 | 18 | 454 | 16,6 | 59 | 9 |
| Інструктары гаркамаў і райкамаў, гаррайкамаў | 1191 | 21,3 | 185 | 35 | 1435 | 17,5 | 195 | 20 |

[1134] Падлічана па: НАРБ. Ф. 4 п. Воп.160. Спр. 26. Арк. 11–83 адв. (1984) ; Спр. 929. Арк. 141–199 адв. (1989).
* Лектары аддзелаў прапаганды і агітацыі абкамаў. ** Другія і проста сакратары.

На 01.01.1989 г. сярод адказных работнікаў апарата ЦК КПБ прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей Беларусі былі: рускія – інспектары ЦК В. Чарнышоў і Д. Дземічаў, інструктары ЦК А. Разумаў і І. Бруй, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК С. Паўлаў, інструктар аддзела прапаганды і агітацыі ЦК М. Бальшакоў, інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў Я. Стрэльчанка, намеснік загадчыка аддзела цяжкай прамысловасці В. Філіпаў, загадчык сектара прыборабудаўніцтва М. Алейнікаў, інструктар аддзела абарончай прамысловасці У. Сёмін, загадчык аддзела хімічнай прамысловасці А. Бедэнка, загадчык аддзела транспарта і сувязей І. Філатчанкаў, загадчык агульнага аддзела Г. Яршоў; украінцы – інструктар аддзела культуры В. Рэянт, намеснік загадчыка эканамічнага аддзела А. Козел; яўрэй – кіраўнік лектарскай групы ЦК С. Ходас; чуваш – адказны дзяжурны прыёмнай першага сакратара ЦК КПБ М. Віктараў і інш. Наогул у кожным аддзеле ЦК акрамя беларусаў ад 2 да 4 асобаў былі рускай нацыянальнасці[1135].

Табліца – 38 Нацыянальны склад асобных катэгорый кадравых работнікаў апарата КПБ на 01.02.1989 г.[1136]

| | Усяго чал. | Нацменшасці ў працэнтах | Рускія | Украінцы | Беларусы | Іншыя нацыянальнысці |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Адказныя работнікі апарата ЦК | 151 | 18,6 | 25 | 3 | 123 | |
| Адказныя работнікі абкамаў | 305 | 22 | 60 | 4 | 238 | 3* |
| Адказныя работнікі гаркамаў, райкамаў | 3030 | 17,95 | 408 | 62 | 2486 | 74** |
| Вызваленыя сакратары парткамаў, партбюро арганізацый, уключна з сакратарамі парткамаў з правамі райкамаў партыі БССР | 2330 | 16,2 | 247 | 54 | 1952 | 76*** |
| Сакратары парткамаў калгасаў | 946 | 10,8 | 50 | 9 | 844 | 43**** |
| Сакратары парткамаў саўгасаў | 752 | 11,8 | 53 | 11 | 664 | 24***** |
| Сакратары парткамаў ВНУ, сярэднеспецыяльных навучальных устаноў, навуковых устаноў | 47 | 42,55 | 16 | 2 | 27 | 2****** |

1135 Статыстычныя справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр.966. Арк.15–63
1136 Падлічана па: Там жа. Воп. 160. Спр. 929. Арк. 142–211 адв.
* 2 палякі, 1 яўрэй.
** 69 палякаў, 2 яўрэі.
*** 72 палякі, 1 немец, 1 татарын, 1 літовец, 1 малдаванін.
**** 40 палякаў, грузін, літовец, немец.
***** 23 палякі, малдаванін.
****** Палякі.

Аналіз нацыянальнага складу партыйных кадраў КПБ у пачатку 1989 г. дазваляе адзначыць, што прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Беларусі сярод работнікаў райкамаў і гаркамаў КПБ складалі 28 %, работнікаў абласных камітэтаў і ЦК КПБ адпаведна 22 % і 18,6 % (гл. табліца 38), сакратароў партарганізацый – 16,2 %, сакратароў раённых і гарадскіх камітэтаў КПБ – 19,8 %, у тым ліку першых сакратароў – 15,7 %[1137].

Табліца 39 – Нацыянальны склад кадравых работнікаў апарату КПБ на 01.01.1990 г.[1138]

| | Усяго чал. | Нацыянальныя супольнасці (працэнты) | Рускія | Украінцы | Беларусы | Іншыя |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сакратары ЦК КПБ | 6 | 33,3 | 2 | | 4 | |
| Загадчыкі аддзелаў, намеснікі загадчыкаў аддзелам ЦК | 43 | 25,5 | 11 | | 32 | |
| Намеснікі заг. аддзелаў ЦК і абкамаў | 65 | 18,5 | 8 | 3 | 53 | 1 |
| Загадчыкі сектарамі ЦК і абкамаў КПБ | 73 | 20,5 | 12 | 3 | 58 | |
| Лектары ЦК і абкамаў КПБ | 26 | 42,3 | 9 | | 15 | 2 |
| Інструктары ЦК КПБ | 98 | 21,4 | 18 | 3 | 77 | |
| Першыя сакратары абкамаў КПБ | 6 | 0 | | | 6 | |
| Другія і проста сакратары абкамаў | 24 | 20,8 | 5 | | 19 | |
| Загадчыкі аддзелаў абкамаў КПБ | 49 | 26,5 | 10 | 2 | 36 | 1 |
| Намеснікі загадчыкаў аддзеламі абкамаў | 37 | 21,6 | 4 | 3 | 29 | 1 |
| Загадчыкі сектарамі абкамаў | 48 | 25 | 9 | 3 | 36 | |
| Кіраўнікі лектарскіх груп абкамаў | 6 | 50 | 2 | | 3 | 1 |
| Лектары абкамаў | 18 | 50 | 7 | | 9 | 2 |
| Інструктары абкамаў | 220 | 22,7 | 39 | 4 | 170 | 7 |
| Старшыні гарадскіх камітэтаў народнага кантроля БССР | 29 | 34,5 | 8 | 2 | 19 | |
| Старшыні раённых камітэтаў народнага кантроля БССР | 106 | 13,2 | 10 | 3 | 92 | 1 |
| Першыя сакратары гаркамаў КПБ | 29 | 31 | 7 | 1 | 20 | 1 |
| Другія і проста сакратары гаркамаў | 59 | 35,5 | 15 | 4 | 38 | 2 |
| Сакратары гарадскіх райкамаў | 68 | 26,5 | 16 | 1 | 50 | 1 |
| Першыя сакратары райкамаў | 106 | 8,5 | 6 | 3 | 97 | |
| Другія і проста сакратары райкамаў | 211 | 17,1 | 26 | 4 | 175 | 6 |
| Загадчыкі аддзелаў гаркамаў і райкамаў | 534 | 17,6 | 70 | 20 | 429 | 4 |
| Інструктары райкамаў і гаркамаў КПБ | 1027 | 21,1 | 169 | 24 | 810 | 24 |

[1137] Статыстычныя справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 929. Арк. 137.
[1138] Падлічана па: Справаздачы. Нацыянальны склад кадравых работнікаў апарата КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 133. Спр.70. Арк. 1–219 ; Спр.71. Арк. 1–166.

Сярод сакратароў першасных арганізацый КПБ у 1989 г. было 25,7 % асобаў з ліку нацменшасцей, праз год – 25,2 %.

Нацыянальны склад наменклатуры кадраў абкамаў КПБ на 01.01.1989 г. паказвае, што прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 33,4 %. У наменклатуру кадраў абкамаў КПБ былі ўключаны 981 кіраўнік прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый. Сярод іх было 241 чал. (24,6 %) рускай нацыянальнасці, 53 (5,5 %) украінцы, 14 (1,4 %) яўрэяў, 12 (1,2 %) палякаў, 2 (0,2 %) татарыны, па 1 (0,1 %) немцу, бурату, адыгейцу, 3 (0,2 %) – іншых нацыянальнасцей[1139].

На 01.01.1990 г. (гл. табліцу 39) сакратарамі ЦК КПБ з 6 чалавек 4 былі беларусамі, 2 рускімі (33,3 %). Сярод лектараў ЦК і абкамаў КПБ у 1989 г. нацыянальныя меншасці складалі 42,3 %. Калі браць толькі лектараў абкамаў, якія забяспечвалі ідэалагічную апрацоўку насельніцтва, прадстаўнікі нацменшасцей складалі 50 %. Такі ж працэнт і сярод кіраўнікоў лектарскіх груп абкамаў. Трэцяя частка (34,5 %) старшынь гарадскіх і 13,2% раённых камітэтаў народнага кантроля БССР былі прадстаўлены нацменшасцямі.

У 1970–80-я гг. вялікую ролю адыгрывалі анкетныя дадзеныя. Гэта дазваляла пэўным чынам фарміраваць склад кіраўніцтва. Пры прызначэнні на пасаду значэнне мела сацыяльнае паходжанне і членства ў КПСС.

Партыйны білет станавіўся ўсё больш карысным "дадаткам" да дыплома аб вышэйшай адукацыі, спрыяючы кар'еры яго ўладальніка. Усё больш стала адчувацца расслаенне камуністаў на кіруючую эліту і партыйную масу. XXIII з'езд КПСС (1966) прыняў рашэнне выключыць са Статута партыі (1961) палажэнні, якія абмяжоўвалі тэрміны знаходжання камуністаў на кіруючых партыйных пасадах пры выкананні прынцыпа сістэматычнага абнаўлення складу і пераемнасці кіраўніцтва. Гэта фактычна з'яўлялася гарантыяй бестэрміновага знаходжання асобы на кіруючай партыйнай пасадзе. Становішча наменклатуры стала больш стабільным, а магчымасць уваходжання ў яе склад – больш абмежаванай. Абнаўленне членаў выбарных партыйных органаў было зведзена да мінімуму і, як правіла, не перавышала адной трэці складу. Такое ж становішча склалася і ў савецкіх органах. Сістэма станавілася ўсё больш замкнёнай. У канчатковым выніку "партыйна-дзяржаўная наменклатура ператварылася па сутнасці ў своеасаблівую карпарацыю, упэўненую ў сабе, у сваіх правах, якая адмежавалася ад астатняй часткі грамадства шматлікімі прывілеямі, усё больш злоўжывала ўладай"[1140]. У гэтых умовах удзел у дзейнасці партыйных арганізацый, які заахвочваўся партыяй, як праява палітычнай актыўнасці станавіўся ўсё больш і больш фармальным. Менавіта таму рост шэрагаў партыі ў значнай меры фарміраваўся штучна.

Існавалі абмежаванні пры прыёме ў кампартыю для асобаў, якія працавалі не на вытворчасці. Калі ў партыю імкнуўся ўступіць, напрыклад, настаўнік, гэта было магчымым у двух выпадках. Па-першае, калі яго вылучалі па ініцыятыве

[1139] Справаздачы // Там жа. Воп. 156. Спр. 966. Арк. 12,14.
[1140] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 315.

партыйных органаў на камсамольскую ці іншую грамадскую працу. Па-другое, калі адначасова з ім у партыю прымалі чатырох рабочых. Шмат асобаў траплялі ў кампартыю пад час службы ў войску. У складзе КПБ стала болей асобаў з навуковай ступенню. Для таго, каб стаць кандыдатам або доктарам навук, трэба было быць абавязкова, за рэдкім выключэннем, членам КПСС.

З'явіліся асобы, якія мелі навуковыя ступені, і ў асяродку партыйнай наменклатуры. Для прыкладу, прывядзем сацыяльны склад Магілёўскай абласной арганізацыі КПБ (гл. табліцу 40).

Табліца 40 – Сацыяльны склад Магілёўскай абласной арганізацыі КПБ (1989–1991)[1141]

| | **01.01.1989 г.** | | **01.01.1990 г.** | | **01.01.1991 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **колькасць** | **%** | **колькасць** | **%** | **колькасць** | **%** |
| Усяго членаў і кандыдатаў КПБ | 85240 | 100 | 84542 | 100 | 75000 | 100 |
| з іх служачых* | 34561 | 40,5 | 34599 | 40,9 | 31077 | 41,4 |
| з вышэйшай адукацыяй | 24965 | 29,3 | 25570 | 30,2 | 23802 | 31,7 |
| дактароў навук | 25 | | 26 | | 31 | |
| кандыдатаў навук | 550 | | 572 | | 525 | |

З аднаго боку ў склад кіраўнікоў вылучаюцца асобы, якія дасягнулі пэўных поспехаў у галіне гуманітарных або эканамічных навук. Адначасова яны праявілі сябе як асобы, адданыя партыі. З другога боку, асабліва ў 1980-я гг., кіраўнікам пэўнага ўзроўню стала прэстыжным мець навуковую ступень. Тым больш, што тэмы дысертацый, якія асвятлялі роль КПСС у розныя часы сацыялістычнага будаўніцтва, у галінах гаспадарчага будаўніцтва і сярод розных сацыяльных груп былі "праходнымі" і дазвалялі з поспехам абараніцца.

**Удзел у органах прадстаўнічай і выканаўчай улады.** Фарміраванне кіруючага апарату саветаў і выканкамаў адбывалася партыйнай наменклатурай у адпаведнасці з тымі працэсамі, якія былі характэрны для грамадска-палітычнага жыцця краіны.

Аб чым сведчыць нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР у 1940-я і 1971–1990 гг. (гл. табліцу 41). Прадстаўніцтва розных нацыянальнасцей падбіралася адміністратыўным шляхам у залежнасці ад склада насельніцтва[1142]. У 1946 г. наменклатура савецкіх кадраў БССР складалася: на ўзроўні старшынь аблвыканкамаў – 91,7 % беларусы (11 чал. з 12) і 8,3 % нацменшасці (рускі);

---

[1141] Падлічана па: Статыстычныя справаздачы Магілёўскага абкама КПБ // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 61. Арк. 1–1адв. ; Спр. 61. Арк. 1–1 адв. ; Спр. 121. Арк. 1–1адв. ; Спр. 201. Арк. 1–2.

* У іх лік уваходзілі: кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, інжынерна-тэхнічныя работнікі, урачы, юрысты, дырэктары школ, настаўнікі, выкладчыкі ВНУ, работнікі культуры, бытавой сферы, кантралёры, бухгалтары і г.д.

[1142] Ліст у міністэрствы і ведамствы БССР, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2222. Арк. 133–134.

сярод 26 намеснікаў старшынь аблвыканкамаў было 8 рускіх і 4 яўрэі – 46,2 % ад агульнай колькасці[1143].

Табліца 41 – Нацыянальныя меншасці БССР у складзе савецкіх кадраў у 1970–1990 гг. (у працэнтах, на 01.01. адпаведнага года)[1144]

| **Назва пасады / год** | **1971 г.** | **1976 г.** | **1981 г.** | **1986 г.** | **1987 г.** | **1989 г.** | **1990 г.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Старшыні аблвыканкамаў | – | 50 | 16,7 | 16,7 | 16,7 | 16,7 | 16,7 |
| Першыя намеснікі старшынь аблвыканкамаў | 33,3 | 16,7 | – | – | – | 8,3 | 9,1 |
| Намеснікі старшынь аблвыканкамаў | 38,9 | 16,7 | 16,7 | 22,2 | 22,2 | 25 | 14,2 |
| Старшыні гарвыканкамаў | 27,3 | 21,2 | 17,7 | 16,7 | 23,7 | 25 | 29,7 |
| Старшыні вясковых райвыканкамаў | 19,7 | 20,7 | 15,4 | 16,2 | 12,8 | 10,3 | 12 |
| Намеснікі старшынь выканкамаў гарадскіх і раённых саветаў | 30,9 | 24,2 | 19,5 | 19,6 | 19,3 | 18,8 | 17,9 |

Сярод кіруючага савецкага апарату БССР у 1976 г. было 3 беларусы і 3 рускія, а пачынаючы з 1981 г. з 6 старшынь аблвыканкамаў было 5 беларусаў і 1 рускі (гл. дадатак М). Украінцы былі сярод старшынь і намеснікаў старшынь гарвыканкамаў і вясковых райвыканкамаў. На больш высокім узроўні мясцовай улады (намеснікі і першыя намеснікі старшынь аблвыканкамаў) па 1 украінцу было толькі ў 1989–1990 гг. Асобы польскай нацыянальнасці прадстаўлены толькі сярод старшынь і намеснікаў старшынь гар- і райвыканкамаў. Асобы яўрэйскай нацыянальнасці ў статыстычных справаздачах адзначаны толькі сярод намеснікаў старшынь аблвыканкамаў у 1946 г. (4 чал.)[1145]

З сярэдзіны 1970-х гг. на ўзроўні непасрэднай працы выканаўчых органаў улады з жыхарамі вага нацменшасцей практычна адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва БССР (гл. табліцу 42).

Напярэдадні перабудовы практыкавалася прызначэнне на пасаду старшынь абвыканкамаў, райвыканкамаў прадстаўнікоў тытульнай нацыі, але абавязкова на ўзроўні намеснікаў былі асобы, пераважна, рускай нацыянальнасці. Пацвярджэнне гэтаму дазваляе знайсці аналіз нацыянальнага складу выканкамаўскіх работнікаў БССР 1980-х гг. (гл. табліцу 43).

У 1989 г. было старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў па нацыянальнасці: беларусаў – 81,7 %, рускіх – 11,5 %, украінцаў – 2,9 %, палякаў – 3,6 %[1146].

---

[1143] Справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 969. А. 9, 33.

[1144] Складзена і падлічана па: Справаздачы. Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР // Там жа. Спр. 969 (1946–1989). Арк. 9–83, 149–151 ; Спр. 767. Арк. 52 адв, 769 (1990). Арк. 1–47.

[1145] Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР. Справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 767, 769, 969.

[1146] Тлумачальная запіска аддзела арганізацыйна-партыйнай і кадравай работы ЦК КПБ. 10.07.1990 г. // Там жа. Спр. 767. Арк. 171.

Табліца 42 – Нацыянальны склад намеснікаў старшынь выканкамаў гарадскіх, раённых (у гарадах), раённых (вясковых) саветаў народных дэпутатаў БССР[1147]

| Нацыянальнасць | 01.04.71 г. | | 01.04.76 г. | | 01.07.81 г. | | 01.07.86 г. | | 01.07.90 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % | Чал. | % |
| Рускія | 68 | 22,8 | 71 | 16,5 | 53 | 11,7 | 77 | 12,3 | 73 | 11,4 |
| Украінцы | 13 | 4,4 | 20 | 4,6 | 22 | 4,9 | 21 | 3,3 | 18 | 2,8 |
| Беларусы | 206 | 69,1 | 326 | 75,8 | 364 | 80,5 | 504 | 80,4 | 527 | 82,1 |
| Палякі | 8 | 2,7 | 10 | 2,3 | 12 | 2,7 | 23 | 3,7 | 22 | 3,4 |
| Іншыя [1148] | 3 | 1,0 | 3* | 0,7 | 1** | 0,2 | 1 | 0,2 | 2*** | 0,3 |

Сярод кіруючых кадраў БССР на 01.01.1989 г. (гл. дадатак Р) асобаў нятытульнай нацыі было: загадчыкі аддзелаў прэзыдыума Вярхоўнага Савета – 16,7 % (з 6 асобаў 1 рускі), загадчыкі аддзелаў Савета Міністраў – 15 % (з 20 асобаў – 3 рускія), старшыні БРК прафсаюзаў – 9,6 % (з 21 асобы – па 1 рускаму і украінцу), сакратары абласных камітэтаў камсамолу – 24 % (з 25 асоб – 5 рускіх і 1 украінец), сакратары гарадскіх і раёных камітэтаў камсамолу – 16 % (з 481 чал. – 56 рускіх, 11 палякаў, 9 украінцаў, 1 грузін), міністры, старшыні дзяржкамітэтаў, кіраўнікі рэспубліканскіх установ – 17,2 % (з 64 чал. – 10 рускіх і 1 украінец), намеснікі міністраў, старшыні дзяржкамітэтаў, кіраўнікоў рэспубліканскіх установ – 30,8 % (з 169 чал. – 38 рускіх, 10 украінцаў, па 2 –палякі і яўрэі)[1149].

Нацыянальны склад органаў прадстаўнічай (выбарнай) улады ў апошнія гады існавання БССР быў наступны. У 1985 г. у склад Вярхоўнага Савета БССР выбралі 365 беларусаў, 89 рускіх, 15 украінцаў, 16 дэпутатаў іншых нацыянальнасцяў. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 24,7 %[1150]. Пасля правядзення наступных выбараў, дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР (на 01.01.1990) – 339 чал, з іх: беларусаў – 249, рускіх – 66, украінцаў – 11, палякаў – 12, яўрэяў – 1 (нацменшасці 26,55 %). Дэпутатаў ўсіх саветаў (абласных, гарадскіх, раённых, сельскіх) – 48208, з іх: беларусаў – 41453, рускіх – 3439, украінцаў – 1033, літоўцаў – 16, малдаван – 13, армян – 11, татар – 24, яўрэяў – 128, палякаў – 1973, немцаў – 16, іншых – 102 (кожнай нацыянальнасці менш 10 асоб), нацменшасці – 14,02 %. Абласныя саветы усяго депутатаў – 1392, з іх: беларусаў – 1024, рускіх – 186, украінцаў – 48, палякаў – 54, яўрэяў – 3, іншыя – 77, нацменшасці – 26,44 %. Раённыя саветы усяго депутатаў – 7832, з іх: беларусаў – 6758, рускіх – 504, украінцаў – 165, палякаў – 338, яўрэяў – 24,

[1147] Звесткі аб складзе і змяняльнасці савецкіх кадраў БССР // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 969. Арк.149–151 ; Спр.767. Арк. 52 адв.
[1148] * Адзін латышскай нацыянальнасці.
** Татарскай нацыянальнасці.
*** Па 1 комі і татарскай нацыянальнасці.
[1149] Справаздачы. Нацыянальны склад кіруючых кадраў БССР // Там жа. Спр. 966. Арк. 13–14.
[1150] БССР. Вярхоўны Савет. Скліканне, 11-е. Сесія, 1-я. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1985. С. 11.

латышоў – 4, літоўцаў – 2, грузінаў – 3, немцаў – 3, іншыя – 31, нацменшасці – 13,72 %. Гарадскія саветы: усяго депутатаў – 5467 (з іх: беларусаў – 4028, рускіх – 992, украінцаў – 243, палякаў – 131, яўрэяў – 39, эстонцаў – 4, іншыя – 30, нацменшасці – 26,33 %). Сельскія саветы: усяго депутатаў – 29005 (з іх: беларусаў – 26126, рускіх – 1111, украінцаў – 434, палякаў – 1229, яўрэяў – 29, літоўцаў – 13, татар – 8, немцаў – 9, іншыя – 46, нацменшасці – 9,93 %[1151]). Старшынь гарадскіх і раённых саветаў народных дэпутатаў БССР усяго – 179 (на 01.07.1990), з іх рускіх – 18, украінцаў – 4, беларусаў – 152, палякаў – 5 (нацменшасцей 15,1 %)[1152].

Табліца 43 – Нацыянальны склад старшынь і намеснікаў старшынь аблвыканкамаў, гаррайвыканкамаў БССР на 01.07.1983 г.[1153]

| **Пасада / нацыянальнасць** | **Усяго** | **Беларусы** | **Нацменшасці ў працэнтах** | **Рускія** | **Украінцы** | **Палякі** | **Яўрэі** | **Іншыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Старшыні аблвыканкамаў | 6 | 5 | 16,67 | 1 | – | – | – | – |
| Першыя намеснікі старшынь аблвыканкамаў | 11 | 11 | 0 | – | – | – | – | – |
| Намеснікі старшынь аблвыканкамаў | 18 | 14 | 22,23 | 4 | – | – | – | – |
| Старшыні гарвыканкамаў | 36 | 27 | 25,0 | 4 | 4 | 1 | – | – |
| Старшыні райваканкамаў у гарадах | 25 | 19 | 24,0 | 6 | – | – | – | – |
| Старшыні райвыканкамаў | 117 | 95 | 18,81 | 16 | 2 | 4 | – | – |
| Намеснікі старшынь гарвыканкамаў | 105 | 74 | 29,53 | 20 | 7 | 3 | 1 | – |
| Намеснікі старшынь райвыканкамаў у гарадах | 61 | 45 | 26,23 | 12 | 4 | – | – | – |
| Намеснікі старшынь райвыканкамаў | 465 | 395 | 15,06 | 48 | 15 | 12 | – | 2* |

Характэрнай рысай 1950–80-х гг. было павелічэнне агульнай колькасці працоўных і службоўцаў, якія прыцягваліся да грамадскага жыцця і ўдзелу ў кіраўніцтве дзяржаўнымі справамі праз дзейнасць афіцыйных грамадскіх арганізацый (саветы розных узроўняў, прафсаюзы, камсамол і г. д.). Дзяржава

[1151] Статыстычная справаздача аб складзе ВС, прэзыдыума, камітэтаў і пастаянных камісій ВС БССР на 1.01.1990 г. // ДАРФ. Ф. Р-9654. Воп. 10. Спр. 111. Арк. 65–85 адв.
[1152]Справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 767. Арк. 17–17 адв.
[1153] Падлічана па: Статыстычныя справаздачы аб складзе старшынь і намеснікаў старшынь аблвыканкамаў, гарвыканкамаў і райвыканкамаў БССР на 01.07.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 44. Арк. 1–45 адв.
* Татарскай нацыянальнасці.

імкнулася паступова перакласці частку сваіх функцый на грамадскія арганізацыі. Ужо да сярэдзіны 1960-х гадоў кожны чацвёрты член прафсаюзу лічыўся актывістам. Тысячы працаўнікоў з'яўляліся прафгрупоргамі, страхдэлегатамі, культарганізатарамі, грамадскімі інспектарамі і г.д. Большасць прыходзіла на выбарную працу калі і не з жаданнем працаваць, то, прынамсі, з намерам нешта змяніць да лепшага. У канцы 1950-х гг. выступы працоўных на сходах, пленумах, з'ездах вылучаліся значнай крытычнасцю, непрымірымасцю да недахопаў, шчырым жаданнем іх выправіць. Аднак мерапрыемствы, накіраваныя на выкананне прынятых рашэнняў, мелі традыцыйную для савецкай сістэмы аднабаковасць, выконваліся нярэдка фармальна. Бо нягледзячы на пастаянныя заявы партыйных камітэтаў рознага ўзроўню пра далейшае пашырэнне ўдзелу грамадскіх арганізацый у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, павышэнні іх ролі, непадзельнае панаванне ў палітычнай сферы адной толькі кампартыі выключала рэальны ўплыў грамадскіх аб'яднанняў на вызначэнне палітыкі дзяржавы, пакідаючы ім толькі фармальны ўдзел у гэтым працэсе. У снежні 1974 г. П. Машэраў у прамове на Пленуме ЦК КПБ, падвяргаючы крытыцы працу "асобных" партыйных арганізацый, адзначаў, што яны ўсё бяруць на сябе, абязлічваючы дзейнасць грамадскіх арганізацый[1154].

Доля працоўных, калгаснікаў, жанчын, моладзі ў выбарных органах планавалася кіруючымі органамі ў адпаведнасці з ідэалагічнымі заданнямі і ўстаноўкамі партыі. Склад дэлегатаў канферэнцый і з'ездаў, членаў камітэтаў і саветаў прадвызначаўся яшчэ да выбараў. Парасткі дэмакратыі пры правядзенні выбарных кампаній былі слабымі і не атрымалі наступнага развіцця. Ужо ў пачатку 1960-х гадоў выбары праходзілі ўсё больш "арганізавана". На працягу ўсяго дзесяцігоддзя памяншалася колькасць месцаў, дзе існавала альтэрнатыўнасць пры іх правядзенні. У якасці прыкладу можна прывесці факт з жыцця прафсаюзаў. У 1963 г. члены прафсаюзу Магілёўскага рэгенератарнага завода, нягледзячы на актыўныя спробы, так і не змаглі настаяць на ўключэнні ў спіс для галасавання свайго кандыдата. Падчас галасавання 43 з 89 галасаваўшых дапісалі яго ў бюлетэні, але ён не быў абраны, бо не дабраў два галасы. Чым вышэй быў узровень выбараў, тым больш заарганізавана і фармальна яны праходзілі[1155]. Таталітарная сістэма з адміністратыўна-каманднай сістэмай кіравання прыводзіла да таго, што дзейнасць далучаных грамадзян з большага насіла фармальны характар. Рэальную ўладу мела партыйна-дзяржаўная наменклатура, ад дзейнасці якой залежыў (хаця б патэнцыйна) увесь лад жыцця краіны.

**Нацыянальныя меншасці ў кіраўніцтве эканомікай БССР.** У разглядаемы перыяд адбылося зліццё партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва краіны. Усе сацыяльна-эканамічныя задачы, якія ставіліся перад грамадствам, вырашала КПСС. Кампартыя займалася кадравай працай не толькі ў сваім

---

[1154] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 321.

[1155] *Агеев А.Г., Пушкин И.А.* История профсоюзного движения Могилёвщины. С. 145.

складзе, але і ў сферы гаспадаркі, саветах і грамадскіх арганізацыях. У наменклатуру кадраў абкамаў уваходзілі кіраўнікі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый, СМІ, народнай адукацыі, навуковых устаноў і г.д. Адчувальным з'яўляўся ўдзел нацменшасцей у гаспадарцы Беларусі. Аб чым сведчыць нацыянальны склад пасадавых асобаў у эканоміцы рэспублікі.

У галінах, дзе ствараліся асноўныя матэрыяльныя каштоўнасці, нацыянальныя меншасці складалі 20 % ад агульнай колькасці рабочых. У прамысловасці (на 01.04.1957 г.) – 29 %. Зусім іншае мы бачым у сферы дзяржаўнай улады і кіравання, або сферы разумовай працы. Як у першым, так і ў другім выпадках на нацменшасці прыпадаў большы працэнт, чым яны складалі ў агульнай колькасці занятага насельніцтва Беларусі. Асабліва сярод гарадскога насельніцтва. На гэта ўплывалі такія фактары, як камандзіраванне ў БССР людзей на кіруючыя пасады, размеркаванне выпускнікоў ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў.

На 01.12.1961 г. у агульнай колькасці занятых у народнай гаспадарцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй прадстаўнікоў нацменшасцей было 39,5 % (рускіх 21,6 %, яўрэяў 11,4 %). Прычым рускія і яўрэі пераўзыходзілі сваю ўдзельную вагу ў жыхарстве рэспублікі. Сярод дадзенай катэгорыі інтэлігенцыі ў Беларусі было: украінцаў з вышэйшай адукацыяй – 5441, з сярэдняй спецыяльнай – 5852, татараў – 180 і 174, армянаў – 74 і 33, латышоў – 50 і 67, грузін – 38 і 17, чувашаў – 35 і 37, літоўцаў – 31 і 56, мардвы – 26 і 36, комі – 13 і 62 адпаведна[1156].

Варта адзначыць некалькі акалічнасцей. Па-першае, чым адказней і больш значная пасада ў гаспадарцы БССР, тым вышэй працэнт прадстаўнікоў немясцовага насельніцтва. Напрыклад, на 1000 асобаў (1970-я) у Беларусі ў сельскай гаспадарцы палякаў было 343 асобы, беларусаў 299, рускіх толькі 81; у сферы адукацыі – 108 рускіх, 90 іншай нацыянальнасці, 78 беларусаў, 61 паляк; у навуцы – 3 рускіх, 2 іншых нацыянальнасцей, па 1 беларусу і паляку; у мясцовай адміністрацыі рускіх – 6, іншых і беларусаў – 4, палякаў – 2[1157]. Па-другое, адносна невялікая вага нацменшасцей ў кіраўніцтве сельскай гаспадаркай рэспублікі (гл. табліцу 44). Улічвалася і тое, што колькасць занятага насельніцтва ў сельскай гаспадарцы ўвесь час памяншалася.

---

[1156] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 252.
[1157] *Kruczkowski T.* Niektóre zagadnienia historii etnicznej Polaków na Białorusi. С. 77.

Табліца 44 – Нацыянальны склад кіруючых кадраў у сельскай гаспадарцы БССР на 01.04.1983 г.[1158]

| **Пасада / нацыянальнасць** | **Усяго** | **Беларусы** | **Працэнт нацменшасцей** | **Рускія** | **Украінцы** | **Палякі *** | **Яўрэі** | **Іншыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Старшыні калгасаў | 1747 | 1546 | 11,51 | 81 | 26 | 67 | 18 | 9** |
| Дырэктары саўгасаў | 860 | 735 | 14,54 | 65 | 28 | 25 | 3 | 4*** |
| Кіраўнікі прадпрыемстваў Міністэрства сельскай гаспадаркі | 47 | 42 | 10,64 | 2 | 2 | 1 | – | – |
| Кіраўнікі трэстаў па меліярацыі | 16 | 12 | 25,0 | 4 | – | – | – | – |
| Начальнікі міжраённых упраўленняў па меліярацыі | 56 | 46 | 17,86 | 4 | 5 | 1 | – | – |
| Кіраўнікі раённых аб'яднанняў па забеспячэнню сельскай гаспадаркі | 117 | 98 | 16,24 | 14 | 2 | 3 | – | – |
| Старшыні абласных ВА "Сельгасхімія" | 6 | 4 | 33,34 | 1 | 1 | – | – | – |
| Старшыні саветаў раённых аграпрамысловых аб'яднанняў | 116 | 103 | 11,21 | 4 | 5 | 4 | – | – |

На 01.07.1984 г. з агульнай колькасці дырэктараў (у тым ліку і генеральных) прадпрыемстваў і аб'яднанняў, кіраўнікоў будаўнічых трэстаў, начальнікаў домабудаўнічых і вясковых будаўнічых камбінатаў БССР былі прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей Беларусі: генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання Міністэрства будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання БССР (рускі), два (з трох, што складала 66 %) генеральныя дырэктары вытворчых аб'яднанняў Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і украінец), генеральны дырэктар Магілёўскага вытворчага аб'яднання шоўкавых тканін (рускі), два генеральных дырэктары (33 % ад агульнай колькасці) вытворчых аб'яднанняў малочнай прамысловасці БССР (рускія), трынаццаць (59,1 %) дырэктараў мясакамбінатаў БССР (11 рускія і 2 украінцы), восем (72,7 %) дырэктараў прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці БССР (рускія), шэсць (што складае 66 % ад агульнай колькасці кіраўнікоў прадпрыемстваў у гэтай галіне вытворчасці) дырэктараў прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці БССР (рускія), дырэктар Гродзенскага вытворчага

[1158] Падлічана па: Статыстычныя справаздачы аб складзе кіруючых кадраў сельскай гаспадаркі БССР. 01.04.1983 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 151. Спр. 43. Арк. 1–96 адв.

* Цікавая акалічнасць: у статыстычных справаздачах таго часу палякі паказваліся ў графе "нацыянальнасці замежных дзяржаў", а яўрэі – не, мабыць, з-за таго, што ў СССР была Яўрэйская аўтаномная рэспубліка.

** Па 2 – грузіны і армяніны, па 1 – літовец, карэл, чуваш, грэк, чэх.

*** Асяцін, мардвін, башкір, татарын.

абутковага аб’яднання “Нёман” (рускі), чацвёра (57,1 %) дырэктараў прадпрыемстваў мікрабіялагічнай прамысловасці БССР (2 рускія, 1 эстонец, 1 татарын), чатыры (80 %) дырэктары абутковых фабрык (рускі, яўрэй, 2 украінцы), чатыры (50 %) начальнікі домабудаўнічых камбінатаў БССР (рускія), сямнаццаць (39,5 %) упраўляючых будаўнічымі трэстамі ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай вобласцях (8 рускія, 2 палякі, 6 украінцаў, 1 яўрэй), два (25 %) дырэктары прадпрыемстваў трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання (рускі і украінец), дырэктар Магілёўскага завода “Строммашына” (рускі), дырэктар Ваўкавыскага завода кровельных і будаўніча–аздабленчых машын Гродзенскай вобласці (яўрэй), пяць (71,4 %) дырэктараў прадпрыемстваў будаўнічага, дарожнага і камунальнага машынабудавання (усе рускія), дырэктар вытворчага аб’яднання “Магілёўліфтмаш” (рускі), пяць (71,4 %) начальнікаў геафізічных, геолагавыведачных і пашукова-здымачных экспедыцый БССР (рускі і 4 украінцы), два (66 %) начальнікі буравых работ (рускія), два (100 %) начальнікі нафтагазаздабываючых упраўленняў БССР (украінцы) і інш.[1159]

Табліца 45 – Склад і змянялънасць кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў БССР у 1984–1987 гг.[1160]

| | **01.07.1984 г.** | | **01.07.1985 г.** | | **01.07.1986 г.** | | **01.07.1987 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Чал.** | **%** | **Чал.** | **%** | **Чал.** | **%** | **Чал.** | **%** |
| Усяго пасад,<br>занятых работнікамі | 204<br>203 | 99,5 | 205<br>205 | 100 | 168<br>167 | 99,4 | 229<br>225 | 98,3 |
| Прадстаўнікі нацменшасцей | 105 | 51,8 | 100 | 48,8 | 76 | 45,5 | 98 | 43,6 |
| Змянілася кіраўнікоў, па прычынах: | 16 | 7,9 | 20 | 9,8 | 18 | 10,8 | 41 | 17,9 |
| вылучаныя на больш значную пасаду | 3 | 18,7 | 6 | 30 | 3 | 16,7 | 6 | 14,6 |
| накіраваныя на вучобу | 1 | 6,3 | – | – | 1 | 5,6 | – | – |
| накіраваныя на аналагічную працу | – | – | 1 | 5,0 | 1 | 5,6 | – | – |
| Вызваленыя: скампраметавалі сябе або не справіліся з даручанай працай | – | – | 1 | 5,0 | 1 | 5,6 | 1 | 2,4 |
| па сямейных абставінах, у сувязі з хваробай, пераходам на пенсію | 4 | 25,0 | 7 | 35,0 | 4 | 22,2 | 15 | 36,6 |
| па іншых прычынах | 8 | 50,0 | 5 | 25,0 | 8 | 44,4 | 19 | 46,4 |

[1159] Статыстычныя справаздачы // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 50. Арк. 5–227.
[1160] Даведка аб складзе і змянялънасці кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў і аб’яднанняў БССР. 1984–1987 гг. // Там жа. Спр. 982. Арк. 1–2 (1984–1985) ; Спр. 406. Арк. 4–5 (1986–1987).

У 1984–1985 гг. прадстаўнікоў нацменшасцей сярод кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў было: рускіх – 67 (32,7 %), украінцаў – 24 (11,7 %), палякаў – 3 (1,5 %), яўрэяў – 3 (1,5 %), па 1 (0,5 %) – армянін, немец, мардвін. На шырокае прадстаўніцтва нацменшасцей у нязначнай ступені ўплывала змяняльнасць кадраў, якая, напрыклад, за перыяд з ліпеня 1984 па ліпень 1985 г. павялічылася на 1,9 % сярод 205 генеральных дырэктароў, дырэктароў прамысловых прадпрыемстваў і аб'яднанняў БССР (гл. табл. 45). Найбольшая змяняльнасць у 1986–1987 гг. была сярод генеральных дырэктароў і дырэктароў прадпрыемстваў машынабудавання для лёгкай і харчовай прамысловасці і бытавога абсталявання, упраўляючых трэстамі, генеральных дырэктараў і дырэктараў прадпрыемстваў станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці і складала адпаведна 37,5 %, 20,9 %, 17,2 %. У якасным складзе начальнікаў упраўленняў буравых работ, дырэктараў прадпрыемстваў хімічнага і нафтавага машынабудавання, упраўляючых раённымі ўпраўленнямі энэргетыкі і электрафікацыі, дырэктароў прадпрыемстваў цэлюлозна-папяровай прамысловасці істотных змен не адбылося, сярод іх змяняльнасці кадраў не было[1161].

Нацыянальныя меншасці пераважалі ў складзе навуковых кадраў рэспублікі (гл. табліцу 46). БССР прываблівала вучоных з навуковымі ступенямі з іншых рэгіёнаў СССР. Гэтаму садзейнічала прамысловае развіццё Беларусі і даволі высокі ўзровень жыцця (у тым ліку месцазнаходжанне, клімат, адносіны мясцовага насельніцтва і г.д.), у параўнанні з іншымі рэспублікамі Саюза. Навуковая эліта з ліку небеларусаў вызначала грамадскія і гаспадарчыя перспектывы БССР.

У кастрычніку 1987 г. прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Беларусі складалі: па 16,7 % сярод старшынь абласных камітэтаў па тэлебачанню і радыёвяшчанню БССР, начальнікаў упраўленняў культуры аблвыканкамаў, начальнікаў абласных упраўленняў па справах выдавецтва, паліграфіі і кніжнага гандлю, рэдактараў абласных газет, 14 % з ліку рэдактараў раённых газет (15 з 107), дзесятую частку рэдактараў аб'яднаных гарадскіх і раённых газет, 40 % сярод начальнікаў упраўленняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі аблвыканкамаў, 60 % з ліку начальнікаў упраўленняў бытавога абслугоўвання насельніцтва аблвыканкамаў, трэцюю частку старшынь праўленняў аблспажыўсаюзаў. Сярод галоўных рэдактараў часопісаў БССР, рэдактараў гарадскіх газет, дырэктараў абласных кантор кінапракату, загадчыкаў абласных аддзелаў народнай адукацыі прадстаўнікоў нацменшасцей не было[1162].

[1161] Тлумачальная запіска аддзела арганізацыйна-партыйнай і кадравай работы ЦК КПБ. 20.07.1987 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 406. Арк. 3.
[1162] Справаздачы // Там жа. Спр. 422. Арк. 5–38.

Табліца 46 – Нацыянальны склад навуковых работнікаў Беларусі[1163]

| Нацыя-нальнасць | 1960 г. | | | 1970 г. | | | 1987 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго | У тым ліку | | Усяго | У тым ліку | | Усяго | У тым ліку | |
| | | дакт. нав. | канд. нав. | | дакт. нав. | канд. нав. | | дакт. нав. | канд. нав. |
| Усяго | 6840 | 181 | 2013 | 21863 | 425 | 5564 | 44499 | 1085 | 14144 |
| Беларусы | 3209 | 60 | 886 | 10461 | 183 | 2616 | 23074 | 507 | 7438 |
| Рускія | 2399 | 73 | 735 | 7912 | 155 | 2052 | 16093 | 415 | 4976 |
| Украінцы | 398 | 10 | 81 | 1398 | 20 | 310 | 2646 | 56 | 818 |
| Латышы | 8 | 1 | 2 | 12 | 2 | 3 | 20 | 2 | 7 |
| Армяне | 21 | 1 | 11 | 59 | 4 | 24 | 80 | 4 | 27 |
| Эстонцы | 4 | 1 | 1 | 11 | 2 | 2 | 14 | 1 | 5 |
| Татары | 17 | 3 | 8 | 68 | 4 | 19 | 122 | 6 | 41 |
| Яўрэі | 684 | 28 | 252 | 1560 | 46 | 432 | 1545 | 66 | 528 |
| Літоўцы | | | | 18 | 2 | 5 | 3 | | 22 |
| Палякі | | | | | | | 500 | 17 | 175 |
| Нацмен-шасці ў % ад агульнай колькасці | 53,1 | 66,9 | 56,0 | 52,2 | 56,9 | 53,0 | 48,15 | 53,3 | 47,4 |

Праз тры гады ў БССР было 155 галоўных рэдактараў рэспубліканскіх партыйных, літаратурных і грамадска–палітычных часопісаў, рэдактараў рэспубліканскіх, абласных, аб'яднаных, гарадскіх і раённых газет. З іх: беларусаў – 136 (87,7 %), рускіх – 9 (5,8 %), украінцаў – 2 (1,3 %), палякаў – 6 (3,9 %), яўрэяў – 1 (0,65 %), асірыйцаў – 1 (0,65 %)[1164].

Нацыянальныя меншасці ў 1989 г. мелі трывалыя пазіцыі ў органах дзяржаўнага кіравання (22,6 %), у кіраўніцтве прадпрыемстваў і арганізацый (28,4 %). Сярод інжынерна-тэхнічных спецыялістаў яны складалі 35,4 %; аграномаў, заатэхнікаў, ветэрынарных работнікаў і ляснічых – 15,8 %; медыцынскіх работнікаў – 30 %; навуковых работнікаў, выкладчыкаў і выхавальнікаў – 30,9 %; работнікаў літаратуры і друку – 33,3 %; культурна-асветніцкіх работнікаў – 29,3 %; работнікаў мастацтва – 44 %; юрыдычнага персаналу – 30,1 %[1165]. У складзе кіраўнікоў прадпрыемстваў сельскай гаспадаркі БССР было 851 дырэктар саўгасаў і 1613 старшынь калгасаў. У асяродку першых нацсупольнасці складалі 13 % (52 рускія, 20 украінцаў, 30 палякаў, 3 яўрэі, 1 татарын, малдаванін, грузін, казах, башкір, чэх), другіх – 12,3 % (81 рускі, 86 палякаў, 19 украінцаў, 6 яўрэяў, 2 грузіны, 1 татарын, армянін, грэк, эстонец)[1166].

[1163] Складзена і разлічана па: *Корзенко Г.В.* Научная интеллигенция Беларуси в 1944–1990 гг. (подготовка, рост, структура). Минск, 1995. С. 76.
[1164] Статыстычныя справаздачы за 1990 г. // Там жа. Спр. 766. Арк. 1–1 адв., 39.
[1165] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 303.
[1166] Нацыянальны склад кіраўнікоў прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы БССР на 1.01.1989 г. Статыстычныя звесткі // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 966. Арк. 14.

Крыху больш шырокае прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей адбылося з канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. Гэта было выклікана, у некаторай ступені, працэсамі адноснай дэмакратызацыі ў краіне, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыяй грамадска-палітычнай дзейнасці нацыянальных меншасцей Беларусі.

**Прадстаўніцтва ў рэгіянальных органах кіравання.** Каб атрымаць больш вартасную карціну прадстаўніцтва нацменшасцей у органах кіравання БССР, нашаму аналізу падвергліся не толькі рэспубліканскія органы кіравання, але і мясцовыя. Прычым для параўнання асаблівасцей ці падабенства заходняга і ўсходняга рэгіёнаў рэспублікі – Гродзенская, Віцебская і Магілёўская вобласці.

Са справаздачы Гродзенскага абкама КП(б)Б у ЦК КП(б)Б за перыяд з ліпеня 1944 па жнівень 1946 гг. можна даведацца аб нацыянальным складзе партыйных органаў і савецка-гаспадарчага актыву (гл. табліцу 47). Безумоўная перавага асобаў рускай нацыянальнасці ў складзе абласнога кіруючага звяна.

Табліца 47 – Нацыянальны склад партыйных органаў і савецка-гаспадарчага актыва Гродзенскай вобласці, 1946 г.[1167]

| | **Усяго** | **Нац. менш. %** | **Бел.** | **Рус.** | **Яўр.** | **Укр.** | **Пал.** | **Інш.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Абласная арганізацыя КП(б)Б | 4246 | 73,1 | 1133 | 2400 | 224 | 349 | 25 | 115 |
| Апарат абкама КП(б)Б | 79 | 62 | 30 | 38 | 4 | – | – | 7 |
| Адказныя работнікі райкамаў КП(б)Б | 219 | 49,3 | 111 | 90 | 6 | – | – | 12 |
| Абласны савецкі апарат | 43 | 55,8 | 19 | 20 | 1 | – | – | 3 |
| Работнікі раённых і гарадскіх выканкамаў | 286 | 57 | 123 | 97 | 4 | – | – | 62 |
| Старшыні сельсаветаў | 222 | 37 | 140 | 56 | – | – | – | 26 |
| Старшыні калгасаў | 28 | 32,2 | 19 | 5 | – | – | 4 | – |

У 1970 г. прадстаўнікі нацыянальных меншасцей складалі 34,2 % (16420 чалавек) ад агульнай колькасці членаў Гродзенскай абласной арганізацыі КПБ[1168]. У яе склад уваходзіла 48006 членаў і кандыдатаў. З іх: беларусаў – 31586, рускіх – 8861, палякаў – 4551, украінцаў – 1949, яўрэяў – 615, літоўцаў – 98, татараў – 97, мардвінаў – 35, чувашоў – 29, іншых нацыянальнасцей – 185 (колькасць кожнай не перавышала 20 асоб)[1169].

[1167] Нацыянальны склад партыйных органаў і савецка-гаспадарчага актыва Гродзенскай вобласці // ДАГАГр. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1778. Арк. 13–65.

[1168] Для параўнання, згодна перапісу 1959 г. нацыянальны склад Гродзенскай вобласці быў: беларусаў – 60,2 % нацменшасцей 39,8 % (палякаў – 30,8, рускіх – 6,7 %, украінцаў – 1,1 %, іншых – 1,2 %). Справаздача Гродзенскага абкама КПБ // Там жа. Спр. 962. Арк. 162.

[1169] Справаздача // Там жа. Спр. 2173. Арк. 6–7.

У абкаме КПБ прадстаўнікоў нацменшасцей было – 20,2 %, гаркамах, райкамах – 27,1 %, абласным савеце дэпутатаў – 28,2 %, раённых саветах – 26,8 %, гарадскіх – 36,4 %, абкаме камсамолу – 30,9 % (гл. табліцу 48). У вобласці працавалі 165 кіраўнікоў прамыслова-транпартных і будаўнічых арганізацый, з іх было 9 польскай нацыянальнасці (5,4 %); 494 старшыні калгасаў і дырэктараў саўгасаў, з іх 43 палякі (8,7 %)[1170].

Табліца 48 – Нацыянальны склад выбарных партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх органаў Гродзенскай вобласці на 01.07.1970 г.[1171]

| **Назва выбарнага органа** | **Колькасць (чал.)** | **Бел. (%)** | **Рус. (%)** | **Пал. (%)** | **Інш. (%)** |
|---|---|---|---|---|---|
| Абкам КПБ | 178 | 79,8 | 10,1 | 4,5 | 5,6 |
| ГК, РК КПБ | 1485 | 72,9 | 15,0 | 6,6 | 5,5 |
| ВС БССР | 56 | 73,2 | 20,0 | 6,8 | – |
| Абласны савет | 227 | 71,8 | 16,3 | 8,0 | 3,9 |
| Раённы саветы | 1398 | 73,2 | 10,0 | 13,6 | 3,2 |
| Гарадскія саветы | 836 | 63,6 | 22,0 | 7,4 | 7,0 |
| Сельскія саветы | 7885 | 75,8 | 3,9 | 18,7 | 1,6 |
| Пасялковыя саветы | 1133 | 71,3 | 9,6 | 15,1 | 4,0 |
| Абласныя галіновыя камітэты прафсаюзаў | 786 | 57,2 | 23,6 | 10,2 | 8,9 |
| Гарадскія і раённыя камітэты прафсаюзаў | 2242 | 67,0 | 15,7 | 12,2 | 5,1 |
| Усяго членаў і кандыдатаў абласнога савета, абкамаў, гаркамаў і райкамаў прафсаюзаў | 3119 | 64,4 | 18,0 | 11,7 | 5,9 |
| Абкам ЛКСМБ | 149 | 69,1 | 13,4 | 14,1 | 3,4 |
| ГК, РК ЛКСМБ | 1809 | 70,8 | 10,8 | 15,2 | 3,2 |

Цікавы аналітычны матэрыял дазваляе атрымаць спіс сакратароў першасных партарганізацый КПБ Гродзенскай вобласці па стану на 20.12.1970 г. Мною прааналізаваны звесткі толькі па некаторых раёнах вобласці. Але і яны вельмі красамоўны і падкрэсліваюць даволі высокую далучанасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей да партыйнага і грамадскага жыцця вобласці. Так, сярод сакратароў першасных арганізацый горада Гродна яны складалі 56,1 %, у г. Ліда – 50 %, Ваўкавыскім раёне – 37,8 %, Воранаўскім раёне – 41,8 %, Гродзенскім раёне – 38,2 %, Ашмянскім – 25 %. Былі прадстаўлены асобы рускай, польскай, украінскай, яўрэйскай, татарскай, армянскай, грузінскай і фінскай нацыянальнасцей[1172].

[1170] Справаздача // ДАГАГр. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 962. Арк. 161.
[1171] Справаздача // Там жа. Спр. 962. Арк. 161.
[1172] Спіс сакратароў першасных арганізацый // Там жа. Спр. 2174. Арк. 1–20, 25–30, 31–40, 77–84.

У дэпутацкім корпусе Віцебскай вобласці ў сярэдзіне 1970-х гг. пераважалі беларусы, за выключэннем гарадоў (гл. табліца 49), дзе традыцыйна пражывала шмат прадстаўнікоў нацменшасцей. У абласны і гарадскія саветы былі выбраны пераважна рускія, украінцы, палякі, яўрэі. Трэба адзначыць, што палякі, латышы, літоўцы сталі дэпутатамі, у асноўным, у месцах кампактнага пражывання на тэрыторыі вобласці.

Аналіз нацыянальнага складу дэпутацкага корпусу ўсіх узроўняў Віцебскай вобласці за 1975 і 1990 гг. (гл. табліцы 49 і 50) засведчыў, што працэнт прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі ў 1990 г. рэзка ўзрос – амаль у 2 разы ў параўнанні з 1975 годам (з 8,8 % да 15,8 %). Нягледзячы на тое, што ў склад абласнога савета іх трапіла менш – адпаведна 20,3 % і 15 %, але сярод дэпутатаў іншых саветаў іх стала больш: раённыя саветы – 9,9 % і 15,8 %, гарадскія абласнога падпарадкавання – 20,9 % і 31,8 %, пасялковыя – 7,8 % і 13,6 %[1173]. Ва ўмовах тагачаснай дэмакратызацыі гэта засведчыла ўзросшую актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей.

Табліца 49 – Нацыянальны склад дэпутатаў саветаў Віцебскай вобласці, якія былі абраны ў 1975 г.[1174]

| **Назва савета** | **Колькасць саветаў** | **Колькасть дэпутатаў** | **Нацменшасці ў працэнтах** | **Рускія** | **Украінцы** | **Яўрэі** | **Палякі** | **Латышы** | **Татары** | **Іншыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго саветаў | 321 | 12962 | 8,8 | 822 | 142 | 60 | 86 | 5 | 6 | 18 |
| Абласны савет | 1 | 287 | 20,3 | 49 | 5 | 3 | 0 | 0 | 0 | 1 |
| Раённыя саветы | 21 | 1600 | 9,9 | 92 | 21 | 12 | 9 | 2 | 2 | 3 |
| Гарадскія саветы | 19 | 1837 | 18,5 | 262 | 40 | 20 | 15 | 0 | 2 | 1 |
| Сельскія саветы | 251 | 7536 | 5,2 | 256 | 50 | 15 | 56 | 3 | 1 | 7 |
| Пасялковыя саветы | 26 | 1168 | 7,8 | 63 | 14 | 6 | 6 | 0 | 0 | 3 |
| Гарсаветы абласнога падпарадкавання | 5 | 1137 | 20,9 | 189 | 27 | 17 | 3 | 0 | 2 | 0 |
| Гарсаветы раённага падпарадкавання | 14 | 700 | 14,6 | 73 | 13 | 3 | 12 | 0 | 0 | 1 |

Трэба адзначыць адну акалічнасць, якая тычыцца пасад старшынь гарадскіх і раённых выканкамаў. Аналіз рэзерва кадраў (1973) на гэтыя пасады засведчыў, што нацыянальныя меншасці складалі ў ім 42,8 і 40 % адпаведна.

[1173] Статыстычныя справаздачы. Нацыянальны склад дэпутатаў саветаў Віцебскай вобласці // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 22. Спр. 1507. Арк.1–25 адв. ; Ф. 1966. Воп. 22. Спр. 3502. Арк. 2–20 адв.

[1174] Статыстычныя сраваздачы. Нацыянальны склад // Там жа. Спр. 1507. Арк. 1–25 адв.

Але яны былі прадстаўлены асобамі рускай нацыянальнасці, за выключэннем аднаго паляка ў складзе рэзерва на пасаду старшыні гарвыканкама[1175].

У пачатку 1980-х гг. на адказных выканкамаўскіх пасадах у Віцебскай вобласці прадстаўніцтва тытульнай нацыі амаль адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва, за выключэннем старшынь гарадскіх выканкамаў. Так, сярод 29 старшынь выканкамаў нацыянальныя меншасці складалі 31,1 % (6 рускіх, 2 украінцы, 1 іншай нацыянальнасці), 77 намеснікаў старшынь выканкамаў – 18,2 % (9 рускіх, 2 украінцы, 3 іншых), 29 сакратароў выканкамаў – 17,1 % (5 рускіх), 320 загадчыкаў аддзелаў, што зацвярджаліся на сесіях – 18,7 % (43 рускіх, 5 яўрэяў, 7 украінцаў, 5 іншых), 48 інструктараў – 18,7 % (7 рускіх, 1 украінец і 1 іншай нацыянальнасці)[1176].

Табліца 50 – Нацыянальны склад дэпутатаў саветаў Віцебскай вобласці, 1990 г.[1177]

| **Назва савета** | **Колькасць саветаў** | **Колькасць дэпутатаў** | **Нацыянальныя меншасці (%)** | **Рускія** | **Украінцы** | **Яўрэі** | **Палякі** | **Латышы** | **Татары** | **Іншыя** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго саветаў | 317 | 7850 | 15,8 | 650 | 99 | 30 | 118 | 3 | 3 | 38 |
| Абласны савет | 1 | 200 | 15,0 | 29 | 6 | 1 | 3 | 0 | 0 | 0 |
| Раённыя саветы | 20 | 1232 | 15,8 | 96 | 15 | 5 | 32 | 3 | 0 | 13 |
| Гарадскія саветы | 19 | 938 | 24,7 | 184 | 20 | 9 | 9 | 0 | 1 | 8 |
| Сельскія саветы | 248 | 4657 | 7,7 | 238 | 39 | 7 | 60 | 0 | 1 | 14 |
| Пасялковыя саветы | 26 | 626 | 13,6 | 55 | 12 | 3 | 10 | 0 | 1 | 3 |
| Гарсаветы абласнога падпарадкавання | 5 | 523 | 31,8 | 132 | 17 | 8 | 2 | 0 | 1 | 6 |
| Гарсаветы раённага падпарадкавання | 14 | 415 | 15,8 | 52 | 3 | 1 | 7 | 0 | 0 | 2 |

У сярэдзіне 1980-х гг. працэнт нацменшасцей сярод старшынь і іншых работнікаў гарадскіх выканкамаў вобласці стаў меншы за іх вагу ў нацыянальным складзе насельніцтва БССР. Сярод 29 старшынь выканкамаў нацыянальныя меншасці складалі 17,2 % (6 рускіх), 108 намеснікаў старшынь выканкамаў – 14,2 % (9 рускіх, 4 украінцы, 3 іншых), 29 сакратароў выканкамаў – 20,7 % (6 рускіх), 359 загадчыкаў аддзелаў, што зацвярджаліся на сесіях – 16,7 % (43 рускіх, 9 украінцаў, 8 іншых), 49 інструктараў – 16,3 % (6 рускіх, 1 украінец і

[1175] Рэзерв кадров (20.04.1973) // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 127. Спр. 80. Арк.118–126.
[1176] Штогадовая праваздача. Нацыянальны склад (1980) // Там жа. Ф. 1966. Воп. 22. Спр. 2281. Арк.1.
[1177] Штогадовая праваздача. Нацыянальны склад // Там жа. Спр. 3502. Арк. 2–20 адв.

1 іншай нацыянальнасці), 29 адказных сакратароў па справах непаўналетніх – 20,7 % (4 рускіх, 2 украінцы)[1178].

У буйных гарадах вялікую ролю адыгрывалі рускія і ўкраінцы. У горадзе Віцебску ў 1985 г. старшынёю выканкама і яго першым намеснікам былі прадстаўнікі рускай нацыянальнасці. Наогул сярод 21 адказнай асобы былі толькі беларусы і рускія (9 чал. – 42,8 %)[1179].

Гэтая тэндэнцыя, а таксама значная вага прадстаўнікоў нацменшасцей у большых населенных пунктах, прасочваецца пры аналізе нацыянальных складаў сельскіх і пасялковых выканкамаў Віцебскай вобласці (гл. табліцы 53 і 54). Сярод 250 старшынь выканкамаў сельскіх саветаў нацыянальныя меншасці складалі 11,6 % (19 рускіх, 3 украінцы, 7 іншай нацыянальнасці), 2 намеснікаў старшынь выканкамаў прадстаўнікоў нацменшасцей не было, 251 сакратара выканкамаў – 7,1 % (11 рускіх, 1 украінец, 6 іншыя)[1180]. У складзе 25 старшынь выканкамаў пасялковых саветаў нацыянальныя меншасці складалі 16 % (3 рускіх, 1 украінец), 3 намеснікаў старшынь выканкамаў – 33,3 % (1 рускі), 26 сакратароў выканкамаў – 19,2 % (3 рускіх, 1 украінец, 1 іншай нацыянальнасці)[1181].

У Магілёўскай абласной арганізацыі КПБ у 1988–1990 гг. нацыянальныя меншасці складалі каля 24 %. Прычым назіралася тэндэнцыя да іх памяншэння (гл. дадатак Н). Былі прадстаўлены больш за 30 нацыянальнасцей, пераважалі рускія, украінцы, яўрэі, якія разам складалі 22,98 % ад членаў арганізацыі. Найбольш істотнае іх прадстаўніцтва было ў 1988 г. (гл. дадатак П) сярод: загадчыкаў аддзелаў Магілёўскага абкама КПБ – 41,7 %, кансультантаў Дома палітасветы абкама – 80,0 %, першых сакратароў гаркамаў і райкамаў – 22,2 %, лектараў гаркамаў і райкамаў КПБ – 42,9 %, першых намеснікаў старшынь выканкамаў раённых саветаў – 20,0 %, інструктараў гаркамаў і райкамаў КПБ – 19,8 %.

З агульнай колькасці праанілізаванай партыйнай наменклатуры, кіраўнікоў савецкіх і дзяржаўных устаноў Магілёўскай вобласці сярод прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей 1980-х гг. пераважаюць асобы рускай нацыянальнасці. Украінцы займалі пасады: загадчыка аддзела абкама КПБ, 3 загадчыкаў аддзелаў гаркамаў і райкамаў КПБ, 2 лектараў і 1 інструктара гаркамаў і райкамаў КПБ, дырэктара саўгаса, 4 старшынь калгасаў, 3 старшынь выканкамаў. Палякі: другога сакратара КПБ, 2 сакратароў райкамаў, 3 інструктараў райкамаў і гаркама, першага намесніка старшыні выканкама раённага савета, 2 старшынь калгасаў, дырэктара саўгаса, 4 намеснікаў старшынь выканкамаў. Яўрэі: лектара гаркама КПБ, старшыні калгаса. Сярод іншых: адзін інструктар райкама КПБ па нацыянальнасці комі, дырэктарам аднаго саўгаса быў казах[1182].

Асобы з ліку нацыянальных меншасцей у Магілёўскай вобласці (гэта толькі з ліку членаў КПБ) займалі высокае сацыяльнае становішча. На 01.01.1988 г.

[1178] Справаздача аб кадрах выканкамаў. Нацыянальны склад (1986) // ДАВц. Ф. 1966. Воп. 22. Спр. 2915. Арк. 1.
[1179] Справаздачы // Там жа. Акр. 93–95.
[1180] Штогадовая праваздача. Нацыянальны склад (1985) // Там жа. Спр. 2917. Арк.1.
[1181] Справаздача аб кадрах выканкамаў. Нацыянальны склад (1986) // Там жа. Спр. 2916. Арк. 1.
[1182] Статыстычныя справаздачы // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 10–20.

рускімі па нацыянальнасці былі – загадчыкі аддзелаў навукі і навучальных установ, прамыслова-транспартнага, гандлю і бытавога абслугоўвання, сельскагаспадарчага і харчовай прамысловасці абкама КПБ; старшыня камісіі партыйнага кантролю пры абкаме КПБ. Украінец загадваў аддзелам прапаганды і агітацыі КПБ[1183]. У красавіку 1988 г. рускія працавалі: генеральным дырэктарам Магілёўскага навукова-вытворчага аб'яднання па сельскай гаспадарцы, дырэктарам Бабруйскага маслабойнага завода, генеральным дырэктарам Магілёўскага вытворчага аб'яднання хлебапрадуктаў; украінец – старшынёй Магілёўскага абласнога вытворчага аб'яднання па аграхімічнаму абслугоўванню сельскай гаспадаркі[1184]. На 01.07.1988 г. рускія ў Магілёўскай вобласці займалі пасады: дырэктара Магілёўскага металургічнага завода імя А. Мяснікова, генеральнага дырэктара Магілёўскага вытворчага аб'яднання "Стромаўталінія", генеральнага дырэктара Магілёўскага вытворчага аб'яднання "Хімвалакно", упраўляючага раённым упраўленнем энэргетыкі і электрыфікацыі "Магілёўэнэрга", дырэктараў двух прадпрыемстваў нафтаперапрацоўваючай прамысловасці, дырэктара Шклоўскай папяровай фабрыкі "Спартак", генеральнага дырэктара Магілёўскага вытворчага аб'яднання шаўковых тканін, упраўляючага будаўнічым трэстам, начальніка ўпраўлення народнай адукацыі Магілёўскага аблвыканкама, рэдактара адной (з 30) раённай газеты. Украінцы былі: рэдактар абласной газеты "Магілёўская праўда", дырэктар Бабруйскага машынабудаўнічага завода, дырэктар аднаго з прадпрыемстваў нафтаперапрацоўчай прамысловасці, дырэктар абутковай фабрыкі, начальнік домабудаўнічага камбіната. Упраўляючым аднаго з будаўнічых трэстаў быў яўрэй, з татар паходзіў дырэктар гідролізнага завода[1185]. Пералік можна было б працягваць, але і прыведзеныя лічбы ўражваюць.

У пачатку 1991 г. нацменшасці складалі 30,7 % ад адказных работнікаў апарату Магілёўскага абкама КПБ, у тым ліку 83,3 % сакратароў і старшынь КК КПБ; 12,8 % сярод адказных работнікаў апарата, гаркамаў і райкамаў КПБ, з іх 13,1 % першых сакратароў. У асяродку старшынь кантрольных камісій гаркамаў і райкамаў прадстаўнікоў нятытульнай нацыі было 26,1 %, вызваленых сакратароў парткамаў, партбюро першасных арганізацый – 37,5 %. Пераважна гэта былі прадстаўнікі рускай і ўкраінскай нацыянальнасці. Сярод больш за 300 адказных асобаў толькі 4 былі іншай, акрамя ўзгаданых, нацыянальнасці[1186].

Аналіз прыведзенай статыстыкі і прыкладаў займаемых пасадаў дазваляе зрабіць выснову аб даволі значнай ролі і высокім сацыяльным статусе нацыянальных меншасцей у грамадскім і гаспадарчым жыцці Магілёўскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях.

Пытанні аб кадрах рэгулярна разглядаліся на пасяджэннях кіруючых органаў КПБ, дзе прымаліся адпаведныя рашэнні. Прынцыпы падбора, растаноўкі і выхавання кадраў, кадравая палітыка на рэгіянальным узроўні

---

[1183] Статыстычныя справаздачы // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 187. Спр. 60. Арк. 14–15.
[1184] Статыстычныя справаздачы // Там жа. Арк. 97–107 адв.
[1185] Там жа. Арк. 144 адв.–178 адв.
[1186] Падлічана па: Там жа. Спр. 200. Арк. 2–3 адв.

знаходзіліся пад кантролем і курыраваліся першымі сакратарамі абкамаў КПБ. Рэгіянальныя партыйныя органы ў асноўным правільна разумелі і праводзілі кадравую палітыку. Аднак былі нярэдкія выпадкі, калі пры вылучэнні работнікаў не прымаліся да ўвагі іх маральныя і дзелавыя якасці. У выніку на месца кіраўнікоў траплялі слаба падрыхтаваныя, безыніцыятыўныя работнікі, або людзі, якія не карысталіся аўтарытэтам, а часам і відавочна скампраметаваўшыя сябе ў мінулым[1187].

Сітуацыя з кадравым патэнцыялам змянілася ў лепшы бок у 1980-я гг., што праявілася ў выніках і тэмпах развіцця Савецкай Беларусі. Так, аналіз сацыяльна-эканамічнага развіцця 15 рэспублік СССР засведчыў, што ў 1988 г. БССР знаходзілася на 4 месцы (пасля РСФСР, УССР, КазССР) па ўнёску ў прыбытак СССР, прычым доля БССР увесь час павялічвалася: 1980 г. – 4 %, 1985 г. – 4,1 %, 1988 г. – 4,2 %. Адбываўся стабільны рост вырабленага даходу на душу насельніцтва – Беларусь разам з Эстоніяй знаходзілася на трэццім – чацвёртым месцы (РСФСР, ЛатССР). Па прадукцыйнасці працы на чацвёртым. Прычым па памеры сярэднямесячнага заробку рабочых і служачых толькі на сёмым. БССР была на 3 месцы ў катэгорыі рэсурсы ўласнай вытворчасці – 71 % патрэбаў рэспублікі ў таварах народнага спажывання забяспечваўся рэсурсамі ўласнай вытворчасці[1188].

Большасць прыведзенага матэрыялу – гэта ў асноўным статыстыка. Яна адлюстроўвае толькі некаторыя працэсы, якія адбываліся ў той час. На яе ўплывалі змяненні ў нацыянальным складзе гарадскога насельніцтва, павышэнне адукацыйнага ўзроўню беларусаў, правядзенне ў справе фарміравання партыйна-дзяржаўнага апарату палітыкі адміністратыўнага рэгулявання долі тытульнай нацыі і інш. Але яна дазваляе зрабіць пэўныя высновы.

Такім чынам, варта адзначыць істотны ўклад і ролю нацыянальных меншасцей у развіцці Савецкай Беларусі ў перыяд 1945–1991 гг. Паказчыкам гэтага з’яўляецца ўдзел нацыянальных меншасцей у партыйна-дзяржаўным і гаспадарчым кіраўніцтве рэспублікі. У пасляваенныя дзесяцігоддзі доля нацыянальных меншасцей ва ўладных структурах была большай, чым іх доля ў складзе ўсяго насельніцтва рэспублікі. У 1965 г. у Беларусі кампартыю ўзначаліў П. Машэраў. З яго прыходам стала памяншацца ўдзельная вага нацыянальных меншасцей сярод кіруючых кадраў партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату і пазней заставалася стабільнай. Крыху больш шырокае прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей адбылося з канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. Гэта было выклікана, у некаторай ступені, працэсамі адноснай дэмакратызацыі ў краіне, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці і актывізацыяй грамадска-палітычнай дзейнасці нацыянальных меншасцей Беларусі. Развіццё грамадска-палітычных

[1187] *Пушкін І.А.* Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей) // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2018. № 2. С. 25–30 ; *Яго ж.* Пралікі ў кадравай палітыкі БССР у 1970-я гг. // Современная молодёжь и общество: сб. науч. статей. Вып. 6 : Историческая память и преемственность. Диалог поколений. Минск, 2018. С. 29–33.

[1188] Матэрыялы па міжнацыянальных адносінах // РДАНГ. Ф. 2. Воп. 5. Спр. 334. Арк. 5–54

падзей у краіне напрыканцы 1980-х гг. засведчыла істотнае памяншэнне ролі партыйнага апарату на жыццё рэспублікі.

Неабходна падкрэсліць, што фарміраванне партыйна-дзяржаўнага апарату БССР залежыла ад унутранай і знешняй палітыкі. Прадстаўніцтва нацыянальных меншасцей у партыйным, савецкім і гаспадарчым кіраўніцтве забяспечвалася не толькі ў залежнасці ад поглядаў і кампетэнтнасці асобы, але і адміністратыўным шляхам. Наогул, склад кіруючых работнікаў і спецыялістаў фарміраваўся адміністрацыяй і кіруючымі органамі КПБ пры мінімальным (фармальным) удзеле грамадскасці ў выглядзе прафсаюзаў.

У разглядаемы перыяд адбылося зліццё партыйнага і гаспадарчага кіраўніцтва краіны. Усе сацыяльна-эканамічныя задачы, якія ставіліся перад грамадствам, вырашала КПСС. Кампартыя займалася кадравай працай не толькі ў сваім складзе, але і ў сферы гаспадаркі, саветах і грамадскіх арганізацыях. У наменклатуру кадраў абкамаў уваходзілі кіраўнікі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту, сувязі, будаўнічых арганізацый, СМІ, народнай адукацыі, навуковых установ і г.д. Назіраўся палітычны недавер, павышаная падазронасць да асобаў, якія патэнцыяльна маглі займаць кіруючыя пасады, з ліку беларусаў і выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі.

У сацыяльным абліччы кіруючых кадраў у 1960–1980-я гг. адзначаецца тэндэнцыя рэгіяналізацыі працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, а таксама тэндэнцыя да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых кадравых рэсурсаў для папаўнення складу кіруючых супрацоўнікаў і іншых спецыялістаў. Гэта выяўлялася як у цэлым па складзе кіраўнікоў, так і па тэрытарыяльным групам пасад. Калі ў 1940–1950-х гг. працэс узнаўлення кадраў істотна карэктаваўся цэнтрам (рэгуляванне адбору, масавыя перамяшчэнні і мабілізацыя работнікаў і інш.), цяпер працэсы іх станаўлення набылі пэўную аўтаномнасць. Быў запушчаны механізм самаразвіцця, які ўжо дзейнічаў незалежна ад волі цэнтра. Ужо ў другой палове 1970-х гг., у адрозненні ад папярэдніх этапаў ў гісторыі СССР, асноўныя кіруючыя кадры сталі рэкрутаваць з гарадскіх, а не сельскіх жыхароў, але вясковы менталітэт доўгія часы працягваў аказваць уплыў на дзейнасць і паводзіны кіраўнічых кадраў гаспадаркі БССР. Адукацыя, а не класавая прыналежнасць, стала адыгрываць вырашальную ролю пры заняцці адказных пасад. Таму ў 1980-я гг. менавіта прадстаўнікі інтэлігенцыі, у большасці сваёй тэхнічнай, сталі пераважаць у складзе кіруючых кадраў дзяржаўных і гаспадарчых структур. Далейшае павялічэнне долі тэхнічнай інтэлігенцыі на наменклатурных пасадах, якое насіла аб’ектыўны і заканамерны характар, прыводзіла да неабходнасці перабудовы самой сістэмы ўзаемаадносін палітычнай эліты і кіруючых работнікаў усіх узроўняў. Нягледзячы на тое, што ўлада спрабавала шляхам прадастаўлення розных ільгот і прывілеяў забяспечыць прадстаўнікам наменклатуры і тэхнічнай інтэлігенцыі больш высокі ўзровень

жыцця, інтарэсы палітычнай эліты і гэтых слаёў насельніцтва ўсё больш разыходзіліся[1189] .

Засяроджванне фактычнай улады ў эканоміцы краіны ў руках “камандзіраў прамысловасці” і іншых мясцовых гаспадарчых кіраўнікоў істотна падрывала пазіцыі кампартыі ў савецкай дзяржаве. Прынцып “стабільнасці кадраў” прыводзіў да таго, што мясцовыя кіраўнікі з часам сталі паўнаўладнымі гаспадарамі ва ўстановах і аб’ектах прамысловасці, якімі кіравалі. Стварэнне цесных сувязяў ўнутры наменклатуры, з аднаго боку, прыводзіла да фактычнай беспакаранасці мясцовых кіраўнікоў, з другога – ўваходзіла ў супярэчнасць з аб’ектыўнымі заканамернасцямі развіцця савецкага грамадства і руйнавала і без таго хісткі аўтарытэт партыі ў шырокіх народных масах. У выніку правадзімай кадравай палітыкі да 1980-х гг. у БССР склаўся ўстойлівы тып савецкай палітычнай і гаспадарчай эліты, які характарызуецца стабільнымі прапорцыямі асноўных яе кампанентаў. Фактар адукацыі стаў адным з найважнейшых пры фарміраванні аблічча эліты і кадравай палітыкі КПСС (КПБ) і савецкага ўрада ў цэлым. У апошнія дзесяцігоддзі існавання БССР, нацыянальнасць улічвалася ў анкетах і пры назначэнні на пасаду, але большасць грамадзян не надавала ёй вялікага значэння, усведамляючы сябе савецкімі людзьмі. Неабходна падкрэсліць, што фарміраванне кадравага патэнцыялу БССР цалкам залежыла ад палітыкі кіруючых органаў СССР. Выразна прасочваецца нізкая змяняльнасць кіруючых кадраў, што істотна перашкаджала абнаўленню кадравага патэнцыялу і развіццю эканомікі БССР[1190].

Аналіз склада і змяняльнасці работнікаў кіруючага апарата органаў партыйнага і дзяржаўнага кіравання, прамысловых прадпрыемстваў і яб’яднанняў БССР дазваляе адзначыць, што кіраўніцтва краіны, каб спыніць хуткае зніжэнне тэмпаў эканамічнага росту, абапіралася ў асноўным на пазаэканамічныя, адміністрацыйна-камандныя метады. З 1985 г., у сувязі з правядзеннем палітыкі “паскарэння і перабудовы” спрабавалі выправіць становішча ў эканоміцы шляхам вылучэння на кіруючыя пасады новых работнікаў, правесці працэс “амаладжэння” кадравага патэнцыяла краіны, але гэтага не адбылося таму, што сістэма рэалізацыі кадравай палітыкі заставалася ранейшай.

Дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у партыйна-дзяржаўным апараце насіла інтэрнацыянальны характар і вызначалася асноўнымі кірункамі знешняй і ўнутранай палітыкі. Гэта пастаянна падкрэслівалася на з’ездах і пленумах КПБ. Таму нельга гаварыць пра тое, што праз дзейнасць у кіруючых органах было магчыма захаваць традыцыі або элементы нацыянальных культур. Гэта рабілася неафіцыйна, у хатнім асяродку.

---

[1189] *Федоров А.В.* Кадровая политика СССР в период внутри- и внешнеполитического развития в 1970–1980-х гг. // Сборник трудов молодых ученых МПИ ФСБ России. Вып. 3. М., 2004. С. 12–19 ; *Яго ж.* Кадровая политика СССР на завершающем этапе индустриальной модернизации (конец 1950–1980-е гг.): автореферат диссертации на соискание учёной степени к. ист. н.: специальность 07.00.02. Москва, 2005. С. 5–12.

[1190] *Пушкін І.А.* Кадравы патэнцыял прамысловасці БССР па матэрыялах рэгіянальных органаў КПБ // Кадравая і антыкарупцыйная палітыка як фактары развіцця грамадзянскай супольнасці: зборнік навуковых прац Міжнар. навук.-практ. канф., Магілёў, 24–25 мая 2018 г. Магілёў, 2018. С. 70–72.

Нацыянальныя меншасці праз сваё прадстаўніцтва ў партыйна-дзяржаўным апараце атрымалі каштоўны вопыт удзелу ў вырашэнні мясцовых гаспадарчых, сацыяльных і грамадскіх спраў. Але іх удзел у гэтых працэсах быў не настолькі шырокім і трывалым, як бы таго жадалася з-за дужа цэнтралізаванага вырашэння пытанняў у сацыяльна-палітычным жыцці і несістэмнасці ў нацыянальнай працы.

Нягледзячы на трансфармацыю адносінаў улады да яўрэяў і некаторых іншых меншасцей, з улікам зменаў у колькасным складзе насельніцтва Беларусі, можна сцвярджаць, што эліта нацыянальных меншасцей у 1945–1991 гг. адчувала сябе камфортна ў партыйна-дзяржаўным і гаспадарчым кіраўніцтве рэспублікі.

### 5.3 Дасягненні і страты ў забеспячэнні грамадскіх і культурна-асветніцкіх запатрабаванняў нацыянальных меншасцей БССР

Агульнавядома, што нацыянальная культура мае магчымасць дасягнуць усяго, што ўласціва культуры агульначалавечай. Культура любога народа злучана ў той ці іншай форме з сусветнай культурай. Аднак, акрамя таго, што ўваходзіць у агульначалавечую культуру, у кожнай нацыянальнай культуры застаецца яшчэ сваё індывідуальнае, нацыянальнае, нацыянальна–спецыфічнае. Нацыянальная культура – гэта “базіс” нацыянальнай самасвядомасці. Як адзначае А. Мельнікаў, “нацыянальная культура – гэта абмежаваная прасторавымі і часавымі рамкамі культура пэўнага народа, якая выражае асаблівасці яго прыродна-геаграфічнага, гістарычнага, сацыяльна-палітычнага развіцця і найбольш яскрава праяўляецца ў нацыянальнай самасвядомасці, псіхалогіі, нацыянальным менталітэце”[1191].

Важнейшымі кампанентамі ладу жыцця асобаў з’яўляюцца іх грамадская дзейнасць, грамадскае правядзенне вольнага часу, грамадскія святы і абрады. У савецкі час некаторыя прынцыпы грамадскага жыцця і яго элементы змянілі спосабы і формы свайго існавання. Гэта ў першую чаргу датычыцца святочна-абрадавай культуры. Важнае месца належыла рэвалюцыйным і дзяржаўным святам і абрадам. Усесаюзнымі ўрачыстасцямі былі гадавіна Кастрычніка, 1 Мая, 8 Сакавіка, Дзень Перамогі. Гэтыя святы не толькі ўвайшлі ў грамадскі быт, але і адзначаліся дома, у сям’і. У той жа час, у пасляваенныя годы, сярод людзей сталага ўзросту выявілася вяртанне да народных абрадавых традыцый. Пазней, дзякуючы сацыяльна-эканамічным і палітычным пераўтварэнням, адбылося разбурэнне старых і ўкараненне новых форм побыту.

У 1960–1980-я гг. шэраг былых каляндарна-аграрных свят трансфармаваўся ў сучасныя грамадскія, працоўныя святы, якія часткова захоўвалі рытуальныя, эстэтычныя, гульнявыя элементы традыцыйных урачыстасцей. Традыцыі прасочваліся ў святочным застоллі, у складзе страў і г. д. Нацыянальная своеасаблівасць праяўлялася пад час сямейных святаў і абрадаў у выкананні побач з агульнасавецкімі песень свайго народу, танцаў, у музычным афармленні свята. У пасляваенны час масавы прыток сельскіх жыхароў паўплываў на этнічнае аблічча гараджан. Аднак у даволі складаных і супярэчлівых працэсах адаптацыі вясковае

[1191] *Мельников А.П.* Национальная культура в общей системе культуры // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф. С. 405.

насельніцтва ў зносінах пераходзілі на рускую мову, якая была свайго роду фактарам акультурацыі да гарадскога асяроддзя[1192]. У Беларусі вельмі добра развівалася руская культура. Вялікімі накладамі выдавалася мастацкая і навуковая літаратура, СМІ, у Гродна, Магілёве, а затым у Мінску працаваў Рэспубліканскі драматычны рускі тэатр і г.д.

**Дасягненні ў адукацыйнай і культурна-асветніцкай сферы.** Пераўтварэнні ў краіне, якія адбываліся ў другой палове XX ст. у галіне адукацыі і культуры, мелі як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Галоўнымі дасягненнямі з'яўляліся значны ўдзел нацыянальных меншасцей у партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве (гл. раздзел 5.2), пад'ём узроўню адукацыі ўсіх этнічных груп, што жылі ў БССР, згладжваліся дыспрапорцыі ва ўзроўнях адукацыі (гл. табліцу 51). Варта адзначыць невысокі адукацыйны ўзровень партыйна-гаспадарчых работнікаў у першыя пасляваенныя гады. Пазней менавіта ўзровень адукацыі вызначаў, хто будзе займаць тую ці іншую кіруючую пасаду.

Табліца 51 – Узровень адукацыі найбольш шматлікіх нацыянальнасцей, якія працавалі ў народнай гаспадарцы Беларусі (на 1 тыс. занятых)[1193]

| | **1959 г.** | **1970 г.** | | **1979 г.** | | **1989 г.** | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Вышэйшая і сярэдняя (поўная і няпоўная)** | **Вышэйшая і сярэдняя (поўная і няпоўная)** | **у тым ліку вышэйшая** | **Вышэйшая і сярэдняя (поўная і няпоўная)** | **у тым ліку вышэйшая** | **Вышэйшая і сярэдняя (поўная і няпоўная)** | **у тым ліку вышэйшая** |
| Усё насельніцтва | 331 | 594 | **57** | 763 | 95 | 899 | 144 |
| Беларусы | 309 | 555 | 40 | 739 | 70 | 889 | 115 |
| Рускія | 631 | 835 | 141 | 913 | 216 | 962 | 277 |
| Украінцы | 565 | 806 | 124 | 891 | 180 | 953 | 222 |
| Яўрэі | 783 | 898 | 248 | 944 | 338 | 975 | 419 |
| Палякі | 155 | 400 | 18 | 601 | 41 | 803 | 77 |

Пашырэнне сеткі навучальных устаноў, пераход у 1960-я гг. да ўсеагульнага 8-гадовага, а ў 1970-я да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі адыгралі вялікую ролю ў павышэнні адукацыйнага ўзроўню нацыянальных меншасцей. Асабліва значныя змены адбыліся ва ўзроўні адукацыі яўрэяў Беларусі, які

[1192] Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. С. 358, 405.
[1193] Там жа. С. 405 ; *Батяев В.Ф.* Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей). С. 72.

няўхільна павялічваўся[1194]. Што дазваляе нам казаць аб адсутнасці істотных перашкодаў у атрыманні вышэйшай адукацыі для яўрэйскага насельніцтва Беларусі і заняцця пэўных пасадаў адпаведна сваёй адукацыі. З ростам урбанізаванасці павялічваўся і адукацыйны ўзровень палякаў, але ён быў ніжэйшы за агульнарэспубліканскі[1195].

Павышэнне адукацыйнага ўзроўню прыводзіла да пашырэння магчымасцей да самарэалізацыі ў грамадскай, культурна-навуковай і адукацыйна-асветніцкай дзейнасці. Можна прывесці вельмі шмат прыкладаў. Прыпынемся на некаторых. Значны ўклад у развіццё беларускай навукі ўнеслі такія прадстаўнікі нацыянальных меншасцей, як рускія – доктар педагагічных навук, прафесар, даследчык гісторыі і развіцця народнай адукацыі ў Беларусі Е. Андрэява[1196], вядомы сацыёлаг, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік НАН Беларусі Я. Бабосаў, матэматык, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік АН БССР У. Крылоў, вучоны ў вобласці металазнаўства і тэрмічнай апрацоўцы, акадэмік АН БССР К. Гораў і інш.; украінцы – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік АН БССР, загадчык лабараторыі тэорыі канцавых груп Інстытута матэматыкі (Гомельскае аддзяленне) С. Чуніхін, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар БДУ, узнагароджаны медалём Лабачэўскага "За выдатныя працы ў вобласці геаметрыі" Б. Камракоў, кандыдаты фізіка-матэматычных навук, дацэнты – загадчык кафедры алгебры ГрДУ В. Аўчыннікаў, супрацоўнік кафедры прыкладной матэматыкі ГрДУ Ю. Белых, выкладчык кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі ВДУ імя П. Машэрава В. Сементоўскі[1197]; татары – пісьменнік С. Александровіч, музыказнаўца, заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі Б. Смольскі, вучоны ў галіне цеплаэнергетыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР Б. Смольскі, кампазітар, педагог, народны артыст Беларусі Д. Смольскі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, загадчык рэдакцыі геалогіі і геаграфіі выдавецтва "БелСЭ" татарын з Віцебшчыны Я. Якубоўскі, генерал–лейтенант І. Паўтаржыцкі, музыказнаўца і тэатразнаўца прафесар І. Смольскі[1198] і іншыя.

У 1950 г. 3,8 % работнікаў Міністэрства адукацыі БССР, 4,1 % навукоўцаў рэспублікі і 5,4 % супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР былі ўкраінцы. У пачатку

---

[1194] У 1959 г. у структуры яўрэйскага насельніцтва па ўзроўню адукацыі 10,7 % складалі асобы з вышэйшай адукацыяй, 3,1 % – з няскончанай вышэйшай, 10,8 % – з сярэдняй спецыяльнай, 13,2 % – сярэдняй, 21,6 % – 7-гадовай, 23,0 % – пачатковай і няскончанай 7-гадовай і 17,6 % – пісьменныя, але якія не мелі пачатковай адукацыі. У наступныя гады ўзровень адукацыі яўрэяў няўхільна павялічваўся. На 1000 студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў даводзілася ў 1960/1961 навучальным годзе – 201 яўрэй, у 1970/1971 – 452, у 1980/1981 – 279, а ў 1989/1990 – 238. Рост узроўню адукацыі яўрэяў відавочна праглядаецца ў матэрыялах перапісаў 1970, 1979 і 1989 г. *Батяев В.Ф.* Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей). С. 73.

[1195] Даволі нізкай заставалася ў палякаў колькасць асобаў з вышэйшай адукацыяй у разліку на 1000 занятых у народнай гаспадарцы. Так, у 1970 г. гэты паказчык быў меншы за сярэднерэспубліканскі ў 3 разы, а ў 1989 г. – у 2 разы.

[1196] *Лыч Л.* Рускі прафесар на ніве беларускага нацыянальнага адраджэння: успаміны. Мінск, 2013.

[1197] *Зенькович Ю.В.* Вклад уроженцев Украины в развитие математической науки Беларуси в ХХ веке // Беларусь–Україна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. С. 327–328.

[1198] *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). С. 40 ; *Думін С.У., Канапацкі І.Б.* Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993. С. 185.

1950-х гг. украінцамі былі 5,3 % выкладчыцкіх кадраў педагагічных і настаўніцкіх інстытутаў і 2,7 % ад агульнай колькасці студэнтаў 13 ВНУ, што падпарадкоўваліся Міністэрству вышэйшай адукацыі. Удзельная вага ўкраінцаў у складзе навуковых і навукова-педагагічных работнікаў на 01.01.1967 г. складала 6,1 %, сярод дактароў навук украінцаў было 5,7 %, кандыдатаў навук – 5 %. У сістэме АН БССР 01.01.1978 г. украінцы складалі 5,7 % супрацоўнікаў. З 1960 г. да 1987 г. колькасць украінцаў – дактароў навук вырасла ў 5,6 раза, а кандыдатаў навук – у 10,1 раза. У канцы 1980-х гг. украінцы складалі 5,95 % навуковых работнікаў рэспублікі. У 1980 г. у Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі спецыялісты ўкраінцы з вышэйшай адукацыяй складалі 5,89 %, а з сярэдняй спецыяльнай – 5,85 %. Больш як 10 % ад агульнай колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй складалі ўкраінцы ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, Брэсцкім інжынерна-будаўнічым, Мінскім радыётэхнічным інстытутах і Мінскім палітэхнічным тэхнікуме[1199].

Добра праявілі сябе нацыянальныя меншасці Беларусі ў спорце. Так, напрыклад, яшчэ ў 1960 г. на Рымскай алімпіядзе чэмпіёнам па грэбле на каноэ-двойцы стаў яўрэй Л. Гейштар з Гомеля; адной з лепшых спартсменак у гісторыі лёгкай атлетыкі з'яўляецца яўрэйка мінчанка М. Іткіна – шматкратная чэмпіёнка СССР і Еўропы, уладальніца некалькіх сусветных рэкордаў у спрынце; 21 яўрэй з Беларусі стаў уладальнікам ганаровага звання "Заслужаны трэнер СССР". Алімпійскім чэмпіёнам па грэка-рымскай барацьбе ў Рыме (1960) стаў А. Караваеў, чэмпіёнам свету быў Л. Ліберман (1973) і г.д. Наогул, чэмпіёнамі свету, Еўропы, СССР, БССР толькі па трох намінацыях: бокс, барацьба, цяжкая атлетыка за перыяд 1920–1980-х гг., былі болей за 150 асобаў яўрэйскай нацыянальнасці з Беларусі[1200].

Ва ўмовах пабудовы сацыялістычнага грамадства ўлады спрыялі развіццю братэрскіх сувязяў паміж народамі. Асабліва ў сферы культуры.

Пашырэнню і паглыбленню кантактаў садзейнічала Беларускае аддзяленне Таварыства савецка-польскага сяброўства, адкрытае ў 1958 г. і меўшае свае філіялы ў розных гарадах Беларусі. Аднак яго дзейнасць, як і пашыраныя двухбаковыя абмены рознымі дэлегацыямі – партыйнымі, прафсаюзнымі, спартыўнымі, маладзёвымі і іншымі, жорстка кантраляваліся ЦК партыі. Кантроль заключаўся ў тым, што на бюро ЦК КПБ заўсёды ўзгадняліся планы прыёму дэлегацый, месцы наведвання і сустрэч і г.д. Напрыклад, у 1958 г. бюро ЦК КПБ 14 разоў разглядала пытанні аб накіраванні беларускіх дэлегацый у Польшчу і прыёме польскіх дэлігацый у Беларусі. Разам з двухбаковым абменам у Беларусі рэгулярна праводзіліся дні польскай культуры (у 1958, 1964, 1972, 1976), якія праходзілі фармалізавана і па загадзя складзеных і "адпрацаваных" планах. Так, падчас правядзення першых дзён польскай культуры ў Беларусі ў 1958 г. "адбыліся сустрэчы польскіх гасцей з беларускімі пісьменнікамі, мастакамі, кампазітарамі, дзеячамі культуры" і г. д. Але не адбывалася і не магло адбыцца

[1199] *Мазец В.Г.* Роля ўкраінцаў у грамадскім і культурным жыцці Беларусі (1945–1989 гг.). С. 314.
[1200] *Лиокумович С.* Евреи в белорусском спорте // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып.1. Мінск, 2002. С. 115–126.

незапланаваных сустрэч з палякамі Гродзеншчыны, Берасцейшчыны, на якіх бы абмяркоўваліся пытанні культурнага, рэлігійнага, навуковага жыцця палякаў Беларусі[1201].

У верасні 1959 г. у Беларусі праходзіў тыдзень латышскай літаратуры, пад час яго адбыліся творчыя сустрэчы, экскурсіі, выставы, што пазітыўна паўплывала на ўспрыняцце латышскай культуры ў беларускім грамадстве[1202]. Напрыканцы снежня 1980 г. было завершана стварэнне экспазіцыі музея баявога супрацоўніцтва беларускіх, рускіх, латышскіх і літоўскіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны ў г.п. Расоны[1203]. У БССР праводзіліся конкурсы польскай песні ў Віцебску[1204] і інш.

Аналіз працэсу інфільтрацыі нацыянальных меншасцей у беларускі этнакультурны асяродак дазваляе адзначыць, што адным з яго вынікаў было фарміраванне сацыяльна значнага пласту прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі, якія лічылі сваёй радзімай Беларусь і мелі адпаведны гэтаму разуменню светапогляд. Іх адрозніваў ад беларусаў высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, развітае пачуццё чалавечай годнасці, актыўная жыццёвая пазіцыя, амбіцыйнасць[1205]. Не выпадкова ў канцы ХХ ст. гэтыя прадстаўнікі нацыянальных меншасцей і іх нашчадкі (руса- і беларусафіцыраваныя) з’явіліся ў шэрагах ідэолагаў беларускага нацыянальнага руху, палітыкаў, дзеячаў культуры.

**Асіміляцыя нацыянальных меншасцей у Савецкай Беларусі.** Да недахопаў, нават з улікам станоўчага ў інтэграцыі, у першую чаргу, варта аднесці асіміляцыйныя працэсы, якія вельмі моцна закранулі палякаў, яўрэяў, латышоў, татараў[1206] Беларусі; затым пэўны недавер да прадстаўнікоў некаторых нацыянальнасцей (яўрэяў, палякаў) і адпаведныя абмежаванні ў дачыненні да іх. А таксама тое, што нацыянальна-культурнае жыццё нацыянальных меншасцей Беларусі, за выключэннем рускіх, ад пачатку 1950-х да сярэдзіны 1980-х гадоў фактычна было абмежавана рамкамі рэлігійнай сферы.

Пасля таго, як Беларусь была вызвалена ад гітлераўскай акупацыі, у родныя мясціны пачалі вяртацца яўрэі, пераважна з ліку тых, хто ў пачатку вайны паспеў эвакуіравацца, а таксама тыя, што ваявалі ў шэрагах Чырвонай Арміі. Беларускія яўрэі пачалі актыўна ўключацца ў працэс аднаўлення гаспадарчага і

---

[1201] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 296.

[1202] Латвия–Беларусь: 1918–2018. Минск, 2018. С. 217–218.

[1203] Інфармацыйны ліст у ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 133. Спр. 56. Арк. 139.

[1204] Дарэчы, у Віцебску 23.07.1988 г. падчас конкурса польскай песні адбыўся вечар беларускай песні, на якім з 20 выкананых песень было толькі 4 беларускія. Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі інтэлігенцыі БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, мовы. 27.07.1988 г. // Там жа. Воп. 160. Спр. 1167. Арк. 22.

[1205] *Кротов А.М.* К вопросу об инфильтрации поляков в белорусскую этнокультурную среду // Проблемы славяноведения: Сборник научных статей и материалов. Вып. 3. Брянск: Издательство Брянского государственного университета, 2001. С. 51.

[1206] Варта адзначыць тое, што існавала пасіўнасць саміх татараў у вывучэнні сваёй гісторыі і культуры. Сярод іх заўжды меліся таленавітыя навукоўцы, літаратары, аднак за распрацоўку татарскай тэматыкі ніхто не жадаў брацца. Такая нічым не апраўданая традыцыя была парушана толькі пад уплывам нацыянальна-адраджэнскіх рухаў у Беларусі ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. *Лыч Л.* Татары Беларусі на пераломах сацыяльна-палітычных эпох (ХХ – пачатак ХХІ ст.). С. 40

культурнага жыцця рэспублікі. У першыя пасляваенныя гады даволі высокай была ўдзельная вага яўрэяў сярод партыйна-савецкай наменклатуры, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ. Напрыклад, у 1947 г. І. Курган быў зацверджаны інспектарам ЦК КП(б)Б, І. Чэрняк – старшым рэдактарам аддзела навукова-тэхнічнай літаратуры Белдзяржвыдавецтва. С. Гласаў працаваў на пасадзе другога сакратара Бабруйскага абкама КП(б)Б, М. Нісневіч – загадчыкам Бабруйскага абласнога фінансавага аддзела. І. Альтшулер кіраваў Баранавіцкім абласным аддзелам прамысловасці, Л. Шайкоўскі – аддзелам камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама[1207]. У 1946/1947 н.г. яўрэі складалі 65,5 % выкладчыкаў Беларускага юрыдычнага інстытута, 43,7 % – палітэхнічнага інстытута, 42 % – інстытута народнай гаспадаркі і 38 % – Мінскага медыцынскага інстытута. Удзельная вага яўрэяў з ліку студэнтаў у 1947 г. складала 17,4 %[1208]. У 1946 г. з ліку 45332 настаўнікаў рэспублікі на яўрэяў прыпадала 3,3 %[1209].

Але сітуацыя была неадназначнай. У ліпені 1945 г. у Мінск вярнулася трупа Беларускага дзяржаўнага яўрэйскага драматычнага тэатра. Спектаклі ставілі на сцэне тэатра імя Янкі Купалы, бо ўласнае памяшканне тэатра было амаль цалкам разбурана. Яўрэйская трупа звярнулася да тагачаснага Старшыні Савета Міністраў БССР П. Панамарэнкі з просьбаю аднавіць памяшканне яўрэйскага тэатра. У адказ яны пачулі: “Мы жывём у Беларускай рэспубліцы, а не ў яўрэйскай”[1210].

У 1948 г. яўрэйскія пісьменнікі на чале з Хаімам Мальцінскім на прыёме ў П. Панамарэнкі, які на той час ужо займаў пасаду першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі, выказалі прапанову аднавіць выпуск часопіса і кніг на яўрэйскай мове. Але іх прапанова не была падтрымана. Гэта было абумоўлена агульнай пазіцыяй ЦК КП(б)Б, які лічыў першачарговай задачай “арганізацыю ідэалагічнай барацьбы супраць любых праяваў нацыяналізму”. У выніку, на тэрыторыі БССР не працавала ніводнай яўрэйскай школы, не выдаваліся кнігі і перыядычныя выданні на ідыш або іўрыце. Пасля закрыцця ў 1949 г. Яўрэйскага драматычнага тэатру БССР не дапускалася стварэння яўрэйскіх культурна-асветных арганізацый. Гэта ўсё негатыўным чынам адбівалася на ўзроўні нацыянальнай самасвядомасці, пра што сведчыла змяншэнне ад перапісу да перапісу колькасці і ўдзельнай вагі яўрэяў, што называлі роднай моваю іўрыт або ідыш[1211].

Пасля смеці Сталіна, у 1953–1956 гг., на думку прафесара Э. Іофэ, працэс разгортвання антысемітызму прыкметна затармазіўся. У Беларусь, пачынаючы

---

[1207] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 217.

[1208] *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. С. 334, 339–340.

[1209] *Смиловицкий Л.* Евреи Беларуси: из нашей общей истории. 1905–1953. Сборник статей. Минск, 1999. С. 229.

[1210] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 180.

[1211] Калі ў 1959 г. 32,9 тыс., або 21,9 % яўрэяў назвалі роднай мову сваёй нацыянальнасці, то ў 1979 г. – 15,1 тыс. і 11,2 %, а ў 1989 г. – 8,6 тыс., або 7,6 %. Удзельная вага тых яўрэяў, якія назвалі роднай рускую мову, у 1959 г. складала – 76,1 %, у 1970 г. – 80,1 %, у 1989 г. – 90,2 %. *Батяев В.Ф.* Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей). С. 69 ; *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 207–226.

з 1954 г., пачалі вяртацца дзеячы культуры, рэпрэсаваныя ў пасляваенны перыяд: Р. Бярозкін, Г. Камянецкі, І. Платнер, Х. Мальцінскі і інш.[1212]

У наступныя дзесяцігоддзі сітуацыя змянілася. З аднаго боку, яўрэі выцясняліся з адказных пасадаў, з другога, каб зрабіць пэўную кар'еру яны былі вымушаны мяняць нацыянальнасць, часам, не надаючы належнай увагі гэтаму з-за ідэалагічных установак. Можна вылучыць два падыходы пры тлумачэнні гэтай з'явы.

Першы. Ён грунтуецца на антысемітызме Сталіна і партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва краіны. Гэты падыход падзяляе частка сённяшніх айчынных і яўрэйскіх гісторыкаў. Так, яўрэйскія гісторыкі (Ізраіль), асвятляючы жыццё яўрэяў у СССР, у тым ліку Беларусі, адзначалі закрыццё сінагог, пераўтварэнне апошніх у клубы, забарону рэлігійнай адукацыі, праслед сіянізму, ссылку яго актывістаў у Сібір. Як адмоўнае разглядалі адсутнасць перашкодаў для змешаных шлюбаў, што прыводзіла да паскарэння асіміляцыі яўрэяў. Падкрэслівалі, што пасля рэвалюцыі яўрэі былі афіцыйна прызнаны ў якасці асобнай нацыянальнасці са сваёй мовай і сваімі ўстановамі, але адначасова сцвярджалі: "На практыцы савецкая сістэма несла яўрэйскаму жыццю яшчэ больш пакут і разбурэнняў, чым царызм… яўрэям было амаль таксама цяжка знайсці сабе месца ў рэспубліцы рабочых і сялян, як за дзесяць стагоддзяў да таго ў феадальным ладзе". Адносіны да яўрэйскай супольнасці ў перыяд 1950–1980-х гг. ацэньваліся як "строгая ізаляцыя… якая суправаджалася рашучым падаўленнем усіх праяў яўрэйскага жыцця; мелася нават дасдаткова прыкметаў радыкальнай антысеміцкай рэакцыі"[1213].

Але гэтаму супярэчаць наступныя факты. У структуры насельніцтва рэспублікі вылучаліся тры сацыяльныя групы: рабочыя, служачыя і сяляне. У другой палове ХХ ст. асноўная частка яўрэйскага насельніцтва адносілася да служачых і рабочых, і невялікая – да сялян. Прычым лік служачых яўрэяў увесь час павялічваўся, а рабочых – памяншаўся. У 1970–80-я гг. па ліку служачых у кожнай этнічнай групе сярод найбольш шматлікіх народаў рэспублікі яўрэі займалі першае, а рабочыя і сяляне – апошняе месца. На гэта паўплывала і тое, што сярод яўрэяў быў вельмі высокі працэнт асобаў з вышэйшай адукацыяй. Так, на 1000 працуючых у БССР сярод усяго насельніцтва прыходзілася 57 асобаў з вышэйшай адукацыяй у 1970 г., 95 у 1979 г., 144 у 1989 г. Сярод яўрэяў: у 1970 годзе – 247, 1979 г. – 338, 1989 г. – 419 чал. Сярод занятых у народнай гаспадарцы большасць працавалі ў сферы інтэлектуальнай працы. У 1979 г. іх было – 61,7 %, а ў 1980 г. – 74,2 %. Сярод яўрэяў пераважалі інжынерна-тэхнічныя работнікі, работнікі машынабудавання і металаапрацоўкі, навуковыя работнікі, выкладчыкі і выхавальнікі, медыцынскія работнікі, работнікі планавання і ўліку[1214].

---

[1212] *Иоффе Э.Г.* Страницы истории евреев Беларуси. С. 186.

[1213] *Рот Сесиль.* История евреев. С древнейших времён по шестидневную войну / Перевод с английского. Иерусалим, Б.Г. С. 365–366, 410.

[1214] *Батяев В.Ф.* Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей). С. 72, 75–76.

Другі. У аснове яго – залежнасць адносінаў кіраўніцтва СССР да яўрэяў ад палітыкі новастворанай дзяржавы – Ізраіля. Савецкая краіна шмат зрабіла для ўзнікнення гэтай краіны і спадзявалася на падтрымку курсу СССР з боку Ізраіля[1215]. Але кіраўніцтва новай дзяржавы зрабіла стаўку на палітыку ЗША. Гэта прывяло да недаверу асобам яўрэйскай нацыянальнасці.

Тым не менш, нягледзячы на некаторую трансфармацыю адносінаў улады да яўрэяў, якая была выклікана знешнепалітычнымі фактарамі, з улікам адукацыйнага ўзроўню і зменаў у колькасным складзе насельніцтва Беларусі, яўрэйская эліта па-ранейшаму адчувала сябе камфортна ў партыйна-дзяржаўным і гаспадарчым кіраўніцтве Савецкай Беларусі.

Эканамічная, навуковая і адукацыйная палітыкі ў БССР і СССР насілі інтэграцыйны кірунак. Быў абвешчаны партыйным кіраўніцтвам лозунг пра непазбежнае зліццё нацый у працэсе будаўніцтва камунізму. Адным з галоўных фактараў нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў СССР у пасляваенны перыяд стала пашырэнне сферы ўжытку рускай мовы амаль ва ўсіх саюзных рэспубліках.

З першых пасляваенных гадоў культурныя патрабаванні насельніцтва Беларусі ўсё больш скіроўваліся на рускія стандарты, што толькі садзейнічала яго асіміляцыі. Вялікія памеры прыняла русіфікацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця беларускага народа. Асабліва ў школьнай справе. Так у БССР існавалі нацыянальныя рускія сярэднія і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Напрыклад, у 1955/1956 н. г. дзейнічалі рускія школы ў Полацку, Лепелі, Ліозна, Талачыне, Барані, рускае педагагічнае вучылішча ў Оршы і інш.[1216]. Адбывалася паступовае павелічэнне ўдзельнай вагі рускамоўных школ. Так, у 1955/56 н. г. з 11346 школ рэспублікі 10730 або 94,5 %, былі беларуска-моўнымі, 592, або 5,2 % з рускай мовай навучання і 24 школы з дзвюма мовамі навучання. У 1958/59 н.г. працавалі 11492 школы, з якіх 10784 або 93,8 %, было беларускамоўных, 667, або 5,8 %, – рускамоўных і 41 школа з дзвюма мовамі навучання. У выніку калі ў 1955/56 н. г. на беларускай мове вучылася 78,5 %, то ў 1960/61 – 70,8 % школьнікаў. У абласных і раённых цэнтрах працавалі 154 школы з беларускай мовай навучання, 329 рускамоўных школ і 21 школа з дзвюма мовамі. Разам з тым мелі месца выпадкі, калі ў школах, якія лічыліся беларускамоўнымі, усе прадметы, за выключэннем беларускай мовы, выкладаліся на рускай мове[1217]. Скарачалася колькасць беларускіх і ліквідоўваліся польскія, літоўскія агульнаадукацыйныя школы. Яны пераўтвараліся ў школы з рускай мовай навучання. У Мінску, дзе тады больш паловы дзяцей школьнага ўзросту было з беларускіх сем'яў, мелася толькі 9 беларускіх школ з 48. Не лепшым з'яўлялася становішча і ў іншых гарадах. Русіфікацыя захапіла сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе рыхтаваліся кадры для розных галін гаспадаркі і культуры[1218].

---

[1215] *Кожинов В.В.* Наследники победы. С. 324–329.

[1216] Гадавыя справаздачы // ДАВц. Ф. 2797. Воп. 3. Спр. 63, 68, 209.

[1217] Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2. С. 300 ; Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001. С. 405.

[1218] *Касцюк М.* Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. С. 105 ; Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе. С. 390.

Закранулі гэтыя працэсы і СМІ. Для прыкладу, на 01.08.1946 г. у Гродзенскай вобласці выдаваліся 13 раённых газет, 2 гарадскія, 1 абласная. З іх: 4 раённыя і 1 гарадская на беларускай мове, 9 раённых і 1 гарадская на рускай. Абласная "Гродзенская Праўда" выходзіла на рускай мове[1219]. Рэспубліканская газета "Калгасная праўда", якая была разлічана ў першую чаргу на жыхароў сельскай мясцовасці, мела ў 1953 г. тыраж на беларускай мове 4830 экземпляраў, на рускай – 56257. Як адзначае прафесар Л. Лыч, тое, што рабілася па асіміляцыі ў БССР карэннай нацыі і мясцовых нацменшасцей не было характэрна для ўсяго СССР. Ён прыводзіць прыклад, як ва Узбекістане на 1961 г. выходзіла 98 газет і 17 часопісаў на ўзбекскай мове, адпаведна 24 газеты і 23 часопісы на рускай, 3 і 2 на каракалпакскай, 4 газеты на казахскай, 2 на таджыкскай, 1 на татарскай[1220].

Як адзначае даследчык В. Мазец: "Нацыянальна-культурнае жыццё палякаў у БССР працякала ў даволі складаных умовах. Гэта было абумоўлена ліквідацыяй польскіх школ і тым самым немагчымасцю атрымоўваць адукацыю на роднай мове. Нацыянальна-культурнае жыццё палякаў ад пачатку 50-х да сярэдзіны 80-х гадоў фактычна было абмежавана рамкамі рэлігійнай сферы, калі не лічыць дзён польскай культуры, што праводзіліся ў 1958, 1964, 1972 і 1976 г. … Дні польскай культуры, арганізатары якіх ставілі ў першую чаргу ідэалагічна-прапагандысцкія мэты, не маглі зрабіць істотнага ўплыву на ўзровень самасвядомасці палякаў у БССР"[1221].

Адразу пасля заканчэння вайны ў дакладной запісцы "Пра стан і меры па паляшпэнні палітычнай працы сярод апалячанага беларускага насельніцтва і насельніцтва польскай нацыянальнасці ў заходніх абласцях БССР" сакратар ЦК КП(б)Б М. Гусараў выказаў сумненне ў неабходнасці далейшага існавання польскіх школ. Адначасовае закрыццё гэтых школ магло прывесці да негатыўнага рэзанансу з боку польскай грамадскасці. Таму ён просіць ЦК УсеКП(б) санкцыянаваць паступовае пераўтварэнне польскіх школ ў беларускія і рускія школы, шляхам замены ненадзейных і некваліфікаваных выкладчыкаў – палякаў падрыхтаванымі і праверанымі выкладчыкамі – рускімі і беларусамі.

У адказ ЦК УсеКП(б) абавязаў Наркамасветы РСФСР "З 1 сакавіка па 1 жніўня 1945 г. адкамандзіраваць для працы ў школах заходніх абласцей Беларусі ўсіх раней эвакуіраваных з БССР настаўнікаў–беларусаў, працуючых у школах РСФСР". Дзяржвыдавецтву РСФСР загадвалася да новага вучэбнага года надрукаваць 1 млн экзэмпляраў беларускіх падручнікаў. У сваю чаргу, ЦК КП(б)Б абавязаў НКА, Мінскі, Бабруйскі, Магілёўскі, Гомельскі абкамы КП(б)Б і аблвыканкамы на працягу мая адкамандзіраваць на працу ў школы заходніх абласцей 400 настаўнікаў; накіраваць у школы 800 настаўнікаў з ліку выпускнікоў педвучэльняў усходніх абласцей і 200 – выпускнікоў педагагічных ВНУ; накіраваць у гэтыя вобласці з ліку рээвакуіруемых 1 тыс. настаўнікаў і асноўную

---

[1219] Даведкі Гродзенскага абкама КП(б)Б // ДАГАГр. Ф. 1. Воп. 1. Спр.1778. Арк. 45, 53.
[1220] *Лыч Л.М.* Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 – кастрычнік 1964 г.). С. 232.
[1221] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 216.

частку настаўнікаў, якія дэмабілізаваліся з РСЧА"[1222]. Як змянялася вага польскіх настаўнікаў у школах Гродзенскай вобласці яскрава бачна з табліцы 52.

Табліца 52 – Нацыянальны склад настаўнікаў школ Гродзенскай вобласці ў 1944–1946 гг.[1223]

| | Усяго (чал.) | Нацыянальныя меншасці | Беларусы | Рускія | Палякі і іншыя |
|---|---|---|---|---|---|
| 1944/45 нав.год | 1709 | 58,6 % | 707 | 160 | 843 |
| 1945/46 нав.год | 2058 | 22,65 % | 1592 | 267 | 199 |

М. Гусараў замест ліквідаваных польскіх школ прапаноўваў ствараць рускія, матывуючы гэта тым, што насельніцтва ў заходніх абласцях, асабліва ў гарадах і мястэчках, цягнецца да рускіх школ. Як прыклад "правільнай працы" сярод насельніцтва заходніх абласцей, прыводзіў факт, што за тры гады колькасць польскіх школ скарацілася з 144 (1944) да 22 (1947). У БССР прадугледжвалася таксама значнае пашырэнне вячэрніх школ з выкладаннем на беларускай і рускай мовах; адкрыццё ў Гародні ў 1947–1948 гг. палітвучэльні для падрыхтоўкі "надзейных работнікаў" з мясцовага насельніцтва; стварэнне ў ЦК КП(б)Б звышустаноўленых лімітаў штата прапагандыстаў у складзе 10 чалавек, маючых належную тэарэтычную і практычную падрыхтоўку і валодаючых польскай мовай і г.д.[1224] Да пачатку 1950-х гг. праблема польскіх школ у БССР была вырашана канчаткова – іх не засталося.

Палякі, якія жылі ў Гродзенскай вобласці, неаднаразова ўзнімалі пытанне пра магчымасць адкрыцця школаў на роднай мове. Так у сваім звароце, накіраваным у Савет Міністраў СССР, "грамадзяне каталіцкай нацыянальнасці Ракаўскага сельсавета Радашковіцкага раёна", патрабуючы вярнуць вернікам будынак Ракаўскага касцёла, разам з тым заяўлялі, што ў адпаведнасці з артыкуламі Канстытуцыі СССР "грамадзяне маюць права на адукацыю на роднай мове, а ў нас гэтае права забранае". У ліку пытанняў, якія часцей за ўсё задавалі лектарам Гродзенскай вобласці ў 1973 г., было пытанне: "Чаму ў Гродна няма польскіх школ?". Пры гэтым падкрэслівалася, што такое пытанне з'яўлялася тыповым для ўсіх раёнаў вобласці[1225].

25.12.1958 г. быў прыняты Закон СССР "Аб крымінальнай адказнасці за дзяржаўныя злачынствы", які ўстанаўліваў крымінальны пераслед за "прапаганду або агітацыю з мэтаю ўзбуджэння расавай, або нацыянальнай варожасці, а таксама і прамое або ўскоснае абмежаванне правоў, або ўстанаўленне прамых ці ўскосных перавагаў грамадзян у залежнасці ад іх расавай, або нацыянальнай

[1222] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: "двайстыя стандарты" нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 293.
[1223] Інфармацыйны ліст аб становішчы школ // ДАГАГр. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1778. Арк. 105.
[1224] *Вялікі А.Ф.* Палякі ў савецкай Беларусі: "двайстыя стандарты" нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.). С. 294.
[1225] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 211.

прыналежнасці”. Палажэнні гэтага Закона былі ўключаны ў новы Крымінальны кодэкс БССР, які пачаў дзейнічаць з 01.04.1961 г. На практыцы ён з 1962 да 1991 г. не прымяняўся ні разу.

Пашырэнню ўжытку рускай мовы паспрыяў Закон СССР “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і пра далейшае развіццё сістэмы народнай адукацыі ў СССР”, які быў прыняты ў 1959 г. У адпаведнасці з ім неабходнасць вывучэння роднай мовы тытульнай нацыі ў саюзных рэспубліках як асобнага прадмета ў рускамоўных школах цалкам залежыла ад жадання бацькоў і вучняў[1226]. Гэтыя палажэнні замацаваў Закон ВС БССР “Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшае развіццё сістэмы народнай адукацыі ў БССР”. Гэтымі законамі скарысталася руская супольнасць рэспублікі. Напрыклад, прафсаюзны камітэт торфапрадпрыемства “Асінторф” 18.06.1959 г. накіраваў у Міністэрства асветы БССР і Рэспубліканскі камітэт прафсаюзаў свой зварот, у якім ад рабочых і служачых дадзенага прадпрыемства паступіла заява з просьбаю адчыніць рускія класы ў мясцовай сярэдняй школе з 1959/60 н.г. Матывацыя бацькоў была наступная: “Працяглы час па накіраванню вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на прадпрыемстве працуюць спецыялісты рускай нацыянальнасці, якія маюць дзяцей і кроўна зацікаўлены ў навучанні сваіх дзяцей на рускай мове”[1227].

22–23.06.1972 г. праходзілі пасяджэнні трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета БССР восьмага склікання. На ёй разглядалася пытанне “Аб поўным пераходзе да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі ў БССР”. З судакладамі выступалі міністр асветы БССР М. Мінкевіч і старшыня пастаяннай камісіі па народнай асвеце ВС БССР А. Караткевіч. Ні яны, ні выступоўцы з ліку адказных асоб і дэпутатаў ніводнага слова не казалі аб навучанні і выкладанні ў адукацыйных установах на роднай мове. Казалі аб чым заўгодна, толькі не аб захаванні роднай мовы ў школах і ПТВ рэспублікі як для тытульнай нацыі, так і для нацыянальных меншасцей[1228]. Гэта, нягледзячы на тое, што 23.06.1972 г. у абмеркаванні пытання аб поўным пераходзе да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі ў БССР міністр асветы СССР М. Пракоф’еў падкрэсліў: “Пастановай прадугледжана, што да 1975 г. школа павінна па ўсіх прадметах закончыць пераход на новыя навучальныя праграмы і падручнікі. Асаблівую ўвагу нам неабходна звярнуць на паляпшэнне выкладання рускай і роднай моў у нацыянальных школах”[1229]. Па выніках сесіі ў пастанове ВС БССР пра новыя праграмы зафіксавана, а наконт моў нічога не сказана[1230]. Партыйна-савецкае кіраўніцтва Беларусі не палічыла мэтазгодным звярнуць на гэта ўвагу. Да таго

---

[1226] *Мазец В.Г.* Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў БССР у 1945–1991 гг. і яе ўплыў на нацыянальную самасвядомасць // Человек. Цивилизация. Культура: IX Межвуз. науч.–теорет. конф.: тэзисы докл. Минск, 2004. С. 22.

[1227] Там жа. С. 22–23.

[1228] Наогул, аб гэтым нічога не гаварылася на сесіях ВС БССР у перыяд 1973–1988 гг. Сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Стэнаграфічныя справаздачы. Мінск, 1972–1989.

[1229] Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР восьмага склікання 22–23 чэрвеня 1972 года. Стэнаграфічная справаздача. Мінск, 1972. С. 108.

[1230] Там жа. С. 175.

ж у Беларусі не было нацыянальных школ (беларускія не ўлічваліся). Літоўская мова ў месцах кампактнага пражывання літоўцаў у Гродзенскай вобласці выкладалася ў пачатку 1970-х гадоў у трох школах[1231].

Менавіта ў гарадах, паводле меркавання даследчыкаў, найбольш хуткімі тэмпамі ішоў працэс рускамоўнай асіміляцыі прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей у Беларусі. Так, згодна перапісу 1979 г., рускую мову, акрамя 1116,5 тыс. рускіх, назвалі роднай у гарадах 54,5 % украінцаў, 55 % армян, 56 % латышоў, 80,3 % яўрэяў[1232]. Гэтаму спрыяў кадравы склад народнай адукацыі. Для прыкладу, прааналізуем яго ў Віцебскай вобласці на 1980 г. (гл. табліцу 53).

Зыходзячы са справаздачных дакументаў і нацыянальнага складу Віцебскага інстытута ўдасканалення настаўнікаў сярод прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей пераважалі асобы рускай нацыянальнасці. Нягледзячы на гэта, носьбітамі русіфікацыі ў сістэме адукацыі з большага з’яўляліся настаўнікі-беларусы, якія паслухмяна выконвалі партыйныя ўказанні па інтэрнацыяналізацыі адукацыі на базе рускай мовы.

Табліца 53 – Нацыянальны склад спецыялістаў сістэмы народнай адукацыі Віцебскай вобласці на 14.11.1980 г.[1233]

| **Структура** | **Адукацыя** | **Усяго** | **Нацыянальныя меншасці** | |
|---|---|---|---|---|
| | | | **%** | **Лік** |
| Школы | Вышэйшая | 12241 | 17,4 | 2135 |
| | Сярэдняя спецыяльная | 3964 | 14,4 | 573 |
| Апарат раённых і гарадскіх аддзелаў народнай адукацыі | Вышэйшая | 126 | 15,1 | 19 |
| | Сярэдняя спецыяльная | – | – | – |
| Інстытут удасканалення настаўнікаў | Вышэйшая | 41 | 51,2 | 21* |
| | Сярэдняя спецыяльная | 2 | – | – |

На 14.11.1980 г. у Віцебскай вобласці працавалі спецыялісты з вышэйшай педагагічнай адукацыяй у сферы народнай адукацыі ў колькасці 11126 чалавек. З іх мелі спецыяльнасць “Руская мова і літаратура” 1590 чалавек, а спецыяльнасць “Беларуская мова і літаратура” толькі 758 асобаў[1234]. З канца 1970-х гг. у сярэдніх

[1231] Інфармацыйны ліст Гродзенскага аблвыканкама ў ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4089. Арк. 55 ; Школы, матэрыялы школьных праверак, даклады інспектараў 1970/1971 н.г. Міністэрства адукацыі Літоўскай ССР // LCVA. Ф. R–762. Воп. 6. Спр. 2480. Арк. 2–97 ; Школы, матэрыялы школьных праверак, даклады інспектараў. Міністэрства адукацыі Літоўскай ССР // Там жа. Спр. 2396. Арк. 2–137 ; Перапіска з Міністэрствам адукацыі ССР наконт дзейнасці школ, працэса адукацыі і г.д. 1970-я гг. Міністэрства адукацыі Літоўскай ССР // Там жа. Спр. 2473. Арк. 1–256.

[1232] *Мазец В.Г.* Нацыянальна-дзяржаўная палітыка ў БССР у 1945–1991 гг. і яе ўплыў на нацыянальную самасвядомасць. С. 129–130.

[1233] Падлічана па: Зводнай справаздачы // ДАВц. Ф. 2797. Воп. 14. Спр. 608. Арк. 18–76.

* З агульнай колькасці: рускіх – 19, яўрэяў – 2.

[1234] Падлічана па: Інфармацыйнай справаздачы // Там жа. Арк. 12.

спецыяльных педагагічных установах індустрыяльнага профілю ўводзіўся спецыяльны прадмет "Удасканаленне ведаў рускай мовы". Гэта было вынікам рэалізацыі пастановы сакратарыята ЦК КПСС "Аб удасканаленні вывучэння і выкладання рускай мовы ў саюзных рэспубліках" (29.08.1978 г.), а таксама пастановы ЦК КПСС і СМ СССР (26.05.1983 г.) аб дадатковых мерах па паляпшэнні вывучэння рускай мовы ў навучальных установах саюзных рэспублік[1235].

З усяго вышэйсказанага зразумела, чаму даследаванне 1989 г. паказала, што рускія, украінцы, палякі, яўрэі і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, якія жылі ў БССР, выбіралі дзве мовы: беларускую і рускую (маецца на ўвазе мова навучання ў школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах, мова друку і інш.), з перавагай рускай мовы (гл. дадаткі С і Т).

Імкненне ўладаў СССР да поўнай саветызацыі і русіфікацыі рабілі вельмі сумніўнымі перспектывы захавання і развіцця польскай, татарскай, яўрэйскай, літоўскай, украінскай і іншых культур на беларускай зямлі. Перад усімі народамі паўставала задача: змірыцца з наяўным становішчам ці пайсці па шляху адраджэння. Новыя ўмовы для развіцця нацыянальных супольнасцей адкрыла хваля нацыянальна-культурнага адраджэння часоў "перабудовы" у СССР, стварыўшая магчымасць аднаўлення ўсяго таго, што было згублена ў ранейшыя гады.

### 5.4 Дзейнасць ва ўмовах дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця і абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту

Страта нацыянальных традыцый, русіфікацыя хвалявала лепшых прадстаўнікоў эліты нацыянальных меншасцей БССР. Толькі з пачаткам правядзення дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне стала магчымым стварэнне ўмоў для адраджэння культурнага і грамадска-палітычнага развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі.

З другой паловы 1980-х гг. грамадскі быт нацыянальных меншасцей Беларусі пад уздзеяннем палітычных і сацыяльных фактараў інтэнсіўна трансфармуецца. Зніжаецца ўзровень грамадскай актыўнасці насельніцтва, звязанай са старымі формамі: удзел у сацыялістычным спаборніцтве, у грамадскай рабоце працоўнага калектыву, святочных дэманстрацыях і шэсцях, масавых урачыстых мерапрыемствах. Нацыянальныя пачуцці, грамадская актыўнасць значнай часткі насельніцтва скіроўваюцца на адраджэнне і захаванне традыцыйнай культуры.

На працэс актывізацыі дзейнасці і нацыянальнай ідэнтычнасці вельмі моцна паўплывала палітыка "перабудовы". Кажучы ў Фарным касцёле г. Гродна аб абнаўленні жыцця ў Хрысце, кс. Тадэуш Кандрусевіч (сёння глава рымска-

[1235] Пастанова № 122/1с ад 29.08.1978 г. Сакратарыята ЦК КПСС "Аб далейшым удасканаленні вывучэння і выкладання рускай мовы ў саюзных рэспубліках" (з прынятымі папраўкамі). Зацверджана Палітбюро ЦК КПСС 31.08.1978 г. Пратакол № 119/V // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 23. Спр. 13. Арк. 1–6 ; Спр. 31. Арк. 1–7 ; Копія запіскі аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПСС, інфармацыя ЦК КП саюзных рэспублік, абкамаў партыі, міністэрстваў аб выкананні пастановы ЦК КПСС і СМ СССР ад 26.05.1983 г. аб дадатковых мерах па паляпшэнню вывучэння рускай мовы ў навучальных установах саюзных рэспублік (1984) // Там жа. Ф. 5. Воп. 90. Спр.185. Арк. 1–97.

каталіцкай царквы ў Беларусі) падкрэсліў: “Перабудова, дэмакратызацыя, галоснасць, якія ажыццяўляюцца ў нашай краіне, адкрылі такі шырокі прастор для дзейнасці царквы. Маліцеся за перабудову, ня бойцеся цяжкасцяў, працуйце сумленна, нястомна”[1236].

**Стварэнне і дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў.** Важнае значэнне мае працэс стварэння і дзейнасці ў Беларусі нацыянальных грамадскіх арганізацый, якія згуртавалі людзей, аб’яднаных агульнымі інтарэсамі. Добраахвотныя аб’яднанні прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей ствараліся для сумеснай рэалізацыі праграмы альбо для дасягнення пэўнай мэты, дзейнічалі на падставе пэўных правілаў і працэдур, развівалі актыўнасць і самадзейнасць асоб, задавальнялі іх запатрабаванні і інтарэсы. Іх работа мела непасрэдны ўплыў на грамадскае і культурнае жыццё рэспублікі.

Першыя грамадскія арганізацыі нацыянальных меншасцей узніклі ў канцы 1980-х гг. У маі 1987 г. быў створаны і 13.12.1987 г. зарэгістраваны клуб аматараў польскай культуры ў Лідзе, дарэчы па ініцыятыве А. Сямёнава, які быў рускім па нацыянальнасці[1237]. У 1988 г. у г. Гродна пры абласным аб’яднанні савецкага фонду культуры было створана Гродзенскае абласное польскае культурна–асветнае таварыства імя А. Міцкевіча з секцыяй у г. Ліда. Мэтай таварыства з’яўлялася прапаганда польскай мовы і культуры, наладжванне і падтрымка сувязей з грамадскімі аб’яднаннямі ў ПНР. У студзені 1989 г. створана таварыства польскай культуры ў г. Ваўкавыску, аддзяленні таварыства савецка–польскага сяброўства ў Бераставіцкім і Воранаўскім раёнах. Стала прыкметнай актыўнасць татарскай абшчыны ў г. п. Іўе, якая арганізацыйна далучылася да “Саюза літоўскіх татар”, які дзейнічаў пры Літоўскім фондзе культуры. “Саюз літоўскіх татар” ставіў задачу вывучэння гісторыі і культуры татар, якія жылі на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Польшчы. На сярэдзіну 1990 г. у БССР дзейнічалі 11 нацыянальных культурна-асветных таварыстваў і аб’яднанняў[1238].

Да асобных раёнаў Гродзенскай вобласці, асабліва Воранаўскаму і Астравецкаму, праяўлялі прыкметны інтарэс нацыяналістычна настроеныя асобы з Літвы. Яны спрабавалі выклікаць у мясцовага літоўскага насельніцтва незадавальненне ўмовамі жыцця ў БССР і імкненне далучыцца да Літвы[1239]. У БССР было створана грамадскае аб’яднанне (ГА) “Беларуская абшчына літоўцаў”. Яно выступіла заказчыкам будаўніцтва Літоўскага нацыянальнага культурнага цэнтра на сродкі Літвы, якое пачалося 18.09.1990 г. у в. Рымдзюны Астравецкага

[1236] Інфармацыйныя лісты аддзела Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР (1988) // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 4080. Арк. 40.
[1237] *Maszkiewicz Mariusz.* Repatriacja czy repatriotyzacja? Wybrane problemy polskich strategii politycznych wobec rodaków wschodnią granicą (1986–1990). Wojnowice, 2017. S. 105 ; *Gawin Tadeusz.* Odrodzenie polskiego życia narodowego w BSRR. Organizacje, Kościół katolicki, szkolnictwo // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 401–402 ; *Bobryk Adam.* Społeczne uwarunkowania funkcjonowania oświaty w języku polskim na Białorusi (1988–2017) // Там жа. S. 485.
[1238] Запіска ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 156. Спр. 775. Арк. 14.
[1239] Інфармацыйны ліст // НАРБ. Ф. 4 п. Воп.156. Спр. 612. Арк. 55–56.

раёна Гродзенскай вобласці[1240]. Аб’яднанне займалася адкрыццём нядзельных школ, стварэннем інфармацыйнага цэнтра, пабудовай школы і культурнага цэнтра літоўцаў, выездам літоўскіх дзетак у Літоўскую рэспубліку на экскурсіі, правядзеннем семінараў па адукацыйных праблемах, стварэннем гурткоў мастацкай самадзейнасці[1241].

Пачаткам адраджэння дзейнасці грамадскіх арганізацый яўрэяў можна лічыць працу групы міласэрнасці ў Доме інвалідаў у Дражні ў 1989 г., якая аказвала дапамогу адзінокім яўрэям і ляжачым інвалідам усіх нацыянальнасцей. У пачатку 1989 г. было створана Мінскае таварыства яўрэйскай культуры, у красавіку 1991 г. – Беларускае аб’яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын (БАЯАіА). Сярод яўрэйскіх грамадскіх арганізацый апошняе было найбольш вядомым і пазней злучыла 135 арганізацый і суполак з 18 гарадоў Беларусі. Яно было створана з мэтай адраджэння яўрэяў Беларусі як нацыянальнай, так і культурнай супольнасці, іх кансалідацыі. За час свайго існавання аб’яднаннем адкрыты 14 нядзельных школ па вывучэнню мовы і культуры яўрэйскага народа, дзве агульнаадукацыйныя школы (у Мінску і Магілёве).

Прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці грамадскіх яб’яднанняў яўрэйскай супольнасці былі дабрачынная, асветніцкая і культурная. Характэрным для любога яўрэйскага культурна-асветніцкага аб’яднання Беларусі было арганізоўваць працу сярод сваіх суайчыннікаў па інтарэсах і ўзроставых (палавых) адзнаках. Асобныя лідары і актывісты яўрэйскага руху, шляхам стварэння вялікай колькасці align рознага роду аб’яднанняў і клубаў, імкнуліся забяспечыць яўрэйскую прысутнасць у рэгёнах і краіне.

Вялікае значэнне для захавання і развіцця культуры яўрэйскага насельніцтва мела рэлігія. Улады Беларусі ставіліся з разуменнем да патрэб вернікаў іўдзеяў і, па магчымасці, вярталі іх рэлігійныя каштоўнасці. Так, былі вернуты сінагогі ў Гродна і Слоніме, дзве сінагогі працавалі ў Пінску. Варта адзначыць фактары, якія замінаці дзейнасці яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і негатыўна ўплывалі на працэс фарміравання грамадзянскай і нацыянальнай згоды: не ва ўсіх гарадах Беларусі яўрэям вярнулі рэлігійныя будынкі, не было ніводнай яўрэйскай агульнаадукацыйнай школы, не знайшлі асоб, якія апаганьвалі яўрэйскія пахаванні на могілках.

Восенню 1989 г. ўзніклі першыя татарскія культурна–асветныя таварыствы ў Мінску і Гродна. Згодна пэўнай інфармацыі грамадскае аб’яднанне татар г. Гродна дзейнічала пад рознымі назвамі з 1988 г. (тады – пры гарадскім фондзе культуры). Сябры (члены) аб’яднання ўваходзілі ў склад Беларускага грамадскага аб’яднання татар “Зікр-Уль-Кітаб”. Асноўны кірунак дзейнасці – культурна-

[1240] 18.03.2001 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах. На ім прысутнічалі адказныя дзяржаўныя асобы з Беларусі і Літвы. Праграма адкрыцця літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах // LVNA. Ф. 78. Воп. 1. Спр. 163. Арк.17–18.

[1241] Інфармацыйны ліст РГА “Беларуская абшчына літоўцаў” аб прароблენай працы // Там жа. Арк. 6–7, 13–14, 22.

асветніцкі. Удзельнічалі ў фестывалях нацыянальных культур, стварылі ансамбль, функцыяніравала школа выхаднога дня[1242].

Вядомы даследчык гісторыі татарскага народа ў Беларусі І. Канапацкі наступным чынам апісваў тагачасныя падзеі: "Рэвалюцыйныя хвалі, змрочныя, цяжкія гады сталінскіх рэпрэсій парушылі паступовы ход развіцця татарскай культуры. Многія прадстаўнікі нацыі, баючыся, што іх можа напаткаць лёс крымскіх татар, з'ехалі ў Польшчу, ЗША, Аўстралію, Турцыю, краіны Заходняй Еўропы. Сярод іх было шмат інтэлігенцыі, духоўных асоб. Адвечныя традыцыі літоўскіх татар сталі забывацца, што яшчэ больш узмацніла заняпад нацыянальнай культуры, садзейнічала раз'яднанню народа. Неабходна было захаваць спадчыну літоўскіх татар для нашчадкаў. Аб гэтым вялася гаворка на сходах прадстаўнікоў беларускіх татар у Мінску і Гродна восенню 1989 года. Тады ж узніклі татарскія абласныя грамадска–культурныя аб'яднанні. 23 чэрвеня 1991 года на свяце Курбан–Байрам у Іуі, дзе прысутнічалі шматлікія пасланцы з усіх раёнаў і абласцей Беларусі, было вырашана стварыць рэспубліканскае згуртаванне татар-мусульман на Беларусі "Аль-Кітаб". Аднадушна абралі кіраўніцтва – прэзідэнтам стаў Абу-Бякір Шабановіч – дырэктар Мінскай гімназіі"[1243].

Татарскія аб'яднанні, як і іншыя, сутыкаліся з наступнымі праблемамі ў сваёй дзейнасці: недастатковае фінансаванне, унутраныя расколы, непаслядоўная палітыка дзяржавы, зніжэнне этнічнай самасвядомасці татар у гады савецкай улады, рост працэсаў іх асіміляцыі і г.д. На думку саміх татар – галоўным сродкам іх самазахавання з'яўлялася рэлігія – іслам.

Татарская культурна-асветніцкая суполка "Аль–Кітаб" звярталася да дзяржаўных устаноў з шэрагам цікавых прапаноў. У тым ліку і аб адкрыцці аддзялення татаразнаўства пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, каб весці падрыхтоўку спецыялістаў. Пытанне падрыхтоўкі кадраў паступова вырашалася шляхам мэтавага накіравання моладзі татарскага паходжання ў ВНУ, як Беларусі, так і Татарстана. "Аль-Кітаб" праводзіла сур'ёзную работу па арганізацыі вывучэння крымска-татарскай і арабскай моў[1244].

Ад першых дзён татарскага адраджэння яго дамінантай стаў рэлігійны фактар. У 1990 г. была адноўлена мусульманская абшчына г. Мінска[1245]. На той час калі распачалося татарскае адражэнне ў Беларусі з 19-ці даваенных мячэцяў заставалася толькі адна – у Іўі (у 2002 г. яна адзначыла сваё 120-годдзе)[1246].

У 1991 г. актывісты "Аль-Кітаб" (І. Александровіч, Я. Гучок, І. Канапацкі, Т. Якубоўскі, Д. Чамбаевіч і інш.) на чале з Т. Якубоўскім упершыню ў гісторыі татар Беларусі пачалі выдаваць на беларускай мове часопіс – штоквартальнік "Байрам. Татары на зямлі Беларусі" (усяго за час існавання часопіса было

---

[1242] *Пушкін І.А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.). Магілёў, 2007. С. 140.

[1243] *Думін С.У., Канапацкі І.Б.* Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993. С. 201.

[1244] *Касовіч В.Ф.* Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцяў у Рэспубліке Беларусь // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ стагоддзі. С. 166.

[1245] *Канапацкий И.* Печальный юбилей. К 100-летию второй Минской мачети // Жизнь. 2002. нояб. С. 6.

[1246] *Канапацкі І.* Татары-мусульмане ў Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2004. № 7. С. 46 ; *Гембіцкая М.* Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2005. № 11. С. 39.

выдадзена на беларускай мове 43 нумары, аб'ём кожнага – 100–120 старонак). Мэты часопіса – абуджэнне самасвядомасці татарскага народа, асвятленне культурнай і гістарычнай спадчыны, абмен поглядамі, думкамі, прапановамі наконт шляхоў адраджэння татарскага этнаса і ісламa[1247].

На жаль, як і іншыя нацыянальныя супольнасці Беларусі, татарскія аб'яднанні праводзілі свае мерапрыемствы на рускай мове. Муфцій І. Александровіч так ахарактарызаваў моўную сітуацыю сярод татараў у сваім інтэрв'ю газеце "Звязда": "Беларусь мы лічым сваёй другой радзімай, сваю мову мы згубілі і раней размаўлялі толькі на беларускай, зараз размаўляем на рускай і польскай... За ўсю гісторыю татар на гэтай зямлі не было ніводнага канфлікту паміж мусульманамі і карэнным насельніцтвам. І зараз няма ніякага працістаяння... Сёння ў нас вялізнае поле дзейнасці – асветніцтва. Пасля атэістычнага перыяду людзі забыліся на духоўнасць... Спадзяёмся, што нашчадкі беларускіх татар прыйдуць у іслам"[1248].

У лютым 1990 г. стварылася таварыства "Палонія", якое было зарэгістравана аддзелам культуры Мінгарвыканкама. 16.06.1990 г. на ўстаноўчым з'ездзе была створана рэспубліканская арганізацыя – Саюз палякаў Беларусі (СПБ), які выступаў у ролі прадстаўніка інтарэсаў польскай нацыянальнай меншасці ў БССР[1249].

Галоўнай мэтай таварыства "Палонія" было адраджэнне польскай мовы і культуры сярод польскага насельніцтва Беларусі. У якасці практычных задач ажыццяўлялася адкрыццё польскамоўных школ і класаў, ствараліся бібліятэкі, арганізоўваліся харавыя і танцавальныя калектывы, вялася праца па ахове помнікаў, звязаных з жыццём славутых дзеячоў польскай гісторыі і культуры ў Беларусі, рабілася ўпарадкаванне могілак і г.д. У школе № 1 г. Мінска былі адкрыты два польскамоўныя класы, дзейнічалі курсы па вывучэнню польскай мовы для дзяцей і дарослых, сабралі вялікую колькасць кніг для польскай бібліятэкі. Таварыствам была праведзена значная праца па адкрыццю ў Дзяржаўным музеі гісторыі і культуры Беларусі выставы твораў польскіх мастакоў, выставы твораў фотакарэспандэнтаў "Газеты Выборчай", зроблены намаганні па выданню польскамоўнай газеты, арганізацыі дзіцячага польскага хору. Кожны год на фестывалі ў Польшчу выязжалі фальклорныя калектывы, якія прадстаўлялі палякаў Мінска. У Таварыства былі трывалыя сувязі з беларускім радыё, дзе некалькі год існавала перадача "Супольнасць"[1250].

ГА "Саюз палякаў Беларусі" ухваліў сваёй галоўнай задачай адраджэнне культурных традыцый, адукацыі і нацыянальнай самасвядомасці палякаў. З

---

[1247] *Орда О.А.* Роль СМИ в возрождении культуры татар Беларуси // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., 8–9 декабря 2005 г., Гродно. Гродно, 2006. С. 424–425.

[1248] *Мядзведзева В.* "Нельга дапусціць працістаяння рэлігій" // Звязда. 2001. 12 кастр. С. 2.

[1249] *Gawin Tadeusz.* Odrodzenie polskiego życia narodowego w BSRR. Organizacje, Kościół katolicki, szkolnictwo / Tadeusz Gawin // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 401–411 ; *Яго ж.* Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności. Białystok, 2007. S. 87–114.

[1250] *Пушкін І. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.). С. 75.

самага пачатку члены саюза паводзілі сябе вельмі актыўна. Яны пісалі петыцыі, выстаўлялі пікеты каля абласных і раённых выканкамаў, настойлівалі на сваіх патрабаваннях, шчыльна супрацоўнічая с каталіцкай царквою. У прыватнасці, яны настойлівалі на прызнанні таго, што ўсе касцёлы на тэрыторыі Гродзеншчыны – памятнікі польскай культуры. У Лідзе быў пастаўлены помнік А. Міцкевічу, у Вілейке – памятнік легіянерам Ю. Пілсудскага. Прыкладаліся намаганні аб’яднаць дэпутатаў–палякаў у Вярхоўным Савеце XII склікання (іх было каля 30), але з гэтага нічога не атрымалася[1251]. Можна адзначыць вялікія намаганні і значныя дасягненні польскіх актывістаў у сферы адраджэння польскамоўнай адукацыі ў нашай краіне[1252].

Прадстаўнікі нямецкай нацыянальнасці ў Беларусі стварылі сваё першае таварыства ў Мінску ў 1990 г., калі было зарэгістравана Мінскае гарадское грамадскае аб’яднанне “Цэнтр нямецкай культуры “Відэргебурт” (Адраджэнне)[1253]. Яно планавала рэалізаваць маштабныя праекты па адраджэнню, захаванню і развіццю культурных традыцый немцаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, садзейнічанню вывучэнню нямецкай мовы і развіццю сяброўства паміж беларускім і нямецкім народамі.

У Брэсцкай вобласці ў перыяд дэмакратызацыі грамадскага жыцця сталі ўзнікаць грамадскія арганізацыі ўкраінцаў. Першым было створана ў студзені 1991 г. рэспубліканскае Беларускае грамадскае аб’яднанне ўкраінцаў “Ватра”. Украінскія грамадскія аб’яднанні Беларусі праводзілі значную культурна-асветніцкую работу, захоўваючы нацыянальныя традыцыі і культуру ў асяродку сваёй нацыянальнай супольнасці і прапагандуючы яе сярод насельніцтва Беларусі.

Захаваннем традыцый латышскага насельніцтва Віцебшчыны займаўся “Саюз латышоў Віцебскай вобласці “Даугава”. Пры яго актыўным удзеле праводзіліся традыцыйныя Дні Латвіі ў Віцебску. Пры консульстве Латвіі ў Віцебску працавала нядзельная школа, дзе дзеці вывучалі латышскую мову, традыцыі і культуру; была арганізавана выстава маладых латышскіх мастакоў. Неабходна асабліва адзначыць пазіцыі Літвы і Латвіі ў справе падтрымкі сваіх дыяспар. Гэтыя дзяржавы мэтанакіравана спрыялі школьнай адукацыі на роднай мове, накіроўвалі выкладчыкаў з Латвіі і Літвы, падтрымлівалі любую сферу культуры, дзе пераважала балтамоўнае насельніцтва.

Напрыканцы 1980-х гг. у Беларусі паўстала праблема нацыянальнага вывучэння Палескага рэгіёну. З’явіўся рух за прызнанне існавання заходне-палескай этнічнай групы (Ятвязі). Было ўзнята гэтае пытанне і на пасяджэнні камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнародных адносінах Вярхоўнага Савета XII склікання. 20.05.1991 г. разглядалася пытанне “Аб статуце і праграме грамадска-культурнага аб’яднання “Полісье”. Статут быў зацверджаны III Вальным зборам аб’яднання 14.04.90 г. Згодна яго, асноўная мэта аб’яднання – садзейнічанне этнакультурнаму адраджэнню Заходняга Палесся (Ятвязі).

[1251] Национально–государственные интересы Республики Беларусь. Минск, 1999. С. 241–242.
[1252] *Gawin T.* Związek Polaków na Białorusi 1988–2005. Historia działaności. Białystok, 2007. S. 120–128.
[1253] *Пушкін І. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.). С. 108.

Са зместу бачна, што гэтая частка Беларусі разглядалася, як асобны край. У Статуце добра прасочваліся сепаратысцкія настроі. На пасяджэнні частка дэпутатаў выказала заклапочанасць тым, што дзейнасць таварыства ініцыіраваная зверху, стварала нацыянальную напружанасць у рэспубліцы, вяло да дэстабілізацыі міжнацыянальных адносін[1254]. Безпаспяховымі засталіся спробы некаторых асоб раскалоць Беларусь па этнічнай прыкмеце.

**Адраджэнне самасвядомасці і стварэнне нацыянальных школ.** У 1986–1990 гг. асаблівую ролю ў справе духоўнага і культурнага адраджэння польскага насельніцтва ў Беларусі адыграла дзейнасць рымска-каталіцкага касцёла[1255]. З канца 1988 і на працягу 1989 гг. у саюзныя кіруючыя органы і ЦК КПСС былі накіраваны дзесяткі лістоў і калектыўных заяў вернікаў з Ліды і Смаргоні Гродзенскай вобласці, Гомеля, Браслава Віцебскай вобласці і іншых месцаў аб рэгістрацыі каталіцкіх рэлігійных аб’яднанняў. 07.04.1989 г. католікі г. Ашмяны Гродзенскай вобласці каб вырашыць пытанне аб рэгістрацыі рэлігійнага аб’яднання звярнуліся на Цэнтральнае тэлебачанне СССР у праграму “Прожектор перестройки”. У выніку за 11 месяцаў 1989 г. аднавілі дзейнасць 20 зарэгістраваных касцёлаў. Пад час святкавання “Пасхі” у касцёлах было каля 130 тыс чалавек, што на 30 тыс. больш, чым у 1988 г.[1256]

Аналіз зваротаў вернікаў БССР дазваляе прасачыць іх нацыянальную самасвядомасць. Напрыклад, 26.04.1985 г. паступіла заява вернікаў в. Дарава Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў Савет па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР. Ад імя каталіцкага таварыства яго падпісалі 7 асоб. З іх: Б. Марчык, М. Адаська, Б. Пятроўка, Г. Янкоўская паставілі свае подпісы на польскай мове[1257]. Да пачатку 1989 г. ва ўсіх лістах вернікаў БССР да мясцовых і цэнтральных уладаў гаворка ішла толькі аб вяртанні касцёлаў і рэгістрацыі рэлігійных аб’яднанняў, ніякіх згадак пра нацыянальнасць не было. Аднак гэтыя звароты рыхтавалі глебу і паспрыялі нацыянальнаму адраджэнню.

Адзначаючы канструктыўную працу па адраджэнні і захаванні нацыянальных адметнасцей, варта адзначыць, што адначасова нярэдка ксяндзы ўмешваліся ў палітычнае жыццё рэспублікі, навязвалі насельніцтву думку аб “польскіх землях на ўсходзе”, фарміравалі адпаведныя настроі, праводзілі ідэю кансалідацыі вакол паланійных суполак і касцёла, як адзіных выразнікаў польскай меншасці. Так, ксяндзы Л. Станішэўскі (г.п. Рось, в. Гнёзна Ваўкавыскага раёна), С. Бартошак (г. Гальшаны Ашмянскага раёна), Я. Казак (в. Макараўцы Бераставіцкага раёна) у казаннях і прыватных гутарках з

[1254] Пратакол № 28 камісіі // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4090. Арк. 107–124.

[1255] *Maszkiewicz Mariusz.* Repatriacja czy repatriotyzacja? Wybrane problemy polskich strategii politycznych wobec rodaków wschodnią granicą (1986–1990). S. 329.

[1256] Ліст загадчыка аддзела Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР // ДАРФ. Ф. Р-6991. Воп. 6. Спр. 4080. Арк. 1, 6, 17–18 ; Ліст старшага інспектара аддзела Савета па справах рэлігійных культаў пры СМ СССР // Там жа. Арк. 13 ; Ліст у Савет па справах рэлігій пры СМ СССР ад 12.05.1989 г. аб святкаванні “Пасхі” 1989 г. у рэлігійных аб’яднаннях, якія дзейнічалі ў БССР // Там жа. Арк. 39.

[1257] *Пушкін І. А.* Дакументы па гісторыі нацыянальных супольнасцей Беларусі 1980–1990-х гг. у цэнтральных архівах Расійскай Федэрацыі // Архівы і справаводства. 2014. № 3. С. 129–130.

вернікамі давалі зразумець, што Заходняя Беларусь – гэта польская тэрыторыя і яна рана ці позна адыйдзе да Польшы[1258].

Захаванне родных моў нацыянальнымі супольнасцямі Беларусі, у тым ліку палякамі, знайшло сваё адлюстраванне ў матэрыялах да пастановы ЦК КПСС і інармацыйным лісце ад 05.02.1987 г. сакратара ЦК КПБ В. Пячэнікава ў ЦК КПСС аб прынятых мерах па вырашэнні пытанняў, узнятых у лістах беларускіх пісьменнікаў і работнікаў культуры[1259]. 10.03.1987 г. адбылося пасяджэнне сакратарыята ЦК КПСС, на якім, сярод іншага, разглядалася пытанне "Аб лістах пісьменнікаў, артыстаў і навукоўцаў БССР па пытаннях развіцця нацыянальнай мовы і культуры"[1260]. Настойлівыя дамаганні інтэлігенцыі Беларусі аб садзейнічанні развіццю беларускай і іншых нацыянальных культур у рэспубліцы нарэшце зварушылі тагачаснае кіраўніцтва БССР. Адбываюцца шэраг сустрэч прадстаўнікоў грамадскасці з уладамі. 27.07.1988 г. кіраўніцтва ЦК КПБ з прадстаўнікамі інтэлігенцыі БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, мовы[1261]. 17.11.1988 г. кіраўніцтва ЦК КПБ з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, працы творчых саюзаў, дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў і інш.[1262]

З усіх нацыянальных супольнасцей Беларусі ў савецкі час толькі літоўцы мелі сваю школу ў Гродзенскай вобласці, калі не ўлічваць школы з рускай мовай навучання. Палякі ў Беларусі на працягу некалькіх пасляваенных дзесяцігоддзяў былі пазбаўлены магчымасці атрымаць адукацыю на роднай мове. Гэта прыводзіла да паскарэння працэсу асіміляцыі і радыкальнага абмежавання функцыянавання польскай мовы як у публічнай сферы, так і ў прыватнай. Таму адным з галоўных пастулатаў польскага адраджэння было стварэнне школ з польскай мовай навучання[1263]. У 1987 г. сталі паступаць у Міністэрства адукацыі масавыя звароты грамадзян Беларусі польскай нацыянальнасці аб вывучэнні іх дзецьмі ў школах польскай мовы і літаратуры. У тым жа годзе Міністэрства асветы БССР разгледзела пытанне пра магчымасць вывучэння польскай мовы ў шэрагу агульнаадукацыйных школ рэспублікі і накіравала адпаведную інфармацыю ў ЦК КПБ і СМ БССР[1264].

Пачатак навучання дзяцей польскай мове быў пакладзены ў Гродзенскай

---

[1258] "Аб святарах каталіцкага культу ў рэспубліцы". Ліст старшыні савета па справах рэлігіі пры СМ Беларусі ў Вярхоўны Савет і СМ ад 27.12.1991 г. // НАРБ. Ф. 136. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 12–13 ; Ліст СМ РБ № 12/89 ад 17.04.1992 г. "Аб узмацненні кантролю за выкананнем замежнымі святарамі дзеючага ў Рэспубліцы Беларусь заканадаўства" // НАРБ. Ф. 136. Воп. 3. Спр. 3. Арк. 147.

[1259] Матэрыялы да пастановы ЦК КПСС: лісты пісьменнікаў, артыстаў і вучоных БССР па пытаннях развіцця нацыянальнай мовы і культуры // РДАНГ. Ф. 89. Воп. 23. Спр. 37. Арк. 1–23.

[1260] Выпіска з пратакола № 42/4с ад 10.03.1987 г. пасяджэння Сакратарыяту ЦК КПСС "Аб лістах пісьменнікаў, артыстаў і навукоўцаў БССР па пытаннях развіцця нацыянальнай мовы і культуры" // Там жа. Спр. 17. Арк. 1–10.

[1261] Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі інтэлігенцыі БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, мовы. 27.07.1988 г. // НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1167. Арк. 2.

[1262] Стэнаграма сустрэчы ў ЦК КПБ з прадстаўнікамі Саюза пісьменнікаў БССР па пытаннях нацыянальнай культуры, працы творчых саюзаў, дзейнасці Народнага фронту, Мартыралога Беларусі і інш. 17.11.1988 г. // Там жа. Спр. 1168. Арк. 1.

[1263] *Bobryk Adam.* Społeczne uwarunkowania funkcjonowania oświaty w języku polskim na Białorusi (1988–2017) // Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich. S. 483–485.

[1264] *Мазец В.* Асіміляцыя нацыянальных меншасцяў у БССР у 1945–1985 гг. як вынік дзяржаўна-нацыянальнай палітыкі. С. 211.

вобласці ў 1987–1988 навучальным годзе. На той момант яе вывучалі 11 вучняў Ласасноўскай СШ Гродзенскага раёна як прадмет. У 1988−1989 н. г. у гуртках польскую мову вывучалі 989 вучняў у 25 школах Гродзенскай вобласці. У наступным навучальным годзе ў вобласці дзейнічала наступная колькасць школ паводле мовы навучання: 184 на рускай мове (4575 класаў) з 120411 вучнямі; 564 на беларускай мове (4494 класа) з 40653 вучнямі; 26 на польскай мове (57 класаў) – 651 вучань; 3 на літоўскай мове (15 класаў) – 91[1265]. Польскую мову вывучалі 6330 вучняў у 135 школах вобласці, з іх 710 у 63 школах як самастойны прадмет, астатнія ў гуртках.

У 1990–1991 н.г. у Гродзенскай вобласці была 631 школа з адной мовай навучання (91256 вучняў). З іх з рускай мовай навучання – 80 школ (51337 вучняў), з беларускай − 551 (39919). Працавалі 105 школ з дзвюмя мовамі навучання (72604 вучня). У іх 68396 вучняў вучыліся на рускай мове, 4208 на беларускай. Акрамя таго было 192 школы (120060 вучняў), у якіх родная мова вывучалася як прадмет: беларуская мова – 175 школ (119248 вучняў), польская мова – 14 (711), літоўская мова – 3 (101). У 157 школах (6653 вучня) родная мова вывучалася факультатыўна ці ў гуртках: беларуская мова – 41 школа (859 вучняў), польская мова – 116 (5795)[1266].

У БССР польскую мову вывучалі ў 207 школах 9140 вучняў, з іх 1153 у 93 класах як прадмет, 7987 у гуртках. Былі задзейнічаны як выкладчыкі польскай мовы – 235 настаўнікаў[1267].

25.05.1990 г. на пасяджэнні бюро ЦК КПБ сярод іншых разглядалася пытанне "Аб стане падрыхтоўкі и перападрыхтоўкі выкладчыкаў і настаўнікаў польскай мовы ў Гродзенскай вобласці". З матэрыялаў да пасяджэння можна даведацца, што мову выкладалі 150 настаўнікаў, з іх было толькі 2 спецыялістамі. Было адзначана, што ў ГрДУ імя Я. Купалы ўтворана кафедра польскай філалогіі (5 чалавек). На філалагічным факультэце ўніверсітэта з 1989 г. былі адкрыты аддзяленні: рускай і польскай мовы, беларускай і польскай мовы і літаратуры, на якіх у 1990 г. навучалася 50 студэнтаў. Да таго ж у ВНУ Польшчы былі накіраваны на вучобу 56 выпускнікоў школ вобласці. Падкрэслівалася, што ўсе студэнты польскіх ВНУ з Гродзенскай вобласці падбіраліся польскім культурна-асветным таварыствам імя А. Міцкевіча. У 1989 г. у ВНУ Польшчы прайшлі стажыроўку 62 выкладчыкі польскай мовы школ вобласці. У школах для выкладання выкарыстоўваліся падручнікі, выдадзеныя ў Польшчы і Літве. У Гродзенскім і Ваўкавыскім педвучылішчах была распачата падрыхтоўка настаўнікаў пачатковых класаў з навучаннем на польскай мове[1268].

Міністэрства адукацыі і навукі пачало распрацоўваць вучэбныя планы, у якіх прадугледжвалася магчымасць вывучэння мовы нацыянальнай супольнасці або навучанне на гэтай мове. Навучальныя планы па польскай мове і літаратуры, па гісторыі польскага народа былі прааналізаваны, абмеркаваны і

[1265] Справаздача // ДАГр. Ф. 730 Воп. 2. Спр. 895. Арк. 3–4.
[1266] Там жа. Арк. 1–1 адв.
[1267] Інфармацыйны ліст Гродзенскага абкама КПБ у ЦК КПБ // НАРБ. Ф. 968. Воп. 1. Спр. 4089. Арк. 50–55.
[1268] Пратакол № 91 пасяджэння бюро ЦК КПБ // Там жа. Ф. 4 п. Воп. 160. Спр. 1078. Арк. 2–15.

ўдасканаленыя ў мясцовых органах адукацыі. Планы абмяркоўваліся з прадстаўнікамі нацыянальных суполак, іх прапановы, заўвагі ўлічваліся пры канчатковай дапрацоўцы гэтых дакументаў. З мэтай больш грунтоўнай і якаснай арганізацыі навучальнага працэсу ў класах з вывучэннем такіх моў, міністэрства супрацоўнічала з краінамі паходжання нацыянальных меншасцей Беларусі. З Польшчай было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў справе вывучэння польскай мовы ў нашай рэспубліцы. Былі створаны сумесныя кансультатыўныя камісіі па справах школы для беларускай меншасці ў Польшчы і польскай меншасці ў Беларусі.

**Высновы.** Грамадска-палітычныя, сацыяльныя працэсы другой паловы XX ст., урбанізацыя і міграцыйныя працэсы, інтэрнацыяналізацыя, навукова-тэхнічны прагрэс, якія не абапіраліся на адвечныя традыцыйныя каштоўнасці народа, прывялі да знікнення цэлых пластоў традыцыйнай культуры народаў Беларусі. Нацыянальна-грамадскую дзейнасць можна вызначыць як змаганне за стварэнне і існаванне нацыянальных школ, захаванне мовы, этнічнай свядомасці і сваёй рэлігіі.

За пасляваенныя дзесяцігоддзі савецкай улады былі атрыманы пэўныя здабыткі ў эканамічным жыцці і адукацыі нацыянальных меншасцей. У літаратуры і мастацтве, наогул у культуры, працягваўся моцны ідэалагічны ўціск. Вялікія памеры прыняла русіфікацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця беларускага народа: школьнай справы, падрыхтоўкі кадраў для розных галін гаспадаркі і культуры, выдавецкай справы, сродкаў масавай інфармацыі.

Культура нацыянальных меншасцей у Беларусі, за выключэннем рускіх, у 1950–80-я гг. не магла паўнавартасна развівацца і фактычна абмяжоўвалася пераважна сфераю рэлігійнага жыцця, дзе захоўваліся элементы традыцыйнай культуры. Але і гэтай сферы партыйна-савецкія ўлады БССР чынілі значныя перашкоды. Магчымасць выкарыстання ў культурным жыцці нацыянальных моў была зведзена да мінімуму. Партыйныя органы ў 1940–1980-я гг. імкнуліся падпарадкаваць свайму ўплыву і кантролю дзейнасць практычна ўсіх самадзейных аб’яднанняў насельніцтва, ахапіць сваім кіраўніцтвам усе асноўныя бакі іх арганізацыі і работы.

Нягледзячы на нястомнае змаганне з рэлігійнымі пачуццямі, камуністычным уладам не ўдалося выкараніць іх са свядомасці людзей. Візіты Яна Паўла II у Польшчу і іх трансляцыя праз польскія СМІ аказалі істотны ўплыў на вернікаў, на павышэнне іх актыўнасці і садзейнічалі росту нацыянальнай самасвядомасці палякаў і літоўцаў у Беларусі.

Нацыянальныя меншасці Савецкай Беларусі ў дазволеных партыяй межах і рамках прымалі ўдзел у партыйна-савецкім, гаспадарчым кіраўніцтве і ў большасці сваёй даволі актыўна ўдзельнічалі ў вырашэнні грамадскіх і культурна-асветніцкіх праблем, падтрымлівалі савецкую ўладу, што садзейнічала ўмацаванню беларускай і ўсёй савецкай дзяржаўнасці.

Грамадска-палітычныя і культурныя працэсы, якія адбываліся ў Беларусі ў 1986–1991 гг. далі адчувальны штуршок развіццю беларускай нацыянальнай

культуры і культуры нацыянальных меншасцей, гэта садзейнічала росту іх палітычнай і нацыянальнай свядомасці.

У некаторых дзяржаўных вучэбных і выхаваўчых установах у адпаведнасці з пажаданнямі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей было арганізавана вывучэнне шэрагу нацыянальных моў, навучанне і выхаванне на гэтых мовах. На базе агульнаадукацыйных школ, пазашкольных, клубных, бібліятэчных устаноў сістэм Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры былі ўтвораны школы, класы, факультатывы, гурткі па навучанню на роднай мове, даследаванню гісторыі і культуры нацыянальных супольнасцей. Адукацыйныя структуры з этнакультурным кампанентам забяспечваліся адпаведнымі падручнікамі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі, па магчымасці, Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і краінамі гістарычнага паходжання. У вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах была арганізавана падрыхтоўка кадраў для гэтых школ. У той жа час, у рэспубліцы не існавала поўнавартасных дзяржаўных нацыянальных школ (за выключэннем польскіх і літоўскіх, прычым у недастатковай колькасці).

Даволі значная частка нацыянальных меншасцей Беларусі праз дзейнасць у нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў дасягалі мэтаў нацыянальнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, пашырэння грамадскай актыўнасці насельніцтва Беларусі, абароны сваіх нацыянальных і грамадзянскіх правоў. Дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў была ў асноўным у культурна-асветніцкім кірунку. Сярод іншых вырашалі задачы выяўлення патрэб і праблем этнічных супольнасцей, абуджэння грамадзянскай самасвядомасці, развіцця патрыятызма і інш.

Дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў, створаных у апошнія гады існавання БССР, была сканцэнтравана пераважна ў гарадах. Яны былі нешматлікія па колькасці зарэгістраваных членаў аб’яднання, за выключэннем СПБ і шэрагу яўрэйскіх арганізацый, якія з’яўляліся найбольш актыўнымі. Узровень актыўнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый на ўсходзе быў ніжэй, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Некампактнасць пражывання нацыянальных меншасцей ва ўсходняй частцы Беларусі абумоўлівала нязначны ўплыў на насельніцтва гэтага рэгіёна НГА і памяншала верагоднасць узнікнення праблем у нацыянальных адносінах.

Стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных меншасцей садзейнічала фарміраванню грамадзянскай супольнасці і актывісцкага (грамадзянскага) тыпу палітычнай культуры ў насельніцтва Беларусі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У Беларусі за гады будаўніцтва сацыялізма (1919–1991) склалася этатысцкая палітычная культура, якая вырашала ўсе праблемы і здзяйсняла кантроль над палітычнымі працэсамі з дапамогаю толькі механізмаў дзяржаўнага рэгулявання. Партыйна-дзяржаўны апарат падпарадкаваў сабе грамадства, у тым ліку і нацыянальныя групы. Гэта перашкаджала свабодным праявам грамадскіх сіл. Тагачасная, пануючая ў краіне, ідэалогія грунтавалася на ідэях аб прынцыповай аднамернасці сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця грамадства. Гэтыя ідэі прадвызначылі выкараненне з грамадскага і культурна-асветніцкага жыцця магчымасцей выбару, любой альтэрнатывы, ініцыятывы, індывідуальнасці і г. д., адсюль курс на інтэрнацыяналізацыю і ліквідацыю нацыянальных асаблівасцей. У савецкі час беларускі народ паступова адхіляўся ад непасрэднага ўдзелу ў кіраванні справамі дзяржавы. Аднак у дазволеных правячай партыяй межах і рамках ён удзельнічаў у вырашэнні грамадска-палітычных, культурна-асветніцкіх і сацыяльна-эканамічных задач, што садзейнічала ўмацаванню беларускай савецкай дзяржаўнасці.

У выніку комплекснага аналізу грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці асноўных, у колькасным вымярэнні, груп нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі, на аснове вывучэння апублікаваных дакументаў і новых архіўных крыніц, упершыню ўведзеных у навуковы ўжытак, зроблены наступныя высновы:

1. Разглядаемы перыяд стаў важнай вехай у развіцці беларускага народа і фарміраванні прынцыпова новай сацыяльна-палітычнай сістэмы ў Беларусі. Ухваленне Канстытуцыяй БССР раўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей спрыяла грамадскаму і культурнаму жыццю народаў Савецкай Беларусі. У выніку назіралася высокая далучанасць значнай часткі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей да ўсіх сфер жыцця рэспублікі. За гады савецкай улады былі атрыманы важкія здабыткі ў эканамічным жыцці, культуры, адукацыі, кнігавыдавецкай справе, мастацтве нацменшасцей.

З першых дзён свайго існавання савецкая ўлада надавала важнае значэнне нацыянальнаму пытанню. Змест, формы і накіраванасць працы ў асяроддзі нацыянальных меншасцей з самага пачатку браліся пад строгі кантроль камуністычнай партыі (бальшавікоў). Прычым улада не ставіла мэтай адраджэнне ці замацаванне традыцыйных укладаў нацыянальных меншасцей. Асноўнай задачай нацыянальнай палітыкі з'яўлялася іх саветызацыя. Рэспубліканскія органы ўлады знаходзіліся пад кантролем цэнтральных органаў СССР і не маглі ў поўнай меры ўздзейнічаць на нацыянальныя працэсы. Нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР, якая фарміравалася не ў рэспубліцы, была накіравана на інтэрнацыяналізацыю, паступовую ліквідацыю нацыянальна-моўнай разнастайнасці, асіміляцыю і акультурацыю прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей. Тагачасная прапаганда

сцвярджала аб добраахвотнай і ўсвядомленай асіміляцыі этнічных груп, аднак факты не дазваляюць пагадзіцца з гэтым.

За міжваеннае дваццацігоддзе нацыянальная палітыка савецкай улады працярпела істотную трансфармацыю: ад прадастаўлення нацыянальна-культурнай аўтаноміі нацыянальным меншасцям да стыгматызацыі пэўных народаў і правядзення супраць іх шырокамаштабных рэпрэсій. Захаванне культур нацыянальных меншасцей на тэрыторыі БССР з’яўлялася састаўной часткай палітыкі беларусізацыі, якая станоўча паўплывала на працэс этнічнай ідэнтыфікацыі ўсіх нацыянальных супольнасцей. Таму самым насычаным і плённым перыядам адраджэння, захавання і рэалізацыі культурных і грамадскіх запатрабаванняў нацыянальных меншасцей былі 1920-я гг. У той час беларускі ўрад у цэлым праводзіў нацыянальную палітыку, якая адказвала інтарэсам асноўных груп нацыянальных меншасцей.

На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў нацыянальная палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР характарызавалася барацьбой супраць любых праяваў нацыянальнай самасвядомасці, а таксама супраць нацыянальных традыцый і звычаяў, пры дэклараванні клопату пра далейшы росквіт нацыянальных культур. Пры ўзмацненні манапольнага становішча камуністычнай партыі і яе ідэй пралетарскага інтэрнацыяналізму было заяўлена аб стварэнні наднацыянальнай сацыялістычнай супольнасці – савецкага народа, падкрэслівалася сяброўства і братэрства народаў пры найбольшай ролі рускага народа. З Канстытуцыі былі выкрэслены палажэнні аб дзяржаўнай мове. У выніку мэтанакіраванай нацыянальнай палітыкі ў БССР руская мова выціснула мовы нацыянальных меншасцей з грамадска-палітычнага жыцця і культурна-адукацыйнай сферы. Адбылася русіфікацыя літаральна ўсіх бакоў жыцця беларускага народа.

У шматнацыянальнай і шматканфесійнай краіне за кароткія тэрміны быў створаны новы навукова-тэхнічны і развіты інтэлектуальны патэнцыял, але адбыліся пэўныя дэфармацыі ў нацыянальнай сферы. Паступовасць, дабраахвотнасць і цярплівасць не прымаліся ў разлік, мясцовыя ўмовы, нацыянальныя культурна-гістарычныя асаблівасці не ўлічваліся. Значныя змены ў нацыянальнай палітыцы адбыліся напрыканцы 1980-х гг., з пачаткам дэмакратызацыі грамадскага жыцця, калі побач з адраджэннем культуры і нацыянальнага жыцця беларускага этнаса пачаўся і аналагічны працэс у большасці нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі нашай краіны.

2. Для грамадскага жыцця нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі міжваеннага часу былі характэрны дзве тэндэнцыі: па-першае, гэта быў апошні перыяд дзейнасці нацыянальных партый, арганізацый і аб’яднанняў, якія паступова выцясняюцца з жыцця, па-другое, адбываецца далучэнне нацыянальных меншасцей у новыя працэсы праз уцягненне іх у прасавецкія грамадска-палітычныя аб’яднанні.

Нацыянальныя меншасці прынялі актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі праз дзейнасць у аб’яднаннях, якія складалі палітычную сістэму грамадства ў БССР (КПБ, прафсаюзы, саветы, дзяржаўныя

структуры, камсамол, кааператыўныя аб'яднанні, творчыя саюзы). Найбольш актыўна і плённа працавалі прадстаўнікі нацменшасцей БССР у таварыствах, звязаных з вытворчасцю, перапрацоўкай і рэалізацыяй сельскагаспадарчай прадукцыі.

У выніку аналізу культурнага, грамадскага, палітычнага, гаспадарчага жыцця Савецкай Беларусі можна сцвярджаць, што сярод нацменшасцей было найлепш палітычна арганізаваным яўрэйскае насельніцтва. Яно больш актыўна ўключалася ў новыя грамадска-палітычныя працэсы. Латышскае, літоўскае, нямецкае, польскае насельніцтва, якое пражывала ў сельскай мясцовасці, больш насцярожана адносілася да дзейнняў савецкай улады і імкнулася захаваць свой уклад жыцця. Татарская, цыганская і некаторыя іншыя супольнасці не змаглі цалкам рэалізаваць свае нацыянальна-грамадскія і культурна-асветніцкія памкненні ў БССР.

У 1920-я гг. на тэрыторыі рэспублікі дзейнічаў шэраг нацыянальных партый, аб'яднанняў, таварыстваў. Адны партыі і аб'яднанні падтрымлівалі КП(б)Б альбо былі ўтвораны па яе ініцыятыве, другія крытыкавалі дзейнасць уладаў і знаходзіліся ў апазіцыі да іх. Асабліва шмат было яўрэйскіх партый і аб'яднанняў. У выніку далучэння яўрэйскай моладзі да савецкага будаўніцтва стала знікаць яўрэйскае мястэчка са своеасаблівым нацыянальным каларытам і ўкладам. У асяродку палякаў, літоўцаў, латышоў, немцаў дзейнічала вялікая колькасць рэлігійных, культурна-асветных і спартыўных таварыстваў, брацтваў, гурткоў. Уладам не падабалася, што ва ўсіх без выключэння таварыствах і гуртках прапагандавалася ідэя "нацыянальнага адзінства".

У выніку розных прычын большасць грамадска-палітычных аб'яднанняў нацыянальных меншасцей знаходзілася ў апазіцыі да камуністычнай партыі і адпаведна, часткова, да савецкай улады. Пачынаючы з другой паловы 1920-х гг., нацыянальныя грамадскія арганізацыі былі ліквідаваны, большасць членаў аб'яднанняў нацыянальных меншасцей абвінавачаны ў контррэвалюцыйный дзейнасці і высланы за межы рэспублікі. Асобныя глыбока заканспіраваныя групы праіснавалі да сярэдзіны 1930-х гг. Нацыянальныя грамадскія аб'яднанні дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі у складзе Польшчы і нелегальна пасля аб'яднання з БССР.

У 1960–1970-я гг. на тэрыторыі БССР сярод моладзі і інтэлігенцыі існавалі асобы, якія крытычна асэнсоўвалі савецкую рэчаіснасць. З мэтай адраджэння і захавання нацыянальнай самасвядомасці рабіліся неаднаразовыя спробы стварэння грамадскіх арганізацый, непадкантрольных камуністычнай уладзе. У розных гарадах Беларусі нелегальна дзейнічалі шэраг маладзёжных нацыянальна-патрыятычных аб'яднанняў. Улады рэспублікі пільна адсочвалі і абмяжоўвалі ўсе памкненні яўрэяў, палякаў, беларусаў, якія былі накіраваны на актывізацыю грамадска-палітычнай дзейнасці, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці і развіццё сваёй культуры. Напрыканцы 1980-х гг. у БССР ствараюцца і дзейнічаюць шэраг грамадскіх аб'яднанняў палякаў, яўрэяў, татар, латышоў і іншых нацыянальнасцей.

3. З першых гадоў савецкай улады прадстаўнікі нацменшасцей складалі пераважную большасць сярод палітычнага і эканамічнага кіраўніцтва БССР. Яны адыгрывалі значную ролю ў жыцці рэспублікі, нават большую, чым тытульнае насельніцтва. Нацыянальныя меншасці (за выключэннем некаторых, напрыклад, цыганоў) займалі высокія статусныя пазіцыі ў сацыяльнай структуры, эканоміцы, палітыцы, адукацыі і культуры беларускага грамадства. Іх дзейнасць і ўзаемаадносіны паміж сабою, з дзяржаўнымі органамі, беларусамі дазвалялі захоўваць узаемаразуменне і дыялог у палітычнай сферы.

Дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей у партыйна-дзяржаўным апараце насіла інтэрнацыянальны характар і вызначалася асноўнымі кірункамі знешняй і ўнутранай палітыкі. Нацыянальныя меншасці праз сваё прадстаўніцтва ў партыйна-дзяржаўным апараце атрымалі каштоўны вопыт удзелу ў вырашэнні мясцовых гаспадарчых, сацыяльных і грамадскіх спраў. Але іх удзел у гэтых працэсах быў не настолькі шырокім і трывалым, як бы таго жадалася з-за дужа цэнтралізаванага вырашэння пытанняў у сацыяльна-палітычным жыцці і несістэмнасці ў нацыянальнай працы.

У выніку індустрыяльнага развіцця рэспублікі, павышэння адукацыйнага ўзроўню прадстаўнікоў тытульнай нацыі паступова ў кіраўніцтве павялічвалася колькасць беларусаў і паменшылася ўдзельная вага нацменшасцей сярод кіруючых кадраў партыйнага, савецкага і гаспадарчага апарату. Аднак эліта нацыянальных меншасцей Беларусі ўвесь час пачувала сябе ў рэспубліцы даволі камфортна. Асаблівасцю было тое, што нацыянальныя меншасці хутчэй арганізоўваліся, рэагавалі на грамадскія змены, для іх асяродка ўласціва наяўнасць працаздольнага і дзейнага актыву. Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей часцяком выступалі з ініцыятывамі пад уплывам партыйна-дзяржаўнай прапаганды, што дазваляла ім ва ўмовах недахопу кадраў займаць адказныя пасады і паляпшаць свой сацыяльны статус.

Вышэйшае кіраўніцтва рэспублікі фарміравалася цэнтральнымі кіруючымі органамі СССР, якія не дапускалі ўмацавання кадравага патэнцыялу з мясцовага насельніцтва. Кіруючы апарат падбіраўся адміністратыўным шляхам, з улікам нацыянальнага складу насельніцтва, кампетэнтнасці і адданасці камуністычным ідэалам, а таксама пераводам на кіруючыя і адказныя пасады у Беларусь асобаў з іншых рэгіёнаў СССР. Але ў 1960–1980-я гг. адзначаецца тэндэнцыя рэгіяналізацыі працэсаў сацыяльнага рэкрутавання адказных работнікаў, а таксама тэндэнцыя да ўзмацнення самадастатковасці мясцовых кадравых рэсурсаў для папаўнення складу кіруючых супрацоўнікаў і іншых спецыялістаў. У другой палове 1970-х гг. асноўныя кіруючыя кадры сталі рэкрутаваць з гарадскіх, а не сельскіх жыхароў, але вясковы менталітэт доўгія часы працягваў аказваць уплыў на дзейнасць і паводзіны кіраўнічых кадраў гаспадаркі БССР. Адукацыя, а не класавая прыналежнасць, стала адыгрываць вырашальную ролю пры занятці адказных пасад. У апошнія дзесяцігоддзі існавання БССР нацыянальнасць улічвалася ў анкетах і пры назначэнні на пасаду, але большасць грамадзян не надавала ёй вялікага значэння, усведамляючы сябе савецкімі людзьмі.

4. У Савецкай Беларусі адсутнічалі сутыкненні і вострыя канфлікты на этнічнай, расавай, лінгвістычнай і канфесійнай аснове. Такое становішча тлумачыцца менталітэтам беларускага народа, гістарычнымі традыцыямі мірнага міжэтнічнага супрацоўніцтва, даўнімі і трывалымі сувязямі між этнічнымі групамі, што пражывалі на тэрыторыі Беларусі, нацыянальна-дзяржаўнай палітыкай. Але ў БССР традыцыйна прысутнічала напружанне ў сферы міжнацыянальных адносін. Для часткі насельніцтва быў характэрны пэўны антысемітызм, які партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам увязваўся з выступленнямі супраць камуністычнай партыі і савецкай улады, пагардлівыя адносіны да праяў беларускай культуры з боку асобных груп нацыянальных меншасцей. Хуткімі тэмпамі ішоў працэс рускамоўнай асіміляцыі прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у Беларусі. Былі складанасці ў адносінах з польскай супольнасцю, якая пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Частка насельніцтва БССР звязвала сваю незадаволенасць існуючымі парадкамі з канкрэтнымі дзеяннямі ўладаў і пэўнымі выканаўцамі па нацыянальных прыкметах. Вялікая колькасць яўрэяў і рускіх на адказных пасадах прыводзіла да праяў антысемітызму ў 1920–1930-я гг., пашырэння антырускіх настрояў у 1980-я гг.

Улічваючы высокі ўзровень адукацыі сярод яўрэйскага насельніцтва, можна казаць аб некаторых адміністратыўных перашкодах, якія былі выкліканы пераважна знешнепалітычнымі фактарамі, пры прызначэнні яўрэяў на адказныя пасады. У той жа час, трэба мець на ўвазе, што гаворка ідзе аб тых асобах, якія паказвалі ў анкетах сваю нацыянальнасць як яўрэй (некаторыя пазначалі сябе ў якасці рускіх ці беларусаў). Падобныя абмежаванні існавалі і ў адносінах да палякаў, іх даволі вялікая колькасць на пасадах мясцовага ўзроўню ў 1989 г. – гэта вынік зменаў, выкліканых палітыкай перабудовы.

Палітычны недавер, павышаная падазронасць да беларусаў, якія патэнцыйна маглі займаць кіруючыя пасады, асабліва да выхадцаў з Цэнтральнай і Заходняй Беларусі, што захоўваліся аж да 1990 г., прывялі да таго, што імі фактычна не займаліся вядучыя пасады ў органах дзяржаўнай улады і кіравання БССР, і тым самым правакавалі ўнутраныя супярэчнасці.

5. З другой паловы 1920-х гг. і да пачатку 1950-х гг. у Савецкай Беларусі праводзіліся масавыя рэпрэсіі і дэпартацыі насельніцтва. Яны былі не толькі прадуктам знешняга фактару – пагаршэння міжнароднага становішча СССР і ўзрастання напругі на заходняй мяжы, але і ўнутранага фактару – падаўлення іншадумства ў вышэйшых эшалонах улады і савецкім грамадстве ў цэлым.

Спроба саветызацыі літоўцаў, латышоў, немцаў, значнай часткі палякаў, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці, з дапамогай створаных форм нацыянальнай аўтаноміі сябе апраўдала, але не прывяла да чакаемых вынікаў. Устаноўлена, што стварэнне нацыянальных мястэчковых і сельскіх саветаў – гэта найлепшая форма арганізацыі і развіцця самакіравання для нацыянальных меншасцей ва ўмовах станаўлення плюралістычнай культуры. Але іх існаванне ва ўмовах фарміравання сталінскіх форм кіравання (адміністратыўна-

каманднай сістэмы) і правядзення палітыкі інтэрнацыялізму прыводзіла да разумення іх сутнасці як асяродка праяў нацыянальнага сепаратызму.

Назіраўся супраціў з боку некаторых меншасцей БССР сацыялістычным пераўтварэнням: калектывізацыі, рэлігійнай палітыцы савецкай дзяржавы, а таксама шматлікія праявы сімпатыі да сваёй гістарычнай радзімы. У гэтай сітуацыі роспуск нацыянальных саветаў, згортванне нацыянальна-культурнай працы і наступныя рэпрэсіі былі непазбежныя. Да таго ж, як правіла, у сялянскіх гаспадарках літоўцаў, латышоў, палякаў, немцаў і іншых выкарыстоўваліся больш перадавыя тэхналогіі і дасягненні агракультуры. У выніку яны часта атрымоўвалі больш высокія ўраджаі і прыбыткі ў параўнанні з сялянамі-беларусамі. Гэта стала прычынай таго, што падчас калектывізацыі іх залічылі ў разрад кулакоў і затым разам з сем'ямі рэпрэсавалі. Размах рэпрэсіўных дзеянняў у дачыненні да розных нацыянальных меншасцей быў не аднолькавы, але закрануў усіх. У большай ступені пацярпелі польская, латышская, нямецкая, літоўская меншасці, у першую чаргу, іх найбольш працаздольная і актыўная частка.

6. Пабудова асноў сацыялізму суправаджалася палітыкай правядзення індустрыялізацыі і калектывізацыі. Гэта прывяло да пераўтварэння БССР у аграрна-індустрыяльную, а затым у індустрыяльную рэспубліку і значных сацыяльных зрухаў, якія непасрэдным чынам закранулі грамадскае жыццё нацыянальных меншасцей Беларусі. Праявіліся тэндэнцыі, накіраваныя на разбурэнне народнай культуры, да страты пераемнасці духоўных каштоўнасцей.

Індустрыялізацыя прывяла да зменаў у сацыяльным і нацыянальным складзе насельніцтва рэспублікі. Раней гарадское насельніцтва складалася пераважна з прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей. Цяпер жа іх доля памяншалася. Павялічвалася ўдзельная вага беларусаў у складзе інтэлігенцыі.

Сяляне з ліку нацменшасцей па-рознаму ўспрымалі пераход да калектыўных формаў гаспадарання. Для серадлякоў уцягванне ў калгасы азначала карэнную ломку звычнага, традыцыйнага ладу жыцця. Таму яны выказвалі нязгоду і сумненні адносна ўступлення ў калгасы. Бедната і батракі, спадзеючыся палепшыць сваё эканамічнае становішча, у асноўным падтрымлівалі радыкальныя пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы.

На тэрыторыі БССР ствараліся і дзейнічалі нацыянальныя калгасы, якія з'явіліся своеасаблівай формай грамадскага самакіравання і кіравання не толькі сродкамі вытворчасці, але і грамадскага жыцця. Вельмі хутка ўзрастала роля калгаса і яго кіраўніцтва ў параўнанні з сельскімі і мястэчковымі саветамі. Па меры ўмацавання калгаснага ладу бачна, што дзейнасць калгасаў усё больш абгрунтоўвалася не эканамічнай мэтазгоднасцю, а грамадска-палітычнай. Калектывізацыя і звязаныя з ёй высылкі заможных сялян на Урал, поўнач Расіі, у Сібір і іншыя рэгіёны СССР пацягнулі за сабой масавыя выезды за межы Беларусі, разбурэнне традыцыйных укладаў жыцця.

7. Падзеі Другой сусветнай вайны адзначыліся працэсамі ўз'яднання беларускіх зямель у верасні–кастрычніку 1939 г., сацыялістычнымі

пераўтварэннямі ў Заходняй Беларусі (восень 1939 – вясна 1941) і гераічнай барацьбой з гітлераўскімі акупантамі (1941–1945).

Уз’яднанне беларускіх земляў у адзінай савецкай дзяржаве ва ўмовах Другой сусветнай вайны з’явілася важным станоўчым палітычным актам у жыцці нашага народа. Дэклараванне і правядзенне карэнных зменаў у сацыяльнай, культурнай і нацыянальнай палітыцы стваралі спрыяльныя ўмовы для прыняцця савецкай улады, асабліва ў асяродку працаўнікоў. Аднак рэчаіснасць аказалася супярэчлівей. Трагічным дысанансам сталі дэпартацыі палякаў (дзяржаўных службоўцаў, інтэлігенцыі, асаднікаў і г. д.), якія ў той час былі зразумелымі для асноўнай часткі насельніцтва, улічваючы тую жорсткую сацыяльную і нацыянальную палітыку, якую праводзіла польская ўлада на гэтых землях.

Аналізуючы грамадскае і культурна-асветніцкае жыццё ў Заходняй Беларусі, можна адзначыць, што змяніліся адносіны да нацыянальных меншасцей, улады БССР імкнуліся абапірацца на ўвесь спектр нацыянальных сіл. Адбывалася фарміраванне новага кіруючага апарату з улікам нацыянальнага складу насельніцтва, а таксама пераводам на кіруючыя і адказныя пасады ў далучаную частку Беларусі асобаў з усходу. Актыўна падтрымлівала савецкую ўладу істотная частка яўрэйскага насельніцтва і невялікая колькасць палякаў і іншых супольнасцей. Кіраўніцтва рэспублікі, мясцовыя партыйныя і савецкія органы, каб замацаваць сваю ўладу, імкнуліся развіваць культуру, духоўныя асаблівасці нацыянальных меншасцей.

Новыя ўлады вырашалі складаныя міжнацыянальныя пытанні ў Заходняй Беларусі, строга прытрымліваючыся класавага прынцыпу. Нацыянальныя партыі забараняліся. Межы Заходняй Беларусі вымушаны былі пакінуць лідэры і актыўныя прыхільнікі нацыяналістычных партый і арганізацый, у тым ліку і беларускіх. Тыя, што засталіся, перайшлі на нелегальныя формы дзейнасці. Ідэалогія класавага падыходу ў рашэнні сацыяльна-палітычных праблем прывяла да нацыянальна-палітычных супярэчнасцей, да ўзнікнення і росту польскага нацыяналістычнага падполля.

8. На працягу вайны 1941–1945 гг. нацыянальныя меншасці Беларусі ўнеслі вялікі ўклад у перамогу над гітлерызмам сваім удзелам ў ваенных падзеях на франтах, працай у тыле, барацьбой з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў і ў атрадах антыгітлераўскага несавецкага супраціву.

Вельмі значным быў унёсак нацменшасцей у барацьбу з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў Беларусі. Партызанскі рух, які пачаў разгортвацца на акупаванай тэрыторыі Беларусі з самага пачатку вайны, насіў шматнацыянальны характар. У пачатку вайны ў радах беларускіх партызан апынуліся мясцовыя патрыёты, а таксама байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, якія вырваліся з акружэння і германскага палону. Пазней асноўную масу партызан Беларусі складалі беларусы і нацыянальныя меншасці, якія пражывалі тут у даваенны перыяд. Нацыянальны склад падпольных арганізацый Беларусі ў значнай ступені адпавядаў агульнай структуры этнічных груп, якія пражывалі ў рэспубліцы ў передваенны час. Выключэнне

складаюць прадстаўнікі яўрэйскай і польскай нацыянальнасцей, доля якіх у падпольных арганізацыях была меншай, чым у агульным складзе насельніцтва. Пераважная большасць прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці, якая ўступіла ў савецкія антыгітлераўскія арганізацыі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд нямецкай акупацыі, з'яўляліся жыхарамі ўсходніх раёнаў БССР.

Падзеі вайны значна абвастрылі нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў акупаванай Беларусі. З першых дзён вайны на тэрыторыі Беларусі акупацыйныя ўлады здзяйснялі нацыянальную палітыку, якая была накіравана на дамінаванне германскай расы, анямечванне і эксплуатацыю пэўнай часткі славянскага насельніцтва, генацыд (яўрэяў, цыганоў). Гітлераўскія агрэсары імкнуліся распальваць супярэчнасці, якія мелі месца паміж палякамі, рускімі, беларусамі і яўрэямі. Нярэдка акупанты аддавалі перавагу нацыянальным меншасцям, каб супрацьпаставіць іх карэннай нацыі. Варта адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі існавалі канфлікты паміж асобнымі нацыянальнымі рухамі. Але яны не пераўтварыліся ў антаганістычныя міжнацыянальныя канфлікты.

У цэлым традыцыйныя добразычлівыя ўзаемадачыненні паміж прадстаўнікамі розных народаў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны былі захаваны. Шырока вядомы факты ўзаемадзеянняў у сумесным змаганні з акупантамі, самаахвярнасць з боку беларусаў, рускіх, палякаў, прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцей на тэрыторыі Беларусі ў дапамозе яўрэям, адносна якіх праводзілася гітлераўская палітыка генацыду.

Акупацыйныя ўлады, знішчаючы ўсіх не згодных з іх дзеяннямі, яўрэяў, праводзячы палітыку германізацыі, у той жа час стваралі ўмовы для пэўнага эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця неяўрэйскай часткі насельніцтва. Гэта, а таксама тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел, паспрыялі таму, што нацыянальнае жыццё часткі нацыянальных меншасцей Беларусі ажывілася. На захадзе Беларусі вялікую працу разгарнулі польскія нацыяналісты (АК), якія імкнуліся выкарыстаць сітуацыю для рэалізацыі сваіх палітычных памкненняў. У паўднёвых раёнах Беларусі дзейнічала Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН, УПА). Польскія і ўкраінскія нацыянальныя вайсковыя фарміраванні налічвалі ў сваіх шэрагах не толькі тысячы палякаў і ўкраінцаў, але і тысячы беларусаў, якія пражывалі ў зонах іх актыўнага дзеяння.

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцей Беларусі былі ў складзе розных груп калабарантаў. Асобы латышскай, літоўскай, польскай, рускай, украінскай нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі працавалі ў створаных акупантамі ці з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах (старасты, бургамістры, юдэнраты і г. д.), грамадскіх арганізацыях, з'яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Частка з іх уваходзіла ў мясцовы паліцэйскі апарат, службу парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фарміраванні, чыгуначныя батальёны. Найбольш актыўнымі ў Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі ў пэўных рэгіёнах былі рускія, латышы, палякі, украінцы. Найменш цікавіліся “палітыкай” татары, прычым варта адзначыць лаяльнасць татараў да немцаў і немцаў да татараў. На тэрыторыі Беларусі ў калабарацыянісцкім руху ўдзельнічалі нацыянальныя вайсковыя часткі.

Пераважна яны складаліся з асобаў, якія не з'яўляліся мясцовымі жыхарамі і апынуліся тут пасля пачатку і ў ходзе вайны.

9. У Савецкай Беларусі дэкларavaўся клопат пра далейшы росквіт нацыянальных культур, але пры гэтым лічылася неабходным умацаванне іх інтэрнацыянальнай асновы, стварэнне агульнасавецкай культуры праз пашырэнне грамадскіх функцый рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін шматнацыянальнай дзяржавы.

Пераўтварэнні ў галіне адукацыі і культуры мелі як станоўчыя, так і адмоўныя бакі. Адным з галоўных дасягненняў з'яўляецца пад'ём узроўню адукацыі ўсіх этнічных груп, што жылі ў БССР, згладжваліся дыспрапорцыі ва ўзроўнях адукаванасці. Нацыянальныя школы і культурна-асветніцкія ўстановы, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, недахоп кніг, падручнікаў і настаўнікаў, даволі якасна абучылі значную колькасць людзей на роднай мове і забяспечылі культурнае развіццё нацыянальных меншасцей БССР.

Да недахопаў, нават з улікам станоўчага ў інтэграцыі, у першую чаргу, варта аднесці асіміляцыйныя працэсы, якія вельмі моцна закранулі палякаў, латышоў, яўрэяў, татар, літоўцаў, немцаў. А таксама тое, што нацыянальна-культурнае жыццё нацменшасцей Беларусі, за выключэннем рускіх, ад пачатку 1950-х да сярэдзіны 1980-х гг. фактычна было абмежавана рамкамі рэлігійнай сферы. Але і ёй партыйна-савецкія ўлады БССР чынілі значныя перашкоды.

Рэлігійная сфера жыцця нацыянальных меншасцей Беларусі ў той час знаходзілася пад татальным кантролем партыйна-савецкіх органаў. Дзяржаўна-канфесійная палітыка была накіравана на поўнае выцясненне рэлігіі з духоўнай сферы жыцця чалавека і ўплыву на грамадства. У Савецкай Беларусі было шмат страчана нацыянальна-рэлігійных традыцый. Аднак істотная частка прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі засталася носьбітамі пэўных рэлігійных традыцый і каштоўнасцей. Іх узровень этнічнай самасвядомасці быў нашмат вышэй, чым у беларусаў. Выяўлена гістарычная заканамернасць, якая складалася ў тым, што ва ўмовах ганенняў, арыштаў адбываецца згуртаванне вернікаў на этнічнай аснове. Немцы, палякі, латышы, літоўцы не толькі не адракліся ад рэлігіі – яна кансалідавала іх. Сярод нацыянальных меншасцей яшчэ больш умацоўваецца сувязь рэлігійных перакананняў з нацыянальнай ідэнтычнасцю. Рэлігійнае жыццё нацыянальных меншасцей стала той сферай, дзе захоўваліся прыкметы, рысы і асаблівасці традыцыйнай культуры палякаў, яўрэяў, татараў, літоўцаў, латышоў і немцаў.

Грамадска-палітычныя і сацыяльныя працэсы, урбанізацыя і міграцыя, інтэрнацыяналізацыя і навукова-тэхнічны прагрэс, якія не абапіраліся на адвечныя традыцыйныя каштоўнасці народа, прывялі да знікнення цэлых пластоў традыцыйнай культуры народаў Савецкай Беларусі. Устаноўлена гістарычная заканамернасць, якая заключаецца ў тым, што ў працэсе правядзення культурнай рэвалюцыі, органы ўлады паступова перайшлі да адміністратыўных метадаў, упадабаючы іх метадам масавай прапаганды (масавая, тлумачальная праца) і ініцыятыве "свядомага" актыўнага насельніцтва на месцах. Нацыянальна-грамадскую дзейнасць можна вызначыць

як змаганне за стварэнне і існаванне нацыянальных школ, захаванне мовы, этнічнай свядомасці і сваёй рэлігіі.

Імкненне ўладаў СССР і БССР да поўнай саветызацыі і русіфікацыі рабілі вельмі сумніўнымі перспектывы захавання і развіцця польскай, татарскай, яўрэйскай, латышскай, літоўскай, украінскай і іншых культур на беларускай зямлі. Аднак развіццё дэмакратычных пераўтварэнняў ў другой палове 1980-х – пачатку 1990-х гг. прывяло да пэўных зменаў у развіцці нацыянальных супольнасцей Беларусі. Грамадская актыўнасць нацыянальных меншасцей, як і беларускага этнасу, скіроўваецца на адраджэнне і захаванне традыцыйных культур, што садзейнічала росту іх грамадскай і нацыянальнай свядомасці.

Гэта дазволіла выявіць гістарычную заканамернасць аб тым, што ў БССР побач з адраджэннем і развіццём грамадскай актыўнасці, нацыянальнай культуры тытульнай нацыі адбывалася захаванне і росквіт культур іншых этнічных груп.

Дзейнасць нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў, створаных у апошнія гады існавання БССР, была сканцэнтравана пераважна ў гарадах. Яны былі нешматлікія па колькасці зарэгістраваных членаў аб’яднання, за выключэннем СПБ і шэрагу яўрэйскіх арганізацый, якія з’яўляліся найбольш актыўнымі. Узровень актыўнасці нацыянальных грамадскіх арганізацый (НГА) на ўсходзе быў ніжэй, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Некампактнасць пражывання нацыянальных меншасцей ва ўсходняй частцы Беларусі абумоўлівала нязначны ўплыў НГА на насельніцтва гэтага рэгіёна і памяншала верагоднасць узнікнення праблем у нацыянальных адносінах. Стварэнне і дзейнасць грамадскіх аб’яднанняў нацыянальных меншасцей садзейнічала фарміраванню грамадзянскай супольнасці і актывісцкага (грамадзянскага) тыпу палітычнай культуры ў насельніцтва Беларусі.

10. Аналіз асноўных кірункаў эвалюцыі нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі, грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей Савецкай Беларусі дазволіў устанавіць, што ў БССР у пэўны час існаваў пратэкцыянізм у адносінах да нацыянальных меншасцей з адначасовым недаверам партыйна-савецкага кіраўніцтва да пэўных этнічных супольнасцей, асабліва калі на іх гістарычных радзімах будаваўся капіталізм, адсюль тлумачыцца дыферэнцыяванае стаўленне кампартыі і савецкай улады да розных груп меншасцей у розныя перыяды.

Устаноўлена, што ў перыяд савецкай гісторыі сфарміраваўся грамадскі менталітэт, у якім дзяржаўна-калектыўныя інтарэсы стаялі над інтарэсамі этнічнай групы і асобнага чалавека, што з’яўлялася перашкодай у развіцці творчай актыўнасці і ініцыятывы грамадзян, выхавання ў іх чалавечай годнасці. Гэта прывяло да нявдольнасці грамадзян і нават этнічных супольнасцей да актыўнай дзейнасці, фарміравання грамадзянскай супольнасці.

Устаноўлена, што ў СССР (БССР) фармальна вызначаныя нормы, якія рэгулявалі грамадскае жыццё і палітыку, у большасці выпадкаў усталёўваліся не законамі, а подзаконнымі актамі і дакументамі кампартыі. Прыведзеныя ў даследаванні факты ўдзелу нацыянальных меншасцей у грамадскім і культурна-

асветніцкім жыцці і рэакцыя савецкага кіраўніцтва на іх дзейнасць дазваляюць у пэўнай ступені выявіць і зразумець да сёння не вывучаныя, ў асноўным закрытыя, практыкі кіравання этнічным складам кіруючых кадраў, а таксама дысцыплінарныя механізмы папярэджання і рэгулявання міжэтнічных супярэчнасцей і канфліктаў на працоўных месцах, у навучальных установах і па месцу жыхарства.

Роля нацыянальных меншасцей у працэсах і этапах станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці знайшла сваё ўвасабленне ў тым, што грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць нацменшасцей спрыялі кансалідавалі і садзейнічалі ўзбагачэнню разнастайнасці патэнцыялу беларускага народа (нацыі).

Удзел у грамадскім і культурна-асветніцкім жыцці дазволіў вылучыць рэальную ролю грамадзяніна, асобных груп як на мясцовым узроўні, так і ў палітычнай сістэме грамадства. У выніку ўсебаковага даследавання і аналізу паказана, як шляхам грамадскіх дзеянняў вызначалася свядомае і дабраахвотнае ўмяшальніцтва асобы, групы ва ўладныя структуры існуючай сістэмы з мэтай магчымага прыстасавання яе да сваіх інтарэсаў, ідэалаў і каштоўнасцей. Як дзейнасць злучалася з імкненнем удасканаліць ці змяніць сацыяльна-эканамічны і палітычны лад.

Праведзенае намі даследаванне нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі ў Савецкай Беларусі (1919–1991), грамадскай і культурна-асветніцкай дзейнасці нацыянальных меншасцей, спецыфікі іх гістарычных лёсаў і асаблівасцей, эвалюцыі асноўных форм існавання іх матэрыяльнай і духоўнай культуры (мова, рэлігія, гістарычная памяць і інш., у якіх найбольш праявілася самаідэнтыфікацыя этнасаў), суб’ектыўна перажытых адносін паміж нацыянальнымі супольнасцямі (іх асобнымі прадстаўнікамі), якія залежылі ад гістарычнага мінулага, сацыяльна-палітычнай абстаноўкі ў краіне, эканамічных і культурна-бытавых умоў жыцця, выявіла гістарычную заканамернасць пра кансалідаванасць беларускага грамадства, пераемнасць традыцыйна мірных і добразычлівых ўзаемадачыненняў паміж рознымі народамі, адсутнасць міжэтнічных канфліктаў на тэрыторыі Беларусі.

# Бібліяграфія


1. Агеев, А. Г. История профсоюзного движения Могилёвщины / А. Г. Агеев, И. А. Пушкин. – Могилёв: УПКП “Могилёвская областная укрупнённая типография имени Спиридона Собаля”, 2005. – 216 с.
2. Агеенко, Т. Латыши на Могилевщине (в документах Национального архива Республики Беларусь) / Т. Агеенко // Латыши и белорусы: вместе сквозь века: сб. науч. ст. Вып. 3 / редкол.: С.П. Кулик [и др]. – Минск: РИВШ, 2014. – С. 37–44.
3. Агееў, А. Р. Фарміраванне і дзейнасць Магілёўскага Беларускага Камітэта (1917–1918): манаграфія / А. Р. Агееў, І. А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2017. – 292 с.
4. Агурский, С. Х. Еврейский рабочий в коммунистическом движении (1917–1921) / С. Х. Агурский. – Минск: Госиздат, 1926. – 244 с.
5. Адамушка, У. І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі / У. І. Адамушка. – Мінск: Беларусь, 1994. – 158 с.
6. Административно-территориальное устройство БССР: Справочник. В 2-х т. Т. 1 (1917–1941 гг.) / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР, Ин-т философии и права АН БССР. – Минск: Беларусь, 1985. – 390 с.
7. Альховік, М. К. Нацыянальная палітыка ў адносінах да яўрэйскага насельніцтва і яе уплыў на грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1937–1939 гг. / М. К. Альховік // Актуальные проблемы социально-гуманитарных наук: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф. 18–19 апреля 2013 г., г. Могилев; МГУ имени А. А. Кулешова. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова, 2013. – С. 106–108.
8. Альховік, М. К. Уплыў нацыянальнай палітыкі на вывучэнне культуры насельніцтва БССР у 1929–1935 гг. / М. К. Альховік // Романовские чтения – 9: сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. Н. М. Пурышевой. – Могилёв: УО “МГУ им. А. А. Кулешова”, 2013. – С. 118–119.
9. Андрэева, Е. Г. Гісторыя народнай адукацыі Беларусі (1917–1941 гг.) / Е. Г. Андрэева. – Мінск : НПТАТ “ПІАН”, 2001. – 320 с.
10. Асноўныя вынікі работы ўраду БССР : да перавыбараў саветаў 1928–29 гг. – Менск: Выд. ЦВК і СНК БССР, 1928. – 151 с.
11. Астрога, В. А. Вывучэнне гісторыі польскай меншасці ў міжваеннай Беларусі / В. А. Астрога // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001г.). – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 232–236.
12. Астрога, В. А. Украінцы ў гістарычнай навуцы Беларусі (1920-я гады) / В. А. Астрога // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 243–246.
13. Біч, М. В. БУНД / М. В. Біч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 2. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Б. І. Сачанка (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 126–132.
14. Багровіч, А. Жыхарства Беларускае ССР у сьвятле перапісу 1959 г. / А. Багровіч. – Нью-Ёрк, Мюнхен, 1962. – 88 с.
15. Балтрушэвіч, Н. Г. Пратэстанцкая царква і нацыянальна-культурная палітыка ў БССР (1940–60-я гг.) / Н.Г. Балтрушэвіч // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 285–287.
16. Барабаш, В. Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации / В. Барабаш // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси: материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 16–18 нояб. 2001 г. / общественное об-ие “Союз поляков на Беларуси”. – Гродно: ОО “Союз поляков на Беларуси”, 2003. – С. 205–211.
17. Барабаш, В. В. Поляки в антифашистской борьбе на территории Беларуси (1941–1944 гг.) / В. В. Барабаш. – Гродно, 1998. – 126 с.

18. Барабаш, Н. Организованный набор рабочих и общественные призывы в БССР (1946–1965 гг.) / Н. Барабаш // Гістарычна–археалагічны зборнік. – Мінск: “Беларуская навука”, 2015. – Выпуск 30. – С. 203–209.
19. Барановский, Е. И. Участие украинцев в партизанском и подпольном движении в Беларуси в годы Великой Отечественной войны / Е. И. Барановский // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 281– 284.
20. Бараноўскі, Я. І. За дружбу народаў. Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў 1921–1925 гг. / Я. І. Бараноўскі. – Мінск: Беларусь, 1972. – 214 с.
21. Бармичев, В. В единой семье братских культур / В. Бармичев. – Минск: Наука и техника, 1965. – 140 с.
22. Бартош, О. Э. Проблемы этничной идентификации цыган Беларуси / О. Э. Бартош // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им Я. Купалы; редкол.: М. А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 152–154.
23. Басин, Я. Большевизм и евреи: Белоруссия, 1920-е : ист.очерки / Я. Басин. – Минск: А. Н. Вараксин, 2008. – 304 с.
24. Басин, Я. З. Разгром иудаизма в Советской Беларуси. (1920–30-е гг.) / Я. Басин // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). – Мінск: «Дэполіс», 2001. – С. 247–249.
25. Батяев, В. Ф. Расселение и этнодемографические особенности белорусских евреев (по материалам переписей) / В. Ф. Батяев // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. / пад рэд. А. Кавалені. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 57–76.
26. Беларусіка = ALBARUTHENICA. [Кн.] 4: Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі / Міжнар. Асац. Беларусістаў, Нац. Навук. – асвет. Цэнтр імя Ф. Скарыны; Рэд.: В. Рагойша і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 381 с.
27. Беларусіка = ALBARUTHENICA. Кн. 3: Нацыянальная і рэгіянальныя культуры, іх узаемадзеянне / Міжнар. Асац. Беларусістаў, Нац. Навук.-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны; Рэд. А. Мальдзіс і інш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
28. Беларуска-польскія культурныя сувязі ў 1945–1991 гадах / Ю. Вашкевіч. – Мінск: ООО “ТЕСЕЙ”, 2004. – 184 с.
29. Беларусы. Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё / В. К. Бандарчык, В. М. Белявіна, Г. І. Каспяровіч і інш.; Рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 433 с.
30. Беларусы. Т. 6: Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко і інш.; Рэдкал.: В. М. Бялявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 606 с.
31. Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал.: У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – 434 с.
32. Белозорович, В. Общественно-политические процессы в западно-белорусской деревне осенью 1939 – начало 1940 гг. / В. Белозорович // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku wzajemności. Мат. X Міжнар. навук. канф.: Гродна–Мір, 24 кастрычніка 2002 г. / Пад рэд. І. Крэня. – Гродна: ГАУПП “Гродз.друк.”, 2004. – С.179–188.
33. Белозорович, В. А. К проблеме депортаций населения из западных областей Беларуси в 1940 г. / В. А. Белозорович // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 268–275.
34. Белорусская ССР в цифрах. К 10 летию существования БССР 1919–1929. – Минск, 1929. – 534 с.

35. Биографический справочник Белорусская ССР: Крат. энциклопедия Т. 5. – Минск: Белорус.сов.энциклопедия, 1982. – 733 с.
36. Блада, Б. Дэпартацыі польскага насельніцтва ў глыб СССР у 1939–1941 гг. / Б. Блада // Дэпартацыя як сацыяльная праблема: Тэматычны зборнік навуковых прац / Навуковы рэдактар С. А. Яцкевіч. – Брэст, 1997. – С. 28–31.
37. Блізнюк, Дз. І. З гісторыі нацыянальнай палітыкі нямецкіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. / Дз. І. Блізнюк // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф., (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 278–281.
38. Богданова, А. П. Латышская вспомогательная полиция безопасности в охране лагеря смерти Тростенец / А. П. Богданова // Гістарычныя шляхі беларускага народа і суседзяў: узаемадзеянне і ўзаемаўплывы. Зборнік навуковых артыкулаў. Вып. 1. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – С. 164–172.
39. Болотова, Ю. Г. Субкультура белорусских цыган / Ю. Г. Болотова // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / редкол.: М. А. Можейко (отв. ред.). – Гродно: ГрГУ, 2010. – С. 324–329.
40. Братское сотрудничество Белорусской ССР с союзными республиками. – Минск: Наука и техника, 1974. – 208 с.
41. Броўкін, Я. Да пытання аб традыцыях аўтаноміі нацыянальных меншасцей на Беларусі / Я. Броўкін // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 1 / Нав. рэд. С. А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск – Віцебск, 1996. – С. 39–40.
42. Бунд в Беларуси. 1897–1921. Документы и материалы / Сост. Э.М. Савицкий. – Минск: БелНИИДАД, 1997. – 608 с.
43. Вабішэвіч, А. Пераўтварэнні ў галіне культуры ў заходніх абласцях БССР у 1939–1941 гг. у адлюстраванні партыйных органаў (на прыкладзе Пінскай вобл.) / А. Вабішэвіч // Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі / Пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 176–186.
44. Вабішэвіч, А.М. Дзейнасць літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый на беларуска–літоўска–польскім памежжы ў 20–30-я гг. XX ст. / А.М. Вабішэвіч // Веснік ГрДУ. Серыя 1. – 2007. – № 1. – С. 37–41.
45. Вабішэвіч, А. М. Польскія грамадскія арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг. / А. М. Вабішэвіч // Весці НАНБ. Серыя гуманітарных навук. – 2008. – № 3. – С. 72–78.
46. Валаханович, А. И. Дзержинщина: прошлое и настоящее / А. И. Валаханович, А. Н. Кулагин / Под ред. П. Т. Петрикова. – Минск: Наука и техника, 1986. – 199 с.
47. Валаханович, И. А. Деятельность спецгрупп НКГБ БССР по выявлению и ликвидации подпольных структур ОУН–УПА на оккупированной территории Беларуси (1943–1944 гг.) / И. А. Валаханович // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 297–300.
48. Васілеўская, Н. У. Захады савецкай улады па забяспячэнні культурных патрэбаў этнічных меншасцяў БССР у першай палове 1920-х гадоў / Н. У. Васілеўская // Беларусь–Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18 – 19 сакавіка 2003 г.) / Рэдкал. У. І. Навіцкі (гал. рэд.), М. П. Касцюк (нам. гал. рэд.) і інш. – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 231–234.
49. Васілючак, М. В. Аб некаторых негатыўных момантах у Заходняй Беларусі напярэдадні вайны (верасень 1939 – чэрвень 1941 гг.) / М. В. Васілючак // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зборнік навук. артыкулаў / рэдкалегія: І. П. Крэнь, У. І. Навіцкі, В. А. Белазаровіч (адк. рэдактары). – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 204–207.

50. Вашкевіч, А. Вайна і мір 1939–1940 гг. ва ўспамінах жыхароў Гародні і ваколіц / А. Вашкевіч, Т. Касатая // Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі / Пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 105–114.
51. Ващило, Н. Н. Бундовские организации Могилева и Могилевского уезда в 1920–1921гг. / Н.Н. Ващило // Проблемы истории и культуры Верхнего Поднепровья. Международная научно-практическая конференция: Тезисы докладов / Под ред. Я. Г. Риера. – Могилев: МГУ им. А. А. Кулешова, 2001. – С. 28–30.
52. Великий, А. БУНД в коммунистической Беларуси: хроника политического уничтожения / А. Великий // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 2. – Мінск, 2003. – С. 52–59.
53. Веренич, В. Л. Состояние и перспективы исследования “Польщизны кресовой” / В. Л. Веренич // Польские говоры в СССР. – Минск: Наука и техника, 1973. – Ч. 1. – С. 183–212.
54. Вишневский, А. Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917–1995) / А. Ф. Вишневский. – Минск: ТПА “Форум” , 1995. – 266 с.
55. Возвращённые имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репресий. – Минск: Навука і тэхніка, 1992. – 120 с.
56. Вольфсон, С. Я. Культурная рэвалюцыя ў дзеяньні: Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР да XV стагоддзя Кастрычніцкай рэвалюцыі / С. Я. Вольфсон. – Менск: Дзяржвыд. БССР, Партмасектар, 1932. – 46 с.
57. Вольфсон, С. Я. Сучасная рэлігійнасць (паводле матэрыялаў дасьледваньняў у БССР) / С. Я. Вольфсон. – Менск: Выд-не БАН, 1930. – 120 с.
58. Всесоюзная перепись населения 1926 года. Том X. Отдел I. Народность. Родной язык. Возраст. Грамотность. – М.: ЦСУ Союза ССР, 1928. – 290 с.
59. Всесоюзная перепись населения 1937 года: Общие итоги. Сборник документов и материалов. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2007. – 320 с.
60. Вынікі і чарговыя задачы КП(б)Б па нацпытанню (прамова сакратара ЦК КПБ т. Крыніцкага 15 кастр. 1925 г.). – Клімавічы: Выд. АПА Калінінскага Акругкому, 1925. – 47 с.
61. Вялікі, А. “Зыход” або перасяленне польскага насельніцтва з Гародні ў Польшчу ў 1944–1946 гг. / А. Вялікі // Гарадзенскі соцыум 2013. Гісторыя і памяць. XV–XX стст. / Пад рэд. А. К. Краўцэвіча і А. Ф. Смаленчука. – Гродна, 2014. – С. 304–311.
62. Вялікі, А. Ф. Палякі ў савецкай Беларусі: “дваістыя стандарты” нацыянальнай палітыкі КПБ (1944–1991 гг.) / А. Ф. Вялікі // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6–7 снежня 2001 г.). – Мінск: Дэполіс, 2001. – С. 292–297.
63. Вялікі, А. Ф. Савецка-германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі / А. Ф. Вялікі // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2006. – № 3. – С. 15–18.
64. Вярэніч, В. Л. Польскія перыферыйныя гаворкі на Усходзе (да гісторыі пытання) / В. Л. Вярэніч // Польские говоры в СССР. Ч. 1. – Минск: Наука и техника, 1973. – С. 5–21.
65. Гавін, Т. Практыка адносінаў савецкай і партыйнай улады да мясцовага насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады ў Гародні і вобласці / Т. Гавін // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2012. – С. 369–383.
66. Галадзед, М. М. Асноўныя вынікі і пэрспэктывы гаспадарчага і культурнага будаўніцтва БССР: Даклад Урада БССР на Савеце Нар. Кам. СССР / М.М. Галадзед. – Менск: Белдзяржвыдат, 1928. – 94 с.
67. Ганбаров, Б. А. Азербайджанская диаспора в Республике Беларусь: организационная структура, социально-экономическое положение и основные направления деятельности (1989–2013 г.) / Б. А. Ганбаров. – Минск : Донарит, 2014. – 231 с.
68. Гембіцкая, М. Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі / М. Гембіцкая // Беларускі гістарычны часопіс. – 2005. – № 11. – С. 34–39.
69. Герасимова, И. П. Еврейская национальная культура в Беларуси и отношение к ней евсекции ЦК КП(б)Б в 20-е годы / И. П. Герасимова // Нацыянальная палітыка і

міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 1997. – С. 82–100.
70. Герасімава, І. Навуковае жыццё яўрэяў Беларусі ў 1920–1930-я гады / І. Герасімава // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2 / Нав. рэд. С. А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 65–67.
71. Гимбут, В. Организация народного образования среди национальных меньшинств в Беларуси: первые шаги трудного пути (перв. пол. 1920-х годов) // Беларусь у XX стагоддзі. Вып. 2. – Мінск, 2003. – С. 71–77.
72. Гігін, В. Ф. Разгром небальшавіцкіх палітычных партый і груп на тэрыторыі Савецкай Беларусі ў першай палове 1920-х гг. / В. Ф. Гігін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – № 10. – С. 3–8.
73. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішэвіч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэдактар). – Мінск: Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
74. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч і інш.; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
75. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч і інш.; рэдкал.: А. А. Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – 654 с.
76. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя і інш.; рэдкал.: А. А. Каваленя і інш; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 584 с.
77. Глагоўская, Л. Нацыянальнае пытанне ў Беларусі пасля 1-ай сусветнай вайны / Л. Глагоўская // Нацыянальныя меншасці Беларусі: Тэматычны зб. навук. прац. Кн. 2 / Нав. рэд. С. А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск–Віцебск, 1996. – С. 42–43.
78. Головнёв, А. М. Сближение национальных культур в процессе коммунистического строительства / А. М. Головнев, А. П. Мельников. – Минск: Изд-во БГУ, 1979. – 176 с.
79. Гребень, Е. А. Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.) / Е. А. Гребень. – Минск : БГАТУ, 2016. – 495 с.
80. Гребень, Е. А. Предпринимательская деятельность населения в период нацистской оккупации Беларуси / Е. А. Гребень // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2015. – № 9. – С. 149–155.
